

Наталля Сліж

# Культура
## сексуальных стасункаў
### у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стст.

Наталля Сліж

# Культура
## сексуальных стасункаў
### у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стст.

Мінск
«Тэхналогія»
2019

УДК 392.5/6(476)“15/16”
ББК 63.5(4Бел)
С47

**Сліж, Н. У.**

С47 Культура сексуальных стасункаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стст. / Наталля Сліж. – Мінск : Тэхналогія, 2019. – 231 с., [16] арк. іл.

ISBN 978-985-458-301-3.

У кнізе секс разглядаецца як складаная філасофска-фізіялагічная з’ява. Звернута ўвага на мужчынскія і жаночыя ідэалы ў Вялікім Княстве Літоўскім, літаратуру пра каханне і секс, візуалізацыю цела ў мастацтве, медыцыну, гігіену, уяўленне пра цела, практыку старабеларускага сексу, законныя і незаконныя інтымныя стасункі, прастытуцыю, згвалтаванні. Даследаванне зроблена на шырокай крыніцазнаўчай базе і паказвае асаблівасці інтымнага жыцця ў розных саслоўях грамадства.

**УДК 392.5/6(476)“15/16”**
**ББК 63.5(4Бел)**

**ISBN 978-985-458-301-3**

© Сліж Н. У., 2019
© Афармленне. НВК “Тэхналогія”, 2019

# ПРАДМОВА

*Секс – гэта жыццё,*
*А жыццё – гэта секс.*

Секс з'яўляецца найважнейшай сферай жыцця мужчыны і жанчыны. Ён выяўляе сапраўдную чалавечую сутнасць: агрэсію, комплексы, паталогіі, жарсці і шмат іншага. Схаваць гэта практычна немагчыма. Мала хто здольны кантраляваць свае жаданні. Неўтаймаваныя жарсці сёння далі магчымасць для развіцця цэлай індустрыі.

Секс такая самая натуральная з'ява, як і харчаванне, якое ўключае ў сябе не толькі фізіялагічны працэс, але і культуру спажывання, традыцыі, нацыянальную кухню. У сексе кожная нацыя стварае той тып адносінаў, які больш зручны для яе і адпавядае тэмпераменту. Аднак гэта не азначае, што ўсе людзі адной нацыянальнасці маюць абсалютна аднолькавыя інтымныя дачыненні. Нацыя можа мець любімую страву, але пры гэтым не грэбаваць пакаштаваць іншы прадукт.

Сусветная гістарычная навука назапасіла багаты вопыт у вывучэнні сексуальнай сферы жыцця. Яна даўно адышла ад ілжывай сарамлівасці і даследуе розныя аспекты тэмы ад гісторыі цела да гісторыі сексуальных меншасцяў[1]. Уздым цікавасці да гэтага накірунку быў звязаны з феміністскім рухам 70-х гг. XX ст., які ўнёс у гістарычную навуку новыя тэндэнцыі і падыходы.

Тэарэтыкі патрыярхату накіроўвалі сваю ўвагу на субардынацыю жанчын і знаходзілі тлумачэнне ёй у мужчынскай "неабходнасці" дамінаваць над жанчынамі. Марксісцкі накірунак фемінізму лічыў, што жанчыны прыгнечаны клас, што адносіны паміж мужчынамі і жанчынамі – гэта класавыя адносіны. Карані другараднага статусу жанчын у гісторыі палягаюць у эканоміцы, у іх маёмасных абмежаваннях амаль ва ўсіх грамадствах. Кэтрын МакКінан сцвярджала, што сексуальнасць для фемінізму з'яўляецца тым, што і праца для марксізму –

[1] Гістарыяграфія па тэме вельмі вялікая, прывядзем некаторыя працы: Stone L. The Family, Sex, and Marriage in England, 1500–1800. New York; Hagerstown; San Francisco; London, 1977; Sajkowski A. Staropolska Miłość: z dawnych listów i pamiętników. Poznań, 1981; Kuchowicz Z. Miłość Staropolska. Łódź, 1982; Brudage J. A. Law, Sex, and Christian Society in Medieval Europe. Chicago; London, 1987; Збигенев Л. С. Секс в культурах мира. Москва, 1991; Тэннехилл Р. Секс в истории / Пер. с англ. А. И. Блейз. Москва, 1995; Kingdon M. R. Adultery and Divorces in Calvin's Geneva. Cambridge; Massachusetts; London; England, 1995; Friedman D. Pan niepokorny. Kulturowa historia penisa / Przekł. I. Kolczyńska. Warszawa, 2003 і інш. Агляд еўрапейскай гістарыяграфіі па тэме гл.: Диса К. Історія сексуальності ранньомодерної доби: уявлення і дискусії на зламі XX і XXI століть // Соціум. Альманах соціальної історії. Київ, 2010. Вип. 9. С. 392–401.

размова пра "тое, што больш за ўсё прыналежыць да цябе і больш за ўсё адбіраецца ў цябе". Крыніцай няроўнасці паміж поламі лічылася сексуальнасць[2].

Аднак такія радыкальныя падыходы не знайшлі моцнай падтрымкі ў іншых даследчыкаў. Разгляд сексу толькі ў рэчышчы дыскрымінацыі жанчыны пакідае па-за ўвагай многія культурныя і сацыяльныя аспекты з'явы. Акрамя таго, у нашым выпадку вельмі сумнеўна выкарыстоўваць класавы метад даследавання адносна феадальнага грамадства.

На сённяшні дзень гісторыя сексу і гісторыя сексуальнасці маюць розныя прадметы даследавання. Першая вывучае непасрэдна практыку сексу (хто, дзе, калі і як), а другая бачыць секс як культурны і сацыяльны канструкты і вывучае розныя сферы, звязаныя з сексам, але не само дзеянне. Пры гэтым сама сутнасць сексуальнасці будзе мець рознае напаўненне – у залежнасці ад таго, якую культуру мы вывучаем[3].

Адзначым істотныя праблемы, з якімі сутыкаюцца даследчыкі пры вывучэнні гісторыі сексу. Стаўленне грамадства да практыкі сексу непасрэдна залежыць ад рэлігіі, традыцый, узроўню развіцця медыцыны, прынятых гендэрных роляў. Таму першая праблема – розніца ў развіцці сучаснага грамадства і грамадства XVI–XVII стст. Гэта значыць, што пры аналізе практыкі сексу варта ўлічваць тагачасныя рэаліі і не падыходзіць да вывучэння праблемы з пункту гледжання сучасных паняццяў і ўзроўню развіцця адукацыі і навукі. Сучасная сексалогія назапасіла вялікі вопыт у вывучэнні асаблівасцей мужчынскага і жаночага цела дзякуючы непасрэднай магчымасці працаваць з людзьмі. Па сутнасці, толькі ў XX ст. навука змагла адказаць на пытанне, што адбываецца з целам падчас сексу нават на узроўні нейрафізіялогіі[4]. І гэта дае магчымасць патлумачыць пэўныя сітуацыі ў практыцы сексу. Сучасны падыход навукі і грамадства да сексуальных адносінаў, паталогій значна адрозніваецца ад падыходаў і разумення гэтай тэматыкі ў перыяд XVI–XVII стст. Другая праблема падобная да той, што ўзнікае для даследчыка гісторыі сексуальнасці і гісторыі сексу як прадстаўніка адной культуры, што вывучае другую[5]. Уласны жыццёвы вопыт, выхаванне, рэлігія, адукацыя, біялагічная прыналежнасць да полу, гендэрная ідэнтыфікацыя непасрэдна маюць уплыў на рэцэпцыю іншай культуры і інтэрпрэтацыю паводзінаў і практык у сексе. Суб'ектыўны фактар пры вывучэнні гэтай тэматыкі адыгрывае важную ролю. Мы цалкам асэнсоўваем гэтую небяспеку, і будзе яўным перабольшваннем сцвярджаць, што іх атрымалася цалкам пазбегнуць.

Культурная антрапалогія таксама звяртае ўвагу на тое, што секс – справа не толькі кахання, разнявольвання ці працягу роду. Гэта неадлучная частка цэласна-

---

[2] Сліж Н. Гендэрная тэорыя ў гістарычным даследаванні // Вялікае княства Літоўскае: Метадалогія і метады даследавання / Пад рэд. С. Каўна. СПб., 2003. С. 72–91.

[3] Karras R. M. Seksualność w średniowiecznej Europie / Przełoż. A. Bugaj. Warszawa, 2012. S. 13–22.

[4] Асноўныя дасягненні ў галіне сексалогіі належаць заходнім даследчыкам, гл.: Imieliński K. Seksiatria. Patologia seksualna. Warszawa, 1990; Imieliński K. Seksiatria. Psychofizjologia seksualna. Warszawa, 1990; Bancrot J. Seksualność człowieka / Pod red. Z. Lwa-Stratowicza, A. Robacha. Wyd. 3. Wrocław, 2011 і інш.

[5] Frayser S. G. Discovering the Value of Cross-Cultural Research on Human Sexuality // Handbook for Conducting Research on Human Sexuality / Ed. M. W. Wiederman, B. E. Whitley, Jr. Mahwah. London, 2002. P. 441.

сці чалавечага грамадства. Але найперш гэта сацыяльны і культурны феномен[6]. Акцэнтаванне ўвагі на тым, што сексуальнасць утрымлівае сацыяльнае вымярэнне, мае важнае значэнне. Кожнае грамадства стварае свае нормы паводзінаў, адпаведна яны датычацца сексу. У залежнасці ад накіраванасці соцыуму будзе абірацца стратэгія ў галіне кантролю ў інтымнай сферы. Патрыярхальнае грамадства стварае жорсткую канструкцыю, дзе сістэма падаўлення і пакаранняў адыгрывае значную ролю. У большай ступені тут кантралюецца жаночая сексуальнасць.

Сучасныя даследчыкі вымяраюць сексуальнасць у чатырох аспектах: біялагічным, сацыяльным, культурным і псіхалагічным. Звяртаецца ўвага, што кожны з іх мае свой кампанент вывучэння для біёлага, сацыёлага, антраполага і псіхолага[7]. У гістарычным кантэксце такое разуменне сексуальнасці таксама мае сэнс, бо яно дае магчымасць вывучаць такія накірункі, як разуменне цела, сацыяльны і культурны кантэкст развіцця сексу, успрыняцце асобай сексуальнай сферы жыцця.

Сексуальнае жыццё немагчыма разглядаць як асобную з'яву без уліку шматлікіх фактараў, якія ўплываюць на ўсе яго праявы, фармуючы вобразы, ідэалы, стэрэатыпы. Польскі сексолаг Казімір Імелінскі вылучыў чатыры такіх асноўных фактары. Першы – гэта развіццё грамадства і падзел яго на класы, дзе мае значэнне, якое месца займае ў гэтым грамадстве кабета, які статус у мужчыны і жанчыны, бо гэты фактар уплывае на роўнасць мужчыны і жанчыны як партнёраў. Другі – гэта роля рэлігіі ў дадзеным грамадстве і часе. Аўтар надаў увагу адносінам рэлігіі да статусу жанчыны ў шлюбе, грамадстве і сексе. Трэцім фактарам ён лічыў узровень развіцця медыцыны. Але навуку рабілі мужчыны, і таму жанчына паказана іх вачыма, і яе сексуальнасць прыстасоўваецца да мужчынскай. І чацвёрты фактар – гэта адносіны грамадства да сексу: звычаі, традыцыі, мараль, пакаранне[8].

Падыходы Імелінскага ў большай ступені можна выкарыстаць пры вывучэнні гісторыі інтымных адносінаў. Для перыяду XVI–XVII стст. немагчыма разглядаць феномен сексу без кантэксту эпохі, падзелу грамадства, рэлігіі, статусу жанчыны і стану развіцця навукі.

Варта адзначыць яшчэ адзін істотны момант пры вывучэнні сексуальнасці, на які звярнуў увагу французскі сацыёлаг П'ер Бурдз'ё, – гэта супрацьдзеянне, нават супрацьстаянне мужчынскага і жаночага, якое зыходзіць з біялагічнай рознасці. Мужчынскае і жаночае цела адрозніваецца ва ўсім: позах, жэстах, манерах і інш. Гэта накладае свой адбітак на ўсе сферы жыцця: ад сацыяльнага ладу да побыту. Супрацьстаянне мужчынскага і жаночага ўваходзіць непасрэдным чынам у сексуальную сферу. У якасці прыкладу прыводзіцца стаўленне кабульскіх мужчын да жаночага аргазму. Іх ніколі не турбавала задавальненне жанчын, але яны заўсёды шукалі сатысфакцыю сваіх сексуальных патрэб[9]. Але афганскія мужчыны ў гэтым не ўнікальны.

---

[6] Говард М. Сучасная культурная антрапалогія. Мінск, 1995. С. 210.

[7] Frayser S. G. Discovering the Value of Cross-Cultural Research. P. 427–431.

[8] Imieliński K. Kobieta i seks. Warszawa, 1989. S. 100–101.

[9] Bourdieu P. The Logic of Practice / Translated by R. Nice. Stanford, 1990. P. 70–78.

Праца П'ера Бурдз'ё прысвечана ў першую чаргу логіцы практыкі. Закранае яна розныя аспекты. Адносна сексуальнай сферы варта звярнуць увагу на тое, што секс найперш практычнае дзеянне, а пасля ўжо тэарэтычнае. Тэарэтычныя развbooжанні на гэту тэму з'явіліся не адразу. Як практыка секс мае сваю ўнутраную логіку. Зразумела, што яна будзе розная для мужчыны і жанчыны. Гэта дуалістычная сістэма супрацьстаяння была ўлічана Робертам Нэем пры даследаванні мужчынскасці ў Францыі, які аднёс сексуальную ідэнтычнасць да *натуральнай якасці,* якая адлюстроўваецца ў целе і яго жэстах[10].

На сённяшні дзень секс стаў шматграннай з'явай. Ён мае сваю філасофію, культуру, псіхалогію, псіхааналіз, фізіялогію. Мы разглядаем секс як натуральную біялагічную з'яву, неабходную для чалавечай прыроды, без асуджэння, дэманізацыі і ідэалізацыі. У гэтым кантэксце, каб быць зразумелымі, феномен сексу можна параўнаць з халоднай зброяй. Так, нож можна выкарыстаць для рамяства, гатавання ежы і нават для забойства. Галоўнае, у чыіх руках ён знаходзіцца і як яго выкарыстоўваюць. З сексам тое самае: ён можа быць для задавальнення, працягу роду, пакарання, прыніжэння і інш. Як зброяй, так і сексам трэба вучыцца карыстацца. Ён па сваёй сутнасці ні дрэнны, ні добры. Праблема палягае ў людзях, іх стаўленні і мэтах дзеянняў.

Секс з'яўляецца важнейшым кампанентам у грамадстве і выконвае шэраг істотных функцый, якія неабходныя для яго існавання. Адзначым некаторыя з іх:

- жыццестваральная: асноўны шлях для працягу роду;
- сакральная: сексуальныя дачыненні паміж мужчынам і жанчынай мелі містычны характар, набліжалі іх да прыроды, сімвалізавалі забеспячэнне дабрабыту і ўрадлівасці ў земляробчых культурах. Такое значэнне набываў секс падчас такіх святаў жыцця, як Русалле, Купалле. З прыходам хрысціянства прыродная сакральнасць была заменена на каханне Хрыста і Царквы, але язычніцкія вераванні гэта не змагло знішчыць;
- функцыя расслаблення: адзін з самых эфектыўных сродкаў адпачынку, зняцця напружанасці і атрымання фізіялагічнага задавальнення;
- камунікатыўная: базісныя адносіны паміж мужчынам і жанчынай;
- культурная: стварае цэлую сістэму культурных з'яў (літаратура, мастацтва, этыкет і інш.);
- адукацыйная: вучыць разумець фізіялагічныя асаблівасці цела, спрыяе развіццю навукі, у прыватнасці медыцыны;
- тэрапеўтычная: з'яўляецца прафілактыкай або лячэннем пры пэўных захворваннях;
- уладная: непасрэдна звязана з падпарадкаваннем і дамінаваннем, асабліва ў феадальным грамадстве, кантралюе паводзіны ў сексуальнай сферы мужчыны і жанчыны праз розныя сродкі: жаданне, гвалт, прымус, сорам і інш.;
- статусная, ці рэпутацыйная: у залежнасці ад тыпу паводзінаў стварае рэпутацыю. Пры гэтым павышаная сексуальная актыўнасць для мужчыны

[10] Nye R. A. Masculinity and Male Codes of Honor in Modern France. Studies in the History of Sexuality. Oxford, 1993. P. 4–10.

і жанчыны трактуецца па-рознаму. Прафесійны занятак сексам прыводзіць да вылучэння ў маргінальную катэгорыю;

- разбуральная для асобы: праяўляецца пры ўжыванні гвалту, паталагічных стасункаў. Прыводзіць да псіхічных адхіленняў, псіхалагічных траўмаў, якія не заўсёды лечацца. Разбуральнае ўздзеянне таксама прасочваецца пры венерычных захворваннях;
- разбуральная для грамадства: праяўляецца пры табуіраванні ці стварэнні культу сексу; і тое, і другое аднолькава разбуральнае. Выпадак першы яскрава бачны ў часы Сярэднявечча ў Еўропе, пурытанства ў Англіі, а другі – падчас існавання Рымскай імперыі, а таксама калі Асветніцтва панавала ў Еўропе і Рэчы Паспалітай. Сітуацыя значна ўскладняецца, калі ў грамадстве адсутнічае магчымасць для абмеркавання і дыскусіі праблемы сексу, бо прыводзіць да з'яўлення паталагічных стэрэатыпаў, якія разбураюць грамадства. Не менш падрываюць асновы грамадства эпідэміі, звязаныя з венерычнымі захворваннямі.

Такім чынам, секс уяўляе сабой складаную філасофска-фізіялагічную з'яву. Зыходзячы з гэтага, мэта дадзенай працы – разгледзець секс і сексуальныя дачыненні ў сацыяльным, культурным і фізіялагічным вымярэнні. Таму для поўнага даследавання тэмы звернута ўвага на наступныя аспекты: культуру сексуальных стасункаў ВКЛ у кантэксце культуры Еўропы і суседніх краін, мужчынскія і жаночыя ідэалы, адносіны паміж мужчынам і жанчынай, літаратуру пра каханне і секс, візуалізацыю цела ў мастацтве, медыцыну, гігіену, уяўленне пра цела, практыку старабеларускага сексу, законныя і незаконныя інтымныя стасункі, прастытуцыю, згвалтаванні. Па сутнасці, секс даследуецца як складаная канструкцыя – ад уяўленняў да адхіленняў.

Наколькі актуальна вывучэнне сферы інтымных адносінаў ВКЛ у навуцы? Ці варта агаляць гісторыю Беларусі і паказваць прыкрыты цемрай бок жыцця? На наш погляд, гэта даўно варта было зрабіць, бо гісторыя без сексу выглядае не "чыстай", а кастрыраванай, быццам бы беларусы памнажаліся не праз натуральныя стасункі, а праз капусту.

Адзначым, што гістарыяграфія па гэтай тэме прадстаўлена адзінкавымі працамі і канцэптуальна феномен сексу ў XVI–XVII стст. не даследаваўся[11]. Намі закраналіся пазашлюбныя стасункі шляхты ў манаграфіі, прысвечанай шлюбу. Аднак тут увага была засяроджана на асноўнай тэме, а секс выступаў як адзін з элементаў шлюбных стасункаў[12]. У артыкулах разглядаюцца асобныя тэмы: прастытуцыя, згвалтаванні і адхіленні ад тагачаснай нормы[13]. Але пры гэтым

[11] Kuchowicz Z. Miłość Staropolska. Łódź, 1982; Terra Alba. Т. 2. Homo venerus: Сексуальная прастора беларускай культуры / Пад рэд. С. І. Даніленкі. Мінск, 2001; Tereškinas A. Kūni žymės: seksualumas, identitetas, erdve Lietuvos kultūroje. Vilnius, 2001. P. 25–63; Лобач У. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры // Studia Mythologica Slavica. VI – 2003. С. 205–247.

[12] Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ у XVI–XVII стст. Смаленск, 2015.

[13] Сліж Н. Сексуальнае жыццё шляхты Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст. // Terra Alba. Т. 2. Homo venerus: Сексуальная прастора беларускай культуры / Пад. рэд. С. І. Даніленкі. Мінск, 2001. С. 138–167; Сліж Н. Мараль і норавы вялікага князя і шляхты ў эпоху Жыгімонта Аўгуста //

даследаванне сексуальных дачыненняў застаецца малавывучаным аспектам і патрабуе далейшых навуковых распрацовак.

Заўважым, што інтымная сфера даволі спецыфічная і складаная для вывучэння. У савецкі перыяд займацца падобнай тэматыкай было проста немагчыма. Пасля 1991 г. больш важнымі сталі тэмы, звязаныя з палітыкай, саслоўнай гісторыяй ды інш. Акрамя таго, вывучэнне сексу як феномена патрабуе ведання не толькі фізіялогіі працэсу, але і заканадаўства, асаблівасцей побыту саслоўяў, культуры і рэлігіі і ўмення зразумець узаемасувязь тэндэнцый. Таму даследаванне сексу як культурнай і сацыяльнай з'явы адносіцца да складанай працы і патрабуе адпаведнай кваліфікацыі.

Крыніцазнаўчая база даследавання даволі шырокая: заканадаўчыя акты, прыватна-прававыя крыніцы, судовыя кнігі, апавядальныя крыніцы, літаратура, паэзія, візуальныя крыніцы. Аднак пры іх аналізе варта звяртаць увагу, што многія з іх не гавораць пра сексуальнасць і практыку сексу адкрыта. Таму не на ўсе пытанні можна знайсці адказы. Аўтарамі многіх крыніц былі мужчыны, таму там прыведзены непасрэдна іх погляд[14]. У працы дэманструюцца фрагменты з розных крыніц; як правіла, яны цытуюцца на мове арыгінала.

У даследаванні мы імкнуліся ахапіць усе саслоўі, наколькі гэта было магчыма. Аднак крыніцы ў большай ступені датычаць шляхты. Адносна мяшчан больш дакументаў захавалася з гарадоў з магдэбургскім правам, але далёка не паўсюль захаваліся магістрацкія кнігі. Найгорш сітуацыя выглядае з сялянамі, бо ў гэтым саслоўі ў сувязі з неадукаванасцю і прававой абмежаванасцю не было прыватна-прававых дакументаў. Большасць звестак пра сялян падаюць людзі іншых саслоўяў.

Рэгуляванне стасункаў у інтымнай сферы паміж мужчынам і жанчынай прадстаўлены ў наступных *заканадаўчых крыніцах:* Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг.[15], соймавыя пастановы[16]. Акрамя таго, у гарадах кіраваліся Вайхбільдам (Ius municipale) і Саксонскім Люстрам (Speculum Saxonum). Абодва помнікі права функцыянавалі ў судовай практыцы. Яны былі ўключаны ў Статут

Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, Гальшаны, Навагрудак, 2006). Мінск, 2007. С. 207–216; Сліж Н. Згвалтаванні ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII ст.: заканадаўства і судовая практыка // Соціум. Альманах соціальної історії. Київ, 2015. Вип. 11–12. С. 91–103; Сліж Н. Забароненыя і ненатуральныя сексуальныя стасункі ў ВКЛ у XVI–XVII стст. // Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зб. навук. арт. Ч. 2. Мінск, 2017. С. 247–266; Сліж Н. Прастытуцыя ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI–XVII стст. // Соціум. Альманах соціальної історії. Київ, 2017. Вип. 13–14. С. 113–126.

[14] Karras R. M. Seksualność w średniowiecznej Europie. S. 22–36.

[15] Статут Великого княжества Литовского 1529 / Под ред. К. И. Яблонскиса. Минск, 1960; Первый Литовский Статут (1529 г.) / С. Лазутка, И. Валиконите, Э. Гудавичус. Вильнюс, 2004; Статут Великого князьства Литовского 1566 года и поправы статутовые 1578 года // Временник Московского о-ва истории и древностей российских. 1855. Кн. 23. С. 1–242; Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. Мінск, 2003; Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года: Тэксты. Давед. Камент. / Рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. Мінск, 1989.

[16] Volumina legum. Przedruk zbioru praw, staraniem xx.pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782 wydanego. T. I–III. Prawa, konstytucye y przywileje królestwa Polskiego, Wielkiego Xięstwa Litewskiego y wszystkich prowincyi należących na walnych seymiech koronnych od seymu wiślickiego roku pańskiego 1347 aż do ostatniego seymu uchwalone. Petersburg, 1859.

Ласкага 1506 г.[17] Афіцыйна ў прававую сістэму Польшчы ўвайшлі лацінскамоўныя апрацаванні Саксонскага Люстра і Вайхбільда Мікалая Яскера[18]. Яны былі зацверджаны ў 1535 г. Жыгімонтам Старым і таксама мелі распаўсюджанне ў Вялікім Княстве. Важнымі для судовай практыкі ў гарадах сталі працы на польскай мове Барталамея Граіцкага і Паўла Шчэрбіца[19]. У практыцы таксама выкарыстоўвалі Крымінальны кодэкс Караліна[20], які ўтрымліваў шэраг артыкулаў па пакаранні за неадпаведныя і ненатуральныя сексуальныя адносіны.

Выкананне ці адыход ад заканадаўчых нормаў ілюструюць *прыватна-прававыя дакументы*. Да іх адносяць тастаменты, даравальныя запісы, судовыя справы ды інш. Часткова дадзеныя крыніцы надрукаваны ў разнастайных зборніках. Прыватна-прававыя дакументы ўваходзілі ў склад архіваў шляхецкіх сем'яў і архіваў дзяржаўных устаноў. Сямейныя архівы мяшчан практычна не захаваліся. Прыватныя калекцыі, якія дайшлі да нас, знаходзяцца ў фондах айчынных і замежных архіваў. Асноўныя дакументы змешчаны ў Метрыцы ВКЛ, кнігах ваяводаў і іх намеснікаў, замкавых, гродскіх, земскіх і трыбунальскіх кнігах. Скаргі, звязаныя з правапарушэннямі, як правіла, разглядаў гродскі суд. У гарадах дзейнічалі бурмістраўска-радзецкі, войтаўска-лаўніцкі, войтаўскі, крымінальны суды. Але ў кожным горадзе гэта сістэма мела свае асаблівасці. Канфліктнымі сітуацыямі займаўся войт і войтаўска-лаўніцкі суд, а пры неабходнасці збіраўся крымінальны суд. Справы, якія мелі міжсаслоўны характар, часцей траплялі да судоў шляхты. Найменш прадстаўлены ў дакументах сяляне. У іх не было прынята і не патрабавалася заканадаўствам весці прыватна-прававыя дакументы. Нешматлікія звесткі пра гэта саслоўе даходзяць з копнага суда, часам з гродскага і земскага.

---

[17] Łaski J. Commune incliti Poloniae Regni Privilegium Constitutionum et indultuum publicitus decretorum approbatorumque. Cum nonnullis iuribus tam Divinis quam humanis per Serenissimum principem et dominum Alexandrum Dei gratia Regem Polonie, magnum ducem Lithuanie, Russie, Prusieque dominum et heredem etc. Cracovia, 1506.

[18] Jasker N. Juris provincialis quod Speculum Saxonum vulgo nuncupatus libri tres opera vigilanti in correctiorem redacti materiam, adjuncti simul glossis aliisque additionibus noviter reccollectis pro interpraelatione textus magis neccessariis Annotatainsuper in marginibus habentur loca legum Jurisque municipalis Magdeburg. Cracoviae, 1535; Jasker N. Juris Municipalis Majdeburgensis Liber vulgo Weichbild nuncupatus ex vetustissimis exemplaribus vigilanti opera nuper latinitatis datus, summaque diligentia recognitus, adjunctis simul glossis et lextus interpretationibs ad id necessariis. Cracoviae, 1535.

[19] Szczerbic P. Speculum Saxonum Albo Prawo Saskie y Maydeburskie porządkiem obiecadła z Lacińskich y Niemieckich exemplarzow zebrane. Lwów, 1581; Szczerbic P. Ius municipale, to jest prawo miejskie majdeburgskie, nowo z łacińskiego i z niemieckiego na polski język z pinością i wiernie przełożone / Wydał G. M. Kowalski. Kraków, 2011; Groicki B. Artykuły prawa majdeburskiego. Postępek sądów około karania na gardle. Ustawa płacej u sądów. Warszawa, 1954; Groicki B. Porządek sądów i spraw mieyskich prawa majdeburgskiego w Koronie Polskiej. Kraków, 1630 / Wyd. K. Koranyi. Warszawa, 1953.

[20] Крымінальны кодэкс Караліна (Constitutio Criminalis Carolina) быў выдадзены ў 1532 г. з ініцыятывы імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Карла V. У яго аснову пакладзена рымскае права. Дзейнічаў як асноўны звод нормаў па крымінальным праве. Поўны склад мае 219 артыкулаў, а ў Граіцкага – 91. Koranyi K. Wstęp // Groicki B. Artykuły prawa majdeburskiego. Postępek sądów około karania na gardle. Ustawa płacej u sądów. Warszawa, 1954. S. VII–VIII; Jarouschek G. Carolina Code // Encyclopedia of Witchcraft. The Western Tradition. Vol. 1: A–D / Ed. R. M. Golden. Santa Barbara; Denver; Oxford, 2006. P. 168–169.

Не менш важнымі для вывучэння інтымнай сферы жыцця з'яўляюцца *апавядальныя крыніцы.* Да іх адносяцца летапісы, сямейныя хронікі, мемуарная літаратура, літаратурна-публіцыстычныя творы, рэлігійная літаратура[21].

Пра стасункі паміж мужчынам і жанчынай шмат інфармацыі ёсць у візуальных крыніцах. Гэта карціны, малюнкі, іконы, гравюры, унутранае ўбранне храмаў. Яны даюць непасрэднае ўяўленне пра выгляд тагачасных людзей, іх ідэалы. Заўважым, што прадставіць цалкам тэндэнцыі не заўсёды падаецца магчымым па прычыне знішчэння многіх прыватных калекцый і храмаў падчас войнаў і рабавання ў перыяд Расійскай імперыі і Савецкага Саюза.

Звернем увагу на ўжыванне тэрміналогіі. У дадзенай працы выкарыстоўваецца тэрмін "старабеларускі секс". Сам тэрмін "старабеларускі" даўно ўвайшоў ва ўжытак у гістарыяграфіі для вызначэння многіх з'яў і працэсаў культуры XVI–XVII стст. Секс мае непасрэднае дачыненне да культуры Вялікага Княства, таму абсалютна правамерна выкарыстоўваць згаданы тэрмін.

Тэрмін "секс" ужываецца для акрэслення фізічных стасункаў паміж мужчынам і жанчынай, як сінонім – "інтымныя стасункі". Заўважым, што сам тэрмін "секс" – гэта сучаснае і мадэрнізаванае абазначэнне. У перыяд XVI–XVII стст. ён не выкарыстоўваўся на нашых землях. У прадмовах Францыска Скарыны знаходзім словы "любодеяние", "кохания", "кохать"[22]. Адносна кахання ў шлюбе часта ўжывалася "милость малженская". У старабеларускую мову былі ўзяты з царкоўнаславянскай словы "блуд" і "блядь", адпаведна яго вытворныя "блудить" і "блядить", з польскай – "вшетечничество (wszeteczniczestwo)", "вшетечница (wszetecznica)", "спросноcць (sprosność)", што азначала "распуста", "распусніца", "непрыстойнасць, распуста", з лацінскай – "венус (venus)", што азначала сексуальныя дачыненні. У старабеларускай мове не было адпаведніка для слова "прастытуцыя". Заканадаўства і судовая практыка трактавала як распусніц прастытутак і жанчын амаральных паводзінаў. У вульгарнай літаратуры для азначэння фізіялагічнага кантакту ўжывалася слова "jebać" і яго вытворныя[23].

У працы ў асноўным разглядаюцца сексуальныя кантакты як фізіялагічныя кантакты паміж асобамі супрацьлеглага полу. Іх можна ўмоўна класіфікаваць у адпаведнасці з іх працягласцю і перыядычнасцю. Трывалыя кантакты здзяйсняюцца, як правіла, у венчаным і нявенчаным шлюбе, паміж каханкамі з доўгатэрміновай сувяззю. Перыядычныя стасункі адбываюцца час ад часу ў шлюбе (напрыклад, калі сужэнцы па розных прычынах не маюць магчымасці часта бачыцца), паміж каханкамі, для якіх дастаткова эпізадычных сустрэч. Разавыя кантакты маюць выпадковы характар, для задавальнення раптоўнага жадання.

У сувязі з гэтым падзелам варта звярнуць увагу на выбар партнёра ці партнёркі. У трывалых дачыненнях ад другога боку патрабуецца больш і ад выгля-

---

[21] Больш дэталёвую характарыстыку крыніц гл.: Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 20–24.

[22] Францыск Скарына і яго час. Мінск, 1988. С. 51–52.

[23] Rabowicz E. Oświeceniowe "przewodniki" po warszawskich domach rozkoszy // Zeszyty Naukowe Wydziału Humanistycznego Uniwersytetu Gdańskiego. Dodatek do prac historycznoliterackich. 1985. № 8–9. S. 50.

ду, і ад якасцей характару. Не апошнюю ролю адыгрываюць пачуцці і эмоцыі. Пры разавым кантакце патрабаванні значна змяншаюцца ці нават адсутнічаюць. Такім чынам стасуюцца з прастытуткамі, жанчынамі свабодных паводзін, пры згвалтаванні, пры выпадковай сітуацыі.

Часткова закранаюцца ў працы аднаполыя сексуальныя кантакты і заафілія. Аднак яны на той час мелі маргінальнае значэнне, іх нельга ўпісваць у агульны культурна-сацыяльны кантэкст.

Праца ахоплівае перыяд XVI–XVII стст., калі панавалі дзве важныя эпохі: Рэнесанс і барока. Яны зрабілі непасрэдны ўплыў на ўяўленні пра адносіны паміж паламі, на вобраз мужчыны і жанчыны. Аднак у некаторых выпадках мы вымушаны звяртацца да фактаў больш ранейшага і пазнейшага перыядаў. Тэрытарыяльна даследаванне мае дачыненне да Вялікага Княства Літоўскага.

Манаграфія складаецца з 11 раздзелаў. Першы раздзел *Развіццё сексуальнай культуры ВКЛ у кантэксце еўрапейскіх і суседніх краін* прадстаўляе культуру сексу ВКЛ у рэчышчы развіцця і ўзаемадзеяння з культурамі суседніх краін. У другім раздзеле *Ідэальныя вобразы мужчыны і жанчыны часоў Рэнесансу і барока* разглядаюцца ўяўленні пра мужчыну і жанчыну ў розных саслоўях. Трэці раздзел *Адносіны паміж мужчынам і жанчынай: нормы і іх парушэнні* апавядае пра віды стасункаў, пра тое, на чым яны базаваліся. Чацвёрты раздзел *Літаратура пра секс і адносіны мужчын і жанчын* прысвечаны літаратурным творам, якія звярталіся да адпаведнай тэмы. У пятым раздзеле *Позірк мастацтва на цела* паказаны выяўленчыя крыніцы, у якіх адлюстраваліся асаблівасці ўспрымання мужчынскага і жаночага цела. Шосты раздзел *Медыцына пра мужчынскае і жаночае цела* характарызуе ўзровень развіцця медыцыны і медыцынскія веды пра цела. У сёмым раздзеле *Цыкл жыцця грэшнага цела і догляд яго* разглядаецца, як разумелася цела, цыкл яго біялагічнага існавання, як стаўленне змянялася ў залежнасці ад полу і ўзросту і як адбываўся догляд. Восьмы раздзел *Практыка старабеларускага сексу* прысвечаны тэхнікам сексу, якія практыкаваліся ў ВКЛ. У дзявятым раздзеле *Забароненыя і ненатуральныя сексуальныя стасункі* аналізуюцца з пункту гледжання рэлігіі і закону. Дзясяты раздзел *Сексуальныя паслугі за грошы* прысвечаны сексуальным паслугам за фінансавую ўзнагароду. Апошні, адзінаццаты, раздзел *Гвалт над целам і воляй* акцэнтуе ўвагу на выкарыстанне прымусу і гвалту ў сексе і адносінах.

Хачу выказаць падзяку маім калегам, якія дапамаглі ў працы над гэтай кнігай з крыніцамі і літаратурай: супрацоўнікам Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі к. г. н. Дзянісу Лісейчыкаву, Людміле Івановай, Альбіне Аляксандравай, даследчыкам Герману Брэгеру, к. г. н. Ганне Паўлоўскай, к. г. н. Ірыне Герасімавай, к. г. н. Валерыю Ластоўскаму, Андрэю Ціхаміраву, пісьменніку Алесю Аркушу.

# 1. Развіццё сексуальнай культуры ВКЛ у кантэксце еўрапейскіх і суседніх краін

Вялікае Княства Літоўскае ў XVI–XVII стст. існавала ў кантакце з шматлікімі краінамі. Гэта непасрэдным чынам уплывала на палітычную, эканамічную, культурную, рэлігійную сітуацыю ў дзяржаве. Пры гэтым знешняе ўздзеянне было рознай ступені і закранала розныя бакі жыцця. Не абмінуў гэты ўплыў і інтымную сферу. Секс з'яўляецца не толькі фізіялагічным дзеяннем, але і сродкам камунікацыі. Таму для разумення камунікатыўных працэсаў і кантэксту, у якім існавала Вялікае Княства Літоўскае, у дадзеным раздзеле прыводзіцца агульная характарыстыка еўрапейскіх і іншых краін. Перавага надаецца апісанню гендэрных адносінаў у іх: традыцый, звычаяў, стэрэатыпаў, ідэалаў. Асобным аспектам праходзіць сувязь Вялікага Княства з гэтымі краінамі і стаўленне да іх.

*Еўропа.* Заходняя Еўропа стала галоўным цэнтрам, дзе ўзнікалі важныя культурныя і рэлігійныя плыні. Культурныя тэндэнцыі мелі шырокі спектр уплыву: ад эканомікі да гендэрных стэрэатыпаў і адносінаў. У Сярэднявеччы высокі кантроль духавенства над прыватнай сферай жыцця прывёў да дыскрымінацыі жанчын, паляванняў на ведзьмаў. Зменшыла гэта негатыўнае стаўленне ўвядзенне культу Дзевы Марыі. А глытком паветра сталі рыцарскі раман і песні трубадураў, якія ўхвалялі гетэрасексуальныя дачыненні[1].

XVI–XVII стагоддзі праходзяць у еўрапейскіх краінах пад уплывам вялікіх змен. Яшчэ з сярэдзіны XV ст. Італія абуджаецца ад гатычнага Сярэднявечча і ўступае ў перыяд Адраджэння. Яго духоўным цэнтрам стала Фларэнцыя. Эпоха па праве лічыцца адметнай і рэвалюцыйнай. Яна адыходзіць ад фанатычнай рэлігійнасці, але працягвае захоўваць адносіны з ёй. Рэнесанс прынёс не толькі новыя імёны ў мастацтва, але і вынаходніцтвы, тэхнічны прагрэс, эканамічнае развіццё, геаграфічныя адкрыцці. Спадчына антычнасці стала крыніцай натхнення для дзеячаў Адраджэння. Культ прыгожага цела, вядомы ў культуры Старажытных Грэцыі і Рыма, адлюстраваўся ў шматлікіх творах італьянскіх мастакоў[2]. Адбылі-

[1] Тэннехилл Р. Секс в истории / Пер. с англ. А. И. Блейз. Москва, 1995. С. 240–266; Tin L. G. Początki kultury heteroseksualnej w cywilizacji Zachodu / Przetł. O. Hedemann. Kraków, 2008. S. 15–54, 83–107; Karras R. M. Seksualność w średniowiecznej Europie / Przełoż. A. Bugaj. Warszawa, 2012.

[2] Лихт Г. Сексуальная жизнь в Древней Греции. Москва, 1995; Тэннехилл Р. Секс в истории. С. 77–125.

ся змены ў падыходзе да асобы: сярэднявечнае безаблічча саступіла антрапацэнтрызму. Эпоха, якая пачалася з Італіі, ахапіла іншыя заходнія краіны[3].

Змены не абмінулі рэлігійнае жыццё. З сярэдзіны XV ст. каталіцызм знаходзіўся ў крызісе. Распуста духавенства ў Ватыкане дасягнула нечуваных памераў. Гэта паказвала на неабходнасць рэфармавання. Трыдэнцкі сабор стаў адказам на рэфармацыйны рух[4], які пачаўся з Нямеччыны і ахапіў еўрапейскія краіны[5]. Аднак у XVII ст. шалі вагаў пахіснуліся ў іншы бок[6]. Праз дзейнасць езуітаў прыходзіць Контррэфармацыя, якую суправаджае барока[7].

Погляды на стасункі паміж мужчынам і жанчынай у еўрапейскіх краінах развіваліся пад уплывам адзначаных эпох. Калі Рэнесанс характарызаваўся разняволенасцю, то барока – стрыманасцю. Варта заўважыць істотную рэч. Эпохі стваралі вонкавую абалонку існавання грамадства, усталёўвалі нормы паводзінаў і стасункаў. Аднак гэта не азначала, што на гэтыя нормы заўсёды арыентаваліся ў жыцці.

Трэба адзначыць, што адносіны паміж мужчынам і жанчынай вызначаліся ў значнай ступені тым, да якога саслоўя яны належалі. Стратыфікацыя грамадства паводле паходжання і заможнасці непасрэдным чынам уплывала на шлюбныя і сямейныя стратэгіі[8]. Вышэйшае грамадства існавала ў вызначаных нормах маралі і этыкету, але мела кантакты з народнай культурай у неабходнай для яго меры. Пры гэтым доступ да культуры эліты звычайным людзям быў абмежаваны. Народная культура не была звязана з жорсткімі ўмоўнасцямі. У ёй знаходзілася месца для фрывольных спеваў і карнавалаў як праявы сексуальнай культуры, кірмашоў, корчмаў, танцаў, ірацыянальных вераванняў і інш.[9] Гарады займалі асобнае месца як палітычныя, эканамічныя, адукацыйныя, культурныя, рэлігійныя цэнтры.

У еўрапейскіх краінах замацаваліся традыцыйныя патрыярхальныя адносіны паміж мужчынам і жанчынай. Мужчына меў прыярытэт у дзейнасці палітычнай, эканамічнай, рэлігійнай, культурнай. Сферай жанчыны заставаліся сям'я і дом.

[3] Пра эпоху Адраджэння напісана вялікая колькасць прац. У дадзенай працы мы не маем намеру дэталёва прадставіць эпоху. Для агульнага разумення варта адзначыць кантэкст, у якім існавала ВКЛ. Пра перыяд гл.: Italy in the Age of the Renaissance 1300–1550 / Ed. J. M. Najemy. Oxford, 2004; Делюмо Ж. Цивилизация Возрождения / Пер. с франц. И. Эльфонд. Екатеринбург, 2006; Renaissance Theories of Vision / Ed. J. Shannon Hendrix, Ch. H. Carman. Great Britain, 2010; Tin L. G. Początki kultury heteroseksualnej. S. 55–79, 109–114.

[4] Kurzel-Runtscheiner M. Córy Wenus. Kurtuzany XVI-wiecznego Rzymu / Przeł. E. Ptaszyńska-Sadowska. Gdynia, 1998. S. 9–194; Делюмо Ж. Цивилизация Возрождения. С. 135–167.

[5] Kriegsiesen W. Stosunki wyznaniowe w relacjach państwo – kościół między reformacją a oświeceniem (Rzesza Niemiecka – Niderlandy Północne – Rzeczpospolita polsko-litewska). Warszawa, 2010. S. 81–131, 217–357.

[6] Strasser U. State of Virginity: Gender, Relation, and Politics in an Early Modern Catholic States. USA, 2004.

[7] Пра тэндэнцыі ў вывучэнні эпохі барока ў еўрапейскай і польскай гістарыяграфіі гл.: Nowicka-Jeżowa A. Barok polski między Europą a Sarmacją. Cz. 1: Profole i zaryzy całości. Warszawa, 2009–2011.

[8] Дюамель К. Семейные стратегии и социальное воспроизводство католического дворянства в XVII–XVIII вв. // Семья, дом и узы родства в истории / Под ред. Т. Зоколла, О. Кошелевой, Ю. Шлюмбума. СПб., 2004. С. 175–199; Тойшер С. Предписанное родство. Нормы и практики родственных отношений в Берне на рубеже XV–XVI вв. // Семья, дом и узы родства в истории. С. 200–242.

[9] Асаблівасці народнай культуры ў еўрапейскіх краінах прааналізаваны Пітэрам Бэркам. Burke P. Popular Culture in Early Modern Europe. New York; Hagesstown; San Francisco; London, 1994.

Безумоўна, жанчыны мелі магчымасць уплываць на некаторыя тэндэнцыі ў грамадстве, але ў даволі абмежаванай форме. У перыяд Адраджэння і барока жаночая праблематыка вельмі актыўна абмяркоўвалася ў еўрапейскіх краінах. Выходзілі выданні як шавіністычныя, так і феміністцкія. У параўнанні з Сярэднявеччам становішча жанчын палепшылася, але на іх статус уплывала саслоўная прыналежнасць, гендэрныя стэрэатыпы і ўзрост. Статус дзяцей быў значна ніжэйшы за статус дарослага[10].

Побач з усталяванымі ўзорамі сямейных адносінаў мелі месца жыццёвыя варыяцыі. Існавала індустрыя прастытуцыі як мужчынскай, так і жаночай[11]. Цэлібат духавенства не заўсёды захоўваўся[12]. Акрамя традыцыйных стасункаў у Еўропе былі вядомы і гомасексуальныя, да іх ставіліся як да граху і дэвіяцыі. Таксама трактаваліся і неўпарадкаваныя сексуальныя стасункі[13]. Злачынствы супраць маралі разглядаліся ў духоўных судах[14], а ў Фларэнцыі і іншых гарадах былі створаны спецыяльныя суды, якія займаліся справамі пра гомасексуалістаў, распусту, неадпаведныя сексуальныя дачыненні. Калі ў XVI–XVII стст. сувязь паміж мужчынамі трактавалася вельмі негатыўна, то ў XVIII ст. гомасексуалізм як з'ява пашыраецца, ствараюцца мужчынскія дамы. Лесбійскія стасункі ўспрымаліся больш спакойна. Тэматыка аднаполых адносінаў час ад часу ўзнікала ў літаратуры[15].

З еўрапейскіх краін самы моцны ўплыў на Вялікае Княства Літоўскае аказала Італія. Яе ўздзеянне было ў розных сферах: палітыка, эканоміка, культура, мастацтва, рэлігія. Італію наведвалі Радзівілы, Валовічы, Алелькавічы і іншыя прадстаўнікі шляхты[16]. Краіна выклікала сапраўдную цікавасць у жыхароў

---

[10] Пра сям'ю напісана шмат прац, напрыклад: Stone L. The Family, Sex, and Marriage in England, 1500–1800. New York; Hagerstown; San Francisco; London, 1977; Flandrin J.-L. Historia rodziny / Przetł. A. Kuryś. Warszawa, 1998; Арьес Ф. Ребенок и семейная жизнь при старом порядке / Пер. с фр. Я. Старцева. Екатеринбург, 1999; A History of Private Live / Ed. F. Ariès, G. Duby. Massachussetts; London, 1989; Bogucka M. Gorsza płeć. Kobieta w dziejach Europy od antyku po wiek XXI. Warszawa, 2005. S. 89–166; Malinowska M. Situacja kobiety w siedemnastowiecznej Francji i Polsce. Warszawa, 2008. S. 15–55; Regional Variations in Matrimonial Law and Custom in Europe, 1150–1600 / Ed. M. Korpiola. Leiden; Boston, 2011; Sibling Relations and the Transformations of European Kinship, 1300–1900 / Ed. C. H. Johnson, D. W. Sabean. New York, 2011 і інш.

[11] Kurzel-Runtscheiner M. Córy Wenus; Martin A. L. Alcohol, Sex, and Gender in Late Medieval and Early Modern Europe. New York, 2001.

[12] Laven M. Sex and Celibacy in Early Modern Venice // The Historical Journal. 2001. Vol. 44. № 4. P. 865–888.

[13] Bingham C. Seventeenth-Century Attitudes toward Deviant Sex // Journal of Interdisciplinary History. 1971. Vol. 1. № 3. P. 447–468.

[14] Poos L. R. Sex, Lies, and the Church Courts of Pre-Reformation England // Journal of Interdisciplinary History. 1995. Vol. 25. № 4. P. 585–607.

[15] Wyrobisz A. Sodoma i Gomora we wczesnorenesansowej Florencji // Przegląd Historyczny. 1997. T. LXXXVIII. Zesz. 1. S. 145–162; Matthews-Grico S. Ciało i seksualność w Europe w czasach Ancien Régime'u // Historia ciała. T. 1: Od renesansu do oświecenia / Pod red. G. Vigarello. Przełożył T. Stróżyński. Gdańsk, 2011. S. 196–207.

[16] Скеп'ян А. Лісты маладых князёў Алелькавічаў з Італіі // Архіварыус. 2009. Вып. 7. С. 55–74; Сліж Н. Гісторыя роду Валовічаў на Гарадзеншчыне ў XV–XVII стст. // Гарадзенскі палімпсест 2012. Людзі даўняй Гародні / Пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. Гродна, 2013. С. 167; Wrześniak M. Włochy w relacjach polskich podrożnikow z XVI i XVII wieku // Saeculum Christianum: pismo

Княства, у бібліятэках нават былі шляхаводнікі па Італіі[17]. Акрамя таго, падтрымліваліся кантакты з Нямеччынай, Францыяй, Англіяй і іншымі краінамі. Так, Аляксандр Пронскі вандраваў па еўрапейскіх краінах, ведаў мовы, звычаі, культуру[18]. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка наказаў выправіць сыноў у вандроўку ў Італію, Іспанію і Францыю для пашырэння светапогляду, разумення свету, вывучэння моў[19]. Адукацыйныя вандроўкі карысталіся папулярнасцю сярод шляхты і мяшчан, хоць і каштавалі вельмі дорага[20].

Аднак атмасфера ў навучальных установах не заўсёды была навуковая. Ясь Лугоўскі падчас падарожжаў 1639–1643 гг. пісаў пра ўніверсітэт у Сене (Італія), што выкладчыкам там працаваць вельмі складана: студэнты ўвесь час крычаць, кідаюць камяні, сам універсітэт тоне ў брудзе, а на сценах паўсюдна можна пабачыць выявы мужчынскіх палавых органаў[21].

У сувязі з геаграфічным становішчам Вялікае Княства Літоўскае не адыгрывала значную ролю ў еўрапейскіх працэсах. Яно ўспрымала тэндэнцыі з Еўропы, спрабавала наблізіцца да вызначаных ідэалаў, але пераадолець адсталасць у галіне эканомікі і мастацтва так і не атрымалася. Для Еўропы ВКЛ, як і Польшча, было цікавае ў якасці сферы ўплыву і крыніцы сыравіны. Стаўленне як да раўназначнага партнёра не было.

*Каралеўская Прусія і Герцагства Прусія.* Каралеўская Прусія і Герцагства Прусія мелі агульнае мінулае, а ў XVI–XVII стст. займалі асобнае месца ў балтыйскім гандлі, мелі высокі ўзровень эканамічнага развіцця і сістэмы кіравання. Да Грунвальдскай бітвы 1410 г. Крыжацкі ордэн вёў даволі агрэсіўную палітыку ў дачыненні да Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Пасля перамогі сітуацыя стала мяняцца, пачалі наладжвацца гандлёвыя сувязі. Адпаведныя дамовы былі падпісаны ў 1415 і 1424 гг. Гданьск і Каралявец былі найважнейшымі эканамічнымі цэнтрамі. Яны выказвалі зацікаўленасць у сыравіне

historyczno-społeczne. 2005. № 12/1. S. 147–173; Quirini-Popławska D. Podróże polskich duchownych do Padwy w XV i XVI wieku; wstępne rozpoznanie // Itinera clericorum: Kulturotwórcze i religijne aspekty podróży duchownych / Pod red. D. Quirini-Popławskiej, Ł. Burkiewicza. Kraków, 2014. S. 225–254.

[17] У інвентары маёмасці, які быў складзены пасля смерці віленскага бурмістра Стэфана Лебядзевіча, згадваецца шляхаводнік Андрэя Скоцці (1649). Гэта папулярнае выданне ўтрымлівала інфармацыю пра мясціны Італіі і карты, выдавалася неаднаразова. Schotti A. Itinerarium nobiliorum Italiae regionum, urbium, oppidorum, et locorum: nunc seriò auctum, & tabellis chorographicis, & topographicis locupletatum. Vicentiae, 1600, 1601, 1610; Amstelodami, 1655. Frick D. Wilnianie. Żywoty siedemnastowiecznie. Warszawa, 2008. S. 190; Niedźwiedź J. Kultura literacka Wilna (1323–1655). Kraków, 2012. S. 116.

[18] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян / Пер. на рус. В. И. Матузовой; под ред. А. Л. Хорошевич. Москва, 1994. С. 58, 61.

[19] Archiwum domu Radziwiłłów. T. VIII. Kraków, 1885. S. 59.

[20] Пытанне замежных адукацыйных вандровак разглядалася ў розных працах: Żołądź-Strzelczyk D. Peregrinatio academica. Studia młodzieży polskiej z Korony i Litwy na akademiach i uniwersytetach niemieckich w XVI i pierwszej połowie XVII w. Poznań, 1996; Tygielski W. Na cóż te koszta i trudy? W jak im celu w XVII wieku wysyłano młodzież szlachecką // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. 2006. T. L. S. 141–155 і інш.

[21] Tygielski W. Europejskie inspiracje, czyli o dawnych "podrożach do szkoł w cudzych krajach" // Studia Europejskie. 2010. № 4. S. 19.

з Княства, а нашы купцы набывалі еўрапейскія і азіяцкія тавары на аптовых складах. У гандлёвую сістэму былі ўключаны Вільня, Коўна, Гародня, Берасце і іншыя гарады[22].

Менавіта праз гандлёвыя стасункі дзве Прусіі аказалі моцны ўплыў на Вялікае Княства. Выхадцы з Герцагства Прусія асядалі ў гарадах, займалі пасады, прыносілі з сабой сістэму адносінаў на падставе нямецкага права, а таксама ідэі рэфармацыйнага руху.

Дзве Прусіі таксама былі пад уплывам еўрапейскіх эпох. Гданьск і Каралявец былі асноўнымі культурнымі цэнтрамі. У Караляўцы быў заснаваны ўніверсітэт, дзе вучыліся сярод іншых і жыхары ВКЛ. Гэтыя гарады славіліся майстрамі, якіх запрашалі працаваць у ВКЛ. У сувязі з геаграфічным становішчам больш моцна дзве Прусіі ўплывалі на заходнюю частку Княства.

*Польшча.* Польскае Каралеўства мела непасрэдныя кантакты з Заходняй Еўропай. Згаданыя культурныя і рэлігійныя плыні знайшлі свой адбітак на тэндэнцыях у грамадстве[23]. На стасункі паміж мужчынам і жанчынай зрабіла моцнае ўздзеянне прыняцце каталіцызму. Рэлігійныя погляды на сям'ю і шлюб паўплывалі на заканадаўства, гендэрныя ідэалы, стаўленне да інтымнай сферы жыцця. Аднак гэта не ліквідавала канкубінат, шлюбныя здрады, прастытуцыю ды інш.[24] Каталіцызм застаўся пануючай рэлігіяй у Польшчы ў XVI–XVII стст. Толькі ў XVI ст. яго пазіцыі аслаблі ў сувязі з прыходам пратэстантызму, але ўзмацніліся з Контррэфармацыяй.

У гэтай феадальнай краіне існавала свая стратыфікацыя грамадства. Яно дзялілася на духавенства, шляхту, мяшчан і сялян. У грамадстве існавала патрыярхальная сістэма адносінаў з дакладна вызначанымі гендэрна-ролевымі функцыямі. Сямейныя і шлюбныя стасункі знаходзіліся пад уплывам каталіцызму[25]. Мастацтва ж развівалася ў рэчышчы Рэнесансу і барока.

---

[22] Daniłowicz I. Skarbiec dyplomatów papieskich, cesarskich, królewskich, książęcych. T. 1. Wilno, 1860. S. 282; T. 2. Wilno, 1862. S. 29, 31, 87; Jaroszewicz J. Obraz Litwy pod względem jej cywilizacji, od czasów najdwaniejszych do końca wieku XVIII. Cz. II. Wilno, 1844. S. 99–101; Gause F. Die Geschichte der Stadt Königsberg in Preussen. Bd. 1: Von der Gründung der Stadt bis zum letzten Kurfürsten. Köln, 1965; Mieleszko W. Handel i stosunki handlowe Białorusi Wschodniej z miastami nadbałtyckimi w końcu XVII i w XVIII wieku // Zapiski Historyczne. T. XXXIII. Zesz. 4. 1968. S. 53–90; Historia Pomorza. T. II: do roku 1815 / Pod red. G. Labudy. Poznań, 1976. S. 24–525; Małłek J. Dwie części Prus. Studia z dziejów Prus Książęcych i Prus Królewskich w XVI i XVII wieku. Olsztyn, 1987; Guldon Z., Wijaczka J. Związki handlowe ziem litewskich i białoruskich z Królewcem w świetle rejestrów celnych komory grodzieńskiej z lat 1600 i 1605 // Komunikaty Mazursko-Warmińskie. 1993. № 1. S. 21–31 і інш.

[23] Характарыстыка тагачаснай Польшчы як краіны, яе традыцыі і звычаі можна знайсці ў працы Марціна Кромэра. Kromer M. Polska czyli o położeniu, obyczajach, urzędach i Rzeczypospolitej Królestwa Polskiego xiąg dwoje / Tłum. W. Syrokomla. Wilno, 1853.

[24] Добра прааналізаваў тэндэнцыі ў сексуальнай сферы ў перыяд Сярэднявечча Адам Кравец у сваёй працы: Krawiec A. Seksualność w średniowiecznej Polsce. Poznań, 2000.

[25] Падрабязней пра сямейныя адносіны ў Польшчы гл.: Karpiński A. Kobieta w mieście polskim w drugiej połowie XVI i w XVII wieku. Warszawa, 1995; Bogucka M. Białogłowa w dawnej Polsce. Kobieta w społeczeństwie polskim XVI–XVIII wieku na tle porównawczym. Warszawa, 1998; Kobieta i rodzina w średniowieczu i na progu czasów nowożytnych / Pod red. Z. H. Nowaka, A. Radzimińskiego. Toruń, 1998; Popiołek B. Kobiecy świat w czasach Augusta II. Studia nad mentalnością kobiet z kręgów szlacheckich. Kraków, 2003; Żołądź-Strzelczyk D. Dziecko w dawnej Polsce. Poznań, 2002; Malinow-

На маральную сітуацыю ў грамадстве аказалі значны ўплыў такія рэлігійныя дзеячы, як Юзаф Верашчынскі і Пётр Скарга, якія выказваліся ў падтрымку шлюбу. Адам Гдацюш, лютэранскі святар, у сваім творы да граху адносіў прастытуцыю, распусту, шлюбную здраду, канкубінат, гомасексуалізм. Прычыну ён бачыў у Сатане, які схіляе да падзення, а спрыяльным фактарам лічыў алкаголь[26].

Штодзённае жыццё Польшчы не вызначалася толькі ўзорнымі паводзінамі, якія дыктаваліся каталіцызмам. Тут мелі месца злачынствы на сексуальнай глебе, пералюбы, дашлюбныя стасункі, сексуальныя паталогіі ды іншыя з'явы. Вышэйшае грамадства і блізкія да яго літаратары бавіліся літаратурай эратычнага, а часам і зусім непрыстойнага зместу[27].

З Польшчай ВКЛ мела даволі моцныя кантакты, асабліва пасля падпісання Люблінскай уніі 1569 г., калі ўтварылася канфедэратыўная краіна Рэч Паспалітая. Найбольшы ўплыў гэта мела на шляхту і мяшчан з заходніх гарадоў Княства. Яны паддаліся моцнаму ўздзеянню паланізацыі, якой актыўна садзейнічаў каталіцызм. У выніку гэта прывяло да занядбання старабеларускай культуры, змены самаідэнтыфікацыі і здрадніцкага стаўлення да нацыянальных інтарэсаў.

*Візантыя*. Варта адзначыць яшчэ адну краіну, якая моцна ўздзейнічала на Вялікае Княства Літоўскае, – Візантыйскую імперыю. Праз прынятае хрысціянства грэчаскага абраду да нас прыйшлі помнікі права, літаратура, мастацкія тэндэнцыі ды іншае, што адбілася на ўсіх сферах грамадскага жыцця. Візантыйская культура працягвала захоўваць свой уплыў нават пасля падзення Канстанцінопаля ў 1453 г.[28] Адлюстраванне візантыйскай культуры можна пабачыць у іконах, фрэсках Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы ў Полацку і інш.

Праз рэлігійную літаратуру Візантыя аказала моцнае ўздзеянне на фармаванне адносінаў паміж мужчынам і жанчынай паводле хрысціянскага ўзору. Датычыла гэта ўсталявання нормаў не толькі ў шлюбных стасунках, але і ў сексуальных паводзінах[29].

---

ska M. Situacja kobiety w siedemnastowiecznej Francji i Polsce. Warszawa, 2008; Krajewski R. Prawo i obowiązki seksualne małżonków. Studium prawne nad normą i patologią zachowań. Warszawa, 2009; Bogucka M. Między obyczajem a prawem. Kultura Sarmatyzmu w Polsce w XVI–XVII wieku. Warszawa, 2013; W kręgu rodziny epok dawnych. Dzieciństwo / Red. B. Popiołek, A. Chłosta-Sikorska, M. Cadocha. Warszawa, 2014 і інш.

[26] Wereszczyński J. Kazanie przy przyjmowaniu świątości małżeństwa. Kraków, 1585. S. 274–306; Skarga P. Kazania o siedmi Sakramientach Kościoła S. Katalickiego. Kraków, 1606. S. 165–183; Frejlich K. Grzechy seksualne w świetle kwestii i dyskursów Adama Gdacjusza // Przegląd Historyczny. 2011. T. CII. Zesz. 2. S. 241–255.

[27] Anonima-protestanta XVI wieku. Erotyki, fraszki, obrazki, epigramaty. Kraków, 1903; Kotarska J. Erotyk staropolski. Inspiracje i odmiany. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1980; Kuchowicz Z. Miłość Staropolska; Kamler M. Złoczyńcy. Przestępczość w Koronie w drugiej połowie XVI i w pierwszej połowie XVII wieku (w świetle ksiąg sądowych miejskich). Warszawa, 2010. S. 277–298; Wiślicz T. Upodobanie. Małżeństwo i związki nieformalne na wsi polskiej XVII–XVIII wieku. Wyobrażenia społeczne i jednostkowe doświadczenia. Wrocław, 2012 і інш.

[28] Гл. абагульняючую працу па тэме: Дзярнович О., Бырлэдяну В., Тимошенко Л. Сны о Византии? Место цивилизационного и культурного наследия Византии в регионе Пограничья Центрально-Восточной Европы. Вильнюс, 2014.

[29] Падрабязней гл.: Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 28–33, 265–332.

Аднак пасля захопу туркамі Канстанцінопаль перастаў быць духоўным цэнтрам для хрысціянства грэчаскага абраду. Хаця адгалоскі візантыйскай спадчыны яшчэ мелі свае праявы ў Княстве ў XVI–XVII стст., але гэта больш датычыла духавенства, чым свецкіх асоб. Культурная арыентацыя краіны змяніла напрамак на заходні.

*Асманская імперыя.* Асманская імперыя істотна адрознівалася ад еўрапейскіх краін сваім падыходам да адносінаў паміж мужчынам і жанчынай у сувязі з панаваннем мусульманскай рэлігіі[30]. Тут былі дазволены палігамныя шлюбы, распаўсюджаныя, праўда, сярод заможных асоб. Паняцці аб прыгажосці былі іншыя. У адрозненне ад еўрапейскай жанчыны ідэальная турэцкая жанчына мела тонкую талію, вялікія грудзі і шырокія клубы.

Асобна варта згадаць пра гарэм султана, які адыгрываў важную ролю ў жыцці краіны і нават уплываў на міжнародныя зносіны. Сюды куплялі здаровых і прыгожых жанчын з рынку нявольнікаў. Мусульманак браць было забаронена. Гарэм прыцягваў увагу замежных дыпламатаў і падарожнікаў, бо не меў аналагаў у еўрапейскіх краінах. Яго ўнутраная структура была іерархічнай з дакладна вызначанымі абавязкамі кожнай асобы. Сексуальнасць была непасрэдна звязана з уладай. А доўгатэрміновы паслясексуальны ўплыў жанчыны залежаў ад яе магчымасці нарадзіць сыноў. Самую фантастычную і яскравую кар'еру атрымалася зрабіць наложніцы Аляксандры (Анастасіі) Лісоўскай, вядомай як Раксалана ў Еўропе і як Хюрэм у Асманскай імперыі. Яна была вывезена татарамі са сваёй радзімы, з ваколіц Рагатына (цяпер тэрыторыя Украіны). Пасля нараджэння ў 1521 г. сына Мехмеда яна стала афіцыйнай жонкай султана Сулеймана. Менавіта яе дзеці далі працяг яго дынастыі. Сучаснікі прыпісвалі ёй больш лагодны палітычны курс да дынастыі Ягелонаў.

Акрамя адносінаў паміж мужчынам і жанчынай у турэцкім грамадстве былі вядомы і нетрадыцыйныя стасункі. Гомасексуалізм квітнеў сярод палацавай службы і ў школах, куды траплялі маладыя хлопцы, прымушаныя ўстрымлівацца ад сексуальных кантактаў. Пра існаванне аднаполых дачыненняў сярод мужчын і жанчын згадваюць у XVII ст. падарожнікі. Жыццё грамадства імперыі было не настолькі маралізавана, як гэта можа падацца. У ім было месца для кахання і эратычных прыгод[31].

Пра традыцыі і звычаі Асманскай імперыі ў ВКЛ было вядома праз вайсковыя і дыпламатычныя стасункі, падарожжы і кнігі[32]. У летапісах Княства

---

[30] Imieliński K. Seksiatria. Psychofizjologia seksualna. Warszawa, 1990. S. 80–83; Тэннехилл Р. Секс в истории. С. 211–235.

[31] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. Łódź, 1992. S. 312, 319; Peirce L. P. The Imperial Harem. Women and Severeignty in the Ottoman Empire. New York; Oxford, 1993; Bałczewski M. Gry i zabawy turków osmańskich na podstwie polskich i obcych źródł od schyłku Średniowiecza do końca Oświecenia. Warszawa, 2000. S. 139–197.

[32] Pajewski J. Legacja Piotra Zborowskiego do Turcji w 1568 r. Materjały do historji stosunków polsko-tureckich za panowania Zygmunta Augusta, Lwów, 1936; Katalog dokumentów Tureckich: dokumenty do dziejów Polski i Krajów ościennych w latach 1455–1672 / Pod red. A. Zajączkowskiego. Warszawa, 1959; Williams A. Mediterranean conflict // Süleyman the Magnificent and His Age. The Ottoman Empire in the Early Modern World / Ed. M. Kunt, C. Woodhead. London; New York, 1995. P. 39–54;

пра вайсковыя і палітычныя дзеянні Турцыі пісалі абсалютна без сімпатый да гэтай краіны[33].

На нашых землях ведалі туркаў у першую чаргу праз вайсковыя сутыкненні. У "Песні пра зубра" Міколы Гусоўскага туркі паказаны як злачынцы, у якіх няма шкадавання да жанчын і дзяцей. Для іх забойства і руйнаванне звычайная справа:

Турак агнём і мячом вынішчае ўсе нашы пасады,
Паліць мястэчкі і сёлы, руйнуе святыні [34].

Пасля наведвання Стамбула Мацей Стрыйкоўскі напісаў адмысловы твор, дзе паказваў злачынствы і гвалт туркаў супраць хрысціян. Ён быў накіраваны прадухіліць пагрозу для Польшчы і ВКЛ ад Асманскай імперыі[35]. У творы таксама апісаны выпадкі з турэцкай гісторыі, якія мелі павучальны і засцерагальны характар. Аўтар меркаваў, што калі не стрымаць агрэсію Турцыі, то гэта прывядзе да знішчэння Польшчы і Вялікага Княства:

...Dziewkę gdy sie spodoba, wezmie bez sromoty,
Oyca z matką zaparwszy używa niecnoty.
Turczyn niegodny iak psow Chrześcianow dręczy,
Leda o co morduie, łupi, bije, męczy...[36]

Пра Егіпет і Святую зямлю, якія былі ў падпарадкаванні Асманскай імперыі, жыхары Княства даведаліся дзякуючы Мікалаю Радзівілу Сіротку. Яго апісанне падарожжа зрабіла вялікі ўплыў на развіццё літаратуры[37].

Ян Люцыній Намыслоўскі для азнаямлення чытачоў з традыцыямі, становішчам і вайсковым патэнцыялам Турцыі зрабіў пераклад з лацінскай на польскую мову[38] кнігі пра падарожжа амбасадара рымскага цэзара Фердынанда Аўгеры Бусбекія да султана Сулеймана ў 1555 г. Кніга давала магчымасць пазнаёміцца не толькі з побытам туркаў, але і з інтрыгамі двара султана. Нават прыводзіліся звесткі пра істотную ролю жонкі Сулеймана Хюрэм у падтрымцы сына Селіма, будучага султана. Асобна апавядалася пра вайсковую моц туркаў. Я. Намыслоўскі нават адзначыў, што войска Рэчы Паспалітай слабейшае[39].

---

Imber C. The Ottoman Empire, 1300–1650. The Structure of Power. London, 2002. P. 44–62; Goffman D. The Ottoman Empire and Early Modern Europe. Cambridge, 2004. P. 99–112, 131–168; Dziubiński A. Stosunki dyplomatyczne polsko-tureckie w latach 1500–1572 w kontekście międzynarodowym. Wrocław, 2005.

[33] ПСРЛ. Т. 32. Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного. Москва, 1975. С. 90–94.

[34] Гусоўскі М. Песня пра зубра / Пер. з лац. мовы Я. Семяжона. Мінск, 2006. С. 68.

[35] Biedrzycka A., Wojtkowiak Z. Stryjkowski Maciej // PSB. T. XLIV. Warszawa; Kraków, 2006–2007. S. 538.

[36] Stryjkowski M. O wolnosci Korony Polskiey y Wielkiego Xięstwa Litewskiego... Kraków, 1575. S. 10.

[37] Кніга жыцій і хаджэнняў / Уклад. А. А. Мельнікаў. Мінск, 1994. С. 165–447; Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616), wojewoda wileński. Warszawa, 2000. S. 121–128.

[38] Augerii Gislenii Busbequii D. legationis Turcicae Epistolae quatuor: quarum priores duae ante aliquot annos in lucem prodierunt sub nomine Itinerum Constantinopolitani & Amasiani: adiectae sunt duae alterae eiusdem de re militari contra Turcam instituenda consilium. Beys, 1595.

[39] Namyslovius Licinius I. Augeriusa Busbequiusa Oratora cesarza Ferdinanda drogi trzy [...] do Solimana cesarza tureckiego; przytym Okrzyk na woynę przeciw Turkowi. Wilno, 1597.

У 1649 г. выйшла выданне Сымона Старавольскага, прысвечанае двару турэцкага султана[40]. У ім падрабязна апісваліся традыцыі, звычаі, палітыка, падаткі і іншыя аспекты з жыцця Асманскай імперыі. Не абмінуў аўтар увагай гарэм, жонак і наложніц. Асаблівасцю султана было тое, што ён сабе выбіраў не жанчын каралеўскай крыві, а нявольніц, здабытых на вайне. Каб выбраць на ноч жанчыну, манарх ішоў у жаночыя пакоі і даваў хустку той, якая спадабалася. Пасля пачыналася яе падрыхтоўка да візіту да султана. Жанчыну вялі ў лазню, апраналі і г. д.[41] Гэты твор даваў магчымасць даведацца пра ўнутраны лад жыцця ў Асманскай імперыі.

У 1678 г. у Слуцку быў надрукаваны багата ілюстраваны гравюрамі Максіма Вашчанкі пераклад на польскую мову працы сакратара англійскага амбасадара ў Турцыі Поля Рыко[42]. У ім падрабязна пададзена апісанне ўнутранага ладу жыцця Турцыі. Адзначалася, што аснова дзяржавы – абсалютная ўлада султана, якому ўсе падпарадкоўваюцца. Вельмі падрабязна паказаны сістэма кіравання, міжнародныя адносіны, панаванне ў рэгіёне над суседнімі народамі, войска, рэлігія і інш. Апісанне гарэму падобнае да таго, што пададзена ў Старавольскага. Звернута ўвага на гомасексуальныя (у тым ліку і лесбійскія) стасункі ў турэцкім грамадстве. У кнізе распавядалася пра некаторыя традыцыі туркаў. Мужчыны праходзілі абразанне ў дзіцячым узросце, да сямі гадоў. Дазвалялася палігамія, але не больш за чатырох жонак, прычым усіх трэба ўтрымліваць у аднолькава добрых умовах. Але наяўнасць некалькіх жонак прыводзіла да канфліктаў паміж імі. Адбівалася гэта ўсё на дзецях: суперніцы рабілі ўсё, каб цяжарныя не нарадзілі, а калі дзіцё ўсё ж такі з'яўлялася на свет, то яго часта атручвалі ці зводзілі іншым чынам. Распаўсюджаны быў яшчэ часовы шлюб (кабі), які па дамове заключаўся на непрацяглы час, напрыклад на месяц ці два[43]. Кніга давала даволі грунтоўнае апісанне тагачаснай Турцыі. Яе карысна было пачытаць перад наведваннем гэтай краіны, каб не трапіць у непрыемную сітуацыю.

Згаданыя выданні падкрэсліваюць цікавасць ВКЛ да Турцыі. У сувязі са складанымі адносінамі было стратэгічна важна валодаць інфармацыяй пра краіну, якая адрознівалася дзяржаўным ладам, рэлігіяй і традыцыямі.

З Турцыяй стасункі складваліся розныя. Яна кантралявала сітуацыю на паўночных межах Княства. Ад яе залежала замежная палітыка Валахіі, Крымскага ханства. Сама Турцыя мела лад, які адрозніваўся ад ладу Вялікага Княства

---

[40] Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Спроба паясьніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя. Коўна, 1926. С. 564–565; Kupiszewska A. Obraz Stambułu w dziele Dwór cesarza tureckiego i rezydencja jego w Konstantynopolu autorstwa Szymona Starowolskiego i jego wpływ na kształtowanie postaw szlachty polskiej wobec Turcji i Turków // Sarmatyzm versus Orientalizm w Europie Srodkowej / Pod red. M. Dlugosz, P. O. Scholz. Berlin, 2012. S. 215–230; Бразгуноў А. Краіны Усходу ў беларускай літаратуры 12–17 стагоддзяў // Biblioterarz podlaski. 2017. № 36. S. 66–68.

[41] Starowolski Sz. Dwór cesarza tureckiego i rezydencya jego w Konstantynopolu opisany. Kraków, 1858. S. 53–55.

[42] Выданне Поля Рыко на англійскай мове выйшла ў 1665 г. Падрабязней пра аўтара і кнігу гл.: Darling L. Ottoman Politics through British Eyes: Paul Rycaut's "The Present State of the Ottoman Empire" // Journal of World History. 1994. Vol. 5. № 1. P. 71–97.

[43] Monarchia turecka opisana przez Ricota Sekretarza Posła Angielskiego u Porty Ottomańskiej residuiącego z francuskiego ięzyka na polski przetłumaczona przez szlachcica polskiego. Słuck, 1678.

Літоўскага. Таму яна прыцягвала да сябе ўвагу, а літаратура пра яе карысталася попытам. Варта адзначыць, што ўсход меў сваю прывабнасць. У Княстве былі папулярныя тканіны і спецыі. Мужчынскі касцюм доўга знаходзіўся пад уплывам усходняй моды. А турэцкая музыка часта гучала ў шляхецкіх дамах.

*Крымскае ханства.* Небяспечнымі суседзямі ВКЛ былі татары. З імі ўвесь час вяліся ваенныя дзеянні[44]. Але ў XIV ст. на загад Вітаўта татары былі паселены для вайсковай службы ў некаторых мясцовасцях (Іўе, Лукішкі каля Вільні, Ласосна каля Гародні)[45].

Жыхары Княства станавіліся ахвярамі татарскага войска. Падчас набегаў татары не толькі рабавалі, але і захоплівалі насельніцтва. Лёс палонных складваўся па-рознаму: забойства, згвалтаванне, рынак нявольнікаў, гарэм. Палонныя з ВКЛ траплялі на рынкі Крыма, Стамбула, Грэцыі і інш.[46] Некаторым палонным шчасціла і іх выкуплялі. Гаспадарскі маршалак, троцкі войскі Аляксандр Фёдаравіч Уладыка выкупіў Ганну Іванаўну Шышчанку, калі быў у складзе пасольства да крымскага хана. Пасля павянчаўся з ёй у манастыры ў Земне[47] (Валынь) прыблізна ў 1568 ці 1569 г. Да палону Ганна была замужам за Міхаілам Халапмавым, і ён спрабаваў яе вярнуць праз суд у 1584 г. А. Уладыка адказаў, што Ганна – яго нявольніца, выкупленая ім з палону. Пазней у сваім тастаменце за 1573 г. Уладыка адпісаў жонцы маёмасць, атрымануюза службу ад Жыгімонта Аўгуста[48].

Пра веданне ў Вялікім Княстве[49] гісторыі і культуры татараў сведчыць трактат Міхалона Літвіна[50]. Аўтар вельмі высока ацэньваў вайсковыя здольнасці гэтага народа, аднак лад жыцця лічыў пастухоўскім і простым, як у старажытнасці. Жанчын татары трымалі ў аддаленых пакоях. Яны вельмі ганарыліся колькасцю жонак. Мужчыны адрозніваліся тым, што перавагу аддавалі не жаночаму выгляду і пасагу, а маральным якасцям, таму шлюбы часта бралі з нявольніцамі, служанкамі, і гэта прыносіла плён. Жанчыны ў шлюбе былі пакорлівыя, трывалі наложніц, ладзілі з мужам. Такія адносіны прыводзілі да шматдзетнасці і памнажалі нацыю. Пералюб прылічаўся да смяротнага граху,

[44] Borzemski A. Kornika Miechowity. Rozbiór krytyczny. Kraków, 1890. S. 80–102; Ochmański J. Organizacja obrony w Wielkim Księstwie Litewskim przed napadami tatarów krymskich w XV–XVI wieku // Studia i materiały do historii wojskowości. T. V. Warszawa, 1960. S. 349–393; Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. International Diplomacy on the European Periphery (15th–18th Century). A Study of Peace Treaties Followed by Annotated Documents. Leiden, 2011.

[45] У хроніцы ёсць інфармацыя пра тое, што палонныя татары, якіх захапіў Вітаўт, былі паселены ў Польшчы і ВКЛ у 1397 г. Miechowita M. Chronica Polonorum. Cracovea, 1521. P. CCLXIIII; Borzemski A. Kornika Miechowity. S. 26.

[46] ПСРЛ. Т. 32. С. 95, 99, 101, 114; Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 72–74; Bałczewski M. Gry i zabawy turków. S. 159–160.

[47] Цяпер Зімняе, тэрыторыя сучаснай Украіны.

[48] Архив ЮЗР. Ч. 8. Т. 3. Киев, 1909. С. 417–418.

[49] З польскіх аўтараў звяртаўся да гісторыі татар Мацей Мехавіта. Miechowita M. Polskie wypisanie dwojej krainy świata / Tłum. A. Glaber. Kraków, 1535. S. 64–74.

[50] Ochmański J. Michalon Litwin i jego traktat o zwyczajach Tatarów, Litwinów i Moskwicinów z połowy XVI w. // Kwartalnik historyczny. 1976. № 4. S. 765–783.

за які прысуджалася самае жорсткае пакаранне. Пры гэтым у татараў былі жанчыны для прастытуцыі, некаторыя з іх нават навучаныя танцам і ігры на музычных інструментах; іх часта запрашалі на бяседы[51]. Літвін ацэньваў станоўча такі лад жыцця, бо ён забяспечваў жорсткую іерархію, падпарадкаванне і вайсковыя перамогі [52].

Разважанні Літвіна аб стасунках паміж мужчынам і жанчынай вяліся з жорсткіх патрыярхальных пазіцый. Паводле яго слоў атрымлівалася, быццам бы дыскрымінацыйнае становішча жанчын прыводзіць выключна да дабрабыту грамадства. Па сутнасці, гэта прыстасаванне жанчын праз сілу і прымус для таго, каб зрабіць жыццё мужчын больш зручным. У такой сістэме жанчына мела права толькі нараджаць ваяроў, якія ў кожны момант маглі загінуць, і ніхто яе не пытаў, ці хоча яна такога лёсу сваім дзецям. Пры гэтым варта адзначыць, што Літвін проста назіральнік. Ён не жыў у гэтай сістэме адносінаў і не адчуваў яе на сабе.

У Княстве ведалі традыцыі і звычаі татараў. Крымскае ханства з'яўлялася небяспечным суседам, таму інфармацыя пра яго моцныя і слабыя бакі была неабходнай. Кантакт з татарскай культурай прыносіў веды пра азіяцкую культуру, аднак яны не мелі моцнага ўздзеяння на грамадства.

*Маскоўскае княства.* Адносіны паміж мужчынам і жанчынай у Маскоўскім княстве склаліся шмат у чым пад уплывам хрысціянства[53]. Не менш істотную ролю адыграў "Дамастрой", які замацаваў патрыярхальную сістэму і адвёў мужчыну галоўную ролю ў ёй[54]. У сямейна-шлюбным жыцці мелі месца ранція шлюбы. Важным было захаванне нявіннасці для жанчыны да вяселля. Пры гэтым у штодзённым жыцці здараліся адхіленні ад маральных нормаў праваслаўнай царквы[55]. У апошніх працах заходнія даследчыкі ўпісваюць сістэму гендэрных адносінаў Маскоўскага княства ў еўрапейскі кантэкст, адыходзяць ад меркаванняў прыгнечанасці жанчын. Але адзначаецца іх абмежаванасць у маёмасным праве. Статус жанчыны цалкам залежаў ад яе саслоўя: дваранкі мелі значна больш правоў, чым мяшчанкі і сялянкі. Хрысціянская мараль падтрымлівала думку, што шлюб неабходны толькі для зачацця дзяцей. Палымянай жарсці і сексуальным забавам для задавальнення ў ім не месца[56].

Пачынаючы з XV ст. паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай складваюцца канфліктныя стасункі, бо яна прэтэндавала на тэрыторыі нашай краіны, а пазней і на Інфлянты. Усходнія межы ВКЛ знаходзіліся ўвесь час у небяспецы. На працягу XVI–XVII стст. войны мелі месца ў 1500–1503, 1507–1508, 1512–1522, 1534–1537, 1558–1582, 1609–1618, 1632–1634, 1654–

[51] Бяседай называлася прыемнае правядзенне часу з размовамі, алкаголем і танцамі.

[52] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 64–73.

[53] Levin E. Sex and Society in the World of the Orthodox Slavs, 900–1700. Ithaca; London, 1989.

[54] Домострой / Под ред. В. В. Колесова, В. В. Рождественской. СПб., 1994.

[55] Кон И. С. Клубничка на березке: Сексуальная культура в России. Изд. 3-е, исп. и доп. Москва, 2010. С. 26–43.

[56] Большакова О. В. История России в гендерном измерении: современная зарубежная историография. Москва, 2012. С. 15–23.

1667 гг.[57] Памяць пра страты ў выніку такіх падзей захоўвалі і перадавалі з пакалення ў пакаленне. А вайскоўцы, якія вызначыліся падчас войнаў, лічыліся героямі[58].

Зразумела, што ваенныя канфлікты прыводзілі да негатыўнага стаўлення да маскавітаў. Нянавісць нашых жаўнераў выклікалі знойдзеныя закатаваныя целы таварышаў падчас выправы С. Баторыя на Маскву для адваявання ўсходніх зямель ВКЛ. Іх пасадзілі ў катлы і жыўцом зварылі, а пасля яшчэ здзекаваліся з мёртвых целаў[59]. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка пісаў, што для "Масквы звычайныя здрада і баламуцтва"[60]. У дзённіку Альбрэхт Станіслаў Радзівіл пры апісанні падзей Смаленскай вайны 1632–1634 гг. адзначаў пра "маскоўскае грубіянства"[61]. Нават на нявольніцкіх рынках у татараў, калі прадавалі выхадцаў з Вялікага Княства Літоўскага, то падкрэслівалі, што гэтыя людзі не з Маскоўскага княства. Маскавіты каштавалі там танней, бо лічыліся лжывымі і хітрымі[62].

Агульная мяжа з Маскоўскім княствам не азначала падабенства ў традыцыях і звычаях. Параўноўваючы лад жыцця ў гэтых краінах, Міхалон Літвін адзначаў перавагі Масквы ў сістэме кіравання, адсутнасці алкаголю ў штодзённым жыцці, падпарадкаванні жанчын мужчынам[63].

Іншае бачанне традыцый у Самуэля Маскевіча, які быў там падчас выправы на Маскву (1611) і ўспрымаў усё як іншы і незразумелы свет. Сватаўство, паводле ягоных слоў, адбывалася "па-жыдоўску", бо юнак не бачыў да шлюбу сваю нявесту. Падчас вяселля мужчыны і жанчыны сядзелі ў асобных пакоях[64]. У мужчынскім пакоі знаходзіліся распусніцы, тут спявалі і размаўлялі выключна пра секс. У іх не было прынята танцаваць на вяселлях, і таму танцы шляхты падаваліся ім нейкім шаленствам: чалавек ходзіць па пакоі і нібыта шукае тое, што не згубіў. Прыстойная асоба мусіць сядзець і глядзець на гэтага блазна. З жонкамі і жанчынамі баяры публічна не размаўлялі. Іх жонкі ўвесь час

[57] Piwarski K. Niedoszła wyprawa t.zw. Radoszkowicka Zygmunta Augusta na Moskwę (rok 1567–68) // Ateneum Wileńskie. R. 4. Z. 13. 1927. S. 257–265; Plewczyński M. Żołnierz jazdy obrony potocznej za czasów Zygmunta Augusta. Studia nad zawodem wojskowym w XVI w. Warszawa, 1985. S. 9–10; Хорошкевич А. Русское государство в системе международных отношений конца XV – начала XVI в. Москва, 1980. С. 104–131; Янушкевіч А. Вялікае княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. Мінск, 2007; Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667. Мінск, 1995 і інш.

[58] Слиж Н. Историческая память о Ливонской войне в панегирической литературе XVII века // Балтийский вопрос в конце XV – XVI в.: сборник научных статей. Москва, 2010. С. 365–380.

[59] Hejdensztejn R. Dzieje Polski od śmierci Zygmunta Augusta do roku 1594. Ks. XII. T. 1. Petersburg, 1867. S. 323.

[60] Ліст Мікалая Радзівіла Сіроткі да Крыштафа Радзівіла, гетмана ВКЛ, 7 сакавіка 1604 г. // Archiwum domu Radziwiłłów. T. VIII. Kraków, 1885. S. 51.

[61] Pamiętniki Albrychta Stanisława Radziwiłła, kanclerza W. Litewskiego / Wyd. E. Raczyńskiego. Poznań, 1839. T. 1. S. 210.

[62] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 72.

[63] Тамсама. С. 72, 75–78, 89–90.

[64] Падобным чынам вяселле апісвалі іншыя замежныя вандроўнікі, гл.: Из записок иностранных путешественников XVI–XVII вв. // "А се грехи злые смертные…": Любовь, эротика и сексуальная этика в доиндустриальной России (X – первая половина XIX в.) / Под ред. Н. Пушкарёвой. Москва, 1999. С. 138, 143.

знаходзіліся дома, а выязджалі толькі па святах да царквы ў закрытых павозках. Не прынята было ўжываць алкаголь нават у корчмах, п'яных адразу адпраўлялі ў вязніцу. Увогуле, калі шляхта распавяла баярам пра волю і намаўляла змяніць лад, то атрымала такі адказ: "*Wasza wolność wam dobra, a nasza niewola nam*"[65]. Назіранне Маскевіча паказвае розніцу ў светапоглядах шляхты і баяраў. Розныя гістарычныя ўмовы існавання стварылі розныя сістэмы адносінаў паміж мужчынам і жанчынай. Падобныя апісанні маскоўскіх звычаяў за гэты перыяд пакінуў Станіслаў Немаеўскі, які адзначыў, што маскавіты перанялі іх ад татараў за час 400-гадовай няволі[66].

Іншыя замежныя вандроўнікі малявалі карціну агульнага п'янства і распусты. Паводле іх назіранняў, жыхары Маскоўскага княства прапівалі нават вопратку ў корчмах і выходзілі адтуль голымі, іх размовы былі накіраваны толькі на секс. Звычайным здавалася выходзіць на вуліцу з лазні голымі і бегчы акунацца ў рэчку, а зімой падаць у снег. Была распаўсюджана здрада сужэнцам. За пералюб не каралі смерцю, жанчыну білі пугай і замыкалі на некалькі дзён у манастыры. Аднак рэлігія ў жыцці маскавітаў прысутнічала[67], а іканапіс увогуле быў значна больш аскетычны, чым заходні[68].

Верш, які быў напісаны замежнікам, апісваў грамадства XVII ст. наступным чынам:

Ты везде в Москве увидишь
Церкви, образа, кресты,
Купола с колоколами,
Женщин, крашеных, как кукол,
Бл*дей, водку и чеснок.

Там снуют по рынку праздно,
Нагишом стоят пред баней,
Жрут без меры, в полдень спят,
Без стыда пердят, рыгают[69].

Тагачасны фальклор маскавітаў уражвае сваёй шчырасцю і адкрытасцю[70]. Непрыстойныя словы часта сустракаліся ў тапаніміцы[71]. Нецэнзурныя выразы былі шматварыятыўныя, шырока выкарыстоўваліся ў побыце і фальклоры[72].

---

[65] Pamiętniki Samuela i Bogusława Kazimierza Maskiewiczów (wiek XVII) / Oprac. A. Sajkowski. Wrocław, 1961. S. 141–143, 146.

[66] Pamiętnik Stanisława Niemojewskiego (1606–1608). Lwów, 1899. S. 98–99; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 174–176.

[67] Из записок иностранных путешественников XVI–XVII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 139–146.

[68] Кон И. С. Клубничка на березке. С. 19.

[69] Из записок иностранных путешественников XVI–XVII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 142.

[70] Напрыклад, сустракаліся наступныя выказванні. : "Глаза хоть кривые, да х*й прям; В середу – с переду, в пятницу – в задницу; Кашу маслом, а п*зду х*ем не испортишь". Фольклорные памятники конца XVII–XVIII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 157–167.

[71] У назвах сустракаюцца: рэчка Блядзея, вёска Елдахова, рэчка Піздзюрка, вёска Хуйкова і інш. Назаров В. Д. "Срамословие" в топонимике России в XV–XVI вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 551–566.

[72] Кон И. С. Клубничка на березке. С. 16–18.

Хоць мелі месца гандлёвыя і культурныя кантакты, але частыя ваенныя сутыкненні прывялі да негатыўнага стаўлення да Маскоўскага княства, і гэта варожасць спрыяла скептычнаму стаўленню да маскоўскіх традыцый, звычаяў, рэлігіі.

*Украіна.* Украіна была ў складзе Вялікага Княства Літоўскага да 1569 г. У выніку Люблінскай уніі Польшча без вайсковых намаганняў забрала ўкраінскія землі[73]. Аднак тут захавалася дзеянне Статута 1566 г., таксама існаваў саслоўны падзел грамадства на шляхту, духавенства, мяшчан, сялян. Сістэма кіравання была падобная да сістэмы ВКЛ[74]. У гарадах дзейнічала магдэбургскае права. Такія гарады, як Кіеў, Львоў, Астрог, Замосце і іншыя, адыгрывалі важную ролю ў эканамічным, культурным, рэлігійным жыцці рэгіёна[75].

Заканадаўства ВКЛ значна паўплывала на фарміраванне сямейна-шлюбных адносінаў. Аднак гэта сфера мела свае рэгіянальныя асаблівасці[76]. Маральныя нормы ў шлюбных і сексуальных стасунках вызначала праваслаўе, якое лічыла дапушчальнымі палавыя кантакты толькі ў шлюбе. На іконах тыпу "Страшны суд" сярод грэшнікаў пазначаны пералюбнікі і распуснікі[77]. Пасля падпісання Люблінскай уніі тут узмацніліся пазіцыі каталіцызму.

Запарожская Сеч прымыкала да Украіны, але гэта быў іншы свет[78]. Казакоў залічалі да гультаёў і разбойнікаў, якія жывуць за кошт нападаў і рабаванняў. Паводле сваёй сутнасці яны мала чым адрозніваліся ад татараў[79]. Землі ВКЛ шмат цярпелі ад казацкіх нападаў. Войска Налівайкі прайшлося як навала па гарадах і вёсках[80]. Баркулабаўскі летапіс згадвае, што ў 1601 г. казакі былі ў Швецыі. Там яны каралю не дапамаглі, уцяклі, а "*тут на Руси Полоцку великую шкоду*

---

[73] Halecki O. From Florence to Brest (1439–1596). Rome, 1958. P. 141–197; Яковенко Н. М. Нарис історії середньовічної та ранньомодерної України. Вид. 3-е. Київ, 2006. С. 197–208; Błaszczyk G. Litwa na przełomie średniowiecza i nowożytności 1492–1569. Poznań, 2002. S. 143–159; Яковенко Н. М. Скількі істориків – стільки уній (з нагод 440-ліття Люблінської унії) // Український гуманітарний огляд. Вип. 14. Київ, 2009. С. 9–42 і інш.

[74] Яковенко Н. М. Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст.: (Волинь і Центральна Україна). Київ, 1993; Яковенко Н. М. Нарис історії. С. 171–175, 209–259; Старченко Н. Честь, кров і риторика. Конфлікт у шляхетському середовищі Волині. Друга половина XVI – XVII початок століття. Київ, 2014. С. 56–60, 317–369.

[75] Сас П. М. Феодальные города Украины в конце XV – 60-х годах XVI в. Киев, 1989; Білоус Н. Київ наприкінці XV – у першій половині XVII століття. Міська влада і самоврядування. Київ, 2008; Яковенко Н. М. Нарис історії. С. 167–171, 285–304 і інш.

[76] Гл.: Левицький О. Сім'я і побут українців у XVI ст. // На переломі. Друга половина XVI ст. Київ, 1994; Старченко Н. Шлюбна стратегія вдів і кілька проблем навколо неї (шляхецка Волинь кінца XVI ст.) // Київська старовина. 2000. № 6. С. 58–74; 2001. № 1. С. 42–62; 2001. № 4. С. 20–42; Ворончук І. "Dobra żona godna mężowi korona" (До історії подружніх стосунків Катерини Острозької і Томаша Замойського) // Київська старовина. 2002. № 5. С. 120–133; Ворончук І. Подружні зради як наслідок практики укладання шлюбів в Україні в XVI–XVII ст. (на матеріалах ранньомодерної Волині) // Соціум. Альманах соціальної історії. 2006. Вип. 6. С. 161–201 і інш.

[77] Федак М. Зображення грішників на іконах "Страшний Суд" XV–XVIII століть (на прикладі пам'яток зі збірки Національного музею у Львові імені Андрея Шептицького) // Літопис Національного музею у Львові імені Андрея Шептицького. Львів, 2014. № 10 (15). С. 70–76.

[78] Яковенко Н. М. Нарис історії. С. 175–192, 259–285, 313–428.

[79] Miechowita M. Polskie wypisanie dwojej krainy świata / Tłum. A. Glaber. Kraków, 1535. S. 41.

[80] Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. С. 478–479.

*чинили, а место славное и великое Витебск звоевали, злата, сребра множество побрали, мещан учтивых порубали, и так шкоду содомию чинили горше злых неприятелей албо злых татар*"[81]. Прысутнасць казакоў ва ўкраінскіх ваяводствах таксама прыводзіла да канфліктаў, рабаванняў і забойстваў[82].

Нягледзячы на выхад Украіны са складу ВКЛ, кантакты ў розных сферах – эканоміцы, палітыцы, культуры, рэлігіі – працягвалі захоўвацца.

*Культурныя асаблівасці Вялікага Княства Літоўскага.* Вялікае Княства Літоўскае ў XVI ст. ужо цалкам існавала ў еўрапейскім кантэксце. Аднак у сувязі са сваім геаграфічным становішчам яно не адыгрывала істотнай ролі ў палітычнай, эканамічнай, культурнай, рэлігійнай сістэме Еўропы. Хоць шляхта і імкнулася ўсімі спосабамі ўключыць дзяржаву ў сістэму еўрапейскіх адносінаў, але розніца паміж Еўропай і Княствам заставалася. Асабліва істотным было эканамічнае адставанне, якое ацэньваецца ў 100 гадоў. У XVII ст. Еўропа перайшла на капіталістычны лад, сталі працаваць біржы і банкі[83]. Для іншаземцаў з Заходняй Еўропы ВКЛ уяўляла сабой дзікі, варварскі і незразумелы край[84].

XVI стагоддзе характарызуецца завяршэннем фарміравання дзяржаўнай сістэмы кіравання. У 60-х гг. была праведзена зямельная рэформа – "Валочная памера", рэфармавана судовая і адміністрацыйная сістэмы, сфармавана заканадаўчая база (Статуты 1529, 1566, 1588 гг.)[85]. У Вялікім Княстве панавала феадальная сістэма гаспадарання, якая ў канцы XVII ст. абсалютна страціла сваю эфектыўнасць. Сама краіна была сельскагаспадарчай, таму эканамічная сітуацыя вельмі залежала ад добрага ўраджаю. Экстрэмальнае надвор'е адразу спараджала эканамічны крызіс, які прыводзіў да павышэння коштаў, заняпаду гаспадарак і голаду[86].

Хвалі Рэнесансу, Рэфармацыі, барока, Контррэфармацыі дайшлі да Княства. Аднак іх моц была слабейшай, чым у месцах зараджэння, хоць мясцовая філасофская, палітычная, этычная, рэлігійная думка і развівалася ў кантэксце адзначаных тэндэнцый[87].

З XVI ст. Княства стала полем дзейнасці для розных рэлігійных плыняў. Да праваслаўя і каталіцызму дадаўся пратэстантызм. Ён прыйшоў з Нямеччыны і Герцагства Прусія. Пратэстанцкія зборы з'явіліся ў Вільні, Гайцюнішках, Смаргоні, Коўне і іншых мясцовасцях. У 1596 г. была прынята Берасцейская

---

[81] ПСРЛ. Т. 32. С. 184, 187.

[82] Білоус Н. Київ наприкінці XV – у першій половині XVII століття. С. 245–272.

[83] Бродель Ф. Материальная цивилизация, экономика и капитализм XV–XVIII вв. Т. 2. Игры обмена. Москва, 1988.

[84] Одэрборн П. Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў // Беларускі гістарычны агляд. 2005. Т. 12. Сш. 1–2 (22–23). С. 167–189.

[85] Довнар-Запольский М. В. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. Т. 1. Киев, 1901; Лаппо И. И. Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Т. 1. Юрьев, 1911; Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута. Москва, 1892 і інш.

[86] Такія сітуацыі апісваюцца ў летапісах, гл.: ПСРЛ. Т. 32. С. 114, 177, 182, 184, 187, 188.

[87] Падокшын С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мінск, 1990; Лойка А. А. Старабеларуская літаратура. Мінск, 2001.

унія. Гэта справакавала канфлікт у грамадстве, які трываў на працягу шэрага гадоў[88]. Полірэлігійная сітуацыя не спрыяла маналітнасці краіны. Увесь час існавала глеба для сутыкненняў і ўнутраных канфліктаў.

Адраджэнне адлюстравалася ў архітэктурных помніках, літаратурных творах, кнігадрукаванні. Самай значнай яго праявай стала дзейнасць Францыска Скарыны. Важную ролю адыграла жонка Жыгімонта Старога італьянка Бона Сфорца. Разам з ёй прыбылі ў Вялікае Княства Літоўскае носьбіты Рэнесансу – мастакі і вучоныя, якія распаўсюджвалі ідэі эпохі праз свае творы. Вялікая княгіня спрыяла доўгім і трывалым кантактам паміж краінамі, вандроўкам шляхты ў Італію[89].

Першы храм у стылі барока з'явіўся ў Італіі, а другі – у Нясвіжы[90]. Поруч з барока ішла Контррэфармацыя, якая вяртала рэлігійнасць у грамадства праз будаўніцтва касцёлаў, літаратуру, падтрымку рэлігійных ідэалаў і светапогляду. У ВКЛ барочныя храмы былі пабудаваны ў Вільні, Гародні, Берасці, Віцебску і іншых гарадах. У шляхецкім асяроддзі набыла папулярнасць панегірычная літаратура і казанні на смерць, прысвечаныя не толькі асобе ці падзеі, але і стварэнню вобразаў ідэальных шляхцічаў і шляхцянак.

Варта адзначыць, што Рэнесанс прынёс у ВКЛ ідэі антычнасці, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў мастацтве, паэзіі, літаратуры, палемічных і філасофскіх творах і зрабілі моцны ўплыў на культуру. Ідэя пра паходжанне шляхты са Старажытнага Рыма змяшчалася ў летапісах, працах Мацея Стрыйкоўскага, Марціна Бельскага, Міхалона Літвіна, Альбрэхта Вуйка Каяловіча. Праўда, версіі прыводзіліся розныя. Паводле адной, Палемон і 500 шляхецкіх сем'яў пакінулі Рым, ратуючыся ад праследу імператара Нерона. У пошуках новай зямлі яны дайшлі да тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага і заснавалі тут дзяржаву. Паводле другой версіі, рымляне ратаваліся ад жорсткага правадыра гунаў Атылы[91].

[88] Падокшын С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (філасофска-гістарычны аналіз). Мінск, 1998; Іванова Л. Рэфармацыйны рух на Беларусі (другая палова XVI – першая палова XVII ст.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 2. С. 54–72; Lukšaitė I. Reformacija Lietuvos Didžiojoje Kunigaikštystėje ir Mažojoje Lietuvoje: XVI a. trečias dešimtmetis – XVII a. pirmas dešimtmetis. Vilnius, 1999; Гудзяк Б. Криза і реформа: Київська митрополія, Царгородський патріархат і генеза Берестейської унії. Львів, 2000; Дмитриев М. В. Между Римом и Царьградом: Генезис Брестской церковной унии 1595–1596 гг. Москва, 2003; Kempa T. Wobec Kontrreformacji. Protestanci i prawosłani w obronie swobód wyznaniowych w Rzeczypospolitej w końcu XVI wieku i w pierwszej połowie XVII wieku. Toruń, 2007; Kriegseisen W. Stosunki wyznaniowe. S. 430–617.

[89] Пра дзейнасць Боны гл.: Pociecha W. Królowa Bona (1494–1557). Czasy i ludzi odrodzenia. Poznań, 1949–1958. T. 1–4.

[90] Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII ст. Мінск, 1988. С. 11; Баженова О. Радзивилловский Несвиж. Росписи костёла Божьего Тела. Минск, 2007. С. 8–9.

[91] ПСРЛ. Т. 32. С. 128; ПСРЛ. Т. 35. Москва, 1980. С. 128–129, 145–146, 173–174, 193–194, 214; Bielski M. Kronika polska. Kraków, 1597. S. 153; Stryjkowski M. Goniec cnothy do prawych slachciczow. Kraków, 1574. S. 36–38, 47–54; Stryjkowski M. Genealogia albo krotkie opisanie Wielkich Księżat Litewskich... Odnowione przez S. Dovgirda. Lubcz, 1626; Stryjkowski M. Kronika.... Królewiec, 1582. S. 41–84; Литвин M. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 86; Koialowicz Wiiuk A. Historiae Lituanae... Vilnae, 1650. P. 24–26; Семянчук А. Беларуска-літоўскія летапісы і хронікі. Гродна, 2000. S. 38–43; Tereškinas A. Imperfect Communities. Identity, Discourse and Nation in the Seventeenth Century Grand Duchy of Lithuania. Vilnius, 2005. P. 256–260; Antoniewicz M. Protoplaści książat Radziwiłłów. Dzieje mitu i meandry historiografii. Warszawa, 2011. S. 140–165.

Акрамя легенды агульнай ствараліся родавыя легенды, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў панегірычнай літаратуры і гербоўніках[92].

Легенда была неабходна для самаідэнтыфікацыі набілітэту, для абгрунтавання адасобленасці ад Маскоўскага княства, надання высокага статусу шляхце ў параўнанні з элітай суседніх краін. Яна зрабіла шляхту ВКЛ "сарматамі", якія адрозніваліся ад мяшчан і сялян. На той час Італія, як краіна паходжання, была абрана невыпадкова. Яна была радзімай антычнай культуры. Тут знаходзіўся Ватыкан – цэнтр еўрапейскага хрысціянства. Усе тагачасныя палітычныя, культурныя, рэлігійныя тэндэнцыі ішлі менавіта з Італіі. Таму знаходжанне ў непасрэдным "сваяцтве" з вялікім Рымам надавала набілітэту ВКЛ статус эліты вышэйшага гатунку. Разам з тым гэта прывяло да з'яўлення думкі, што родная мова шляхты – лацінская. Адпаведна, гэта паўплывала на статус старабеларускай мовы, які паступова стаў зніжацца. Лацінская мова не набыла пашырэння, на яе месца прыйшла больш лёгкая – старапольская. Вацлаў Ластоўскі справядліва крытыкаваў саслоўную адасобленасць шляхты, яе пагардлівае стаўленне да сялянства, адмаўленне ад сваёй мовы[93]. Пошукі лацінскай ідэнтычнасці прывялі да страты набілітэтам старабеларускай ідэнтычнасці, што негатыўна паўплывала на само шляхецкае саслоўе.

Сярод саслоўяў былі яшчэ духавенства, мяшчане і сяляне. У духавенства маглі патрапіць прадстаўнікі любога паходжання. Аднак заняць уплывовыя пасады, такія як пасада віленскага біскупа, маглі толькі шляхцічы. Мяшчане мелі асобны статус, які вызначаўся магдэбургскім правам, калі яно было нададзена гораду, дзе яны пражывалі. Магчымасці мяшчан абмяжоўваліся маштабам мясцовасці, яе геаграфічным становішчам і маёмаснай прыналежнасцю[94]. Найгоршае становішча было ў сялян. Іх жыццё і дабрабыт шмат у чым залежалі ад ўласніка, войнаў, прыродных катаклізмаў[95]. Сялянскі светапогляд адлюстраваўся ў фальклоры, які сістэматычна сталі фіксаваць толькі з XIX ст. У сатырычнай літаратуры XVII–XVIII стст. сялян прадстаўлялі неадукаванымі, некультурнымі, цёмнымі, хітрымі, але з пачуццём гумару[96].

---

[92] Paprocki B. Gniazdo cnoty: zkąd herby rycerstwa sławnego Krolestwa Polskiego, Wielkiego Księstwa Litewskiego, Ruskiego, Pruskiego, Mazowieckiego, Zmudzkiego y inszych Państw do tego Krolestwa nalezacych Książąt y Panow poczatek swoy maią. Kraków, 1578; Kojałowicz Wiiuk A. Compendium; Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego [...]. Kraków, 1897.

[93] Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. С. 604–607.

[94] Пра гарады ВКЛ гл.: Alexandrowicz S. Miasteczki Białorusi i Litwy jako ośrodki handlu w XVI i w I połowie XVII wieku // Rocznik Białostocki. Białystok, 1961. T. 1. S. 63–127; Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. Минск, 1966; Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVII вв. (Социально-экономическое исследование истории городов). Минск, 1975; Бардах Ю. Лад местаў на магдэбургскім праве ў Вялікім Княстве Літоўскім да паловы XVII ст. // Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2002. С. 103–160; Дружчыц В. Магістрат у беларускіх местах з майдэборскім правам у XV–XVI сталецьцях // Arche. 2009. № 7. С. 241–337 і інш.

[95] Лойка П. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі (эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII ст.). Мінск, 1991; Голубеў В. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. Мінск, 1992; Спиридонов М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.). Минск, 1993; Гісторыя сялянства Беларусі. Т. 1: Ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997 і інш.

[96] Карский Е. Белорусы. Т. III. Очерки словесности белорусского племени. 2. Старая западнорусская письменность. Петроград, 1921. С. 212–237.

Грамадскі лад краіны не быў ідэальным. Яго крытыкавалі і Андрэй Волан, і Міхалон Літвін. Апошні лічыў, што маскавіты і татары саступаюць у сілах літвінам, аднак пераўзыходзяць працавітасцю, дысцыплінаванасцю ды іншымі якасцямі; што яны любяць простую ежу, а літвіны – вострыя прыправы і віны, і гэта прыводзіць да хвароб. Яшчэ аўтар адзначыў, што ў Вялікім Княстве Літоўскім вырабляюць шмат гарэлкі і піва, бяруць алкаголь з сабой у паходы, піць пачынаюць з самай раніцы, а сяляне любяць збірацца ў корчмах, піць, слухаць валынку і глядзець на мядзведзяў. Злоўжыванне алкаголем прыводзіла да страты гаспадаркі і злачынстваў. Паводле меркавання аўтара, адсутнасць алкагалізму ў маскавітаў і татараў рабіла іх мацнейшымі[97].

Суседзі таксама не заўсёды пазітыўна ўспрымалі літвінаў. Рознасць у менталітэце і ўзаемнае непрыязнае стаўленне літвінаў і палякаў праявілася ў палеміцы паміж Станіславам Арахоўскім і віленскім войтам Аўгустынам Ратундасам у іх творах "Пірамíды" і "Размова Паляка з Літвінам". Арахоўскі пагардліва ставіўся да сістэмы кіравання ВКЛ і да самой краіны, якую, паводле ягонай думкі, выратаваць магло толькі далучэнне да Польшчы. Ратундас, у сваю чаргу, раскрытыкаваў пазіцыю Арахоўскага наконт таго, што ва ўсіх каралеўствах пануе свабода і дэмакратыя, а ў княствах – дэспатыя, і аргументацыю прывёў на падставе гісторыі Польшчы[98].

Даволі крытычнае стаўленне да краіны сустракаецца сярод нунцыяў. Напрыклад, Галеаца Марэскоці агульную сітуацыю з каталіцызмам ацэньваў нядрэнна ў Італіі, Францыі, Германіі, а вось у Герцагстве Прусія, Рэчы Паспалітай і Маскоўскім княстве характарызаваў крытычна. Ён жа адзначаў, што жанчынам Рэчы Паспалітай дазволена ўдзельнічаць у вырашэнні праблем, і яны маюць вялікую ўладу[99].

Стаўленне да замежнага ўплыву ў нас было і пазітыўнае, і негатыўнае. Адны, як М. К. Радзівіл Сіротка, прывозілі замежных майстроў, а другія крытыкавалі ўздзеянне замежжа. Яскравым сведчаннем апошняга з'яўляецца "Прамова Мялешкі". У ёй высмейваецца прыхільнасць шляхты да замежнай моды, ежы, звычаяў, бо "*наша костка, однак, собачим мясом обрасла и воняет*". Аўтар лічыў, што гэта толькі разбэшчвае людзей, робіць іх слабымі, дрэнна ўплывае на вайсковы дух шляхты. Негатыўна характарызаваліся немцы і палякі (ляхі), якія прыносілі свае парадкі. Немец, калі прыязджаў у госці, то хацеў, каб добра пачаставалі і каб жонка гаспадара была поруч, а сам сядзеў "*як бес надувшись*"; такога трэба "*кулаком в морду ... нехай бы морды такой поганой не надымал*". Не менш кпінаў было ў бок палякаў, якія прыехалі служыць, хочуць добрага

---

[97] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 75–78, 89–90.

[98] Quincunx to jest Wzór Korony Polskiej. Kraków, 1564; Rotundus-Mieleski A. Rozmowa Polaka z Litwinem, 1564 / Wyd. J. Korzeniowski. Kraków, 1890; Саверчанка І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Адраджэнне і ранняе барока. Мінск, 1998. С. 71–79; Кавалёў С. Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу. Мінск, 2010. С. 135–143.

[99] Boccolini A. Monsignor Galeazzo Marescotti in viaggio verso la Polonia e il suo incontro con la corte: osservazioni, stili, usi // Itinera clericorum: Kulturotwórcze i religijne aspekty podróży duchownych / Pod red. D. Quirini-Popławskiej, Ł. Burkiewicza. Kraków, 2014. S. 354, 362, 365–369.

забеспячэння, а працаваць не жадаюць, глядзяць, што ўрваць для сябе. Адзначалася іх хцівасць да дзевак, заляцанне да жонак гаспадароў: "*скоро ты з дому, то он молчком приласкается до жонки*"[100].

Нацыянальныя стэрэатыпы пра многія народы добра бачныя ў прымаўцы з калекцыі Крыштафа Завішы: "*Іспанская прастата, італьянская шчодрасць, польскі ўрад, панскія цырымоніі (манеры), англійская вольнасць, французская сарамлівасць, нямецкая пакора, маскоўскае слова, турэцкі шлюб, валошская*[101] *вернасць – усё гэта падазроныя рэчы*[102]. Яна трапна ілюструе стаўленне да народаў, а таксама звяртае ўвагу, у якіх выпадках каму не варта давяраць.

Такім чынам, перыяд XVI–XVII стст. быў часам вялікіх змен і трансфармацый у Княстве, якія адбіліся на розных сферах: ад палітыкі да культуры. Краіна значна змянілася. Былі канчаткова сфарміраваны сістэма кіравання, заканадаўства, эканоміка, гандаль, адукацыя, інстытуты сям'і і шлюбу, традыцыі і звычаі. Усё гэта развівалася дзякуючы ўнутраным і знешнім тэндэнцыям. Гэтыя змены мелі пазітыўныя і негатыўныя наступствы для грамадства, таму адназначнага стаўлення да працэсаў не было.

Вялікае Княства Літоўскае не знаходзілася ў ізаляцыі. Яно кантактавала з блізкімі і далёкімі краінамі. Кантакты здзяйсняліся рознымі шляхамі: ваенныя, дыпламатычныя, культурныя, рэлігійныя, адукацыйныя, эканамічныя. Не менш актуальны быў збор інфармацыі праз шпегаў[103]. Звесткі пра краіны значна дапаўнялі розныя кнігі, такія як "Хроніка свету" Марціна Бельскага[104], падарожныя нататкі і іншыя. Былі вядомы ў ВКЛ і карты з вывамі замежных гарадоў[105]. Краіна была добра інфармавана пра падзеі ў суседзяў і Еўропе. У XVII ст. сюды нават сталі даходзіць еўрапейскія навіны з газет. Напрыклад, у магілёўскай хроніцы згадвалася пра моцны землятрус у Неапалі ў 1688 г.[106]. Адносіны паміж краінамі і этнічныя стэрэатыпы, якія ўзніклі ў тыя часы, і цяпер не страцілі актуальнасць.

---

[100] "Прамова Мялешкі" датуецца першай паловай XVII ст. Сатырычны твор быў вельмі папулярны, уваходзіў у склад розных рукапісаў, быў неаднаразова надрукаваны. Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. С. 446–449; Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі. Мінск, 1992. С. 65–68. У артыкуле змешчана 5 варыянтаў "Прамовы Мялешкі": Даўгяла Зм. Зь беларускага пісьменства XVII ст. // Arche. 2009. № 7. С. 768–816; Галенчанка Г. Невядомыя і малавядомыя помнікі духоўнай спадчыны і культурных сувязей Беларусі XV – сярэдзіны XVII ст. Мінск, 2008. С. 384–388.

[101] Валахія – частка сучаснай Малдовы.

[102] "Hiszpańska prostota, włoska hoyność, polski urząd, panskie dworstwo, angielska wolność, francuski wstyd, niemiecka pokora, szochi w czas, moskiwskie słowo, tureckie małzęstwo, wołoska wierność wszytko to podeyzrzane rzeczy". VUB, f. 3-2239, l. 60v.

[103] Archiwum domu Sapiehów. Lwów, 1892. T. 1. S. 491; Кананові́ч У. Інфармацыйна-выведная служба ў Вялікім Княстве Літоўскім у познім сярэднявеччы // Castrum, urbis et bellum: зб. навук. прац. Баранавічы, 2002. С. 195–218.

[104] Bielski M. Kronika wszytkiego świata. Kraków, 1564.

[105] Напрыклад, у інвентары Трайчанскага манастыра згадваюцца карты Рыма, Канстанцінопаля, Гамбурга, Аўгсбурга (1678). Минская старина. Вып. 4. Труды Минского церковного историко-археологического комитета (Тройчанский архив). Минск, 1913. С. 72.

[106] ПСРЛ. Т. 35. С. 246.

Непасрэдны ўплыў на шляхецкую культуру, а праз яе і на культуру ВКЛ, меў вялікакняскі і каралеўскі двор. Гэта было месца камунікацыі розных людзей з розных краін: амбасадараў, рамеснікаў, дактароў і інш. Яны прыносілі з сабой частку сваёй культуры. Асобы, якія траплялі ў гэта асяроддзе, карысталіся магчымасцю пазнаёміцца з замежнымі навінамі і цікавосткамі. Жыццё каралеўскага двара і візіты іншаземцаў добра адлюстраваныя ў дзённіку канцлера ВКЛ Альбрэхта Станіслава Радзівіла. У ім прасочваецца ўплыў розных культур праз кантакты, музыку, тэатр, побытавыя рэчы і інш.[107] Ян Уладзіслаў Пачобут-Адляніцкі з захапленнем пісаў пра побыт пры двары ў 1684 г., калі Ян Сабескі быў у Яварове. Шляхціч пабачыў людзей розных нацыянальнасцей (грэкаў, французаў, туркаў, татараў), а таксама дзіўныя рэчы – італьянскі агарод, незвычайных жывёл і інш.[108]

Аднак варта адзначыць, што ў канфедэратыўнай краіне Рэчы Паспалітай цэнтр паступова зрушыўся ў бок Варшавы як сталага месца знаходжання манарха, у Вільні, Гародні і іншых гарадах ён бываў наездамі. Асабліва гэта стала заўважна ў XVII ст. Больш актыўна, з прычыны геаграфічнага становішча, развівалася жыццё ў заходнім рэгіёне. У агульным сэнсе для еўрапейскіх краін Рэч Паспалітая была цікавая як вытворца сыравіны, спажывец прадукцыі і культуры, прыхільнік Ватыкана[109], але як самастойны гулец не разглядалася. Меркаванне, што краіна дзікая і нецывілізаваная, не змянілася з часоў крыжацкіх паходаў.

Уяўленне пра іншую дзяржаву складвалася ў залежнасці ад характару адносінаў. Канфлікты стваралі вобраз ворага, таму ўзнікала негатыўнае стаўленне да яго культуры. Такім чынам, напрыклад, гэта адбылося ў выпадку з Маскоўскім княствам, Асманскай імперыяй, Крымскім ханствам. Італію ўспрымалі зусім інакш – як цэнтр рэлігіі, культуры, гісторыі, антычнай спадчыны. Яна была ўзорам, вартым пераймання. Аднак як бы не складваліся адносіны, краіны ўсё роўна ўплывалі на ВКЛ. Да таго ж было вельмі важна назапашванне гістарычнай і актуальнай інфармацыі пра суседзяў, якія ўваходзілі ў сферу інтарэсаў дзяржавы. Гэта мела не толькі культурнае значэнне, але і практычны сэнс, таму што было карыснае для вайсковай і дыпламатычнай справы.

Варта адзначыць, што акрамя еўрапейскіх краін у Вялікім Княстве Літоўскім ведалі пра Азію і нават Індыю. Напрыклад, у радзівілаўскай калекцыі (1680, 1683) знаходзіўся шэраг індыйскіх карцін[110]. А ўражанні пра Індыю можна было атрымаць з "Аповесці пра Варлаама і Іасафата", якая была выдадзена

---

[107] Radziwiłł A. S. Pamiętnik o dziejach w Polsce. Warszawa, 1980. T. 2. S. 485, 493. T. 3. S. 205 і інш.

[108] Pamiętnik (1640–1684). Jan Władysław Poczobut Odlanicki / Oprac. A. Rachuba. Warszawa, 1987. S. 316–318.

[109] Рэлігійная сітуацыя ў Рэчы Паспалітай і ВКЛ вельмі непакоіла Рым. Platania G. Viaggio politico, viaggio religioso. Nunzi pontifici e la questione degli "uniati" al tempo di Jan II Kazimierz Wasa (1648–1668) attraverso i documento della Sacra Congregazione de Propaganda Fide // Itinera clericorum: Kulturotwórcze i religijne aspekty podróży duchownych / Pod red. D. Quirini-Popławskiej, Ł. Burkiewicza. Kraków, 2014. S. 323–342.

[110] AGAD, AR, dz. XXVI, sygn. 102, k. 136; Sulerzyska T. Inwentarz Galerii Obrazów Radziwiłłów z XVII w. // Нясвіжскія зборы Радзівілаў. Вяртанне 7. Мінск, 2002. С. 123.

ў друкарні Куцеінскага манастыра ў 1637 г. Знаёмства з усходам адбывалася яшчэ праз літаратуру пра астралогію і чараўніцтва[111].

Зразумела, гэтыя веды канцэнтраваліся пераважна ў эліты, якая займалася міжнароднай і ўнутранай палітыкай. Духавенства кантактавала з замежжам у залежнасці ад свайго веравызнання. Мяшчан больш цікавіла інфармацыя практычнага характару ў сферы эканомікі, гандлю, медыцыны і інш. Сяляне былі ў меншай ступені ўключаны ў інфармацыйную прастору.

Вялікае Княства Літоўскае схілілася ў бок еўрапейскай культуры, якая стала прыкладам для развіцця розных сфер: рэлігіі, мастацтва, эканомікі і інш. Пры знаёмстве з рознымі краінамі жыхары не абыходзілі ўвагай традыцыі і звычаі ў галіне інтымнай культуры. Непасрэднае знаёмства з ёй адбывалася праз секс, шлюб і даверлівыя размовы. Некаторыя ідэі знайшлі сваё месца ў сексуальнай сферы жыцця грамадства.

---

[111] Карский Е. Белорусы. Т. III. С. 46–47, 52–59.

# 2. Ідэальныя вобразы мужчыны і жанчыны часоў Рэнесансу і барока

У кожнай краіне розныя сацыяльныя групы ствараюць свае паняцці мужчынскасці і жаноцкасці, гендэрныя стэрэатыпы і ідэалы. Традыцыйна мужчына ці жанчына не прымалі самастойна рашэнне, якімі ім быць. Асяроддзе фарміравала канструкт, да якога ён ці яна павінны быць максімальна падобныя, каб не выпадаць з супольнасці.

Патрыярхальнае грамадства Вялікага Княства Літоўскага мела дакладна вызначаную іерархію. Першасная роля аддавалася менавіта мужчыну – і ў жыцці, і ў сямейных дачыненнях. Да патрыярхальнай сістэмы ідэальна пасавала хрысціянства, якое сцвярджала, што жанчына створана для мужчыны[1]. Гэта падкрэслівалася ў кананічным праве і абрадах вянчання. У апошніх дэкларавалася падпарадкаванне жонкі мужу і яе паслухмянасць[2].

У патрыярхальнай сістэме свабода жанчыны залежала ад яе статусу. Шляхцянкі не былі абмежаваны ў эканамічных правах і мелі права самастойна распараджацца маёмасцю[3]. Мяшчанкі ж згодна з магдэбургскім правам не маглі без мужа ці сваякоў здзяйсняць маёмасныя аперацыі. Гэта прасочваецца ў дакументах: жанчыны вельмі рэдка фігуруюць у іх самастойна[4]. Сялянкі мелі найменш правоў; яны нават не згадваліся ў інвентарах маёнткаў. Падчас пераліку гаспадарак запісвалася толькі імя і прозвішча гаспадара. Жанчыну маглі адзначыць, толькі калі яна была ўдавой і станавілася галоўнай у сям'і[5].

Такім чынам, існавала сістэма з дакладна вызначанымі гендэрна-ролевымі функцыямі мужчыны і жанчыны, якая адпавядала патрэбам грамадства. Аднак у большай ступені працэс фарміравання гендэрных роляў і стэрэатыпаў меў дачыненне да шляхты, бо менавіта эліта займалася іх стварэннем у культурнай сферы.

Разуменне паняцця "мужчына" наўпрост залежала ад саслоўя. Розныя паняцці ўкладваліся ў канструкты "мужчына-шляхціч", "мужчына-святар",

---

[1] Майлз Р. Жаночая гісторыя свету. Мінск, 2006. С. 85–87.

[2] Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 265–377.

[3] Сліж Н. Шляхцянкі на старонках прыватна-прававых і судовых дакументаў XVI–XVII стст. // Arche. Жаночая гісторыя Беларусі. 2011. № 12. С. 8–22.

[4] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 104–105, 110–111 і інш.

[5] АВАК. Т. 14. Инвентари имений XVI-го столетия. Вильна, 1888. С. 22–23, 37–45 і інш.

“мужчына-мешчанін” і “мужчына-селянін”. Кожны з іх выконваў свае функцыі ў грамадстве, якія былі абумоўлены заканадаўствам, рэлігіяй, традыцыямі і звычаямі.

*Мужчына-шляхціч*. Шляхецкае грамадства мэтанакіравана займалася стварэннем “ідэальнага” мужчыны. Для XVI ст. характэрна станаўленне не толькі саслоўнай самаідэнтыфікацыі, але і гендэрнай. Патрыярхальнае грамадства для сваёй сістэмы існавання дакладна вызначыла, якія ролі павінен у ім адыгрываць мужчына: сына, мужа, бацькі, гаспадара, мецэната, абаронцы, рыцара, палітыка[6].

З малога ўзросту ў шляхцічах выхоўвалі набожнасць, павагу да бацькоў, старэйшых і сваякоў, рыхтавалі іх да выканання абарончай функцыі ў сям’і, спрыялі іх кар’еры і поспеху ў асяроддзі. Бацькі жадалі бачыць сваіх сыноў годнымі шляхцічамі, якія займаюць высокія пазіцыі не толькі паводле права нараджэння, але і дзякуючы сваім чалавечым якасцям. Таксама яны хацелі, каб нашчадкі перанялі ад іх лепшае і перадалі сваім дзецям. Сын, нягледзячы на яго прыналежнасць да мужчынскага полу, знаходзіўся ў сям’і на ніжэйшай прыступцы ў параўнанні з маці. З дзяцінства яго прывучалі паважаць сістэму і паводзіць сябе адпаведна з узростам і статусам. Па дасягненні дарослага ўзросту ад сына чакалі клопату пра бацькоў, забеспячэння ім спакойнай старасці. Асновы мужчынскіх паводзін, мужчынскай ідэнтычнасці закладаліся яшчэ ў дзяцінстве, а замацоўваліся і развіваліся ў юнацтве.

Грамадская дзейнасць шляхціча была непасрэдна звязана з яго гендэрнымі ролямі. Ён мог удзельнічаць у палітычным жыцці, займаць дзяржаўныя і вайсковыя пасады. Роля рыцара была самай важнай і актуальнай для шляхецкага грамадства. Такія вайсковыя пасады, як гетман, палкоўнік, капітан, ротмістр і іншыя, даваліся набілітэту. Сармацкая культура стварыла ідэал рыцара, які павінен быў абараняць незалежнасць краіны, сям’ю і маёмасць у шматлікіх войнах. Цалкам адпавядалі вобразу ваяра Вітаўт, Стэфан Баторый, Канстанцін Астрожскі, Ян Караль Хадкевіч. Яны неаднаразова згадваліся ў тагачаснай літаратуры і сталі прыкладам для нашчадкаў[7]. Смелыя і таленавітыя ваяры былі запатрабаваныя, бо ў тыя часы войны з’яўляліся штодзённасцю і асноўнай гістарычнай падзеяй. Летапісы і хронікі звычайна звярталі ўвагу менавіта на гэта, іншым тэмам аддавалася вельмі мала месца. Па сутнасці, у той час гісторыяй называлі гісторыю вайны.

Вайсковыя рысы шляхціча таксама адлюстроўваліся ў партрэтах і надмагіллях. Большасць гэтых партрэтаў паказвае вайсковасць набілітэту. Гэтая рыса праяўляецца ў наяўнасці зброі (шаблі ці буздыгану) і рыцарскіх даспехаў. Так намаляваны канцлер ВКЛ Леў Сапега, вялікі гетман ВКЛ Канстанцін Астрож-

---

[6] Апошнюю ролю нельга атаясамляць з сучасным разуменнем палітычнага дзеяча, у дадзеным выпадку палітык – гэта асоба, якая ўдзельнічае ў грамадскім і палітычным жыцці краіны на мясцовым і дзяржаўным узроўнях.

[7] Stryjkowski M. Kronika.... Królewiec, 1582. S. 356–518, 544–546, 566–567; Kronika Macieja Stryjkowskiego niegdyś w Królewcu drukowana. Warszawa, 1766. S. 725–731; ПСРЛ. Т. 32. С. 127; ПСРЛ. Т. 35. С. 108–109, 125–127, 140–141, 162–163, 168–169, 230–231.

скі, мсціслаўскі ваявода Ян Завіша, віцебскі кашталян Мікалай Завіша, пінскі староста Уладзімір Ельскі, Юрый Радзівіл і інш. Герб, атрыбуты і подпісы на партрэтах дэманструюць грамадскі стан і сацыяльную ролю мадэлі. Вайсковыя, дзяржаўныя, мецэнацкія дасягненні паказвае партрэт Януша Скуміна Тышкевіча ў старадруку з нагоды атрымання ім пасады віленскага ваяводы[8].

Надмагіллі ўвасаблялі патрыятычную ідэю рыцара, абаронцы сваёй зямлі. Сярод помнікаў вылучаюцца пахаванні віцебскага кашталяна М. Вольскага і яго жонкі (в. Крамяніца), канюшага ВКЛ П. Сапегі (в. Гальшаны, цяпер у Музеі старажытнабеларускай культуры)[9]. Шэраг помнікаў можна пабачыць у касцёлах Вільні.

Не менш важнай для шляхціча была палітычная дзейнасць. У мужчынскіх казаннях на смерць хоць і ў ідэалізаванай форме, але таксама адзначалася гэта сфера жыцця. Аўтары твораў прасочвалі ўсе этапы станаўлення асобы як палітыка. Толькі шляхта магла абірацца на сеймы і сеймікі, атрымліваць дзяржаўныя пасады. З маладых гадоў шляхціч атрымліваў адукацыю, якая дазваляла быць прафесіяналам у палітыцы. Яго вучылі юрыдычным навукам, рыторыцы, мовам і іншаму, бо для ўдзелу ў палітычным жыцці краіны неабходна была добрая адукацыя. Высокі адукацыйны ўзровень таго ці іншага шляхціча часта адзначаецца ў розных крыніцах. Пасады дзяліліся на дзяржаўныя і мясцовыя, зразумела, што найбольш прэстыжнымі лічыліся дзяржаўныя. За іх змагаліся шляхцічы з самых уплывовых родаў. Шлюбныя стратэгіі таксама ўлічвалі пасады, якія займалі сваякі з боку жаніха і нявесты.

Поліканфесійная сітуацыя XVI ст. спрычынілася да таго, што на рэлігійнасці шляхецкага саслоўя ўвага не акцэнтавалася, але з перамогай Контррэфармацыі тэндэнцыі ў грамадстве змяніліся. Пастутова з другой паловы XVI ст. уласцівай шляхцічу рысай становіцца рэлігійнасць. Роля мецэната дасягае свайго росквіту ў XVII ст. Знешняй яе праявай была мецэнацкая дзейнасць: фундацыя цэркваў, касцёлаў або збораў, іх фінансавая падтрымка, выданне палемічных і рэлігійных твораў за свой кошт, падтрымка друкарні. У штодзённым жыцці шляхціч наведваў храм, прытрымліваўся рэлігійных традыцый і звычаяў. Ён нават імкнуўся добра памерці, як патрабавала рэлігія. На сённяшні дзень захавалася шмат дакументаў, якія пацвярджаюць мецэнацкую дзейнасць шляхты ўсіх веравызнанняў: праваслаўных, каталікоў, пратэстантаў, уніятаў, а таксама шляхты рознага стану заможнасці ад магнатэрыі да засцянковай шляхты. Напрыклад, віленскі кашталян Мікалай IV Глябовіч пасля пераходу з кальвінізму ў каталіцызм праявіў сябе ў пераўтварэнні кальвінскага збору ў Заслаўі

[8] Izdebski A. Phaenomena seu aspectus felicissimi syderu[m] ... Ianussii Skumin Tiszkiewicz, palatini Vilnensis, Bracla., Iurbor., Novovo. etc. capitanei. Vilnae, 1641; Kuran M. Mecenat kulturalny Janusza Skumina Tyszkiewicza. Aspekt wizualny druków naukowych i okolicznościowych // Socialinių tapatumų reprezentacijos Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kultūroje. Dailės istorijos studijos 2010. № 4. P. 97–99.

[9] Хадыка А. Ю., Хадыка Ю. В. Непаўторныя рысы: з гісторыі беларускага партрэта. Мінск, 1992. С. 62–64, 97–98, 123–124; Гістарычны партрэт Вялікага княства Літоўскага XVI–XVIII стагоддзяў. Мінск, 2003; Лявонава А. К. Скульптурныя надмагіллі Беларусі канца XVI – першай паловы XVII ст. // Помнікі старажытнабеларускай культуры. Новыя адкрыцці. Мінск, 1984. С. 60–65; Šinkūnaitė L. XVII a. Lietuvos portretas. Vilnius, 2000. p. 34–52, 74–86.

ў касцёл, у фундацыі кляштара Св. Тройцы ў Дуброўне, заснаванні брацтва Св. Мікалая ў Смаленску[10].

Галоўным у сям'і з'яўляўся мужчына. Звязана гэта было з яго статусам у грамадстве, шырокімі палітычнымі і юрыдычнымі правамі. Ён павінен быў выконваць ролі мужа і бацькі, абараняць інтарэсы сям'і ва ўсіх сферах, быў адказны за маёмасны стан сям'і і захаванне спадчыны для нашчадкаў. Агульнапрыняты ўзор шляхціча-мужа патрабаваў добрага стаўлення да жонкі. У сваіх дзённіках, успамінах і мемуарах шляхцічы выказвалі сімпатыю да жонак[11].

З нараджэннем дзіцяці мужчына набываў новую ролю. Ён станавіўся бацькам. Шляхцічы неабыякава ўспрымалі з'яўленне на свет нашчадкаў, асабліва мужчынскага полу. У дзённіках і мемуарах аўтары фіксавалі галоўныя, на іх погляд, падзеі: нараджэнне дзяцей, выпраўленне іх на адукацыю і ў вандроўкі, шлюб, нараджэнне ўнукаў. Перыяд дзяцінства, як правіла, абмінаўся. Мужчыны не рабілі замалёўкі пра нейкія здарэнні з дзецьмі, іх учынкі і інш. Актыўны ўдзел бацькі ў жыцці дзяцей пачынаўся пасля дасягнення імі падлеткавага ўзросту. Прыклад клопату пра дзяцей зафіксаваны ў "Admonitoryum" М. К. Радзівіла Сіроткі, дзе вельмі падрабязна распісаны адукацыя і выхаванне сыноў (1603)[12]. Што датычыць дачок, шляхціч меў абавязак выдаць іх замуж і даць пасаг[13]. У выпадку, калі ён не мог сам выканаць свой бацькоўскі абавязак, то для гэтай мэты прызначаў у тастаменце апекуноў[14].

Не менш важнай функцыяй для мужчыны была функцыя гаспадара. Самастойна ці з жонкай шляхціч купляў і прадаваў маёнткі, браў пазыкі ці даваў сам, сачыў за агульным станам гаспадаркі, наведваў фальваркі. Ён здзяйсняў кантроль над агульным функцыянаваннем феадальнай эканамічнай адзінкі. Жонка больш займалася ўнутранымі гаспадарчымі справамі.

У працэсе фарміравання роляў былі задзейнічаны разнастайныя грамадскія сферы: палітыка, культура, рэлігія, адукацыя, выхаванне і інш. Іх узаемадзеянне дало гендэрны канструкт мужчынскасці ў ВКЛ. Сапраўдны шляхціч у вачах грамадства быў рыцарам, абаронцай, дзяржаўным дзеячам, добрым сем'янінам, рэлігійным чалавекам. Гэты эталон быў выпрацаваны на працягу XVI ст., набыў сваё развіццё ў XVII ст. і стаў неад'емным элементам шляхецкай культуры.

*Мужчына-мешчанін.* Статус і магчымасці мешчаніна залежалі ад горада пражывання, яго велічыні і падпарадкавання. Свае асаблівасці мелі гарады з магдэбургскім правам, прыватныя гарады, мястэчкі. Прывілеяваны статус

[10] Wawrzynec X. Senator w Jasnie Wielmożnym Panu JMP Mikołai IV Hlebowiczu na Dabrownie Kasztelanie Wileńskim, Oniksztyńskim, Radoszkowskim starosce oraz dworanin pokoiowy JKM w Wielmożnym panie Janie Hlebowiczu na Dabrownie synu kasztelіana pomienionego. Wilno, 1633.

[11] Pamiętnik Teodora Jewłaszewskiego nowogrodskiego podsędka. 1546–1604. Wilno, 1860. S. 30–31; Niezabytowski S. Dzienniki 1695–1700. Poznań, 1998. S. 75, 77, 89, 109, 135, 142, 163, 170, 184, 289.

[12] Archiwum domu Radziwiłłów. T. 8. Kraków, 1885. S. 58–69.

[13] Сліж Н. Выхаванне асобы ў шляхецкай сям'і // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёна Беларусі. Матэрыялы Міжнароднай канферэнцыі. Брэст, 1998. С. 62–66.

[14] Сліж Н., Гардзееў М. Шляхецкія тэстаменты 16 – пачатку 18 ст. // Гістарычны альманах. Т. 3. Гародня, 2000. С. 90–110.

мела Вільня. Яе ўраднікі атрымалі шляхецтва і мелі права рэпрэзентаваць свае інтарэсы на соймах.

Асноўным заняткам мяшчан былі рамяство і гандаль. Акрамя таго, яны маглі быць задзейнічаны ў сістэме кіравання горада і займаць пасады (бурмістра, лаўніка, радцы, пісара, шафара). Адміністраванне горада было цалкам мужчынскай сферай. Магдэбургскае права рэгламентавала правілы паводзінаў мяшчан у грамадстве.

Статуты не толькі рэгулявалі адносіны ўнутры цэха, але і стваралі своеасаблівы ідэал рамесніка. Ён павінен быў якасна выконваць сваю працу, удзельнічаць у жыцці цэха, выказваць павагу да калегаў, прыстойна сябе паводзіць на сходах. Гэтыя і іншыя патрабаванні ўтрымліваліся ў статутах. Пры парушэнні ўсталяваных артыкулаў выкарыстоўвалі розныя пакаранні, напрыклад штрафы, выгнанне з цэху. Рамесніцкая структура насельніцтва была вельмі развітой: злотнікі, кушнеры, муляры, шаўцы, краўцы і інш.[15]

Купцы з'яўляліся значнай сацыяльнай групай у многіх гарадах. Яны былі задзейнічаны ў міжнародным і рэгіянальным гандлі[16]. Паспяховыя купцы былі даволі заможнымі і ўплывовымі асобамі ў горадзе. Пры гэтым у сістэме гандлю склаліся свае адносіны. Дамовы афармлялі пісьмова, каб пры іх парушэнні можна было звярнуцца ў суд. Ковенскія мяшчане Бальцэр Медніцкі і Ганус Старк сведчылі, што нейкі нясвіжскі мешчанін Пётр Крыскі фрахтаваў тавар з Караляўца да Коўна на віціне Медніцкага на 8 лаштаў солі. Заплаціў частку грошай Старку, а Медніцкаму – нічога. Ад яго імя напісаў гарадзенскі бурмістр Адам Тарасевіч, каб купцы соль прывезлі да Гародні. Аднак па ранейшай дамове павінны былі прывезці толькі да Коўна. Каб пазбегнуць праблемаў ад Крыскага, актыкавалі гэта сведчанне (1606)[17]. Рэпутацыя сумленнага гандляра мела важнае значэнне ў асяроддзі. Але гэта не азначала, што не было купцоў, якія парушалі закон. Напрыклад, гандлёвыя і мытныя зборы змяншалі прыбытак, што правакавала пазбягаць мытных камор. Андрэй Казімір Скарабагаты, скарбнік ВКЛ, адміністратар тытунёвай манаполіі, падаў скаргу на гарадзенскага бурмістра Мікалая Васілевіча за нявыплату падатку на тытунь. Скарбовы Трыбунал ВКЛ наклаў штраф на яго маёмасць у памеры 4000 злотых (1682)[18].

[15] Akty cechów wileńskich 1495–1759 / Przyg. do druku. H. Łowmiański przy współudziale M. Łowmiańskiej i S. Kościałkowskiego. Poznań, 2006; Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов; НГАБ, КМФ-18, спр. 113, арк. 1 – 7 адв.; Цітоў А. Гарадзенскія злотнікі ў XVI – пачатку XX ст. // Гарадзенскі палімпсест 2012. Людзі даўняй Гародні / Пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. Гродна, 2013. С. 111–119; НГАБ, КМФ-18, спр. 85, арк. 337–338; Галубовіч В. Канфірмацыйныя прывілеі на цэх гарадзенскім шаўцам Жыгімонта (1609) і Уладзіслава Вазаў (1633) // Гарадзенскі палімпсест 2012. Людзі даўняй Гародні / Пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. Гродна, 2013. С. 129–130.

[16] Мелешко В. И. Торговые связи Могилева с городами Польши и Прибалтики во второй половине XVI – первой половине XVII в. // Acta Baltico-Slavica. T. 2. Białystok, 1965. S. 61–101; Mieleszko W. Handel i stosunki handlowe Białorusi Wschodniej. S. 53–90; Игнатенко А. П. Русско-белорусские торговые связи во второй половине XVII в. Вопросы истории Белорусской ССР. Вып. 37. Минск, 1969. С. 18–57; Абецедарский Л. С. Торговые связи Белоруссии с Русским государством (вторая половина XVI – первая половина XVII в.) // Ученые записки БГУ. 1957. Вып. 6. С. 3–46 і інш.

[17] VUB, f. Kauno magistrato aktų knyga, 1606–08, l. 22–22v.

[18] НГАБ, ф. 1703, спр. 6, арк. 186 адв. – 187 адв.

Адураднікаў патрабавалася сумленна кіраваць горадам, адпаведна з заканадаўствам весці судовыя справы, збіраць падаткі і інш. Некаторыя ўраднікі для вырашэння фінансавых праблем горада выкарыстоўвалі свае грошы. Праца магістрата пільнавалася войтам, мяшчанамі. Пры парушэнні заканадаўства была магчымасць абскардзіць дзеянні ўраднікаў. Напрыклад, гарадзенскі войт Канстанцін Александровіч падаў пратэстацыю на былых бурмістраў Ганусa Паўльсена і Яна Зеляпугу, якія не зрабілі справаздачу за мінулы год (1661). У 1662 г. у гэтым парушэнні абвінавачваліся Ян Адамовіч і Пётр Ляўковіч[19].

Вайсковасць сярод мяшчан не культавалася, так як у шляхецкай культуры, але мела месца. Гэта саслоўе мела права насіць зброю і часам выкарыстоўвала яе для вырашэння прыватных канфліктаў[20]. Мяшчане Віцебска былі абавязаны несці вайсковую службу. Вылучалася асобная сацыяльная група "конныя мяшчане". Іх заслугі былі адзначаны падчас Смаленскай вайны 1632–1634 гг.[21] Віцебск межаваў з Маскоўскім княствам, нясенне вайсковай службы было неабходнасцю. Мяшчане вызначыліся пры абароне сваіх гарадоў ад маскоўскіх войскаў падчас вайны 1654–1667 гг. Патрыятычнае стаўленне да месца свайго пражывання было ўласціва мяшчанам, бо для іх абараніць свой горад азначала захаваць жыццё і маёмасць.

Рэлігійнасць мела важнае значэнне для мешчаніна, таксама як і абарона свайго веравызнання. У магістраты абіраліся парытэтна праваслаўныя і каталікі. Цэхі таксама падзяляліся згодна з веравызнаннем (напрыклад, у Вільні, Берасці). Гарады бралі ўдзел у канфліктах, звязаных з прыняццем Берасцейскай уніі, наступам Контррэфармацыі.

Мешчанін быў абавязаны праяўляць сваю рэлігійнасць. Гэта дэкларавалася нават цэхавымі статутамі. Рамеснікі павінны былі наведваць храм, даваць грошы на свечкі, утрымліваць алтар. Напрыклад, Фара Вітаўта ў Гародні была гарадскім храмам, у якім знаходзіліся цэхавыя алтары, да таго ж тут былі месцы пахаванняў мяшчан. Традыцыйным стала ў тастаментах рабіць запісы на карысць храмаў[22]. У казаннях на смерць віленскіх мяшчан Юрыя Штрунка і Якуба Гіблы аддавалася ўвага іх веры, падтрымцы храма[23].

У сям'і ад мешчаніна чакалася адпаведнае выкананне ролі гаспадара, мужа і бацькі. Ён павінен быў сваёй працай забяспечыць жонку і дзяцей. Гэта можна пабачыць у тастаментах. Мешчанін быў абавязаны выхаваць дзяцей, даць ім адукацыю і маёмасць, ажаніць ці выдаць замуж. Ён павінен быў клапаціцца пра

---

[19] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 45 адв., 53–54, 58, 111 адв., 121, 124.

[20] Сліж Н. Злачынства і злачынцы ў Гародні ў XVII ст. // Arche. Гарадзенскі міленіум. 2014. № 11. С. 122–182.

[21] Макараў М. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. Мінск, 2008. С. 100, 110.

[22] Sliž N. Testamenty mieszczan grodzieńskich w pierwszej połowie XVII w. // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. 2013. T. 61. Z. 2. S. 307–309; Сліж Н. Тэстамент берасцейскага бурмістра Станіслава Баброўскага, 1639 г. // Białoruskie Zeszyty Historyczne = Беларускі гістарычны зборнік. 2014. № 42. С. 9, 15.

[23] Frick D. Wilnianie. Żywoty siedemnastowiecznie. Warszawa, 2008. S. 54–55, 70–71.

жонку і пакінуць ёй забеспячэнне на выпадак сваёй смерці[24]. Марнатраўства маёмасці, злоўжыванне алкаголем вельмі негатыўна ўспрымалася ў грамадстве і сям'і, лічылася разбуральным[25].

Пералічаныя вышэй ролі згадваюцца ў казаннях на смерць. Так, віленскі мешчанін Юрый Штрунк быў паказаны як адукаваны купец, які вучыўся сваёй справе, добры муж і бацька, а таксама як шчыры вернік. Віленскі бурмістр Якуб Гібла характарызаваўся як адукаваная асоба (атрымаў адукацыю за мяжой), добры муж, рэлігійны чалавек, добры ўраднік у магістраце[26]. Пра віленскага купца Сымона Энгельбрэхта казалі, што ён паходзіў з прыстойнай сям'і: бацька Сымон быў купцом і годным чалавекам, а маці Крысціна Літавоўна – набожнай жанчынай. Для навучання купецкім справам бацька адправіў яго ў Гамбург. Шмат увагі аддадзена рэлігійнасці Энгельбрэхта, а таксама апісана яго годная хрысціянская смерць[27]. Згаданыя мяшчане вызнавалі лютэранства. Усе тры казанні на смерць напісаны адным аўтарам, для якога важна было падкрэсліць як рэлігійнасць прыхаджан, так і адпаведнае выхаванне, працу і сямейны стан. Нельга казаць, што складзеныя вобразы памерлых былі характэрны для ўсяго мяшчанства. Тым больш, што магчымасць надрукаваць казанні мелі далёка не ўсе. Вільня была самым заможным горадам, аднак і тут мы маем адзінкавыя прыклады казанняў.

Магдэбургскае права адназначна ўсю адказнасць за сям'ю ўскладала на мужчыну. Жанчына не мела права без яго дазволу распараджацца сваёй маёмасцю[28]. Пры неабходнасці мужчына рэпрэзентаваў інтарэсы жонкі ў судзе. У Гарадзенскім магістраце Пётр Зубрыцкі ад імя жонкі Крысціны Адамовічаўны сцвярджаў, што яна не пазычала дзве бочкі жыта ў Яна Катовіча (1640)[29].

Для мяшчан шляхецкая культура была прыкладам, да якога варта імкнуцца. Таму ў пэўных момантах можна знайсці падабенства ў ідэалах. Але для мяшчанства быў уласцівы рацыяналізм і практычнасць, якія зрабілі непасрэдны ўплыў на сутнасць роляў у сям'і і грамадстве. У асяроддзі цаніліся рамеснікі, купцы, ураднікі, якія добра выконваюць сваю працу. Дабрабыт сям'і вельмі моцна залежаў ад адпаведнага выканання мужчынам ролі бацькі, мужа, гаспадара. Аднак такога культывавання вобразу мешчаніна, як вобразу шляхціча, не было. На гэта непасрэдным чынам паўплывала ніжэйшая сацыяльная прыступка мешчаніна.

---

[24] Sliž N. Testamenty mieszczan grodzieńskich. S. 305–316; Сліж Н. Тэстамент берасцейскага бурмістра Станіслава Баброўскага, 1639 г. С. 7–24.

[25] Алексейчикова Н. Влияние социально-бытовых отклонений на семейную жизнь белорусских горожан в XVI–XVIII вв. // Вестник Брянского государственного университета. 2014. № 2. С. 22–26.

[26] Schönflissius J. Ultimum hominis christiani symbolum albo kazanie pogrzebne przy obchodzie pogrzebu Jerzego Sztrunka. Jewie, 1634. S. C; Schönflissius J. Antidotum spirituale. To iest, Lekarstwo Duchowne na truciznę srogiey śmierci przy obchodzie pogrzebu niegdy pobożnego i Szlachetnego Męza Jego Mści Pana Jakuba Gibla Burmistrza Wileńskiego. Królewec, 1638. S. 15–20; Frick D. Wilnianie. S. 54–55, 70–71.

[27] Schönflissius J. Memoriał smiertelnosci na pogrzebie niegdy szlachetnego pana Simona Engelbrechta kupca wileńskiego w Krolewcu w tym roku 1635. Junij. [Wilno], 1635.

[28] Напрыклад, у магістрацкіх кнігах Гародні жанчына рэдка калі фігуруе самастойна. НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1–3.

[29] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 126 – 126 адв.

*Мужчына-селянін.* Вывучэнне гендэрных роляў селяніна сутыкаецца з шэрагам праблемаў. Па-першае, крыніцы, створаныя шляхтай, даюць уяўленне пра сялян, якія адносна набілітэту знаходзіліся ў падпарадкаваным стане. Адпаведна, іх прыстасоўвалі да патрэб грамадства, навязвалі ролі і іх разуменне. Па-другое, самастойны голас сялян пра сябе, сваю ролю, адносіны з іншымі людзьмі вельмі слабы з прычыны адсутнасці прыватна-прававых дакументаў, якія былі б створаны імі. Сяляне ў асноўным фігуруюць у канфліктных сітуацыях праз скаргі ў копных судах[30].

Акрамя таго, само праяўленне мужчынскасці ў селяніна сутыкалася з умовамі існавання. Ён знаходзіўся ў прыгонным, падпарадкаваным стане, цалкам залежаў ад волі гаспадара. А гэта стварала неспрыяльную атмасферу для развіцця моцнага мужчынскага пачатку. Тут была запатрабавана пакора і падпарадкаванне. Паводле назіранняў Бернарда О'Конара селянін Вялікага Княства Літоўскага знаходзіўся ў значна горшым стане, чым селянін Польшчы. Ён працаваў без выходных. Пан мог зайсці ў яго дом, забраць, што яму падабаецца, і збіць[31]. Калі такія сітуацыі адбываліся, то селянін не мог выканаць функцыю абаронцы. Не дзіўна, што падчас войнаў сяляне выступалі супраць шляхты.

У першую чаргу селянін выконваў ролю гаспадара. Ён быў абавязаны займацца сельскагаспадарчымі працамі ў маёнтку ўладальніка і ў сваім двары[32]. Селянін быў абмежаваны ў выкананні ролі гаспадара. Былі вызначаны падаткі, паншчына і інш. Выказванне "*мужик пакуль добрь пакуль есть отчичь*" (1540)[33] сведчыць, што свае абавязкі селянін павінен выконваць добра для дабрабыту свайго гаспадара. Адпаведна і сваю гаспадарку трымаць у парадку, каб мець магчымасць з яе плаціць падаткі. Адказным за яе быў менавіта мужчына, а жанчына ў якасці галоўнай магла выступаць толькі як удава. Маёмасць мела важнае значэнне для селяніна, бо зараблялася цяжкай працай. Таму большасць спрэчак, якія ўзнікалі ў сялянскім асяроддзі, былі выкліканы маёмаснымі пытаннямі.

Асобную праслойку сярод сялян можна ўмоўна назваць грамадскімі дзеячамі. Да іх адносім старцаў, якія абіраліся для кіравання ў воласці. Як правіла, гэта былі мужчыны ва ўзросце, якія ўдзельнічалі ў працы копнага суда, яны карысталіся павагай сярод сялян, вылучаліся арганізацыйнымі і інтэлектуальнымі здольнасцямі. На судзе прысутнічала ўся грамада, а сур'ёзныя злачынствы разбіраліся ў прысутнасці гродскіх ураднікаў[34].

---

[30] АВАК. Т. 18. Акты о копных судах. Вильна, 1891; Черкаський І. Громадський (копний) суд на Україні-Русі XVI–XVIII вв. // Праці комісії для виучування західньо-руського та вкраїнського права. Київ, 1928. Вип. 4. С. 190–214.

[31] O'Connor B. Historia Polski / Tłum. W. Duży, T. Falkowski, P. Hanczewski, K. Pękacka-Falkowska. Warszawa, 2012. S. 495.

[32] Лойка П. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі; Голубеў В. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне.

[33] АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890. С. 120.

[34] АВАК. Т. 18. Вильна, 1891; Черкаський І. Громадський (копний) суд. С. 97–123; Буцін Д. С. Склад удзельнікаў копнага суда на беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага (XVI–XVII стст.) // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 5. Мінск, 2010. С. 9–18.

Функцыю ваяра і абаронцы селянін у штодзённым жыцці выконваў рэдка. Пры нападзе на яго ці на яго гаспадарку ён практычна быў ахвярай. Ваяўнічасць праяўлялася толькі пры адпаведных умовах. Напрыклад, падчас казацка-сялянскіх войнаў 1648–1651 гг. сяляне далучыліся да казацкіх атрадаў. У вайну 1654–1667 гг. праявілася сялянская здольнасць да збройнага супраціву. З 1654 г. пачынаюцца бунты супраць шляхты[35]. Сяляне ставіліся варожа да сваіх гаспадароў і чакалі прыходу маскоўскіх войскаў[36]. У Менскім ваяводстве Дзяніс Мурашка прычыніўся да падбухторвання сялян супраць гаспадароў. Яны пачалі рабаваць маёнткі[37]. Жорсткасць абыходжання маскоўскіх войскаў з сялянамі[38] прымусіла змяніць іх стаўленне да новай улады. Ян Цадроўскі адзначаў, што прыблізна 20 чалавек шляхты і столькі ж сялян з Плешчаніц аб'ядналіся і разбілі маскоўскую пяхоту каля Каменя Харэцкага (1658)[39]. Гэта не адзіны выпадак удзелу сялян у вайсковых выправах супраць маскавітаў. Паны маглі задзейнічаць сялян у вырашэнні сваіх канфліктаў з суседзямі. Пры нанясенні шкоды сялянскай гаспадарцы ўладальнікі падавалі скаргі ў суд і патрабавалі кампенсацыі. Але гэта не праяўленне чалавечага стаўлення да падданых, а хутчэй звязана з тым, што маёмасць пана панесла страты[40]. Найбольш распаўсюджанай формай супраціву сялян былі ўцёкі ў горад ці ў іншую гаспадарку, адмова выконваць працу, збіццё панскіх слуг, скаргі[41].

Малая прысутнасць функцыі ваяра ў сялянскай культуры адмоўным чынам паўплывала на агульную мужчынскасць беларускай нацыі. Ліквідацыя шляхты, пераарыентацыя рэшткаў шляхты на польскую культуру, слабая прысутнасць мяшчанскай культуры і дамінаванне культуры сялян прывялі да дэградацыі вайсковага пачатку ў мужчынах.

Рэлігійнасць селяніна была не такая, як у шляхты і мяшчан. Нават у XVIII ст. значную ролю ў сялянскім светапоглядзе займалі язычніцкія вераванні[42]. Веравызнанне сялян залежала ад таго, якой рэлігійнай плыні хрысціянства трымаўся ўладальнік маёнтка. Істотную ролю адыгрывала геаграфічная даступнасць храма. Чым далей ён знаходзіўся, тым радзей яго наведвалі. Не лічылася абавязковым вянчацца і хрысціць дзяцей[43]. У жыцці селяніна большае значэнне меў матэрыяльны бок, чым рэлігійны. Гэта было звязана з ладам жыцця, працай, вялікай занятасцю.

---

[35] Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII в. Москва, 1974. С. 64.

[36] Абецедарский Л. С. Белоруссия и Россия: очерки белорусско-русских связей второй половины XVI–XVII в. Минск, 1978. С. 150.

[37] Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мінск, 1983. С. 129.

[38] Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667. С. 64.

[39] Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. С. 129–130.

[40] АВАК. Т. 6. Акты Брестского гродского суда (поточные). Акты брестского подкоморского суда. Акты Брестской магдебургии. Акты Кобринской магдебургии. Акты Каменецкой магдебургии. Вильна, 1872. С. 23–25, 28–29, 45–46, 64, 120–121; АВАК. Т. 22. Акты Слонимского земского суда (1555–1570). Вильна, 1895. С. 199–200, 255–256 і інш.

[41] АВАК. Т. 6. Вильна, 1872. С. 34, 65, 70–71, 88, 94–95, 101–102; LMAVB, f. 16-52, l. 1–17.

[42] Лісейчыкаў Дз. В. Забабоны і цуды ва уніяцкіх парафіях Беларусі XVIII – пачатку XIX ст. // Архіварыус. Вып. 5. Мінск, 2007. С. 188–198.

[43] Голубеў В. Ф. Сялянская сям'я ў Беларусі ў эпоху феадалізму: праблемы і перспектывы даследавання // Гістарычна-археалагічны зборнік. Мінск, 2014. С. 73.

Змест роляў бацькі і мужа фарміраваўся пад уплывам традыцый, звычаяў, рэлігіі. Сямейнае жыццё часам залежала ад панскай волі, бо шлюб паміж падданымі розных гаспадароў заключаўся з іх згоды. Дабрабыт сялянскай сям'і непасрэдна залежаў ад наяўнасці ў ёй моцнага і здаровага мужчыны, які здольны выконваць цяжкую працу. Пры выразным гендэрным падзеле працы гэта мела важнае значэнне. Аднак дэталёва ўявіць выкананне гендэрных роляў мужчыны ў сям'і складана – захавалася мала дакументаў па сямейных справах. Трапляюцца, аднак, выпадкі здрады сям'і з боку мужчын. Так, селянін Сац з сяла Ужкаў маёнтка Новы Воўчын (Берасцейскі павет) абакраў сваю сям'ю, кінуў жонку Марту Сідараўну, яе дзвюх дачок, свайго сына ад першага шлюбу – і збег (1612)[44].

*Жанчына-шляхцянка.* Непасрэдна жаночай сферай, незалежна ад саслоўя, з'яўлялася сям'я. Менавіта тут жанчыне былі адведзены галоўныя ролі: дачкі, жонкі, маці, гаспадыні. У грамадскім жыцці шляхцянка рэалізоўвалася як мецэнатка. Статус шляхцянкі значна павышаўся, калі яна выходзіла замуж. Жанчына атрымлівала магчымасць самой кіраваць у новай сям'і. Шлюб даваў ёй правы самастойна выступаць у эканамічнай, юрыдычнай, сацыяльнай, рэлігійнай, культурнай сферах.

Выдатна жаночыя вобразы паказаны ў панегірыках. Пры характарыстыцы жыцця шляхцянкі галоўнай ніццю праходзіць шлюб, муж, дзеці і іх выхаванне, рэлігія. Менавіта так была прадстаўлена ў панегірыку Альжбета Шыдлавецкая. Яе шлюб з Мікалаем Радзівілам выглядае ідэальным. Яны кахалі і разумелі адзін аднаго, захоўвалі вернасць. У яго можна было навучыцца, як трэба кахаць жонку, а ў яе – мужа. За 14 гадоў супольнага жыцця ў іх нарадзілася 9 дзяцей. Альжбета была ўзорнай маці, якая добра выхавала дзяцей. Перад смерцю яна паклікала іх да сябе, благаславіла, наказала старэйшай дачцэ быць прыкладам для малодшых сясцёр. Усім дзецям было сказана, каб яны Святое Пісанне чыталі, Бога шанавалі, бацьку выказвалі павагу[45]. Гэта вельмі яскравы ўзор жонкі і маці, які можна разглядаць як інструкцыю для іншых шляхцянак.

"Каронай для свайго мужа" браслаўскага харужага Пятра Міхала Паца (?–1696) была Тэкля Валовічаўна. Каханы муж быў для яе дарам ад Бога. Разам з ім яна дачакалася дзяцей і ўнукаў. Яна характарызавалася як мудрая, кемлівая, цнатлівая, добра выхаваная кабета[46]. У гэтых і іншых казаннях пры апісанні жыцця шляхцянкі аўтары звярталі ўвагу на яе характар і ўнутраны свет, бо гэта былі яе асноўныя каштоўнасці. На яе ўскладалася адказная роля быць носьбітам найлепшых чалавечых якасцей. Гэтыя ідэалізаваныя жаночыя вобразы паказвалі, якія рысы характару цаніліся ў жанчыне, якія функцыі яна павінна была выконваць у сям'і і грамадстве.

Пацвярджэнне добрага выканання ролі жонкі паказваюць тастаменты. Шмат мужчын выказвалі ўдзячнасць сваім жонкам. Чачэрскі і прапойскі староста, по-

[44] АВАК. Т. 6. Вильна, 1872. С. 94–95.

[45] Bazilik C. Krótkie opisanie sprawy. S. 6–11.

[46] НГАБ, ф. 694, воп. 1, спр. 459.

лацкі кашталян Юрый Зяновіч падарыў рухомыя рэчы і маёмасць сваёй "*мілай пані Ганне Слушчанцы, якая шчыра і верна кахала, ва ўсім цнатлівае захаванне і старанне, якое яна з кахання шлюбнага свайго рабіла, робіць і рабіць не перастае, як у здароўі, так і ў хваробе маёй, пільна імкнецца і ратуе здароўе маё, не лянуючыся брацца за цяжкія працы, якія парушаюць яе здароўе*"[47]. Таксама пра добрае стаўленне да жонак сведчаць даравальныя запісы. Шляхцічы дарылі маёнткі, грошы, рухомыя рэчы за каханне, вернасць, добрае супольнае жыццё ў шлюбе, дапамогу падчас хваробы[48].

Тагачасныя творы адзначалі, што самая важная роля кожнай жанчыны – роля маці[49]. Пра Марыну Абрынскую напісалі, што яе жывот залаты, бо нарадзіла сыноў. Сыны – гэта нашчадкі, якія працягваюць род; паводле тагачасных уяўленняў нараджэнне сыноў вызваляла жанчыну ад першароднага граху. З чатырох сыноў двое абралі манаскае жыццё: Ян быў капланам у Смаленску, пасля – у Вільні, а Мікалай прыняў пострыг у базылянскім ордэне. Служэнне Богу сыноў значна падвышала ролю Марыны як іх маці. Юрый і Яраслаў абралі свецкі лад жыцця. З дачок толькі Алена стала манашкай полацкага кляштара. Ганна выйшла замуж за аршанскага земскага пісара (1632) і падкаморыя Яна Гектара Падбярэзскага, яе старэйшы сын стаў манахам езуіцкага ордэну. Зафея стала жонкай аршанскага скарбніка Ломскага[50].

У казаннях на смерць акцэнтавалася ўвага на рэлігійнасці шляхцянак. Лічылася добрай справай наведваць храм, дапамагаць жабракам, рабіць ахвяраванні на карысць рэлігійных устаноў. Дакументы сведчаць, што шмат шляхцянак рэалізоўвалі сябе ў рэлігійным мецэнацтве, займаліся фундацыямі самастойна ці з мужамі. Навагарадскі кашталян Аляксандр Іванавіч Палубінскі і Зафея Юр'еўна Гальшанская запісалі віленскаму Свята-Троіцкаму праваслаўнаму брацтву маёнтак Судэрвы ў Віленскім павеце на заснаванне там праваслаўнай школы (1593). Троцкі падкаморы Багдан Мацвеевіч Агінскі (?–1625) і Раіна Грыгораўна Валовічаўна пабудавалі ў сваім маёнтку Еўе (Троцкі павет) праваслаўную царкву. У 1619 г. яны вырашылі перадаць ёй гэты маёнтак і маёнтак Алесніцкі, каб там заснавалі манастыр, школу, друкарню. Праз 14 гадоў, калі муж ужо памёр, Раіна зноў пацвердзіла фундуш, падарыла 6000 злотых і Евейскую пушчу[51].

Дакументы паказваюць рэалізацыю розных роляў жанчыны, у тым ліку і гаспадыні. Напрыклад, гэта адлюстравалася ў перапісцы з ураднікам Марыі

---

[47] Augustyniak U. Testamenty ewangelików reformowany w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI–XVII wieku. Warszawa, 2014. S. 26–35.

[48] AGAD, AR, dz. X, sign. 50; НГАБ, ф. 1741, воп.1, спр.1, арк. 379 адв.; ф. 1785, воп. 1, спр. 12, арк. 41 – 41 адв., 67 адв., 147 – 147 адв., 183 адв. і інш.

[49] Lawski A. Pociecha duchowna. Kraków, 1614; Woyniłowicz M. Trop sprzęgłego przez śmierć cugu sześci rodzonych braci w Ich MM. PP. Władysława, Samuela, Krysztapha, Tomasza, Kazimira, Iana Wilczkow. Wilno, 1666.

[50] Ostrożanski S. Kłosy złote przy pogrzebie JMP Maryny Obrynskiey Jarosławowey Sokolinskiey kniehyni Drudzkiey, Podwoiwodziney Połockiey położne na trunie. Wilna, 1640.

[51] АВАК. Т. 11. Акты Главного литовского трибунала. Вильна, 1880. С. 46–50, 55–58, 85–92.

Багданаўны Жаслаўскай[52], у дакументах Гальшкі Гаслаўскай[53]. Эканамічная актыўнасць шляхцянак нічым не абмяжоўвалася. Яны ўдзельнічалі ў фінансавых аперацыях нараўне з мужчынамі. Шляхцянкі мелі права прадаваць, дарыць, пазычаць без дазволу мужа.

Такім чынам, шляхцянка ўяўлялася ў грамадстве як жонка, маці, гаспадыня, мецэнатка. Яе асноўная актыўнасць была сканцэнтравана на сям'і. Ідэальная шляхцянка павінна была адпавядаць мужу, выхоўваць дзяцей, кіраваць гаспадаркай і, вядома, быць рэлігійнай.

*Жанчыны-мяшчанкі.* Саксонскае Люстра і Вайхбільд адрозніваліся ад Статутаў у трактаванні статусу жанчыны, яе правоў і абавязкаў. Паводле заканадаўства мяшчанка была практычна пазбаўлена юрыдычнай і эканамічнай самастойнасці. Яна заўсёды знаходзілася ў апецы ў сваёй сям'і, у мужа, а пасля яго смерці – у апекуноў. Мяшчанка не мела права сама распараджацца сваёй маёмасцю без апекуна ці мужа. На судзе яна не магла сама прадстаўляць свае інтарэсы ці падаваць дакументы (Саксонскае Люстра, ч. 1, арт. 45, 46). Фактычна магдэбургскае права разглядала жанчыну як недзеяздольную асобу[54].

Літаратурных твораў, якія б паказвалі вобразы мяшчанак, захавалася мала. У рукапісе ксяндза Барталамея Вышамерскага сярод іншых утрымліваюцца казанні на смерць гарадзенскіх мяшчанак Юстыны Шульцаўны, жонкі Крыштафа Фіселя, і Кацярыны Дорбахаўны, жонкі злотніка Годфрыда Варланга (1674)[55]. Абедзве жанчыны належалі да элітнай часткі мяшчан. Аднак у абодвух тэкстах больш увагі аддаецца рэлігійнаму моманту падзеі.

Мяшчанкі не мелі магчымасці займаць пасады. Яны былі практычна выключаны з адміністрацыйнай сістэмы кіравання. Жанчыны не сустракаюцца ў якасці сведак у дакументах, але выступаць сведкамі ды ініцыяваць судовую справу яны маглі[56]. Як правіла, гэта мела месца ў справах крымінальнага характару. Адпаведна мы не можам казаць пра выкананне імі сацыяльна значных роляў. Акрамя таго, для гэтага патрабавалася адукацыя, а мяшчанкі ў сваёй большасці былі неадукаваныя. Адукацыя каштавала дорага, не ўсе яе маглі дазволіць нават для сыноў. У прыватна-прававых дакументах, дзе быў патрэбны подпіс, за жанчын часта падпісваліся ўраднікі. Намі быў выяўлены толькі адзін дакумент з гарадзенскага магістрата з подпісам мяшчанкі Кацярыны Дахновічаўны за 1655 г.[57]

---

[52] AGAD, Archiwum Potockich z Radzynia, sign. 295, k. 1–2.

[53] Сліж Н. Сямейнае і штодзённае жыццё Гальшкі Гаслаўскай // Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час: зборнік навуковых артыкулаў. Гродна, 2007. С. 270–277.

[54] Пра жанчын-мяшчанак больш падрабязна гл.: Karpavičienė J. "…Magdeburgo teisėje gerada turi dukrai tekti": turtinė moters padėtis Vilniuje ir Kaune XVI a. pirmojoje pusėje // Lituanistica. 2001. № 3 (47). P. 3–18; Karpavičienė J. Moters padėtis Kaune XVI a. pirmojoje pusėje: globėjiškas miesto teisės aspektas // Kauno istorijos metraščio. 2002. T. 3. P. 37–47; Karpavičienė J. Moteris Vilniuje ir Kaune XVI a. pirmojoje pusėje: gyvenimo sumiestinimo Lietuvoje atodangos. Vilnius, 2005.

[55] VUB, f. 3-2263, l. 58–61v, 80v–83.

[56] Сліж Н. Злачынства і злачынцы ў Гародні. С. 146, 152, 153, 157; Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 98–99, 543–544.

[57] LVIA, f. 694, ap.1, b. 4624, l. 4–5.

Мяшчанкі не ўваходзілі ў склад цэхавых структур. Статуты цэхаў не дазвалялі ім быць цэхмайстрамі, вучнямі, таварышамі мужчынам. Жанчыны ў дакументах фігуруюць як удовы. Яны маглі быць далучаны да рамяства і гандлю ў асноўным праз сям'ю. Адсутнасць адукацыі і гістарычныя ўмовы не давалі мяшчанкам актыўна ўдзельнічаць у сістэме кіравання горадам і яго эканамічным жыцці.

Асноўнай сферай дзейнасці мяшчанкі былі сям'я і гаспадарка. Гэта даказваюць даравальныя запісы, тастаменты, акты куплі-продажу, інвентары і інш. Але дакументы дазваляюць толькі ў некаторай ступені асвятліць жыццё мяшчанкі, бо сямейныя архівы не захаваліся.

Добрыя стасункі паміж мужам і жонкай пацвярджаліся дараваннем маёмасці, часам узаемнага. Перад войтаўска-лаўніцкім судом мяшчане Ян Тарасовіч і Агнешка Мацееўна публічна вызналі праз шляхціча Якуба Клюкоўскага, што рухомая і нерухомая маёмасць Яна ў выпадку смерці пераходзіць жонцы, тое самае прадугледжвалася ў выпадку яе смерці (1588)[58]. З той жа прычыны Крысціна Вербікоўна і Андрэй Філіповіч сведчылі перад смерцю перад гарадзенскім наместнікам Андрэем Грушчынскім пра запіс адно другому сваёй маёмасці (1657)[59]. Такія выпадкі мелі месца ў бяздзетных сем'ях.

Адмысловыя даравальныя запісы сустракаюцца рэдка, часцей запісы на карысць жонак змешчаны ў тастаментах. Калі ў сям'і не было дзяцей, то асноўная маёмасць пакідалася жонцы. Напрыклад, гарадзенскі мешчанін Мікалай Ляховіч запісаў палову дома жонцы Альжбеце Кроснеўчанцы, а палову – гарадзенскаму бернардынскаму касцёлу (1640)[60]. Гарадзенская мяшчанка Магдалена Цвіклянка стала асноўнай спадчынніцай мужа Юрыя Стрэчня. Яна атрымала 3,5 валокі ў Адамовічах з будынкамі, пчоламі, свойскай жывёлай. Муж запісаў ёй гэту маёмасць навечна, бо яна ўнесла пасаг памерам 1000 злотых (1664)[61]. Мяшчане таксама пакідалі маёмасць жонцы, калі ў іх былі супольныя дзеці. Магілёўскі бурмістр Акула Васілевіч Пірог жонцы Анушы за добрае стаўленне запісаў 20 коп літоўскіх грошаў і футра (1579)[62].

Па дакументахназіраецца, што для мяшчан мела важнасць сям'я, якую яны стваралі самі. Калі маёмасць нажылі разам з жонкай, то зразумела, што яна станавілася спадчынніцай. Пры гэтым важнае значэнне мелі адносіны, якія склаліся падчас супольнага пражывання. У бяздзетнай шляхецкай сям'і нерухомасць пераходзіла сваякам, бо яна павінна была застацца ў родзе. Для мяшчанскай сям'і родавая гісторыя не адыгрывала такой важнай ролі. Больш цаніліся тыя, хто побач. Калі ў сям'і нараджаліся дзяўчынкі, то яны і станавіліся спадчынніцамі. Гарадзенскі мешчанін Якуб Гукнейка дом з паловай пляца пакінуў жонцы Кацярыне Пушкоўне пажыццёва, а пасля яе смерці ён дзяліўся паміж дочкамі Марынай і Крысцінай. Іншыя дзве дачкі (Кацярына, жонка

[58] LVIA, f. 1282, ap. 1, b. 11218.

[59] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 25 адв. – 26.

[60] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 163 адв. – 164, 168 адв. – 169.

[61] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 91 адв. – 92 адв.

[62] АВАК. Т. 39. Акты Могилевского магистрата XVI в. (1578–1580). Вильна, 1915. С. 403–404.

Аляксандра Карповіча, Барбара, жонка сталяра Грыгора Чаховіча) і падчарка (Цэцылія, жонка Казіміра Вінаградскага) былі замужам і таму маёмасць ужо атрымалі (1672)[63].

Нараканні мужоў выклікалі непрыстойныя паводзіны жонкі. У справе пра развод гарадзенскі мешчанін Багдан Хведкевіч так казаў пра сваю жонку Аўдоццю Валадкоўну: "*за 22 год жона моя смачно ела и пила, и в красне ходила, во всими вживала с ким хотела, а я в пашни надзовал и робил яко холоп одну скитеру мне даст тым и кормлюся*" (1540)[64]. У справе тлумачылася, што за ўсе гады супольнага жыцця яна марнавала грошы і не клапацілася пра мужа, не дбала пра гаспадарку. У выніку гэта прывяло да разводу. За неадпаведныя паводзіны жонку маглі адлучыць ад маёмасці. А вось іншы выпадак. Фёдар Барсуковіч, бурмістр, перад вайной 1654–1667 гг. узяў другі шлюб, які аказаўся няўдалым. У сваім тастаменце Фёдар абвінавачваў жонку ў п'янстве, марнатраўстве, давядзенні сям'і да галоты. Таму яна была адлучана ад спадчыны. Жонка была пры складанні тастамента і казала, што калі ажаніліся, то за яе кошт была пабудавана пякарня, якую спаліла маскоўскае войска. Фёдар настойваў, што будаваў сам (1663)[65]. Аргументацыя жанчыны не была прынята пад увагу.

Гэтыя і іншыя дакументы сведчаць, што ад мяшчанкі ў першую чаргу чакалася выкананне ролі жонкі і маці. Як жонка яна павінна была клапаціцца пра мужа, гаспадарку, займацца дзецьмі. Запісы на карысць жанчын сведчаць, што яны выконвалі свае абавязкі і атрымлівалі за гэта маёмасць. У сямейнай сферы бачна, што дамінаваў мужчына, а ў жанчыны была другасная роля. У гэтым супадалі і заканадаўства, і практыка права. Жанчына мела права атрымаць маёмасць па спадчыне, перадаць яе спадкаемцам, прадаць, купіць, але ўсе яе маёмасныя аперацыі здзяйсняліся пад кантролем мужчыны.

Фактычна крыніцы адлюстроўваюць актыўнасць жанчын у сямейнай сферы, а іх удзел у рамястве і гандлі паказаны мала. У рэлігійнай сферы яны былі задзейнічаны як ахвяравальніцы храмам.

*Жанчыны-сялянкі.* Самы складаны вобраз для даследавання – гэта жанчыны з сялянскага саслоўя. Іх дзейнасць менш за ўсё бачная ў дакументах. Нават у інвентарах пісаліся толькі ўдовы. Згодна з назіраннямі Б. О'Конара, маладыя дзяўчаты характарызаваліся стрыманасцю. Замуж выходзілі ў 24–30 гадоў, бо патрэбны быў час на прыгатаванне пасагу і падарункаў для сваякоў жаніха. Сталеючы, дзяўчынка ўключалася ў гаспадарку і ва ўсім дапамагала маці. Аўтар падкрэсліваў, што, выбіраючы нявесту, больш звярталі ўвагу на асобу, чым на маёмасць, якую атрымаюць з пасагам[66].

Зыходзячы з гэтага меркавання, можна казаць, што ў сялянскім асяроддзі гаспадарлівасць жанчыны мела важнае значэнне. У натуральнай гаспадарцы

---

[63] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк 283 – 283 адв.

[64] АВАК. Т. 17. Вильна, 1890. С. 242.

[65] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 116 адв. – 117 адв., 148 адв. – 149 адв.; ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 76–77.

[66] O'Connor B. Historia Polski. S. 497.

трэба было ўмець рабіць усё. Зразумела, ад жанчыны чакалі, што яна будзе добрай жонкай і маці. Але што гэта значыць для сялянскага асяроддзя, дэталёва ўявіць немагчыма, бо прыватныя дакументы адсутнічаюць.

Гістарычныя ўмовы, якія склаліся ў той час на тэрыторыі Вялікага Княства, непасрэдна ўплывалі на вызначэнне гендэрных роляў. Уплыў зрабілі шматлікія войны, эканамічны лад, культурныя і рэлігійныя плыні. Яны ўзвялі ў ранг абавязковых такія мужчынскія рысы, як мужнасць, рэлігійнасць і інш. У выхаванні і падрыхтоўцы да пэўных роляў больш працавала шляхецкае грамадства. Для гэтага ствараліся адпаведныя літаратурныя творы.

Мужчыны выконвалі шэраг сацыяльна значных знешніх і ўнутраных роляў: галава сям'і, бацька, гаспадар. Ад шляхціча яшчэ патрабавалася адпаведнасць ролі рыцара, палітыка, абаронцы. Жанчына з'ўлялася жонкай, маці, гаспадыняй, выхавацелькай. А шляхцянка часта фігуравала як мецэнатка. Гэта былі традыцыйныя ўзоры, вобразы, якія захоўваліся і перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Яны паказвалі абавязкі суб'екта перад сям'ёй і грамадствам. Выкананне гендэрна-ролевых функцый мужчыны і жанчыны ў сям'і і грамадстве рабіла гэты інстытут стабільным і непарыўным. Дзяржава, грамадства, царква сачылі, каб шляхціч і шляхцянка адпавядалі ідэалам. Гэта было важна для існавання ўсёй феадальнай сістэмы грамадства.

# 3. Адносіны паміж мужчынам і жанчынай: нормы і іх парушэнні

Саслоўнае грамадства дакладна вызначае, якія павінны быць адносіны паміж мужчынам і жанчынай. Зыходзячы з заканадаўства, судовай практыкі, рэлігіі і культуры ВКЛ, адносіны можна ўмоўна падзяліць на законныя і незаконныя. Законнымі лічыліся шлюбныя стасункі. Як правіла, яны ўзнікалі ў межах адной сацыяльнай групы. Міжсаслоўныя шлюбы давалі магчымасць для змены сацыяльнага статусу, але ўспрымаліся даволі негатыўна. Шляхта брала шлюб з мяшчанствам, калі людзі з гэтага саслоўя эканамічна адпавядалі шляхцічам. Тут магло быць два варыянты. Першы варыянт, калі мяшчанская сям'я дасягала высокага эканамічнага ўзроўню. Тады сваяцтва з такой сям'ёй давала шляхце грошы, а мяшчанам статус. Другі варыянт, калі шляхта была ўжо практычна дэкласавана і набліжана да ніжэйшага саслоўя, тады падтрымка шляхецкіх традыцый у дачыненні да шлюбу не мела такога значэння.

Незаконнымі і ганебнымі лічыліся дашлюбныя стасункі, пералюб, стасункі з прастытуткамі. Пра гэта гаворыцца ў іншых раздзелах кнігі. Але адзначым, што асноўная характарыстыка такіх стасункаў – гэта тое, што палавыя кантакты адбываліся для сексуальнага задавальнення.

*Каханне ў шлюбе*. Шлюб уяўляе сабой вельмі складаную сістэму ўзаемаадносінаў. Ён ствараўся для вядзення агульнай гаспадаркі, нараджэння і выхавання дзяцей. Секс тут быў неабходны для рэалізацыі пракрэатыўнай функцыі і выканання шлюбных абавязкаў. У ВКЛ сфарміраваўся падыход да шлюбу як да партнёрскіх адносінаў, заснаваны на ўзаемнай павазе, падтрымцы і дапамозе[1]. Гэта атрымлівалася дзякуючы сістэме дакладна вызначаных гендэрных роляў.

Важнае, калі не галоўнае, значэнне ў шлюбе мела маёмасць. Усе маёмасныя адносіны паміж мужам і жонкай адзначаліся ў прыватна-прававых дакументах. Гэта датычыла пасагу, вена, пазыкі, дарэння і інш. Шлюб, заснаваны толькі на пачуццях, не выклікаў разумення ў шляхты. У сувязі з няроўным шлюбам кароннага кухмістра Андрэя Мнішаха з варшаўскай мяшчанкай Гізанскай канцлер ВКЛ Альбрэхт Станіслаў Радзівіл напісаў, што Амура часта малююць сляпым, а ён

[1] Партнёрскі шлюб меў месца ў еўрапейскіх краінах. Howell M. The Properties of Marriage in Late Medieval Europe: Commercial Wealth and the Creation of Modern Marriage // Love, Marriage, and Family Ties in the Later Middle Ages / Ed. I. Davis, M. Muller, S. Rees Jones. Turnhout, 2003. P. 17–62.

бы яго яшчэ маляваў глухім, які не звяртае ўвагу на славу пасля смерці (1649)[2]. Еўрапейскія медыкі ў XVI ст. успрымалі каханне як хваробу. Пастулова гэта стаўленне змянілася. У XVII ст. да гэтага пачуцця пачалі ставіцца як да лекаў[3].

Аднак мы не збіраемся ідэалізаваць шлюб, бо адносіны паміж мужчынам і жанчынай у сям'і былі розныя. Гісторыя ведае як прыклады кахання, так і нянавісці. Прычыны такіх стасункаў вельмі розныя, і з гістарычнага гледзішча не заўсёды падаецца магчымым выявіць, чаму ў адной пары склалася каханне, а ў другой – нянавісць. Прычым паходжанне абсалютна не гарантавала, што супольнае жыццё будзе ўдалым.

Які сэнс і значэнне мела слова "каханне" для мужчыны і жанчыны ў XVI–XVII стст. у шлюбе? Адказ паспрабуем знайсці не ў літаратурных творах, а ў прыватных выказваннях і дакументах. У даравальных запісах і тастаментах шляхты і мяшчан часта сустракаецца старабеларускі тэрмін "*милость малженская*" – шлюбнае каханне. Аднак што пад ім разумеецца? У адных выпадках гэта канкрэтызуецца, а ў другіх не. Менавіта дарэнне на карысць сужэнца сведчыла пра добрыя дачыненні ў сям'і. Дарылі рэчы, каштоўнасці, грошы, нерухомую маёмасць. Дакументы складаліся на карысць жонкі або мужа, а таксама былі ўзаемныя запісы[4].

Зафея Пракседа Скіндараўна ў даравальным запісе мужу, мсціслаўскаму падчашаму Лявону Коцелу, раскрывае, у чым праяўлялася каханне (1680). Гэта была падтрымка ў цяжкіх жыццёвых сітуацыях. Муж аднавіў пабудовы ў маёмасці Пашаўшы ў Жамойцкім старостве, якую шляхцянка атрымала ад бацькоў Крыштафа Скіндара і Тэклі Блісtrубаўны, выплаціў за палову гэтай маёмасці сястры Кацярыне, купіў разам з жонкай маёмасць Бяньковічы ў Навагардскім ваяводстве, выплаціў пазыкі. Гэтыя два маёнткі яна перадала яму ў пажыццёвае карыстанне[5].

Добрыя адносіны паміж сужэнцамі сустракаліся ў мяшчанскіх сем'ях. Гарадзенскі катляр Ян Лукашэвіч Януцэвіч на выпадак сваёй смерці ўсю маёмасць прызначыў жонцы Еве Прушкоўскай. Яны разам доўга пражылі ў шлюбе. Дзеці памерлі малымі. Такі запіс катляра прымусіў зрабіць выпадак. У 1639 г. ён быў зняволены ў двары пана, аднак яго браты і сёстры адмовіліся дапамагчы ў гэтай сітуацыі. Жонка прадала свае рэчы, каб вызваліць мужа (1644). Яе ўчынак настолькі ўзрушыў Януцэвіча, што той вырашыў выказаць падзяку праз дарэнне дома і прыладаў працы[6].

---

[2] Radziwiłł A. S. Pamiętnik o dziejach w Polsce. T. 3. Warszawa, 1980. S. 204.

[3] Tin L. G. Początki kultury heteroseksualnej w cywilizacji Zachodu / Przetł. O. Hedemann. Kraków, 2008. S. 161–178.

[4] Даравальных запісаў захавалася даволі шмат: НГАБ у Гродне, ф. 1664, воп. 1, спр. 493 (запіс Леанарда Аляхновіча жонцы Марыне Друцкай, 1567); НГАБ, ф.1785, воп. 1, спр. 12, арк. 183 адв. (запіс ашмянскага старосты Станіслава Нарбута Гальшке Глябовічаўне, 1591); НГАБ у Гродне, ф. 1664, воп. 1, спр. 83 (запіс люцынскага старосты Самуэля Быхаўца Крысціне Дэнгофаўне, 1685); AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dz. X, sign. 73 (запіс Багданы Філіпаўны Шымковічаўны мсціслаўскаму ваяводзе Андрэю Сапегу, 1593) і інш.

[5] AGAD, Archiwum Prozorów i Jelskich, sign.7, k. 9–9v.

[6] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 293 адв. – 294.

Полацкая мяшчанка Мар'я Стралкоўна падарыла мужу Марціну Шчасновічу дом, а ён за гэта абяцаў яе шанаваць аж да смерці (1650)[7]. Віленскія мяшчане Захарый Губыка і Ганна Ілісоўна пражылі шмат гадоў у згодзе. Яны склалі ўзаемны даравальны запіс, у якім запісалі маёмасць адно аднаму (1689)[8]. У тастаментах таксама мяшчане згадвалі добрым словам сваіх сужэнцаў і дзякавалі ім за дапамогу і падтрымку[9].

Прыведзеныя прыклады паказваюць, што каханне мела матэрыяльнае вымярэнне. За дапамогу, падтрымку, добрыя адносіны, клопат, догляд падчас хваробы прынята была падзяка ў выглядзе маёмасці. Каханне праяўлялася не ў словах, а ў канкрэтных дзеяннях: выплата пазыкаў, дапамога па гаспадарцы, догляд у хваробе, набыццё лекаў і інш. Менавіта праз учынкі была бачна важнасць адной асобы для другой.

Клопат, турбаванне пра мужа ці жонку нярэдка сустракаюцца ў ліставанні. Напрыклад, канцлер ВКЛ Леў Сапега перажываў, што яго жонка Альжбета Радзівілаўна выехала з Варшавы хворая, і сам збіраўся выязджаць за ёй. У адным з лістоў пяшчотна звяртаўся да яе: "*Moja namilsza Halzusienka*" (1606)[10].

У лістах гетмана ВКЛ Яна Караля Хадкевіча часта можна сустрэць звароты да жонкі Зафеі Мялецкай "*Moja najmilsza Zosieńku pocecho moja serdeczna*". Заўсёды пытаўся пра справы ў доме, пра дзяцей, дасылаў падарункі. А ў адным з лістоў быў вымушаны апраўдвацца: "*Co się moskiewki od kawalera tknie, dalibógem ci jej nie widział, a choćby i Dyanną była, jużby nię pewnie nie ruszyła pokusa...*" (ліст пашкоджаны, 1606?, без даты)[11].

Мужчыны перажывалі страту жонак. З вялікім болем пісаў Ян Уладзіслаў Пачобут-Адляніцкі пра смерць сваёй жонкі Рахелі Юдзіты Гадэбскай. Ён страціў сябра, які быў даражэйшы за золата. Шляхцянка моцна захварэла на гарачку і неўзабаве памерла (1682). Ян Уладзіслаў яшчэ да яе хваробы быццам бы прадчуваў трагедыю: яго сэрца "выла без усялякай прычыны"[12].

Геранім Хадкевіч перажываў смерць трэцяй жонкі Дароты Рэяўны: "*...tak i nam to swoym przykładem podały, a byśmy y my małżonkowie ich w zmarłey miłości ty na tym świecie z sobą trwali, y tym się cieszyli że Pan Bog ynaczey nie chciał*[13]." У 1614 г. Хадкевіч ажаніўся чацвёрты раз з Зафеяй Карабчэўскай, якая была вядома сваім ваяўнічым характарам[14].

---

[7] Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г.: зб. дак. / Склаў і падрыхтаваў да друку М. Гардзееў. Мінск, 2006. С. 109–110.

[8] Frick D. Wilnianie. Żywoty siedemnastowiecznie. Warszawa, 2008. S. 304–306.

[9] Ibid. S. 216, 221, 243, 245, 508.

[10] Archiwum domu Sapiehów. T. 1. Lwów, 1892. S. 488–489, 506.

[11] Korrespondencye Jana Karola Chodkiewicza poprzedzone opisem rękopismów z archiwum radziwiłłowskiego, znajdujących się w Bibliotece Ordynacyi Krasińskich połączonej z Muzeum Konstantego Świdzińskiego / Oprac. W. Chomętowski. T. 1. Warszawa, 1875. S. 31–97.

[12] Pamiętnik (1640–1684). Jan Władysław Poczobut Odlanicki / Oprac. A. Rachuba. Warszawa, 1987. S. 294–296.

[13] Ліст віленскага кашталяна Гераніма Хадкевіча канцлеру ВКЛ Льву Сапегу, Берасце, 13 снежня 1611 г. ANK, Archiwum Młynowskie Chodkiewiczów, sygn. AMCh 51, list nr 22.

[14] Rolle A. Niewiasty kresowe. Warszawa, 1883. S. 102–135; Dobrowolska W. Chodkiewicz Hieronim // PSB. T. 3. Kraków, 1937. S. 360–361.

Згаданыя дакументы датычаць шляхецкіх сем'яў, дзе існаваў прыняты этыкет у адносінах. Але і за гэтымі словамі этыкету можна пабачыць павагу і пачуцці. Асабістая перапіска з мяшчанскіх і сялянскіх сем'яў не захавалася. Пра мяшчанскія сем'і апавядаюць прыватна-прававыя дакументы. На жаль, цяжка вызначыць стасункі ў сялянскай сям'і, бо ў гэтым саслоўі не было практыкі вядзення такіх дакументаў.

Пры аповедзе пра каханне немагчыма абысці гісторыю Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівілаўны. Згодна з летапісам гісторыя пачалася з таго, што Жыгімонт Аўгуст "*не могучи здержати прирожоное хтивости ку белым головом, почат миловати паню Барбару Радивиловну*", якая на той час была ўдавой. Вялікі князь так актыўна завітваў да Барбары, што розгалас пайшоў па ВКЛ і Польшчы. Яе браты (родны Мікалай Руды і дваюрадны Мікалай Чорны) папрасілі не хадзіць і не рабіць няславу іх дому. Жыгімонт Аўгуст трымаў пэўны час абяцанне, але аднойчы ноччу "*крепкости прироженое далеи терпети не мог*" і прыйшоў да жанчыны. Браты яго перапынілі, і тады адбылося таемнае вянчанне[15]. Аповесць адназначна паказвае, што сексуальныя стасункі паміж Жыгімонтам Аўгустам і Барбарай пачаліся перад шлюбам. Жарсць была асноўнай прычынай шлюбу для Жыгімонта Аўгуста. Яна мела важнае значэнне ў адносінах пары і пасля вянчання. Пасля сканчэння сойма ў Петрыкаве ў 1548 г. Жыгімонт Аўгуст адразу накіраваўся ў Вільню, каб бавіць час з Барбарай[16].

Шлюб Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівілаўны быў успрыняты сучаснікамі як няроўны[17]. Аднак адзначым, што шлюб з падданай адбыўся не першы раз. Кароль Уладзіслаў Ягайла ў 1417 г. ажаніўся трэці раз па сваім жаданні з Альжбетай, дачкой сандамірскага ваяводы Аттона з Пііліцы. Шлюб выклікаў негатыўную рэакцыю, бо не прыносіў ніякай карысці для краіны. Акрамя таго, жанчына была ўжо ва ўзросце, перажыла трох мужоў. Перашкодай да шлюбу было духоўнае сваяцтва: яна была хроснай маці караля[18].

Шлюбу Жыгімонта Аўгуста і Барбары супрацiўляліся і ў Польшчы, і ў ВКЛ. Яго скандальна абмяркоўвалі на Петрыкаўскім сойме (1548). Шляхта патрабавала разводу. Канфлікт дайшоў да такой вастрыні, што Жыгімонт Аўгуст хацеў адмаўляцца ад кароны. Станіслаў Арахоўскі[19] добра паказаў трагічнасць сітуацыі[20]. На сойме кароль выступіў перад шляхтай, апеляваў да рэлігійных палажэнняў адносна шлюбу, што ад Бога кожны мае права ўзяць жонку, а як

[15] ПСРЛ. Т. 35. С. 282; Kronika Macieja Stryjkowskiego. S. 747.

[16] М. Стрыйкоўскі так пісаў пра гэта: "A Veneris surgens amor, ignis, & ira, & c." Kronika Macieja Stryjkowskiego. S. 748–750.

[17] ПСРЛ. Т. 35. С. 171–172, 282; Kronika Macieja Stryjkowskiego. S. 747–749; Kuchowicz Z. Barbara Radziwiłłówna. Lódź, 1982. S. 34–38.

[18] Stryjkowski M. Kronika.... Królewiec, 1582. S. 547; Tęgowski J. Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów. Poznań; Wrocław, 1999. S. 128–129.

[19] Станіслаў Арахоўскі – вядомы палітычны мысліцель XVI ст., жыў у часы Жыгімонта Аўгуста, аўтар многіх палемічных твораў. Вирский Д. Станіслав Оріховський-Роксолан як історик та політичний мислитель. Київ; Кременчук, 2001.

[20] Kronika Macieja Stryjkowskiego. S. 749; Bielski M. Kronika polska. Kraków, 1597. S. 589; Kroniki Stanisława Orzechowskiego / Tłum. Z. A. Włyńskiego. Sanok, 1856. S. 16–18, 24–37; Nowak-Dłużeski J. Okolicznościowa poezja polityczna w Polsce. Czasy Zygmuntowskie. Warszawa, 1966. S. 171–173.

хрысціянін ужо не можа развесціся. Надалей Жыгімонт Аўгуст абяцаў больш нічога не рабіць без парад шляхты[21].

З пункту гледжання тагачаснага польскага грамадства, Барбара Радзівілаўна не адпавядала ролі каралевы. Гэты шлюб парушаў усе нормы маралі[22] і быў заключаны таемна, што не дазвалялася каталіцкай царквой. Да таго ж ён зрываў міжнародныя планы. Варта адзначыць мужныя паводзіны Жыгімонта Аўгуста. Дзеля сваёй жонкі ён пайшоў супраць сям'і і грамадства, прыклаў шмат намаганняў для захавання шлюбу і надання Барбары статусу каралевы. Пазней, на соймах 1573 і 1576 гг., былі прыняты пастановы для Генрыка Валезы і Стэфана Баторыя пра тое, што кароль Рэчы Паспалітай не мае права браць шлюб без волі і рады двух народаў[23]. Жаданне Уладзіслава Вазы ажаніцца з англічанкай, якая была пратэстанткай, выклікала бурнае абмеркаванне. Была ўзгадана Барбара Радзівілаўна ў падтрымку таго, што можна абраць у якасці жонкі польку. Аднак гэта ідэя не рэалізавалася, бо будучая каралева павінна быць каталічкай, княжной, чужаземкай[24].

Скандал на сойме паклаў толькі пачатак непрыемнасцям для Жыгімонта Аўгуста. Пачалася літаратурная кампанія. Пісалі пасквілі і прыбівалі да варот замка, шляхецкіх двароў, ратушы[25]. Станіслаў Арахоўскі[26] напісаў дзве прамовы супраць "ганебнага" шлюбу Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівілаўны. У іх крытыкаваўся лад ВКЛ, Радзівілы ("здрадзівілы") называліся неадпаведным для каралеўскага шлюбу родам. Барбара апісвалася як распусная і хцівая жанчына, якая прывабіла Жыгімонта чарамі і целам. Аўтар лічыў, што такі шлюб руйнуе маральнасць Польшчы, а Барбара падае кепскі прыклад для шляхецкіх сем'яў. Акрамя таго, калі верыць Арахоўскаму, у Нямеччыне распаўсюдзіліся карцінкі з Барбарай у непрыстойным аздабленні: яе шыю і рукі "ўпрыгожвалі" мужчынскія чэлесы[27]. Польская гістарыяграфія апавядае пра гэта ў тым самым ключы. Барбара, як і ўсе літвінкі, названая распуснай жанчынай[28].

Спатрэбіўся час, каб Барбара была прынята і нянавісць адышла. Яе каранавалі. Перад смерцю яна цяжка хварэла. Арахоўскі напісаў, што памерла жанчы-

---

[21] Копія соймавага дзённіка не ўтрымлівае нумарацыі старонак. Biblioteka Kórnicka, rkps. 253.

[22] Сліж Н. Сексуальнае жыццё шляхты Вялікага княства Літоўскага. С. 143–144; Goliński J. Barbara i Zygmunt August. Renesansowe kroniki i listy o miłości tragicznie spełnionej // Między Zachodem a Wschodem. Studia ku czci professora Jacka Staszewskiego. T. II. Warszawa, 2003. S. 191–198.

[23] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. Wilna, 1619 r. // Biblioteka Narodowa. XVII.4.3228, k. 186.

[24] Pamiętniki Albrychta Stanisława Radziwiłła. S. 271–282.

[25] ПСРЛ. Т. 35. С. 171–172, 282.

[26] С. Арахоўскі хоць і асуджаў шлюб Жыгімонта Аўгуста, але сам ажаніўся з вялікім скандалам. Ён быў каталіцкім святаром і для шлюбу адмовіўся ад сану. Bielski M. Kronika polska. Kraków, 1597. S. 591–593; Вирський Д. С. «Жонатий ксьондз»: справа з одруженням Станіслава Оріховського-Роксолана 1551 р. // Український історичний журнал. 2014. № 1. С. 72–89.

[27] Opera inedita et epistulae Stanislai Orzechowski 1543–1566. Vol. I / Ed. I. Korzeniowski. Cracoviae, 1891. P. 131–177; Nowak-Dłużeski J. Okolicznościowa poezja polityczna w Polsce. Czasy Zygmuntowskie. Warszawa, 1966. S. 171–190; Ragauskienė R. Barbora Radivilaitė. Vilnius, 1999. P. 131.

[28] Збігнеў Куховіч малюе чорнымі фарбамі шлюб Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівілаўны, падкрэслівае, што яна адпавядала амаральнасцю сваёй краіне і грамадству. Гісторык падае абсалютна пагардлівае стаўленне да ВКЛ. Пры гэтым у сваёй працы ён карыстаўся памфлетамі, гістарычнымі працамі, а не архіўнымі дакументамі. Kuchowicz Z. Barbara Radziwiłłówna. Łódź, 1982.

на ад рака[29]. На яе смерць былі напісаны літаратурныя творы[30]. Жыгімонт Аўгуст з жалем пісаў Мікалаю Рудому пра смерць жонкі (Кракаў, 14 мая 1551 г.). Вялікі князь адзначаў пра яе жаданне быць пахаванай у Вільні і апавядаў, што неўзабаве разам з целам выправіцца ў княства. Аб гэтым было напісана і Мікалаю Чорнаму. Пахаваць вырашылі ў склепе, дзе ўжо было цела першай жонкі манарха[31]. Труна Барбары Радзівілаўны знаходзіцца сёння ў склепе пад капліцай Св. Казіміра касцёла Св. Станіслава ў Вільні.

Аднак гэта быў не адзіны скандал у каралеўскай сям'і. Не менш увагі да сябе прыцягнуў шлюб Яна Сабескага з Марыяй Казімірай. Яна была ўдавой пасля смерці Яна Замойскага, але стасункі ў іх пачаліся падчас жыцця яе мужа. З перапіскі пералюбнікаў вынікае, што адносіны ў іх складваліся складана. Марыю Казіміру крыўдзіла несур'ёзнае, а часам абразлівае стаўленне да яе з боку Сабескага. У адным з лістоў жанчына пісала, што не дазволіць ставіцца да сябе як да карчмы, куды можна завітаць на гадзіну (1660). Ажаніліся яны ў 1665 г., неўзабаве пасля смерці Замойскага. Перыяд жалобы па мужу не быў вытрыманы. Гэта выклікала моцны рэзананс у грамадстве, бо такі шлюб не адпавядаў традыцыям. У пазнейшых лістах каралевы Марыі Казіміры бачна каханне да мужа. Яна з нецярплівасцю чакала ад яго навін, калі ён быў на вайсковай выправе супраць туркаў. Пры канцы аднаго з лістоў было напісана, што Марыя Казіміра абдымае і цалуе мужа ад ступняў да галавы (1683). А Ян Сабескі праз лісты перадаваў пацалункі ад ножак да вуснаў. Пара была вядома тэмпераментнымі стасункамі[32].

*Канфлікты ў сям'і.* Адносіны паміж мужчынам і жанчынай не заўсёды складваліся ідэальна, у шлюбных дачыненнях мелі месца збіццё і забойствы. Прычыны, якія даводзілі да фізічнага гвалту, былі розныя: нянавісць, пералюб, скандалы і інш.[33] Хоць кепскія адносіны і не былі прычынай для разводу, аднак на практыцы здаралася і разбурэнне шлюбу[34].

Інфармацыя пра канфлікты ў сям'і сустракаецца ў судовых справах. Скаргі падавалі за збіццё, забойствы, замахі на жыццё. Такія выпадкі здараліся сярод людзей розных саслоўяў. У якасці ахвяр выступалі як жанчыны, так і мужчыны. У наступных справах абвінавачанымі былі жанчыны. У 1565 г. у Вількамірскім павеце прысудзілі да смяротнага пакарання Кацярыну Ваўчкоўскую і яе слуг за забойства мужа Мельхера Вайцяховіча[35]. У кнігах Упіцкага земскага суда зафіксавана скарга Яна Вяковіча на жонку яго брата Мікалая Вяковіча Хрысціну (1587). Ён абвінавачваў яе ў чарах і атручванні яго брата, адзначаў

[29] Kroniki Stanisława Orzechowskiego. S. 69–72.

[30] Nowak-Dłużeski J. Okolicznościowa poezja polityczna w Polsce. S. 191–197.

[31] Listy króla Zygmunta Augusta do Radziwiłłów. Warszawa, 1999. S. 206–207, 208–210, 213–214.

[32] d'Arquien de la Grange M. K. Listy do Jana Sobieskiego. Warszawa, 1996. S. 110–115, 234–240, 243–254; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 290, 294.

[33] Kaczor D. Przestępczość kryminalna i wymiar sprawiedliwości w Gdańsku w XVI–XVIII wieku. Gdańsk, 2005. S. 106–107.

[34] Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 449–474.

[35] НГАБ, КМФ 18, спр. 260, арк. 916–925.

яе непрыстойныя паводзіны ў шлюбе[36]. У Менскім ваяводстве разглядалася справа супраць Марыны Станіславаўны Дастаеўскай, якая абвінавачвалася ў забойстве мужа Станіслава Карловіча з дапамогай нанятага Яна Тура. Ён забіў гаспадара, калі той выходзіў з лазні. Акрамя таго, пасля яго смерці яна сфальсіфікавала яго тастамент на карысць сваіх дзяцей, чым нанесла страты дзецям ад першага шлюбу (1607)[37].

Мужчыны таксама абвінавачваліся ў злачынствах. У сваім тастаменце вількамірская шляхцянка Раіна Станіславаўна Юражанка Гедроіцкая пісала, што з ведама мужа Крыштафа Яцкевіча на яе навёў чары Ганс Малдын. Калі яна з гэтай прычыны захварэла і ляжала ў ложку каля двух тыдняў, муж збіваў яе да крыві (1614)[38]. Навагарадскія і пінскія шляхцічы Станіслаў і Ян Янікоўскія ініцыявалі справу супраць Яна Матэвушавіча Вільскага, які арганізаваў забойства іх сястры, а сваёй жонкі Ефрасінні Янікоўскай у студзені 1660 г. у Юркавічах. У дакуменце адзначалася, што яны жылі дрэнна, не мелі дзяцей. Муж, скарыстаўшыся ваенным становішчам як прычынай, разам з маці вывез маёмасць жонкі ў Нясвіж, а яе выправіў у с. Юркавічы. Мясцовы падданы Міхель даўно атрымаў загад ад Вільскага забіць Янікоўскую. Калі жанчына прыехала ў сяло, яе забілі. Браты паспрабавалі высветліць яе лёс, але Міхель сказаў, што мае загад збіць любога, хто запытаецца пра Янікоўскую. Вярнуўшыся жывымі, браты паспяшаліся падаць скаргу ў суд. Выраку па справе ў кнізе няма[39].

У наступным выпадку сістэматычнае збіццё жанчыны прывяло да трагедыі. Гарадзенскі мешчанін Павел Кардашэвіч падаў скаргу на Пархвена Кімбара з абвінавачваннем у забойстве цёткі Агап'і Кардашоўны (1671). У адпаведнасці з заканадаўствам (Саксонскае Люстра, ч. II, арт. 13; Вайхбільд, арт. XXXVIII) бок скаржніка патрабаваў смяротнага пакарання. Кімбар неаднаразова збіваў жонку і пагражаў забіць. 15 лістапада сужэнцы пілі ў доме жыда Шаўла. Пархвен там пачаў яе біць, а пасля працягнуў на вуліцы Замкавай. Жанчына ад удараў упала на зямлю, муж біў яе нагамі па галаве. Забіў насмерць, а пасля забойства хацеў утапіць у Нёмане. Намітку завязаў за шыю і валок па зямлі да ракі. Людзі, якія пабачылі збіццё, злавілі Кімбара на гарачым учынку і аддалі ў вязніцу. Гэта версія падзей была адлюстраваная ў скарзе і ў апытанні сведак, якое правялі лаўнікі Марцін Шаматула Сапінскі і Ваўжынец Канчэўскі, войтаўска-лаўніцкі пісар Аляксандр Дрогаш 18 лістапада 1671 г. Сам Кімбар распавёў наступнае. Калі ён вярнуўся ад пана судзіча[40], то жонкі дома не застаў, яна была ў жыда. Кімбар казаў ёй ісці дадому і нагрэць яму вады. Агап'я адмовілася, ён вымушаны быў ударыць, а пасля біў

---

[36] Опись документов Виленского центрального Архива древних актовых книг. Вып. 7. Вильна, 1909. С. 215, 218, 232–233, 256, 258.

[37] АВАК. Т. 18. Вильна, 1891. С. 201–219.

[38] Судебные процессы над ведьмами в Литве / Подготовили К. Яблонскис, Р. Ясас. Вильнюс, 1987. С. 91–93.

[39] НГАБ, ф. 1733, воп. 1, спр. 1, арк. 80–81.

[40] Імя ў дакуменце не згадваецца, верагодна, Стэфан Александровіч.

на вуліцы. Яна ўпала сама і паламала шыю, тады ён павалок яе да ракі. Суд улічыў вынікі следства, частыя факты збіцця і прысудзіў да смяротнага пакарання. Выкананне прызначылі на 4 снежня[41]. Як вынікае з дакументаў, у гэтай сям'і гвалт у дачыненні да жанчыны адбываўся часта. Прадухіліць такі вынік магла скарга на мужа і развод.

Праблема гвалту існавала ў многіх тагачасных краінах, ён быў неад'емнай часткай сямейнага жыцця[42]. Але гэта актуальна і сёння[43]. У большасці выпадкаў ахвярай станавілася жанчына. Дзеці таксама маглі трапляць у віхуру канфліктаў. Мужчыны радзей трывалі гвалт.

Акрамя жорсткіх сямейных сітуацый з забойствамі сустракалася яшчэ і канфліктнае супольнае пражыванне. Полацкі мешчанін Васіль Павуковіч абвінавачваў зяця Пятра Ярмошыча ў нядбайным стаўленні да жонкі Еўдакіі і руйнаванні маёмасці (1650)[44]. Віленская мяшчанка Анастасія Александровічаўна падала скаргу на першага мужа Фёдара Арэшыца. Ён ніколі не дапамагаў ёй, знік на 9 гадоў, пасля вярнуўся ў Вільню, стаў нарэшце жыць з жонкай, але збіваў і нават напаў на вуліцы (1663). Рашэнне па гэтай скарзе не выяўлена. Жанчына выйшла замуж другі раз за Станіслава Дзедзінскага, харужага драгунскай роты стольніка ВКЛ Бенедыкта Паўла Сапегі. Напэўна, з першым мужам яе развялі, бо той быў яшчэ жывы. Другі муж дапамог адрамантаваць дом пасля вайны, даглядаў мяшчанку да смерці, выдаткоўваў грошы, калі яна хварэла (ляжала прыблізна 5 гадоў). Усю маёмасць яна запісала мужу ў тастаментах 1671, 1675 гг.[45] Гэта не адзінкавыя сітуацыі. Скаргі на збіццё ад мужа былі пададзены ад Кацярыны Шмітоўны на Яна Пецэльту (1669), ад Евы Дзіблеўшчанкі на Яна Шкіля (1649). Апошні падаў на жонку скаргу за абразу і пагрозы[46].

---

[41] НГАБ, ф. 1800, спр. 1, арк. 227 адв. – 228; ф. 1761, спр. 2, арк. 228 – 228 адв.; Сліж Н. Злачынства і злачынцы ў Гародні. С. 148–149.

[42] Bernarski S. Keeping It in the Family? Domestic Violence in the Later Middle Ages: Examples from a Provencal Town (1340–1403) // Love, Marriage, and Family Ties in the Later Middle Ages / Ed. I. Davis, M. Müller, S. Rees Jones. Turnhout, 2003. P. 277–297; Brożyna M. A. Not Just a Family Affair: Domestic Violence and the Ecclesiastical Courts in Late Medieval Poland // Love, Marriage, and Family Ties in the Later Middle Ages / Ed. I. Davis, M. Müller, S. Rees Jones. Turnhout, 2003. P. 299–309; Ворончук І. Подружні зради як наслідок практики укладання шлюбів в Україні в XVI–XVII ст. (на матеріалах ранньомодерної Волині) // Соціум. Альманах соціальної історії. 2006. Вип. 6. С. 190–197.

[43] Напрыклад, сучасныя праблемы, звязаныя з гвалтам, разглядаюцца ў зборніку: Маладая жанчына ў небяспецы / Пад рэд. Б. Леві. Мінск, 2003.

[44] У кнігах полацкага магістрата захавалася толькі скарга, а рашэння па ёй не выяўлена. Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г. С. 86–87.

[45] Анастасія ў дакументах фігуравала як Аляксеевічаўна, Александровічаўна, Семяновічаўна. Дэвід Фрык падае яе яшчэ як Полікшанка. LVIA, f. 22, ap. 1, b. 1 (SA 5333), l. 378–378v; Frick D. Wilnianie. S. 519–520, 524–528; Frick D. Kith, Kin, and Nieghbors. Communituies and Confessions in Seventeenth-Century Wilno. Ithaca; London, 2013. P. 240–246. Яе бацькам быў Аляксандр Сямёнавіч Александровіч, таму "Аляксеевічаўна" ўжывалася памылкова, а сябе яна запісвала то па імі, то па прозвішчы бацькі. Пра сям'ю згадваецца ў скарзе брата Самуэля (1661). XVII a. Vidurio Maskvos okupacijos Lietuvoje šaltiniai. T. I: 1657–1662 m. Vilniaus miesto tarybos knyga / Sudarė E. Meilus. Vilnius, 2011. P. 491–492.

[46] Frick D. Wilnianie. S. 298–299, 376–377; Frick D. Kith, Kin, and Nieghbors. P. 223–224.

П'янства таксама было прычынай дрэннага супольнага жыцця[47]. Мяшчанка з Вострава Аўдоцця Іванаўна Рэбусчына атрымала ад слуцкага архімандрыта Міхаіла Загароўскага вызваленне на год ад пражывання з мужам Максімам Луцкевічам Козічам (1619). Прычынай стала злоўжыванне алкаголем і, як вынік, збіццё жанчыны і яе дзяцей ад першага шлюбу, марнатраўства маёмасці[48].

У судовых актах сустракаюцца дакументы, якія сведчаць пра неадпаведныя паводзіны жанчын у шлюбе. Віленскі кравец Павел Арцімовіч падаў скаргу на жонку Алену. У 1641 г. ён прыняў яе ў свой дом, пабачыў яе добрае стаўленне да дзяцей і гаспадарлівасць і ажаніўся. Жанчына змянілася адразу пасля шлюбу: стала піць, выносіць рэчы, руйнаваць маёмасць. Алена давяла яго да жабрацтва. Але скаргу кравец падаў толькі пасля таго, як яна сышла ад яго (1649)[49]. Базыль Завіскі абвінавачваў жонку Агату Гінелевічоўну ў атручванні, прысвойванні грошай і рэчаў (1676). Аднак у 1689 г. ён згадваў яе ў тастаменце і дзякаваў за добрае стаўленне[50].

Полацкі мешчанін Андрэй Латушэнка абвінаваціў цешчу Мар'ю Тарасоўну ў хаванні жонкі. У адказ яна сцвярджала, што ён сам выгнаў дачку і чыніў непрыемнасці. Суд пастанавіў жанчыне вярнуцца да мужа і загадаў спакойна жыць сужэнцам і цешчы (1650)[51].

Не абыходзілі спрэчкі і сялянскія сем'і. Гаспадарскі падданы Рэпніцкага войтаўства Сенько Мілковіч падаў скаргу на зяця гаспадарскага падданага Кандрата Аляшкевіча з прычыны нежадання жыць апошняга з яго дачкой і яе выгнаннем з дому. На што адказчык сцвярджаў, што, наадварот, яна не хоча з ім жыць і сама сыходзіць. Суд прыняў рашэнне застацца сужэнцам разам. А ў выпадку выгнання жонкі Кандрат будзе абавязаны заплаціць 3 рублі (1560)[52].

У той час сустракаліся сітуацыі, калі жаданне быць побач прымушала выкарыстоўваць чараванне. Магдалена так хацела выйсці замуж за Марціна Велічковіча і разлучыць яго з нявестай, што звярнулася да нейкай бабы. Тая дала дзяўчыне кавалак бруднай прасціны, загадала яго падкінуць і абяцала добры вынік. Выпадак патрапіў на разгляд у Мерацкі магістрат. Высветлілася, што баба "дапамагала" і іншым парам. У выніку яе выгналі з горада (1646)[53].

Адносіны паміж мужчынам і жанчынай у сямейным жыцці складаюцца па-рознаму. Яны не з'яўляюцца стабільнымі і могуць змяніцца ў кожны момант. У той час не існавала псіхалагічнай службы, затое ў сямейныя дачыненні ўмешваліся сваякі і рэлігія. Абарону ад агрэсіі мужа жанчына магла атрымаць

---

[47] Ва Украіне падобныя выпадкі мелі месца. Дубенская мяшчанка Настасся Сініцкая з-за п'янства адхіліла трэцяга мужа Данілу Сініцкага ад маёмасці (1660). Білоус Н. Насильство над жінками: сюжети з міщанського і селянського повсякдення Волині XVI – початку XVIII ст. // Соціум. Альманах соціальної історії. Київ, 2015. Вип. 11–12. С. 142.

[48] Минская старина. Вып. 4. Труды Минского церковного историко-археологического комитета (Тройчанский архив). Минск, 1913. С. 8–9.

[49] Frick D. Wilnianie. S. 400–402; Frick D. Kith, Kin, and Nieghbors. P. 227–229.

[50] Frick D. Wilnianie. S. 360–365; Frick D. Kith, Kin, and Nieghbors. P. 219–223.

[51] Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г. С. 186.

[52] НГАБ, ф. 1785, воп. 1, спр. 1, арк. 28 адв. – 29.

[53] Судебные процессы над ведьмами. С. 216–218.

ад бацькоў ці сваякоў. Моцны статус сям'і жанчыны быў фактарам, які часта не даваў давесці сітуацыю да трагедыі. Духавенства, якое прытрымлівалася канцэпцыі непарыўнасці шлюбу, імкнулася захаваць сям'ю якім заўгодна коштам. Але пры настойванні пакрыўджанага боку было магчыма атрымаць развод ці сепарацыю.

У шляхецкім саслоўі гвалт у дачыненні да жанчыны не дапускаўся дзякуючы нормам культуры і заканадаўства. Адкрыты гвалт выклікаў адназначна адмоўную рэакцыю. Гэта магло негатыўна адбіцца на статусе і кар'еры шляхціча. Таму гвалт праяўляўся часцей у схаванай форме.

Можна аднесці да сапраўднага мастацтва захаванне добрых і трывалых адносінаў на працягу ўсяго шлюбу. Для гэтага патрабаваліся намаганні з абодвух бакоў. Важную ролю ў адносінах адыгрываў секс. Задаволенасць у інтымным жыцці дазваляла ўлагоджваць канфлікты. Чым даўжэй заховваліся жарсці ў ложку, тым даўжэйшым быў сямейны дабрабыт.

# 4. Літаратура пра секс і адносіны мужчын і жанчын

Каханне, эротыка, секс заўсёды мелі адлюстраванне ў літаратуры ў розныя часы. Гэта тэматыка хвалявала, бо сфера адносінаў мужчыны і жанчыны кранае ўсіх. Літаратура стварала ідэальныя вобразы і падтрымлівала мары пра рамантычнае каханне. Яна па-свойму інтэрпрэтавала жыццёвыя сюжэты, прымушала чытача перажываць і хвалявацца, а часам смяялася з розных выпадкаў і станавілася забаўкай. Але заўсёды яна вучыла, перадавала жыццёвы вопыт іншым.

На літаратуру ў Вялікім Княстве Літоўскім непасрэдным чынам паўплывала творчасць італьянскіх пісьменнікаў. Напрыклад, творы Дантэ Аліг'еры, Джузэпэ Бакача, Франчэска Петраркі[1] і іншых аўтараў былі добра вядомы[2]. Ідэі рэнесанснай літаратуры знайшлі ў нас прыдатную глебу. Разам з гэтым адбываецца адкрыццё антычнасці. З'яўляюцца пераклады "Трої", "Александрыі", прац Арыстоцеля, Платона і інш.[3] Акрамя таго, філосафы часта цытаваліся ў розных творах як панегірыкі на вяселле, казанні на смерць і інш. Лічылася, што філасофская мудрасць антычнасці вартая пераймання.

Развіццё кнігадрукавання зрабіла кнігу даступнай для больш шырокага кола насельніцтва[4]. Бібліятэкі ствараліся пры навучальных і рэлігійных установах. Сярод шляхты збіраць кнігі стала моднай і неабходнай справай, хоць гэта і каштавала немалых грошай. Калекцыі кніг мелі Радзівілы, Зяновічы, Кахлеўскія і інш. Звычайна прыватныя кніжныя зборы перадаваліся па спадчыне па

---

[1] Творы італьянскіх пісьменнікаў захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, фондах Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Напрыклад: Comento di Christophoro Landini fiorentino sopra la Comedia di Danthe Alighieri poeta fiorentino. Firenze, 1481; IL Decameron di messer Gioyanni Boccaccio cittadino fiorentino. Di nuouo ristampato, e riscontrato in Firenze con testi antichi, & alla sua vera lettione ridotto dal cavalier Lionardo Saluiati ... Venetiae, 1594 і інш. Каталог гарадзенскай калекцыі сведчыць пра наяўнасць розных замежных выданняў: Каталог выданняў XV–XVI стагоддзяў: з фонду Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Слонім, 2003.

[2] Саверчанка Н. Італьянскія кнігі эпохі Рэнесансу на Беларусі // Материалы международной электронной конференции "Книжная культура пограничья Славии Восточной и Западной (ноябрь 2007 г.)". Рэжым доступу: http://www.knizhkult.narod.ru/Saverchenko.htm.

[3] Саверчанка І. Aurea medio critas. С. 27–34.

[4] Пра развіццё кнігадрукавання ў часы ВКЛ напісана шмат прац, гл.: Кніга Беларусі: 1517–1917: зводны каталог / Склад. Г. Я. Галенчанка [і інш.]. Мінск, 1986; Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі; Нікалаеў М. Гісторыя беларускай кнігі. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. Т. 1. Мінск, 2009; Галенчанка Г. Невядомыя і малавядомыя помнікі і інш.

мужчынскай лініі[5]. Заможныя мяшчане таксама мелі бібліятэкі. Напрыклад, пасля смерці віленскага бурмістра Стэфана Лебядзевіча быў складзены інвентар рэчаў (1649). Сярод іншага засталася даволі вялікая калекцыя кніг, у якой было 96 кніг на лацінскай мове, 4 – на польскай і 12 – на царкоўнаславянскай і старабеларускай. Гэта была рэлігійная, гістарычная, філасофская, мастацкая, юрыдычная літаратура[6]. У прыватных бібліятэках знаходзіліся кнігі замежнага і мясцовага друку, што азначае знаёмасць з тагачаснымі літаратурнымі тэндэнцыямі ў Еўропе. Вядома, закранала гэта толькі адукаваную частку насельніцтва.

*Павучальная і палемічная літаратура.* Ніякая эпоха не услаўляла каханне і эротыку так, як Рэнесанс. Многія літаратурныя дзеячы, патрапіўшы ў хвалю эпохі, закраналі гэту тэматыку. Вядомы беларускі кнігадрукар Францішак Скарына ў сваіх прадмовах звяртаў увагу на розныя тэмы, у тым ліку звязаныя з адносінамі мужчыны і жанчыны. У прадмове да "Эклезіяста" адзначалася, што людзі маюць розныя думкі і мэты ў жыцці: "*едины в царствах и пановании, друзии в богатестве и в скарбох, инии в мудрости и в науце, а инии в здравии, красоте и в крепости телесной, неции же во множестве имения и статку, неции в роскошном ядении и питании и в любодеянии, инии теже в детех, в приятелех, во слугах и во иных различных многых речах*". Але галоўнае, згодна з "Эклезіястам", выконваць запаветы Бога[7]. Скарына не адмаўляў чалавеку сярод усіх жаданняў жаданне мець прыгожае цела і кахаць, але лічыў, што ў жыцці варта кіравацца запаветамі.

У прадмове да "Найвышэйшай песні Саламонавай" гэта тэма разглядаецца далей. Адносіны Хрыста і Царквы параўноўваюцца са стаўленнем каханка да каханкі або жаніха да нявесты. "*Из сея убо песни Саломоновы ясне можемы поразумети превеликую и неизреченную м(и)л(о)сть и любовь Божию, еже имеяше к нам грешным, понеже не погордел ест ступити на землю съ превышнего престола своего. Яго любовникъ ко любой своей, или яго женихъ к невесте своей, тако и Хр(и)стосъ ко церкви своей сниде.*"[8] Сам твор у выданні Скарыны аформлены ў выглядзе дыялогу Хрыста і Царквы, чаго не рабілася ў іншых перакладах твора. Некаторыя вершы не ўвайшлі ў склад выдання Скарыны. Такім чынам, эратычны тэкст "Найвышэйшай песні Саламонавай" Ф. Скарына перадаў у рэлігійным кантэксце, як гэтага патрабаваў хрысціянскі падыход. Але ў самім тэксце апісваюцца эратычна-сексуальныя стасункі паміж каханкамі[9]:

---

[5] Запартыка Г. Страчаныя скарбы манастырскіх бібліятэк // 480 год беларускага кнігадрукавання: матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў. Мінск, 1998. С. 198–209; Śliż N. Książka w rodzinie szlacheckiej wielkiego Księstwa Litewskiego // Księga – Nauka – Wiara w średniowicznej Europe / Pod red. T. Ratajczka. Poznań, 2004. S. 85–87; Niedźwiedź J. Kultura literacka Wilna. S. 87–122, 215–222; Нікалаеў М. Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1. С. 243–260.

[6] LVIA, f. 23, ap. 1, b. 1 (SA 5096), l. 437–439v; Frick D. Wilnianie. S. 189–192; Niedźwiedź J. Kultura literacka Wilna. S. 114–116.

[7] Францыск Скарына і яго час. Мінск, 1988. С. 51–52.

[8] Францыск Скарына і яго час. С. 55–57; Біблія: факс. узнаўленне Бібліі, выд. Ф. Скарынаю ў 1517–1519 гг. Т. 3. Мінск, 1991. С. 422–423.

[9] Для параўнання тэкст твора ў: Біблія. Кнігі Сьвятога Пісаньня Старога і Новага Запавету / Пер. В. Сёмухі. Duncanville, 2002. С. 863–868.

**Гласъ Хр(и)стовъ ко Церкви**: Се ты красна есь приятелко моя, се ты красна есь очи тое яко глубичий.

**Гласъ Церкви ко Хр(и)сту**: Се ты красен есь любый мой и лепый, постелька наша процвила. Кроквы домовъ нашых суть. Кедровы, и бальки наше кипросовы[10].

У прадмовах бачна, што погляды цара Саламона былі блізкія беларускаму першадрукару. Ф. Скарына ў гэтых творах прызнае не толькі духоўнае, але і цялеснае каханне. Ён быў прыхільнікам добрых нораваў. Ва ўступным слове да "Другога Закона" ён пісаў, што для ўсіх народаў варта прытрымлівацца наступнага: муж з жонкай павінны жыць добра, дзяцей выхоўваць, чалавек павінен вяртаць пазычаныя рэчы, супрацьстаяць насіллю. Пры гэтым аўтар асудзіў распуснікаў, гомасексуалістаў і скаталожнікаў[11]. Такім чынам, Ф. Скарына, выдаючы Біблію, распаўсюджваў не толькі слова Божае, але і ўзоры рэнесансавага кахання. Праз біблейскія прыклады ён імкнуўся ўвесці ў жыццё рэлігійны становучы ўзор кахання без усялякіх адхіленняў.

У гэтым кантэксце варта згадаць выданне пратэстанцкай Берасцейскай Бібліі 1563 г. Над перакладам на польскую мову працаваў цэлы калектыў. Яна суправаджалася каментарамі да кожнай главы[12]. У яе складзе таксама ёсць "Найвышэйшая песня Саламонава", якая тлумачыцца як размова паміж Хрыстом і Царквой. Перад другой главой адзначаецца, што Хрыстос – гэта лілея, а царква – ружа. У падобным рэчышчы змешчаны каментары да вершаў твора[13].

[c]*Lewą rękę swą niechay podłoży pod głowę moię, a*[d] *pod prawicą swą niechay mię obłapi.*

[c]To iest słowo iego w tym docześny, żywocie.

[d]To iest chwałą swą po tymninieyszym żywocie.

*Głos namiłszego mego, o to przychodzi*[f] *sktacząc po gorach, a skokiem bieżąc po pagorkach.*

[f]To się rozumie o Krystusie kthory na się wziął ciało nasze[14].

Пытанні нораваў, узаемаадносінаў паміж мужчынам і жанчынай закраналіся рознымі аўтарамі. Часам у сувязі з гэтым можна сустрэць выразнае негатыўнае стаўленне да жанчын. Міхалон Літвін не толькі крытыкаваў дзяржаўны лад у Княстве, але і норавы жанчын. Ён пісаў, што падчас выбару жонкі мужчыны цанілі пасаг, прыгажосць, паходжанне. На ягоны погляд, жанчыны нічым не былі заняты, а толькі хадзілі па гасцях, чапляліся да мужчынскіх кампаній, апраналіся ледзь як не мужчыны. Уключэнне нормы пра пасаг у Статут 1529 г. стала прычынай дрэнных адносінаў жанчыны з бацькамі, апекунамі

[10] Біблія: факс. Т. 3. С. 427.

[11] Францыск Скарына і яго час. С. 138–139.

[12] Грыцкевіч А. П. Брэсцкая Біблія // ЭГБ. Т. 2. Мінск, 1994. С. 93.

[13] Biblia swięta, tho iest, Księgi Starego y Nowego Zakonu, wlasnie z Żydowskiego, Greckiego, y Łacińskiego, nowo na Polski ięzyk z pilnością y wiernie wyłożone. Brzest, 1563. S. 350v–353.

[14] Ibid. S. 351.

ці мужам, бо пасаг забяспечваў незалежнасць. Літвін адзначаў, што жанчыны клапаціліся найперш пра сваю прыгажосць, каб ёю скараць мужчын, асабліва заможных. Аўтар пісаў, што заможныя жанчыны праз сваю хцівасць вядуць распусны лад жыцця, для гэтага не выходзяць замуж, а карыстаюцца станам удавы ці незамужняй і нават праследуюць падданых, каб задаволіць свае сексуальныя патрэбы. Ён лічыў, што татары і маскавіты абсалютна правы, што не даюць свабоды жанчынам, бо, як кажуць у народзе, "хто дасць волю жанчыне, той у сябе яе адніме". Такія стасункі паміж мужчынам і жанчынай, на ягоную думку, прыводзяць да змяншэння нараджальнасці[15].

Андрэй Волан у кнізе пра шляхецкую свабоду[16] разважаў пра розніцу паміж свабодай і сваволлем. Аўтар прыводзіў прыклад пра жаўнераў, якія забыліся пра закон. Гэта прывяло да злоўжывання сілай, руйнавання гарадоў, гвалту над жанчынамі. Волан даводзіў, што гвалт і грубая сіла непрымальны для здаровага розуму. Права павінна быць усталявана згодна з разумным падыходам. Паводле ягонага меркавання, нельга назваць правам, а толькі як нецнатлівасцю, калі на Кіпры дзяўчат перад шлюбам аддавалі на псаванне, прыводзілі іх так да распусты. У адзінаццатым раздзеле Волан асудзіў распусту, якая панавала ў той час у грамадстве нават у прыстойных дамах. Да катэгорыі распуснікаў ён аднёс пералюбнікаў, гвалтаўнікоў і спакуснікаў дзяўчат. Найбольш адмоўныя характарыстыкі атрымалі пералюбнікі. Прыводзячы прыклады жорсткіх пакаранняў у іншых народаў за шлюбную здраду (лупцаванне, каранне смерцю), падкрэсліваў, што ў Вялікім Княстве Літоўскім таксама трэба ўвесці такую практыку. Пры гэтым традыцыйна асуджалася менавіта жаночая здрада, якая прыводзіць да руйнавання дому[17]. На момант выдання твора ў ВКЛ сапраўды не было яшчэ ўведзена пакаранне для шляхты за пералюб. Яно з'явілася толькі ў Статуце 1588 г. Пакаранні дзейнічалі ў гарадах з магдэбургскім правам.

Асобную ўвагу Волан звярнуў на шляхцянак. Ён лічыў, што трэба забараніць жанчынам насіць залатыя ланцужкі, упрыгожанні, адзенне з шоўку, а дазваляць гэта толькі на вяселлях і ўрачыстасцях; яго абурала, што жанчыны ходзяць апранутыя так, "быццам бы на іх усе грошы краіны". Таксама ён асуджаў, што больш у цане заможныя нявесты, чым цнатлівыя, а бедныя прыстойныя дзяўчаты так і застаюцца не замужам. Для вырашэння праблемы ён прапанаваў пасаг даваць умераны, не вышэй за 6000 злотых. Акрамя гэтага, ён адзначаў, што ў гутарках першае месца займаюць пералюбніцы ці распусныя ўдовы. У доме жанчыны не сядзяць, у госці ходзяць, разам выпіваюць, а пасля гэта праваکуе да распусты. Шляхцянкі павінны захоўваць цноту і трымацца ў строгасці[18].

[15] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 90–91.

[16] Першае выданне кнігі выйшла на лацінскай мове ў 1572 г. Volano A. De libertate politica sive civili libellus lectu non indignus. Cracoviae, 1572.

[17] Wolan A. O wolności Rzeczypospolitey albo szlacheckiey / Tłum. S. Dubingowicz. Wilno, 1606. S. 4–7, 14, 51–59.

[18] Ibid. S. 67–70.

Пад уплывам антычных філосафаў склалася бачанне на шлюб, адносіны і жанчын у гуманіста, перакладчыка і каментатара канца XVI – пачатку XVII ст. Беняша Буднага, які служыў пры двары віленскага ваяводы Крыштафа Радзівіла. У кнізе былі змешчаны цытаты знакамітых філосафаў і гісторыі з антычнасці і Рэчы Паспалітай з каментарамі Буднага. Аўтар даволі супярэчліва ставіўся да шлюбу, што было звязана са стэрэатыпнымі адносінамі да жанчын. На думку гуманіста, толькі патрэба ў нашчадках прымушала мужчын мець адносіны з жаночым полам. Пры гэтым цэлы раздзел быў прысвечаны вядомым жанчынам. Будны лічыў, што ў паводзінах жанчына дазваляе сабе больш, чым таго патрабуе прыстойнасць, а сарамлівасць ёй уласціва толькі пад прымусам. Таму з даўніх часоў жанчыну трымаюць у паслухмянасці да канца жыцця: пакуль яна ў паненскім стане – у бацькоў, а потым – у шлюбе. Аўтар раіў выбіраць жонку з сярэдняй маёмасцю, каб яе месца не перавышала месца мужа ў сям'і, і падчас выбару не разлічваць толькі на вочы, але і слухаць, што кажуць пра жанчыну. Яе найлепшыя рысы – цнатлівасць[19] і сарамлівасць. Было прыведзена меркаванне праўніка Ліцургуса, які ўсталяваў шлюб без пасагу, каб мужчыны абіралі жанчын па пачцівасці. Увогуле, на думку аўтара, прызначэнне жанчыны – нараджаць дзяцей і выхоўваць іх. Аднак пры гэтым прыводзіліся прыклады геральных учынкаў жанчын пры абароне сваёй Айчыны[20].

Будны меў адносна жанчын не толькі патрыярхальныя погляды, але яўна дыскрымінацыйныя. Для яго ідэальная жанчына – гэта паслухмяная істота, якая цалкам падпарадкавана мужу, займаецца гаспадаркай і дзецьмі, выконвае рэпрадуктыўныя функцыі і недасведчаная ў сексе.

Б. Будны падзяляў думку Дыягена, што каханне – гэта забавы для лайдакоў. Акрамя таго, прывёў словы з Авідыя:

> Skoro odeymiesz zbytnie prożnowanie:
> Kupudo na cie wnet strzelać przestanie[21].

У працы прыводзіліся выказванні наконт таго, што сексуальныя стасункі стратныя для моцы мужчыны. Калі ў Піфагора спыталі, у які час лепш бавіцца з жанчынай, то ён адказаў, што гэта трэба рабіць тады, калі хочаш, каб сіл менш стала. У каментарах Будны адзначыў праўдзівасць выказвання, што "Венус" і "Бахус" у чалавека сілы забіраюць[22].

---

[19] Як довад пра існаванне цнатлівых жанчын у канцы кнігі змешчана гісторыя пра тое, як два купцы заклаліся на цнатлівасць жонкі. Падманным шляхам Амброжы патрапіў у дом купца Вінцэнта, падглядваў за жанчынай, пакуль яна распраналася, і скраў яе каштоўнасці. Гэта пасля стала доказам нявернасці жонкі. Вінцэнт загадаў яе забіць, але слуга пашкадаваў і адпусціў. Пасля доўгіх пакутаў яна патрапіла на двор караля, але пад выглядам мужчыны. Лёс склаўся так, што яна сустрэла Амброжыя, даведалася пра прычыну яе няшчасцяў, знайшла мужа, і разам яны вярнуліся дадому. Амброжы быў пакараны. Гісторыя на старонках без нумарацыі ў выданні: Budny B. Krotkich a wężłowatych opowieści, ktore po grecku zową Apophtegmata. Lubcza, 1614.

[20] Budny B. Krotkich a wężłowatych opowieści. Lubcza, 1614. S. 70, 85, 130–131, 146–155; Kraków, 1635. S. 411, 472, 484–485.

[21] Budny B. Krotkich a wężłowatych opowieści. Lubcza, 1614. S. 40.

[22] Ibid. S. 65.

*Мастацкая літаратура.* У XVI ст. пераклады рыцарскага рамана на старабеларускую мову[23] ўзбагацілі лірыку кахання і нават веды пра інтымную сферу жыцця. Значны ўнёсак у літаратуру быў зроблены дзякуючы перакладу "Аповесці пра Трышчана", у якой рыцарскія прыгоды спалучаліся з рамантычнай лініяй[24].

"Аповесць пра Атылу" ўтрымлівае сюжэт пра першую шлюбную ноч Атылы і Мікольты. Жаніх выпіў віна праз меру і "бавіўся" ўначы больш, чым трэба. Калі Атыла заснуў, то кроў пайшла носам і ён захлябнуўся ад гэтага. Мікольта прачнулася ад таго, што гарачая кроў "на перси текла", і закрычала. Да гэтай сітуацыі быў змешчаны каментар аб тым, што празмернае заняцце сексам шкоднае для здароўя не толькі для сталых, але і для маладых мужчын. Атыле было 56 гадоў. Для характарыстыкі сексуальных дачыненняў у тэксце выкарыстана слова "венус"[25].

"Аповесць пра Баву" ўтрымлівае непрыстойныя словы "курвін сын" і "курва". Яны былі ўжыты падчас апісання падзей, звязаных з забойствам Гвідона. Рычарда абразілі неадпаведным сынам двойчы. Першы раз ён пачуў гэта ад жонкі Гвідона. Яна загадала яму паехаць да Дадона і перадаць, каб ён забіў яе мужа падчас палявання. Калі ён адмовіўся, то жанчына прыгразіла разарваць на сабе вопратку і абвінаваціць яго ў згвалтаванні. Другі раз, калі Рычард перадаваў словы жонкі Гвідона і Дадон западозрыў яго ў здрадзе. У выніку жанчына зрабіла так, што муж паехаў на паляванне і там яго забіў Дадон. Пасля гэтага выпадку жонку Гвідона аўтар назваў курвай. Калі яна даведалася ад Дадона, што мужа няма сярод жывых, то павяла яго за руку ў асобную камору. Гэты сюжэт вельмі добра паказвае маніпуляванне жанчынай мужчынамі праз секс для дасягнення сваёй мэты. Каб пазбавіцца ад мужа, яна аднаму пагражала абвінаваціць у згвалтаванні, а другому абяцала секс[26]. У дадзеным выпадку

---

[23] Аб перакладной літаратуры гл.: Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. С. 372–376, 452; Кіпель З. Беларуская перакладная літаратура XV–XVI стст. як мост паміж Усходам і Захадам // Беларусь паміж Усходам і Захадам. Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Ч. 2. Мінск, 1997. С. 175–181; Кіпель З. Лёс беларускай аповесьці аб Тундалі ў сьвятле беларуска-заходнеславянскіх узаемадачыненьняў // Скарыназнаўства. Кнігазнаўства. Літаратуразнаўства. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэсу беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый", Мінск, 2000. Мінск, 2001. С. 140–143; Бразгуноў А. Трансфармацыя і эвалюцыя заходнееўрапейскага рыцарскага рамана ў беларускай літаратуры XVI ст. // Скарыназнаўства. Кнігазнаўства. Літаратуразнаўства. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэсу беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый", Мінск, 2000. Мінск, 2001. С. 143–149.

[24] Аповесць захоўваецца ў складзе іншых твораў. Biblioteka Raczyńskich w Poznaniu, rkps 94, k. 1–127; Карский Е. Белорусы. Т. III. С. 77–78. Надрукавана факсіміле з транслітарацыяй на старабеларускую і перакладам на беларускую: Беларускі Трышчан / Пад рэд. М. Машкевіча. Вроцлаў, 2006.

[25] Аповесць пра Атылу перакладзена ў 1574 г. Цыпрыянам Базылікам на польскую мову. Пераклад на старабеларускую з'явіўся не пазней за 1582 г. Веселовский А. Н. Из истории романа и повести. Вып. 2. Славяно-романский отдел // Сборник отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук. Т. 44. № 3. СПб., 1888. Приложение. С. 232.

[26] Аповесць перакладзена ў XVI ст., захоўваецца ў складзе рукапісу ў Бібліятэцы Рачынскіх (Biblioteka Raczyńskich w Poznaniu, rkps 94); Веселовский А. Н. Из истории романа и повести. С. 130–131, 133; Карский Е. Белорусы. Т. III. С. 78–80.

абраза "курва" адносілася да жанчыны, якая няверная сваймy мужу, непрыстойная ў паводзінах. Акрамя таго, яна названа "курва маці", бо хацела забіць сына Баву.

Асобная лінія аповесці – гісторыя кахання Бавы і Дружнены, дачкі армянскага цара. Яны пераадолелі шмат перашкод, каб быць разам. Адносіны пачаліся пасля рыцарскага турніру. Пад пагрозай абвінаваціць у згвалтаванні Дружнена прымусіла Баву заручыцца – ускласці ёй вянок, пасля чаго яна моцна пацалавала юнака. Пра зачацце іх сыноў напісана наступнае. Увечары Бава напаіў каня, памыў рукі, прыйшоў да Дружнены, схапіў яе за грудзі і меў з ёй секс тройчы. Праз дзевяць месяцаў нарадзіліся дзеці. Баву і Дружнену лёс развёў на сем гадоў. Сям'я аб'ядналася, калі жанчына прыйшла да Бавы з сынамі пад выглядам скамарошніцы[27]. Гэта гісторыя цікавая тым, што паказвае актыўную ролю жанчыны ў адносінах з мужчынам. Сюжэт з сексуальнымі стасункамі апісвае элементарныя сродкі гігіены перад актам – мыццё рук. Гэта забяспечвае захаванне ўлоння жанчыны ад інфекцый. Папярэднія пяшчоты даволі агрэсіўныя – "схапіў за грудзі". Палавы акт адбыўся не адзін раз і забяспечыў зачацце дзяцей.

Цікавасць да замежнай літаратуры мела месца таксама ў XVII ст. Але творы перакладаліся ўжо на польскую мову. Берасцейскі войскі Крыштаф Пекарскі займаўся перакладчыцкай дзейнасцю. Яго цікавілі італьянскія творы. Так з'явілася ў друку ў 1652 г., а пасля перавыдадзена ў 1695 г., кніга "Страшны Герой" Франчэска Андрэіні[28], якая складалася з размоў героя і яго слугі Татумфацкага, у якіх абмяркоўваліся розныя тэмы. Герой трапляў у госці да Багоў Алімпа. У яго была каханая Ізабэла, таму размовы таксама ішлі пра каханне і шлюб: "*Miłość z nogą maluią dla ryb, z skrzydłami dla ptastwa, z ogniem dla niewiast, z strzałami dla męszczyzn, a z armatą dla rożnych zierząt*". Тэма была актуальна, бо героя ахапіла каханне, і ён не хацеў працягваць вайсковую выправу, жадаў застацца ў доме з прыгажуняй. Апісанне кахання больш падобна на апісанне стану звар'яцелага чалавека. Падкрэсліваецца, што герой не можа сябе кантраляваць і падпарадкоўваецца сваймy пачуццю, у чым вінаваціць жанчыну. Прычым падаецца розніца паміж прыстойнымі жанчынамі для шлюбу і распуснымі куртызанкамі. Наконт жанчын сустракаюцца сексісцкія меркаванні, што без кія абысціся не можа арэх, асёл і жанчына; адно жанчына думае, а другое кажа, таму зразумець іх цяжка, лепш найгоршы мужчына ў свеце, чым найлепшая жанчына, і інш. Асобна падкрэслівалася, што муж галава жонцы і жонка павінна яму падпарадкоўвацца[29].

---

[27] Веселовский А. Н. Из истории романа и повести. С. 139, 154, 161, 168–172.

[28] Франчэска Андрэіні (1548–1624) быў аўтарам камедыйных твораў. Яго праца пра героя камедыі дэль артэ з назвай *Le Bravure del Capitano Spavento* была ўпершыню надрукавана ў 1607 г. Frajese F. A. Andreini, Francesco // Dizionario Biografico degli Italiani. Vol. 3. 1961. Рэжым доступу: http://www.treccani.it/enciclopedia/francesco-andreini_(Dizionario-Biografico).

[29] Andreini F. Bohatyr Straszny. Z włoskiego na łaciński, z łacińskiego na polski ięzyk przetłumaczony przez Krzysztofa z Piekar Piekarskiego, Woyskiego Woiewodztwa Brzeskiego. Kraków, 1695. S. 12, 22–25, 38, 60, 63, 112–113.



ITINERARIVM
Nobiliorum
ITALIÆ REGIONVM,
VRBIVM, OPPIDORVM,
ET LOCORVM;

Nunc seriò auctum, & Tabellis Chorographicis, & Topographicis locupletatum,

*In quo, tamquam in Theatro, Nobilis adolescens, etiam domi sedens, præstantissimæ regionis delicias spectare cum voluptate poterit.*

AVCTORIBVS
FRANCISCO SCHOTTO ANTVERPIENSI I. C.
ET F. HIERONYMO EX CAPVGNANO
Bonon. Prædicatorio.

VICENTIÆ,
Apud Petrum Bertellium Bibliopolam Pa
*Superiorum permissu.*

Тытульны аркуш даведніка па Італіі. Кніга прысутнічала ў прыватных бібліятэках шляхцічаў ВКЛ.
*Schotti A. Itinerarium nobiliorum Italiae regionum... Vicentiae, 1600*




Тытульны аркуш кнігі аб Асманскай імперыі. Сярод іншага выданне ўтрымлівае апісанне нораваў туркаў.
*Monarchia turecka... Słuck, 1678*



MICHALONIS LITVANI
DE MORIBVS
TARTARORVM,
LITVANORVM ET MO-
SCHORVM, FRAGMINA X.
multiplici Historia
referta.
ET,
IOHAN. LASICII POLONI
DE DIIS SAMAGITARVM,
CÆTERORVMQ. SARMATARVM,
ET FALSORVM CHRISTIANORVM,
Item
DE RELIGIONE ARMENIORVM.
Et de initio Regiminis Stephani
Batorij.
Nunc primùm per
I. IAC. GRASSERVM, C.P.
ex Manuscripto Authentico edita.

BASILEÆ,
Apud CONRADVM WALDKIRCHIVM.
M DC. XV.

Тытульны аркуш кнігі
Міхалона Літвіна
пра норавы татараў,
літвінаў і маскавітаў.
*Michalonis Lituani.*
*De moribus tartarorum…*
*Basillae, 1615*



Герб Сфорцаў,
якім карысталася
Бона Сфорца, жонка
Жыгімонта Старога.
Палац у Мілане.
Фотаздымак аўтара



Палац Сфорцаў
у Мілане



Радавод Тышкевічаў са старадруку
як сведчанне вайсковых, дзяржаўных
і мецэнацкіх дасягненняў роду.
*Izdebski A. Phaenomena seu aspectus felicissimi syderu[m]... Vilnae, 1641*

Надмагілле Паўла Сапегі
і яго трох жонак з касцёла Св. Яна
Хрысціцеля з Гальшан. Музей
старажытнабеларускай культуры





Партрэт Жыгімонта Аўгуста, караля,
які нават пад ціскам грамадства не
адмовіўся ад свайго кахання.
*Bielski M. Kronika polska. Kraków, 1597*



Партрэт Стэфана Баторыя.
Кароль адпавядаў вобразу ваяра,
рыцара, абаронцы.
*Bielski M. Kronika polska. Kraków, 1597*

Тытульны аркуш кнігі А. Волана пра шляхецкую свабоду. Сярод іншага ў ёй закранаюцца пытанні нораваў у грамадстве, статусу і паводзінаў жанчын.
*Volano A. De libertate politica sive civili libellus lectu non indignus. Cracoviae, 1572*


DE LIBERTATE POLITICA SIVE CIVILI LIBELLVS LECTV NON INDIGNVS.

*

Autore ANDREA VOLANO.

CRACOVIÆ
In Officina Matthiæ Wirzbiętæ Thypographi S.R.M.


BOHATYR STRASZNY,

Z Włoskiego na Łaćinski, z łaćinskiego ná Polski Ięzyk.

PRZETŁVMACZONY.

PRZEZ

KRZYSZTOFA z Piekar PIEKARSKIEGO, WOYSKIEGO Woiewodztwá Brzeskiego.

A

Teraz Nowo z Przydatkiem Regestru zebránego y Tytułow przy Rozmowách, dla lepszego Dyskursow wyrozumienia, dokładnie, z dostáteczno dawnych w Druku omełek poprawą

PRZEDRVKOWANY.

Nakładem Krzysztofa Domáńskiego,

W KRAKOWIE,
w Drukárni Mikołaja Alexandra Schedla, I.K.M. Typogr. Roku Pańskiego, 1695.

Тытульны аркуш кнігі Ф. Андрэіні “Страшны Герой”. У размовах героя і слугі абмяркоўваліся дачыненні з жанчынамі, каханне, шлюб і інш.
*Andreini F. Bohatyr Straszny… Kraków, 1695*



Ісус Хрыстос, Мікеланджэла,
базіліка Св. Духа, Фларэнцыя (1492).
Фотаздымак аўтара

Сыход Хрыста ў Лімб,
Бранзіна, базіліка Св. Крыжа,
Фларэнцыя (1552)





Габрыэль д'Эстрэ і адна з яе сясцёр,
Галерэя Уфіцы, Фларэнцыя
(другая палова XVI ст.).
Фотаздымак аўтара

Партрэт адмірала Андрэа Дорыа,
Бранзіна, Пінатэка Брэра, Мілан
(1550). Фотаздымак аўтара



Маргіналіі ў "Аповесці пра ружу".
*De Lorris G., de Meun J. Le Roman de la Rose. 1301–1400*






Тытульны аркуш кнігі
М. Гусоўскага
“Песня пра зубра”.
*Carmen Nicolai Hussoviani de statura, feritate ac venatione bisontis. Cracoviae, 1523*

Анёлы ў афармленні
карты ВКЛ Т. Макоўскага.
*Magni Ducatus Lithuaniae, caeterarumque regionum illi adiacentium exacta description. Amsterdam, 1613*



Малюнак
Аўгуста Вінцэнці
Лоцы на лісце
да караля Яна III.
НГАБ, ф. 695,
воп. 1, спр. 103,
арк. 16 адв.



Фігура “Алегорыя Сілы”,
Нікола Пізана, Хрысцільня ў Пізе (1260).
Фотаздымак аўтара





Фрэска “Страшны суд”, Джотта, капліца Скравені, Падуя (1305). Фотаздымак аўтара

Фрэска “Страшны суд”,
Спаса-Праабражэнская царква, Полацк (XII ст.).
Фотаздымак Алеся Аркуша





Аголены мужчына з д’ябламі ў сцэне з князем Уладзімірам,
Радзівілаўскі летапіс (XV ст.)




Гарадзенскія мяшчанкі,
фрагмент гравюры Адэльгаўзера-Цюнта
(1567–1568)

Купцы,
фрагмент гравюры Адэльгаўзера-Цюнта (1567–1568)





Візуалізацыя продкаў
на радаводзе Пузынаў
са старадруку.
*Brzozowski G. Trophaeum philosophicae veritatis... Vilnae, 1699*



Партрэт Генрыка Валезы
ў еўрапейскім строі.
*Bielski M. Kronika polska. Kraków, 1597*

Партрэт Антонія Навагеры,
Джавані Батыста Мароні,
Пінатэка Брэра (1565).
Фотаздымак аўтара



Гарадзенскі селянін, фрагмент абраза "Танец смерці"
(канец XVII ці пачатак XVIII ст.). Фотаздымак аўтара







Застаўкі і ініцыял
з выдання Францыска Скарыны
(Кнігі Майсеевы, Эстэр),
Прага (1519)





Адам і Ева,
фрагмент тытульнага
аркуша Берасцейскай Бібліі
(1563)



Жаночыя фігуры
на бакавым фрагменце алтара
з капліцы в. Мохавічы Лідскага
раёна. Музей старажытна-
беларускай культуры.
Фотаздымак аўтара

Напалову аголеныя
целы мужчын,
касцёл Св. Пятра і Паўла,
канец XVII ст., Вільна.
Фотаздымак Таццяны Вароніч






Гравюра К. Гётке з сімвалами шлюбу.
*Ozembłowski I. Annuli nuptiales…*
*[Vilnae, 1647]*




Тытульны аркуш кнігі А. Весалія з анатамічным ускрыццём цела.
*Vesalius A. De humani corporis fabrica. Basileae, 1555*




Вянозная сістэма мужчыны.
*Vesalius A. De humani corporis…*




Структура мышачнага корпусу мужчыны.
*Vesalius A. De humani corporis…*


C. PLYNII SE
CVNDI NATVRAE HI
STORIARVM LIBRI XXXVII.
È CASTIGATIONIBVS HERMO
LAI BARBARI, QVAM EMEN
DATISSIME EDITI.
Jordanus Nobilis
Additus est ad maiorem Studiosorum commoditatem, Index
Ioannis Camertis Minoritani, quo Plynius ipse totus
breui mora temporis edisci potest.

AD LECTOREM
Qui cœlum, terras, æquor, genus omne animantum
Omne exors animæ, quid ferat omnis ager
Inuentus rerum uarios, Artes'q;, Metalla
Marmora cum gemmis, quid iuuet, aut noceat
Deniq; naturæ qui cuncta adoperta reuelat
Plynion integrum, Candide Lector, habes
Atq; ita q; priscum præseruat fronte nitorem
Lima viri docti præstitit Hermoleo
Cui ferè te tantum (dicam) debere fatendum
Auctori quantum secula debuerunt.

CAVTVM MAX. AEMIL. AVG.
Decreto Priuilegio, ne quis intra
Sexennium excudat.
Ex Libris D. D. Pauli Argentina.

Тытульны аркуш кнігі Плінія Старэйшага, якая ўтрымлівала раздзел з інфармацыяй пра нараджэнне дзяцей.
*Plinius Gaius Secundus. Historia naturalis.*
*Hagenoae, 1518*

Спусканне крыві.
*Falimirz S. O ziołach i o moczy ich. Kraków, 1534*







Цырульнік.
*Falimirz S. O ziołach...*



174

## Thu masz wiedziec czas iuz natichmiast przychodzacy zlezenia albo rodzenia / ytez kthemu bieg a obyczay prawie przyrodzony / y nad przyrodzenie rodzenia dzieciecia.

### Capitulum 2.

Pospolity á zwyczayny czas zlezenia / iest dziewiaty miesiąc / abowiem dziewiątego miesiącza wypełnionego zlezenie przychodzi / á tak okolo czterdziesci niedziel od poczęcia przychodzą thy znaki na brzemienną niewiaste ktore vkazuią rychle porodzenie dziecie.

¶ Naprzod przychodzą okolo dymion (cia. ytez okolo pępka bolesci / takiez tez y w krzyżu / przy tym zapalenie / czliwosc / y nadymanie zywota / slabizn przychodzi : Gdy thy znamiona przychodzą na brzemienną niewiaste vkazuią rychle porodzenie.

¶ Thez mamy wiedziec o dwoiakiem rodzeniu / Jedno iest przyrodzonym á slusznym obyczaiem / á tak według rodzenia / iako thez według czasu : Drugie rodzenie nad obyczay przyrodzony / tak w rodzeniu dzieciecia / iako thez y w nieslusznym czasie.

☞ Abowiem dziewiąty miesyc iesth prawy á sprawiedliwy czas porodzenia / aczkolwiek sie przygadza y siodmego miesyca zlezenie / kthore bywa zdrowe dziecigtko : ale osme° miesyca ktore sie dziatki rodzą / pospolicie á rzadko ma pochybic aby miały zywo zostac / o czym Auicenna swiadczy / slusny obyczay á pospolity rodzenia dziecigtka : Z powiesci wielkiego Woyciecha / taki ma byc naprzod iz glową sie ma dziecie rodząc vkazowac / potym szyią z ramiony / potym rączki ku boczkom przytulone á ku noszkam sciągnione : takze wychodzi z zywotha za pomoczą babiną / az do konecza wynidzie / á na ostatek noszki : bowiem tenze wielki Woyciech pisze iz dziecie w zywocie matki swoiey ku grzbietowi oczyma y pierskami / glowką ku pępkowi matczynym siedzi. Potym gdi czas ku porodzeniu przychodzi / wznak sie obroci / thak iz g[…]ą na doł / noszkami ku gorze / oczyma ku zywotowi matczynemu sie obracza / á tak przyrodzonym obyczaiem z zywota wychodzi iako tu na figurze widzisz : drugie iz ku takiemu rodzeniu przyrodzonemu to tez ma byc / izeby rychlo dziecigtko niezabawiaiąc wychodziło z zywota á krom wielkiey cieszkosci y wielkiey bolesci.

Tu masz slusne rodzenie.

¶ Zasie nad przyrodzony obyczay rodzenie / Naprzod czasu niesłusznе° / albo nie tym sposobem namienionym z zywota wychodzenie : Auicenna / Rodzenie ktore nie glową ale nogami przichodzi / á ktemu rece ku nogam y ku biodram przytulone / powieda byc niesłuszne / awszakoz iednak bliskie ku przyrodzonemu rodzeniu / á to dla tego iz tez takim obyczaiem rodząc sie dziecie / zywo y z matką zostaie / iako tu na tey figorze widzisz.

Takie rodzenie nie według przyrodzenia.

## Tu zasie masz wiedziec o latnym a lekkiem ytez o cieszkim rodzeniu / á kthoremi znaki lekkie albo cieszkie ma byc rodzenie poznano.

f 4 Capi.

Становішча плода.
*Spiczyński H. O ziolach tutecznych…*
*Kraków, 1542*



Роды.
*Spiczyński H.*
*O ziolach tutecznych…*




Роды.
*Rößlin E. Der Swangern frawen und hebamme[n] roszgarte[n], [Hagenau], [1515]*



Прыгатаванне лекаў у аптэцы.
*Siennik M. Lekarstwa doświadczone…*
*Kraków, 1564*



Rosegarten

Vnd so das kind sich mit
den kniiwen erzeugt/ od mit
einē knü kem an die geburt.
So soll die hebam dz kind
vbersich heben vnd die füess
begriffen/ vñ wie obgeschri-
ben ist dem kind zů vßgang
helffen

Jtē ob das kind ein hand
erzeugte/ So sol die hebam
das kind nit empfahē/ sond
sie soll mit yngelaßner hād
die schultern des kindes be-
greiffen vnd hindersich hebē
vnd die hand neben des kin-
des seyten hynab streckē/ dz
haupt begreiffen/ vñ im zů
vßgāg helffen. Wo aber sö-
lich wysen vnd schicken der
hend nit ein fürgāg wolt ha-
ben So ist aber not dz man
die fraw an ruckē lege/ vnd
mit dē haupt nider vnd mit
dē hindern hoch/ damit das
das kind hindersich fall/ vñ
als dan wider sitzē/ vñ dem
kind zů vßgang helffen.

E

Становішча плода.
*Rößlin E. Der Swangern…*

Унутраныя органы
жаночага цела.
*Rueff J. De conceptu et generatione hominis... Francoforti ad Maenum, 1580*




Маціца і плод.
*Rueff J. De conceptu...*







Гінекалагічныя інструменты.
*Rueff J. De conceptu...*




Верш пра еўнуха “Kyslyr Aga albo na przełożony nad czarnymi eunuchami w Saraiu białogłowskim”. *Monarchia turecka...*



Выявы людзей ва ўзросце. *Protasowicz J. Konterfekt człowieka starego. Wilno, 1597.*

Блохі.
*Spiczyński H.*
*O ziolach tutecznych…*






BARWICZKA
DLA OZDOBY TVVARZY
Pánienskiey.

Ná pilne żadánie Pánny Daygoty Wietostroyskiey / imieniem dobrych towárzyszek uczyniona.

Przez Rádopátrzká Gładkotwarskiego z Lekarzewic.

Homer. Iliad.
Forma mulieres ornat, virum autē robur,
Pulchra; iucunda est visu delectabilis auditu: Sensus omnes formosa delectat.

W Wilnie/ Roku 1605.

Тытульны аркуш кнігі пра прыгажосць.
*Gładkotwarski R. Barwiczka dla ozdoby twarzy panienskiey. Wilno, 1605*



Танцы жыхароў ВКЛ.
*Olaus Magnus. Historia de Gentibus Septentrionalibus. Romae, 1555*



Партрэт вялікага князя літоўскага Вітаўта.
Паводле Я. Длугаша, ён меў шалёны тэмперамент і вельмі любіў жанчын.
*Guagnini A. Sarmatiae Europeae descriptio… Spirae, 1581*

Анёлы, касцёл Св. Пятра і Паўла, Вільня. Фотаздымак аўтара



Тытульны аркуш
кнігі Псеўда-Арыстоцеля,
якая мела звесткі пра цела
мужчынскае і жаночае.
*Problemata Aristotelis ac
philosophorum medicorumque
complurium. Paganus, 1557*



PROBLEMATA ARISTOTELIS AC PHILOSOPHORVM MEdicorumq; complurium, ad uarias quæstiones cognoscēdas admodum digna, & ad naturalem Philosophiam discutiendam maxime spectantia.

MARCI ANTONII ZIMARAE Sanctipetrinatis Problemata his addita, unà cum trecentis Aristotelis & Auerrois Propositionibus, suis in locis insertis.

ALEXANDRI APHRO... per Quæstionibus nonnullis Physi... Solutionum Liber, Angelo Politiano Interprete.

DER MAGISTRAT ZU LANGENSALZA

Выява з куфра гетмана ВКЛ
Міхаіла Казіміра Паца.
Фотаздымак Таццяны Вароніч





Схематычная выява на карце
рэчкі Гарынь, Мазырскі павет. НГАБ,
ф. 1477, воп. 1, спр. 3176



“Сатыр і німфа”.
*L’Arétin d’Augustin Carrache ou Recueil de postures érotiques, 1798*



"Пандора".
*L'Arétin d'Augustin Carrache…*



Тытульны аркуш
Бібліі 1563 г.
На выяве да мужчыны
шчыльна прыціснуўся
д’ябал

Мужчыны цалуюцца.
Медзярыт “Вечар
плытагонаў на Нёмане”,
Г. Рэдліх паводле
М. А. Пятроўскага
(1866)






Тытульны аркуш даведніка па публічных дамах у Амстэрдаме.
*Le Putanisme d'Amsterdam: Livre contenant les tours et les ruses, dont se servent les Putains et les Maquereles. Amsterdam, 1681*

*Панегірычная літаратура.* Каханне і эротыка прысутнічалі ў творах вясельнага цыклу[30]. Кожны этап (сватаўство, заручыны, вітанне жаніха і інш.) суправаджаўся прамовамі. Найбольш важнымі і кульмінацыйнымі былі прамовы на аддаванне панны і падзяку за яе. У іх даволі поўна паказана ўсхваленне дзяўчыны і яе паходжання. Прамаўлялі іх спецыяльна запрошаныя асобы ад імя жаніха і нявесты[31].

Напрыклад, пры адданні вялікаму маршалку ВКЛ Яну Станіславу Сапегу Грызельды Вадынскай на вяселлі ў Гародні 1 чэрвеня 1631 г. была адмысловая прамова. У ёй усхвалялася паходжанне жаніха, яго адпаведнасць продкам, пасаванне Яна і Грызельды адно другому. Напрыканцы была выказана просьба да Бога благаславіць шлюб і пажаданне доўгіх гадоў жыцця[32].

У першы вясельны вечар былі провады ў ложак – пакладзіны. Яны суправаджаліся спецыяльнымі для гэтага выпадку прамовамі: запрашэнне панны ў ложак, аддаванне панны ў ложак, падзяка за панну ў ложку, падзяка за добрае выхаванне, адказ на падзяку[33]. Захавалася гістарычная прамова падзякі ў ложку канюшага ВКЛ Крыштафа Хадкевіча за Альжбету Кішчанку. Частка прамовы прысвечана інстытуту шлюбу. Усхваляліся подзвігі К. Хадкевіча ў Інфлянтах, у маскоўскіх экспедыцыях. Пасля вяртання дадому, прыслухаўшыся да парад бацькоў і сяброў і пры спрыянні канцлера ВКЛ Льва Сапегі, ён звярнуў сваю ўвагу на Альжбету як на будучую жонку. Падкрэслівалася, што жаніх паходзіць са знакамітага роду. Яго продкі вылучаліся сваёй вайсковай і палітычнай дзейнасцю. Адзначаліся сваяцкія сувязі са знакамітымі родамі Рэчы Паспалітай[34]. Уся прамова была накіравана на тое, каб паказаць, што жаніх – годны чалавек, таму сваякі нявесты не павінны шкадаваць, што аддалі дзяўчыну за яго замуж. Гэтая прамова перапісвалася шмат разоў і трапіла ў крыніцы як падзяка за панну і як падзяка ў ложку[35].

Асобна варта згадаць пра ўрачыстыя прамовы, спецыяльна напісаныя на канкрэтнае вяселле. Большасць з іх была надрукавана, некаторыя захаваліся ў рукапісах. Мода на іх пайшла з двара вялікага князя літоўскага і польскага караля Жыгімонта Старога, пасля яна перайшла да магнатаў і шляхты. Для першай паловы XVII ст. асноўнай тэмай у прамовах было каханне, якое ўносіць гармонію ў жыццё асобы. У другой палове XVII ст. каханне сталі апісваць як бітву. Перамога жанчыны над мужчынам з'яўлялася несапраўднай, бо

---

[30] Падрабязней пра шляхецкае вяселле і яго літаратурнае суправаджэнне гл.: Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 377–448.

[31] Biblioteka Kórnicka, sygn. BK 1195, k. 37–38, 105; Woysznarowicz K. Orator polityczny weselnym i pogrzebowym służą aktom. Tak stanowi duchownemu, iako rycerskimu potrzebny. Kraków, 1677. S. 44–122; Trębska M. Staropolskie szlacheckie oracje weselne. Geneologia, obrzęd, źródła. Warszawa, 2008. S. 145–149.

[32] AGAD, AR, dz. II, sygn, ks. 7, k. 337–342.

[33] Trębska M. Staropolskie szlacheckie oracje weselne. S. 231–244.

[34] Biblioteka Kórnicka, sygn. BK 1195, k. 40–43; Damianowicz S. Księga mowy na seymach, weselach y pogrzebach miane w sobie zamykaiące do ktorych listy rozne epitafia y fraszki werszem pisanie są przydanie (1645), LVIA, f. 1135, ap. 2, b. 46.

[35] Trębska M. Staropolskie szlacheckie oracje weselne. S. 237–240, 298.

ў рэчаіснасці яе скарае мужчына[36]. Гэта было звязана з архаічным уяўленнем пра секс як уладу. Для мужчын было важна падкрэсліць сваё дамінаванне над жанчынай[37]. У дадзеным выпадку гэта "змаганне" знайшло свой водгук у вясельных прамовах.

Прамовы адрасаваліся ў першую чаргу маладым і іх сем'ям. Яны не адносіліся да нейкага абраду, творы рыхтаваліся ў адпаведнасці з тагачаснай рыторыкай. Значэнне мела назва твора і прысвячэнне прадмовы. Увага аддавалася гербам родаў, паходжанню маладых. Яны павінны былі эмацыйна ўздзейнічаць на слухачоў, схіляць да падтрымкі традыцый, падпарадкавання хрысціянскім запаветам[38].

Адмысловы верш на вяселле польнага гетмана ВКЛ Крыштафа Радзівіла і Кацярыны Астрожскай быў напісаны Янам Каханоўскім (1578)[39]. Андрэй Волан склаў панегірык з нагоды вяселля троцкага кашталяна Юрыя Радзівіла і Зафеі Ганны Збароўскай (1601)[40]. Панегірычныя творы былі прысвечаны вяселлям Юрыя Гарабурды і Ганны Крысціны Завішанкі[41], Аляксандра Храптовіча і Багданы Жыжэмскай[42] і інш.

*Літаратурныя забавы.* Да катэгорыі літаратурных забаў можна аднесці творы, якія называліся "жаночыя соймы". Яны маюць непасрэднае дачыненне да ўяўленняў пра адносіны паміж мужчынам і жанчынай. Першы з іх датуецца 1543 г., быў напісаны ў Польшчы. Найбольшую папулярнасць "жаночыя соймы" набылі ў XVII ст., яны неаднаразова перадрукоўваліся[43]. Гэта своеасаблівыя пародыі на соймікавыя інструкцыі. Асноўнай іх тэмай былі жаночыя пытанні, з якімі "адпраўлялі" паслоў на вальны сойм.

У ВКЛ "жаночыя соймы" таксама мелі месца. Інструкцыя 1641 г. прызначалася на сойм у Варшаве. Яна змяшчала 19 пунктаў, сярод якіх былі наступныя:

- Юнакі не павінны цікавіцца пасагам, бавіцца доўгім заляцаннем.
- Тыдзень перад Вялікім пастом, у які звычайна дамаўляліся пра шлюб, патрабавалася павялічыць да 12 тыдняў.
- Рознасць рэлігій не павінна перашкаджаць шлюбу.

---

[36] Mroszek K. Epitalamium staropolski. Między tradycją literacka, a obrzędem weselnym. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk; łódź, 1989. S. 47, 59, 61.

[37] Говард М. Сучасная культурная антрапалогія. С. 206–209.

[38] Mroszek K. Epitalamium staropolski. S. 55–56, 63; Niedźwiedź J. Nieśmiertelne teatra sławy. Teoria i praktyka twórczości panegirycznej na Litwie w XVII–XVIII w. Kraków, 2003. S. 185–229, 251.

[39] Kochanowski J. Dzieła polskie. T. III. Warszawa, 1953. S. 149–153; Mroszek K. Epitalamium staropolski. S. 119–120.

[40] Volan A. Nuptiae Radiviliae hoc ets Ad... Georgium Radivilum, castellan Trocensem et Sophiam Ioannis Zborovi[i], castellani Gnesnensis... [Vilnae, 1601].

[41] Woydagowicz M. Wesele starozytności przy przezacnym akce godownym Ich MM. PP. Jego M.P. Jerzego Haraburdy y Jey Mośći Anny Krystyny Zawiszanki Podskarbianki WXL. B/d.

[42] Peski S. Sześć hydriy abo stągwi wody przygod stanu małżeńskiego w wino szczęścią słowem boskim przemienioney na przezacne gody Ie(g)o M. Pana P. Alexandra Chreptowicza y Iey Mośći Panny Bohdany Zyżemskiey corki Ie(g)o M. Kniazia Iarosza Zyżemskiego Podkomorzego Mozerskiego. [Wilna, 1620].

[43] Seym Białogłowski... [b/m, b/d]; Badecki K. Wstęp // Polska satyra mieszczańska. Nowiny sowiźrzalskie / Opr. K. Badecki. Kraków, 1950. S. XV–XIX, 72–89.

- Панна мела права сама абіраць мужа.
- Забараняўся шлюб маладой дзяўчыны і ўдаўца, бо невядома, каму дагаджаць: мужу ці яго дарослым дзецям. Такое ж стаўленне да шлюбу ўдавы з юнаком.
- Найбольш спрыяльны шлюбны ўзрост – да 20 гадоў; калі пазней выйсці замуж, палова пасагу хай забіраецца.
- Нельга выходзіць замуж дзяўчатам, якія не ўмеюць танцаваць, а хлопцам забаранялася прывозіць з-за мяжы новыя танцы[44].

Частка з гэтых пунктаў змяшчалася пазней і ў інструкцыі за 1674 г. Яны датычылі тыдня перад пастом, доўгага заляцання, спагнання пасагу. Шлюб з удаўцом дапускаўся толькі ў выпадку, калі ўсе ключы пераходзілі жонцы. Да гэтага дадаваліся іншыя патрабаванні. Сярод іх – адстойванне права жанчын удзельнічаць у сойміках, судах, пасяджэннях Трыбунала; насіць мужчынскі строй, зброю (шаблю, ашчэп ці рагаціну); ездзіць на кані, самім вырашаць жаночыя пытанні. Дапускалася магчымасць панны браць юнака на выпрабаванне на 12 тыдняў, а калі не спадабаецца, то наступнага ўзяць. Ад юнакоў патрабавалася ўменне іграць на музычных інструментах. З крыніцы вынікае, што тэкст быў складзены падчас бяседы. Подпісы пад ім паставілі жанчыны з адмысловымі прозвішчамі і пасадамі: гладкай Венеры сакратарка Алена Лакочанка, гетманаўна бяздоннага кахання Дарота Ненасыценская і іншыя[45]. Адрозненне гэтай інструкцыі ў тым, што тэкст у некаторых месцах і "подпісы" носяць двухсэнсоўны характар з эратычным падтэкстам. Патрабаванні датычылі не толькі выбару жанчыны ў справе шлюбу, але і ў сексуальным жыцці, а таксама права роўнасці ў палітыцы.

Яшчэ адна інструкцыя была напісана для сойму ў Варшаве, які павінен быў адбыцца 24 студзеня 1681 г. Складзена яна была 4 кастрычніка 1680 г., дадзена паслам Прыпепскаму і Крэнпкоўскаму. Жанчыны патрабавалі скасавання прымусовага шлюбу без кахання, бо прыводзіць да смутку абаіх; забароны звычаю, калі пасля вяселля ў маладога кралі нявесту з ложка, бо праз гэта толькі нянавісць паміж сужэнцамі; забарона ўдовам выходзіць замуж за юнакоў. У сувязі са з'яўленнем у гарадах і мястэчках публічных дамоў юнакі сталі праводзіць там шмат часу. Таму прапаноўвалася зачыніць дамы, а паненкам дазволіць бавіць час з юнакамі публічна і прыватна. Як сорам для грамадства трактаваўся звычай, калі замужнія жанчыны мелі маладых хлопцаў. Прапаноўвалася ў выпадку шлюбу 25-гадовай жанчыны з юнаком перадаваць яму ўсе яе рухомыя рэчы, а пры шлюбе 30-гадовай – палову пасагу. Дазвалялася нявесце без пасагу ўзяць двух сужэнцаў: каб адзін клапаціўся пра ежу, а другі пра вопратку. Незамужнім дзяўчатам, якія мелі больш за 12 гадоў, прапаноўвалася для паляпшэння здароўя дазволіць мець сексуальныя стасункі раз у год.

---

[44] Інструкцыя ўваходзіць у склад рукапісу, у ім змешчаны прамовы на розныя выпадкі. Biblioteka Kórnicka, sygn. BK 1195, k. 152–153; Kuchowicz Z. Miłość Staropolska. S. 186.

[45] Інструкцыя паходзіць з бібліятэкі Слізняў, захоўваецца на асобных картках. НГАБ у Гродне, ф. 1663, воп. 1, спр. 429.

Патрабавалася забараніць юнакам заляцацца да дзвюх паненак адразу[46]. Гэтая інструкцыя не пазбегла сексуальнай тэматыкі. Яна настойвала на больш свабодных стасунках паміж мужчынам і жанчынай да шлюбу і ў шлюбе.

Усе даты ў інструкцыях адпавядаюць рэальным датам рэальных соймаў. Творы падаваліся як літаратурная забаўка. У інструкцыях частка патрабаванняў паўтаралася. Многія з іх мелі фрывольны характар. Ідэі, якія ў іх выказваліся, былі для тых часоў даволі смелыя.

Пры гэтым у тэкстах абмяркоўваліся важныя пытанні ў сферы гендэрных адносінаў. Адмоўна ставіліся да стасункаў і шлюбу, дзе была значная розніца ва ўзросце. З пункту гледжання фізіялогіі сексуальныя кантакты старэйшага мужчыны і маладзейшай жанчыны апраўданы, бо яны знаходзяцца на прыкладна аднолькавым узроўні тэмпераменту: у мужчыны ён паступова згасае, а ў маладой жанчыны толькі пачатак актыўнасці. Тое ж можна адзначыць для адносінаў паміж жанчынай пасля 25 і юнаком: абое знаходзяцца на піку сексуальнай актыўнасці і пасуюць адно аднаму. Для юнака стасункі са сталай жанчынай з'яўляюцца карысным вопытам, часта спрыяльным для кар'еры і статусу. Але няроўныя ўзроставыя адносіны часта недоўгатэрміновыя, бо партнёры пераходзяць у іншую стадыю і перастаюць задавальняць адно другога. У сацыяльным плане шлюб з удаўцом з дарослымі дзецьмі ставіць маладую жанчыну ў складаную сітуацыю. Негатыўнае стаўленне дзяцей да яе звязана ў першую чаргу са змяншэннем іх спадчыны.

Прапанова мець дашлюбныя сексуальныя стасункі для паненак мела свой сэнс. Паводле тагачасных уяўленняў гэта было карысна для набыцця досведу і здароўя. Праўда, стасункаў раз на год недастаткова для падтрымання здароўя. Даволі цікава гучыць забарона юнакам заляцацца адначасова да дзвюх паненак на фоне дазволу нявесце без пасагу ўзяць двух сужэнцаў.

“Жаночыя соймы” далі магчымасць публічна абмяркоўваць некаторыя пытанні, звязаныя з сексам, выказваць жаданні, выводзіць таемныя рэчы з цемры. Нават калі гэта рабілася ў жартоўнай форме, такія забавы давалі выхад для сексуальнай энергіі.

*Паэзія*. Паэзія ВКЛ насіла шматмоўны характар і закранала розныя тэмы. Вершы, прысвечаныя каханню, эротыцы таксама мелі месца[47]. Італьянская літаратура часоў Рэнесансу зрабіла моцны ўплыў па паэзію Польшчы і ВКЛ. Італьянская атмасфера адчувалася ў шляхецкіх колах[48]. Пры двары Радзівілаў паэты бавіліся вершамі на розныя тэмы. Сярод іх былі творы рамантычнага і эратычнага зместу. Сармацкая эротыка прызначалася для шляхты, творы пісалі ў адпаведным стылі. Знакамітым творцам пры Радзівілах быў Даніэль Набароўскі. Ён пакінуў пасля сябе багатую літаратурную спадчыну, сярод іншага

---

[46] Інструкцыя ўваходзіць у склад рукапісу, аўтарам якога з'яўляецца С. Слізень. Аднак аўтарам інструкцыі ён мог і не быць. Навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. НББ 091/4024к, арк. 125 адв.

[47] Tereškinas A. Kūni žymės. P. 32–37.

[48] Kotarska J. Erotyk staropolski. Inspiracje i odmiany. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1980. S. 23–72; Кавалёў С. Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага. С. 265–267, 313–315.

пераклад "Трыумфу кахання" Франчэска Пятраркі. Набароўскі працаваў у галіне петраркізму, дзе было месца каханню, звароту да антычнай спадчыны, жанчыне як ідэалу з годнымі фізічнымі і духоўнымі якасцямі[49]. Яго вершы прысвечаны рознай тэматыцы, у тым ліку каханню, жарсці, здрадзе і іншым аспектам. Згодна з вершам "Каханню ўсе роўныя":

*Miłości wszystko równo*
Niedba miłość na świecie o wysokie stany,
O wielkie majętności, o ród zawołany.
Frasza u niej posagi z wyprawą gotowa.
I król sielankę lubi, sielanian królową[50].

Пра спрыянне для шляхціча ежы і алкаголю ў справах сексу напісана ў наступным вершы. У ім параўноўваецца секс з бітвай:

*Sine cerere et baccho friget venus*
Szlachcic mówi tak:
Kiepska miłość o głodzie,
Nie chce sięgięć po wodzie,
Ale pod dobrym winie
Dogodzi się dziewczynie,
A korzenie potrawy
Napełnią wnętrze stawy.
Zaporożczyk zemdlony
Zle cięgnie łuk zmocniony,
Ale tatarzyn syty
Rozdziera w zbroi nity[51].

Да тэматыкі кахання, жаночай прыгажосці звяртаўся паэт з радзівілаўскага кола Збігнеў Морштын[52]. Яму таксама была вядома італьянская літаратура. Морштын стварыў цыкл вершаў пад назвай "Эмблема", у якіх гучалі тэмы эротыкі і кахання. А эпіграфамі для многіх з іх сталі цытаты з "Найвышэйшай песні Саламонавай"[53].

*Emblema 28*
*Miłość święta karmi piersiami oblubieniece swoję*

Napis: Smaczniejsze są piersi twoje niż wino. Cant. 1, 4

O, jako wielką słodycz w twoich czuję
Piersiach, ktore, me kochane, podwasz;
Twe wdzięczne mleko, którym mię napawasz,
Bardziej niż słodkie wino mi smakuje.

---

[49] Nowicka-Jeżowa A. Madrygały staropolskie. Z dziejów liryki miłosnej w epoce Renesansu i Baroku // Studia Staropolskie. T. XLVII. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1978. S. 6–22; Kotarska J. Erotyk staropolski. S. 10, 67, 69, 112, 192.

[50] Naborowski D. Poezje wybrane / Opr. K. Karaser. Warszawa, 1980. S. 29.

[51] Ibid. S. 30.

[52] Kotarska J. Erotyk staropolski. S. 107–108, 113, 199–221.

[53] Helikon sarmacki, wątki i tematy polskiej poezji barokowej / Przyg. A. Vincenz, M. Malicki, J. Chrościcki / Biblioteka Narodowa. № 259. Seria I. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk; Łódź, 1989. S. 105, 111, 260, 261.

I nie tak wdzięczny w hyblesjkiej kraine
Z tymu miód robią pszczołki pracowite;
Nie tak są słodkie, nie tak smaczne skryte
Wszystkie kanary w brazylijskiej trzcinie,

Jako twój napój, o moje kochanie,
Który miłość twa obficie wywodzi,
Pragnącą duszę posila i chłodzi.
O, niechże zawsze i pierwsze zaranie.

Nie umyka mi takiego obroku,
Niechaj południe i spóźniona chwila
Tymże pokarmem świętym mię posila
Do ostatniego życia miego zmroku[54].

Калі вядома пра палітычную дзейснасць менскага ваяводы Крыштафа Завішы і пра яго мемуары[55], то практычна не вывучана яго паэтычная спадчына. Ён з'яўляецца аўтарам шматлікіх вершаў. Усе яны сабраны ў адным рукапісе, які датуецца 1696 г. Многія з твораў маюць дачыненне да тэмы эротыкі і кахання. Сярод іх ёсць як мілыя і рамантычныя ("Добры дзень пані"), так і жартаўлівыя ("Лямант нешчаслівай жонкі і ўдавы паны (пасля разводу)", у якім высмейваецца статус разведзенай жанчыны). Варта адзначыць, што Завіша меў добрае пачуццё стылю і гумару, якое прысутнічае ў вершах.

*Na dobry dzień Panie*
Lubos iusz wstała lub ieszcze w takowey
Posciołce lubey nie podniesła głowy.
Ja dawno nie spie maiąc to na myśli
Moiey kochaney Bog Dobry dzień przysli[56].

Асобны верш прысвечаны сумнеўнаму каханню. Чалавечай натуры ўласціва кахаць. Яго прагне неразумнае сэрца, але пасля вяселля прыходзіць смутак:

*O wątpliwym kochaniu*
Zyć a nie kochać nie ludzkiey natury
Jest fortel, raczey Angelskiey postury
Bo gdy uwazań ze iest ciało z gliny
Musi tedy lgnąc do nadobney miny
Prawda ze damy są z gliny stworzone.
I do kochania nie tak są skłonione.
Powinny by nas iednak kochać z tego
Ze się wykradły gdzies z boku naszego.
Wdzieczna iest miłość chociasz oginie zarzy
Luby to upał ktorym serca parzy.
Być w takim ogniu Fenixem rzecz miła
Kędy iest ochłod delikatnych siła
Jusz ci to kochać nic iest snadneyszego

[54] Ibid. S. 425–426.

[55] Pamiętniki Krzysztofa Zawiszy, wojewody mińskiego (1666–1721) / Oprac. J. Bartoszewicz. Warszawa, 1862.

[56] VUB, f. 3-2239, l. 42v.

Kochanym zabyć nic naytrudnieyszego
Bog dzie się czasem kto naybarziey pali.
Z tąd wiele uzna nie affektem fabi
Głupie to serce co skara lotem
W cudze afektu pędząc nie wie o tem
Ze ma szwankować wzamierzonym celu
W smutek cięszsza rzecz wpadać po weselu
I ten nie mądze swe intenta toczy
Tam gdzie go afekt niewspiera ochoczy.
Nazad zyzyphie taka miłość boczy
Kędy raz szyię łomią ludzkie oczy.
Diabełko ktore twarz pieszczotno nosi
Nie ieden tantal usta czasem wznosi
Ale te jabłka nierwo go omylą
Gdy sie inszemu z ustami nachylą
I cosz ze kocham trudno się z tym taić
Takiego ognia nie mozna zataić,
To iednak nie wiem czym rownie kochany
Czuć boleść cudzey nie podobna rany.
W tym zas kochaniu nie mowa iest wina
Ale zdrayczyną pięknosci dziewczyna
Tych pęttow wziętych kto sobie nie słodzi
Ten y bez mysli y bez serca chodzi.
Wy oczy cudnie, serc ludzkich magnesce
Z ktorych Cupido tysiąc strzałek niesię
Zesciesią smiercą nie iedniemu stały
Przetoz cie y mnie w załobę ubrały
Wy smacznie piersi kochanego raiu
Choć w zakazanym zamknięteście gaiu
A ktosz dla was się przestempcą nie staię
Chyba ten ktury gustow nie uznaię
Gdy pszczołki kędy osłodyczy zwiedzą
Ustawnie na tym iusz kwiateczki siedzą
Trudno ich spędzić z tak lubey patrawy
Tam im naymilsze gdzie słodka zabawa
Mnie choc nie pszczołką natura mieć chciała
Słodyczy chciwość podobnemu dała
Przetoz iezeli twe roze pieszczotne
W kanar mi się bydć zdadzą przemienione
Serce na zemste chociasz nie uzyte
Poszle, w kochaniu maiąc swą zaszczytę[57].

Каханне ў Завішы не толькі сумнеўнае, але і яўнае, яго немагчыма схаваць, яно ўсё роўна заквітнее:

*Miłość zawsze jawna*
Stateczna miłość nie może byc skryta
Ktura w jagodach promieniem wykwita[58].

[57] Ibid., l. 42–43.
[58] Ibid., l. 106v.

Для шляхецкага асяроддзя было ўласціва бавіцца загадкамі сексуальнага характару. У рукапісе сустракаецца адна з такіх, якая ўтрымлівае алегорыю з біблейскага сюжэта пра Адама і Еву: як толькі Адам кранаецца яблыка Евы, то яго вуж падымае галаву[59].

К. Завіша збіраў розныя выказванні як знакамітых філосафаў, так і народныя. Шэраг з іх мае непасрэднае дачыненне да стасункаў паміж жанчынай і мужчынам. Яны паказваюць тагачасныя ўяўленні і стэрэатыпы:

> Jako drzwi obraczią się na zawiasach, tak teskliwy na łozu swoim.
> Kolce złote u swin w pysku, niewiasta piękna a głupa iednoż to czyni.
> Mondra niewiasta buduie dom, a głupa budowany psue.
> Z koniem nie igray, zenie nie ufay y nie ulegay pieniądzie sam
> czyni choway.
> Pachołka na koniu, panne w tancu obirać masz.
> Człowiek bez cnoty, uroda bez serca, serca bez siły za nic stoią.
> Skarb oyczysty, zona cnotliwa, potomek godny błogosłowięstwo Boże.
> Panna podcziwa bez farby, wina bez przyprawy, cnota bez przygany
> wydoprzymowki.
> Wino mocne, białogłowa grzeczna z mądrego uczyni błazna[60].

З'яўленне і распаўсюджанасць твораў лірычнага і эратычнага кахання былі звязаны з іх папулярнасцю сярод розных слаёў насельніцтва. “Непрыстойныя” песні любілі спяваць і шляхта, і мяшчане, і сяляне[61].

Сялянская творчасць дайшла да нас дзякуючы працы этнографаў. Шмат тэкстаў было сабрана ў XIX ст. Тэма сексуальных дачыненняў у беларускім фальклоры закраналася ў гістарыяграфіі. Варта адзначыць, што ў традыцыйнай культуры яна адлюстравалася ў розных жанрах: паданні, песні, загадкі, прымаўкі, прыказкі[62]. Яны часам вельмі адкрыта апісваюць стасункі паміж мужчынам і жанчынай, а некаторыя творы маюць падвоены сэнс. Аднак асаблівасць твораў народнай культуры палягае ў тым, што іх немагчыма дакладна датаваць.

Даволі шмат твораў эратычнага характару было сабрана этнографам Міхаілам Федароўскім. Значнае месца сярод іх займалі юрлівыя песні. Адна з іх апісвае даволі праўдзівае заляцанне мужчыны да жанчыны з мэтай атрымання сексу:

> Я Марусі сёе,
> Я Марусі тое,
> Я Марусі скруціўшы
> Вяровачкі ва трое,
> Маруся ні хоча.

---

[59] Ibid., l. 91. Тэкст верша прыведзены ў раздзеле “Практыка старабеларускага сексу”.

[60] Ibid., l. 60–60v.

[61] Катэхізіс: помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст. / Адаптаваны тэкст; пер. са старажыт. бел. мовы Н. Кабелка. Мінск, 2005. С. 112; Кавалёў С. Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага. С. 129–130.

[62] Federowski M. Lud Białoruski. Materiały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905. T. V. Pieśni. Warszawa, 1958; Лобач У. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры. С. 205–247; Белорусский эротический фольклор / Изд. подг. Т. Володина, А. Федосик. Москва, 2006; Валодзіна Т. Жанчына і жаночае ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў // Arche. Жаночая гісторыя Беларусі. 2011. № 12. С. 266–310.

Я Марусю за цыцусю,
Маруся рагоча.
Я Марусі піва,
Я Марусі віна,
Я Марусі тры таляры,
Жэбы была жыва[63].

Для сексуальнага выхавання падлеткаў былі прызначаны двухсэнсоўныя загадкі[64]. Некаторыя з іх захаваліся ў калекцыі М. Федароўскага: "*Белая бутэлька, корак чырвоны (Цыцка); На бабе спацеў, на дзеўку – захацеў (Хлеб); Дзед бабу ласкоча, а баба не хоча, як прыйшоў дзед да цела і баба захацела (Ключ)*"[65].

Каханне, эротыка і секс хвалявалі людзей ва ўсе часы. Таму гэтыя тэмы закраналі розныя аўтары. Рэлігійная і палемічная літаратура імкнулася выхаваць людзей у адпаведнасці з ідэаламі грамадства. Сатыра высмейвала існуючыя традыцыі. Паэзія ўслаўляла жыццё і эратычныя забавы. Народная творчасць без сарамлівасці звярталася да сексуальнай тэматыкі. Інтымная сфера жыцця была настолькі важнай, што яе немагчыма было абмінуць у літаратуры. Рэнесанс даў магчымасць пазнаёміцца з тэндэнцыямі ў Еўропе і пераняць новыя павевы. У параўнанні з Сярэднявеччам лірыка кахання выразна загучала ў публічнай прасторы ВКЛ. Яна была блізкай і зразумелай для ўсіх, таму мела попыт. Не страціла тэма сваёй папулярнасці і ў час барока. Але ёй яшчэ было далёка да той адкрытасці абмеркавання эротыкі і сексу, якое ўнесла Асветніцтва[66].

---

[63] Federowski M. Lud Białoruski. Materiały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905. T. VI. Pieśni. Warszawa, 1960. S. 33.

[64] Лобач У. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры. С. 218.

[65] Federowski M. Lud Białoruski. Materiały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905. T. IV. Pieśni. Warszawa, 1935. S. 466, 467, 473.

[66] Wolska B. Bez winy i wstydu. Seksualność w polskiej poezji obscenicznej o tematyce erotycznej doby Oświecenia // Napis. 2012. Seria 18. S. 59–88; Dąbrowski Sz. P. Zjawisko sodomii w polskiej poezji erotycznej XVIII wieku: wstępne rozpoznanie problemu // Napis. 2012. Seria 18. S. 37–57.

# 5. Позірк мастацтва на цела

Падача вобразаў мужчыны і жанчыны ў мастацтве залежала ад эпохі. У перыяд Рэнесансу ідэальнымі целамі лічыліся антычныя ўзоры з дакладнымі прапорцыямі, атлетычнага целаскладу. Барока дадало інтарэс да пышнасці формаў.

Еўрапейскае мастацтва ў XVI ст. перажывала сапраўдны ўздым. Мастакі эпохі Адраджэння адыходзяць ад гатычных канонаў, уносяць у карціны свята жыцця і культ цела, вяртаюцца да ідэалаў Старажытных Рыма і Грэцыі. Іх спадчына захавала прыклады мастацтва ў архітэктуры, скульптуры, роспісу. Дасканалыя мужчынскія і жаночыя целы адлюстраваліся на вазах, барэльефах, надмагіллях, у скульптурных кампазіцыях[1]. Значнае месца ў антычным мастацтве займалі эротыка і секс. Да нас дайшлі выявы з гетэрасексуальнымі, гомасексуальнымі, заафільнымі кантактамі[2]. Варта адзначыць, што тэндэнцыі старажытнай культуры знайшлі адлюстраванне ў працах Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Сандра Бацічэлі, Тыцыяна Вечэліа, Яна Масіса і іншых, дзе эмацыйна і з ювелірнай дакладнасцю перадаюцца рухі, позіркі, выразы твару, дэталі вопраткі. Мастакі імкнуліся да стварэння ідэальнага і прапарцыянальнага цела, надзеленага сексуальнай прывабнасцю. Аголенае цела прысутнічала паўсюдна: у храмах, у мастацтве, на плошчах і вуліцах. Новыя тэндэнцыі захаваліся ў XVII ст., хоць мелі як прыхільнікаў, так і крытыкаў[3].

Рэлігійнасць набывае эратычны характар. Яна часам выступае як спакушэнне для веры. Мастакі Рэнесансу інтэрпрэтуюць рэлігійныя сюжэты без сціпласці і сарамлівасці, адкрываючы гледачу прывабнасць сваіх герояў. Гэта можна пабачыць у наступных карцінах: "Адам і Ева", Якопа Басана[4]; "Сыход Хрыста

---

[1] Искусство Древнего мира: энцикл. Москва, 2001. С. 140, 142, 143, 150, 151, 160, 245, 263 і інш.; Кон И. С. Мужское тело в истории культуры. Электрон. версия книги, исп. и доп., 2010. С. 100–156.

[2] Напрыклад, у Музеі антычнасці ў Берліне (Altes Museum) адведзена асобная выстава з эратычнымі і сексуальнымі сюжэтамі. Прыклады мастацкіх твораў можна пабачыць на старонцы: Sex and erotic in Greek and Roman Arts. Рэжым доступу: http://www.flickriver.com/photos/carolemage/sets/72157633026810785.

[3] Friedman D. Pan niepokorny. S. 71–72; Burke J. Sex and Spirituality in 1500s Rome: Sebastiano del Piombo's "Martyrdom of Saint Agatha" // The Art Bulletin. 2006. Vol. 88. № 3. P. 482–495; Arasso D. Ciało, wdzięk, wzniosłość // Historia ciała. T. 1: Od renesansu do oświecenia / Pod red. G. Vigarello. Przełożył T. Stróżyński. Gdańsk, 2011. S. 381–425; Кон И. С. Мужское тело. С. 182–229, 247–261, 267–268, 272–292.

[4] Карціна захоўваецца ў Галерэі Палаціна (Фларэнцыя).

ў Лімб" (1552), Аньёла Бранзіна[5]; "Св. Себасцян" (1480–1490), Эрколе дэ Раберці; "Св. Кацярына Александрыйская" (1520–1530), Джыан Піетра Рыцці дэтто Джыампіетрына; "Зузанна і старэйшыя" (1517), Ларэнца Лота[6] і інш. Нават вобраз Ісуса Хрыста з'яўляецца аголеным на распяцці (1492) аўтарства Мікеланджэла. Яго можна пабачыць у базіліцы Св. Духа ў Фларэнцыі[7]. У візантыйскім мастацтве ў такім выглядзе ён прадстаўлены на мазаіках, прысвечаных абраду хрышчэння, якія цяпер знаходзяцца ў Арыянскай хрысцільні і Хрысцільні Неона (V–VI стст.) у Рыміні. Але там Ісус да пояса закрыты вадой.

Анёлкі ў італьянскіх храмах і палацах набываюць выразную мужчынскую адметнасць. Гэта можна пабачыць у роспісах і скульптурах кафедральнага сабора Узнясення Панны Марыі (Піза), базіліцы Св. Крыжа (Фларэнцыя), Галерэі Палаціна (Фларэнцыя), Галерэі Уфіцы (Фларэнцыя) і інш. Падобныя выявы змешчаны на тытульнай старонцы "Песні пра зубра" М. Гусоўскага і на карце ВКЛ Т. Макоўскага[8].

Даволі цяжка вызначыць, як гэтыя рэнесансавыя тэндэнцыі адбіліся на ўнутранай аздобе храмаў ВКЛ. Напрыклад, мураваная Фара Вітаўта ў Гародні была пабудавана італьянцамі. Аднак яна моцна пацярпела падчас вайны 1654–1667 гг., пазней неаднаразова перабудоўвалася, а ў 1961 г. была ўзарваная. У сувязі з living рознымі гістарычнымі падзеямі ўнутранае ўбранне храмаў захавалася ў асноўным пасля сярэдзіны XVII ст., калі ўжо панавалі барочныя традыцыі. Варта адзначыць, што ў XVI ст. у храмах грэчаскага абраду дамінавала візантыйская традыцыя, якой былі ўласцівы вобразы святых, цалкам закрытыя вопраткай. Таму распаўсюджанне пэўных тэндэнцый не магло ахапіць усе храмы.

Мода на аголенасць не абышла нават партрэты. На парадных партрэтах практычна аголеныя, ледзь прыхаваўшы геніталіі, былі адлюстраваны італьянскім мастаком Бранзіна вялікі герцаг Тасканы Казіма I Медзічы ў вобразе Арфея (1538–1540), генуэзскі адмірал Андрэа Дорыа ў вобразе Нептуна (1550)[9]. Тэатральна, на фоне чырвонай заслоны намаляваны аголеныя Габрыэла д'Эстрэ і адна з яе сясцёр (другая палова XVI ст.)[10]. Карціны з грамадскай тэматыкай таксама не маглі абысціся без прыгожых цел. Бранзіна ў карціне "Алегорыя грамадскага шчасця" (1567–1568) паказаў Шчасце і постаці вакол яго ў выглядзе амаль аголеных жанчын[11].

Асобна варта сказаць пра жанр эротыкі ў мастацтве. Яго слабыя пачаткі мелі месца нават у Сярэднявеччы. Напрыклад, сярэднявечны манускрыпт "Аповесць

---

[5] Карціна захоўваецца ў базіліцы Св. Крыжа (Фларэнцыя).

[6] Карціны захоўваюцца ў Галерэі Уфіцы (Фларэнцыя).

[7] Выява аголенага Хрыста сустракалася і раней у мастацтве. У перыяд Рэнесансу акрамя Мікеланджэла на гэта наважыліся Данатэла (1450) і Бэнвэнута Чэліні (1562). Пасля забароны Трыдэнцкага сабору на стварэнне такіх выяў мастакі да гэтага вобраза не звярталіся амаль да XIX ст. Кон И. С. Мужское тело. С. 158–167.

[8] Carmen Nicolai Hussoviani de statura, feritate ac venatione bisontis. Cracoviae, 1523; Magni Ducatus Lithuaniae, caeterarumque regionum illi adiacentium exacta description. Amsterdam, 1613.

[9] Кон И. С. Мужское тело. С. 243–247.

[10] Карціна захоўваецца ў Галерэі Уфіцы (Фларэнцыя).

[11] Карціна захоўваецца ў Галерэі Уфіцы (Фларэнцыя).

пра ружу" ўтрымліваў аздабленні сексуальнага характару: фалічнае дрэва, сцэны сексу паміж манахамі і манашкамі[12].

Ужо ў XIII ст. у італьянскіх храмах можна было пабачыць аголеныя мужчынскія і жаночыя целы. У хрысцільні (бабтыстэрыі) у Пізе на кафедры вуглавая фігура "Алегорыя Сілы" аўтарства Ніколы Пізана прадстаўлена ў выглядзе аголенага мужчыны (1260)[13]. Скульптура аголенай жанчыны змешчана сярод іншых у аздобе кафедры ў кафедральным касцёле Пізы (1302–1310) працы Джавані Пізана.

У рукапісных творах ВКЛ таксама сустракаюцца цікавыя малюнкі. Радзівілаўскі летапіс (XV ст.) утрымлівае 613 мініяцюр[14]. У сюжэце аблогі Кіева печанегамі (968) паказаны аголены юнак, які здолеў пераплыць Днепр дзеля выратавання гараджан. Аголены мужчына з д'яблаwі сімвалізаваў непрыстойныя паводзіны валадара ў сцэне з князем Уладзімірам. У дарэнні кіеўскім князем Яраполкам пераяслаўскага княжэння брату Андрэю і валынскага – пляменніку Ізяславу Мсціславічу (1134) злева змешчана аголенае цела мужчыны, якое не вельмі пасуе да сюжэта. Такім чынам сімвалізавалася слабая палітыка Яраполка[15]. Аголенае цела выступала тут як сімвал граху, сораму і непрыстойнасці. Аналагічная сімволіка сустракаецца ў выявах "Страшны суд" на фрэсках Джота ў капліцы Скравені (Падуя), на фрэсках у Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку, на іконах Украіны[16] і інш.

Аднак спецыяльныя эратычныя творы былі зроблены Маркантоніем Раймондзі. Ён быў аўтарам цыклу гравюр *I Modi* ("Шляхі" ці 16 спосабаў задавальнення), які складаўся з 16 сцэн з пазіцыямі для сексу. Твор быў зроблены на падставе ранейшых ілюстрацый Джуліа Рамана. Выданне 1524 г., а таксама і другое 1527 г. былі знішчаны каталіцкай царквой. Асобныя кавалкі з гравюр захоўваюцца цяпер

---

[12] De Lorris G., de Meun J. Le Roman de la Rose. 1301–1400 // Bibliothèque Nationale de France. MS. Fr. 25526. P. 106v, 111, 111v, 160, 160v; Camille M. Image on the Edge: The Margins of Medieval Art. Cambridge, 1992; Łanuszka M. Zakazany owoc smakuje najlepiej. Рэжым доступу: http://posztukiwania.pl/blog/2015/02/15/zakazany-owoc-smakuje-najlepiej.

[13] Кон И. С. Мужское тело. С. 180–181.

[14] Аб мініяцюрах гл.: Радзивилловская или Кенигсбергская летопись: статьи о тексте и миниатюрах рукописи. Москва, 1902; Рыбаков Б. А. Из истории культуры Древней Руси: исследования и заметки. Москва, 1984. С. 188–239; Толочко А. Пририсовки зверей к миниатюрам Радзивиловской летописи и проблема происхождения рукописи // Ruthenica. 2005. № 4. С. 62–84; Никитин А. Л. О Радзивиловской летописи // Герменевтика древнерусской литературы. Вып. 11. Москва, 2004. С. 525–557; Толочко А. «Не преступати предела братня» (об источниках миниатюр Радзивиловской летописи) // Ruthenica. 2014. № XII. С. 70; Tolochko O. Notes on the Radziwiłł Codex // Studi Slavistici. 2013. T. X. P. 29–42; Темушев С. Н. Миниатюры Радзивилловской летописи как источник по проблеме функционирования налогово-даннической системы домонгольской Руси // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. 2014. Вып. 9. С. 98–114.

[15] Радзивиловская летопись: Текст. Исследование. Описание миниатюр / Отв. ред. М. В. Кукушкина. Кн. 1. СПб.; Москва, 1994. С. 35, 45, 166 об.; Нікалаеў М. Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1. С. 57–58; Зелянкова А. Голае мастацтва: ад Скарыны да Шагала (фота) 06.06.2010. Рэжым доступу: http://gazetaby.com/cont/art.php?sn_nid=29198.

[16] Himka J.-P. Last Judgement Iconography in the Carpathians. Toronto, 2009. P. 51, 67, 121–125; Федак М. Зображення грішників на іконах "Страшний Суд" XV–XVIII століть (на прикладі пам'яток зі збірки Національного музею у Львові імені Андрея Шептицького) // Літопис Національного музею у Львові імені Андрея Шептицького. Львів, 2014. № 10 (15). С. 70–79.

у Брытанскім музеі[17]. У 1550 г. было зроблена перавыданне ў Венецыі[18]. Гэтыя выявы пакладзены ў аснову французскай публікацыі XVIII ст.[19] Даволі складана сказаць, як гэты цыкл гравюр паўплываў на мастацкія тэндэнцыі ў нас і на эратычны светапогляд жыхароў краіны. Можна дапусціць, што з гэтымі выявамі маглі пазнаёміцца падарожнікі з ВКЛ, нешта набыць для прыватнай калекцыі. Але ў сувязі са знішчэннем многіх мастацкіх твораў, якія захоўваліся ў шляхты і мяшчан, мы не можам дэталёва прааналізаваць запазычанне эратычных выяў у мастацтве Вялікага Княства Літоўскага. Хоць захаваліся ўскосныя звесткі пра вядомасць эратычных карцін у нас. З пазнейшых выяў захавалася выява мужчыны і жанчыны падчас палавога акта, якая намалявана на карце рэчкі Гарынь[20].

Наступае абсалютнае пераможнае панаванне бессаромна прыгожага цела. Карціны сталі своеасаблівымі падручнікамі па мужчынскай і жаночай анатоміі. Адраджэнне, пачаўшыся з Італіі, захапіла ўсю Еўропу. Яно пакінула пасля сябе шэдэўры, якія ўражваюць і цяпер.

Набывае папулярнасць калекцыянаванне мастацкіх твораў з эратычнымі сюжэтамі. У прыватных калекцыях сталі распаўсюджаны карціны са сцэнамі, дзе героі і гераіні дэманструюць прыгажосць аголенага цела. Гэтыя тэндэнцыі не абышлі каралеўскія і шляхецкія палацы ў Польшчы[21] і ВКЛ. Пра папулярнасць выяў з непрыстойным зместам у 50-х гг. XVI ст. адзначаў Андрэй Фрыч Мадрэўскі. Гэта мела нават практычны характар: карцінкі выкарыстоўвалі для спакусы і распальвання жарсці[22].

Дзякуючы інвентару, які быў складзены ў Караляўцу ў 1680 і 1683 гг. для Людвікі Караліны Радзівілаўны, захаваліся звесткі пра шыкоўную калекцыю розных мастацкіх твораў. Сярод партрэтаў, гравюр, пейзажаў, індыйскіх карцін знаходзіліся і такія творы: скульптура з дрэва аголенай жанчыны; карціны: аголеная жанчына спіць, а за ёй падглядваюць два мужчыны; аголеная жанчына спіць, пры ёй лютня і біклага з напоем, за ёй падглядвае мужчына (аддадзена кароннаму падскарбію Яну Андрэю Морштыну ў 1674 г.); аголеная жанчына накрытая покрывам

[17] Puff H. Wczesnonowożytna Europa, 1400–1700 // Geje i lesbijki: życie i kultura / Pod red. R. Aldricha / Tłum. P. Nowakowski. Kraków, 2009. S. 95; I modi nell'opera di Giulio Romano, Marcantonio Raimondi, Pietro Aretino e Jean-Frederic-Maximilien de Waldeck / Ed. L. Lawner. Longanesi, 1984; I Modi: the sixteen pleasures. An erotic album of the Italian renaissance / Giulio Romano ... [et al.] / Edited, translated from the Italian and with a commentary by L. Lawner. Northwestern University Press, 1988. Інфармацыя пра цыкл гравюр змешчана на старонцы: I modi. Рэжым доступу: http://en.wikipedia.org/wiki/I_Modi.

[18] Гравюры з выдання 1550 г. змешчаны на старонцы: I modi. Рэжым доступу: http://www.eroticart.com/i-modi-woodblock-edition-c-93_94/posture-16-i-modi-woodblock.

[19] Carracci A. L'Arétin d'Augustin Carrache ou Recueil de Postures Érotiques, d'Après les Gravures à l'Eau-Forte par cet Artiste Célèbre, Avec le Texte Explicatif des Sujets. Paris, 1798.

[20] НГАБ, ф. 1477, воп. 1, спр. 3176.

[21] Schusterowa A. Nieznany obraz Jana Massysa: "Wenus" w zbiorach Pusłowskich w Krakowie // Biuletyn Historii Sztuki i kultury. 1949. R. XI. № 3–4. S. 256–261; Kuchowicz Z. Miłość Staropolska. Łódź, 1982. S. 164–179.

[22] Кніга была надрукавана ўжо пасля смерці аўтара пры падтрымцы Крыштафа Монвіда Дарагастайскага ў Лоску. Яна мае дачыненне не толькі да Польшчы, але і да ўсёй Рэчы Паспалітай. Кніга дэманструе пратэстанцкія погляды на грамадства. Была напісана ў 1553 г. Modrzewski Fricz A. O poprawie Rzeczypospolitey księgi czwore. Pierwsze O Obyczaioch. Wtore O Statucie. Trzecie O Woynie. Czwarte O Szkole. Łosk, 1577. S. 53.

з бавоўны (карціна намалявана на дошцы); карціна з выявай аголенай жанчыны; аголеная жанчына спіць і пры ёй сатыр (падарыў кароль Ян Казімір); дама пад намётам паказвае грудзі; аголеная жанчына з лебедзем (з каменю); аголеная жанчына пад чырвоным плашчыкам; Венера з двума купідонамі (праца нямецкага мастака Лукаса Кранаха). Некаторыя карціны былі аднесены да непрыстойных: дама з сатырам, непрыстойная карціна (была закрыта, сюжэт не апісаны)[23]. У інвентары згадваюцца іншыя карціны, якія адлюстроўваюць адносіны паміж мужчынам і жанчынай, часам на іх яшчэ намаляваны купідон. Можна казаць, што была сабрана адмысловая калекцыя з тэматыкай эротыкі, кахання, жадання. Апісаныя сюжэты былі папулярны з часоў Рэнесансу, мелі распаўсюджанне ў Італіі. Аднак назвы даюць толькі апісанне сюжэту, без аўтара і краіны паходжання.

Калекцыі карцін таксама мелі заможныя мяшчане Вільні, Коўна, Берасця. Аднак пры іх згадванні ў дакументах не заўсёды падавалася апісанне. Сустракаліся карціны рэлігійнага зместу, партрэты, пейзажы[24]. Праз гандлёвыя кантакты мяшчане мелі магчымасць наведваць прускія гарады і набываць там творы мастацтва. Вядома, ёсць верагоднасць, што карціны з эратычным зместам былі ў калекцыях, бо ў той час капіяванне знакамітых твораў набыло масавы характар. Аднак без дакументальных звестак мы не можам гэта дакладна сцвярджаць. У дамах польскіх мяшчан было таксама папулярна вешаць вялікую колькасць абразоў і карцін. Яны былі як мясцовага паходжання, так і замежнага[25].

Творы мастацтва часта адлюстроўваюць уяўленні людзей пра гістарычныя, культурныя і рэлігійныя падзеі. Аднак для нас не менш цікава, як паказвалі мастакі тагачасных людзей.

На развіццё мастацтва ў ВКЛ непасрэдным чынам паўплывалі еўрапейскія тэндэнцыі і майстры з Італіі, Прусіі і іншых краін. Еўрапейская мода распаўсюдзіла ў культуры ВКЛ такую з'яву, як партрэт. Гэты мастацкі жанр на сваім пачатку знаходзіўся пад уплывам візантыйскіх іканапісных традыцый. Яскравым прыкладам з'яўляецца партрэт Альжбеты[26], дачкі Багдана Саковіча Насілоўскага, полацкага намесніка і троцкага ваяводы. Яна стала жонкай будучага троцкага ваяводы і маршалка ВКЛ Мікалая Радзівіла[27].

---

[23] AGAD, AR, dz. XXVI, sygn. 102, k. 89–137; sygn. 106, k. 94–105; Sulerzyska T. Inwentarz Galerii Obrazów. C. 102–124; Kuchowicz Z. Miłość Staropolska. S. 168. Другі экзэмпляр захоўваецца ў НГАБ, часткова надрукаваны ў: Галенчанка Г. Невядомыя і малавядомыя помнікі. С. 390–412.

[24] НГАБ, ф. 1786, воп. 1, спр. 2, арк. 355–358; Сліж Н. Тэстамент берасцейскага бурмістра Станіслава Баброўскага, 1639 г. // Беларускі гістарычны зборнік. 2014. № 42. С. 13, 21; Frick D. Wilnianie. S. 205; Paliušytė A. Zbiory obrazów mieszczan kowieńskich w XVII–XVIII wieku: tematya i funkcje // Tradycja – metody przekazywania i formy upamiętnienia w państwie polsko-litewskim, XV – pierwsza połowa XIX wieku. Materiały XIX konferencji Komisji Lituanistycznej przy Komietecie Nauk Historycznych PAN w dniach 21–22 września 2010 / Pod red. U. Augustuniak. Warszawa, 2011. S. 173–183.

[25] Bartkiewicz M. Odzież i wnętrza domów mieszczańskich w Polsce w drugiej połowie XVI i w XVII wieku. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1974. S. 66–68.

[26] Даследчыца Альжбету Насілоўскую і Альжбету Саковічаўну вызначыла як розных асоб. Matušakaite M. Z źródeł portretu litewskiego // Lituano-Slavica Posnaniesia. 1991. T. V. S. 47–67.

[27] Kelma E. Ród Sakowiczów i jego majętności w XV i pierwszej połowie XVI wieku // Lituano-Slavica Posnaniesia. 1989. T. III. S. 158; Сліж Н. Саковічы-Насілоўскія: ад уплывовага да шараговага роду (XV–XVI стст.) // Arche. 2014. № 6. С. 41–59.

У XVI ст. на партрэтны жанр ВКЛ больш уздзейнічаюць еўрапейскія тэндэнцыі. Але пры гэтым склалася і свая адметная школа[28]. Набылі распаўсюджванне тры віды партрэта: сармацкі, данатарскі і пахавальны. Карціны даюць магчымасць уявіць, як выглядалі шляхцічы і шляхцянкі ў XVI–XVII стст.

Сармацкі партрэт адносіцца да катэгорыі параднага партрэта. У яго функцыю ўваходзіла рэпрэзентаваць паходжанне, ролю і статус у грамадстве. Да гэтага віду належаць партрэты польскага караля і вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя (мастак Марцін Кобер, 1593), канцлера ВКЛ Льва Сапегі (1617 (?)), гетмана ВКЛ Міхаіла Казіміра Паца (70-я гг. XVII ст.), Грызельды Сапяжанкі (к. 1630 г.), Аляксандры Весялоўскай (1639–1645) і інш. Шляхцічаў паказвалі на фоне тэатральнага антуражу з сімваламі ўлады (булава, пячатка і інш.) і гербам. Апрануты яны былі ў парадную вопратку, якая падкрэслівала шляхецкі статус. Жанчын малявалі ў адпаведнасці са станам і ўзростам. Статус вызначаў багатыя сукенкі і ўпрыгожанні. Як дадатковыя элементы выкарыстоўваліся кніга, хустачка, рэлігійныя сімвалы. Духавенства на партрэтах выступала апранутае ў адпаведнасці са сваім веравызнаннем і прыналежнасцю да манаскага ордэна[29].

Сармацкі партрэт становіцца важным элементам шляхецкай культуры. Стварэнне родавых галерэй было не толькі данінай модзе і эпосе, але і неабходнай візуальнай крыніцай гістарычнай памяці, прызначанай для нашчадкаў. Збор партрэтаў пачаўся з вялікакняскага двара. Пазней свае галерэі мелі Радзівілы, Сапегі, Завішы і інш. Сваю гісторыю духавенства таксама адлюстроўвала ў партрэтах. Былі створаны галерэі віленскіх і жамойцкіх біскупаў. Тэндэнцыі не абышлі нават кляштары[30]. Напрыклад, такую галерэю можна пабачыць і цяпер у гарадзенскім касцёле Адшукання Святога Крыжа, які быў пабудаваны пры бернардынскім кляштары.

Візуалізацыя продкаў адбывалася не толькі ў выглядзе асобных партрэтаў, але і ў выглядзе партрэтазаваных генеалагічных дрэваў, увасобленых на гравюрах. Вядомы выявы генеалогій Пацаў, Тышкевічаў, Пузынаў, Палубінскіх, Хадкевічаў і інш.[31]

[28] Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1: Ад старажытных часоў да першай паловы XVI ст. Мінск, 1987. С. 205–213; Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 2. С. 52–58; Хадыка А. Ю., Хадыка Ю. В. Непаўторныя рысы: з гісторыі беларускага партрэта. Мінск, 1992. С. 3–72.

[29] Chrzanowski T. Ciało sarmackie // Teksty: teoria literatury, krytyka, interpretacja. 1977. № 2 (32). S. 60–61; Хадыка А. Ю., Хадыка Ю. В. Непаўторныя рысы. С. 72–135; Хадыка А. Партрэт сармацкі // ЭГБ. Т. 5. Мінск, 1999. С. 410–411; Olędzki P. Wspólne dziedzictwo: portret sarmacki w dziedzictwie narodów Rzeczypospolitej Szlacheckiej. Białystok, 1999; Šinkūnaitė L. XVII a. Lietuvos portretas. Vilnius, 2000. p. 42–52, 56–85; Гістарычны партрэт Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стагоддзяў. Мінск, 2003.

[30] AGAD, AR, dz. XXVI, sygn. 102, k. 89–137; sygn. 106, k. 94–105; Sulerzyska T. Inwentarz Galerii Obrazów. C. 102–124; Kałamajska-Saeed M. Genealogia przez obrazy. Barokowa ikonografia rodu Sapiehów na tle staropolskich galerii portretowych. Warszawa, 2006; Turczak Ł. Sapieżyńska genealogia portretowa w kościele Świętej Anny w Kodniu nad Bugiem // Sapiehowie epoki Kodnia i Krasiczyna / Pod red. K. Stępniaka. Lublin, 2007. S. 255–264.

[31] Brzozowski G. Trophaeum philosophicae veritatis, in gentilitia ducum de Koźielsk porta, sub felicissimis auspiciis, perillustris magnifici domini, d. Hieronymi Puzyna, capitanei Upitensis, iudiciis deputati ad Tribunal M.D.L. erectum. Vilnae, 1699; Kałamajska-Saeed M. Genealogia przez obrazy. S. 102–105; Kuran M. Mecenat kulturalny Janusza Skumina Tyszkiewicza. Aspekt wizualny druków naukowych i okolicznościowych // Dailės Istorijos Studijos. 2010. T. 4: Socialinių tapatumų reprezentacijos. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kultūroje. S. 97–100; Нікалаеў М. Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1. С. 187.

Данатарскі партрэт быў звязаны з фундацыйнай дзейнасцю шляхты. Як правіла, змяшчаўся ў заснаваным храме ці кляштары. Партрэт мог быць намаляваны і на іконе. Напрыклад, Ян Сегень і яго герб змешчаны на іконе "Пакланенне вешчуноў"[32].

Пахавальны партрэт быў неабходным элементам у шляхецкім пахаванні[33]. Гэта мог быць прыжыццёвы партрэт або копія з пасмяротнай васковай маскі. Маляваўся на меднай, сярэбранай ці алавянай блясе, якая размяшчалася на тарцовай частцы труны падчас цырымоніі, а пазней уваходзіла ў інтэр'ер храма. Да гэтай жа катэгорыі адносяцца надмагільныя скульптуры. Захаваліся надгробкі Льва Сапегі, Пятра Весялоўскага, Паўла Сапегі і яго жонак і інш.[34]

У адрозненне ад еўрапейскіх партрэтаў на партрэтах ВКЛ XVI–XVII стст. асобы пададзены ў статычных позах. Адкрытымі былі твар і рукі. Анатамічная прапарцыянальнасць цела не заўсёды была вытрымана. Вопратка шчыльна закрывала цела і не давала магчымасці ўбачыць асаблівасці фігуры. Гэта відавочна ў партрэтах духавенства і жанчын ва ўзросце. Сукенкі з гарсэтам, якія падкрэслівалі талію, выгадна прадстаўлялі маладых жанчын. Мужчынам быў больш уласцівы барочны тып фігуры: сярэдні целасклад з бачным жыватом[35]. Аднак гэтыя недахопы добра хаваліся і арганічна выглядалі ў тагачаснай вопратцы. Якая б ні была асоба ў жыцці, на партрэце яе паказвалі ў найлепшых якасцях шляхецкасці. Знешняя прыстойнасць не дапускала нават намёку на лёгкі эратызм. Партрэты дэманстравалі ў большай ступені сацыяльны статус, чым саму асобу. У гэтым сацыяльным вобліку было месца толькі вонкавай абалонцы з лёгкім намёкам на існаванне пад ёй цела.

Але ў 50-х гадах XVI ст. мода прынесла вялікую разнастайнасць. Як адзначалі сучаснікі, шляхта стала апранацца на турэцкі, італьянскі, нямецкі манер. Да таго ж мужчыны пачалі насіць такія кароткія ўборы, што былі адкрыты тыя часткі цела, якія трэба закрыць. Не толькі жанчыны, але і мужчыны, закінуўшы прыстойныя шаты, закінулі сорам[36]. У вядомых партрэтах гэты модны павеў не знайшоў адлюстравання.

У еўрапейскай мужчынскай модзе набылі распаўсюджанне вельмі кароткія камзолы і абцягваючыя нагавіцы, якія дэманстравалі ногі, азадак і чэлес. У еўрапейскіх краінах узнікненне такой моды выклікала нараканні і прымусіла уста-

---

[32] Хадыка А. Партрэт данатарскі // ЭГБ. Т. 5. Мінск, 1999. С. 410; Kałamajska-Saeed M. Genealogia przez obrazy. S. 24–30.

[33] Шляхецкае пахаванне ўяўляла сабой урачыстую цырымонію з тэатральнымі элементамі, у якой важнае месца займалі прамовы, катафалк, аздоба храма і інш. Kosman M. Litewskie kazania pogrzebowe z pierwszej połowy XVII wieku // Odrodzienie i Reformacja w Polsce. T. XVII. 1972. S. 87–112; Mroszek K. Epitolanium staropolski; Ślękowa L. Muza domowa. Okolicznościowa poezja rodzinna czasów renesansu i baroku. Wrocław, 1991; Platt D. Kazania pogrzebowe z przełomu XVI i XVII wieku. Z dziejów prozy staropolskiej. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1992; Chrościcki J. Pompa funebris. Z dziejów kultury staropolskiej. Warszawa, 1974.

[34] Лявонава А. К. Скульптурныя надмагіллі Беларусі канца XVI ст. – першай палавіны XVII ст. // Помнікі старажытнабеларускай культуры. Новыя адкрыцці. Мінск, 1984. С. 60–65; Хадыка А. Партрэт пахавальны // ЭГБ. Т. 5. Мінск, 1999. С. 410; Šinkūnaitė L. XVII a. Lietuvos portretas. P. 118–129.

[35] Chrzanowski T. Ciało sarmackie. S. 63.

[36] Modrzewski Fricz A. O poprawie Rzeczypospolitey. S. 50.

наўліваць даўжыню вопраткі. У часы Адраджэння мужчынская вопратка далей эратызавалася. Да абцягваючых нагавіц дадаваліся спецыяльныя кішэні, куды ўкладваліся палавыя органы. У заможных асоб яны часта аздабляліся каштоўнымі камянямі. Напрыклад, гэта прыстасаванне бачна на карціне Тыцыяна "Партрэт Карла V"[37], Джавані Батыста Мароні "Партрэт Антонія Навагеры"[38]. У ВКЛ такія партрэты хутчэй выключэнне, чым правіла. У Нацыянальным музеі ў Варшаве захоўваецца гравюра Генрыка Валезы. Пад гербамі Польшчы і ВКЛ манарх намаляваны ў вопратцы па еўрапейскай модзе, што было натуральна для француза. Аднак яму быў дамаляваны чэлес[39]. У Хроніцы Марціна Бельскага змешчаны партрэт Генрыка Валезы ва ўбранні паводле еўрапейскага стылю[40].

Традыцыйная мужчынская вопратка ў Княстве была доўгая. Пад уздзеяннем еўрапейскай моды адзенне ўкарацілася і стала вышэй за калена. Еўрапейскі касцюм насілі пры двары, для зручнасці выкарыстоўвалі для верхавой язды, падчас вайсковых выпраў. Папулярнасцю ён карыстаўся сярод мяшчан як больш камфортны для працы[41]. Даўжыня жаночага ўбрання не змянілася і закрывала ступні.

Выяў мяшчан і сялян захавалася не так шмат. Ды і практыка стварэння партрэтаў і галерэй не ахапіла гэтыя саслоўі. Займаліся мастацтвам людзі або выбітныя, як Ф. Скарына, або заможныя. Але некаторыя выявы звычайных людзей можна пабачыць. Напрыклад, на гравюры Гародні аўтарства Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. намаляваны гарадзенскія мяшчане і мяшчанкі ў штодзённых жыццёвых сітуацыях. А гарадзенскі абраз "Танец смерці" (канец XVII ці пачатак XVIII ст.) адлюстраваў вобразы тыповага мешчаніна і селяніна. У радзівілаўскай калекцыі былі творы з сялянскімі сюжэтамі, але гэта маглі быць еўрапейскія карціны[42]. Выявы сялян змешчаны ў інвентары Бранчыцкага ключа 1682 г., што з'яўляецца выключэннем. Яны паказаны падчас сельскагаспадарчых прац. На выявах мужчыны барануюць, сеюць, косяць, займаюцца пчалярствам, плывуць на чоўне. Пяць асоб намалявана вакол тытула пра валокі вёскі Жабіна. Малюнкі не адрозніваюцца высокай мастацкай якасцю, вельмі малыя па памерах. Гэта не партрэтныя выявы сялян, а хутчэй тыпажы[43]. Але ў гэтым іх каштоўнасць. Яны паказваюць функцыянальнае прызначэнне сялянскага цела, менавіта цела працоўнага, і тут не было месца для эратычнага бачання.

Аднак Рэнесанс пакінуў свой след у мастацкай культуры нашай краіны. На гравюры анёлы-жанчыны з аголенымі грудзямі трымаюць падстаўку з генеалогіяй

---

[37] Кон И. С. Мужское тело. С. 175–180, 261–266.

[38] Захоўваецца ў Пінатэцы Брэра ў Мілане.

[39] Oczko P., Nastulczyk T. Homoseksualność staropolska. Kraków, 2012. S. 204–205.

[40] Bielski M. Kronika polska. Kraków, 1597. S. 705.

[41] Gutkowska-Rychlewska M. Historia ubiorów. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1968. S. 388–422; Жыгульскі З. "Бітва пад Оршай" – аналіз структуры карціны // Arche. 2014. № 12. С. 354–400; Бялявіна В., Ракава В. Мужчынскі касцюм на Беларусі. Мінск, 2007. С. 11–39, 103–139.

[42] Галенчанка Г. Невядомыя і малавядомыя помнікі. С. 394–395.

[43] AGAD, AR, dz. XXV, sygn. 351a; Kazimierski J. Inwentarz pomiarowy dóbr klucza Brańczyckiego na Białorusi z 1682 roku // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. 1955. № 2. S. 403–434. Выявы былі надрукаваны ў якасці дадатку да артыкула.

Пацаў[44]. У застаўках і загалоўных літарах выданняў Францыска Скарыны выкарыстоўваліся аголеныя целы[45]. Тытульная старонка Берасцейскай Бібліі 1563 г. аздоблена выявамі Адама і Евы, садомскага граху[46]. Фігуры аголеных Адама і Евы былі на роспісе Свята-Духавай царквы Тупічэўскага манастыра[47] ў Мсціславе (1633–1636)[48]. Аголенасць Адама і Евы была звязана з біблейскім сюжэтам. Таму ў многіх хрысціянскіх храмах яны маляваліся ў адпаведнасці з паданнем, у іншых выявах палавыя органы хаваліся лістамі[49]. Укрыжаваны Хрыстос прадстаўлены на выявах з павязкай на сцёгнах. На іконе "Уваскрэсенне – Сашэсце ў пекла" на яго голае цела накінуты плашч[50].

На бакавых фрагментах алтара з капліцы в. Мохавічы Лідскага раёна жаночыя фігуры, выразаныя з дрэва, хоць і прадстаўлены ў вопратцы, аднак грудзі з сасочкамі выразна бачныя[51]. Міхалон Літвін адзначаў, што татары асуджаюць наяўнасць у храмах ВКЛ ікон з выявамі прыгожых жанчын, якія ўзбуджаюць жаданне[52].

З часоў барока багатым дэкорам вылучаецца касцёл Св. Пятра і Паўла ў Вільні, які быў пабудаваны дзякуючы фундацыі гетмана ВКЛ Міхаіла Казіміра Паца. У аздобе выкарыстаны анёлы, напалову аголеныя целы мужчын. У капліцы Св. Аўгусціна знаходзіцца выява Маці з блізнятамі, аднаго з іх яна корміць малаком. У сакрыстыі ў дэкоры ёсць выява жанчыны з аголенымі грудзямі[53]. У левым бочным алтары можна пабачыць напалову аголеных мужчын з пышнымі барочнымі фігурамі. У правым бочным алтары выразна чытаюцца ладныя целы юнакоў. Аднак такі стан захаванасці і такая багатая аздоба храма хутчэй выключэнне, чым правіла.

Храмы выконвалі не толькі рэлігійную функцыю, але і мастацкую. За выключэннем пратэстанцкіх збораў яны аздабляліся іконамі, скульптурамі, фрэскамі. Сюжэты мелі рэлігійны характар, а постаці былі амаль цалкам закрыты вопраткай. Такім чынам, храмы былі мастацкай галерэяй, даступнай для ўсіх слаёў.

Рэдкая з'ява, калі эратычны малюнак з'яўляецца ў прыватным дакуменце. У лісце да караля Яна III пра будаўнічыя працы ў Вілянаве архітэктар Аўгуста

[44] Slęsky I. Decora Lilieti Ill[uistrissi]mi D.D. Petri Pac, Palatini Trocen[sis]. Vilnae, 1642.

[45] Пра відавочны ўплыў заходніх рэнесансавых тэндэнцый на гравюры Ф. Скарыны пісалі розныя даследчыкі. Шматаў В. Францыск Скарына і Альбрэхт Дзюрэр. Праблема паходжання іканаграфіі // 480 год беларускага кнігадрукавання: матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў. Мінск, 1998. С. 39–52; Пуцко В. Сюжеты Скариненских гравюр // 480 год беларускага кнігадрукавання: матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў. Мінск, 1998. С. 110–123.

[46] Біблія: факс. узнаўленне Бібліі, выд. Ф. Скарынаю ў 1517–1519 гг. Т. 1. Мінск, 1990. С. 375, 461, 609, 741; Biblia swięta. Brzest, 1563; Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1. С. 250; Нікалаеў М. Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1. С. 176–180; Зелянкова А. Голае мастацтва.

[47] Манастырскі комплекс не захаваўся, канчаткова зруйнаваны ў 1950–1960-я гг.

[48] Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 2. Мінск, 1988. С. 40.

[49] Кон И. С. Мужское тело. С. 168–170.

[50] Музей старажытнабеларускай культуры. Мінск, 2004. С. 47, 49–50.

[51] Тамсама. С. 152–153.

[52] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 104.

[53] Lietuvos architektūros istorija. T. II: Nou XVII a. Pradžios iki XIX vidurio. Vilnius, 1994. P. 103–109; Sakalauskas M. Šv. Petro ir Povilo bažničia. Vilnius, 1997. P. 63, 86.

Вінцэнці Лоцы[54] на адгорце намаляваў выяву аголенай жанчыны з барочнымі формамі (1 верасня 1681 г.)[55].

Варта адзначыць, што ў мастацтве сустракаюцца яшчэ сімвалічныя выявы. У панегірыках на вяселле часам змяшчаюцца выявы з сімваламі кахання. На тытульнай старонцы панегірыка з нагоды вяселля мсціслаўскага кашталяна Пятра Уладзіслава Каменскага і Яганны Петранэлы Еўдаксіі Завішанкі сярод іншага змешчаны сюжэт з выявай пярсцёнка, які трымаюць птушкі з гербоў сужэнцаў[56]. Вянок аб'ядноўваў гербы Казіміра Вяжэвіча і Ядвігі Тызенгаўзаўны. Унутры яго быў змешчаны надпіс: "*Amor distantia iungit*" ("Каханне зблiжае адлегласць")[57]. Гравюры аўтарства Конрада Гётке[58]. Алегарычныя выявы кахання таксама мелі месца ў еўрапейскай літаратуры[59].

Мастацтва было важным эстэтычным сродкам перадачы інфармацыі. Яно паказвала і распаўсюджвала ўзоры ідэальных цел мужчыны і жанчыны, праз розныя сюжэты апавядала пра гендэрныя адносіны. У адрозненне ад кнігі мастацкі твор быў зразумелы і яго маглі "пачытаць" нават неадукаваныя людзі.

Мастацтва ВКЛ развівалася ў кантэксце еўрапейскіх тэндэнцый. Рэнесанс і барока непасрэдным чынам паўплывалі на развіццё мастацкіх жанраў. Значную ролю адыгралі замежныя мастакі. Як і на іншыя краіны, на нашу мацнейшае ўздзеянне ў сферы мастацтва аказала Італія. Літвіны, у асноўным шляхецкая і мяшчанская эліта, адукаваныя асобы, былі знаёмыя з творчасцю знакамітых мастакоў. Культ аголенага цела таксама быў вядомы. Аднак з прычыны рабавання калекцый беларускай магнатэрыі і шляхты, руйнавання храмаў немагчыма цалкам прааналізаваць распаўсюджанне тэндэнцый.

[54] Аўгуста Вінцэнці Лоцы быў архітэктарам пры двары Яна III Сабескага, але выконваў працы для шляхты, у тым ліку для Радзівілаў. Fiałkowski W. Locci Augustyn Wincenty // PSB. T. XVII. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1972. S. 508–510.

[55] НГАБ, ф. 695, воп. 1, спр. 103, арк. 16 адв. Малюнак выяўлены Дзмітрыем Кішкілевічам, загадчыкам аддзела аўтаматызаваных тэхналогій НГАБ.

[56] Ozembłowski I. Annuli nuptiales ad felices et augustos Hymenaeos perillustris ac magnifici d[omi]ni d. Petri Vladislai de Kamionogrod Kamienski castellanidae Mscislaviensis... nec non perillustris ac m. d[omi]nae d. Ioahannae Petronellae Eudoxiae de Bialogrud Zawiszanka castellanidis Vitebscensis. [Vilnae, 1647].

[57] Boczkowski A. Auguria magnae felicitatis inter nuptias perillustris & magnifici domini D. Petri Casimiri Wiazewicz Succamerarij Mścisłauiensis, V. Palatini Smolenscensis, Aduocati Orsensis, Marschalci Tribunalitij et perillustris dominae Hedvigis Tyzenhauzowny Palatinidis Derpatensis concepta. Vilnae, 1645.

[58] Liškevičienė J. Konradas Giotkė – XVII amžiaus pirmosios pusės Vilniaus graveris // Knygotyra. 2010. 55 P. 54–79.

[59] Weststeijn T. The Painting Looks Back: Reciprocal Desire in the seventeenth centure // Ut Pictura Amor: The Reflexive Imagery of Love in Artistic Theory and Practice, 1500–1700 / Ed. W. Melion, M. Zell, J. Woodall. Leiden; Boston, 2017. P. 268–269.

# 6. Медыцына пра мужчынскае і жаночае цела

Узровень развіцця медыцыны з'яўляецца важным аспектам пры аналізе інтымнай сферы жыцця. Ён паказвае ступень разумення медыкамі фізіялагічных працэсаў у целе, веданне хвароб і метадаў лячэння і інш. Істотнымі таксама з'яўляюцца даступнасць медыцынскага абслугоўвання і пашырэнне ведаў сярод насельніцтва.

*Медыцына ў XVI–XVII стст.* XVI стагоддзе вызначалася развіццём навукі, у тым ліку і медыцыны. У Італіі выйшаў шэраг манаграфій прафесараў медыцыны з дэталёвымі апісаннямі цела (шкілета, унутраных органаў і інш.)[1]. Пры гэтым навука актыўна стала звяртаць увагу на мужчынскія і жаночыя асаблівасці цела. Захаваўся сшытак Леанарда да Вінчы, які складаецца з вялікай колькасці малюнкаў. Яны дакладна перадаюць мужчынскую і жаночую анатомію. Сярод іх нават ёсць становішча плода ў цяжарнай[2]. Праца Андрэа Весалія, аздобленая багатымі ілюстрацыямі, была падзелена па раздзелах паводле пабудовы мужчынскага цела[3]. Яна ўтрымлівала падрабязнае апісанне мужчынскіх палавых органаў. Пасля Весалія з'явіліся іншыя працы, якія таксама звярталі ўвагу на дэталёвую анатомію[4]. Вучоныя і медыкі спрабавалі зразумець сутнасць і прынцыпы функцыянавання цела мужчыны і жанчыны. Арабскія і еўрапейскія працы толькі ў некаторай ступені прыўзнялі заслону ў справе тайны цела.

Навучанне ліцвінаў у Італіі давала магчымасць пазнаёміцца з дасягненнямі тагачасных навукоўцаў[5]. Вучыліся медыцыне таксама ў Галандыі. Напрыклад,

---

[1] Davidson N. Theology, Nature and the Law: Sexual Sin and Sexual Crime in Italy from the fourteenth to the seventeenth century // Crime, Society and the Law in Renaissance Italy / Ed. T. Dean, K. J. P. Lowe. Cambridge, 1994. P. 82.

[2] Leonardo da Vinci: Anatomical Drawings from Royal Library Winsor Castle. New York, 1984.

[3] Vesalius A. De humani corporis fabrica. Basileae, 1555.

[4] Kornell M. Drawings for Bartolomeo Passarotti's Book on Anatomy // Drawing 1400–1600: Invention and Innovation / Ed. S. Currie. London (Ashgate), 1998. P. 172–188; Friedman D. Pan niepokorny. S. 82–101.

[5] Пра сваё падарожжа за мяжу і навучанне медыцыне пісаў Мацей Ворбек-Летаў (1610–1616). Skarbnica pamięci: pamiętnik lekarza króla Władysława IV / Oprac. E. Galos, F. Mincer. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1968. S. 38–56.

Іван Лыскавец абараніў у 1637 г. дысертацыю па вадзянцы страўніка, а Крыштаф Арцішэўскі выдаў у 1643 г. трактат пра лекі ад падагры[6].

Медыцына ВКЛ развівалася ў рэчышчы еўрапейскай медыцыны. Лекі і абсталяванне для аптэк прывозілі з Прусіі. Напрыклад, з Караляўца рэчы для аптэкі прывёз гарадзенскі аптэкар і радца Ян Мераеўскі (1600)[7]. Аптэкі былі ў буйных гарадах ВКЛ: Вільні, Коўне, Берасці, Гародні ды інш. З інвентару аптэкі берасцейскага бурмістра Станіслава Баброўскага вынікае, што ў будынку знаходзіліся розныя жбаны, шкатулкі з зёлкамі, перагонны куб, патэльні, біклагі, шалі і інш. Акрамя таго, былі два траўнікі і дзве лекарскія кнігі. Дакумент сведчыць, што тут прадаваліся лекавыя травы, парашкі, спецыі, свечкі і інш.[8] Значную ролю ў развіцці медыцыны адыгрывалі езуіты. Яны трымалі аптэкі і мелі ў сваіх кнігазборах добрыя кнігі[9].

Унутраны склад цела быў таксама вядомы ў ВКЛ. Існавала практыка анатамічнага ўскрыцця. Першае галоснае ўскрыццё было зроблена ў Гародні ў 1586 г. Смерць Стэфана Баторыя выклікала спрэчку паміж прыдворнымі лекарамі Мікалаем Бучэлем з Падуі і Сымонам Сымоніўсам з Лукі, якая адлюстравалася нават у друку. Для вырашэння канфлікту было праведзена анатамічнае ўскрыццё цела манарха[10]. Пазней Жыгімонт Ваза даў прывілей на шляхецтва каралеўскаму доктару Мікалаю Бучэлю з Падуі і яго сваякам Прасперу Ліпе і Філіпу Бучэлю. Пра Мікалая было адзначана, што ён служыў яшчэ пры Стэфане Баторыі і выратаваў шмат людзей. Падканцлер ВКЛ Леў Сапега прыняў іх да свайго герба (1589)[11]. Экспертыза ўнутраных органаў была таксама праведзена пасля смерці Жыгімонта Вазы ў 1632 г.[12]

---

[6] Катлярчук А. Студэнты з Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэтах Нідэрландаў XVII–XVIII стст. // Arche. 2007. № 11 (62). С. 422–428.

[7] VUB, f. 4-A2106, l. 73v.

[8] Інвентар аптэкі быў надрукаваны, гл.: НГАБ, ф. 1786, воп. 1, спр. 2, арк. 353–355; АВАК. Т. 6. Вильна, 1872. С. 317–318; Грицкевич В. П. С факелом Гиппократа: Из истории белорусской медицины. Минск, 1987. С. 66–68.

[9] Грицкевич В. П. С факелом Гиппократа. С. 72.

[10] Simonius S. D. Stephani primi Polonorum regis magnique Lithuaniae ducis vita medica, aegritudo, mors, Nyssae, 1587; Simonius S. Amadei Cvrtii medici Ticinensis Responsvm ad epistolam cuiusdam Georgij Chiakor Ungari, De morte Stephani primi, Poloniae regis, [et]c. atq[ue] ad maledicum examen Anonymi, Epistolae eidem adiunctum. Elephas muscam magno conatu peperit. Cracoviae, 1587; Simonius S. Responsum ad Refutationem scripti de sanitate, victu medico, aegritudine, obitu, D. Stephani Polonorum regis. Olomutii, 1588; Simonius S. Scopae, quibus verritur confutatio, quam advocati Nicolai Buccellae Itali chirurgi anabaptistae innumeris mendaciorum, calumniarum, errorumque purgamentis infartam postremo emiserunt. Olomutii, 1589; Buccella N. Confutatio responsi Simonis Simonii Lucensis ad epistolam Georgii Chiakor... de morte Stephani I Poloniæ regis. Cracoviae, 1588; Ziembicki W. Ostatnie łowy. W 350 rocznice zgony króla (grudzień 1586 – grudzień 1936). Lwów, 1937; Lepszy K. Buccella Mikołai // PSB. T. III. Kraków, 1937. S. 74–75; Caccamo D. Buccella Niccolò // Dizionario Biografico degli Italiani. Vol. 14. Rome, 1972. Рэжым доступу: http://www.treccani.it/enciclopedia/niccolo-buccella_(Dizionario-Biografico).

[11] У дакуменце на старабеларускай мове прозвішча напісана “Букцеля”. НГАБ, ф. 1755, воп. 1, спр. 11, арк. 609–613.

[12] Pamiętniki Albrychta Stanisława Radziwiłła. S. 12.

*Літаратура па медыцыне.* У Еўропе стала папулярным выданне траўнікаў і лячэбнікаў[13], што прыводзіла да папулярызацыі медыцынскіх ведаў. У нас былі вядомы розныя замежныя медыцынскія творы як на сваіх мовах, так і перакладныя[14]. Літаратура па медыцыне мелася ў прыватных бібліятэках. Згадваецца яна ў зборах Альбрэхта Гаштольда, Жыгімонта Аўгуста, віленскага бурмістра Стэфана Лебядзевіча, Саламона Рысінскага, Сапегаў і інш.[15] Сустракаюцца працы Клаўдыя Галена, Псеўда-Арыстоцеля[16], Джыралама Меркурыале[17], Плінія Старэйшага[18], Гіпакрата, Андрэ ду Лаўрэнса[19] і інш. Кнігазбор накшталт гэтага быў у люблінскага медыка Пятра Клішэўскага (1627)[20]. Гэта сведчыць, што для тагачасных медыкаў аснову складалі падобныя кнігі. Адносна медыцынскай бібліятэкі Жыгімонта Аўгуста варта зазначыць, што ў ёй былі сабраны працы вядомых і значных медыкаў антычнасці, Сярэднявечча і Новага часу. Гэта сведчыла пра магчымасць у краіне даведацца пра дасягненні ў навуцы. Важнымі цэнтрамі захавання медыцынскай літаратуры былі кляштары, што таксама спрыяла распаўсюджанню ведаў[21].

---

[13] Arber A. Herbals, Their Origin and Evolution. A Chapter in the History of Botany 1470–1670. Cambridge, 1912; Rostański K. Szymon Syreniusz i jego dzieło // Wiadomości Botaniczne. 1997. R. 41/2. S. 7–12; Herbals. Рэжым доступу: http://www.minrec.org/libdetail.asp?id=591.

[14] Грицкевич В. П. С факелом Гиппократа. С. 99–100.

[15] НГАБ, ф. 694, воп. 1, спр. 450, арк. 58, 58 адв., 62; Topolska M. B. Biblioteki w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI i pierwszej połowie XVII wieku // Pamiętnik Biblioteki Kórnickiej. 1983. Z. 20. S. 168, 178; Gudmantas K. Alberto Goštauto biblioteka ir Lietuvos metraščiai // Knygotyra. 2003. T. 41. P. 14, 21; Kawecka-Gryczowa A. Biblioteka ostatniego Jagellona. Pomnik kultury renesansowej. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk; Łódź, 1988. S. 48–49, 223–242; Frick D. Wilnianie. S. 190–191; Zachara M. Silva Rerum Szyrmów // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. 1981. T. 26. S. 174; Niedźwiedź J. Kultura literacka Wilna. S. 116.

[16] У складзе бібліятэкі Сапегаў было выданне 1548 года. Нікалаеў М. Абразкі старажытнай кніжнай культуры Берасцейшчыны (пераважна па матэрыялах Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу) // Берасцейскія кнігазборы: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. "Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання", Брэст, 30–31 кастр. 2008 г. / Склад.: А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька; пад агул. рэд. М. В. Нікалаева. Брэст, 2010. С. 300.

[17] Mercurialis H. Variarum Lectionum, in medicinae scriptoribus & alijs, libri sex. Venetiis, 1588. Джыралама Меркурыале (італ. Geronimo Mercuriale або Mercuriali; лат. Hieronymus Mercurialis, Hyeronimus Mercurialis, 1530–1606) вядомы італьянскі фізіёлаг, медык, аўтар шматлікіх прац па медыцыне, у тым ліку па спартовай. Ongaro G. Mercuriale Girolamo // Dizionario Biografico degli Italiani. Vol. 73. Roma, 2009. Рэжым доступу: http://www.treccani.it/enciclopedia/girolamo-mercuriale_(Dizionario-Biografico).

[18] Plinius Caius Secundus. Historia naturalis. Hagenoae, 1518; Каталог гарадзенскай калекцыі старадрукаў сведчыць пра наяўнасць розных замежных выданняў у ВКЛ: Каталог выданняў XV–XVI стагоддзяў. С. 140–142.

[19] Кніга мела шмат перавыданняў, першае выйшла ў 1600 г. Laurentii A. Historia anatomica: humani corporis partes singulas uberrime enodans, novisque controversiis et observationibus illustrata: cum indice rerum et verborum locupletissimo. Frankfurt a.M., 1600.

[20] Torój E. Inwentarz księgozbioru Piotra Kliszewskiego lekarza lubelskiego z pierwszej polowy XVII wieku // Folia Bibliologica. 1990–1991. Rocz. XXXVIII–XXXIX. S. 123–143.

[21] Ціборовська-Римарович І. О. Стародруки книгозбірні монастиря Ордену картезіанців у Березі Картузькій у фондах Національної бібліотеки України: шляхи надходження та історико-книгознавча характеристика // Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання: матэрыялы і даклады III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (23–24 верасня 2015 г.) / Пад рэд. М. Нікалаева. Брэст, 2016. С. 21–33.

Набылі распаўсюджанне ў ВКЛ польскія траўнікі і лячэбнікі. Выданне траўніка Стэфана Фаліміжа значна паўплывала на развіццё і папулярызацыю медыцынскіх ведаў[22]. Ён уяўляў сабой зборнік з перакладу з лацінскай мовы траўніка 1485 г. і арыгінальных раздзелаў. Утрымліваў апісанне прыгатавання гарэлак, траў і іх лекавых уласцівасцяў, астралагічную інфармацыю, парады па прыняцці родаў і доглядзе немаўлят і інш.[23] Магчыма, што крыніцамі паслужылі нямецкія працы, сярод якіх траўнік Яўхарыўса Росліна малодшага. Ён быў выдадзены ў 1533 г., наступныя выданні былі значна дапрацаваны[24]. Траўнік быў пакладзены ў аснову перавыданняў Гераніма Спічынскага і Марціна Сенніка[25]. Перавыданне пад рэдакцыяй Г. Спічынскага прысвячалася троцкаму ваяводзе Станіславу Гаштольду[26]. З яго было зроблена тлумачэнне ў Маскоўскай дзяржаве ў XVII ст.[27] Траўнік М. Сенніка захаваў у сабе шмат звестак з папярэдніх выданняў[28], аднак была ўведзена і новая інфармацыя[29].

Пералічаныя працы ўтрымлівалі розныя рэкамендацыі па лячэнні жаночых і мужчынскіх захворванняў. А траўнік М. Сенніка ўключаў яшчэ парады гуманіста Джыралама Рушэлі па такіх хваробах, як болькі, сіфіліс, пухліны і інш.[30] Напрыклад, для хуткага зачацця рэкамендавалася на чацвёрты дзень пасля менструацыі закладваць у маціцу пілюлю з шафрану і мірту. Перад гэтым трэба было абавязкова вымыцца. Лекі знаходзіліся там некалькі гадзін, а пасля трэба было ісці да мужа[31].

Лячэбнік Марціна Сенніка адрозніваўся ад папярэдніх выданняў. Ён утрымліваў спецыяльны раздзел, прысвечаны жаночым праблемам. Слушна адзначалася, што дзетародная функцыя жанчыны залежыць ад менструацыі. Прыводзіліся рэцэпты і рэкамендацыі пры затрымцы і парушэнні цыклу, для паспяховага зачацця, лёгкіх родаў, вываду мёртвага плода, пры хваробах жаночых (выпаданне маціцы, пухліны і інш.), мужчынскіх (пухліны і інш.),

---

[22] Falimirz S. O ziołach i o moczy ich. Kraków, 1534.

[23] Hryniewiecki B. Falimirz Stefan // PSB. T 6. Kraków, 1948. S. 354–355.

[24] Rößlin E. Kreutterbuch von allem Erdtgewächs Mit warer Abconterfeitung aller Kreuter. Franckfurt am Meyn, 1533; Kreuterbuch von aller Kreuter, Gethier, Gesteine und Metal, Natur, nutz unnd gebrauch. Mitt aller derenn leblicher Abconterfeytunge. Franckfurt am Meyn, 1540; Das Krauterbuch des Eucharius Rosslin. Рэжым доступу: http://www.landesarchiv-bw.de/web/55150; Roth F. W. E. Die Botaniker Eucharius Rösslin, Theodor Dorsten und Adam Lonicer 1526–1586 // Zentralblatt für Bibliothekswesen. Band 19. Leipzig, 1902. S. 273–274.

[25] Rostafiński J. Porównanie tak zwanych zielników Falimirza, Spiczyńskiego i Siennika. Kraków, 1888.

[26] Spiczyński H. O Ziolach tutecznych y zamorskich y o moczy ich, a k temu księgi lekarskie wedle regestru niżey napisanego wszem wielmi użitecźne. Kraków, 1542.

[27] Ва Успенскім манастыры захоўваўся пераклад. Историческое и археологическое описание первоклассного Успенского женского монастыря в городе Александрове (Владимирской губернии) / Сост. Л. А. Кавелин. СПб., 1884. С. 130–132; Зубов А. Заметка о травнике троцкаго воеводы Станислава Гажтовта // Чтения в обществе истории и древностей российских. 1887. № 3. С. 1–27.

[28] Kowalska H. Siennik Marcin // Polski Słownik Biograficzny. T. 37. Warszawa; Kraków, 1997–1998. S. 236.

[29] Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568.

[30] Falimirz S. O ziołach i o moczy ich. Kraków, 1534. S. 19–20 i інш.; Spiczyński H. O Ziolach tutecznych y zamorskich. S. 12, 14, 30 і інш.; Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 2, 33, 184, 380–381, 551–554 і інш.

[31] Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 378.

венерычных (сіфіліс). Некаторыя парады былі даволі дзіўныя з сучаснага пункту гледжання. Напрыклад для зачацця рэкамендавалася піць з віном здробненыя косць аленя і зуб слана[32]. Сіфілісу была прысвечана асобная праца лекара С. Баторыя Войцеха Очкі[33].

Траўнік Сымона Сырэнскага[34] быў ілюстраваны выявамі лекавых траў, побач давалася інфармацыя пра расліну і выпадкі яе ўжывання. Сярод іншых даваліся рэкамендацыі са сферы гінекалогіі пры затрымцы менструацыі, запаленнях маціцы, бясплоднасці, вывадзе мёртвага плода, а таксама пры мужчынскіх захворваннях, у тым ліку апісваліся сродкі для ўзбуджэння і ўзмацнення патэнцыі. А рута рэкамендавалася мужчынам і жанчынам пры павышаным лібіда. Аніс лічыўся лепшым сродкам для лячэння "французскай хваробы" – сіфілісу[35].

Адзін з першых вядомых старабеларускіх лячэбнікаў, які быў перакладзены ў 1487 г.[36], утрымлівае характарыстыкі лекавых траў і парады па доглядзе цела[37]. У той час у старабеларускай мове ўжо існавалі тэрміны для пазначэння частак цела і ўнутраных органаў. Для мужчынскіх палавых органаў выкарыстоўвалі словы "яйца", "мошонка"[38], жаночых – "лона", "тайное месца", "мацица", грудзі мелі назву "перси"[39].

Лячэбнік прапаноўваў розныя сродкі для выздараўлення, у тым ліку даволі экзатычныя. Пры доўгай менструацыі рэкамендаваліся трыпутнік і шчаўе, а для змяншэння болю – фіялка[40]. Пры мужчынскіх хваробах ужывалі трыпутнік (пры болях у машонцы), конскае шчаўе (для выгнання каменя з машонкі), пастарнак (пры болях і ацёках у яечках)[41]. Жолуд і кроп дапамагалі пры хваробе палавых органаў мужчыны і жанчыны. Кроп[42] трэба было зварыць у віне і сядзець над парам, накрыўшыся коўдрай. А штодзённае ўжыванне расліны прыводзіла да амаладжэння. Гусялапка дапамагала супраць здрады мужа ці жонкі і тым, хто не можа зачаць дзіця[43]. Украінскі лячэбнік рэкамендаваў, калі жонка бегала ад

---

[32] Siennik M. Lekarstwa doświadczone... Kraków, 1564. S. 108–120.

[33] Oczko W. Przymiot. Kraków, 1581.

[34] Сымон Сырэнскі атрымаў медыцынскую адукацыю, працаваў лекарам. Яго траўнік быў напісаны на падставе літаратуры і практыкі. Выданне знаходзілася ў бібліятэках Патоцкіх, Радзівілаў, Сангушкаў і інш. Barcik M. Syreński Szymon // PSB. T. 47. Warszawa; Kraków, 2011. S. 279–281.

[35] Syreński (Syreniusz) Sz. Zielnik Herbarzem z ięzyka Łacinskiego zowią... Cracoviae, 1613. S. 20, 24, 27, 41, 43, 45, 52–54, 67, 68, 107, 117, 120, 121, 131, 133, 148, 166, 219, 529.

[36] Узорам для перакладу мог стаць адзін з траўнікаў: Herbarius. 1484; Herbarius seu De virtutibus herbarum. Passau, 1485. Аб траўніках гл.: Arber A. Herbals, Their Origin and Evolution. P. 13–18.

[37] Гэты рукапіс складаецца з перакладаў з лацінскай і польскай мовы тэкстаў розных аўтараў. Расійскія даследчыкі безгрунтоўна прылічылі яго да старажытнарускіх лячэбнікаў, хоць пры гэтым адзначылі яго паходжанне з тэрыторыі ВКЛ. Редкие источники по истории России / Под ред. А. А. Новосельского и Л. Н. Пушкарева. Москва, 1977. С. 7–11.

[38] У маскоўскіх лячэбніках для пазначэння чэлеса выкарыстоўвалі слова "хуерик". Старинные памятники медицинской письменности XVI–XVII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 148.

[39] Редкие источники. С. 42–44, 47, 48, 56, 57, 69 і інш.

[40] Тамсама. С. 32–33, 47, 52.

[41] Тамсама. С. 32–33, 44, 46.

[42] Ва ўкраінскім лячэбніку кроп таксама рэкамендавалася ўжываць пры "болях у яйцах", але ў якасці адвару. Німчук В. В. Мова українського травника XVI ст. // Мовознавство. 1976. № 5. С. 55.

[43] Редкие источники. С. 42–43, 69, 108–109.

мужа, накарміць яе сэрцам вараб'я. У выпадку здрады яшчэ можна было пасыпаць валасы на лона, тады кахаць будзе толькі мужа. Гэты ж рэцэпт дзейнічаў у дачыненні да мужчын[44].

Шэраг сродкаў датычыў цяжарнасці, родаў, пасляродавага догляду. Лічылася, што ўжыванне чабору выклікае заўчасныя роды. Рэкамендаваліся дубовая амяла (насіць падчас цяжарнасці)[45] і куколь для палягчэння родаў, а губа аленя – пры цяжкіх родах, касач, корань марской цыбулі, снітка, гарычка – для ачышчэння пасля родаў, чамярыца і казінае малако – для выгнання мёртвага плода, воск – пры застоі малака ў грудзях, мальва – пры адсутнасці малака[46].

Асобнае месца сярод медыцынскай літаратуры займае перакладны трактат "Арыстоцелевы вароты, ці Тайная Тайных". Гэта сярэднявечны арабскі твор, які не належыць Арыстоцелю. Ён быў перакладзены на розныя мовы, у тым ліку на старабеларускую мову ў сярэдзіне XVI ст.[47] Кніга ўтрымлівала таемныя веды пра чалавека. Запісы на палях сведчаць, што кніга карысталася папулярнасцю ў XVI і XVII стст. Пададзеныя ў ёй звесткі кардынальна адрозніваліся ад прынятых рэлігійных ведаў. У трактаце цела разумелася як носьбіт інфармацыі. Фізіягноміка і асаблівасці пабудовы цела распавядалі пра характар асобы. Доўгая рука з доўгімі пальцамі ўказвае на майстэрства ў рукадзеллі, мясістыя сцёгны – на малую сілу, тоўстыя галёнкі і лыткі – на цвёрдасць нагі і сілу жывёльную, тонкая і мяккая пятка – на злое сэрца, а тоўстая – на моцнае і г. д. Нават прыводзіўся выгляд добрага чалавека: тонкі твар, сярэднія валасы, роўная шыя, прамыя далоні, доўгія пальцы, вясёлы позірк, смяецца калі патрэбна і інш. Акрамя таго, падаваліся знешнія адрозненні мужчын у залежнасці ад тыпу: смелы, мяккасардэчны, мудры, філосаф, упарты і дурны, бессаромны і інш. Для жанчын быў толькі адзін тып. Яны ўсе былі аднолькавыя: слабейшыя душой і целам, паддаюцца спакусам, хутка раз'юшваюцца, злейшыя за мужчын, вонкава адрозніваюцца (тонкі твар, вузкія плечы, больш мяса на сцёгнах і клубах)[48].

Трактат утрымлівае розныя рэцэпты лекаў, інфармацыю пра лекараў, характарыстыку каштоўных камянёў як лекавых сродкаў, рэкамендацыі па доглядзе цела ў залежнасці ад сезона: харчаванне гарачай ежай увосень і ўзімку, а халоднай – вясной і летам, мыццё ў лазні[49].

---

[44] Німчук В. В. Мова українського травника. С. 55.

[45] Пра амялу як сродак, які палягчае роды, пісаў М. Сеннік. Siennik M. Lekarstwa doświadczone... Kraków, 1564. S. 59v.

[46] Редкие источники. С. 39, 44, 45, 48, 49, 55, 57, 59, 55, 68, 94, 96.

[47] Цяпер рукапіс захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ 091/276к). Праца падрабязна апісана, гл.: Карский Е. Белорусы. Т. III. Очерки словесности белорусского племени. 2. С. 52–55; Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. С. 336–337; Станкевич Л. И. Рукописный сборник гадательно-астрологического содержания XVI в. ("Аристотелевы врата, или Тайная тайных".) из фонда Национальной библиотеки Беларуси // Материалы международной электронной конференции "Книжная культура пограничья Славии Восточной и Западной (ноябрь 2007 г.)". Рэжым доступу: http://www.knizhkult.narod.ru/Stankevich.htm. Аб трактаце гл.: Сперанский М. Из истории отреченных книг. IV: Аристотелевы врата, или Тайная тайных. Москва; Санкт-Петербург, 1908.

[48] Навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, НББ 091/276к, "Арыстоцелевы вароты, ці Тайная Тайных", арк. 22 адв. – 23, 37–38.

[49] Тамсама, арк. 38 адв. – 58 адв.

Значная частка прысвечана астралогіі і парадам у залежнасці ад планеты і знака задыяку. Напрыклад, калі Месяц у Авене, добра шлюб браць, у Цяльцы – мыцца ў лазні, галіцца, стрыгчы валасы, шлюб браць, у Панне – апрануць новыя порткі, пускаць кроў, у Шалях – варыць піва, галіцца, стрыгчы валасы, у Стральцы – закладаць сяброўства, кроў пускаць, мыцца ў лазні, у Казярогу – піва варыць. Былі парады, што рабіць ў адпаведнасці з днямі месяца. Гэта добры астралагічны параднік з табліцамі і тлумачэннямі, які можна было выкарыстоўваць для жыцця[50].

Варта адзначыць, што астралагічныя веды былі запатрабаваны. У "Беларускім зборніку" змешчана інфармацыя пра ўплыў на лёс народжанага немаўляці дня месяца. Звесткі былі ўзяты ад рымскага аўтара (1652). Пры гэтым першая частка зборніка прысвечана рэлігійным пытанням (малітвы і інш.)[51]. Пра астралогію як звычайную частку жыцця сведчыць верш Сімяона Полацкага "12 месяцаў". У ім кожны месяц характарызуецца ў адпаведнасці са знакамі задыяка.

У 1578 г. быў выдадзены медыцынскі параднік "De logistica medica"[52] Яна Гаслера з Берна[53]. Ён аддаваў увагу розным аспектам: тэмпература цела, лекі і інш. У ім было прысвячэнне Мікалаю Дарагастайскаму, полацкаму ваяводзе[54], які быў вучнем аўтара і падтрымаў выданне кнігі. Апрача таго, у Вільні выйшлі дзве кнігі Гаслера "Paradoxus annorum mundi" (1596) і "De Fuga et praeclusione pestilentiae" (1602)[55].

Медыцынскія творы ўтрымлівалі інфармацыю пра хваробы і лекі. У іх не вылучаліся асобна, як цяпер, тэрапія, хірургія, гінекалогія і інш. Тагачасная медыцына адрознівала мужчынскія і жаночыя хваробы, асобная ўвага аддавалася менструацыі (лічылася жаночай хваробай), цяжарнасці, родам, пасляродаваму догляду. Аднак паступова спецыялізацыя прыходзіць у медыцыну. У 1641 г. у Вільні была надрукавана праца, прысвечаная воку і яго асаблівасцям успрымання святла, з адпаведнымі схемамі ды ілюстрацыямі[56].

Лячэбнікі ўтрымлівалі рэкамендацыі па вялікай колькасці захворванняў: болі галавы, страўніка, суставаў і інш. У якасці лекавых сродкаў выкарыстоўвалі спецыі (цынамон, гваздзіка, перац), агародніну (часнок, цыбуля, рэпа),

[50] Навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, НББ 091/276к, "Арыстоцелевы вароты, ці Тайная Тайных", арк. 61 адв. – 89.

[51] Белорусский сборник XVII века. Рукопись могилевского епархиального церковного древнехранилища // Сборник статей Могилёвских Губернских Ведомостей / Под ред. Е. Р. Романова. Вып. 1. 1898 и 1899 гг. Могилев-Губернский, 1900. С. 2, 4; Марзалюк І. Матрыманіяльнасць і секс у Беларусі ў XI–XVIII стст. // Terra Alba. Т. 2. Homo venerus: Сексуальная прастора беларускай культуры / Пад рэд. С. І. Даніленкі. Мінск, 2001. С. 125–126.

[52] Hasleri I. De logistica medica. Augsburg, 1578.

[53] Біяграфію Яна Гаслера гл.: Hasler F., Portmann M.-L. Johannes Hasler (1548–16?), Arzt, Theologe und Iatrophilosoph // Gesnerus: Swiss Journal of the history of medicine and sciences. 1969. № 26. S. 164–188.

[54] Hasler F., Portmann M.-L. Johannes Hasler (1548–16?). S. 174; Галенчанка Г. Невядомыя і малавядомыя помнікі. С. 238–241.

[55] Hasler F., Portmann M.-L. Johannes Hasler (1548–16?). S. 184; Jarczykowa M. Krzysztofa Dorohostajskiego zabawy Muzom poświęcone // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. 2014. T. 58. S. 108.

[56] Młodzianowski J. Theoremata de oculo. Vilnae, 1641; Галенчанка Г. Невядомыя і малавядомыя помнікі. С. 246–247.

зёлкі (мята, крапіва), сродкі жывёльнага паходжання (тлушч, косткі), малітвы і інш. Пры гэтым мясцовыя медыкі спалучалі замежны і айчынны вопыт лекавання.

Самай вялікай небяспекай былі пошасці. Яны вынішчалі цэлыя мясцовасці. Часта мор суправаджаў войны. Напрыклад, самая крывавая вайна 1654–1667 гг. прынесла пошасць амаль на ўсю тэрыторыю ВКЛ[57]. Так, у Кейданах адны хварэлі, а другія выязджалі з горада. Тыя, хто застаўся, хавалі адзін другога. З дамоў гучалі стогны, а сабакі бегалі паўсюдна і елі трупы[58]. На выпадак пошасцей лячэбнікі ўтрымлівалі шэраг рэкамендацый[59].

Акрамя таго, была традыцыя весці хатнія запісы, сярод якіх часта ўтрымліваліся медыцынскія парады[60]. Іх крыніцамі маглі быць як друкаваныя зборнікі, так і чыйсьці жыццёвы вопыт. Гэтыя рукапісы сведчаць пра распаўсюджанасць элементарных медыцынскіх ведаў сярод адукаванага насельніцтва – як правіла, сярод шляхты.

Варта адзначыць, што веды пра лекавыя ўласцівасці раслін былі запатрабаваны ў беларусаў нават у XIX ст. Траўнік быў сабраны Элізай Ажэшкай. Ён захоўваўся ў міжваенны перыяд у Гродзенскім музеі, часткова быў надрукаваны[61]. Цяпер адзін з тамоў гербарыя знаходзіцца ў экспазіцыі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

Калекцыя раслін Міхаіла Федароўскага і каментары да яе захаваліся да сённяшняга дня ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта. Часткова рукапіс быў надрукаваны. М. Федароўскі адзначаў даволі высокі ўзровень ведаў знахароў Заходняй Беларусі ў галіне лекавых раслін. Знахарскія веды перадаваліся ад бацькі да старэйшага сына, рэдка – малодшаму, а сярэдняму – ніколі. Паводле павер'я, лекі дапамагалі, калі іх даваў старэйшы(ая) ці малодшы(ая) у сям'і. Знахары добра ведалі час збору траў і іх уласцівасці. Лячылі розныя хваробы (панос, белі, астму, кашаль і інш.), у тым ліку і звязаныя з палавой сістэмай, нават венерычныя. Ведалі травы для дапамогі пры цяжарнасці і родах. Некаторыя са сродкаў дайшлі да нашага дня і ўжываюцца ў народнай

---

[57] Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия. С. 165; Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мінск, 1983. С. 130; Chrapowicki J. A. Diariusz. Cz. 1: 1656–1664 / Oprac. T. Wasilewski. Warszawa, 1978. S. 305; Герасімава І. Маравая пошасць у акупаванай Вільні (1657 год) // Arche. "Гісторыя беларускай штодзённасці". 2012. № 3. С. 96–108.

[58] Stefan Franciszek z Pruszcza Medeksza. Księga pamiętnicza wydarzeń zaszłych na Litwie 1654–1668. Kraków, 1875. S. 30–31.

[59] Апісанне мер бяспекі пры пошасці ёсць у: Falimirz S. O ziołach i o moczy ich. Kraków, 1534. S. 61–66 (Część o rzadzeniu czasu powietrza morowego); Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 541–548. У Вільні была выдадзена адпаведная інструкцыя Валенція Варташэўскага ў 1630 г. Frick D. Wilnianie. S. 97–100.

[60] LMAVB, f. 17-11, l. 322v–340v; f. 17-26; Навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, НББ 091/4024к, арк. 266 – 269 адв.; Галенчанка Г. Невядомыя і малавядомыя помнікі. С. 383; Віцько Д. В. Silva rerum Стафана Яна Слізня XVII–XVIII стст. з успамінамі Аляксандра Слізня за 1561–1646 гг. // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 11. Мінск, 2009. С. 78.

[61] Orzeszkowa E. Ludzi i kwiaty nad Niemnem // Wisła: miesięcznik geograficzno-etnograficzny. 1890. T. 4. S. 1–3; Jodkowski J. O czarowniku Znaku na inkwizicji w Grodnie w 1691 r. Lwów, 1932. S. 8–12.

медыцыне[62]. Каштоўнасць інфармацыі Федароўскага ў тым, што да яго яна перадавалася ў вуснай форме ў сялянскім асяроддзі. Дзякуючы яму звесткі пра народную медыцыну былі занатаваны.

*Медыцынскае абслугоўванне.* Саслоўны падзел грамадства рабіў медыцыну даступнай для заможных. Веды вымяраліся грашыма, таму магчымасць атрымаць медыцынскую адукацыю мелі далёка не ўсе. У XVI–XVII стст. карысталіся паслугамі знахароў, лекараў, цырульнікаў[63]. Лекарамі і цырульнікамі былі ў асноўным асобы з мяшчанскага асяроддзя, якія набывалі свае веды за мяжой. У ВКЛ была больш развіта гуманітарная навука. Пры гэтым спецыялісты высокага ўзроўню былі ў асноўным замежнікі: немцы, італьянцы, французы. Узровень ведаў мясцовых лекараў жадаў лепшага[64], бо навучанне ў цэху і ва ўніверсітэце, вядома, адрознівалася.

Самы знакаміты лекар XVI ст. – полацкі мешчанін Францыск Скарына. Асабістых лекараў маглі сабе дазволіць толькі каралеўскія і заможныя асобы, як, напрыклад, Мікалай Радзівіл Сіротка[65]. А калі нічога не дапамагала, то звярталіся да цудатворных абразоў[66].

Больш-менш прафесійную медыцынскую дапамогу літвіны маглі атрымаць у горадзе. У многіх вялікіх гарадах былі арганізаваны цэхі цырульнікаў. Цырульнікі займаліся не толькі стрыжкай валасоў і галеннем, але і элементарнымі хірургічнымі працамі, у асноўным звязанымі з ранамі[67]. У Вільні цэх цырульнікаў быў арганізаваны ў 1509 г. Прывілей цэха пасля дапрацоўваўся і неаднаразова пацвярджаўся[68]. Для берасцейскага цэха ўзорамі сталі прывілеі Варшавы і Лукава (1615), для менскага – прывілеі Кракава, Варшавы, Гданьска, Караляўца, Вільні, Коўна і Берасця (1635), для полацкага – прывілеі Вільні (1642), для гарадзенска-

---

[62] Zioła lesniczy używane przez lud białoruski w okolicach Wołkowyska i Słonima z dodatkiem roślin w gusłach i czarach zastosowanie mających. Zeszyt III. Zebrał i opisał M. Fedorowski // Gabinet rękopisów BUW, sygn. 445; Federowski M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej: materyały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905. T. 1. Wiara, wierzenia i przesądy z okolic Wołkowyska, Słonima, Lidy i Sokółki. Kraków, 1897. S. 382, 415–449.

[63] Грицкевич В. П. С факелом Гиппократа. С. 70–87.

[64] O'Connor B. Historia Polski / Tłum. W. Duży, T. Falkowski, P. Hanczewski, K. Pękacka-Falkowska. Warszawa, 2012. S. 568–569, 575; Szpilczyński S. Bernard O'Connor o zdrowotności i higienie w Polsce u schyłku XVII wieku oraz jego zapatrywania na strukture ludzkiego organizmu // Kwartalnik Historii Nauki i Techniki. 1974. № 19/2. S. 308.

[65] Archiwum domu Radziwiłłów. T. VIII. S. 22.

[66] Пра лячэнне хваробаў з дапамогай цудатворных абразоў гл.: Сліж Н. "Збор знакамітых цудаў і ласкаў Найсвяцейшай Панны Марыі Студэнцкай" як крыніца па гісторыі Гародні // Архіварыус. Вып. 7. Мінск, 2009. С. 132–181; Сьліж Н. «Нябесная скарбніца...» Вільні // Arche. Genius urbis. 2010. № 3. С. 62–99; Сліж Н. Цудатворны абраз Маці Божай Студэнцкай і гарадзенская шляхта: ідэнтыфікацыя, радаводы, сувязі // Герольд Litherland. 2011. № 18. С. 41–93.

[67] У папулярным перакладзе Стэфана Фаліміжа ўтрымліваецца спецыяльны раздзел аб працы цырульніка, які перадрукоўваўся ў іншых выданнях. Falimirz S. O ziołach i o moczy ich. Kraków, 1534. S. 96–117v. (Część o naukach barwieskich).

[68] Giedroyć F. Ustawy Cechów Cyrulickich w dawnej Polsce // Kronika Lekarska. 1897. R. 18, z. 3. S. 395–400; Akty cechów wileńskich 1495–1759 / Wyd. H. Łowmiański, M. Łowmiańska, S. Kościałkowski. Poznań, 2006. S. 48–49, 101–103, 154–156, 164–165, 171.

га – таксама Вільні (1649)[69]. Статуты казалі ў асноўным пра ўнутраны распарадак. Забаранялася чыніць перашкоды цэхавым рамеснікам, займацца лекарскай дзейнасцю, галеннем, стрыжкай, спусканнем крыві асобам, якія не ўваходзілі ў склад цэха, жыдам, лазнікам, цыганам, татарам. Пры неабходнасці майстры маглі параіцца наконт лячэння з іншымі майстрамі. Аднак статуты не ўтрымлівалі прафесійную інфармацыю: рэкамендацыі па кнігах, леках, захворваннях.

Прафесія цырульніка цанілася. Менскі цырульнік Павел Шнэль Скаршэўскі атрымаў вызваленне ад Жыгімонта Вазы ад выплаты капшчыны і пастою ў яго доме падчас соймаў і іншых з'ездаў за сваю працу для людзей у галіне медыцыны, а таксама ў сувязі з тым, што медыцынская дзейнасць патрабавала спакою і адсутнасці чужых людзей у доме (1595)[70].

Здароўе мела важнае значэнне. Аднак захаваць яго было вельмі складана. Трэба было мець вельмі загартаванае цела, каб пераносіць вайсковыя паходы, вандроўкі, цяжкую фізічную працу, асаблівасці харчавання і інш. Звычайная прастуда магла скончыцца смерцю. Больш кваліфікаваны догляд цела мелі заможныя людзі. Пры неабходнасці яны выязджалі на лячэнне за мяжу. Напрыклад, Мікалай Крыштаф Дарагастайскі лячыўся ў Італіі (1608)[71].

Акрамя лекаў былі вядомы парады па здаровым ладзе жыцця. Шэраг рэкамендацый быў па харчаванні, якое непасрэдна звязвалі з добрым станам здароўя. На падставе прац Арыстоцеля, Авіцэны, Гіпакрата і іншых рэкамендавалася мець разнастайнае харчаванне, не злоўжываць ежай, піць пасля ежы, але няшмат, хадзіць перад абедам і знаходзіцца ў спакоі пасля яго, ужываць лёгкія стравы на вячэру[72].

Польскі лекар Марцін Сеннік лічыў, што для падтрымкі добрага стану неабходны паветра, ежа, піццё, сон, рух і спакой, настрой. Ён напісаў даволі падрабязныя рэкамендацыі па здаровым ладзе жыцця. Напрыклад, абсалютна слушна адзначалася, што празмернае ўжыванне ежы прыводзіць да страты здароўя[73].

*Хваробы палавой сферы*. Масавае распаўсюджанне ў Еўропе XVI ст. набывае сіфіліс[74], таму рэцэпты ад яго з'яўляліся ў розных працах[75]. Хвароба даходзіць да Польшчы. Паводле хронік, у 1493 г. у Кракаў прынесла хваробу жанчына пасля наведвання святаў у Рыме, а распусныя людзі спрыялі яе распаўсюджванню. У Італіі

[69] Беларускі архіў. Т. 3: (XV–XVIII). Мінск, 1930. С. 148–155; АС. Т. 1. Вильна, 1867. С. 325–327; НГАБ, КМФ-18, спр. 111, арк. 640 адв. – 648; спр. 123, арк. 255–256; спр. 127, арк. 464 – 467 адв.; Стрэнкоўскі С. Гарадское самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XIV–XVIII ст.). Ч. 1. Мінск, 2013. С. 423.

[70] Беларускі архіў. Т. 3. С. 80–81.

[71] Sajkowski A. Opowieści misjonarzy konkwistadorów pielgrzymów i innych świata ciekawych. Poznań, 1991. S. 229.

[72] Редкие источники. С. 73–77.

[73] Siennik M. Lekarstwa doświadczone... Kraków, 1564. S. 2–14.

[74] Kurzel-Runtscheiner M. Córy Wenus. S. 141–144; Hughes O. D. Bodies, Disease, and Society // Italy in the Age of the Renaissance 1300–1550 / Ed. M. Najemy. Oxford, 2004. P. 105–110; Same-Sex Desire in the English Renaissance A Sourcebook of Texts, 1470–1650 / Ed K. Borris. New York; London, 2005. P. 114–115.

[75] Podemontan A. Taiemnice. Wszystkim oboiey płsci... Supraśl, 1737. S. 116–120.

сіфіліс пачаўся з Неапаля, куды яго прынеслі французскія салдаты пад кіраўніцтвам Карла VIII, што і дало назву хваробе "франса". А пасля ў 1495 і 1496 гг. службоўцы з Вугоршчыны прынеслі сіфіліс у Кракаў зноў[76]. Зыходзячы з інфармацыі ў друкаваных і выяўленчых крыніцах, паходжанне сіфілісу ў Польшчы дыскутавалася ў гістарыяграфіі. Але даследчыкі не змаглі прыйсці да адназначных высноў[77]. ВКЛ таксама закрануў сіфіліс. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка прыдбаў хваробу праз распуснае жыццё пры дварах Жыгімонта Аўгуста і Генрыка Валезы[78].

Варта адзначыць, што на той час лячэнне хвароб палавых органаў у Еўропе праводзілася вельмі складана і часта без поспеху. Мужчыны і жанчыны пакутавалі ад розных відаў захворванняў[79]. Лекар Бернард О'Конар адзначаў у другой палове XVII ст., што метады лячэння венерычных хвароб у Рэчы Паспалітай таксама вельмі недасканалыя[80]. Звязана гэта было з узроўнем развіцця медыцыны, нізкім станам гігіены і адсутнасцю адпаведных сродкаў кантрацэпцыі.

Як пацвярджае прымаўка "*Po iaiu się napić, po jabłku pannę obłapić*"[81], для мужчын незалежна ад паходжання заўсёды была важна патэнцыя. Таму пошук эфектыўных афрадызіякаў быў нязменна актуальны. Грэкі ўжывалі цыбулю, яйкі, мёд, мідыі, крабаў, смаўжоў. У Кітаі былі вядомы розныя парашкі, у склад якіх уваходзілі рогі аленя, водарасці, грыбы і інш.[82] У Турцыі стымулятары рабілі з гіены, праўда, у падарожных нататках не згадваецца рэцэптаў[83]. Для ўзмацнення патэнцыі ў маскоўскіх лячэбніках раілі аніс[84]. Не абышлі ўвагай польскія выданні сродкі для ўзбуджэння і стымулявання патэнцыі. Рэкамендаваліся шафран, поліўка з бабамі, перцам і імбірам, галубіныя і вераб'іныя яйкі і інш. Мужчынам ва ўзросце раілі ўжываць два разы на дзень сумесь з гарчыцы, перцу, кмену і насення партулаку, запраўленую мёдам[85]. Небяспечную павышаную хцівасць прапаноўвалася стрымліваць рознымі сродкамі: піць сланечнік, класці ў ложак ружу ці руту, піць поліўку з чорнага маку і інш.[86] Калган выкарыс-

---

[76] Mechovita M. Chronica Polonorum. Cracovea, 1521. P. CCCLVII; Oczko W. Przymiot. Kraków, 1581. S. 7–8; Kronika Marcina Bielskiego. T. II. Sanok, 1856. S. 893; Kronika Macieja Stryjkowskiego. S. 625.

[77] Lejman K. Zarys historii kiły // Archiwum Historii i Filozofii Medycyny. 1969. № 2. S. 125–145. Koronowska S. K. 430 lat wenerologii polskiej // Nowiny Lekarskie. 2010. № 79 (6). S. 487–494; Grzegorczyk W., Grzegorczyk J., Grzegorczyk K. Alleged cases of syphilis immortalized in the Krakow Altarpiece by Veit Stoss in the light of new research on the origins of the disease in Europe // Medical Review. 2016. № 14 (3). S. 340–357.

[78] Hejdensztejn R. Dzieje Polski od śmierci Zygmunta Augusta do roku 1594. Ksiąg XII. Tom 1. Petersburg, 1867. S. 157; Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616), wojewoda wileński. Warszawa, 2000. S. 105.

[79] Stone L. The Family, Sex, and Marriage. P. 487.

[80] O'Connor B. Historia Polski. S. 575–576; Szpilczyński S. Bernard O'Connor o zdrowotności. S. 308.

[81] Proverbiorum Polonicorum a Solomone Rysinio Collectorum Centuriae Decem et Octo. Lubecz ad Chronum, 1618. P. H, Centuria 13:30.

[82] Тэннехилл Р. Секс в истории. С. 166–168; ван Гулик Р. Искусство секса в Древнем Китае / Пер. с англ. Н. Касьяновой. Москва, 2003. С. 187–188.

[83] Namyslovius Licicnius I. Augeriusa Busbequiusa Oratora cesarza Ferdinanda drogi. S. 21.

[84] Старинные памятники медицинской письменности XVI–XVII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 150.

[85] Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 198, 379; Kuchowicz Z. Miłość Staropolska. S. 384.

[86] Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 379.

тоўваўся як сродак супраць зачацця (трымаўся ў роце падчас сексу жанчынай). Але аўтар не рэкамендаваў казаць пра гэта жанчыне[87].

Для тагачасных людзей было зразумела і натуральна, што ў выніку стасункаў паміж мужчынам і жанчынай нараджаюцца дзеці. Аднак тое, што адбываецца ва ўлонні, заставалася таямніцай. Апісанне зачацця дзіцяці ёсць у Палеях (XVI ст.), якія захоўваліся ў бібліятэцы Супрасльскага манастыра[88]. Дзіцё ствараецца, калі мужчынскае семя трапляе ў жаночае ўлонне. Як не бачым, што знаходзіцца ў жалезе ці камені, так не бачым і зачацце, але ў ім прысутнічае рука Бога. Душа ўсяляецца на пятым месяцы цяжарнасці. Роды адбываюцца праз 9 месяцаў. Адзначалася пра зачацце ў граху, калі парушаліся божыя законы. Больш падрабязна гэта не тлумачылася. Згадваўся яшчэ адзін від зачацця – праз чараванне і вядзьмарства[89].

Працэс зачацця, фарміравання і нараджэння дзяцей абмяркоўваўся ў медыцынскай літаратуры з часоў Сярэднявечча[90]. Гэтыя погляды даходзілі і да ВКЛ. Была вядома кніга Плінія Старэйшага[91]. Яна ўключала ў сябе розныя кнігі, а 7-я была прысвечана чалавеку. У ёй сярод іншага аддавалася ўвага нараджэнню дзяцей. З тэксту адукаваныя чытачы маглі даведацца, што тэрмін цяжарнасці можа быць 7 ці 8 месяцаў, але нараджэнне дзяцей у гэты перыяд небяспечнае. Згадваецца пра экзатычны выпадак цяжарнасці – 13 месяцаў. Блізнят нараджаюць з цяжкасцю, адзін з іх, як правіла, памірае. Нараджэнне ўперад нагамі неадпаведнае, нават небяспечнае для жыцця жанчыны і плода. Дзяўчаты нараджаюцца хутчэй за хлопцаў. Рэдкія выпадкі – гэта нараджэнне чатырох дзяцей. На самаадчуванне цяжарнай уплывае практычна ўсё: поўня, празмернае ўжыванне салёнага і інш. Таксама якая заўгодна прычына можа справакаваць выкідыш. Адзначалася, што жанчына, будучы цяжарнай адным дзіцём, можа зацяжарыць другім і мець дзяцей ад двух мужчын, калі паміж стасункамі было мала часу. Прыводзяцца некаторыя назіранні, што і ад здаровых бацькоў нараджаюцца хворыя, а ў хворых здаровыя, паталогіі могуць ісці праз некалькі пакаленняў. Дзеці могуць быць падобныя да маці, бацькі ці мяшанага тыпу. Прычына гэтай з'явы палягае ў стане розуму падчас зачацця, яго хуткасці і ў тым, які вобраз у гэты час у галаве. Чый стан мыслення будзе дамінаваць, да таго і будзе падобнае дзіця. З тэмай звязана пытанне няплоднасці. Ёсць целы, якія ўваходзяць у супярэчнасць паміж сабой, тады людзі не могуць мець дзяцей. Яшчэ аўтар заўважыў, што ў адных бацькоў нараджаюцца толькі дзяўчаты, у іншых толькі хлопцы, некаторыя нараджаюць раз у жыцці, некаторыя не могуць вынасіць. Жанчыны не нараджаюць пасля 50, а менструацыя ў многіх заканчваецца пасля 40. Што да мужчын, то яны здольныя да зачацця нават у старасці, напрыклад у 86 гадоў. Нават ёсць выпадкі сярод людзей нізкага

[87] Редкие источники. С. 18.

[88] Описание рукописей Виленской публичной библиотеки, церковно-славянских и русских / Сост. Ф. Добрянский. Вильна, 1882. С. 144–151.

[89] Палея, XVI ст. // LMAVB, f. 19-83, l. 78–82; Палея, XVI ст. // LMAVB, f. 19-84, l. 47v–50v.

[90] Siraisl N. G. Medieval and Early Renaissance medicine: an Introduction to Knowledge and Practice. Chicago, 1990. P. 110–114.

[91] Кніга была ў бібліятэцы С. Рысінскага. НГАБ, ф. 694, воп. 1, спр. 450, арк. 58.

стану, што мелі дзяцей пасля 70[92]. Прыведзеныя звесткі пра цяжарнасць – гэта не прадмет даследавання, а жыццёвыя назіранні і інфармацыя з літаратуры.

Працы Арыстоцеля карысталіся папулярнасцю ў ВКЛ. У Сярэднявеччы многія з іх былі перакладзены на лацінскую мову і неаднаразова перавыдаваліся. Кніга "De Animalibus" ("Гісторыя жывёл") была перакладзена Тэадорам Газай і выдадзена першы раз у Венецыі[93]. Гэта рэдкае выданне ёсць у калекцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі[94]. Кніга была ў спісах Жыгімонта Аўгуста (1533)[95], віленскага бурмістра Стэфана Лебядзевіча, у апошняга не былі згаданыя месца і год выдання[96]. Можам толькі выказаць меркаванне, што ўраднік мог карыстацца выданнем 1619 г.[97] Цікавасць да яго палягае ў тым, што апошняя частка прысвечана захворванням жанчын, якія перашкаджаюць зацяжарыць, мужчынскай бясплоднасці, працэсу зачацця дзіцяці. Гэтай тэматыцы быў прысвечаны твор Галена "De semine" (Насенне). У ім ён звяртаўся да згаданай працы Арыстоцеля і прац Гіпакрата[98].

Асаблівасці жаночага цела, цяжарнасць абмяркоўваліся ў творы Псеўда-Арыстоцеля "Problemata". Праца была вядома ў еўрапейскіх краінах, перакладалася на розныя мовы, аказала значны ўплыў на развіццё медыцынскіх ведаў[99]. Яна таксама ўтрымлівалася ў бібліятэках. Паводле кнігі менструацыя разумелася як хвароба, якая наступае з 13 гадоў і заканчваецца пасля 50. Падчас цяжарнасці менструальная кроўператваралася ў малако. Сам цыкл залежаў ад цыклу Месяца і складаў 29 дзён і 14 гадзін. Працягласць менструацыі была 3 дні, а ў некаторых 5–6. Незразумелым было месца знаходжання менструальнай крыві: у маціцы ці ў венах на пазванку. Пачыналася выдзяленне крыві ў жанчыны ў розны перыяд Месяца, у залежнасці ад тэмпераменту (сангвінік, халерык, меланхолік, флегматык). Звярталася ўвага на пагрозу выкідыша, калі ішла кроў падчас цяжарнасці. Зацяжарыць жанчыне лягчэй пасля менструацыі, бо лепш прыгатаваная і больш чыстая. Таксама тут падкрэслівалася важнасць стану ўяўлення жанчыны падчас палавога акта. Візуалізацыя мае такую моц, што можа прывесці да нараджэння ўшчэрбнага дзіцяці, калі яно ўяўлялася. Таксама гэта ўплывала на падабенства дзіцяці да маці ці бацькі. Але само дзіцё з'яўляец-

---

[92] Plinius Caius Secundus. Historia naturalis. Hagenoae, 1518. Праца была перакладзена на розныя мовы, у тым ліку на польскую: K. Pliniusza Starszego Historyi naturalnej ksiąg XXXVII = C. Plinii Secundi Historiae naturalis libri XXXVII. T. 3 ks. 7–9 / Tł. J. Łukaszewicz. Poznań, 1845. S. 31–49.

[93] Aristoteles. De Animalibus. Venezia, 1476.

[94] Саверчанка І. Італьянскія кнігі эпохі Рэнесансу.

[95] Kawecka-Gryczowa A. Biblioteka ostatniego Jagellona. S. 243.

[96] Frick D. Wilnianie. S. 191.

[97] Aristotelis Historia de animalibus Julio Caesare Scaligero interprete cum ejusdem commentariis. Philippus Jacobus Maussacus opus primus vulgavit et estituit, additis Prolegomenis et animadversionibus. Tolosae, 1619.

[98] Galen. De semine. Corpus Medicorum Graecorum 5.3.1 / Ed. Ph. De Lacy Berlin, 1992.

[99] Aristoteles' Problemata in Different Times and Tongues / Ed. P. De Leemans, M. Goyens. Leuven, 2006; Wallis F. Giulio Guastavini's commentary on Preudo-Aristotle's account of male same-sexual coitus, Problemata 4.26 // The Science of Homosexuality in Early Modern Europe / Ed. K. Borris, G. Rousseau. London; New York, 2008. P. 57–73; Carrè A., Cifuentes L. Girolamo Manfredi's Il Perché: I. The Problemata and its Medieval Tradition // Medicina & Storia. 2010. № X, 19-20. P. 13–38.

ца ад уваходжання семя ва ўлонне. Магчымасць зацяжарыць для поўных жанчын была меншай, бо яны маюць слізкую маціцу, у якой не замацоўваецца семя, або праход у маціцу вузкі, семя не можа патрапіць. Таксама праблемы ўзнікаюць у жанчын з гарачым тэмпераментам. Не могуць зачаць прастытуткі. Хлопчыкі нараджаюцца, калі семя трапляе ў правую частку жанчыны, а дзяўчынкі – калі ў левую частку. Памер дзяцей залежыць ад памераў маціцы. Блізняты нараджаюцца не такімі моцнымі, як адно дзіця, бо сіла дзеліцца на дваіх[100].

Працэс зачацця апісаны ў медыцынскім трактаце Альберта Вялікага пра жаночы арганізм, які быў перакладзены з латыні на польскую мову і суправаджаўся каментарамі. Выдадзены ён быў у Амстэрдаме[101]. Гэты твор на латыні “De secretis milierum” быў вельмі папулярны ў Еўропе і шмат разоў перавыдаваўся. Аўтарства прыпісвалася святому Альберту Магнусу, але памылкова. Праца грунтавалася на поглядах Авіцэны, Арыстоцеля і іншых[102]. У ВКЛ было вядома лацінскамоўнае выданне[103]. У кнізе пададзена мужчынскае бачанне біялагічных працэсаў у жаночым целе. З сучаснага пункту гледжання гэтыя ўяўленні вельмі наіўныя, а часам проста фантастычныя.

У трактаце сцвярджалася, што плод ствараецца ад семя бацькі і менструальнай крыві маці, якія злучаюцца ўнутры жанчыны. Маціца ўсё прымае і замыкаецца. Плода не будзе, калі мужчына выпусціць семя перш, чым жанчына кроў, а таксама калі нядобрае семя, негарачае. Больш шанцаў для зачацця дзіцяці, калі мужчына рэдка стасуецца з жанчынай, бо тады яго семя гарачае[104]. Гэтая думка панавала і ў іншых еўрапейскіх працах. Лічылася, што частыя сексуальныя стасункі робяць сперму слабай, адпаведна гэта не дае магчымасці для зачацця. З працы Арыстоцеля пайшло меркаванне, што якасная сперма тая, якая, калі трапляе ў кубак з вадой, падае на дно[105].

Адзначалася, што звычайна менструацыя пачынаецца ў жанчыны з 12, 13, а часцей з 14 гадоў. З гэтага часу яна можа нараджаць. Але гэта з’ява разглядалася як хвароба, прычыны яе былі зусім незразумелымі. Лічылася, што жанчына такім чынам чысціцца: выходзяць лішкі вільгаці і павышаецца тэмпература. У сувязі з гэтым выказвалася меркаванне, што жанчыны няздольныя да навукі, бо мозг заплывае цяжкімі рэчывамі. У непрыстойных жанчын кроў сіняга колеру. Прырода менструацыі была незразумелай для тагачасных медыкаў, таму

[100] Гэта кніга мае шмат перавыданняў. Намі было выкарыстана выданне 1557 г. Problemata Aristotelis ac philosophorum medicorumque complurium. Paganus, 1557. P. 113–127, 133–134.

[101] Albertus Magnus. O sekretach białogłowskich, mocy ziół, kamieni y zwierząt osobliwych przetłumaczony. Amsterdam, 1695; Wallace W. Albertus Magnus, Saint // Dictionary of Scientific Biography. New York, 1970. P. 102.

[102] Wallace W. Albertus Magnus, Saint. P. 102; Lemay Rodnite H. Women’s Secrets: A Translation of Pseudo-Albertus Magnus De Secretis Mulierum with Commentaries. Albany, 1992. P. 1–19.

[103] Кніга Альберта Магнуса была адзначана сярод іншых у кнігазборы віленскага бурмістра Якуба Кеўліча (1630) і пінскага старосты Яна Караля Млоцкага. Бібліятэка апошняга пасля 1674 г. перайшла ў спадчыну Грыгорыю Шырме. Niedźwiedź J. Kultura literacka Wilna (1323–1655). Kraków, 2012. S. 113; Zachara M. Sylwa Rerum Szyrmów // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. 1981. T. XXVI. S. 174.

[104] Albertus Magnus. O sekretach białogłowskich. S. 21–24, 26–31.

[105] Bastl B. Eherliche Sexualität in der Frühen Neuzeit zwischen lust und last. Die Imtrutztia de Fürsten Karl Eusebius von Liechtenstein // Archiv für Kulturgeschichte. 1996. № 78/2. P. 277–301.

са старажытнасці на гэты конт выказваліся розныя меркаванні[106]. Адсутнасць менструацыі падчас цяжарнасці разумелася як неабходнасць крыві для плода. Адзначалася ўзмацненне сексуальных жаданняў у цяжарных, а таксама ў тых, хто меў затрымку менструацыі[107]. Апошнія назіранні былі слушныя, бо ў перыяд зменаў у гарманальным фоне можа адбывацца павышэнне лібіда.

Пра плод змешчана наступнае апісанне: першыя 10 дзён ён выглядае як малако, пасля становіцца крывавага колеру, далей фарміруюцца часткі цела. На гэты працэс уплываюць планеты і знакі задыяка. Слушная была заўвага пра "слабасць" плода ў 8 месяцаў і пра яго сфарміраваны і здаровы стан у 9 месяцаў. Змешчаны важныя парады аб прысутнасці пры родах дасведчаных жанчын для дапамогі у працэсе выхаду дзіцяці[108].

Асобна апісваліся прыкметы цяжарнасці, якія выяўляюцца адразу пасля сексу (!). Цяжка нават уявіць, на якой падставе яны былі вызначаны, бо ў тагачаснай гінекалогіі меркавалася, што лепш за саму жанчыну ніхто не можа ведаць, цяжарная яна ці не[109]. Калі пасля сексу жанчына адчувае холад і боль у галёнцы – то зачала. Холадна робіцца, бо ўсё цяпло канцэнтруецца для плода. Калі мужчына падчас сексу адчувае, што яго чэлес зацягваецца і засмоктваецца маціцай, то гэта азначае зачацце. Іншы знак – прага сексу жанчынай пасля злучэння з мужчынам. Пачырваненне твару таксама сведчыла пра зачацце. Праз піццё мёду (2 лыжкі мёду і 1 лыжка вады) жанчынай можна было даведацца пра цяжарнасць. Калі пачуе бурчанне каля пупка, то зацяжарыла. Пол дзіцяці вызначаўся па колеры скуры на твары жанчыны: моцнае пачырваненне – хлопчык, бо для зачацця патрэбна больш энергіі; лёгкае – дзяўчынка. Аб тым, што народзіцца хлопчык, сведчылі схіленне жывата жанчыны на правы бок, як уласцівы па моцы мужчыну, і хада з правай нагі[110].

Для мужчын даваліся істотныя парады, як паводзіць сябе з цяжарнай, якія актуальныя і цяпер. Нельга пры ёй згадваць ежу і стравы, якія немагчыма знайсці, бо гэта можа пашкодзіць плоду. Цяжарнай жанчыне, паколькі яна робіцца слабай з-за плода, раілася даваць ежу, якую яна патрабуе. Наяўнасць крываністых выдзяленняў падчас цяжарнасці азначала, што плод пашкоджаны[111]. Для мужчыны было вельмі важна даведацца, цнатлівая паненка ці не. Вызначалася гэта па колеры мачы[112]. Толькі як гэта жаніх рэалізоўваў на практыцы?

Пэўныя парады з гэтага старадруку, вядома, былі слушныя, але тлумачэнне біялагічных працэсаў было далёкае ад рэчаіснасці. Тым не менш з'яўленне такой кнігі азначала, што ў грамадстве Рэчы Паспалітай былі запатрабаваны веды пра стасункі паміж мужчынам і жанчынай не толькі рэлігійныя, але і медыцынскія.

---

[106] K. Pliniusza Starszego. S. 49; Zagożdżon J. Wstęp // O sekretach białogłowskich / Oprac. J. Kroczak, J. Zagożdżon. Wrocław, 2012. S. 21–24.

[107] Albertus Magnus. O sekretach białogłowskich. S. 26–31, 39, 40.

[108] Ibid. S. 42, 45–46, 48, 148–149.

[109] Bastl B. Austrian Aristocratic Rituals in Pregnancy, Childbirth and Baptism from 15th – 18th Centuries // Paper held at the 16th Century Studies Conference at St. Louis, Missouri, 9–12 December 1993.

[110] Albertus Magnus. O sekretach białogłowskich. S. 174–183.

[111] Ibid. S. 202–206.

[112] Ibid. S. 184–186.

Цяжарнасць лічылася асобым станам жанчыны, якому варта было аддаваць увагу для палягчэння стану ў гэты перыяд. Народны лячэбнік (XVII ст.) пры слабасці цяжарным прапаноўваў ужываць канаплянае малако, а калі слабасць узнікала часта – адвар мяты. Пры коліках у жываце рэкамендавалася пакласці на яго тканіну, змочаную ў цёплай вадзе. Каб прыспешыць роды, давалі адвары травы "сабачкі", спарынні. Для палёгкі пры родах можна было даць кілішак гарэлкі, а пры цяжкіх родах – спарынню. Пасля нараджэння дзіцяці жанчыну трэба было адразу весці ў лазню і мыць там тры дні, каб хутчэй выйшаў паслед. Калі не дапамагала, то давалі адвары з траў. Увогуле ў большасці жаночых захворванняў (крывацёкі, белі і інш.) рэкамендаваліся травы. Лячэбнік утрымлівае цэлы пералік сродкаў жывёльнага і расліннага паходжання, якія можна выкарыстаць для лячэння розных хвароб. Міндаль ужываўся для змяншэння рэзі ў парадзіхі і немаўляці, каб гнаць кроў падчас менструацыі. Шалфей рэкамендаваўся пасля абортаў, чарнобыль – для супакаення маціцы і выгнання мёртвага плода[113], грэчка – для змяншэння пухліны ў парадзіхі[114].

Траўнікі С. Фаліміжа, Г. Спечынскага і М. Сенніка ўтрымлівалі амаль аднолькавы па змесце і малюнках раздзел па акушэрстве. Узяты ён быў з працы Яўхарыўса Росліна, якая першы раз была надрукавана ў 1513 г. Яна набыла вялікую папулярнасць і была перакладзена на розныя мовы. Але ў яе аснову ляглі працы "Гінекалогія" ("Gynaecia", прыпісваецца Muscio) і "Практыка" Міхаэля Саванаролы ("Practica", Michele Savonarola)[115]. Напрыклад, ілюстрацыі са становішчам плода вельмі блізкія да працы Мусціа. Раздзел па акушэрстве з траўнікаў змяшчае малюнкі, якія ідэнтычны малюнкам з працы Росліна. Ён апісвае ў дэталях працэс родаў: ад знакаў аб яго пачатку да догляду дзіцяці ў першыя хвіліны жыцця. Даваліся рэкамендацыі па хуткіх родах і дапамозе жанчыне. Для родаў прызначалася спецыяльнае крэсла, падобнае да стульчака, з дзіркай для выхаду плода. Згаданыя выпадкі цяжкіх родаў. Сярод іх адзначалася нараджэнне блізнят, мёртвы плод, выхад плода нагамі і інш. У ілюстрацыях паказаны адпаведнае і неадпаведнае становішча плода пры выхадзе з маціцы і ўплыў гэтага на працэс родаў. Асобная ўвага аддавалася прыняццю родаў пры нараджэнні дваіх дзяцей[116].

Акушэрства і гінекалогія былі значна больш распрацаваны ў замежнай навуцы. Да іх звярталіся Леанарда да Вінчы, Якуб Руэф, Конрад Геснэр і інш.[117] Вылучаецца праца Я. Руэфа, якая ўпершыню надрукавана ў 1554 г., а пасля шмат

---

[113] У беларускім лячэбніку XVII ст. чарнобыль рэкамендаваўся пры цяжкіх родах. Редкие источники. С. 28–29.

[114] Романов Е. Из белорусской народной медицины // Могилёвская старина: сб. ст. "Могилёвских губернских ведомостей" 1902–1903 гг. / Под ред. Е. Романова. Могилёв, 1903. Вып. 3. С. 108, 110, 112, 120–121, 123.

[115] Rösslin E. Der Swangern Frauwen und Hebammen Rosegarten. Strasbourg; Hagenau, 1513; Green M. N. The Sources of Eucharius Rösslin's 'Rosegarden for Pregnant Women and Midwives' (1513) // Medical History. 2009. № 53 (2). P. 167–192.

[116] Falimirz S. O ziołach i o moczy ich. Kraków, 1534. S. 14v–37 (нумарацыя кожнай часткі асобная); Spiczyński H. O Ziolach tutecznych y zamorskich. S. 173–186; Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 441–466.

[117] Needham J. A History of Embryology. New York, 1959. P. 96–223.

разоў была перавыдадзена і перакладзена на англійскую мову. Кніга са шматлікімі ілюстрацыямі прысвячалася асаблівасцям жаночага арганізма, родам, цяжарнасці[118].

Роды для жанчыны – гэта цяжкая і небяспечная сітуацыя. Шмат што залежала ад дасведчанасці павітухі і проста ўдачы. Непасрэдную небяспеку стваралі неадпаведнае становішча плода, нараджэнне дваіх і болей дзяцей, мёртвы плод. Цяжкія і доўгія роды маглі прывесці да вялікай страты крыві і да смяротнага выніку. Занясенне інфекцыі таксама пагражала жыццю жанчыны. Тэкля Валовічаўна, жонка маршалка ВКЛ Аляксандра Людвіка Радзівіла, памерла адразу пасля нараджэння дзіцяці (1637)[119]. Мелася практыка напісання тастаментаў перад родамі. Так, навагарадская шляхцянка Гальшка Валянцінаўна Высоцкая, жонка Станіслава Казіноўскага, склала тастамент у 1630 г. У якасці прычыны яна адзначыла, што "ў маладым узросце, але будучы цяжарнай знаходзіцца бліжэй да смерці, чым да жыцця"[120].

Звычайна роды прымалі павітухі. Пра выпадак правядзення кесарава сячэння паходзяць звесткі з 1763 г. Яго правёў Я. Мілер. Спецыялізаваныя школы для акушэрак былі адчынены ў Семятычах Ганнай Ябланоўскай (1764) і ў Гародні (другая палова XVIII ст.) Антоніем Тызенгаўзам. Аднак у Гародні ў працэсе навучання ўзніклі праблемы праз тое, што ў школу набралі жанчын, якія не ўмелі чытаць[121].

Медыцынская навука ў ВКЛ развівалася ў рэчышчы еўрапейскай навукі. Гэтаму спрыяла адукацыя за мяжой, пераклад медыцынскіх твораў, магчымасць набыць арыгінальныя кнігі. Якасць догляду цела цалкам залежала ад саслоўнай прыналежнасці і ад заможнасці. Здароўе мела важнае значэнне, таму лекары, цырульнікі і знахары былі запатрабаваны. Вучоныя і лекары былі мужчынамі, таму анатомія мужчынскага цела была распрацавана лепш. Жаночае цела, фізіялагічныя працэсы ў ім былі таямніцай. Зачацце дзяцей, цяжарнасць і роды прымушалі вывучаць спецыфіку жаночага арганізма. У параўнанні з Сярэднявеччам Рэнесанс дасягнуў значных поспехаў. Але навуцы і гэтай галіне яшчэ было куды развівацца.

Медыцынскі догляд цела быў заснаваны на замежным і народным вопыце. Ён быў неабходны пры хваробах, цяжарнасці, родах. Акрамя таго, парады медыкаў і вучоных карысталіся папулярнасцю для забеспячэння здаровага ладу жыцця.

---

[118] Rueff J. De conceptu et generatione hominis... Francoforti ad Maenum, 1580.

[119] Pamiętniki Albrychta Stanisława Radziwiłła. S. 339.

[120] Гальшка Валянцінаўна Высоцкая была каталічкай, прасіла пахаваць цела ў бернардынскім касцёле ў Нясвіжы. Маёмасць размеркавала паміж мужам, дачкой і будучым нашчадкам. НГАБ, ф. 694, воп. 1, спр. 201, арк. 1 – 1 адв., 5.

[121] Грицкевич В. П. С факелом Гиппократа. С. 79–82, 96–97; AGAD, Archiwum Tyzenhauzów, sygn. 25/84, k. 2v–3.

# 7. Цыкл жыцця грэшнага цела і догляд яго

Жыццё залежала ад таго, у якой абалонцы яно з'явілася: мужчынскай ці жаночай. Гэта вызначала біялагічнае прызначэнне асобы. Паводле хрысціянскага вучэння цела напоўнена грахом па самой прыродзе і сутнасці ад самага пачатку, ужо з нараджэння. Тастаменты шляхты і мяшчан пры распараджэнні аб пахаванні інакш як грэшным цела не называлі, яно прыйшло з зямлі і павінна было туды вярнуцца. Душа вызвалялася ад палону, і існавала няпэўная надзея, што яна трапляла пад апеку Бога і святых.

Цела для біялагічнага існавання заўсёды нечага патрабуе: ежы, вопраткі, задавальнення, лячэння... Усё жыццё прыстасавана для забеспячэння яго патрэбаў. Цела адразу з нараджэння вызначае лад жыцця, абавязкі і патрабаванні. Мужчынскае цела, у залежнасці ад саслоўя, абавязана выконваць цяжкую працу, ваяваць, рабіць дзяцей, а жаночае цела – гатаваць, прыбіраць, нараджаць, даглядаць дзяцей. У феадальным грамадстве немагчыма было не выконваць гендэрныя ролі, прызначаныя целам. Асоба трапляла ў палон, абумоўлены яе цялеснай прыналежнасцю. Да гэтага яшчэ дадаваўся крытэрый узросту, які таксама вызначаў правы і абавязкі. Паслабленні рабіліся праз хваробу ці недзеяздольнасць, але яны ставілі ў залежны стан ад асяроддзя.

Хрысціянства прынесла істотную жыццёвую праблему ў грамадскую думку: барацьбу духу з целам. Яна актуалізавалася пры набліжэнні Контррэфармацыі. Мецэнацтва становіцца не толькі сродкам для падтрымання храмаў, але і расплатай за грахі, якія здзяйсняла цела. Найбольш яскрава перавага духоўнага над цялесным бачна ў тастаментах. Шляхта і мяшчане ў меру сваіх фінансавых магчымасцей перад смерцю рабілі запісы на карысць цэркваў і касцёлаў[1], каб атрымаць выратаванне душы.

---

[1] Запісы на карысць храмаў сустракаюцца ў розных тастаментах. Пра гэта пісалася ў розных працах: Сліж Н., Гардзееў М. Шляхецкія тэстаменты. С. 90–110; Pisanko-Borowik A. Dyspozycje pogrzebowe mieszczan grodzieńskich w świetle ich testamentów (XVII–XVIII w.) // Małe Miasta. Religie / Red. M. Zemło. Lublin; Supraśl, 2007. S. 143–168; Sliž N. Testamenty mieszczan grodzieńskich w pierwszej połowie XVII w. // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. 2013. T. 61. Z. 2. S. 307–308; Zielecka-Mikołajczyk W. Prawosławni i unici w Rzeczpospolitej XVI–XVIII wieku wobec życia i śmierci w świetle testamentów. Warszawa, 2012. S. 70–163 і інш.

У 38-м раздзеле Катэхізіса Лаўрэнція Зізанія, які прысвечаны чалавеку, супрацьпастаўляюцца душа і цела. Перавага аддаецца душы і яе каштоўнасці. Звяртаецца ўвага на тое, каб цела нічым душу не засмуціла. Адзначаецца, што душа падпарадкоўваецца Богу, а цела "похаці", а сам чалавек – раб цялеснай жарсці[2].

Праблема не абышла нават мастацкую літаратуру. Пра барацьбу паміж духоўным і цялесным пісаў Мацей Стрыйкоўскі:

...Ciało naciągnie do roskoszy brzytkich,
A dusza do cnot swiętych pędzi wszytkich...[3]

У вершы Станіслава Серафіна Ягадынскага іранічна адзначаецца пра большае дбанне людзей пра цялесныя патрэбы, а не пра душу:

*Ciało*
Nie wiem y to Boga iakoby być miało?
O Dusze nic nie dbamy, a wszytko o ciało[4].

Цела, як і сексуальнасць, мужчыне ці жанчыне цалкам не належала. Яно заўсёды знаходзілася пад кантролем асяроддзя, сям'і, рэлігіі, улады[5]. А цела вялікага князя літоўскага і польскага караля, па сутнасці, было больш грамадскім, чым прыватным. Інтымная сфера ўладкоўвалася ў залежнасці ад інтарэсаў краіны: шлюб заключаўся для патрэбы палітыкі. Невялікая прыватная сексуальная прастора захоўвалася пры выбары каханкі пры ўмове, што яе не падклалі ўдала для маніпулявання манархам.

Важным жыццёвым крокам, які цалкам мяняў прыналежнасць цела, быў шлюб. Згодна з Пісаннем муж адыходзіў ад бацькоў і "прыляпляўся да жонкі, і станавіліся яны адной плоццю". Гэта ідэя прапагандавалася як у кананічным праве, так і ў абрадах вянчання[6]. Па сутнасці, яна азначала ўзаемазалежнасць мужчыны і жанчыны адно ад другога. Пасля шлюбу яны ўспрымаліся ў грамадстве як пара, а не як асобна існуючыя людзі.

Аднак гэта канцэпцыя часам знаходзіла ў літаратуры адмоўны водгук:

*Ożenienie*
...Częścią bydź ciała nie chcą, ciała składanego,
Woła bydź całym Panem ciała swego.
Połowicą bydź ciała nie chcą niczyiego,
Y myślę mogąc nie chcą, myślę to dla czego...[7]

У феадальную эпоху "кошт" цела вызначаўся ў залежнасці ад саслоўя[8]. Пачынаючы ад Статута 1529 г. уводзілася дыферэнцыяцыя пры кампенсацыі за

2 Зизаний Л. Сия книга глаголемая Катихисис. 1627. С. 157–167.

3 Stryjkowski M. Goniec cnothy do prawych slachciczow. Kraków, 1574. S. 12v.

4 Jagodyński S. S. Dworzanki. Kraków, 1621. У старадруку няма нумарацыі старонак.

5 Matthews-Grico S. Ciało i seksualność. S. 153.

6 Падрабязней пра стаўленне хрысціянскіх канфесій да шлюбу ў ВКЛ гл.: Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 265–377.

7 Jagodyński S. S. Dworzanki. Kraków, 1621.

8 Гэты саслоўны падыход да вартасці людзей быў вядомы ў ВКЛ са Статута Яраслава, Рускай Праўды, візантыйскага і рымскага права.

збіццё і забойства ў залежнасці ад статусу. Пры гэтым за жанчыну сума была ў два разы большая. Раздзел 7 быў прысвечаны гвалтоўным нападам на шляхту. За забойства прызначалася выплата галоўшчыны 100 коп літоўскіх грошаў (арт. 28). У 11-м і 12-м раздзелах апісаны пакаранні за шкоду людзям іншых саслоўяў. Напрыклад, за забойства рамесніка прызначалася выплата 12 рублёў, а за збіццё – 3 (раздз. 11, арт. 2), за збіццё парабка палова капы літоўскіх грошаў, за яго жонку – капа (раздз. 11, арт. 4). Гэтыя раздзелы засталіся ў Статутах 1566 і 1588 г., аднак былі значна дапрацаваны (раздз. 11–13).

Акрамя таго, што шляхецкае цела было даражэйшае, шляхецтва ўтварыла цэлую канцэпцыю, якая абгрунтоўвала яго вышэйшы гатунак. Паходжанне, выхаванне, адукацыя, пасады, вайсковыя подзвігі, гербы, гістарычная памяць, слава рабілі шляхту асобным саслоўем. Яго прыродзе былі ўласцівы найлепшыя дабрадзейнасці і рысы, якія перадаваліся генетычна. Па сутнасці культывавалася ідэя, што прыстойным і шляхетным можна быць толькі паводле паходжання[9]. Такое перакананне існавала і ў набілітэце Заходняй Еўропы[10]. Гэта было звязана непасрэдна з фарміраваннем самаідэнтыфікацыі шляхецкага грамадства, якое адбывалася ў XVI ст. Разуменне і абгрунтаванне сваёй адметнасці былі неабходнымі элементамі гэтага працэсу. Прычым усе прапанаваныя ідэі былі разлічаны на шляхцічаў і ствараліся з арыентацыяй на іх. У агульнасаслоўнай канцэпцыі шляхецтва не было месца для шляхцянак, бо яны мелі іншае цела, якое не падыходзіла для рыцарскіх учынкаў, пасадаў і дзяржаўнага кіравання. Жанчыны згадваюцца толькі ў родавых гісторыях. У XVII ст. канцэпцыя існавала без істотных зменаў. Шляхта была ўжо сфарміраваным саслоўем са сваімі традыцыямі і культурай. У XVIII ст. адбываецца заняпад і дэградацыя створанай раней канструкцыі. Шляхецкае саслоўе становіцца галоўнай перашкодай у развіцці краіны і прыводзіць яе да падзелаў.

Мяшчанскае саслоўе хоць і было ў пэўнай ступені адукаванае, аднак не бавілася стварэннем уласнага канцэпту. Пра існаванне мяшчанскай самасвядомасці можна казаць у гарадах з магдэбургскім правам[11]. Зразумела, што праз адсутнасць адукацыі і магчымасцей сялянства не займалася абгрунтаваннем уласнай адметнасці. Функцыяй сялянскага цела было выкананне цяжкай сельскагаспадарчай працы. Шляхце трэба было апраўдаць сваё выключнае права на кіраванне краінай, у тым ліку і за кошт саслоўяў, якія стаялі на ніжэйшай прыступцы. Набілітэт лічыў, што іншыя саслоўі створаны для таго, каб яму служыць. Таму яны мелі значна меншую вартасць у параўнанні са шляхтай, адпаведным было і стаўленне да іх.

Цела праходзіла біялагічны цыкл існавання: дзяцінства, юнацтва, сталасць і старасць. Дзяцінства – гэта перыяд знаходжання пад доглядам. У ім важнае месца займалі выхаванне і адукацыя. Апошняя падзялялася на мужчынскую

[9] Stryjkowski M. Goniec cnothy; Wolan A. O wolności Rzeczypospolitey. S. 21–31.

[10] Дюамель К. Семейные стратегии и социальное воспроизводство. С. 180.

[11] Slizh N. Transformation of the burgher mentality: the case of Horodno (16th–17th centuries) // Crossroads from Rus' to... / Ed. R. Dymczyk, I. Krywoszeja, N. Morawiec. Vol. 2. Częstochowa; Humań; Poznań, 2015. P. 23–34.

і жаночую[12], а таксама на саслоўную. У шляхецкім асяроддзі хлопчыкаў рыхтавалі да палітычнай і вайсковай кар'еры, а дзяўчат да сямейнага жыцця. Для сям'і былі больш пажаданыя хлопчыкі, чым дзяўчынкі, бо яны давалі працяг роду. Хлопчыкаў з мяшчан вучылі рамяству ці гандлю, а з сялян – сельскай гаспадарцы. Дзяўчаты ў гэтых саслоўях практычна былі неадукаваныя[13]. Нават сярод мяшчанак рэдка сустракаліся пісьменныя.

Юнацтва па сутнасці ўводзіла ў дарослае жыццё. Гэта першы вопыт сур'ёзных абавязкаў у хлопчыкаў, а для дзяўчат – ранні шлюб (15–16 гадоў). Максімальная прыродная актыўнасць прыходзілася на перыяд ад 20 да 30 гадоў. Далей ужо колькасць хваробаў павялічвалася і пагаршала якасць жыцця.

Маладое цела знаходзілася ў найлепшай форме. Іншаземцы адзначалі моцны целасклад мужчын і прывабнасць жанчын, адзінае, што псавала – гэта п'янства[14]. Літвінаў і русінаў называлі моцнымі і адважнымі[15]. Мужчынскае і жаночае цела з маладосці выконвала выразна адметныя ролі. Маладых шляхцічаў ужо з 12 гадоў бралі ў вайсковыя выправы. Заканадаўства накладала абавязак выконваць вайсковую службу. Таму цела маладога мужчыны рыхтавалі да бітваў. Ён павінен быў валодаць зброяй, пераносіць цяжар паходнага жыцця. XVI і XVII стст. вызначыліся шэрагам войнаў. Падрыхтоўка да службы была заўсёды актуальнай. Аднак гэта не азначала, што ўся шляхта жадала несці вайсковыя выдаткі і трываць цяжар выпраў. Мешчаніну і селяніну таксама патрабавалася моцнае цела, каб вытрымаць вандроўкі, цяжкую працу і інш.

У мужчынскім целе найважнейшым органам, які паказваў адметнасць пола, лічыўся чэлес. Працаздольны орган быў праявай мужчынскай моцы. Са старажытнасці чэлес у многіх народаў звязваўся з урадлівасцю. Адпаведныя гэтым уяўленням традыцыі захаваліся ў нас нават у XIX ст. Мужчыны Віцебскай губерні пасля пасеву лёну распраналіся і голымі качаліся па зямлі. У Лепельскім раёне жанчыны прасілі мужоў, каб яны бегалі голымі па градках, а самі прыгаворвалі: "*Расціці агурочкі, як мужчынскія х..чкі*". На Палессі пры пасадцы гуркоў мужчына здымаў штаны і абягаў пасеяную зямлю, каб гуркі сталі такімі моцнымі і вялікімі, як яго чэлес. Акрамя ўрадлівасці чэлес у розных культурах сімвалізаваў моц, уладу, абарону. Але не кожная культура, як старажытнагрэчаская, стварае фалічны культ (некаторыя даследчыкі называюць такія ўяўленні нават фалакратыяй[16]). Хрысціянскай ідэалогіі не ўласціва было ўхваленне

---

[12] Сліж Н. Жаночае выхаванне і адукацыя ў шляхецкай сям'і ў XVI–XVII стст. // Женщина. Образование. Демократия: Материалы 1-й Международной междисциплинарной научно-практической конференции (11–12 декабря 1998 г.). Мінск, 1999. С. 98–100.

[13] Адукаваныя жанчыны сярод мяшчанак сустракаюцца ў Вільні. Яны самі падпісвалі дакументы. А ў Гародні часта адзначалася, што жанчыны неадукаваныя, таму за іх падпісвалі іншыя асобы. Значна больш адукаваных жанчын было пры манастырах і кляштарах. НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1–3; LVIA, f. 22, ap. 1, b. 1 (SA 5333); f. 23, ap. 1, b. 1 (SA 5096); Niedźwiedź J. Kultura literacka Wilna. S. 123–144.

[14] Одэрборн П. Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў. С. 167–189.

[15] Olaus Magnus. Historia de Gentibus Septentrionalibus. Romae, 1555. P. 629.

[16] Володина Т. Телесный низ в традиционных представлениях белорусов // Белорусский эротический фольклор / Изд. подг. Т. Володина, А. Федосик. Москва, 2006. С. 18; Кабакова Г. И. Антропология женского тела в славянской традиции. Москва, 2001. С. 228; Кон И. С. Мужское тело. С. 31–32, 112.

фалічных сімвалаў. Увогуле толькі пеніс Хрыста быў Боскім, а звычайны мужчынскі лічыўся дэманічным[17].

Рэнесанс істотным чынам мяняе стаўленне еўрапейцаў да мужчынскага агаленага цела, у тым ліку і да чэлеса. Яго не толькі можна было пабачыць у мастацкіх творах, ён стаў прадметам вывучэння медыкаў. Цікавіла не толькі яго структура, але і функцыянаванне. Леанарда да Вінчы пакінуў пасля сябе анатамічныя даследаванні і дакладныя замалёўкі чэлеса[18].

Пра важнасць мецъ чэлес і яечкі апавядаецца ў насмешлівым вершы, які прысвечаны назіральніку за еўнухамі ў гарэме султана. Ён быў напісаны ў 1792 г. пад ілюстрацыяй "*Kyslyr Aga albo na przełożony nad czarnymi eunuchami w Saraiu białogłowskim*". Невядомы аўтар выказвае еўнуху сваё шкадаванне аб невяртальнай страце мужчынскай адметнасці. Для культуры Рэчы Паспалітай незразумела, як можна ахвяраваць сваёй мужчынскасцю для такой службы:

Stoisz smutny jewnuchi z tak niepiękna cerą
Żal mi że się trapisz to twoją cholerą
Żełują cię o Kyslyr Aga! I tureckie żony
Niemasz kuśki i jajec zostałeś okpiony
Darmo tamiesz ręce y zżymasz się sam u sobie
Nikt nie przyprawi jajec, a ni kuśki tobie.
Roku 1792. Januar die 24 in saude descripta sunt carmine Kyslyr Aga[19].

У іншым асобніку "Манархіі Турэцкай", які цяпер захоўваецца ў Астрогу, таксама ёсць подпісы да ілюстрацый у выглядзе вершаў. Яны датуюцца XVII–XVIII стст., але іншыя па змесце[20].

Прыгожае цела жанчыны было яе капіталам на шлюбным рынку ці на рынку камерцыйнага сексу[21]. Яго ўзбуджальны фактар для мужчыны ўспрымаўся як дадзенасць, якой трэба было карыстацца для дасягнення сваіх мэтаў. Для мужчыны жаночае цела было жаданае і прывабнае, але фізіялогія яго існавання і прычыны адметнасці былі незразумелыя. У прадмове да твора "Фарбаванне" ("Barwiczka", 1605) адзначалася важнасць прыгажосці, бо непрывабным дзяўчатам шлях быў толькі ў манастыр, бо ў іх не было ні сяброў, ні каханкаў, ні жаніхоў. У самім тэксце праводзілася думка, што цнота, напэўна, гэта добра, але прыгажосць можа дабіцца вынікаў там, дзе прыстойнасць не здолее[22].

[17] Friedman D. Pan niepokorny. Kulturowa historia penisa / Przekł. I. Kolczyńska. Warszawa, 2003. S. 69.

[18] Friedman D. Pan niepokorny. S. 74–81; Noble D., DiFrancesco D., Zancani D. of semen. Published 20 August 2014. Рэжым доступу: http://rsnr.royalsocietypublishing.org/content/early/2014/08/14/rsnr.2014.0021.

[19] Monarchia turecka. S. 46.

[20] Позіховська С. Примірник «Монархії турецької» (1678 г.) П. Ріко в колекції Музею книги та друкарства м. Острог // Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання: матэрыялы і даклары III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (23–24 верасня 2015 г.) / Пад рэд. М. Нікалаева. Брэст, 2016. С. 89–97.

[21] Matthews-Grico S. Ciało i seksualność. S. 185.

[22] Gładkotwarski R. Barwiczka dla ozdoby twarzy Panienskiey. Wilno, 1605; Кавалёў С. Шматмоўная паэзія. С. 320–321. Аўтар твора падпісаўся псеўданімам "Гладкатварскі", сапраўднае імя аўтара невядомае.

Цела маладой жонкі мела абсалютную сексуальную прывабнасць і важнае значэнне ў шлюбных стратэгіях. У патрыярхальным грамадстве, як правіла, жаніх быў старэйшы за нявесту. Першы шлюб шляхцянак адбываўся ў юным узросце: Зафея Алелькавічаўна Слуцкая выйшла замуж ў 14 гадоў за Януша Радзівіла, Кацярына Трызнянка (1532–1571) – у 16 гадоў за Паўла Якаўлевіча Уніхоўскага (1515–1593), Ганна Сапяжанка (1603–1627) – у 15 гадоў за троцкага кашталяна Альбрэхта Уладзіслава Радзівіла (1589–1636) і інш.

Але значная розніца ва ўзросце паміж мужам і жонкай магла стаць тэмай для кпінаў. Маршалак ВКЛ Станіслаў Казімір Радзівіл ажаніўся з Марыяй Казімірай дэ Бетунэ ў сувязі з палітыкай каралеўскага двара. На момант шлюбу, у 1690 г., яму было 42 гады, а ёй – 13. Розніца паміж сужэнцамі складала 29 гадоў. Радзівіл памёр у гэтым жа годзе, не пакінуўшы нашчадкаў. У наступным годзе Марыя выйшла замуж за маршалка ВКЛ Аляксандра Паўла Сапегу[23]. Гэта гісторыя стала тэмай для верша:

*Na ożenienie Xcia Radziwiłł marszałka WXLo*
1. Straszna rzecz y muterna iakaś iedzie z wieku
Mieni się swiat y zmysły w człowieku
Kocha ieden pięknosci, rayskie jabłko przyzna
A nie wie że we wnątrz proch, smrod, mech, y perczyna.
2. Tak go obiectum miłe slepym uczyniło
Ze nie patrzy na koniec tylko na dzis miło
Xiąże marszałek wieki Xstwa Litewskiego
Bierze stary dziewczyne corkę Betoniego.
3. Dwor mu w tym dziewosłębił dworska polityka
Bez rady swoich ledwo wprawiła go w łyka
Cos tu xiąże przyiachał zbyc melancholiey
Dostałes mola wrocisz się w hypokondryey.
4. Jesli się z ciała że nisz francuskie to ciało
Będzie do kuchni mięsa gwałt potrzebowało
Jesli dla dworskiey łaski, wszak wiesz dworskie względy
Biorą, nie daią fortun, biorą za urzędy.
5. Jesli zas dla potomstwa niepewne to łoże
I wałach zrobi zrzebie gdy drygant pomoże
Prędzey tam francuz dopchnie nizli twoia siła
A ona po staremu zrodzi Radziwiła[24].

Пра перавагу маладога жаночага цела адзначалася ў народнай юрлівай песні:

Сыра ліпа пагарэла,
Мая жонка пастарэла.
Я старую замардую,
Вазьму сабе маладую[25].

[23] Nagielski M. Radziwiłł Stanisław Kazimierz // PSB. T. 30. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk; łódź, 1987. S. 369.

[24] Гэты і іншыя вершы ўваходзяць у склад рукапісу, які па запісах і падзеях можна датаваць 90-мі гадамі XVII ст. Зыходзячы з асаблівасцей твораў, можна казаць, што аўтар належаў да набілітэту Рэчы Паспалітай і добра ведаў жыццё тагачаснай шляхты. Рукапіс не ўтрымлівае нумарацыі старонак. ANK, ASang. 246.

[25] Federowski M. Lud białoruski. T. VI. Pieśni. Warszawa, 1960. S. 46.

Пра сексуальную непрывабнасць жанчыны, якая страціла сваю прыгажосць ва ўзросце, напісана на прыкладзе Ізабэлы Тарлоўны, жонкі земскага падскарбія ВКЛ Бенедыкта Паўла Сапегі. Яе раман прывёў да сепарацыі сужэнцаў у 80-х гг.[26]

*Podskarbina Litewska*
Była to pewne dama urodliwa
I w swych postępkach az iuz nazbyt zywa
Jakią ze wszytkich stron wierciec poczęto
Wszystkią z niey gładkosc do kata wychnęto
Protheusz nie tak w postaci odmienney
Jak ona chodzi w odmianie codzienney
Nikt o nię niedba ona chce kazdego
Niezna nieboga defekty swoiego[27].

Аднак калі жамойцкі кашталян Мікалай Нарушэвіч, якому было прыблізна 37 гадоў, сватаўся да юнай Кацярыны, дачкі полацкага ваяводы Мікалая Радзівіла, то ў адпаведнасці з этыкетам адзначаў яе адоранасць Богам, а не вонкавую прывабнасць: "... *panny woiewodzianki nowogrodzkiey Jey Mczi panny Katarzyny, ktora iest z wielka miar darami Bozskiemi y dzienosczіami panienskimi, z wielkiey pochwałą ... ludzie dobrych obdarzoną*". Яна знаходзілася ў апецы троцкага ваяводы Мікалая Крыштафа Радзівіла. Ёй магло быць прыкладна каля 18 гадоў, а можа і менш. Вяселле адбылося ў 1597 г. Пасля смерці Нарушэвіча (1603) Кацярына выйшла другі раз замуж за ўшпольскага старосту Пятра Гарайскага[28]. Нарушэвіч на той час дасягнуў даволі высокага статусу ў грамадстве і мог прэтэндаваць на шлюб з шляхцянкай з роду Радзівілаў. Тады ён быў удаўцом, меў дзяцей і для другога шлюбу шукаў не ўдаву, а юную паненку.

Шлюб з жанчынай, старэйшай за мужа, успрымаўся негатыўна. Канцлер ВКЛ Леў Сапега адгаворваў будучага польнага гетмана ВКЛ Крыштафа Радзівіла жаніцца з удавой кароннага гетмана Яна Замойскага – Барбарай Тарноўскай (1606). Крыштафу было на той час 24 гады, а ёй мінула 40. Сапега раіў пра розніцу ва ўзросце запытаць у пана Сасніцкага, як ён брыдзіцца сваёй бабай і ўпадае ў грэх. Сапега лічыў, што жаніцца трэба з 14- ці 15-гадовай дзяўчынай, гэта значна лепш, чым з удавой. Маладая жонка дарасце да сталых гадоў, а старая маладой ужо ніколі не стане. Сапега звяртаў увагу Крыштафа на маладую Хадкевічаўну, якой на той час ужо было 13 гадоў, і на Ганну Кішчанку. Абедзве мелі добрае паходжанне[29]. Напэўна, гэты ліст паўплываў на рашэнне К. Радзівіла, бо ў гэтым жа годзе ён ажаніўся з Ганнай, дачкой Станіслава Кішкі і Альжбеты Сапяжанкі[30].

---

[26] Rachuba A. Sapieha Benedykt Paweł // PSB. T. 34/1. Zesz. 143. Warszawa; Wrocław; Kraków, 1993. S. 589.

[27] ANK, ASang. 246.

[28] Ліст Мікалая Нарушэвіча да троцкага ваяводы Мікалая Крыштафа Радзівіла, 26 красавіка 1597 г. AGAD, AR, dz. V, sygn. 10264, k. 14–16; Dzięgielewski J. Naruszewicz Mikołaj // PSB. T. 22. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1977. S. 570; Lulewicz H. Radziwiłł Mikołaj // PSB. T. 30. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, Łódź, 1987. S. 348.

[29] Archiwum domu Radziwiłłów. T. VIII. S. 235–237.

[30] Wisner H. Radziwiłł Krzysztof // PSB. T. 30. Wrocław; Warszawa; Kraków, Gdańsk; Łódź, 1987. S. 282.

Як бы ні апісвалі жаночую цноту, рысы характару і прыгажосць, але найбольшую прывабнасць для мужчын, згодна з паэтам Даніэлем Набароўскім, меў яе "смак усярэдзіне"[31]. Ф. Скарына з "Найвышэйшай песні Саламонавай" змясціў наступны верш, звязаны з жаночым нізам: "*Оградъ замкненый и кладезь запчатаеный*"[32]. Аднак у яго выданне не ўвайшоў наступны верш, які ёсць у Берасцейскай Бібліі 1563 г.: "*Szczery twoie iako sad pomagranatowy, z owocy słodkiemi z cyprysy y z spikanardy* (6:13)"[33]. Нагадаем, што тагачасная жаночая вопратка (сукня) закрывала нават пантофлі[34]. Калі мужчына не мог пабачыць цела, то для яго было шмат магчымасцей для фантазіі.

Акрамя таго, улонне было сімвалам жыцця, бо праз яго нараджаліся дзеці:

> Gdy iak drzewo dostałe z roskwitłym owocem
> Sliczny mąż z dziateczkami stoi radząc o czym,
> A przy nim oblubienica iak z latorostami
> Albo winna macica roskoszna z gronami
> Stoi iako oliwne drzewko uslachcona,
> Przed nią śliczne coreczki a za nimi ona[35].

У іншым вершы, які змешчаны ў альбоме Бернардоні і датуецца XVII ст., апісана ідэальная жанчына. У адным з радкоў яна практычна атаясамліваецца з улоннем. Такім чынам, аўтар падкрэслівае прызначэнне жанчыны нараджаць як мага болей дзяцей:

> Zona ma bydz wdzięczna, iak winna maczicza,
> Ochędozna, wstydliwa, pilna, robotnicza,
> Nieswarliwa, cnotliwa, piekna, ochedozna,
> Jednej mysli z małzonkiem, do tego nabozna[36].

У перакладным творы "Страшны Герой" Франчэска Андрэіні ўлонне багіні Венеры апісана як месца, дзе жыве Купідон. Прычым адзначаецца, што гэта найлепшае для яго месца: "*Miedzy nogami Venery Bogini ma swą rezydentią Cupido, ktory padszy na łono matki swey, pewnie sposobnieyszego na to nie mogłby znaleść mieysa nigdy*"[37]. Такім чынам падкрэсліваецца, што каханне, а тут хутчэй можна казаць пра жарсць, запальваецца ў мужчын не ад вачэй жанчыны, а менавіта ад улоння.

Але існавала вульгарнае акрэсленне для ўлоння. Так, на старонках судовых кніг сустракаюцца наступныя запісы: "*pizda to pienie*" (1565), "*wzova luba pizda*" (1717)[38]. Слова выкарыстоўвалася ў штодзённымі жыцці, а таксама ў вульгарных вершах.

[31] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 273.

[32] Біблія: Факс. Т. 3. С. 432.

[33] Biblia swięta. Brzest, 1563. S. 352.

[34] Бялявіна В., Ракава В. Жаночы касцюм на Беларусі. Мінск, 2007. С. 113–121.

[35] Kołakowski S. Wiek ludzki, albo Krotkie opisanie wieku człowieczego. [B. m.], 1584. S. 14; Кавалёў С. Шматмоўная паэзія. С. 300.

[36] Галенчанка Г. Невядомыя і малавядомыя помнікі. С. 335.

[37] Andreini F. Bohatyr Straszny. S. 24.

[38] НГАБ, ф. 1706, воп. 1, спр. 6, арк. 630; ф. 1730, воп. 1, спр. 5, арк. 1155.

Другое месца па прыцягальнасці належала грудзям[39]: "*Две перси твое яко два младых козелца близенцы серны, они же посутся посреде цветиемъ*"[40]. Іх прывабнасць жанчына магла падкрэсліць гарсэтам і дэкальтэ.

У ВКЛ жаночае цела не дэманізавалі, не было фанатычнага палявання на прыгажосць, як у Еўропе, якое прывяло да вельмі негатыўнага стаўлення да жанчын і палавой варожасці[41]. Спрыяў гэтаму таксама твор "Молат ведзьмаў". У ім сцвярджалася, што жанчыны больш схільныя да вядзьмарства, злыя, слабыя ў веры, ілжывыя, праз чары ўзбуджаюць каханне (д'ябальскую спакусу) і зацямняюць розум, перашкаджаюць нараджэнню дзяцей і інш. Усё самае дрэннае ў жыцці ад іх. Страх перад жанчынай у аўтараў твора быў такі, што нават існуе глава пра пазбаўленне чэлеса ведзьмамі[42]. Лічылася, што калі мужчына не можа панаваць над чэлесам, а ён паводзіць сябе як хоча пры жанчыне, то, зразумела, вінаватай у гэтым можа быць толькі яна.

У сталым узросце асноўны час людзей займалі клопат пра сям'ю і праца. З прычыны адсутнасці метрык аб нараджэнні і дакладных звестак пра ўзрост даволі складана вызначыць пераход да старасці, а таксама дакладныя межы старасці. Мікалай Радзівіл Сіротка лічыў, што пільнай увагі патрабуюць тыя, у каго сівізна ў галаве[43], бо такія людзі здольныя на розныя экстраардынарныя ўчынкі.

Старасць вызначалася як сумны перыяд, абцяжараны хваробамі. Найбольш небяспечным лічыўся ўзрост у 63 гады. Згодна з тагачаснымі астролагамі на яго прыходзіліся смерць ці вялікія няшчасці. Гэта адзначыў Мацей Ворбек-Летаў, калі дасягнуў такога ўзросту. Для яго гэта прароцтва аказалася праўдзівым, бо ўзрост трапіў на 1655 г., на час вайны з Маскоўскім княствам[44].

У гэты перыяд значна змяншалася сексуальная актыўнасць ці ўвогуле згасала: у мужчын пачыналася імпатэнцыя, а ў жанчын – клімакс. У каралеўскага ўрача Бернарда О'Конара выклікала здзіўленне, што 64-гадовая Кацярына Сабеская, жонка Міхаіла Казіміра Радзівіла і сястра манарха Яна III, мела менструацыю[45].

Былі асобы, якія вялі "баявую" старасць. Шляхціч Станіслаў Адахоўскі вызначаўся вялікай колькасцю злачынстваў, наездаў на шляхецкія, мяшчанскія, сялянскія двары, за што быў асуджаны на смяротнае пакаранне разам з сынам Станіславам. Апошняга вызвалілі ад рук ката, бо рабіў злачынства з прымусу бацькі (1655). Такі прысуд быў звязаны з ваенным часам[46].

У старасці патрабавалася апека з боку асяроддзя. Звычайна даглядалі дзеці. Калі іх не было, то ўсынаўлялі чужых ці аддавалі права апекі над сабой і маёмасцю. Пасля смерці мужа Сенькі Абрамовіча Фядоры Сцяпанаўне цяжка

[39] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 274–275.

[40] Біблія: Факс. Т. 3. С. 431.

[41] Делюмо Ж. Демоны в женском обличье // Делюмо Ж., Фрезер Д. Идентификация ужаса. Москва, 2009. С. 89–106.

[42] Шпренгер Я., Инститорис Г. Молот ведьм. Москва, 1992. С. 125–142, 224–229.

[43] Ліст Мікалая Радзівіла Сіроткі да Крыштафа Радзівіла, гетмана ВКЛ, 25 красавіка 1586 г. // Archiwum domu Radziwiłłów. T. VIII. S. 23

[44] Skarbnica pamięci: pamiętnik lekarza króla Władysława IV. S. 224.

[45] O'Connor B. Historia Polski. S. 576.

[46] Ibid. S. 225.

стала даглядаць маёнтак Сезенеўскае Глябоўскае (Гарадзенскі павет). У сувязі з узростам яна перадала права на маёнтак з умовай догляду яе да канца жыцця Сямёну Максімавічу Абрамовічу (1617)[47]. У даравальным запісе ад бацькоў, полацкіх мяшчан Войцеха Міхайлавіча і Фядоры Пракопаўны, на дом, агарод і рэзніцкую крамку дачка Зафея Войцехаўна і яе муж Сямён Андрэевіч абавязаліся даглядаць бацькоў да смерці (1650)[48]. З прычыны пакалечання рукі і нагі гарадзенскі мешчанін Станіслаў Прылуцкі са згоды падпробашча перайшоў жыць у шпіталь Св. Духа. Перад гэтым рашэннем ён размеркаваў маёмасць паміж трыма дочкамі (1667)[49].

Наяўнасць дзяцей не азначала дагледжаную старасць. Магілёўскі магістрат абавязаў Сеньку карміць і даглядаць бацьку Грышко Савініча. Апошні падаў скаргу на сына ў сувязі з яго нежаданнем дапамагаць яму ў старасці. У ёй адзначалася, што Грышко раней выдаткоўваў на сына і яго жонку (1588)[50]. Кепскае стаўленне дзяцей магло прымусіць сысці пад апеку храма і перадаць яму маёмасць. Гарадзенскі шляхціч Мікалай Рабей Гнойніцкі (?–1644) разам з другой жонкай Ганнай Мацееўнай Басяцкай запісаў Каложскай царкве ў Гародні маёнткі Гнойніцы і Стары Двор (Гарадзенскі павет) за права жыць пры манастыры ў старасці (1643). Прычынай такога рашэння стала дрэннае стаўленне да яго сына Юрыя, які зруйнаваў маёмасць, пазычаючы шмат грошай, і не жадаў даглядаць бацькоў, нават марыў іх голадам[51]. Часам дапамагалі чужыя людзі. Гарадзенскі радца Мікалай Кудаеўскі пакінуў сваю маёмасць лентвойту Ганусу Паўльсену, а таксама даручыў пахаваць яго цела ў гарадзенскім бернардынскім касцёле. Пляменнік Ян быў адхілены ад спадчыны з прычыны збіцця і руйнавання маёмасці (1665)[52]. Без дапамогі дзяцей на старасці гадоў засталася Ганна Рэйховічаўна. Пры хваробах ёй дапамагала толькі сястра Кацярына, на якую і была запісана ўся маёмасць (1655)[53].

Старасць значна абмяжоўвала магчымасці людзей незалежна ад стану. Падданыя ва ўзросце звярталіся да гаспадара для вызвалення ад абавязкаў. Так, падданы з Пагоста прасіў канюшага ВКЛ Багуслава Радзівіла вызваліць ад дворнай службы ў сувязі са старасцю і руйнаваннем гаспадаркі ад маскоўскага войска (1662)[54].

Суцяшэннем у старасці станавіліся ўнукі. Навагарадскі ваявода Фёдар Скумін Тышкевіч у лісце да канцлера ВКЛ Льва Сапегі ад 6 лютага 1605 г. з радасцю пісаў, што ў яго ўзросце жыццё пацешыла нараджэннем унука[55]. Нягледзячы

[47] Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, КП 9216.

[48] Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г. С. 164.

[49] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 145 – 145 адв.

[50] НГАБ, ф. 1817, воп. 1, спр. 3, арк. 40 адв. – 41.

[51] НГАБ у Гродне, ф. 128, воп. 1, спр. 12, арк. 1–5; Сліж Н. З гісторыі Прачысценскай царквы ў Гародні. XVI–XVIII ст. // Гарадзенскі палімпсест XII–XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 7 лістапада 2008 г.) / Пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. Гародня; Беласток, 2008. С. 76.

[52] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 116–117.

[53] Frick D. Wilnianie. S. 390–391.

[54] НГАБ, ф. 694, воп. 3, спр. 13, арк. 66.

[55] Сын нарадзіўся ў Януша Тышкевіча і Барбары Нарушэвічаўны. ANK, Archiwum Młynowskie Chodkiewiczów, sygn. AMCh 51, list nr 90.

на старасць, ён працягваў прымаць удзел у палітыцы і дзяржаўным кіраванні. А апошнія гады жамойцкага старосты Яраша Валовіча азмрочыла смерць дачкі Тэклі ў выніку родаў, судовы працэс з пляменнікам Яўстахіем Валовічам, праблемы са здароўем[56]. У 63 гады Мікалай Радзівіл Сіротка "адчуваў сябе напалову чалавекам": аслабеў зрок, страцілася добрае вымаўленне. Гэта стала прычынай адмовіцца ад пасады віленскага ваяводы ў 1612 г. У канцы 1613 г. ён быў часткова паралізаваны, а апошні год жыцця (1615) ужо не падымаўся з ложку[57].

Праблемы старасці пад розным вуглом падаваліся ў літаратуры:

*Baba*
Dla czego baba głosem y szepliwo gada?
Żeby nie słyszeć gdy się piasek z niey wykrada[58].

Два погляды на старасць ёсць у творы Яна Пратасовіча[59]. Твор паказвае не толькі праблемы старога чалавека, але і яго псіхалагічны стан у гэты перыяд. Даволі цяжка прыняць змены цела і разумець, што большая частка жыцця ўжо прайшла і смерць можа напаткаць у любы момант. Твор напісаны ў выглядзе дыялогу паміж двума старцамі, які паказвае два падыходы да старасці. Першы стары наракае: цела не слухаецца, знікае моц, пагаршаюцца зрок, слых, пасівелі валасы, людзі не хочуць кантактаваць – жыццё страціла сэнс. Падыход другога старца значна больш аптымістычны. Спасылаючыся на біблейскія прыклады, ён лічыць, што гэта натуральны стан, наканаваны Богам, які трэба прыняць[60]. Твор заканчваецца перамогай другога погляду і падзякай Богу:

Już mnieyszy słuch, mnieyszy smak w starości swej czuję,
Oczy mgliste, ledwo co omacnie najduję,
Po twarzy wszędzie zmarski jakoby zorane,
Włosy jako śnieg biały, różno rozczosane,
Na czele mi się jakieś fałdy poczyniły,
Czerstwość ciała i gładkość już mię odstąpiły.
Głowa mi sie kołysze, jakby się dziwuyąc,
A takim odmiennościam swoim przypatrując;
Zęby co do jednego wszystkie wypróchniały,
Tylko dziąsła nikczemne i słabe zostały,
Szyją mi się z ciężkością przychodzi obrócić,
Aż się wszystek jako wilk sam muszę nawrócić.
Nos wyschły i nadzwyczay zstał się zaostrzony,
Nawet od wszystkich sił swych jestem opuszczony...

---

[56] Сліж Н. Гарадзенскія падворкі ў XVII ст. // Гарадзенскі палімпсест 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры, XVI–XX стст. / Пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. Мінск, 2011. С. 227–228; Сліж Н. Гісторыя роду Валовічаў. С. 165.

[57] Archiwum domu Radziwiłłów. T. VIII. S. XXII, 54; Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka. S. 318.

[58] Jagodyński S. S. Dworzanki. Kraków, 1621.

[59] Зварот да тэмы ўзросту і цыклу жыцця быў у творах іншых аўтараў. Напрыклад, польскі паэт Station Станіслаў Кулакоўскі апісаў паводзіны асобы ў залежнасці ад узросту і палавой прыналежнасці: у дзяцінстве трэба вучыцца, у маладосці закладаць сям'ю, а ў старасці перадаваць вопыт маладым. Kołakowski S. Wiek ludzki; Кавалёў С. Шматмоўная паэзія. С. 282–302.

[60] Кавалёў С. Шматмоўная паэзія. С. 309–311.

...Taka jest dostoyeństwem i drogą koroną;
Znak tedy łaski Bożej, kto nawiedzon oną.
Więc iż są starzy ludzie więcej doskonali
W mądrości anižli co w wieku niedostali...[61]

Розніца паміж маладосцю і старасцю падкрэслівалася ў народнай песні:

А старому хлеб аўсяны,
Маладому пытляваны;
А старому хлеба лусту,
Маладому дзеўку тлусту[62].

Старасць была апошняй мяжой перад смерцю. Цела паступова згасала, гублялася здароўе, абмяжоўвалася дзеяздольнасць. Часам хвароба даводзіла да ляжачага стану ці да такіх пакут, што людзі прасілі смерці[63].

Многім хацелася мець спакойную і дагледжаную старасць, аднак жыццё гэта нікому не гарантавала. Праблемы ад сваякоў і дзяцей атрымлівалі людзі незалежна ад статусу і заможнасці. У гэты перыяд шмат што залежала ад сям'і, бо патрабавалася апека і клопат. Агульна прынятыя традыцыі патрыярхальнага грамадства вымагалі павагі і шанавання да людзей ва ўзросце. Шанец атрымаць догляд мелі ўладальнікі хоць нейкай маёмасці, бо, як правіла, хто даглядаў, той і атрымліваў усю спадчыну або яе большую частку.

Смерць была жахлівая і раптоўная, прыходзіла "як таць у начы", а цела станавілася "смраднае" і "тленнае"[64]. Смерць заўсёды была побач і не шкадавала нікога незалежна ад узросту і статусу. Гэта яскрава паказваюць абразы накшталт "*Танец смерці*"[65]. Адзін з такіх знаходзіцца ў гарадзенскім брыгіцкім касцёле. Ён створаны прыблізна ў канцы XVII – пачатку XVIII ст. Для перыяду барока ідэя "*memento mori*" ("памятай пра смерць") стала неад'емным элементам светапогляду. Пра смерць трэба было заўсёды памятаць і быць да яе прыгатаваным[66]. Людзі сапраўды думалі пра апошнюю мяжу і нават прадчувалі, складалі тастаменты незадоўга да скону[67].

Аднак смерць не азначала поўнае скančэнне існавання цела. Яно мела генетычны працяг у нашчадках, якія былі падобныя да сваіх бацькоў і продкаў. Гэта мела істотнае значэнне для эліты, якая лічыла, што найлепшыя рысы перадаюцца з пакалення ў пакаленне[68].

[61] Protasowicz J. Konterfekt człowieka starego. Wilno, 1597. Старадрук не мае старонак.

[62] Federowski M. Lud białoruski. T. VI. S. 51.

[63] Сліж Н. "Збор знакамітых цудаў і ласкаў..." С. 175–176.

[64] Выразы паходзяць з тастамента падскарбія ВКЛ Івана Гарнастая (1555). Сліж Н. Сям'я Івана Гарнастая, падскарбія ВКЛ // Беларускі гістарычны зборнік. 2012. № 38. С. 16, 30.

[65] Танец смерці – еўрапейскі сюжэт, які паказваў, што кожнаму / кожнай наканавана памерці незалежна ад сацыяльнага статусу. Падрабязней пра гэта гл.: Sliž N. Obraz Taniec śmierci w Grodnie jako źródło wizualne i literackie // Zeszyty Historyczne. Prace Naukowe Akademii im. Jana Długosza. T. XIV. Częstochowa, 2015. S. 27–50.

[66] Drużbicki K. Nauka o przygotowaniu się do świątobliwej śmierci. Kraków, 1669. S. 20–61, 132–176.

[67] Sliž N. Testamenty mieszczan grodzieńskich. S. 305–316.

[68] Слиж Н. Историческая память о Ливонской войне. С. 365–380.

Жыццё мужчыны і жанчыны залежала ад біялагічнага цыклу існавання цела. Узрост непасрэдным чынам уплываў на статус, правы і абавязкі. Найвышэйшы перыяд актыўнасці прыходзіўся на юнацтва і сталасць, а ў дзяцінстве і старасці была патрэбная апека. Гэту дадзенасць неабходна было прыняць і жыць з гэтым да апошняй хвіліны.

*Асабістая гігіена*. Мужчынскае і жаночае цела патрабавала догляду. У Вялікім Княстве Літоўскім для асобаў усіх саслоўяў важнае значэнне мела лазня. Дзякуючы ёй асабістая гігіена ў нас была развіта лепш, чым у Заходняй Еўропе. Праўда, каталіцкая царква ставілася тады да мыцця негатыўна і забараняла яго, ды і праваслаўныя іерархі ставіліся да частага хаджэння ў лазню не вельмі прыхільна, бо лічылі, што гэта стварае ўмовы для спакусы.

Тым не менш вялікія князі літоўскія лазняй карысталіся. Пра гэта вядома, напрыклад, хоць бы з эпізоду з забойствам князя Трайдзеня[69]. Лазні былі і ў шляхецкіх маёнтках. Так, у судовай справе 1522 г. паміж Янам Юр’евічам Глябовічам і Хоцянам Шэмбелем згадваецца, што ў Глябовіча былі лазні на рацэ Даўспуда, якія зруйнаваў Шэмбель[70]. Пра наяўнасць такіх будынкаў згадваецца і ў інвентарах Астрожчыцаў (1556)[71], Русоты (1556 і 1581), Здзяцеля (1580), Цяпіна (1591), Дзяксян (1596), Відзішак (1596)[72], Холчла (1593)[73] і інш. Звычайна лазня будавалася каля ракі ці каля возера, каб было зручней прыносіць ваду. Так, у Платэльскім замку ў 1585 г. яна знаходзілася на беразе возера, мела сенцы і была пакрыта дранкай[74].

Часам у дакументах сустракаецца апісанне будынкаў. У Талочыне ў 1564 г. лазня выглядала так: *“Лазня из ганкомъ из дверми у тои лазни кадка при тои лазни светлица с печю из дверми из защепкаи из лавами и окон 3. Межи тым сенми коморка з неи погребная”*[75]. Пры апісанні маёнтка Гайцюнішкі ў 1570 г. згадвалася, што пры другім доме насупраць святліцы знаходзілася гліняная лазня, якая патрабавала рамонту. Унутры яе былі чорная простая печ, на ёй насціл, а каля сцен – 3 лавы[76]. У маёнтку Жаймены Жамойцкага староства ў 1582 г. у лазні сярод іншага знаходзілася ванна[77]. У лазні ў Іўі Лідскага павета ў 1598 г. унутры была печка з паліванай кафляй і кацёл, дзве нізкія лавы і месца для мыцця. Падлога была пакрытая дошкамі. Перад лазняй знаходзіліся сенцы, а ўсе дзверы і аканіцы былі на завесах[78].

---

[69] ПСРЛ. Т. 32. С. 32–33; ПСРЛ. Т. 35. С. 94.

[70] Риб. Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. Петербург, 1903. С. 1088.

[71] Гл. падрабязней: Сліж Н. Астрожчыцкі замак у сярэдзіне XVI ст. // Архіварыус. 2010. Вып. 8. С. 121–129.

[72] АВАК. Т. 14. Вильна, 1888. С. 21, 201, 228, 411, 511, 540.

[73] Siedziby Kiszków i Radziwiłłow na Białorusi w XVI–XVIII wieku. Opisy z zasobu Archiwum Głównego Akt Dawnych / Oprac. J. Zawadski. Warszawa, 2002. S. 25.

[74] АВАК. Т. 14. Вильна, 1888. С. 298.

[75] AGAD, Archiwum Potockich z Radzynia, sygn. 295, k. 425–426.

[76] Ibid. AR, dz. X, sygn. 111, k. 24–47.

[77] АВАК. Т. 14. Вильна, 1888. С. 259.

[78] Siedziby Kiszków i Radziwiłłow. S. 51.

У горадзе лазні былі грамадскія і прыватныя. Напрыклад, паводле прывілеяў на магдэбургскае права (Гародні 1496 г.[79], Менску 1499 г.[80] і інш.) дазвалялася пабудаваць грамадскую лазню і браць з яе прыбыткі ў гарадскі скарб. Існавала асобная прафесія – лазнік, якая не адносілася да прэстыжных. Статуты цырульнікаў людзям гэтай прафесіі забаранялі займацца галеннем і стрыжкай[81]. Уключэнне такога артыкула азначала, што лазнікі таемна і яўна ўмешваліся ў справы цырульнікаў. Што да прыватных лазняў, то на гарадскіх падворках, у адрозненне ад маёнткаў, яны былі не заўсёды[82]. Пры гэтым будаванне прыватных лазняў у гарадах абмяжоўвалася. Так, у Віцебску ў 1530 г. было забаронена іх трымаць у Верхнім і Ніжнім замках[83]. У сувязі з правядзеннем кожнага трэцяга сойма ў Гародні ў канстытуцыі сойма 1677 г. была прынята пастанова вынесці лазні на берагі рэк Нёман і Гараднiца[84].

У Вільні грамадскія лазні знаходзіліся ў розных месцах: на Зарэччы, у замку, на вуліцы ад Брамы Субач да Саф'янікаў (належала шпіталю Прачысценскай царквы), каля шпіталя Св. Спаса. У лазню людзі хадзілі самі ці з сябрамі. Сярод іншага яна часам рабілася і месцам злачынства: тут чалавека маглі абакрасці ці пабіць[85]. Акрамя таго, на гарадскіх падворках Вільні будавалі прыватныя лазні[86].

Лазню мелі мяшчане ў малых гарадах. Напрыклад, у Мерачы яна згадваецца на падворках Якуба Шымковіча (1599), Сымона Гарбеля (1600), Андрэя Вайткевіча (1600), Юрыя Татаровіча (1603), бурмістра Адама Кракініча (1603), Ядзі Гітароўны (1612), Крыштафа Пятровіча Млынарчыка (1613), Пятра Ёневіча (1617)[87].

Лазня была не толькі для мыцця, але і для лячэння хвароб. Аб гэтым згадваецца ў скарзе Дароты Крыжаноўскай, зафіксаванай у Мерацкім магістраце (1609)[88]. А ў жартаўлівай інтэрмедыі "Чорт і яго вучні, мужык і жыд" (XVII ст.) былі наступныя радкі:

> *Rusticus*: Dobryi ia cyrulnik, umeiu leczyci;
> Wiedaiu iak lekarstwa dobraho zažyci.
> Ia ieho zlecze zaraz aharodnym zielam,
> Wyparu czorta w łazni maładzieńkim chmielam[89].

[79] АВАК. Т. 7. Акты Городненского гродского суда. Вильна, 1874. С. 59–61.

[80] Вішнеўскі А. Ф., Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах: вучэбны дапаможнік. Мінск, 1998. С. 99.

[81] Беларускі архіў. Т. 3. С. 148–155; НГАБ, КМФ-18, спр. 111, арк. 640 адв. – 648; спр. 123, арк. 255–256.

[82] Падрабязней гл.: Сліж Н. Гарадзенскія падворкі ў XVII ст. С. 222–254.

[83] Беларускі архіў. Т. 2. Літоўская Метрыка (XV–XVI стст.). Менск, 1928. С. 10.

[84] Volumina Legum. T. 5. Petersburg, 1859. S. 254, 305–306, 399–400.

[85] АВАК. Т. 20. Акты, касающиеся города Вильны. Вильна, 1893. С. 69–70, 280, 302, 478; Frick D. Wilnianie. S. 489–490, 495; XVII a. Pradžios lietuvos vietovių istoriniai šaltiniai / Parengė D. Vilimas. Vilnius, 2014. P. 34.

[86] Frick D. Wilnianie. S. 573; Сліж Н. Гарадзенскія падворкі ў XVII ст. С. 224.

[87] Lietuvos magdeburginių miestų privilegijos ir akta. T. 7: Merkinės miesto aktai (1598–1627) / Sudarė A. Baliulis. Vilnius, 2010. P. 111, 152, 164, 233, 251, 461, 504, 639.

[88] Ibid. P. 318.

[89] Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. С. 581.

Часам з-за лазні былі канфлікты. Менскі мешчанін Іван Барысовіч абвінавачваў лаўніка Фёдара Касперавіча Шышку ў парушэнні межаў і пабудове лазні на яго агародзе. Менскія ўраднікі агледзелі спрэчную тэрыторыю і прысудзілі Барысовічу прысягнуць, што гэта яго зямля. У выніку суседзі прыйшлі да пагаднення і лазню не прыйшлося разбіраць (1641)[90].

У Даніэля Набароўскага ёсць верш, прысвечаны лазні і голым вобразам у ёй:

*Na nagie obrazy w łaźni*
Co za nagie obrazy, jeśki mie kto spyta?
Łaźnia tu, łaźni nago myć się przyzwoita,
A jeśliby się komu niepocześnie zdały,
Wolno, jeżeli umie, przybrać temorały[91].

У лячэбніку XVII ст. не рэкамендавалася часта мыцца ў лазні, бо гэта прыводзіла да хвароб, звязаных з сістэмай стрававання. Для захавання здароўя лепш ісці ў лазню пасля чатырох гадзін па абедзе і не піць там вады. Знаходзіцца лепш менш за гадзіну. Доўгі побыт прыводзіў да немачы і ранняй старасці[92]. Для мыцця рук і твару выкарыстоўвалі наліўкі з рукамыйнікамі[93], а для абмывання цела – спецыяльныя збаны.

Мыліся ў нас мылам, якое рабілі для ўласных патрэбаў і яшчэ вывозілі ў іншыя краіны[94]. Напрыклад, гарадзенскія мяшчане экспартавалі сваё мыла ў Каралявец[95]. Таксама мыла было вядома ў Магілёве, Шклове, Копысі[96]. Запатрабаванасць у мыле была звязана з тым, што ў Еўропе мыццё стала медыцынскай неабходнасцю, але вытворчасць мыла была яшчэ не развіта[97].

Праваслаўе прадпісвала прытрымлівацца асабістай гігіены. Мыцца ў адпаведнасці з патрэбамі, але каб гэта не прыводзіла да сексуальнага ўзбуджэння. Забаранялася кранацца нямытымі рукамі палавых органаў[98].

Крыніцы не прыводзяць звесткі пра тое, як часта мыліся. Гэта была натуральная з'ява, не вартая згадвання. Цяжка дакладна сцвярджаць пра штодзённае мыццё, але пры наяўнасці лазні раз на тыдзень працэдура магла быць. У еўрапейскім грамадстве нават арыстакраты мелі праблемы з асабістай гігіенай. Пра англічанак пісалі, што чысціня і свежасць для іх не маюць істотнага значэння[99].

---

[90] LVIA, f. 610, ap. 3, b. 300.

[91] Naborowski D. Poezje wybrane. S. 52.

[92] Редкие источники по истории России. Древнерусский лечебник / Под ред. А. А. Новосельского, Л. Н. Пушкарева. Москва, 1977. С. 78.

[93] Згадваецца ў спісе рэчаў Марыі Жаслаўскай, гл.: AGAD, Archiwum Potockich z Radzynia, sygn. 391, k. 5.

[94] Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов. С. 211, 219.

[95] Сліж Н. Арганізацыя гандлю ў Горадні ў XVI – першай палове XVII стагоддзя // Гісторыя гандлю ў Беларусі (ад старажытнага часу да канца XX ст.): праблемы вывучэння і перспектывы даследавання. Матэрыялы І Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 14–16 лістапада 2013 г.). Мінск, 2014. С. 141–142.

[96] Грицкевич В. П. С факелом Гиппократа. С. 52.

[97] Бродель Ф. Материальная цивилизация, экономика и капитализм XV–XVIII вв. Т. 1. Структуры повседневности: возможное и невозможное. Москва, 1986. С. 141–143, 209–210, 382–383.

[98] Такі падыход вынікае са спавядальнага чыну. Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 292.

[99] Stone L. The Family, Sex, and Marriage. P. 485–486.

Пра асабістую гігіену таго часу ёсць і іншая інфармацыя. Яшчэ да XVI ст. людзі навучыліся вырабляць грабянцы для расчэсвання валасоў. Віленскі біскуп Павел Гальшанскі карыстаўся касцянымі грабянцамі, адзін з якіх быў густы (каштаваў 7 грошаў), а другі – рэдкі (1,5 гроша). Галіўся ён не самастойна, а запрашаў спецыяльнага чалавека, якому ў 1539 г. плаціў за працу 15 грошаў[100]. Галіліся і іншыя шляхцічы, пра што сведчыць, напрыклад, тое, што ў 1569 г. Іван Іванавіч Гарнастай меў набор для галення[101].

Аднак нягледзячы на ўсе намаганні захаваць чысціню, існавала праблема, з якой было цяжка змагацца, – блохі і вошы. Найбольш яны дакучалі ўначы. Аб гэтым нават пісаў у сваім вершы "Дабранач" Геранім Морштын. Траўнікі XVI ст. утрымлівалі парады па барацьбе з паразітамі. Блохі і вошы таксама былі сур'ёзнай праблемай для жыхароў Польшчы і Еўропы. Гэта адлюстравалася нават на тагачасных выявах і ў літаратуры. Але ў той час сустракаліся надзвычайныя падарункі з блохамі. Першая дачка Жыгімонта Старога і Боны Сфорцы атрымала ад баварскага князя маленькую скрыню, зробленую па-мастацку, з блыхой, прывязанай воласам да тонкага залатога ланцуга (1539). Яе даглядалі год[102].

Пра праблему з гігіенай у шляхты спявалася ў народнай песні:

Панічу, панічу,
Які ты харошы.
Жупан белы, жупан белы,
За каўнерам вошы[103].

У штодзённым жыцці літвіны імкнуліся пільнавацца асабістай гігіены. Для гэтага былі лазні грамадскія і прыватныя. У падарожжы бралі з сабой рукамыйнікі. У крыніцах ёсць, аднак, толькі фрагментарныя звесткі, бо гэта быў настолькі звычайны элемент штодзённасці, што часта заставаўся па-за ўвагай складальнікаў дакументаў. Догляд мужчынскага і жаночага цела адрозніваўся.

*Прывабнасць.* У Еўропе ў XVI ст. становяцца папулярнымі не толькі лячэбнікі, але і параднікі на тэму касметычнага догляду цела[104]. Адной з самых папулярных кніг, перакладзенай на лацінскую, нямецкую, іспанскую, французскую і польскую мовы, была кніга італьянскага гуманіста Джыралама Рушэлі "Сакрэты Алесіа П'емантэзэ" (1557)[105]. Марцін Сеннік пераклаў яе на польскую

[100] АС. Т. 7. Вильна, 1870. С. 20.

[101] Пра набор згадваецца ў рэестры рэчаў, складзеным пасля смерці І. Гарнастая. Гл.: AGAD, Archiwum Potockich z Radzynia, sygn. 391, k. 25.

[102] Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 280, 498–499; Podemontan A. Taiemnice; Wszystkim oboiey płsci... Supraśl, 1758. S. 16; Grześkowiak R. Amor curiosus. Studia o osobliwych tematach dawnej poezji erotycznej. Warszawa, 2013. S. 146–201.

[103] Federowski M. Lud białoruski. T. VI. S. 20.

[104] Eamon W. Science and the Secrets of Nature: Books of Secrets in Medieval and Early Modern Culture. Princeton, 1994.

[105] Джыралама Рушэлі (Girolamo Ruscelli) выдаў кнігу пад псеўданімам Алесіа П'емантэзэ (Alessio Piemontese або Alexius Pedemontanus). De' secreti del reuerendo donno Alessio Piemontese, prima parte, diuisa in sei libri. Venetia, 1555. Кніга неаднаразова перавыдавалася і карысталася папулярнасцю.

мову і змясціў у якасці дадатку да свайго траўніка[106]. Кніга не страціла сваёй актуальнасці нават у XVIII ст. і была передрукавана ў Супраслі[107].

У кнізе сярод іншага ўтрымліваліся парады з рэцэптамі, як даглядаць валасы (фарбаванне ў розныя колеры, лячэнне выпадзення, умацаванне, дэпіляцыя валасоў у непажаданых месцах), даглядаць твар (фарбаванне, выбельванне[108], пазбаўленне ад касметычных дэфектаў і зморшчын і інш.), выбельваць зубы, лячыць і даглядаць жаночыя грудзі падчас кармлення, умацоўваць агульны стан здароўя[109] [110].

Для прывабнасці цела важнае значэнне меў пах. Яго адносяць да самага моцнага сродку сексуальнага ўздзеяння. Аб гэтым згадвае нават "Найвышэйшая песня Саламовава": "*И запахъ мастей твоихъ надъ вси речи добровонный*"[111]. Пах цела моцна ўплывае на пачатак стасункаў[112]. Раілі для гэтага араматызаваныя гарэлкі, травы, мыла, парашкі, алеі. Араматызатары наносілі на цела, вопратку, пасцельную бялізну. Для найлепшага разнявольвання падчас масажу ўжываліся спецыяльныя араматызаваныя сродкі[113].

Жаданне мець не толькі здаровае, але і прывабнае цела было актуальна ва ўсе часы. Жанчыны ў Княстве фарбавалі свае твары, выкарыстоўвалі сваю прыгажосць для прыцягнення ўвагі мужчыны і ўтрымання яго каля сябе. Гэта катэгарычна асуджаў М. Літвін[114].

Жанчыны заўсёды хацелі выглядаць прывабнейшымі і маладзейшымі. У творы "Фарбаванне" ("Barwiczka", 1605) даваліся парады, як выкарыстоўваць касметыку для ўпрыгожвання твару (бялілы, румяны, сродкі ад прышчоў). Рэцэпты былі ўзяты і адвольна перакладзены з "Касметыкі" Авідыя[115]. Народная медыцына прапаноўвала экзатычныя сродкі для пазбаўлення вяснушак (настойка з бабовых кветак) і для густаты валасоў (газа, галубіны памёт)[116]. Для павелічэння саскоў у маскоўскім лячэбніку раілі грызці міндаль[117].

Прывабнасць цела мела важнае значэнне, ад яго часта залежаў лёс. Прыгажосць і здароўе адыгрывалі істотную ролю ў інтымным жыцці мужчыны і жанчыны, таму жаданне трымаць сябе ў добрай форме было заўсёды.

На ўмовы існавання цела ўплывала паходжанне. Зразумела, што заможныя і адукаваныя людзі мелі больш магчымасцей. На цяжкіх працах шляхта

---

[106] Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 489–628.

[107] Podemontan A. Taiemnice; Wszystkim oboiey płsci... Supraśl, 1737.

[108] Напрыклад, для выбельвання твару рэкамендавалася гарэлка.

[109] Рэкамендаваліся розныя рэцэпты з лімонам, арэхамі, цукрам, мёдам.

[110] Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 492–498, 503–518, 522, 535–537; Podemontan A. Taiemnice. S. 1–16, 30–59, 79–83, 125–131.

[111] Біблія: Факс. Т. 3. С. 431.

[112] Збигнев Л. С. Секс в культурах мира. Москва, 1991. С. 20.

[113] Siennik M. Herbarz... Kraków, 1568. S. 561–578.

[114] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 90.

[115] Gładkotwarski R. Barwiczka dla ozdoby twarzy Panienskiey. Wilno, 1605; Кавалёў С. Шматмоўная паэзія. С. 320–327.

[116] Романов Е. Из белорусской народной медицины. С. 108–109.

[117] Старинные памятники медицинской письменности XVI–XVII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 149.

выкарыстоўвала падданых, а не займалася імі сама. Гэта было істотнай палёгкай у жыцці ва ўмовах натуральнай гаспадаркі. Большасць насельніцтва харчаваннем і вопраткай забяспечвала сябе само, што адбірала практычна ўвесь час. Жыццё праходзіла ў штодзённай працы і прыводзіла да хуткага зношвання арганізма і ранняга старэння.

Адзначым, што ў падтрыманні цела ў добрым і прыгожым стане істотную ролю адыгрывала інфармаванасць пра асновы гігіены і фізіялогіі. Працэнт адукаванага насельніцтва быў невялікі, таму веды не мелі шырокага распаўсюджання.

Для тагачасных людзей, незалежна ад сацыяльнага статусу, біялагічны цыкл існавання цела не быў сакрэтам. Аднак кожны крок да апошняй мяжы, як і сама мяжа, выклікалі страх. Палохала набліжэнне старасці, змены ў арганізме, хваробы, смерць. Страх быў не толькі за сябе, але і за родных і блізкіх людзей. Часткова змірыцца і прыняць непазбежныя змены дапамагала рэлігія. Але справіцца з усім гэтым псіхалагічна было вельмі складана. Свет увесь час мяняецца, а праблемы і перажыванні застаюцца тыя самыя.

# 8. Практыка старабеларускага сексу

*Kto miłuie rzewnie, ten szaleie pewnie.*
*Kto miłuie powoli, tego głowa nie boli*[1].

Разглядаць практыку інтымных адносінаў магчыма найбольш прадуктыўна, калі аналізаваць асаблівасці цела і яго патрэбы ў сексе. Спачатку былі стасункі паміж мужчынам і жанчынай, а пасля з'явіліся іх інтэрпрэтацыі. Пры гэтым у даследаванні ўлічваецца мужчынскі і жаночы дуалізм сістэмы каштоўнасцей і падыходаў у сексе і канфлікт іх інтарэсаў, які вынікае з біялагічнай адметнасці[2]: патрэбы мужчыны і жанчыны ў інтымнай сферы жыцця адрозніваюцца. Акрамя таго, важную ролю ў практыцы сексу адыгрывалі сацыяльныя і культурныя ўмовы. Гэта адзначыў у сваіх даследаваннях амерыканскі навуковец Альфрэд Кінсі[3]. Жыццё ў феадальным грамадстве з рэлігійным дамінаваннем у культуры, поглядах і стэрэатыпах спрыяла абмежаванню мужчын і жанчын у праяўленні сваіх жаданняў, бо за гэта можна было атрымаць праблемы не толькі ў храме, але і ў судзе. Гэта азначала аднясенне сексу да таемнай сферы жыцця, якую не імкнуліся галосна абмяркоўваць, таму ў многіх выпадках мы вымушаны карыстацца ўскоснымі крыніцамі.

Сучаснымі даследчыкамі заўважана непасрэдная сувязь паміж геаграфічным становішчам і тэмпераментам народа. Чым бліжэй да экватара і цяплейшы клімат, тым вышэйшы тэмперамент[4]. Вялікае Княства Літоўскае знаходзілася ў сярэдняй кліматычнай зоне з чатырма сезонамі. Краіна хоць і займала даволі вялікую тэрыторыю, аднак не мела кардынальна розных кліматычных умоў. Выразная сезоннасць і звязаная з ёй сельскагаспадарчая праца непасрэдным чынам уплывалі на сексуальную актыўнасць насельніцтва. Яна ўзрастала ў веснавы і летні перыяд. Перапынак наступаў з пачаткам цяжкіх прац:

Пачала жаць – перастала даваць.
Стаў касіць – перастаў прасіць.

---

[1] Proverbiorum Polonicorum. Centuria 6, 20.

[2] Bourdieu P. The Logic of Practice. P. 70–78.

[3] Peakman J. The Pleasure's All Mine. A History of Perverse Sex. London, 2013. P. 40.

[4] Rushton J. P. Ethnic Differences in Temperament // Personality and Person Perception Across Cultures / Ed. Yueh-Ting Lee, C. R. McCauley, J. G. Draguns. USA, 1999. P. 55–58.

Залежнасць ад прыродных умоваў ставіла на першае месца забеспячэнне рэчамі, неабходнымі для жыцця: дом, вопратка, харчаванне. Фізічнае задавальненне не адносілася да катэгорыі прыярытэтных патрэбаў. У першую чаргу секс быў для забеспячэння працягу роду і зняцця напружання.

Дазволенае і недазволенае ў сферы сексуальных практык вызначалі заканадаўства, рэлігія, традыцыі і звычаі. Гэта азначала, што сексуальнае жыццё было не толькі справай мужчыны і жанчыны, а яшчэ і справай грамадскай. Заканадаўчыя нормы склаліся ў многім пад уплывам кананічнага права, але закраналі толькі асобныя моманты ў стасунках. Рэлігія рэгламентавала практычна ўсё: ад шлюбу да тэхнік сексу. На шырокія колы насельніцтва адукацыя і навуковыя дасягненні ўплывалі мала, бо большасць была непісьменнай. Асноўныя веды ўтрымліваліся ў лацінскамоўнай літаратуры, некаторых перакладных працах, але даступны яны былі толькі адукаваным асобам.

Міф пра Адама і Еву, як і сама хрысціянская канцэпцыя стаўлення да адносінаў паміж мужчынам і жанчынай, зрабілі адмоўны ўплыў на развіццё сексуальных стасункаў. Падпарадкаваны стан жанчыны, вызначэнне яе існавання толькі для нараджэння дзяцей негатыўна адбіліся на яе сексуальнасці і жаноцкасці[5], адпаведна і на інтымным жыцці шлюбнай пары. Хрысціянская сістэма гендэрных адносінаў была не адзіная, якая панавала ў той час у свеце. Вядомы былі ісламская, іудаісцкая і іншыя сістэмы. Адрозніваўся даасізм, які шукаў гармонію паміж інь і ян, што азначала задавальненне абодвух падчас інтымных стасункаў[6]. Але дамінуючае ўздзеянне на тэрыторыі нашай краіны ажыццяўляла менавіта хрысціянства. Іслам, іудаізм існавалі ў сваёй групе і для хрысціянскага насельніцтва былі чужымі плынямі.

Хрысціянства па сваёй сутнасці негатыўна ставілася да сексу. Прычым гэта датычыла як шлюбных, так і пазашлюбных стасункаў. Дадзеная тэндэнцыя захавалася на стагоддзі[7]. Створаная мадэль адносінаў паміж мужчынам і жанчынай існавала ў жорсткіх рамках забарон. Яна, па сутнасці, пазбавіла ўсіх радасці і задавальнення ў сексуальных стасунках. Натуральныя стасункі былі акрэсленыя як грахоўныя і суправаджаліся страхам пакарання, што ўваходзіла ў канфлікт з чалавечай псіхалогіяй і філасофіяй быцця. Аднак гэта не азначала, што вернікі цалкам падпарадкоўвалі сваё жыццё догмам. У жыцці жыхароў ВКЛ засталося месца для язычніцкіх вераванняў[8], якія можна было заўважыць у святах, звычаях і традыцыях.

З кніг ашмянскага гродскага суда была выпісана скарга ксяндза Даўгялішскага касцёла Мікалая Хрызастома Ардовіча на даўгялішскага падстаросту Самуэля Камароўскага і яго жонку Ганну Хмяльніцкую. 18 чэрвеня 1673 г. на імшы, калі сабраліся людзі рознага сацыяльнага стану, ксёндз нагадаў, каб на свята Св. Яна Хрысціцеля паганскія абрады не рабілі, вогнішча не раскладвалі. Аднак увечары 26 чэрвеня, калі з'ехаў муж, Г. Хмяльніцкая запрасіла шляхту,

[5] Майлз Р. Жаночая гісторыя свету. С. 85–89.

[6] Тэннехилл Р. Секс в истории. С. 158; ван Гулик Р. Искусство секса в Древнем Китае. С. 136.

[7] Imieliński K. Seksiatria. Psychofizjologia seksualna. S. 65–67.

[8] Одэрборн П. Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў. С. 167–189.

сялян з дзецьмі, чэлядзь на святкаванне Купалля. Яна выправіла сваіх людзей у парк каля касцёла, каб яны расклалі там вогнішча. Яно было настолькі вялікае, што іскры ляцелі на касцёл. Пасля прыбыла Г. Хмяльніцкая разам са сваёй кампаніяй. Яны сталі спяваць, верашчаць, скакаць праз вогнішча і танцаваць каля яго. Дзяўчаты былі з распушчанымі валасамі[9].

Апісанне святкавання Купалля вельмі рэдкая з'ява, а тым больш для дакументаў XVII ст. Крыніца добра паказвае супрацьстаянне паміж каталіцызмам і язычніцтвам. Прафілактычныя пропаведзі ксяндза не ўразілі прыхаджан, і яны па старадаўнім звычаі ўзялі ўдзел у святце. Прычым прысутнічала як шляхта, так і сяляне, што паказвае блізкасць свята для гэтых саслоўяў; яно яднала ўсю лакальную супольнасць. Ініцыятарам мерапрыемства была Г. Хмяльніцкая, якая скарысталася адсутнасцю мужа, каб зрабіць гулянку для ўсяго наваколля. Месца святкавання – парк каля касцёла – было абрана наўмысна. Гэта паказвае не толькі авантурны характар шляхцянкі, але яе жаданне ўкалоць ксяндза, выказаць пратэст супраць яго жадання зліквідаваць паганскія святы. Можа быць, раней на месцы гэтага касцёла было капішча, тады гэта дае яшчэ падставы для правядзення там святкавання. Хоць ксёндз і не прывёў падрабязнага апісання абраду, усё ж зразумела, што асноўныя элементы былі захаваны: вялікае вогнішча, скокі праз яго, песні і танцы.

Вядома, што гэта старадаўняе свята насіць эратычны характар. У гэты дзень здымаліся сексуальныя забароны, удзельнікі свята карысталіся сексуальнай свабодай. Натуральным вынікам такіх святкаванняў было нараджэнне дзяцей. Да іх з'яўлення грамадства ставілася спакойна, бо гэта было асвечана рэлігіяй і звычаямі продкаў[10]. На жаль, скарга М. Ардовіча не дае апісанне гэтага боку святкавання. Але нам падаецца, што яго сакральны сэнс не быў схаваны ад удзельнікаў мерапрыемства, і папараць-кветку яны шукалі ў адпаведнасці з прынятай традыцыяй. Праз тое, што дакументы Ашмянскага павета за гэты перыяд страчаны, мы не можам прасачыць далейшае развіццё падзей і даведацца, чым скончыўся разгляд скаргі.

Сексуальная сфера працягвала існаваць і ва ўмовах хрысціянства, але эротыка стала забароненай тэмай. Пра яе пісалі ў завуаляванай, схаванай форме з выкарыстаннем вобразаў і сімвалаў. Секс быў таемным бокам жыцця, пра які адкрыта не размаўлялі і не дэкларавалі свае прыхільнасці. Адпаведна гэта зрабіла ўплыў на змест у крыніцах, якія дайшлі да нас. Яны змяшчаюць ускосную інфармацыю, а не падрабязнае і дэталёвае апісанне інтымнага жыцця.

*Цнота.* Захаванне цноты дзяўчынай да шлюбу прапагандавалася хрысціянствам. Напрыклад, у Венецыі выяўленне адсутнасці знакаў дзявоцкасці падчас першай шлюбнай ночы было прычынай для звароту ў суд[11]. У еўрапейскіх краінах з цноты быў даўно зроблены фетыш. Лічылася, што чым менш жанчына

---

[9] Siarczyński. Czary, gusła i zabobony. Poznań, 1843 // LMAVB, f. 17-224, l. 10.

[10] Зайкоўскі Э. Сакральная прастора сексуальнага жыцця язычнікаў // Terra Alba. Т. 2. Homo venerus: Сексуальная прастора беларускай культуры / Пад рэд. С. І. Даніленкі. Мінск, 2001. С. 22–28.

[11] Ruggiero G. The Boundaries of Eros: Sex Crime and Sexuality in Renaissance Venice. New York, 1985. P. 25–26.

ведае пра секс, тым лепей. Найвышэйшай каштоўнасцю замест дарослай жаноцкасці стала дзявочая недасведчанасць. Ідэальным тыпам стала дзіця-нявеста. А маленькую плеўку, якая выпадкова захавалася ў чалавечай эвалюцыі, зрабілі сведчаннем дзявоцкасці[12]. Такі стан рэчаў меў выгаду для мужчыны. Нявопытная ў сексе жанчына мела менш патрабаванняў да здольнасцей мужчыны ў ложку і ўсё прымала як дадзенасць. Для жанчыны сітуацыя выглядала так, як трапна апісваецца ў выказванні амерыканскай актрысы Жа Жа Габор: "*Я нічога не ведаю пра секс, бо заўсёды была замужам*"[13].

У дахрысціянскі перыяд у славян сексуальнае жыццё не нармавалася жорстка. Ні ад жанчыны, ні ад мужчыны не патрабавалася захаванне цноты. Гэта адзначаецца ў падарожных нататках і летапісах[14]. Калі верыць падарожніку Ераніму Пражскаму, то ў XIV ст. высакародныя жанчыны з дазволу сужэнцаў мелі каханкаў, якіх называлі "вучнямі шлюбу"[15]. Старажытныя эратычныя беларускія святы – Купалле, Русалле – былі дазволенымі перыядамі сексуальнага разняволення[16].

У Вялікім Княстве Літоўскім у XVI ст. цнатлівасць дзяўчыны да шлюбу не была абавязковай[17]. У той час спробы паўплываць на маральны воблік насельніцтва не заўсёды мелі поспех. Папскі нунцый Фульвіа Ругеры адзначаў, што шляхцічы ўвесь час у руху, наведваюць адзін аднаго, сяброў, сваякоў. Начуюць там, дзе даязджаюць, неабходна толькі мець з сабой пасцель. Кожны возіць з сабой тое, што яму патрэбна. У дарозе ўсе спяць разам, покатам на саломе, мужчыны побач з жанчынамі. Вандруючы, людзі не перастаюць піць і размаўляць. Таму мала сарамлівых жанчын, няма недахопу ў публічных жанчынах (1565)[18]. Але заўважым, што сам Ватыкан не быў узорам маральнасці. नават дзіўна, што нашы жанчыны выклікалі такую рэакцыю нунцыя.

Маральны стан насельніцтва выклікаў нараканні ў пратэстантаў. Андрэй Фрыч Мадрэўскі[19], калі крытыкаваў грамадскі лад дзяржавы, шмат увагі звярнуў на маральны воблік насельніцтва. Лічыў, што цноту трэба выхоўваць з дзяцінства. Прычым выхаванне дзяўчынак і хлопчыкаў павінна ісці асобна, асаб-

---

[12] Майлз Р. Жаночая гісторыя свету. С. 88.

[13] Душенко К. В., Манчха Г. П. Острый женский взгляд. Москва, 1999. С. 47.

[14] Krawiec A. Seksualność. S. 47, 51.

[15] Scriptores rerum Prussicarum. B. IV. Leipzig. 1870. S. 237–239.

[16] Богданович А. Пережитки древнего миросозерцания белорусов: этнографический очерк. Гродно, 1895 / Рэпрынт. Мінск, 1995. С. 116–120; Ягорава І. Ю. "Русалля" з "Радзівілаўскага летапісу" // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1982. № 2. С. 28–30; Krawiec A. Seksualność. S. 83; Зайкоўскі Э. Сакральная прастора сексуальнага жыцця язычнікаў. С. 10–30; Белорусский эротический фольклор. С. 138–144.

[17] Сліж Н. Сексуальнае жыццё шляхты Вялікага княства Літоўскага. С. 138–167; Сліж Н. Мараль і норавы. С. 207–216.

[18] [Rekaczewski E.] Relacye nuncyuszów apostolskich i innych osób o Polsce od roku 1548 do 1690. T. 1. Berlin; Poznań, 1864. S. 127.

[19] Аналіз інтэлектуальнай спадчыны Андрэя Фрыча Мадрэўскага гл.: Państwo i Społeczeństwo. Andrzej Frycz Modrzewski w 500 rocznicę urodzin. Kraków, 2003. № 3; Augustyniak U. Andrzeja Frycza Modrzewskiego program naprawy społeczeństwa i państwa // KSAP. XX lat / Pod red. H. Samsonowicza. Warszawa, 2010. S. 101–124.

ліва ў падлеткавы перыяд, калі пачынаецца цікавасць да сексуальнага жыцця: "*A naywięcey tego się strzedz, aby między dziewczatami chłopięta nie przybywały, a zwłaszcza gdy iuż z dzieciństwa abo z chłopięcegi wieku wyrastaią, bo ten wiek z przyrodzienia ku pożądliwości cielesney bardzo iest sklonny, a zwyczaie y kochania ich pożądliwe, do których się w onym wieku zapalaią, nie maią żadnego rozsądku uczciwości, nie mogą być dobre y rosta w nich z laty, tak iż w dalszym wieku trudni iuż bywa przestać abo się oduczyć*". У дадзеным выказванні слушна адзначана пра цікавасць да сексу ў падлеткавы перыяд. Якраз гэта натуральна для падлеткаў. Але з пункту гледжання святара іх трэба прывучаць да працы, навукі, прыстойных гульняў, а не распусных, вучыць рэлігіі, быць ім прыкладам у прыстойнасці. Асуджаўся стыль выхавання дзяцей вялікіх паноў, якія гадуюцца ў пяшчоце, распусце, бавяцца танцамі, лютняй, распуснымі песнямі, маюць шмат слуг, не абмежаваны ў ежы. Для захавання маральнасці ў грамадстве раілася абраць у кожным павеце дазорцаў за шлюбам, якія павінны былі назіраць за паводзінамі мужа і жонкі, каб яны не кантактавалі з падазронымі (распуснымі) асобамі, прыстойна жылі, не біліся, кахалі і дапамагалі, не разводзіліся[20]. Ідэі кнігі не былі рэалізаваны, і сам твор лічыўся забароненым, бо крытыкаваў каталіцызм.

Захаванне цноты да шлюбу дзяўчынай стала важным патрабаваннем у XVII ст. На гэтым нават сталі акцэнтаваць увагу ў казаннях. Цнота была пад аховай сваякоў: бацька, маці, браты і апекуны абавязаны былі прывесці дзяўчыну да шлюбу ў чысціні[21]. У мастацкай літаратуры таксама лічылася важнай дашлюбная чысціня нявесты[22]. Як вынікае з прымавак[23], цноце таксама спрыяла адсутнасць адукацыі: "*Ktora czyta, śpiewa, gądzie, z tey rzadko cnotliwa będzie*", а адсутнасць сарамлівасці прыводзіла да яе страты: "*Niewiasta, ktora wstyd straci, pręto się z niecnotą zbraci*"[24].

Вяноўныя запісы, якія атрымлівала жанчына ад мужа пасля шлюбу за ўнесены пасаг на 1/3 нерухомай маёмасці, часам утрымліваюць выказванні, што вена атрымана за "*доброе и цнотливое захование*"[25]. Арэст Лявіцкі выказаў меркаванне, што так адзначалася дашлюбная цнатлівасць нявесты, а прывенак – дараванне за яе захаванне для мужа. Мужчыны афармлялі падарункі ў "абрадаваных

[20] Modrzewski Fricz A. O poprawie Rzeczypospolitey. S. 11–13 v, 31v–36v.

[21] Ginkiewicz M. Kazanie na pogrzebie dobrey pamięci Jey Mości Paney Pani Zofiey z Drucka Lubeckiey Pawłowey Laskowskiey. Wilna, 1649.

[22] Andreini F. Bohatyr Straszny. S. 113.

[23] Прымаўкі, сабраныя Саламонам Рысінскім, маюць непасрэднае дачыненне да тэрыторыі ВКЛ. Многія з іх ужываюцца на Беларусі і цяпер. Прыведзеныя намі прыклады прымавак падкрэсліваюць тагачаснае стаўленне да праблем маралі і гендэрных адносінаў. Літаратуру па тэме гл.: Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 2. СПб., 1893. С. 472–485; Лепешаў І. Я., Якалцэвіч М. А. Тлумачальны слоўнік прыказак. Гродна, 2011; Grześkowiak R. Przysłowia "są jakoby szpikiem niejakim bystrego rozumu..." Nieznane wydanie "Przypowieści polskich, od Solomona Rysińskiego zebranych, dwa tysiąca i dwieście" z roku 1621 // Sarmackie theatrum VII: W kręgu rodziny i prywatności / Pod red. M. Jarczykowa, R. Ryba. Katowice, 2014. S. 100–130.

[24] Proverbiorum Polonicorum. P. D 3, Centuria 7:20; Centuria 11:100.

[25] НГАБ, КМФ-18, спр. 34, арк. 139 адв.; ф. 1785, воп. 1, спр. 5, арк. 8.

лістах"[26]. Тое ж самае адзначыў Мітрафан Доўнар-Запольскі, прыводзячы прыклады са звычаяў іншых народаў. Ад жаніха нявеста атрымлівала падарунак раніцай, пасля першай ночы з мужам, таксама дадавалася ўдовіна частка. Ранішні і ўдовін падарункі мелі адно і тое ж паходжанне – плата за дзявоцкасць[27]. У вяноўных запісах згадка пра запіс вена за "*цнотливое захование*" больш нагадвае ўсталяваную формулу, чым дэкларацыю, што нявеста выйшла замуж цнатлівай. Паводле нормаў права жанчына павінна была сябе прыстойна паводзіць, але адмысловага артыкула з патрабаваннем захоўваць цнатлівасць не існавала[28].

Калі верыць літаратурным творам, то замуж ішлі не толькі не цнатлівыя, але і добра спрактыкаваныя ў сексе шляхцянкі. Верш, які быў прысвечаны шлюбу Барбары, дачкі ашмянскага мечніка, крэўскага старосты Караля Марсона, з даманаўскім старостам Геранімам Катоўскім[29] наўпрост кажа пра дашлюбных дзяцей жанчыны і яе юрлівасць:

*Epitolamium sławnego małzenstwa Kotowskiego*
*ktoremu szlub dała Wołowicz kanonik wilen(ski)*
Dawno to powiedziano ze od pierwszej proby
Každa Panna panienskiey pozbywa ozdoby
Niewierzano bo mam dowod nowożen iest swiadkiem
Wzioł kurwę przecie mowi ze wzioł z całym zadkiem
Patrzcie iak to iest twardey natury litewka
Kilkoro dzieci miała przecię ieszcze dziewka
Bierze Kotowski krewską starosciankę
Srogiego Marsa pieszczoną kochankę
Widzę nowożen wielki k[...][30] w tey mierze
Pierwey miał babę teraz kurwę bierze
Ten co szlub dawał niech ma za naginę
Ze panią młody pocałuie w brodę
Szlub daie Woł Kotowi obowiąskiem takim
By się wolno na gruncie iego pasc wszelakim
Patoz kocie dokąt zwierza wygłodniały wołek
Rogiem swoim dopadszy podnasza podatek.

У гэтым жа зборніку змешчаны верш, які падкрэслівае, што для дачкі прыкладам паводзінаў з'яўляецца маці. У прыстойнай маці – прыстойная дачка, а ў распуснай – распусная:

---

[26] Левицький О. Сім'я і побут українців у XVI ст. С. 221–224. Станіслаў Вараніцкі запісаў жонцы Ганне Хамякоўне 200 коп літоўскіх грошаў на сваіх маёнтках менавіта за захаванне цнатлівасці (1570). Архив ЮЗР. Ч. 8. Т. 3. Киев, 1909. С. 203–204.

[27] Довнар-Запольский М. В. Исследования и статьи. Т. 1. Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. Киев, 1909. С. 73–81; Maciejowski W. A. Polska aż do pierwszej połowy XVII wieku pod względem obyczajów i zwyczajów w czterech częściach opisana. T. 3. Peterzburg; Warszawa, 1859. S. 28; McNamara J. A., S. Wemple. The Power of Women through the Family in Medieval Europe 500–1100 // Women and Power in the Middle Ages. Athens and London, 1988. P. 86–87.

[28] Падрабязней пра вена і вяноўныя запісы гл.: Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 159–204.

[29] Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. T. 10. Warszawa, 1913. S. 236.

[30] Слова напісана незразумела.

*Jaka matka taka corka*
Jeżeli matka czystoscę chowała
Tedy y corka takaż będzie miała.
Jesli matki nadstawiała zadku
Tegoz y w corce spodzewac się statku[31].

У сувязі з біялагічнымі асаблівасцямі цела жанчына знаходзілася ў складанай сітуацыі. Парушэнне нявіннасці мела фізічныя прыкметы – разрыў плеўкі, а ў горшым выпадку цяжарнасць. У мужчын не было такіх праблем, таму сексуальныя дачыненні да шлюбу яны заўсёды маглі сабе дазволіць. Тым больш, што грамадства да гэтага ставілася з трываннем. У ВКЛ, як і ў іншых еўрапейскіх краінах, дзейнічалі падвоеныя стандарты. Тое, што было дазволена мужчыну, забаранялася жанчыне. Нягледзячы на забароны на дашлюбны секс, еўрапейскія крыніцы фіксуюць шлюбы, калі жанчыны ішлі замуж цяжарнымі[32].

*Сексуальныя стасункі ў шлюбе.* З пункту гледжання рэлігіі законнымі і натуральнымі лічыліся сексуальныя стасункі ў шлюбнай пары. Адмова ў сексе партнёру лічылася грахом[33], але "блуду" неабходна было пазбягаць[34].

Інтымнае жыццё пачыналася пасля вянчання і вяселля. Першы сексуальны кантакт адбываўся ў пэўным сэнсе публічна. У першы вясельны вечар пару вялі ў ложак, і праводзіўся абрад "пакладзіны". Гэта важны элемент у ланцугу шлюбных абрадаў. Па сутнасці ён паказваў асноўную мэту заключэння шлюбу – сексуальныя стасункі і працяг роду. Палавы акт замацоўваў шлюб і рабіў яго канчаткова здзейсненым. Прычым гэта набывала публічнае гучанне, бо прысутнічала падчас праводзін уся грамада. Гэты абрад адбываўся нават пры шлюбе кіраўнікоў дзяржавы. На вяселлі вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста і чэшскай каралевы Альжбеты пакладзіны былі праведзены на наступны дзень пасля яе каранацыі 17 мая 1543 г.[35] Звычай меў месца і на сучаснай тэрыторыі Украіны[36].

Пакладзіны суправаджаліся спецыяльнымі для гэтага выпадку прамовамі: запрашэнне панны ў ложак, аддаванне панны ў ложак, падзяка за панну ў ложку, падзяка за добрае выхаванне, адказ на падзяку[37]. Пры запрашэнні панны ў ложак увага аддавалася не толькі каханню. З яе можна зразумець, што ложак – гэта месца, дзе перамагала каханне. У ім здзяйснялася "бітва", дзе актыўную ролю меў мужчына. Там ён атрымліваў доказ цноты[38]. Гістарычная прамова Фелікса Крыскага пры аддаванні Марыяны Пенянжкаўны, дачкі кракаўскага падчашага, каралеўскаму дваранін і вінніцкаму старосце Дзмітрыю Агінскаму (1607)

---

[31] ANK, ASang. 246.

[32] Stone L. The Family, Sex, and Marriage. P. 501–502, 607–610; Ingram M. Church Courts, Sex and Marriage in England, 1570–1640. (Past and Present publications). Cambridge, 1987. P. 219–237.

[33] Собрание припадков краткое. Супрасль, 1722. С. 85 адв.; Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 297.

[34] Зизаний Л. Сия книга глаголемая Катихисис. 1627. С. 181.

[35] ПСРЛ. Т. 35. С. 237.

[36] Левицький О. Сім'я і побут українців у XVI ст. С. 221.

[37] Trębska M. Staropolskie szlacheckie oracje weselne. S. 231–244.

[38] НГАБ у Гродне, ф. 1663, воп.1, спр. 426, арк. 2 адв., 3 адв.

стала прыкладам рыторыкі і шмат разоў перапісвалася. У ёй ухваляўся інстытут шлюбу і яго вынік – нашчадкі: "*miłość rozradza potomstwo*"[39].

Калі дакладна прамаўлялася падзяка за добрае выхаванне панны, казаць цяжка, верагодна, раніцай наступнага дня. У ім асноўная ўвага звярталася на цноту. У дадзеным выпадку мелася на ўвазе захаванне дзявочай нявіннасці. У адказе на падзяку асноўнай тэмай было ўхваленне добрай жонкі[40]. Заўважым, што ў прамовах няма адкрытага апісання сексуальных стасункаў. Усё перадаецца праз услаўленне шлюбу, жаніха і нявесты.

У беларускай народнай традыцыі пакладзіны мелі не менш важнае значэнне. Увечары шлюбную пару суправаджалі да каморы з песнямі і жартамі на сексуальную тэму[41]. Ранкам паказвалі кашулю нявесты са слядамі крыві як доказ яе дзявоцкасці, ці бацька жаніха адпраўляў бацьку нявесты бутэльку гарэлкі з чырвонай стужкай. Дзяўчыну, якая не захавала цноту, чакала ганьба, як і яе сям'ю. Міхаіл Федароўскі сцвярджаў, што звычай меў месца ў шляхецкім асяроддзі. Пры ад'ездзе да дому жаніха на дзяўчыну і яе маці, як вінаватую ў дрэнным выхаванні, надзявалі хамут, ставілі перад імі шчарбатыя міскі. Усё суправаджалася кпінамі і песнямі[42]. У канцы XIX ст. у беларускай народнай культуры гэты звычай стаў знікаць[43]. Ці была ў шляхецкай культуры традыцыя выносіць кашулю, дакладна сказаць цяжка. Яе маглі замяніць нейкім сімвалам.

Найбольш інтэнсіўны перыяд для сексуальных стасункаў быў у першыя месяцы шлюбу[44]. Ад пары чакалі нашчадкаў, і часта першая цяжарнасць наступала ў першы год супольнага жыцця. Аднак гэты бок жыцця практычна схаваны ў дакументах. У сямейных хроніках знаходзім толькі інфармацыю пра нараджэнне дзяцей, іх шлюбы.

Абмежаванні ў інтымным жыцці сям'і накладалі фізіялагічныя асаблівасці. Стасункі паміж мужчынам і жанчынай не здзяйсняліся падчас цяжарнасці, менструацыі[45], хваробы. З прычыны хваробы Ядвіга Юр'еўна Насілоўская не магла задаволіць сексуальныя патрэбы мужа Грыгорыя Юр'евіча Осціка. Ён знайшоў сабе каханку. Жонка даведалася пра здраду. У выніку яны развяліся (1566)[46].

---

[39] Biblioteka Kórnicka, sygn. BK 1195, k. 45–47, 113–114; Trębska M. Staropolskie szlacheckie oracje weselne. S. 234–237.

[40] НГАБ у Гродне, ф. 1663, воп.1, спр. 426, арк. 7; Trębska M. Staropolskie szlacheckie oracje weselne. S. 240–244.

[41] Прыклады жартаўлівых спеваў з эратычным падтэкстам гл.: Федароўскі М. Ф. Люд беларускі. Мінск, 1991. С. 136–137. Апісанне абраду суправаджэння да каморы гл.: Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-Русский край, снаряжённой Императорским русским географическим обществом. Юго-западный отдел. Т. 4: Обряды: родины, крестины, свадьба, похороны / Собр. П. П. Чувинский. СПб., 1877. С. 434–450; Могилёвские свадебные песни из записей А. С. Дембовецкого. С. 187–197.

[42] Federowski M. Pieśni i opisy obrzędów dorocznych, weselnych, chrzestnych i pogrzebowych z okolic Prużan, Białowieży, Wołkowyska, Swisłoczy, Słonima, Lidy, Sokółki i Żołudka... // Gabinet rękopisów BUW, sygn. 442, k. 197–198.

[43] Богданович А. Пережитки древнего миросозерцания белорусов. С. 120.

[44] Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 136.

[45] Michalonis Lituani. De moribus tartarorum, lituanorum et moschorum. F. 27; Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 90.

[46] НГАБ, КМФ-18, спр. 262, арк. 350 – 361 адв.

У сямейным жыцці секс меў важнае значэнне. Праз яго здзяйснялася пракрэатыўная функцыя сям'і. Гэта быў адзіны магчымы шлях для нараджэння дзяцей. Да таго ж наяўнасць сталага партнёра давала магчымасць зняць сексуальнае напружанне. Нават калі ў грамадстве не дэкларавалася адкрыта важнасць інтымнага жыцця, то гэта разумелася.

*Месцы для стасункаў.* У першую чаргу як месца для сексуальных стасункаў варта згадаць дом. У халодны перыяд памяшканні мелі важнае значэнне для шлюбных і пазашлюбных кантактаў. Дом – гэта шматфункцыянальная пабудова. Зразумела, немагчыма сцвярджаць, што ён будаваўся выключна для таго, каб там займацца сексам. Месцы для пражывання ўладкоўваліся ў адпаведнасці са статусам і заможнасцю.

Шляхецкі маёнтак уяўляў сабой цэлую гаспадарчую сістэму, якая складалася не толькі з дома[47]. Пры ім знаходзіліся кухня, пякарня, сырнік, стайня, бровар, лазня і інш. Мы не выключаем магчымасць выкарыстання гэтых будынкаў не па прызначэнні. У асноўным шляхецкія маёнткі будаваліся з дрэва, аднак былі і мураваныя замкі (Мір, Нясвіж, Гайцюнішкі і інш.)[48]. У сувязі з палітычнай дзейнасцю шляхта мела дамы ў гарадах, аднак яны адрозніваліся ад маёнткаў. На абмежаванай гарадской плошчы былі толькі неабходныя пабудовы: невялікі дом, стайня, вазоўня, кухня[49].

Планіроўка дома і яго ўнутранае ўбранне непасрэдным чынам залежала ад статусу роду і яго фінансавых магчымасцей. Дом быў прызначаны не толькі для пражывання, але і для дэманстрацыі месца і ролі роду ў грамадстве. Большая частка прасторы прызначалася для прыёмаў і спажывання ежы. На адпачывальні (каморы) адводзіліся далейшыя пакоі, значна меншыя. У іх маглі знаходзіцца шафы, куфры, печ, стол, крэслы, лавы, ложак. Адпачывальні магнатэрыі аздабляліся дарагімі шпалерамі і апонамі, дыванамі, карцінамі і абразамі[50].

У сувязі з небяспекай ад пажараў у гарадах імкнуліся спрыяць пабудове мураваных дамоў, аднак дамінавалі драўляныя[51]. Асаблівасці забудовы тагачасных гарадоў добра бачны на гравюрах Гародні Адэльгаўзера-Цюнта (1567–1568), Вільні (1583), Коўна Тамаша Макоўскага (1600) і інш. Мяшчанскае саслоўе ўладкоўвала свае дамы ў залежнасці ад заможнасці. Багатыя мяшчане ў побыце пераймалі элементы шляхецкай культуры. Напрыклад, дом берасцейскага бурмістра Станіслава Бабpоўскага не саступаў дому заможнай шляхты. Ён быў мураваны, меў два паверхі. Асобны пакой быў адведзены пад адпачывальню[52]. Мяшчане сярэдняй заможнасці будавалі дамы з некалькімі жылымі памяшканнямі, каб адно з іх адвесці пад адпачывальню. У гарадах былі пабудовы

[47] АВАК. Т. 14. Вильна, 1888; АВАК. Т. 25. Инвентари и разграничительные акты. Вильна, 1898.

[48] Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1. С. 129–156; т. 2. С. 10–22; Шаблюк В. У. Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння: XIV–XVIII стст. / Пад рэд. Я. Г. Звяругі. Мінск, 1996. С. 38–55; Lietuvos architektūros istorija. T. II. P. 165–177; Бохан Ю., Скеп'ян А. Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV– сярэдзіне XVII стагоддзя. Мінск, 2011. С. 19–88.

[49] Сліж Н. Гарадзенскія падворкі ў XVII ст. С. 222–254.

[50] АВАК. Т. 20. Вильна, 1893. С. 136; Бохан Ю., Скеп'ян А. Побыт феадалаў. С. 93–130.

[51] Lietuvos architektūros istorija. T. II. P. 175–187.

[52] Сліж Н. Тэстамент берасцейскага бурмістра Станіслава Баброўскага. С. 13, 21.

рознага ўзроўню камфорту[53]. Самыя бедныя дамы называлі "халупы". Пакоі і нават куты здаваліся ў арэнду. У такіх дамах была вялікая канцэнтрацыя людзей і малая прыватная прастора.

Сялянскія дамы былі збудаваны з дрэва, мелі двухкамерную (хата і сені) ці трохкамерную (хата, сені і камора) планіроўку. У гэтых малых будынках пражывалі ўсе разам[54]. Гэта азначала, што ў шлюбнай пары практычна не было месца для інтымнай прасторы. Для стасункаў трэба было чакаць, пакуль усе заснуць, ці сыходзіць у гаспадарчыя пабудовы, а ў цёплы перыяд можна было выкарыстаць якое заўгодна бязлюднае месца.

Традыцыйна месцам у доме для сексуальных забаў быў ложак. Гэта было адно з месцаў стасункаў каханкаў Зафеі Радзівілаўны і слугі яе мужа Станіслава Тымінскага[55]. Асаблівасці зменаў выгляду гэтага тыпу мэблі ў перыяд XVI–XVII стст. даволі цяжка прасачыць. Захавалася не так шмат выяў. Ложак служыў хворым, тым, хто памірае, адпачывае. Схематычна ён паказаны на іконах "Нараджэнне Маці Божай" (1649 і 1648–1650 гг.)[56], на выявах на сталі ў Фарным касцёле ў Гародні, якія прысвечаны цудам ажыўлення Юзафа Тымінскага, вылячэння Андрэя Катовіча, Барбары Сапежанкі і Канстанцыі Вадынскай (канец XVII – пачатак XVIII ст.)[57].

Як вынікае з карцін і інвентароў, ложкі былі драўляныя, мелі рознай формы спінкі. Іх асновай была высокая платформа, якая надавала ім трываласць. Ложкі былі як прывазныя, так і выраблены мясцовымі рамеснікамі[58]. У XVII ст. сярод шляхты і заможных мяшчан набывае папулярнасць ложак з намётам, які замацоўваўся на чатырох слупах. Заслона рабілася з каштоўнай тканіны: шоўк, аксаміт і інш.[59] Такі ложак дадаткова ствараў прыватную прастору для мужчыны і жанчыны, да таго ж утвараў прыемную інтымную атмасферу.

Да ложка дадаваліся неабходныя прыналежнасці: падушкі, пярыны (верхняя і ніжняя), коўдры, навалачкі, прасціны. Пасцельная бялізна[60] рабілася з розных тканін (даматканай, шаўковай і інш.), магла аздабляцца карункамі і вышыўкай[61]. Пра наяўнасць пасцелі і ложка згадваецца ў мяшчанскіх дакументах[62]. У інвентары маёмасці за 1651 г., якая засталася пасля Лаўрына Клічэўскага, згадваліся два ложкі: ложак мужчынскі (36 грошаў літоўскіх) і ложак з верхам (24 грошы

[53] Інвентары гарадскіх дамоў гл.: Frick D. Wilnianie. S. 422–427, 553–556, 573–578; Сліж Н. Гарадзенскія падворкі ў XVII ст. С. 223–224.

[54] Одэрборн П. Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў. С. 167–189; O'Connor B. Historia Polski. S. 496; Шаблюк В. У. Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння. С. 31–36.

[55] Sajkowski A. Opowieści. S. 321.

[56] Гл.: Іканапіс Беларусі XV–XVIII стст. Мінск, 1992. Іл. 17, 29.

[57] Сьліж Н. Лава ў капліцы Маці Божай Студэнцкай у фарным касьцёле Гародні // Arche. Другая Гародня. 2010. № 1, 2. С. 70–73, 75, 76, 87–89, 94–95.

[58] Бохан Ю., Скеп'ян А. Побыт феадалаў. С. 127.

[59] Bartkiewicz M. Odzież i wnętra domów. S. 41–44.

[60] Разнастайная пасцельная бялізна ўжывалася таксама ў шляхецкім і мяшчанскім асяроддзі Польшчы. Bartkiewicz M. Odzież i wnętra domów. S. 102–105.

[61] Frick D. Wilnianie. S. 204.

[62] XVII a. Vidurio Maskvos okupacijos Lietuvoje šaltiniai T. I. P. 162, 230, 266, 345, 362; Сліж Н. Тэстамент берасцейскага бурмістра Станіслава Баброўскага. С. 13, 21.

літоўскія)[63]. Сярод рэчаў, апісаных пасля смерці віленскай мяшчанкі Анастасіі Віткоўскай у 1684 г., былі два ложкі: дубовы без намёту (5 фларынаў) і сасновы на адну асобу (2 фларыны). У доме Альжбеты Юсевічоўны быў вялікі маляваны ложак (1682)[64]. Чым заможней былі гаспадары, тым больш якасная і багатая тканіна была на ложках.

Аднак у якасці ложкаў маглі выкарыстоўваць шырокія лавы ці тапчаны з 2–4 дошак, на якія клалі сеннікі, пярыны, коўдры. На дзень гэтыя канструкцыі разбіраліся. Акрамя таго, іх выкарыстоўвалі для гасцей, бо мець дадатковыя ложкі ў хаце не заўсёды было магчыма[65]. Бялізну мылі і мянялі, але як часта гэта адбывалася, у дакументах не згадваецца.

У XVI–XVII стст. замацавалася традыцыя ўключаць у пасаг прыналежнасці да ложка. Напрыклад, яны пералічваліся ў пасагу шляхцянак Ганны Рагазянкі (1562), Настассі Адамовічаўны (1614), Барбары Сынкоўскай (1670–1680-я гг.) і інш.[66], мяшчанкі Барбары Якубаўны Медзешэўскай (1675)[67], дачкі гаспадарскага каваля Мікалая Яновіча[68]. Ложак меў важнае значэнне для сужэнцаў. У пэўным сэнсе гэта была тэрыторыя жанчыны, і яе важна было трымаць у парадку, чысціні і прыгожым аздабленні. Таму было абсалютна натуральна даваць у пасаг рэчы для ложка.

У ложак клаліся апранутымі. Для гэтага былі спецыяльныя начныя кашулі. Жанчыны часта атрымлівалі іх у пасаг[69]. Доўгія сарочкі апраналі на ноч мужчыны. Падчас раптоўнай жарсці мужчына і жанчына не заўсёды распраналіся, а агалялі неабходныя часткі цела. Традыцыя спаць у адзенні была і ў іншых краінах. Калі верыць дзённіку Яна Хрызастома Паска, то ў Польшчы нават жонка перад мужам перад сном не агалялася. Таму яго моцна здзівіла ў Даніі норма спаць голымі. Гэта не лічылася сорамам, бо, як яму патлумачылі, такімі Бог стварыў людзей (1658)[70].

Аднак сексуальныя стасункі мелі месца не толькі ў ложку. Кажучы сучаснай мовай, у той час былі аматары экстрэмальнага сексу, якія займаліся гэтай справай там, дзе іх ахапіла жарсць. Разнастайнасць месцаў для сустрэч была ўласціва каханкам. Яны займаліся сексам пры кожнай магчымасці. Гэта магло адбывацца днём, а не абавязкова ноччу, бо пры наяўнасці сужэнца значна прасцей было знайсці час удзень. Зафея Радзівілаўна і яе каханак Станіслаў Тымінскі былі заўважаны ў пакоі гаспадыні, святліцы, каморы Тымінскага, доме Б. Паўлавай (1607)[71]. Падчас памінак па жонцы Войцеха Галімскага ў берасцейскім двары Зафеі Чаховічаўны, жонкі віленскага чашніка Даніэля Набароўскага,

---

[63] LVIA, f. 23, ap. 1, b. 1 (SA 5096), l. 515, 517.

[64] Frick D. Wilnianie. S. 205, 574.

[65] Бохан Ю., Скеп'ян А. Побыт феадалаў. С. 124, 126.

[66] Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 231–254, 488, 502–503, 514–515.

[67] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 410.

[68] АВАК. Т. 17. Вильна, 1874. С. 84–85.

[69] Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 503, 515.

[70] Pamiętniki Jana Chryzostoma Paska / Wyd. E. Raczyńskiego. Poznań, 1836. S. 9.

[71] Sajkowski A. Opowieści. S. 321; Seredyka J. Księżniczka i chudopachołek. Zofia z Radziwiłłów Dorohostajska. Stanisław Tymiński. Opole, 1995. S. 39–40, 42, 45.

Альжбета Шчупакоўна здрадзіла мужу, берасцейскаму радцу Лукашу Памаранскаму, з чаляднікам Галімскага Янам Вярбіцкім на гарышчы дома (1640)[72]. Жонка Матыса Ёдэшкі Ганна сярод белага дня кахалася з чаляднікам паручніка ў склепе (1658)[73]. У судовай справе супраць Раіны, дачкі гарадзенскага ката Марціна Загурскага, адзначалася, што яе бачылі з жыдам Шымкам Хаімовічам пад грушкай у полі, якое належала касцёлу Св. Мікалая, у карчме за Нёманам, на прыродзе за Нёманам (1668)[74]. Абое былі ў шлюбе і, зразумела, не маглі выкарыстоўваць свае дамы для спаткання. А летам было добрае надвор'е і любіцца можна было паўсюль, галоўнае – далей ад людскіх вачэй. Аднак выпадковыя сведкі заўважылі каханкаў.

Як вынікае з народнага фальклору, у сялян таксама адбываліся сустрэчы на прыродзе:

Куды мяне павядзеш,
Такую маладую?
На папову сенажаць,
Траву зеляную[75].

А мамачка, – мельнік
Павёў мяне ў ельнік,
І стаў ён варажыць:
Куды мяне палажыць?
А ножкамі к дарожца,
Галоўкаю к бярозца[76].

Месцы для стасункаў былі розныя: ад дома да поля. У гэтым плане літвіны не вынаходнікі. Напрыклад, палякі кахаліся ў ложку, гаспадарчых пабудовах, карэтах, на прыродзе падчас палявання і ў іншых месцах[77].

Аднак захаваць таямнічасць падчас сексу і абараніць сябе ад прысутнасці іншых людзей было даволі складана. Інтымныя стасункі адбываліся практычна публічна. У шляхецкім падворку пражывала вялікая колькасць людзей. У драўляных дамах была добрая акустыка. Таму нават пра секс гаспадароў ведалі двор і прыслуга. Напрыклад, забавы З. Радзівілаўны і яе каханка Тымінскага ноччу чулі ўсе паненкі[78]. Шчыльна заселеныя мяшчанскія і сялянскія дамы таксама спрыялі таму, што стасункі праходзілі навідавоку.

Публічныя мерапрыемствы і месцы таксама маглі справакаваць раптоўны секс. Гэта магло адбыцца ў карчме, у гасцях, на святах, вяселлях. Жанчыны, як і мужчыны, наведвалі корчмы, а на святах сядзелі ўсе разам, не было падзелу на мужчынскія і жаночыя часткі. Атмасферу стваралі алкаголь, распусныя песні,

[72] Лукаш Памаранскі жыў пры двары З. Чаховічаўны. АВАК. Т. 6. Вильна, 1872. С. 366–367.

[73] Frick D. Wilnianie. S. 114.

[74] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 164 адв. – 165.

[75] Federowski M. Lud białoruski. T. VI. S. 37.

[76] Шейн П. В. Материалы для изучения языка и быта русского населения Северо-Западного края. Т. 1. Ч. 1. СПб., 1887. С. 566.

[77] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 281–283.

[78] Seredyka J. Księżniczka i chudopachołek. S. 45.

жарты, танцы. Апошняя забава была вельмі папулярная ў нас[79]. Сымон Будны і Андрэй Фрыч Мадрэўскі мелі рацыю, калі пісалі, што згаданыя рэчы прыводзяць да распусты[80]. Асаблівае нараканне было на танцы, бо яны ствараюць магчымасць цялеснага кантакту, які можа перарасці ў секс. Грэка-каталіцкая царква адносіла да граху спяванне непрыстойных песень, непрыстойныя жарты, непачцівае крананне, пацалункі, аблапванне[81]. Усё гэта ў выніку магло прывесці да сексуальных кантактаў, як правіла, не паміж мужам і жонкай.

Не менш важнае значэнне меў час для стасункаў. Хрысціяне павінны былі абіраць яго згодна з кананічным правам. Забаранялася займацца сексам у пасты, святы, па серадах, пятніцах, перад службай і інш.[82] Па сутнасці, асоба павінна была падпарадкоўваць сваё інтымнае жыццё рэлігійнаму календару, але не заўсёды гэта рабіла.

Публічная і прыватная прастора моцна перакрыжоўваліся. Для прыватнасці было не так шмат месца. Таму ў сексуальных дачыненнях не заўсёды можна было захаваць інтымную прастору. Яна парушалася як у доме, так і на прыродзе. Але ў доме была магчымасць спецыяльна уладкаваць месца для сну і сексу. Калі жарсць ахапіла раптоўна, то на месца ўжо асабліва ўвага не звярталася.

*Патэнцыя і імпатэнцыя*. Важным элементам сексуальных адносінаў была мужчынская патэнцыя. Было вядома, што палавы акт для мужчыны заканчваўся семявывяржэннем. У працы Псеўда-Арыстоцеля сярод іншага тлумачылася ўтварэнне спермы. Яна ад мозга ішла праз пячонку, сэрца і даходзіла да патрэбнага органа. А белы яе колер утвараўся ад косці. Аднак само стварэнне семені мела дзве версіі: або з часткі цела, або з яго вадкасці. Пры гэтым пры тлумачэнні немагчымасці зачацця звярталася ўвага не толькі на праблемы ў жанчын, але і ў мужчын. Не спрыяла пракрэацыі больш халодная прырода мужчыны, вадзяністае семя, рознасць тэмпераментаў мужчыны і жанчыны[83].

Пра неабходнасць чэлесу "ведаць сваю справу" напісана ў жартаўлівым вершы невядомага аўтара канца XVII ст.:

> *Przypadek o kusiu przez SLMK*
> Kusia było złapano, nie rozumieł się sprawie
> A cycy zań ręczyły do sądu go stawie
> Dla tego więc y teraz gdy kto wymie za nie
> Kus rozumie ze sprawa, y zaraz powstanie[84].

Пік сексуальнай актыўнасці мужчыны прыпадаў на маладосць. Як адзначала прымаўка: "*Kto w zieleni, żenić się nie leni*"[85]. Аднак здольнасць зачаць дзіця

[79] Olaus Magnus. Historia. P. 629.

[80] Катэхізіс: помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст. С. 122; Modrzewski Fricz A. O poprawie Rzeczypospolitey. S. 53–55.

[81] Собрание припадков. С. 112 адв.

[82] Brudage J. A. Law, Sex, and Christian Society. P. 136–137, 139–141, 152–166; Левина Е. Секс и общество в мире православных христиан, 900–1700 // "А се грехи злые смертные..." С. 303–307.

[83] Problemata Aristotelis. Paganus, 1557. P. 110–113, 123.

[84] У назве пададзены скарот без расшыфроўкі. ANK, ASang. 246.

[85] Proverbiorum Polonicorum. Centuria 7: 80.

некаторыя маглі захаваць у пачэсным узросце. Пліній Старэйшы адзначаў пра патэнцыю мужчын нават у 86 гадоў, а таксама пра выпадкі плоднасці пасля 70 гадоў сярод людзей нізкага стану[86]. Вядома, што гетман ВКЛ Канстанцін Астрожскі (к. 1460–1530) ажаніўся першы раз з Таццянай Сямёнаўнай Гальшанскай (?–1522) у 1509 г., калі яму было 49 гадоў. Праз два гады яна нарадзіла сына Ільюю. Другога сына Канстанціна Васіля (1524/25–1608) і дачку Зафею ён меў у другім шлюбе з Аляксандрай Слуцкай (?–1563/64). На момант нараджэння сына Канстанцін Астрожскі быў прыкладна ў 65-гадовым узросце[87].

Пра жарсці і сексуальную моц ва ўзросце пісаў Ян Каханоўскі ў вершы "Да дзеўкі" ("Do dziewki"):

> ...Nie uciekaj, ma rada, wszak wiesz: im kot stary,
> Tym, pospolicie mówią, ogon jego twardszy,
> I dąb choć mieścy przeschnie, choć list na nim płowy
> Przedsię stoi potężnie, bo ma korzeń zdorowy[88].

У кнізе прымавак Саламона Рысінскага частка гэтага верша сустракаецца як прымаўка: "*Im kot starszy, tym ogon twardzy*"[89]. А іншая прымаўка пацвярджае думку: "*Stary, ale jary*". Але наконт шлюбу старога з маладой пададзена іншае меркаванне: "*Kiedy się stary z młodą ożeni, tedy właśnie, iakoby w stary woz szalone konie założył*"[90]. Народная мудрасць бачыла розніцу паміж сексам і шлюбам.

Мужчынская сіла праяўлялася ў дзецях. Для шляхты было важным пакінуць пасля сябе нашчадкаў мужчынскага полу для працягу роду. Мікалай Радзівіл Сіротка (1549–1616) у 1579 г. пісаў свайму сваяку гетману польнаму ВКЛ Крыштафу І Радзівілу (1547–1603): "*... bo to prawie sztuka, i Moskwę pobić i dziecię urobić, nie każdemu to można*"[91]. Калі верыць лісту М. Радзівіла, то гетман быў рэдкім мужчынам і ў бітве, і ў ложку. На той час гетману было 32 гады, у гэтым узросце, як правіла, на патэнцыю яшчэ не наракаюць.

Дадзенае выказванне з'яўляецца цікавым прыкладам параўнання вайсковай моцы і мужчынскай патэнцыі. Для тагачаснага грамадства відавочнай праявай мужчынскай фізічнай сілы была спрытнасць у вайсковай справе. Фізічна развіты і загартаваны мужчына мог пераносіць паходы. Аднак гэтага было недастаткова для паспяховага ваяра. Ён павінен быў добра валодаць зброяй, быць дасведчаным у стратэгіі і тактыцы, каб перамагаць ворага. Вайсковая дзейнасць, па сутнасці, была публічнай дэманстрацыяй мужчынскай моцы. Сексуальная патэнцыя мужчыны непасрэдна асацыявалася з яго ўменнем ваяваць. Стасункі з жанчынай параўноўваліся з вайной, якую мужчына заваёўваў і скараў. А вына-

[86] K. Pliniusza Starszego Historyi. T. 3, ks. 7–9. S. 47–49.

[87] Kempa T. Konstanty Wasil Ostrogski (ok.1524/1525–1608), wojewoda Kijowski i marszałek ziemi Wołyńskiej. Toruń, 1997. S. 16–115.

[88] Tuwin J. Cztery wieki fraszki polskiej. Warszawa, 1957. S. 28.

[89] У бібліятэцы Рысінскага былі творы Каханоўскага, таму цікавыя выказванні ўвайшлі ў яго кнігу. Голенченко Г. Я. Крупные светские частновладельческие библиотеки Белоруссии и Литвы второй половины XVI – середины XVII в. // Федоровские чтения, 1982. Москва, 1987. С. 112.

[90] Proverbiorum Polonicorum. P. C, Centuria 4:80; Centuria 15:10; P. D 3, Centuria 7:10.

[91] Ліст ад 2 красавіка 1579 г. // Archiwum domu Radziwiłłów. T. VIII. S. 15.

кам перамогі станавілася нараджэнне дзіцяці. Таму выйграная бітва і нашчадкі былі публічнай дэманстрацыяй мужчынскай патэнцыі, якая шанавалася ў грамадстве.

Візуалізацыю мужчынскай вайсковай сілы можна было пабачыць у своеасаблівым "алтары мужчынскай патэнцыі" ў касцёле Св. Пятра і Паўла ў Вільні, які заснаваў гетман ВКЛ Міхаіл Казімір Пац. Цяпер яго атрыбуты стаяць у іншых месцах. З левага боку каля галоўнага алтара знаходзіцца алтар з цудатворнай іконай Маці Божай. Ён змешчаны паміж дзвюма калонамі, якія падтрымліваюць скульптуры напалову аголеных мужчын барочнага целаскладу. На падлозе стаялі два вайсковыя барабаны і куфар, які выклікае найбольшую цікавасць. Ён аздоблены выявамі герба ўладальніка. Паміж імі змешчаны малюнак вайскоўца. Замок ад куфра знаходзіцца на месцы чэлеса. Калі ўставіць ключ у замок, то атрымліваецца адпаведная двухсэнсоўная карцінка.

Дзякуючы Яну Длугашу да нас дайшла інфармацыя пра шалёны тэмперамент вялікага князя Вітаўта. Ён пасля заключэння міру з зяцем Васілём I, маскоўскім князем[92], кінуў войска і на кані паспяшыў да жонкі Ганны. У хроніцы адзначаецца, што Вітаўт "*jako człowiek nader skłonny do roskoszy miłosnych i chętnie im hołdujący*"[93]. Пасля гісторыя знайшла водгук у Марціна Кромера[94] і Мацея Стрыйкоўскага:

> *O wtorey woynie Witoldo, wen z zięcie Basiliem Moskiewskim,*
> *a o złości Swidrigiełowey 1407 & 1408*
> ...A Witold skoro pokoy z zięciem concludował,
> Na rozsadzonych koniach k Wilna appelował,
> Do żony bo go Wenus piekła na dzień każdy,
> A też zwyczay przed woyskiem ieżdzać miewał zawżdy,
> Woyska w nieprzyiacielskiey ziemu się zostały,
> Ktore bez wodża zewsząd szkody potykąły...[95]

У частцы, прысвечанай смерці Вітаўта, Я. Длугаш сярод іншага зноў адзначаў хцівасць вялікага князя да жанчын. Для задавальнення жарсці той трымаў нават наложніц пры двары (1430)[96]. Вялікі князь меў хударлявы целасклад, вёў актыўны лад жыцця, не ўжываў алкаголю. Гэта дазволіла яму на доўгі час захаваць патэнцыю і здольнасць да сексуальных забаў. Але такую характарыстыку Вітаўту дае толькі Я. Длугаш. У летапісах ВКЛ засяроджваецца ўвага толькі на яго вайсковай і дзяржаўнай дзейнасці. Інфармацыю Длугаша цяжка ўспрымаць як выключна праўдзівую, бо ён такім чынам паказваў Вітаўта дзяржаўным

---

[92] ПСРЛ. Т. 32. С. 77–78.

[93] Długosz J. Roczniki czyli kroniki sławnego królewstwa polskiego. Ks. 10–11. Warszawa, 2009. S. 25–26.

[94] Kronika polska Marcina Kromera biskupa warmińskiego ksiąg XXX / Przeł. przez M. Błażowskiego. Sanok, 1857. S. 767.

[95] Stryjkowski M. Kronika.... Królewiec, 1582. S. 517–518.

[96] "Ale bardzo wielu mówi, że książę do tego stopnia szukał przygód z kobietami, że tak był lubieżny i skłonny do miłostek, że nieraz tuż przez nadchodzącym zwycięstwem zostawiał wojsko na ziemi wroga. Przemierzają wiele ziem i zmieniają konie wracał zwykle do żony i do nałożnic, by zaspokoic palącą żądzę". Długosz J. Roczniki. Ks. 11. Warszawa, 2009. S. 318.

дзеячам, які не зусім адпавядае класічнаму еўрапейскаму вобразу хрысціянскага рыцара. Апошні характарызуецца прыстойнымі паводзінамі ў дачыненні да жанчыны. Варта адзначыць, што ў наступныя стагоддзі дзейнасць Вітаўта стала прыкладам для нашчадкаў.

Сярод апантаных аматараў жанчын згадваліся вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст, канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл. Напрыклад, у маладосці Жыгімонт Аўгуст любіў разам з сябрамі ладзіць распусныя вечарыны з удзелам дзяўчат[97]. Пра яго ў летапісе адзначалася: "*Потом король Август, кгды поховал тело королевое, малжонки своее, будучи пан молоды, не могучи здержати прирожоное хтивости своеи ку белым головом, почат миловати паню Барбару Радивиловну*"[98]. У гэтым урыўку адназначна паказваецца, што Жыгімонт Аўгуст у маладым узросце любіў жанчын і не мог стрымліваць сваіх жаданняў.

У рэлігійнай палеміцы часта гучала абвінавачванне духавенства розных канфесій у распусце, што пацвярджаецца судовымі выпадкамі[99]. Народная культура прыпісвала найбольшую пажадлівасць служкам хрысціянскага культу – папам і ксяндзам[100]. У калекцыі М. Федароўскага ёсць такі верш:

О там на грузду
Прадаваў поп п*зду,
А хлопчыкі купавалі[101].

Праблема мужчынскай сілы і яе захавання турбавала Міхалона Літвіна. Ён прыязна ставіўся да палігаміі ў татараў. Жонка ў іх бралася для нараджэння дзяцей. А ў сувязі з тым, што жанчына не заўсёды даступна для сексу з прычыны менструацыі ці цяжарнасці і не ўсе жанчыны могуць мець дзяцей, наяўнасць другой жонкі дае магчымасць пакінуць нашчадкаў. Літвін вельмі ўхваляў ашчаднае стаўленне татараў да сваёй спермы. Яны не раскідваюцца ёй для задавальнення хцівасці, а выкарыстоўваюць толькі для нараджэння дзяцей[102].

У гэтым сцвярджэнні прасочваецца ўяўленне, што рэдкія сексуальныя стасункі робяць сперму мужчыны больш якаснай, а частыя – аслабляюць патэнцыю і сілу мужчыны. Аднак тут заўважны даволі павярхоўны агляд тэмы. Літвін або не ведаў дэталёва пра практыку стрымання семявывяржэння, або не хацеў пра яе грунтоўна распавядаць. Татары, як туркі і арабы, былі знаёмы з даасізмам. Ён прыйшоў з Кітая і меў добра распрацаваныя падручнікі па тэхніцы сексу. На гэты аспект жыцця звярталася шмат увагі, бо ён быў адным з элементаў, неабходных для доўгага і здаровага жыцця. Згодна з вучэннем мужчына павінен падоўжваць палавы акт на максімальна доўгі перыяд часу для таго, каб атрымаць

[97] Hejdensztejn R. Dzieje Polski. Ks. XII. T. 1. Petersburg, 1867. S. 7, 153; Kuchowicz Z. Miłość Staropolska. S. 429.

[98] ПСРЛ. Т. 35. С. 282.

[99] Tazbir J. Dewiacje obyczajowe // Studia nad kulturą staropolską. Prace wybrane / Red. S. Grzybowski. T. 4. Kraków, 2001. S. 254, 259; Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 333, 352–354, 376.

[100] Лобач У. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры. С. 241–242.

[101] Gabinet rękopisów BUW, sygn. 441, k. 474.

[102] Michalonis Lituani. De moribus tartarorum, lituanorum et moschorum. F. 27; Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 90.

больш энергіі ад жанчыны. Найвышэйшага піку энергія жанчыны дасягае падчас аргазму, таму мужчына абавязаны давесці яе да гэтага стану. Для стрымання семявывяржэння існавала дзве тэхнікі: *coitus reservatus* і *coitus obstructus*. Першая тэхніка патрабавала высокай канцэнтрацыі ў апошні момант: мужчыне трэба было заплюшчыць вочы, прыціснуць язык да нёба, выгнуць спіну і напружыць шыю. Так семявывяржэння не адбудзецца, і сперма застанецца ўнутры. Другая тэхніка таксама выкарыстоўвалася перад вывяржэннем. Мужчына хутка заціскаў указальным і сярэднім пальцамі левай рукі месца паміж машонкай і заднім праходам. Такім чынам семя пераводзілася ў мачавы пузыр. Акрамя таго, былі рэкамендацыі па семявывяржэнні ў залежнасці ад пары года, узросту і целаскладу. Напрыклад, моцны мужчына ў 15–20 гадоў можа выпускаць семя два разы ў дзень, слабы – адзін; у 30 гадоў – раз у дзень, слабы – раз у два дні. З узростам норма змяншалася. Пры гэтым канцэпцыя і тэхніка палавога акта для папаўнення энергіі і для зачацця дзіцяці адрознівалася[103].

Гэта тэхніка была даволі складанай, не кожны мужчына мог ёй авалодаць. Пры гэтым яна мела шмат пераваг. Стрыманне семявывяржэння дазваляла кантраляваць нараджальнасць не заўсёды на 100 %, але дастаткова эфектыўна. Акрамя таго, жаночы аргазм наступае пазней за мужчынскі і мае больш складаны механізм[104], таму доўгі палавы акт спрыяе інтарэсам жанчыны і даводзіць яе да максімальнага задавальнення. Аднак у даасізме рабілася гэта ў першую чаргу для папаўнення энергіі мужчыны.

З трактата Літвіна вынікае, што татары ведалі і практыкавалі гэту тэхніку. Яна прыйшла да іх з Кітая. Ад татараў інфармацыя дайшла да жыхароў ВКЛ. Аднак немагчыма дакладна казаць пра практыкаванне тэхнікі і яе распаўсюджанасць сярод нашых мужчын, хоць трактат быў вядомы ў краіне і меўся ў бібліятэках[105]. Тэхніка сапраўды была вартая пераймання, але для гэтага патрабаваліся падручнікі, настаўнікі і здольныя мужчыны.

У Еўропе таксама была вядомая тэхніка перарванага палавога акта – *coitus interruptus*. Мужчыне трэба было паспець да пачатку семявывяржэння вывесці з улоння жанчыны чэлес. Гэта быў адзін са спосабаў кантрацэпцыі, які забараняўся рэлігіяй як грахоўны[106]. Аднак і ён не даваў 100 % гарантыі ад цяжарнасці, бо за пару секундаў да семявывяржэння з'яўляюцца першыя сперматазоіды, прыдатныя для апладнення[107]. Можна толькі выказаць меркаванне, што

[103] Тэннехилл Р. Секс в истории. С. 158–160; ван Гулик Р. Искусство секса в Древнем Китае. С. 80, 205–206, 260–268, 375–381, 388–390.

[104] Пра спецыфіку аргазму гл.: Bancroft J. Seksualność człowieka. S. 79–100; Imieliński K. Seksiatria. Psychofizjologia seksualna. S. 319–328; Traish A. M., Kim N. N., Munarriz R. Biochemical and Physiological Mechanisms of Female Genital Sexual Arousal // Archives of Sexual Behavior. 2002. № 31. P. 393–400; Lloyd E. A. The Case of the Female Orgasm: Bias in the Science of Evolution. Cambridge; London, 2005; Mah K., Binik Y. Are Orgasms in the Mind or the Body? Psychosocial versus Physiological Correlates of Orgasmic Pleasure and Satisfaction // Journal of Sex & Marital Therapy. 2005. № 31. P. 187–200; Frith H. Orgasmic Bodies: The Orgasm in Contemporary Western Culture. Houndmills; New York, 2015 і інш.

[105] Голенченко Г. Я. Крупные светские частновладельческие библиотеки. С. 111.

[106] Stone L. The Family, Sex, and Marriage in England. P. 489, 501; Davidson N. Theology, Nature and the Law. P. 77–78.

[107] Imieliński K. Seksiatria. Psychofizjologia seksualna. S. 317–319.

ў нас мужчыны пра такі спосаб ведалі і практыкавалі яго. Праз вандроўкі была магчымасць пашырыць свой сексуальны далягляд. Але крыніцы не згадваюць пра валоданне гэтай тэхнікай.

Аднак казаць, што мужчыны ВКЛ цалкам кантралявалі сябе, было б яўным перабольшваннем іх магчымасцей. Яны ў гэтым плане былі такія ж, як і іншыя мужчыны. Распаўсюджаная ў свеце мудрасць справядліва заўважае: калі ўстае чэлес – губляецца розум. У той ці іншай інтэрпрэтацыі гэтая думка паўтараецца ад старажытнасці да сучаснасці[108].

Ва ўсе часы імпатэнцыя была мужчынскім сорамам. Праваслаўе, уніяцтва, пратэстантызм, каталіцызм лічылі яе слушнай прычынай для разводу, бо мужчына і жанчына ўжо не маглі жыць як муж і жонка і мець дзяцей. Сям'я не магла выконваць пракрэатыўную функцыю. Скасаванне шлюбу з-за мужчынскай імпатэнцыі адбывалася амаль без перашкод у царкоўным і свецкіх судах[109]. Уніяцкая царква лічыла "*неспособность до сполкованя*" перашкодай да шлюбу і вылучала два віды: часовае і вечнае. Для доказу недзеяздольнасці патрабавалася тры гады, а пасля даваўся развод[110].

Такія справы сустракаюцца ў розных саслоўях. На старабеларускай мове для тлумачэння разводу з-за імпатэнцыі выкарыстоўвалі наступныя выразы: "*не маючы мешканя такого, якое межи мужам и жену бывает, иж если не был способен на учинок свой мужской*" і "*з-за дефектов натуральных неспособность здоровя*"[111]. Не толькі ў нас скасоўвалі шлюб з-за імпатэнцыі. Напрыклад, духоўныя суды Іспаніі лічылі гэта слушнай прычынай для разводу[112]. Праблеме страты патэнцыі польскі паэт Ян Андрэй Морштын прысвяціў цэлы верш "Nagrobek kusiowi" ("Надмагілле чэлесу"), дзе ў жартаўлівай форме падаецца апісанне фізіялагічнай трагедыі[113].

Паводле тагачасных уяўленняў, моцная патэнцыя – гэта тое, што робіць мужчыну мужчынам. Яна дае ўпэўненасць у сабе, а магчымасць яе прадэманстраваць павышае самаацэнку. Адпаведна немагчымасць праявіць мужчынскасць адбіваецца адмоўна на рэпутацыі і статусе. Мужчынская моц не была прыватнай справай мужчыны. Ад яе праявы залежала сітуацыя ў сям'і, таму патэнцыя ці яе адсутнасць была не толькі прыватнай, але грамадскай сферай.

*Тэхнікі і практыкі ў сексе.* Інфармацыю пра тэхнічны і фізіялагічны бакі сексу можна было атрымаць з розных крыніц. ВКЛ мела трывалыя інтэлектуальныя кантакты з рознымі краінамі. Гэта дазваляла жыхарам атрымліваць звесткі

---

108 Кон И. С. Мужское тело. С. 35.

109 Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 136–139; Szczurowski T. Missya bialska. Prawo kanoniczne o wszystkich ustawach i dekretach synodalnych we wszelkich materiach i wydarzeniach. Kn. 1. Supraśl, 1792. S. 205.

110 Собрание припадков. С. 83 адв.

111 ИЮМ. Вып. 6. Витебск, 1876. С. 473; Вып. 10. Витебск, 1879. С. 446.

112 Behrend-Martinez E. Unfit for Marriage. Impotent Spouses on Trail in the Basque Region of Spain, 1650–1750. Reno, 2007.

113 ANK, ASang. 246; Morsztyn J. A. Utwory zebrane / Oprac. L. Kukulski. Warszawa, 1971. S. 313–316.

не толькі праз досвед, але і праз літаратуру. Адукаваныя людзі сярод шляхты і мяшчан імкнуліся мець уласныя бібліятэкі. Але ў сувязі з рознымі гістарычнымі падзеямі многія з іх дайшлі да нас толькі ў спісах. Шмат старадрукаў захоўваецца па-за межамі Беларусі. Вывучаючы розныя калекцыі, мы звярнулі ўвагу на наяўнасць сярод збораў замежнай літаратуры, якая датычыла тэматыкі інтымных стасункаў. Зразумела, наяўнасць кнігі ў бібліятэцы не азначала, што яе чыталі, а веды выкарыстоўвалі. Аднак можна казаць, што кнігі дайшлі да нашай краіны.

Пра анатомію, сексуальныя стасункі можна было даведацца з медыцынскай і мастацкай літаратуры. Медыцынскія творы, як правіла, былі на лацінскай мове. У іх утрымліваліся звесткі са старажытнагрэчаскай, старажытнарымскай, арабскай, сярэднявечнай і рэнесансавай еўрапейскай навукі. Крыніцы паказваюць, што да нас даходзіла новая на той час літаратура і пераклады антычных твораў. Гэта азначае, што інтэлектуальнае грамадства ведала апошнія еўрапейскія тэндэнцыі ў галіне медыцыны, а значыць, людзі мелі магчымасць атрымаць веды па анатоміі і фізіялогіі.

Працы па прыродазнаўстве функцыянавалі ў культурнай прасторы ВКЛ і актыўна выкарыстоўваліся. Напрыклад, Лаўрэнцій Зізаній згадваў кнігу пра жывёл Арыстоцеля падчас тлумачэння слоў *“неясыт”, “пелікан”*. Сымон Будны быў вельмі адукаваным для свайго часу чалавекам. У сваіх творах ён спасылаўся на філосафаў антычнасці, Сярэднявечча і Рэнесансу, між іншым згадваў Плінія Старэйшага[114]. Шматлікія цытаты антычных філосафаў прыводзіліся ў працы Беняша Буднага[115]. Гэтыя і іншыя прыклады сведчаць пра рэцэпцыю антычнай і еўрапейскай думкі і пераасэнсаванне яе ідэй у працах дзеячаў ВКЛ. Аднак заўважым, што ў нас больш друкавалася рэлігійная літаратура, а не прыродазнаўчая. У асноўным уласнікамі друкарняў былі прыхільнікі розных рэлігійных плыняў, што зрабіла ўплыў на выбар кніг.

Адзначым змест некаторых прац, якія сустрэліся ў кнігазборах. У спісе кніг С. Рысінскага згадваецца кніга па анатоміі французскага медыка Андрэ ду Лаўрэнса. У ёй даецца апісанне ўсіх органаў, звяртаецца ўвага на анатамічную спецыфіку мужчыны і жанчыны[116].

Асобныя творы ўтрымлівалі не тэхнічныя парады, а тлумачэнні фізіялагічных працэсаў. Такая інфармацыя мелася ў асобных тэматычных частках (палавы акт, сперма, менструацыя, цяжарнасць, зачацце, гермафрадыты, дзеці) з працы Псеўда-Арыстоцеля “Problemata”. Гэта праца, створаная ў форме пытанняў і адказаў, ахоплівала розныя тэмы пра цела мужчыны і жанчыны, а таксама іншыя пытанні. Яна была папулярная ў Еўропе з часоў Сярэднявечча, выкарыстоўвалася ва ўніверсітэтах, медыцынскіх колах, судах, перакладзена на розныя мовы. Акрамя таго, выйшаў шэраг прац розных аўтараў

---

[114] Зизаний Л. Лексис сиречъ реченія, въ кратъце събранны. Вильна, 1596. С. 24; Merczyng H. Szymon Budny jako krytyk tekstów biblijnych. Kraków, 1913. S. 149; Падокшын С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі.. С. 71–72, 81.

[115] Budny B. Krotkich a węzłowatych powieści. Lubcza, 1614.

[116] Laurentii A. Historia anatomica. P. 342–357.

з каментарамі[117]. Лацінскі варыянт кнігі быў у спісе віленскага бурмістра Стэфана Лебядзевіча, але без пазнакі месца і года выдання[118].

Кніга мела свецкі характар і на тагачасным узроўні тлумачыла асаблівасці чалавечага цела і працэсаў, якія з ім адбываюцца. Давалася вызначэнне палавога акта: "*Coitus est mutia action maris & faeminae, per instrumenta ad talem actum deputata, ad servuandam speciem*". Было выказана меркаванне, што арганізму наносілі шкоду частыя стасункі (парушаецца дыханне і высушваецца цела), стасункі пасля ежы (узнікаюць праблемы з страваваннем), лазні (адчыненыя поры хутка ахалоджваюць цела), ванітавання. Шкоднымі лічыліся і распусныя стасункі. Адзначалася, што часты секс змяншае жаданне. Аўтар падкрэсліваў, што сам палавы акт брудны і нізкі, і толькі фінальнае задавальненне прымушае чалавека яго практыкаваць[119]. Істотны момант пры апісанні сексу – гэта звяртанне ўвагі і на задавальненне, што, па сутнасці, супярэчыла хрысціянству. Калі падсумоўваць агульна прыведзеныя звесткі, то сексуальныя стасункі, якія адбываюцца ў адпаведны перыяд, не распусным чынам, спрыяюць здароўю, даюць здаровых дзяцей. Парушэнне правілаў прыводзіць да хвароб.

Твор Псеўда-Альберта Вялікага пра жаночыя сакрэты быў вядомы ў ВКЛ на лацінскай мове[120], пасля выйшаў яго пераклад на польскую. У ім звярталася ўвага на карысць сексуальных стасункаў для жанчын: "*Na ostatek wiedź, że łączęnie się z mężem białymgłowom iest pomocne, bo przez to zbytki wilgotne z nich odchodzą, a gorącość przyjmuią, ktora temperuie ich zimność. W meszczyźnie zaś opacznie się dzieie, zkąd białymgłowy często obcuiące z mężami, nie są tak krotkiego życia, iak mężowie; to świadczy natura wrobla, ktory dla częstey iurnośći zdycha*"[121]. Гэта парада базавалася на тым, што структура мужчыны гарачая, а жанчыны – халодная. Таму секс карысны жанчыне як сродак разагрэву, а для мужчын гэта мела адваротнае дзеянне. Пад лішкамі вільгаці ў жанчыны разумеліся яе фізіялагічныя асаблівасці: выдзяленне вадкасці падчас сексу.

Асобна былі пазначаны характарыстыкі "гарачай" і "халоднай" жанчыны. Жанчыны першага тыпу з радасцю кантактуюць з мужчынамі, атрымліваюць ад гэтага задавальненне, маюць цвёрдыя і поўныя грудзі, шмат грубых валасоў на целе, акрамя таго, смелыя з мужчынамі, вясёлыя, любяць выпіць, прыгожа апранаюцца, часта бываюць у грамадскіх месцах. Другі тып мае мала валасоў на целе, мяккія грудзі, цела падобнае да мужчынскага, бледны твар, слаба гаворыць[122]. Гэта інфармацыя пададзена для далейшай характарыстыкі асаблівасцей

[117] У навуцы абмяркоўвалася аўтарства твора, яго ўплыў на развіццё навукі і іншыя аспекты, гл.: Aristotle's Problemata in Different Times and Tongues. Leuven, 2006; Wallis F. Giulio Guastavini's Commentary. P. 57–73; Wexler S. Re-evaluating Aristotle's Problems // International Zeitschrift. 2009. Vol. 5. № 2. Рэжым доступу: http://www.zeitschrift.co.uk/v5n2swexler.html; Carré A., Cifuentes L. Girolamo Manfredi's Il Perché. P. 13–38.

[118] Frick D. Wilnianie. S. 191.

[119] Problemata Aristotelis. Paganus, 1557. P. 105–109, 160, 166, 223.

[120] Кніга была шмат разоў перавыдадзена і мела назву на латыні: Albertus Magnus. De secretis mulierum. Item, de virtutibus herbarum, lapidum et animalium. Amstelodami, 1655, 1669 і інш.

[121] Albertus Magnus. O sekretach białogłowskich. S. 31–32.

[122] Ibid. S. 383–386.

цяжарнасці двух тыпаў жанчын. Па сутнасці, медыкі ВКЛ ведалі гэтыя і іншыя працы, але ці даходзілі веды да іх асяроддзя, да хворых, ці давалі ўрачы ім сваю ўласную ацэнку, гэта сказаць цяжка.

Дадатковую інфармацыю можна было атрымаць з мастацкай літаратуры. Так, у "Аповесці пра Атылу" адзначалася, што празмернае ўжыванне алкаголю перад сексам і празмернае фізічнае задавальненне для мужчын, старэйшых за 50 гадоў, можа прывесці да смерці[123]. Пра эратычныя прыгоды падчас падарожжаў, метады спакусы і іншае можна было пачытаць у "Дэкамероне".

У творы "Страшны Герой" Франчэска Андрэіні давалася апісанне, як працуе натуральны інстынкт у мужчын. Спачатку іх прываблівае выгляд, а пасля ўжо разбіраюцца, ці варты быў прадмет кахання: "*To pierwsz upodobanie zrządzone obaczeniem subiecti rodzi się w nas z instynktu naturalnego, lecz poznawszy, wyrozymiawszym y uwazywszy merita & demerita, tey w ktorey się kochamy upodobanie, do swey przychodzi wolności, y iuż godność kochać, a niegodność nie kochać osoby roskazuie*". Як і цяпер, візуалізацыя для мужчыны мела першаснае значэнне. У іншым выказванні тэма развіваецца далей, падкрэсліваецца, што хцівасць зняволье і адбірае розум: "*Przez zręnicę do serca, a z serca skoro miłość dopadła intellektu mego, zaraz chciwoć mię tak uięła, y z niewoliła, że teyże godziny on affekt miłoscnego zawzięcia, radbym był podał do wiadomości ukochaney Damy, w czym pokazała mi miłość y matka iey Venera wielki fawor*"[124]. Хоць у творы гэта пачуццё называецца каханнем, але больш яно характэрна для фізіялагічнага жадання, якое цалкам падпарадкоўвае мужчыну. Гэта думка пацвярджаецца меркаваннем, што Купідон жыве паміж ног Венеры: улонне правакуе жарсці, а не каханне.

У маралізатарскіх творах можна было знайсці не толькі павучэнні пра прыстойныя паводзіны, але і апісанні метадаў спакушэння жанчын, якімі традыцыйна карысталіся мужчыны. Зразумела, яны лічыліся непрыстойнымі. Апісваючы сустрэчы, якія маглі адбыцца як у горадзе, так і ў вёсцы, Андрэй Мадрэўскі адзначаў: Бахус падштурхоўвае да Венеры, бо спрыяе разнявольванню. Мужчыны падпойвалі жанчын, паказвалі малюнкі з непрыстойнымі сцэнамі, вялі адпаведныя размовы. Атмасферы спрыяла спяванне распусных песняў і танцы. Пасля мужчыны адхіналі вопратку, цалавалі, шчыпалі, разняволена мацалі жанчын. Такое каханне ацэньвалася як нешчаслівае для замужніх і дзяўчат[125].

Агульна прынятая традыцыя надавала актыўнасць у сексе мужчыну. Жанчына, як правіла, прымала яго жаданні. Аднак у крыніцах часам сустракаецца інфармацыя і пра ініцыятыўных жанчын. Пра іх тагачасная прымаўка казала: "*Miłośnice, drapieżnice*"[126]. Міхалон Літвін пісаў пра заможных жанчын, якія жывуць пад відам удаўства ці дзявоцтва, пры гэтым праяўляюць жаданні ў дачыненні да сваіх падданых, нават іх пераследуюць[127]. Канцлер ВКЛ Альбрэхт Станіслаў Радзівіл апісваў выпадак спакушэння манашкай манаха. У выніку яна нарадзіла

[123] Веселовский А. Н. Из истории романа и повести. С. 232.

[124] Andreini F. Bohatyr Straszny. S. 24–25, 98.

[125] Modrzewski Fricz A. O poprawie Rzeczypospolitey. S. 53–55.

[126] Proverbiorum Polonicorum. P. E 3v, Centuria 9:10.

[127] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 90.

дзіця, якое забіла і пахавала пры алтары. Цела было знойдзена, манашка пакарана смерцю, а манах быў збіты розгамі і адпраўлены ў вязніцу (1646). Але не менш цікавыя высновы Радзівіла аб небяспецы кантактаў з манашкамі. Жанчына, нават у манаскім абліччы, зможа прынесці непрыемнасці. Жанчыны-спакусніцы фігуравалі ў жыцці святых. Нейкая распусніца безвынікова спрабавала спакусіць Язафата Кунцэвіча[128]. Як вынікае зназіранняў прачкі Барбары Паўлавай, Зафея Радзівілаўна мела тэмперамент і прагу да сексу з каханкам С. Тымінскім. Яна не саромелася пускаць яго да сябе праз вакно, калі муж быў у маёнтку (1607)[129].

Ян Андрэй Морштын у вершы "Nagrobek kusiowi" ("Надмагілле чэлесу") апісаў смутак жанчын розных нацыянальнасцей з нагоды "смерці" чэлеса. Пры гэтым падаюцца іх характарыстыкі ў адпаведнасці з іх паводзінамі ў сексуальнай сферы. Сярод іншых згадваюцца літвінкі, якія адрозніваюцца моцнай схільнасцю да сексу:

...Płacze jurna Hiszpanka, co sobie kiep goli,
I Francuzka, co pewnie kusia niż chleb woli,
Płacze Włoszka, u której miewał dwie piwnice,
I Angielka, do której nie trzeba zwodnice,
Płacze leniwa w łóżku Polka i co taje
Z lubnością Niemka, jak jej dotknie męskie jaje,
Płacze Żydówka, co go bez kapturka znała,
I Ruska, co go sobie czarami jednała,
I jebliwa Litewka roztachana bieży
I łamiąc ręce krzyczy: "Tu korol kuś leży!"
I bijąc w łono, woła: "Jakby nas powarzył!
Któż mi tu, kto w tych pustkach będzie gospodarzył?"[130].

Даволі складанае пытанне – гэта працягласць палавога акта. Бытаваў стэрэатып, што жаночае ўлонне ненасытнае. Прымаўка казала: "*Trzy rzeczy nienasycone, a czwarta nie mowi dosic. Piekło, łono białogłowskie, ziemia, a ogien nigdy nie mowi dosic*"[131]. Яе паходжанне было звязана з асаблівасцямі жаночага арганізма. Жанчыне патрабуецца значна больш часу, каб атрымаць задавальненне. Далёка не кожны мужчына здольны кантраляваць сябе даўжэй чым 3 хвіліны і давесці жанчыну да аргазму, а тым больш хутка аднавіць сілы для паўторных актаў. Напрыклад, "Аповесць пра Баву" апісвае сексуальныя кантакты Бавы і Дружнены тройчы за ноч[132].

Акрамя таго, ад партнёра ў сексе чакалася актыўнасць, нікога не радавала пасіўнае ляжанне:

Ці ты спіш, ці ляжыш,
Ці якое ліха?
Я дзяруся і чашуся,
А ты ляжыш ціха![133]

---

[128] Radziwiłł A. S. Pamiętnik o dziejach w Polsce. T. 2. Warszawa, 1980. S. 503; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 277.

[129] Sajkowski A. Opowieści. S. 321.

[130] Morsztyn J. A. Utwory zebrane / Oprac. L. Kukulski. Warszawa, 1971. S. 315–316.

[131] VUB, f. 3-2239, l. 60–60v.

[132] Веселовский А. Н. Из истории романа и повести. Вып. 2. С. 154.

[133] Federowski M. Lud białoruski. T. VI. S. 36.

Яшчэ больш цяжка праводзіць даследаванні па сексуальным задавальненні партнёраў. У сувязі з фізіялагічнымі асаблівасцямі ў мужчыны механізм атрымання аргазму просты. Дасягаецца ён заўсёды, пачынаючы з першага сексуальнага вопыту, за выключэннем хвароб і паталогій[134]. Калі мужчынскія жаданні ў сексуальнай сферы не атрымлівалі рэалізацыі ў шлюбе, то для гэтага карысталіся паслугамі прастытутак[135].

Жаночы аргазм мае складаную структуру, патрабуе паступовага развіцця. Нават па даследаваннях групы амерыканскіх навукоўцаў пад кіраўніцтвам А. Кінсі 1953 г. вынікала, што на першым годзе шлюбу дасягалі аргазму толькі 25 % жанчын[136]. Ва ўмовах XVI–XVII стст. гэта азначала рэдкую магчымасць для жанчыны развіць сваю сексуальнасць, бо для гэтага патрабаваўся вопыт. Аднак, у адрозненне ад сітуацыі ў мужчын, для рэалізацыі пракрэатыўнай функцыі жанчыны не мае значэння ступень яе задавальнення, таму і ўвага мужчын на гэта мала звярталася. Пры гэтым варта ўлічыць, што штодзённае жыццё большай часткі насельніцтва (мяшчан і сялян) было прысвечана захаванню жыццядзейнасці. Таму час для сексуальных практык мелі ў асноўным заможныя людзі або вельмі хцівыя.

Медыцынская думка Італіі абмяркоўвала праблему жаночага задавальнення падчас сексу. У XVI ст. прафесары медыцыны лічылі, што мужчына і жанчына маюць сексуальныя жаданні. Да таго ж прапаноўваліся розныя спосабы, каб задаволіць жанчыну[137]. Зварот навукоўцаў да структуры і функцыянавання палавых органаў быў невыпадковым, гэтая тэма заставалася таямніцай, якая ўзбуджала цікавасць. Леанарда да Вінчы, вывучаючы праблему сексуальных кантактаў, пісаў пра чаканні партнёраў: “*Жанчыны любяць вялікі чэлес, а мужчыны чакаюць ад жаночага ўлоння чагосьці адваротнага. Ніхто не мае таго, чаго прагне*”[138]. Ён меў рацыю. Многім жанчынам важная глыбіня пранікнення, а мужчынам – максімальна шчыльнае ахопліванне чэлеса. Аднак калі мужчынскае стаўленне да сексу і рэакцыю можна заўважыць у кнігах і дзённіках, то жаночых нататак у Еўропе пра інтымнае жыццё не выяўлена[139]. Маўклівымі на гэты конт засталіся і жанчыны ВКЛ, а мужчыны пазбягалі дэталяў інтымнай сферы ў сваіх дзённіках і мемуарах.

Аднак учынкі часам больш кажуць, чым словы. Тое, што фізічнае задавальненне мела значэнне для мужчын і жанчын, сведчаць справы пра перадюб. Жарсці авалодвалі людзьмі так, што не палохала нават пагроза смяротнага пакарання. Шлюбная здрада мела месца ва ўсіх саслоўях. У справе гарадзенскага мешчаніна Юзафа Каваліцкага і яго жонкі Рэгіны Лукашоўны падчас

[134] Imieliński K. Seksiatria. Psychofizjologia seksualna. S. 317–319; Imieliński K. Seksiatria. Patologia seksualna. S. 6–19.

[135] У працы змешчаны вершы, якія апісваюць дамы распусты, а таксама шляхаводнікі па адпаведных месцах Варшавы. Але пры гэтым шмат увагі аддаецца спосабам сексуальнага задавальнення. Гэтыя крыніцы можна выкарыстоўваць для аналізу сітуацыі ў ВКЛ, бо ствараліся яны ў шляхецкім коле нашай краіны. Rabowicz E. Oświeceniowe “przewodniki”.

[136] Imieliński K. Seksiatria. Psychofizjologia seksualna. S. 319–328.

[137] Davidson N. Theology, Nature and the Law. P. 81–82.

[138] Friedman D. Pan niepokorny. S. 73.

[139] Stone L. The Family, Sex, and Marriage in England. P. 490, 552–559.

правядзення следства за 9 ліпеня 1674 г. задаваліся пытанні пра маральны стан жанчыны і высвятлялася, ад каго ў яе дачка. Сярод іншых сведчанняў прагучала цікавае выказванне пана Візапольскага. Рэгіна служыла ў яго два тыдні, і ён хацеў пакінуць яе на год. Аднак яна "*tęskniła ze według swego upodobania męs(z)czyzny nie miała*"[140]. Мы ўлічваем, што цытата жанчыны зроблена з іншых слоў. Калі яна прыведзена блізка да тэксту, то паказвае дасведчанасць мяшчанкі ў практыцы сексу, а таксама веданне памкненняў свайго цела. Зразумела, чаму такая жанчына не магла доўга заставацца са сваім мужам.

Крыніцы захавалі нам урыўкавыя звесткі пра практыку сексу. Старажытныя пяшчоты, вядомыя не толькі ў нас, але і ў іншых народаў, – гэта пацалункі і абдымкі. Пра іх выкарыстанне сведчыць пас з анёлкамі пад самай столлю, якія абдымаюцца і цалуюцца. Ён знаходзіцца ў касцёле Св. Пятра і Паўла ў Вільні. Абдымкі Адама і Евы бачны на тытульнай старонцы Берасцейскай Бібліі 1563 г. Пра пацалункі прыгожа напісана ў старабеларускім перакладзе "Найвышэйшай песні Саламонавай"[141]: "*Оцалуймя поцалованиемъ оустъ своих ялко лепшая суть милости твоя надъ вино войннейшаа над масти драгие*", "*Сотъ каплющий оуста твоя невесто. Мед и млеко подъ языкомъ твоимъ*"[142].

Пра паходжанне звычаю цалавання апавядаў Ян Пратасовіч у творы "*Inventores rerum albo Krótkie opisanie kto co wynalazł i do używania ludziom podał*" (1608): пацалункі ўзніклі ці то ў старажытных жыдоў, ці то ў уцекачоў з Троі, ці то ў рымлянаў. Плутарх апісвае традыцыю рымскіх патрыцыяў, вярнуўшыся дадому, цалаваць сваіх жонак, каб даведацца, ці не пілі тыя падчас іхняй адсутнасці віна. Паэт лічыў, што такія жанчыны варты кія, а не пацалункаў:

Lecz tu rychlej niż wino gorzałkę poczuje,
Bowiem się takich siła białychgłów najduje,
Iż się gorzałką miłą nadobnie uraczą,
Że czasem ledwie mężów swych przed sobą baczą.
Przeto takich by najmniej nie trzeba całować
Ale raczej sporego kija nie żałować,
Okładając po grzbiecie, aby jej nie piła,
Lecz raczej gospodarstwa swego pilna była[143].

Аральны секс быў вядомы ў практыцы. З працы Псеўда-Арыстоцеля вынікала, што аральныя стасункі нельга лічыць сексам, бо яны не прыводзяць да зачацця дзяцей – семя, калі трапляе ў рот, знішчаецца ў сістэме стрававання[144].

Верш Д. Набароўскага таксама сведчыць пра знаёмасць з гэтай тэхнікай. Магчыма, гэтым бавіліся Ян Сабескі і Марыя Казіміра, бо згадвалі ў лістах пацалункі па ўсім целе[145]: "*Całuję zatem wszystkie śliczności i mile ściskam najśliczniej-*

[140] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 376 – 376 адв.; Сліж Н. Злачынства і злачынцы ў Гародні. С. 151–152.

[141] Гэты твор у Бібліі Ф. Скарыны, а таксама ў Берасцейскай Бібліі, у іншых выданнях прадстаўлены як размова Царквы і Хрыста. Такім чынам эратычнаму твору было нададзена рэлігійнае гучанне. Біблія Ф. Скарыны ўтрымлівае не ўсе вершы.

[142] Біблія: факс. узнаўленне Бібліі, выд. Ф. Скарынаю ў 1517–1519 гг. Т. 3. Мінск, 1991. С. 425, 432.

[143] Кавалёў С. Шматмоўная паэзія. С. 316–318.

[144] Problemata Aristotelis. Paganus, 1557. P. 108.

[145] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 290.

*szego ciałeczka Wci serca mego jedynego*", "*Całuję zatem najśliczne stopeczki, rączki i wszystkie wdzięcznoćsi najśliczniejszego ciałeczka*"[146]. Хаця не выключаем, што гэта мог быць і кампліментарны зварот да жонкі.

Аральны секс згадваецца ў беларускім фальклоры. Вельмі яскрава такі спосаб сексуальнага кантакту паказвае наступны верш:

Як за лесам, за буйракам
Там стаяла баба ракам,
А дурань думаў капліца
Дай давай туды маліцца[147].

Іншы варыянт гэтага верша:

Ішла баба церaз кладку
Ды задрала ногу.
А дзед думаў, што ікона –
Памаліўся Богу.

Брешыця, сватки, брешыця,
Аб кол языки чэшиця.
Свашышки-голубятчки,
Паймайця зайца,
Паставьця яго на лавы
И пацалуйця яму у яйцы[148].

Зыходзячы са спавядальных чыноў, можна сцвярджаць пра практыкаванне стымуляцыі грудзей і палавых органаў рукамі[149]. Пра пяшчоты грудзі адзначаецца ў "Найвышэйшай песні Саламонавай": "*Рано встанмы на винницe, соглядаймо естьли же есть зацвила винница... Тамо дамъ тобе перси мое*"[150]. Твор натхніў Збігнева Морштына напісаць верш на гэту тэму[151]. "Аповесць пра Баву" апісвае, як галоўны герой перад сексам схапіў Дружнену за грудзі[152]. Гэта частка жаночага цела заўсёды прыцягвала і хвалявала мужчын, таму не дзіўна, што ім прысвечаны літаратурныя творы.

Дотык да жаночых грудзей спрыяў хуткаму ўзбуджэнню мужчыны. Аб гэтым наўпрост пішацца ў загадцы, якая змешчана ў рукапісе Крыштафа Завішы:

*Anigma*
Parę jabłek od Ewy w Raiu zdobycz swoię
Damy u piersi noszą dzis na załość moię.
Ktorych skoro się dotknę ręką Adamową,
Wąz pomysłą tego grzechu podnosci tam głową[153].

---

[146] Maria Kazimiera i Jan Sobiescy. Listy okresy odsieczy wiedeńskiej / Wstęp Z. Wójcik. Warszawa, 1983. S. 64, 83, 92, 125, 135, 136.

[147] Аничков Е. В. Язычество и Древняя Русь. СПб., 1914. С. 375; Лобач У. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры. С. 238.

[148] Могилёвские свадебные песни. С. 178.

[149] Ілюстрацыя са стымуляваннем жаночых палавых органаў змешчана ў: Carracci A. L'Arétin d'Augustin Carrache ou Recueil de Postures Érotiques, d'Après les Gravures à l'Eau-Forte par cet Artiste Célèbre, Avec le Texte Explicatif des Sujets. Paris, 1798. Il. P. 64.

[150] Біблія: Факс. Т. 3. С. 438–439.

[151] Helikon sarmacki. S. 425–426.

[152] Веселовский А. Н. Из истории романа и повести. Вып. 2. С. 154.

[153] VUB, f. 3-2239, l. 91.

Разнастайнасць, а таксама прадухіленне цяжарнасці даваў анальны секс, але ён адносіўся да ліку грахоўных[154]. Каталіцкая царква выступала супраць такіх стасункаў. А магістрат Венецыі публічна абвясціў у 1511 г., што прастытуткі, якія практыкуюць анальны секс, будуць выкінуты з прафесіі[155]. А ў XV ст. там сустракаюцца выпадкі пакарання мужоў за выкарыстанне гэтай практыкі з жонкамі[156]. Гэты від сексу лічыўся брыдкім і непрыстойным, хоць практыкаваўся ў Рэчы Паспалітай. У польскага шляхціча Станіслава Нямоеўскага выклікала пачуццё агіды апавяданне маскоўскага папа пра анальныя стасункі з жонкай, для якога гэта быў спосаб кантрацэпцыі, бо ўжо меў на той час 12 дзяцей. Шляхціч быў здзіўлены распаўсюджанасцю гэтай з'явы ў Расіі (1606)[157]. Пра практыкаванне там гэтай тэхнікі сведчыць таксама Адам Алеары[158].

Групавы секс таксама лічыўся грахоўным. Аднак эксперыментатары ў гэтай галіне былі. У шлюбаразводным працэсе магілёўскага мешчаніна Багдана Лук'янавіча і Уліты згадваецца, што жонка на яго вачах, у яго доме, здраджвала з некалькімі казакамі і пасля з імі з'ехала ў Маскву (1610)[159]. Пра ўсеагульную распусту сярод гасцей на вяселлях пісаў Паўль Одэрборн[160].

У еўрапейскіх краінах таксама быў вядомы адначасовы секс з некалькімі партнёрамі. Знакаміты альбом "*I Modi*" ("Шляхі" ці "16 спосабаў задавальнення") утрымлівае выяву з групавым сексам. На ёй мужчына ўдзельнічае ў палавым акце з жанчынай, а яго нага выкарыстоўваецца другім мужчынам для стымуляцыі чэлеса[161].

Мастурбацыя з'яўляецца старажытнай формай самазадавальнення[162]. Гэта была адна з самых бяспечных формаў сексу, якая не пагражала цяжарнасцю і венерычнымі захворваннямі. Аднак праваслаўе, каталіцызм і пратэстантызм самазадавальненне адносілі да грахоўных дзеянняў[163], бо яно распальвала сексуальнае жаданне і не прыводзіла да нараджэння дзяцей. Кіраваліся словамі апостала Паўла: "*Не льстите себе. Ни блудницы, ни идолослужители, ни прелюбодее, не сквернители, ни малакия, не мужеложницы, ни лихоимцы, ни тати, ни пияницы, не досадителе, ни хищницы ц(а)рствия Б(о)жия не наследятъ*"[164]. Тыя, хто зай-

---

[154] Катэхізіс: помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст. С. 112; Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 288, 291.

[155] Davidson N. Theology, Nature and the Law. P. 87.

[156] Ruggiero G. The Boundaries of Eros. P. 119–120.

[157] Pamiętnik Stanisława Niemojewskiego (1606–1608). Lwów, 1899. S. 98–99; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 322.

[158] Из записок иностранных путешественников XVI–XVII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 139.

[159] ИЮМ. Вып. 7. Витебск, 1877. С. 297–300; Bardach J. Świecki charakter zwyczajowego prawa małżeńskiego ludności ruskiej Wielkiego Księstwa Litewskiego (XV–XVII wieku) // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1963. T. XV. Z. I. S. 118.

[160] Одэрборн П. Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў. С. 167–189.

[161] Carracci A. L'Arétin. P. 73.

[162] Peakman J. The Pleasure's All Mine. A History of Perverse Sex. London, 2013. P. 47–48.

[163] Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 294; Tazbir J. Dewiacje obyczajowe. S. 253–255.

[164] Апостол. Вильна, 1595. С. 135. У Новым Запавеце 1568 г. выкарыстана слова "roskosznicy", верагодна, як назва аматараў цялесных задавальненняў. Nowy Thestament z greckiego na polski ięzyk z pilnośćią przełożony. Nieśwież, 1568. S. SIIIv.

маўся мастурбацыяй, былі пастаўлены ў лік грэшнікаў разам з п'яніцамі, язычнікамі і інш. Уніяцкія святары таксама адносілі мастурбацыю да граху. Прычым яна лічылася пералюбам, калі падчас працэсу мужчына ўяўляў замужнюю жанчыну. Дзеянне насіла менш грахоўны характар, калі ў фантазіях не прысутнічалі асобы і падзеі. Не адносілася да граху вывяржэнне падчас сну[165].

Еўрапейскія тэолагі практыкаванне ананізму трактавалі даволі негатыўна. Ён лічыўся сродкам пазбягання шлюбных дачыненняў. Таму мужчыны, якія займаліся самазадавальненнем, захоўвалі гэта ў таямніцы. Пытанне абмяркоўвалася ў літаратуры. Медыкі лічылі мастурбацыю карыснай для здароўя. У 1710 г. у Лондане выйшла кніга "Ананізм" ("Onania"), якая закранала практыкі самазадавальнення. Яна атрымала надзвычайную папулярнасць і была перакладзена на розныя мовы[166]. Мастурбацыю, як правіла, выкарыстоўвалі для зняцця сексуальнай напружанасці пры адсутнасці партнёра[167]. Выпадкамі публічнай мастурбацыі на банкетах вядомы Караль Радзівіл "Пане Каханку"[168].

Рэлігійная літаратура XVI–XVII стст. акцэнтавала асноўную ўвагу на мужчынскай мастурбацыі. Адзначаліся наступныя тэхнікі: стымуляцыя палавых органаў сваімі рукамі, рукамі ці сцёгнамі партнёра. Здзяйсняць самазадавальненне мужчына мог лежачы ніцма на ложку ці на вопратцы. Для гэтай мэты таксама выкарыстоўвалася дзірка ў дрэве[169]. Па сутнасці, крыніцы адрознівалі мастурбацыю як сродак самазадавальнення і ўзаемазадавальнення. Такі ж падыход існуе цяпер у сексалогіі[170]. Беларуская традыцыйная культура да мастурбацыі ставілася спакойна, як да сродку зняцця напругі[171].

Даволі складаны момант у даследаванні – гэта позы, бо адмысловых падручнікаў, створаных у ВКЛ, не было. Таксама цяжка вызначыць распаўсюджанасць тут такой замежнай літаратуры. У Еўропе было толькі некалькі выданняў практычнага характару па сексуальных позах. Але яны значна адставалі ад кітайскіх падручнікаў[172]. Эратычны альбом *"I Modi"* ўтрымліваў наступныя позы: місіянерская поза – ляжачая, тварам да твару, самая распаўсюджаная поза ў еўрапейскіх народаў[173]; адваротная поза – мужчына ляжыць, а жанчына сядзіць на ім, павярнуўшыся спінай; у варыяцыі гэтай позы нага мужчыны закінута на нагу жанчыны; варыяцыя місіянерскай позы – жанчына на ўзвышэнні паўляжыць,

---

165 Собрание припадков. С. 113; Koronczewski A. Teologia moralna. S. 312.

166 Friedman D. Pan niepokorny. S. 106–111; Matthews-Grico S. Ciało i seksualność. S. 191–193; Peakman J. The Pleasure's All Mine. P. 51–55.

167 Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 323.

168 Tazbir J. Dewiacje obyczajowe. S. 264.

169 Марзалюк І. Матрыманіяльнасць і секс. С. 135; Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 288, 291.

170 Сучасная навука даследуе мастурбацыю ў вельмі шырокім кантэксце: ад гісторыі да тэрапіі. Masturbation as a Means of Achieving Sexual Health / Ed. by W. Bockting, E. Coleman. New York, 2012; Knowles J. Masturbation – From Stigma to Sexual Health // Katharine Dexter McCormick Library / Planned Parenthood Federation of America, Inc. Retrieved 29 July 2006. Рэжым доступу: https://www.plannedparenthood.org/files/5513/9611/7867/masturbation_11-02.pdf.

171 Лобач У. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры. С. 239.

172 Stone L. The Family, Sex, and Marriage in England. P. 493–494.

173 Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 294.

мужчына стаіць; поза стоячы – мужчына на руках трымае жанчыну, адна яе нага закінута яму на плячо; варыяцыя гэтай позы – абедзве нагі жанчыны на поясе мужчыны; адваротная поза – мужчына ўнізе, а жанчына ляжыць на ім; варыяцыя місіянерскай позы – жанчына сядзіць на ўзвышшы, а мужчына стаіць на каленях; варыяцыя місіянерскай позы – мужчына і жанчына ляжаць на баку, павёрнутыя адно да другога; "поза жабы" – мужчына стаіць і трымае жанчыну за клубы, а жанчына, павярнуўшыся спінай, практычна вісіць, толькі рукі на падлозе; варыяцыя місіянерскай позы – жанчына ляжыць на высокім ложку, пад спінай падушка, а мужчына стаіць; варыяцыя місіянерскай позы – жанчына сядзіць на ўзвышшы, а мужчына стаіць; жанчына паўляжыць, крыху звесіўшыся з ложка, а мужчына трымае яе за нагу; поза стоячы – жанчына паўляжыць на ложку, мужчына стаіць, яе нага закінута яму на плячо; варыяцыя місіянерскай позы – жанчына ляжыць на ложку, а мужчына стаіць на каленях; поза ззаду – жанчына стаіць на каленях і руках, а мужчына – ззаду[174].

Апісаныя вышэй позы дапамагалі зрабіць сексуальнае жыццё больш разнастайным. Пра іх было вядома яшчэ з часоў Старажытных Грэцыі і Рыма. На прадметах побыту і мастацтва захаваліся выявы розных поз: місіянерскай, позы "вершніца" і інш.[175] Так як жыхары ВКЛ наведвалі Італію, то напэўна мелі магчымасць азнаёміцца з еўрапейскімі тэхнікамі. Тым больш, што італьянцы лічыліся знаўцамі сексу. Аднак крыніцы не дазваляюць правесці грунтоўнае даследаванне па выкарыстанні гэтых ведаў.

Карыстаўся папулярнасцю ў Англіі "Шэдэўр Арыстоцеля", які ўпершыню быў надрукаваны ў Лондане ў 1684 г., а пасля неаднаразова перавыдаваўся. Кніга непасрэдна прысвечана сексуальным стасункам, анатоміі, сямейным дачыненням і іншым пытанням[176].

Варта адзначыць, што пары, якія хацелі зрабіць сваё сексуальнае жыццё больш разнастайным, адразу траплялі ў лік грэшнікаў. Напрыклад, у праваслаўі грахом лічыліся аральны і анальны секс, мастурбацыя, глыбокі пацалунак, крананне вуснамі грудзей і палавых органаў, стымуляцыя палавых органаў рукамі, позы "вершніца", "ззаду", перавернутая поза "6 на 9"[177]. Каталіцызм дазваляў толькі місіянерскую позу. Усе разнастайнасці і тэхнікі лічыліся грахоўнымі[178]. Базылянскі святар Дземетры Занкевіч да садаміі адносіў незвычайныя стасункі паміж мужчынам і жанчынай, а канкрэтна – анальны секс, бо далей да гэтай жа катэгорыі адносіўся секс паміж мужчынамі. Смяротным грахом супраць натуры вызначаў выкарыстанне розных поз у практыцы: "*...iako bestyie głupie z sobą*

[174] У кнізе 1798 г. апісаныя позы маюць назвы ад імёнаў антычных герояў. Carracci A. L'Arétin. P. 5, 9, 13, 17, 21, 25, 29, 33, 37, 41, 44, 49, 53, 57, 61, 69, 77.

[175] Выявы з позамі часоў Старажытных Грэцыі і Рыма можна пабачыць на старонцы: Sex and Erotic in Greek and Roman Arts. Рэжым доступу: http://www.flickriver.com/photos/carolemage/sets/72157633026810785.

[176] Інфармацыя пра выданне і яго змест гл.: Aristotle's Masterpiece. Рэжым доступу: https://en.wikipedia.org/wiki/Aristotle%27s_Masterpiece.

[177] Канонические церковные памятники XIII–XVIII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 22–25, 28–107; Левина Е. Секс и общество в мире православных христиан, 900–1700 // "А се грехи злые смертные..." С. 312–315; Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 285–292.

[178] Davidson N. Theology, Nature and the Law. P. 76–78.

*schodzą, sromotnie z tyłu, z boku stojąc, śiedząc, podnosząc się niezwyczajnie*”[179]. У дадзеным выпадку меліся на ўвазе позы “ззаду”, “вершніца”. Поза “стоячы збоку” магла мець розныя інтэрпрэтацыі: стоячы; жанчына паўляжыць на ложку, а мужчына стаіць і інш. Пералічваючы грахоўныя стасункі, аўтар лічыў, што яны шкодзяць натуры, чалавечай прыродзе і не з’яўляюцца нормай для людзей. Таксама анальныя стасункі адносілі да садаміі ў іншых працах, нават адзначалася, што садамія няпоўная, калі семя выпушчана ўбок[180]. Такое трактаванне разнастайнасці ішло з рэлігійнага пераканання, што ўсе праявы цялеснага задавальнення шкодзяць натуры чалавечай, адпаведна – духоўнаму.

Ці паводзілі сябе вернікі згодна з прадпісаннямі, дакладна ўявіць цяжка, але пералік грахоўных тэхнік дазваляе казаць пра практыку ў ВКЛ як мінімум чатырох поз. Таксама складана вызначыць, наколькі была папулярна рэлігійная літаратура і наколькі ёй кіраваліся ў жыцці.

У народнай культуры беларусаў вядомы позы місіянерская, “ззаду”, “вершніца”. У радзіннай абрадавасці галоўнымі героямі гісторый былі кум і кума. Праз апісанне іх дачыненняў апавядалася пра сексуальныя стасункі[181]:

Кума, кума, задзяры ногу,
А кум скажа хвала Богу[182].

Я и сплю – бирягуся,
Пирядом ни лажуся.
А чорт яго збирядэтся,
Ён и з заду прыгарнецца[183].

Ілюстрацыя з карты рэчкі Гарынь у Мазырскім павеце сведчыць, што была вядома поза “стоячы”. Постаці мужчыны і жанчыны намаляваны схематычна на фоне рэчкі, але бачна ўлонне і мужчынскі чэлес ва ўзбуджаным стане. Поза больш падыходзіць для людзей прыкладна аднолькавага росту і даволі зручная для выкарыстання на прыродзе[184].

Пра жаданне ўдасканальвацца ў тэхніцы сексу сведчыць ліст караля Яна Сабескага 1675 г. да жонкі Марыны Казіміры. Калмык Астракан быў больш дасканалы ў сексе, чым французы, італьянцы, іспанцы і туркі. Ён распавёў пра 12 практычных поз, пра якія даведаўся ў калмыкаў. Таксама хваліўся, што ведае больш за тысячу сакрэтаў. Пісаў Сабескі жонцы з мэтай, каб яна падумала пра разнастайнасць іх сексуальнага жыцця[185].

Дасведчанасць калмыка ў інтымнай сферы жыцця тлумачыцца кантактамі калмыкаў з кітайцамі. Варта адзначыць, што на той час у Кітаі была ўжо даволі

---

179 Zankiewicz D. Wódz malutkich to jest nauka chrześcijańska. Supraśl, 1717. S. 337.

180 Собрание припадков. С. 113; Koronczewski A. Teologia moralna. Supraśl, 1779. S. 315.

181 Лобач У. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры. С. 233–234, 238.

182 Gabinet rękopisów BUW, sygn. 441, k. 463.

183 Могилёвские свадебные песни. С. 181.

184 На карце не адзначана дата, верагодна, канец XVIII ці пачатак XIX ст. НГАБ, ф. 1477, воп. 1, спр. 3176.

185 Żeleński-Boy T. Marysieńka Sobieska. Warszawa; Lwów, 1938. S. 343–344; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 294.

развітая навука па сексуальных практыках. Былі распрацаваны рэкамендацыі і надрукаваны альбомы з ілюстрацыямі розных поз[186]. Таму ў Азіяцкім рэгіёне менавіта Кітай меў уплыў на развіццё тэндэнцый у галіне інтымных стасункаў.

Ліст Яна Сабескага – гэта рэдкі выпадак, калі асоба не толькі азнаёмілася з тэорыяй у галіне сексу, але і жадала ўвесці новае ў сваю практыку. Вядома, што літвіны выязджалі за мяжу і мелі з іншаземцамі розныя кантакты, у тым ліку і сексуальныя. Аднак крыніцы не заўсёды даюць магчымасць непасрэдна прасачыць замежны ўплыў на сексуальную культуру.

Прыведзеныя звесткі па тэхніках сексу носяць фрагментарны характар. Яны не даюць магчымасці цалкам уявіць сітуацыю ў краіне і прааналізаваць, якія віды практык і як часта выкарыстоўвалі пары. Варыятыўнасць магла быць рознай, як само жыццё.

Старабеларуская практыка сексу з'яўляецца прадуктам грамадства, якое існавала ў канкрэтным гістарычным кантэксце. Грамадства было феадальным, адпаведна мела аграрны характар. Для яго была ўласціва традыцыйнасць, кансерватыўнасць, архаічнасць. Новыя павевы датычылі адукаваных людзей, якія мелі магчымасць вандраваць за мяжу, чытаць літаратуру. Але яны складалі невялікую частку насельніцтва.

На сексуальныя адносіны ў XVI–XVII стст. непасрэдным чынам паўплывалі заканадаўства, рэлігія, традыцыі, звычаі, саслоўная прыналежнасць. З пералічанага самым важным чыннікам была рэлігія, бо яна рэгламентавала тэхнікі і адзначала, якія з іх грахоўныя. Наяўнасць язычніцкіх вераванняў, а таксама фізічнае жаданне супрацьстаялі падпарадкаванню сексу рэлігіі і знішчэнню задавальнення. Узбагачаў практыку кантакт з іншымі культурамі. У ВКЛ практыкавалі не толькі місіянерскую позу, але і іншыя. Былі знаёмы розныя пяшчоты, пазавагінальны секс, групавы секс.

Для сексуальнага кантакту важныя былі наяўнасць партнёра, месца, валоданне тэхнікамі, здароўе, патэнцыя. Секс у шлюбе адносілі да катэгорыі неабходных абавязкаў. Задавальненне секс прыносіў там, дзе былі жарсці і прага сексу. Прычым жаданне праяўлялі як мужчыны, так і жанчыны.

Адсутнасць падручнікаў па сексе, якія б былі створаны на нашай тэрыторыі, значна абмяжоўвае даследчыцкія магчымасці. Да нас таксама не дайшлі дзённікі пра сексуальныя прыгоды з апісаннем тэхнік. Атрыманая інфармацыя мае ўскосны характар. Аднак нават гэтыя звесткі сведчаць пра важнасць інтымнай сферы жыцця і атрымання задавальнення ў ёй.

[186] Ван Гулик Р. Искусство секса в Древнем Китае; van Gulik R. Erotic Colour Prints of the Ming Period With an Essay on Chinese Sex Life from the Han to the Ch'ing Dynasty, B.C. 206-A.D. 1644. Leiden, 2004; Guo J. Robert Hans van Gulik Reading Late Ming Erotica // BIBLID 0254-4466. 2010. № 28:2. P. 225–265.

# 9. Забароненыя і ненатуральныя сексуальныя стасункі

Кожнае грамадства фарміруе сваё меркаванне наконт нормаў і адхіленняў ад іх у сексуальных стасунках. Падыходы да гэтай праблемы, якія прапаноўваюць сучасныя сексолагі, кардынальна адрозніваюцца ад падыходаў старажытных грамадстваў[1].

Грамадства ВКЛ мела свае погляды на натуральныя і ненатуральныя, а таксама на дазволеныя і забароненыя сексуальныя адносіны. У многім забарона на тыя ці іншыя стасункі зыходзіла са стаўлення да гэтай сферы рэлігіі, якая адносіла іх да грахоўных. Сярод такіх жыццё ў нявенчаным шлюбе, дашлюбныя дачыненні, стасункі паміж сваякамі, пералюб, бігамія, гомасексуалізм, заафілія, секс праз гвалт і прастытуцыя. Апошнія дзве тэмы даследуюцца асобна. Уніяцтва нават разглядала як грахоўныя сексуальныя стасункі з д'яблам, калі ён для кантакту ўваходзіць у цялесную абалонку ("бесцяльства"). Яго звычайна выклікалі чараўніцы. Да катэгорыі дачыненняў ненатуральных або супраць чалавечай натуры адносілі ўсе праявы садаміі (аднаполыя стасункі, заафілію, мастурбацыю, анальны секс)[2]. Заканадаўства ВКЛ утрымоўвала нормы, звязаныя са шлюбам і распустай. Яно не канцэнтравала дадаткова ўвагу на тым, якога тыпу была распуста: аднаполыя стасункі, анальны секс, аральны секс, заафілія. Гэтыя грахі і пакаранні за іх былі ў сферы кананічнага права. Але Статуты дазвалялі выкарыстоўваць пры вынясенні прысудаў заканадаўчыя акты іншых хрысціянскіх краін.

Разуменне забароненых і ненатуральных сексуальных стасункаў у XVI–XVII стст. і ў сучасным грамадстве істотна адрозніваюцца. У многім гэта зыходзіла ад усталяванай нормы, якой быў шлюб і сексуальныя стасункі ў ім для працягу роду. Усё, што адыходзіла ад яе, трапляла ў катэгорыю ганебных. У тагачасным грамадстве забароны былі звязаныя ў многім са страхам перад сваім

---

[1] Imieliński K. Seksiatria. Patologia seksualna; Peakman J. The Pleasure's All Mine. P. 10–12.

[2] Собрание припадков. С. 113; Koronczewski A. Teologia moralna. S. 313; Boswall J. Chrześcijaństwo, tolerancja społeczna i homoseksualność. Geje i lesbijki w Europe Zachodniej od początku ery chrześcijańskiej do XIV wieku / Przełożył J. Krzyszpień. Kraków, 2006. S. 24–28. Wyrobisz A. Tolerancja, nietolerancja i przesądy w Europie średniowiecznej i nowożytnej. Badania nad historią homoseksualizmu, stosunkiem społeczeństwa do homoseksualistów i nad udziałem homoseksualistów w kulturze // Przegląd Historyczny. 2007. T. 98. № 3. S. 384.

целам, бо яго жаданні, патрэбы, хцівыя праявы было немагчыма кантраляваць. Розум уваходзіў у канфлікт з целам, таму найлепшым выйсцем была забарона.

Забароненыя стасункі варта адрозніваць ад забароненых і ненатуральных тэхнік. Да першай катэгорыі адносім кантакты з неадпаведнымі асобамі (сваякі, асобы свайго полу, прастытуткі), істотамі (жывёлы, птушкі), а таксама палігамныя кантакты. Забароненыя і ненатуральныя тэхнікі практыкаваліся падчас сексуальных стасункаў, не адпавядалі патрабаванням кананічнага і царкоўнага права, напрыклад як анальны, аральны секс, позы, адрозныя ад місіянерскай, і інш. Тэхнікі маглі практыкавацца нават у шлюбнай пары. Адзначым, што такі падзел зыходзіць з тагачасных нормаў права і прынятых традыцый.

У сувязі з недахопам крыніц у дадзеным раздзеле мы можам прадэманстраваць толькі варыятыўнасць сексуальных паводзін. Статыстычныя дадзеныя па парушэннях прааналізаваць не падаецца магчымым. Знойдзеныя выпадкі нават не дазваляюць уявіць прапарцыянальнасць тагачасных дэвіяцый. Таму тут разглядаюцца толькі неадпаведныя закону стасункі.

*Нявенчаны шлюб*. Пражыванне ў нявенчаным шлюбе адносілася да катэгорыі ганебных дзеянняў з пункту гледжання царквы. Сумеснае пражыванне не было асвечана царквой і Богам, таму ў гэтым выпадку духавенства яшчэ пазбаўлялася даходаў ад абраду вянчання.

Заканадаўства не забараняла непасрэдна нявенчаны шлюб, а забараняла яго вынік – пазашлюбных дзяцей. Упершыню гэта было зроблена ў Статуце 1529 г., калі быў уведзены тэрмін "бенкарт" – пазашлюбнае дзіця, ад якога адмовіўся бацька ці напісаў гэта ў сваім тастаменце, або народжанае ад нявенчанай жонкі (Статут 1529 г. Раздз. 3, арт. 12).

Статут 1566 г. пашырыў паняцце "бенкарт". Да гэтай катэгорыі сталі адносіцца не толькі дзеці, народжаныя ў нявенчаным шлюбе, але і дзеці ад каханкі. Прычым яны не маглі стаць законнанароджанымі, нават калі пасля смерці жонкі шляхціч ажаніўся з каханкай, таксама як і дзеці, якія нарадзіліся ў такім шлюбе пазней (Статут 1566 г. Раздз. 3, арт. 23)[3].

У Статуце 1588 г. незаконнымі прызнаваліся яшчэ дзеці ад шлюбу паміж сваякамі, калі яны пры жаніцьбе ведалі аб сваяцтве (Статут 1588 г. Раздз. 3, арт. 28; раздз. 5, арт. 22). У канстытуцыі 1578 г. была прынята дадатковая пастанова, што датычыла шляхцічаў, якія жылі з наложніцамі замест законных жонак, мелі ад іх дзяцей, а пасля ўступалі з імі ў шлюб. Дзеці ад такіх стасункаў лічыліся незаконнымі[4]. За забойства бенкарта злодзея вызвалялі ад смяротнага пакарання. Калі на момант злачынства яшчэ жыла маці, то ёй выплачвалася галоўшчына як за простага чалавека (Статут 1588 г. Раздз. 14, арт. 32).

Наяўнасць бенкарта ў шляхецкай сям'і ставіла яе на ніжэйшую сацыяльную прыступку і пазбаўляла магчымасці перадаваць па спадчыне маёмасць. У выніку шляхецкая сям'я не выконвала ў дачыненні да дзяцей сацыялізацыйную, статусную, абарончую і эканамічную функцыі, што падрывала асновы існавання

[3] Лаппо И. И. Великое княжество Литовское. С. 249–250.

[4] Volumina Legum. T. II. S. 187.

дадзенага інстытута. Увядзенне гэтых артыкулаў спрыяла знікненню нявенчанага шлюбу ў шляхецкім асяроддзі[5]. Але пры гэтым за такі шлюб адмысловага пакарання не было[6].

Нявенчаны шлюб даволі доўга пратрываў у шляхецкім асяроддзі, амаль да канца XVI ст. Увогуле, шлюб меў свецкі характар, таму вянчанне не было абавязковым элементам. Пры заключэнні шлюбу большае значэнне мела адпаведнасць традыцыям і ўпарадкаванне маёмасных дачыненняў паміж бакамі. Нявесце даваўся пасаг, жаніх запісваў ёй вена, захоўваліся ўсе традыцыі: заручыны, вяселле. Адсутнічала толькі вянчанне. Такі шлюб не лічыўся ганебным і не абражаў жанчыну. Ён не з'яўляўся перашкодай для наступнага венчанага шлюбу. Скасаваць такі шлюб было значна прасцей, чым венчаны. Аднак паводле статусу нявенчаны шлюб саступаў венчанаму[7], дзеці маглі не атрымаць шляхецкай годнасці і спадчыны.

Стаўленне да нявенчанага шлюбу як шлюбу ніжэйшага статусу прасочваецца ў судовых справах[8]. Баярын Самілішскай воласці Андрэй Івашковіч і яго нявесткі скардзіліся на дзяцей дзядзькі Кундрата – Станэля, Мікалая, Юхну, Дашка, Мацка і Кахну, якія былі народжаны ад нявольніцы Доні (1514). Пасля смерці іх бацькі яны валодалі яго маёмасцю. Скаржнікі даказалі, што дзеці Кундрата не маюць права ёю валодаць, бо яны адносяцца да катэгорыі нявольнай чэлядзі, а іх маці не вянчалася з Кундратам, адпаведна не магла набыць статус шляхцянкі. Пазней мужчына ажаніўся з шляхцянкай і вянчаўся з ёй, але дзяцей у шлюбе не было. Пры жыцці Кундрата дзеці Доні не прэтэндавалі на маёмасць і шляхецтва, не былі супраць другога шлюбу бацькі. У сувязі з гэтымі абставінамі суд прыняў бок А. Івашковіча, і яму перадалі маёнтак[9].

Падобная сітуацыя мела месца пасля прыняцця Статута 1529 г. У Гарадзенскім замкавым судзе разглядалася справа аб айчыстай зямлі паміж Сакам і Цімошам Мітковічамі, з аднаго боку, і Аверкам Радзівонавічам, Пашкам Манілавічам і Васком Герасімавічам, з другога боку. Мітковічы спрабавалі вярнуць зямлю, якая належала іх бацьку. Маці прыходзілася нявенчанай жонкай бацьку, таму гарадзенскі староста Юрый Мікалаевіч Радзівіл прысудзіў зямлю сваякам. Яго рашэнне было пацверджана гаспадарскім прывілеем і Гарадзенскім замкавым судом (1541)[10]. Аднак Мітковічы захавалі свой статус (іх называлі гаспадарскімі баярамі) і імя па бацьку[11], у дачыненні да іх не ўжываўся тэрмін "бенкарты".

Становішча нявенчанай жонкі пасля смерці мужа было даволі хісткім. Гарадзенскі баярын Антон Хадаровіч падаў скаргу на сваю нявестку Ульку Федкаўну,

---

[5] Bardach J. Świecki charakter zwyczajowego prawa małżeńskiego. S. 85–148; Левицький О. Сім'я і побут українців у XVI ст. С. 213.

[6] Левицький О. Сім'я і побут українців у XVI ст. С. 211.

[7] Владимирский-Буданов М. Ф. Черты семейного права Западной России // Чтение в историческом обществе Нестора Летописца. Киев, 1890. Кн. 4. Отд. 2. С. 48–53; Лаппо И. И. Великое княжество Литовское. С. 251; Bardach J. Świecki charakter zwyczajowego prawa małżeńskiego. S. 89, 91–147.

[8] Bardach J. Świecki charakter zwyczajowego prawa małżeńskiego. S. 97.

[9] Риб. Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. Петербург, 1903. С. 128–129.

[10] АВАК. Т. 17. Вильна, 1890. С. 179.

[11] Bardach J. Świecki charakter zwyczajowego prawa małżeńskiego. S. 93–94.

што яна, з'яўляючыся нявенчанай жонкай сына Сенькі, засталася жыць пасля яго смерці ў доме, не хацела адтуль сыходзіць і да таго ж зрабіла шкоду гаспадарцы (1556). На судзе Улька спрабавала даказаць, што яна вянчалася з мужам, і абяцала прывесці ў якасці сведкі свяшчэнніка. Але на наступныя пасяджэнні суда жанчына не з'явілася і не прывяла сведку. Таму паводле прысуду яна разам з дзіцём павінна была пакінуць дом свёкра[12].

Аднак у іншым выпадку муж паклапаціўся пра дабрабыт сваёй нявенчанай жонкі. Па тастаменце берасцейскага шляхціча Станіслава Яновіча Мрочкі яго жонцы Пелагеі Андрэеўне Старадоўшчанцы і іх дзецям (Аляксандры, Ермагену, Раіне і Аксім'і) дарыўся маёнтак Ілковічы. Прычым апекунамі для гэтых дзяцей былі прызначаны два сыны ад першага венчанага шлюбу – Адам і Якуб[13]. Тастамент быў унесены ў кнігі Берасцейскага земскага суда, значыць, набыў законную моц. Дзеці ад нявенчанага шлюбу не толькі не страцілі статус, а яшчэ і атрымалі маёмасць ад бацькі.

Крынскі мешчанін Сак Белавіч падаў скаргу на шляхціча Гарадзенскага павета Івана Вешаневіча (1568). Сын апошняга ажаніўся з яго дачкой Матрунай. У сям'і нарадзілася дачка. Пасля (невядома, з якой прычыны) муж выгнаў яе з дому, а пасагавыя рэчы (тканіны, ручнікі, жаночыя і мужчынскія сарочкі, грошы, гусей і інш.) пакінуў сабе. Мешчанін патрабаваў рэчы і кампенсацыю выдаткаў на вяселле за піва і мяса. Іван Вешаневіч адказаў, што Матруна жыла з сынам у нявенчаным шлюбе, а калі яна пайшла з дому, то ўсё было вернута. Сітуацыя стварылася такая, што было толькі слова аднаго боку супраць другога, а сведак не было. У сувязі з гэтым была прызначана прысяга, якую Іван прайшоў. Яго вызвалілі ад адказнасці[14]. Хоць шлюб быў нявенчаны, аднак вяселле было спраўлена і пасаг дзяўчына атрымала. Шлюб быў "скасаваны" сыходам мяшчанкі. Верагодна, паходжанне дзяўчыны і вызначэнне шлюбу як нявенчанага спрыяла таму, што справу вырашылі праз прысягу. Прычым судзіліся бацькі, а не муж і жонка.

У мяшчанскім асяроддзі законнымі лічыліся венчаныя шлюбы. Добрае паходжанне неабходна было для ўраднікаў магістрата, цэхавых майстроў[15]. Аднак пры гэтым сустракаліся сярод мяшчан і нявенчаныя шлюбы. Церашко Люцікові́ч падаў скаргу ад імя сястры Мар'і на Афанаса Грыдковіча, магілёўскага мешчаніна, што ён пакінуў яго сястру, а ўзяў іншую жанчыну за жонку (1617). На гэта Афанас паклаў разводны ліст кузьмадзям'янінскага свяшчэнніка Нестара Іванавіча (1616). Паводле яго шлюб быў нявенчаны, а прычынай яго скасавання

[12] АВАК. Т. 17. Вильна, 1890. С. 406; Владимирский-Буданов М. Ф. Черты семейного права. С. 49; Лаппо И. И. Великое княжество Литовское. С. 251–252.

[13] Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / Склад. А. Ф. Аляксандрава, В. У. Бабкова, І. М. Бобер. Мінск, 2012. С. 95–96.

[14] НГАБ, ф. 1755, воп.1, спр. 4, арк. 22 – 22 адв.

[15] Патрабаванне пацвердзіць паходжанне ўтрымліваецца ў многіх цэхавых статутах. НГАБ, КМФ-18, спр. 62, арк. 75 – 79 адв.; спр. 77, арк. 508 адв. – 511; Сліж Н. Гарадзенскі бурмістраўска-радзецкі суд: суадносіны судовай практыкі з магдэбургскім правам (1639–1642 гады) // Палітычная сфера. Гісторыя: літаратура, права, палітыка. 2014–2015. № 22–23. С. 35–51.

стала нязгода і сваркі. Магілёўскі магістрат палічыў, што справа падлягае разгляду ў духоўным судзе, і накіраваў яе да мсціслаўскага пратапопа[16].

У 1624 г. рымарскі цэх намагаўся адхілення ад рамяства берасцейскага мешчаніна Лукаша Марцінавіча Чулковіча за нявыплаты ў цэхавую скрыню, а таксама за пражыванне ў нявенчаным шлюбе з Палоніяй Церпілоўскай. Аднак гэтыя довады бурмістраўска-радзецкі суд не прыняў пад увагу і прысудзіў яшчэ выплаціць Лукашу 30 злотых. Цэх быў не задаволены рашэннем і праз некалькі дзён паступіла заява аб непрыстойным жыцці Лукаша. Аднак праз некаторы час два бакі прыйшлі да пагаднення[17].

Пры высвятленні маёмасных адносінаў пасля смерці гаспадара паміж мачахай і пасынкам выявілася пра нявенчаны шлюб жанчыны. Віленскі мешчанін Самуэль Александровіч і яго сястра Анастасія Александровічаўна, жонка Тэадора Арэшыца, падалі скаргу на сваю мачаху Марыну Серафіноўну Пракопаўну з абвінавачваннем у самавольным распараджэнні маёмасцю іх бацькі Аляксандра Сямёнавіча. У скарзе прыводзіцца гісторыя шлюбу. Аляксандр Сямёнавіч перажыў дзвюх жонак, быў ужо ва ўзросце і не хацеў жаніцца. Сын і дачка таксама адгаворвалі яго ад гэтага кроку. Аднак Марыне атрымалася зладзіць шлюб. Падчас вянчання ў царкве высветлілася, што гэта быў яе чацвёрты шлюб, што было забаронена царкоўным правам. Марына прысягнула, што вянчалася двойчы, а калі і быў яшчэ муж, то нявенчаны. У выніку шлюб адбыўся. Пасля вяселля Аляксандр Сямёнавіч выправіў дзяцей з дому. Бацька памёр падчас маскоўскай акупацыі, бо жонка зрабіла так, каб ён патрапіў у вязніцу віленскага замка. Магістрат далей разбіраўся толькі з маёмаснымі пытаннямі, правёў інвентарызацыю рэчаў і перадачу іх сыну. Інфармацыя пра шлюбы мачахі магла ініцыяваць справу аб прызнанні шлюбу незаконным, але гэтым магістрат не заняўся (1661)[18].

Нявенчаны шлюб меў месца ў сялянскім асяроддзі. Гаспадарскі падданы Кляпацкага войтаўства Кандрат Ваўчковіч падаў скаргу на гаспадарскую падданую Рэпніцкага войтаўства ўдаву Багданавую. Ён ажаніў з яе дачкой сына, згулялі вяселле, а яна не хацела аддаваць дачку. Жанчына патлумачыла свой учынак непаўналетнім узростам дачкі, нежаданне яе быць з мужам, а таксама адзначыла, што шлюб быў нявенчаны. Суд прысудзіў выплаціць кампенсацыю скаржніку за вяселле (1560). Нявенчаны шлюб паміж сялянамі разводзілі ў свецкім судзе. Слонімскі гродскі суд прыняў пастанову развесці дачку гаспадарскага падданага Луконіцкага войтаўства Хедзеца Пятковіча з Цімошам, сынам гаспадарскага падданага Аўдзея Кошчыча. Прычынай стала іх дрэннае сумеснае жыццё (1560)[19]. Хоць уласнікі спрабавалі кантраляваць сямейнае жыццё сялян, нявенчаны шлюб працягваў існаваць у XVII ст. Акрамя таго, сяляне самавольна пакідалі як венчаных, так і нявенчаных сужэнцаў[20].

---

[16] ИЮМ. Вып. 8. Витебск, 1877. С. 345–347.

[17] АВАК. Т. 6. Вильна, 1872. С. 239–242, 244–245.

[18] XVII a. Vidurio Maskvos okupacijos Lietuvoje šaltiniai T. I. P. 491–492, 497–502.

[19] НГАБ, ф. 1785, воп. 1, спр. 1, арк. 23 адв. – 24, 29 адв.

[20] Голубеў В. Ф. Сялянская сям'я ў Беларусі ў эпоху феадалізму: праблемы і перспектывы даследавання // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 29. Мінск, 2014. С. 73.

Да канца XVI ст. ні адна з хрысціянскіх канфесій не дамаглася жорсткага кантролю над прыватным жыццём вернікаў. Толькі ў канцы XVI ст. адбыліся комплексныя змены ў заканадаўстве, рэлігіі, грамадскай думцы, якія стварылі неспрыяльныя ўмовы для існавання нявенчанага шляхецкага шлюбу. Аднак у іншых саслоўях поўны кантроль здзейсніць не атрымалася.

*Дашлюбныя стасункі.* У заканадаўстве не было артыкула, які б адназначна казаў пра забарону мець секс да шлюбу. Разглядаўся вынік стасункаў – дзеці. Яны былі відавочным пацвярджэннем кантакту. За пазбаўленне ад іх пагражала пакаранне. Кананічнае права адназначна лічыла секс да шлюбу грахоўным.

У дадзеным выпадку нявенчаны шлюб і дашлюбныя стасункі маюць наступныя адрозненні. У нявенчаным шлюбе мужчына і жанчына пражываюць разам як сям'я і нават маюць дзяцей. Іх можна аднесці да дашлюбных стасункаў, бо, напрыклад, другі шлюб можа быць венчаным. Аднак істотная рыса нявенчанага шлюбу – трываласць адносінаў і супольнае пражыванне. Дашлюбныя стасункі маюць выпадковы характар. Яны могуць доўжыцца нейкі перыяд часу, аднак застаюцца на ўзроўні спатканняў, але не пражывання разам.

Дашлюбныя стасункі сустракаліся сярод людзей усіх саслоўяў. Жанчын традыцыйна ўгаворвалі на секс з абяцаннем шлюбу ў будучым. Шляхта карысталася сваім становішчам і спакушала ці прымушала прыслугу. Калі вынікі такіх кантактаў не прыводзілі да суда, то выявіць у дакументах звесткі пра іх існаванне практычна немагчыма. Інфармацыю магло б даць параўнанне запісаў пра шлюб і нараджэнне дзяцей у метрычных кнігах. Аднак яны захаваліся ў малой колькасці, таму правесці грунтоўнае статыстычнае даследаванне не падаецца магчымым.

У дзённіку Ян Антоні Храпавіцкі пісаў з абурэннем пра сына Крыштафа Антонія, які замест выправы на вайну з Турцыяй кахаўся ў Варшаве з Замойскай (1672). Прычым бацька быў больш незадаволены нежаданнем сына ваяваць, чым яго дашлюбнымі стасункамі: "*...na bruku siedząc w Warszawie kocha się z panią Zamoyską, która chcie iść za niego i dodaje mu wszytkiego, nawet wóz sześcikonny z żywnością do obozu mu dała. Hultaj! Nie szedłby raczej krew przelewać za Ojczyznę, wiarę i Pana*"[21]. Пазней Крыштаф ажаніўся з іншай шляхцянкай.

У судовых кнігах занатаваны найбольш трагічныя сітуацыі, звязаныя з дашлюбнымі стасункамі. Аднак нават тут нельга адназначна сказаць, наколькі масавы характар яны мелі.

Рэтаўскі баярын Валенты Жвагіня абвінавачваў Гендруту Якуцеўну ў навядзенні чараў на дзяцей. Падчас разгляду справы высветлілася, што прычынай стала нянавісць дачкі скаржніка да яе і нежаданне сына ажаніцца: "*зо мною обцовал и мел ми досит учынит*". Прысудзілі жанчыну да спалення (1602)[22]. Чары праявіліся ў давядзенні да вар'яцтва. Якуцеўна знаходзілася на ніжэйшай сацыяльнай прыступцы і праз дашлюбныя стасункі хацела наладзіць сваё сямейнае жыццё. Але тут з абяцаннямі хлопца атрымалася класічная сітуацыя: абяцаць не значыць ажаніцца. Пакрыўджаная жанчына адпомсціла сям'і.

---

[21] Chrapowicki J. A. Diariusz. Cz. 3: lata 1663–1672 / Oprac. L. Wierzbicki. Warszawa, 2009. S. 251.

[22] Судебные процессы над ведьмами в Литве. С. 86–87.

У кнігах Слуцкага замкавага суда занатаваныя звесткі пра следства ў справе знікнення пазашлюбнага дзіцяці (1689). Яно праводзілася ў вёсцы Прусы Слуцкага княства. Аксюта Лісічына распавяла пра свае стасункі з сынам слуцкага пратапопа Мікітам Мінкевічам. Яна служыла чаляднiцай у яго бацькі. Паабяцаўшы шлюб, хлопец спакусіў Аксюту. У выніку яна зацяжарыла. Калі ўжо падышоў тэрмін нарадзіць, дзяўчына прыйшла да пратапопа і папрасіла яго нейкім чынам пазбавіцца ад дзіцяці. Яна цягала цяжкія рэчы, ставіла вядро вады на жывот. Аксюта нарадзіла ў фальварку пратапопа. Пры родах былі жанчына Хоміна і Мікіта. Ён забраў нованароджанага і некуды яго аднёс. Аксюту адправілі ў Слуцк і прасілі нічога не казаць пра здарэнне, бо гэта прымусіць пратапопа з сорамам пайсці ў манастыр. Калі яна вярнулася, то безвынікова спрабавала знайсці дзіця. Аксюту выдалі замуж, шлюб даў сам пратапоп. Аднак у хуткім часе знайшлі цела немаўляці ў гною. Аповед пацвердзілі іншыя падданыя[23]. Чым закончылася справа, невядома, прысуду кніга не ўтрымлівае. Адзначым цікавую акалічнасць, што ў выніку дашлюбных стасункаў жанчына нарадзіла дзіця, а пасля выйшла замуж. У дадзеным выпадку непажаданы плод кахання адмоўна адбіваўся на рэпутацыі мужчыны і яго сям'і, што прывяло да знікнення дзіцяці.

У іншым выпадку, спаслаўшыся на заканадаўства (Статут 1588 г. Раздз. 11, арт. 60), Слуцкі замкавы суд вынес вырак аб смяротным пакаранні жанчыне (1688). Слуцкая мяшчанка Агапа Юркоўна Панчошнікаўна нарадзіла дзіця ў выніку стасункаў са шваграм Адамам Піварэзчыкам. Факт нараджэння быў утоены мяшчанкай і яе бацькамі. Дзіцё знайшлі мёртвым са знакамі ўдушэння. Пра гэта пайшлі пагалоскі, было праведзена следства. Агапа адмаўлялася, што нарадзіла немаўля, а пасля сцвярджала, што яно нарадзілася мёртвым. Следству атрымалася даказаць забойства і пасляродавы стан жанчыны. Аднак Піварэзчык застаўся без прысуду за пералюб[24]. У справе асуджаліся амаральныя паводзіны мяшчанкі. Для суддзяў прысуд быў відавочным. У самым горшым стане апынуліся бацькі Агапы. Ім прыйшлося прыняць факт здрады зяця з другой дачкой, хаваць факт нараджэння дзіцяці, а пасля страціць яго і дачку. Здрада ўнутры сям'і мела жахлівыя наступствы.

Наступная сувязь таксама прывяла да трагедыі. Дзеўка Барбара Грыгаліч з вёскі Ельнішкі (Вількамірскі павет), што належала дэрпцкаму харужычу, капітану каралеўскага войска Герману Ганцкофу, служыла пры двары пана Яна Корфа і "дапусцілася да граху" з яго сынам Мікалаем Філіпам Корфам. У выніку іх стасункаў нарадзіўся сын. Зразумела, што малады паніч адмовіўся ад дзіцяці, і Барбара вырашыла забіць немаўля. Яна панесла яго да рэчкі Лавены. Там дзіця прыдушыла, сціснуўшы пальцамі рот, пасля ўдарыла аб зямлю і яшчэ жывога кінула ў ваду. Яго вылавілі жаўнеры і прынеслі на двор Ганцкофа. Вінаватая была адразу выяўлена і пасаджана ў вязніцу ў двары. Суддзі Фрыдрык Прахемфельс, Юрый Купсуй, Міхал Махалеўскі, Ян Казімір Загора выслухалі ўсе абставіны справы і прысудзілі Барбару да смяротнага пакарання (1680)[25].

---

[23] НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 1239, арк. 130 – 131 адв.

[24] Тамсама, арк. 385 – 386 адв.

[25] AGAD, Archiwum Tyzenhauzów, sygn. G-756.

Праблема дашлюбных стасункаў і, як вынік, пазашлюбных дзяцей адлюстравалася нават у беларускім фальклоры[26]:

Гультай валы пасе,
За нім дзеўка дзіця нясе.
Гультай, гультай!
Я праз цябе дзіця маю,
Бо дай цябе пярун забіў,
Як ты мне дзіця зрабіў.
Бо дай ты дзеўка спраглася,
А на што ж ты я***ся[27].

Забойства немаўляці было звычайным шляхам для пазбаўлення ад непажаданага выніку сексуальных адносінаў. Варыянты кантрацэпцыі былі нешматлікія (раслінныя сродкі з няпэўным вынікам, перарваны палавы акт, анальны і аральны секс). А сярод неадукаванага насельніцтва не ўсё было вядома і не ўсё ўжывалася. Прычыны забойства палягалі ў непрыманні грамадствам пазашлюбных дзяцей. Яны былі жывым сведчаннем амаральных паводзінаў. Віна ўскладалася, як правіла, на жанчыну. Мужчыны адмаўляліся несці адказнасць за вынік кантактаў. А прымусіць шляхціча прыняць дзіця не падавалася магчымым. Таму негатыўнае стаўленне асяроддзя штурхала да забойства.

Нягледзячы на рэлігійныя забароны, дашлюбны секс меў месца. За яго можна было атрымаць пакаранне ад святара. Але калі вынікам станавіліся дзеці і іх забойства, то справы траплялі ў суд, і выракі былі жорсткія. Дашлюбныя стасункі выклікалі клопат і ў духавенства Еўропы, бо рэлігійныя ідэалы і жыццё разыходзіліся[28]. Сустракаліся яны таксама ў суседняй Польшчы, аб чым сведчыць даследаванне Тамаша Вісліча[29].

*Стасункі паміж сваякамі.* Заканадаўства ў першую чаргу забараняла шлюбныя стасункі паміж сваякамі, але пра сексуальныя адносіны паміж імі асобна нічога не адзначалася. У Статуце 1566 г. у артыкуле аб разводзе была ўведзена забарона на шлюб паміж сваякамі (Статут 1566 г. Раздз. 5, арт. 18). Калі муж і жонка былі сваякамі, але не ведалі пра гэта, то кожны заставаўся пры сваёй маёмасці. Блізкае сваяцтва лічылася перашкодай для шлюбу. Гэты артыкул з невялікім дапаўненнем быў уключаны ў Статут 1588 г. (Статут 1588 г. Раздз. 5, арт. 20). Асобным артыкулам забараняўся шлюб паміж сваякамі да чацвёртай ступені сваяцтва па бацькоўскай і мацярынскай лініі (Статут 1588 г. Раздз. 5, арт. 22)[30]. Пералічваліся сваякі, паміж якімі не магло быць шлюбных дачыненняў. Разглядаўся выпадак, калі першы шлюб адпавядаў закону, а другі быў незаконны – са

---

[26] Карский Е. Белорусы. Т. III. Очерки словесности белорусского племени. 1. Народная поэзия. Москва, 1916. С. 333–340.

[27] Gabinet Rękopisów BUW, sygn. 441, k. 474.

[28] Peakman J. The Pleasure's All Mine. P. 29.

[29] Wiślicz T. Dialectics of Virginity. Controlling the Morals of Youth in the Early Modern Polish Countryside // Framing Premodern Desires: Sexual Ideas, Attitudes, and Practices in Europe / Ed. M. Heinonen, M. Kaartinen, S. Lidman, T. Linkinen. Amsterdam, 2017. P. 83–102.

[30] Лаппо И. И. Литовский Статут 1588 г. Т. 1. Исследование. Ч. 2. Каунас, 1936. С. 38–39; Andriulis V. Lietuvos Statutų (1529, 1566, 1588 m.) šeimos teisė. Vilnius, 2003. P. 47–48.

сваяком ці сваячкай. Такія справы знаходзіліся ў юрысдыкцыі земскага суда. Парушальнікі пазбаўляліся паловы сваёй маёмасці на карысць дзяржавы. Жанчына страчвала пасаг, а калі мела нерухомую маёмасць, то і палову яе. На другой палове дазвалялася толькі пажыццёвае пражыванне. Мужчыну не дазвалялася займаць пасады. Не падлягалі пакаранню асобы, якія не ведалі пра сваяцтва і даказалі гэта пад прысягай. Шлюб паміж сваякамі скасоўвалі. А магчымасць наступнага шлюбу разглядалася ў духоўным судзе[31]. Як адзначае Арэст Лявіцкі, шлюбы паміж сваякамі мелі месца ў праваслаўным асяроддзі і пасля Статута 1566 г.[32] Паводле класіфікацыі крымінальных спраў па соймавай пастанове 1611 г. шлюб паміж сваякамі разглядаўся як прыватная крымінальная справа[33].

Крымінальны кодэкс Караліна дазваляў караць мужчыну за стасункі са сваячкамі (арт. LXXII)[34]. У еўрапейскіх краінах, таксама ў Польшчы, шлюбы і стасункі паміж сваякамі мелі месца і караліся згодна з заканадаўствам і кананічным правам[35]. Хрысціянства адносіла секс паміж сваякамі да грахоўнага[36]. Адпаведна гэта мела ўплыў на заканадаўства, і забарона стала нормай права.

Каб пазбегнуць судовых спраў і мець законны шлюб, у такіх выпадках шляхта звярталася за дазволам. Ганна Марыя Радзівілаўна і канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл знаходзіліся ў сваяцкіх адносінах, былі рознага веравызнання: яна была каталічкай, а ён – пратэстантам. У 1664 г. яны атрымалі дазвол на шлюб ад папы Аляксандра VII[37].

Аднак не заўсёды атрымлівалася ўлагодзіць справу. У рэляцыі нунцыя Маласпіна (1598) пра кальвініста, віленскага ваяводу і гетмана ВКЛ Крыштафа Радзівіла адзначалася, што ён жыве ў незаконным шлюбе. Яго першай жонкай была Кацярына Астрожская, каталічка. Пасля яе смерці (1579) К. Радзівіл у 1593 г. ажаніўся з яе роднай сястрой Альжбетай. Яна таксама была каталічкай, засталася ўдавой пасля смерці віленскага кашталяна Яна Кішкі[38]. Абрад вянчання быў праведзены ковенскім пробашчам Якубам Варанецкім[39]. Тут былі дзве перашкоды – рознае веравызнанне і блізкае сваяцтва паміж першай і другой жонкамі, таму на шлюб патрабаваўся адмысловы дазвол. Ён звяртаўся за дыспенсіяй ва ўсе пратэстанцкія ўніверсітэты Нямеччыны, Англіі, а таксама

---

[31] Малиновский И. Учение о преступлении по Литовскому Статуту. Киев, 1894. С. 59–60; Таўталес А. Права сямейнае паводле Літоўскіх Статутаў // Arche. 2009. № 7. С. 991–992.

[32] Левицький О. Сім'я і побут українців у XVI ст. С. 218–219.

[33] Volumina legum. T. III. S. 36.

[34] Groicki B. Artykuły prawa majdeburskiego. S. 153.

[35] Vleeschouwers-Van Melkebeek M. Incestuous Marriages: Formal Rules and Social Practice in the Southern Burgundian Netherlands // Love, Marriage, and Family Ties in the Later Middle Ages / Ed. I. Davis, M. Muller, S. Rees Jones. Turnhout, 2003. P. 77–96; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 311–313; Kaczor D. Przestępczość kryminalna. S. 152–155; Kamler M. Złoczyńcy. S. 286–287.

[36] Zankiewicz D. Wódz malutkich. S. 336; Pieniądz A. Kazirodztwo w społeczeństwie wczesnego średniowiecza // Przegląd Historyczny. 2007. № 98. S. 351–367; Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 271–272, 294–295.

[37] AGAD, AR, dz. I, sygn. 8247.

[38] Kempa T. Konstanty Wasil Ostrogski. S. 113.

[39] Lulewicz H. Radziwiłł Krzysztof // PSB. T. 30. Warszawa; Wrocław; Kraków; Gdańsk; Łódź, 1987. S. 274.

Жэнеўскі, але яму адмовілі. За такі ўчынак меў ганьбу, знеслаўленне. У адпаведнасці са Статутам ВКЛ спрабаваў праз жонку, якая была каталічкай, атрымаць вызваленне ад кананічных правілаў у Рыме. Яму адмовілі і нават не падалі ніякай надзеі на станоўчае рашэнне[40].

Абставіны наступнай справы невядомы, бо інфармацыя аб гэтым выпадку была ў запісе канцлеру ВКЛ Льву Сапегу ад Жыгімонта Вазы (1601). Багдан Сямёнавіч Пашкевіч і Марына Іванаўна Корценеўна Росіцкая былі пакараныя канфіскацыяй маёнткаў на карысць дзяржавы за тое, што ўзяўшы "*над право Божае и над право посполитое земское за жону властьною мачоху сваю*" па смерці яго бацькі і "*не прыстойне праве в порубстве з нею мешкаетъ*". У Б. Пашкевіча адабралі маёнтак Пневіца (Браслаўскі павет), а ў яго мачахі – маёнтак Росіца (Полацкае ваяводства)[41]. Дакумент нічога не ўзгадвае пра развод, але пакаранне было даволі істотнае і, што важна, не засталося на паперы, а прыведзена да выканання.

Да стасункаў паміж сваякамі адносіцца снахацтва – сексуальныя стасункі бацькі з жонкай сына. У 1581 г. быў зафіксаваны такі выпадак. Крыніца тлумачыць яго праяўленнем народнага звычаю. Хлопец трынаццаці гадоў быў жанаты са старэйшай за яго жанчынай, а шлюбныя абавязкі за яго выконваў бацька[42]. Такія стасункі былі забаронены царкоўным правам.

Шлюб і стасункі паміж сваякамі адносіліся да грахоўных. Гэта было апраўдана з біялагічнага пункту гледжання. Хоць на той час навука генетыка не існавала, аднак адмоўны вынік такіх кантактаў для нашчадкаў можна было назіраць. Яшчэ адно наступства – гэта канфлікты ў сям'і. Таму забарона на секс паміж сваякамі была справядлівай.

*Бігамія.* У артыкуле пра забарону шлюбу паміж сваякамі была змешчана забарона на бігамны шлюб (Статут 1588 г. Раздз. 5, арт. 22). Мужчына, які меў венчаную жонку і ажаніўся з другой жанчынай без скасавання папярэдняга шлюбу, падлягаў смяротнаму пакаранню[43]. Калі жанчына ведала аб гэтым факце, то яна таксама каралася. Крымінальны кодэкс Караліна ўтрымліваў такое ж пакаранне (арт. LXXIV)[44]. Гэтая норма была непасрэдна звязана з кананічным правам. Для ўсіх хрысціянскіх плыняў знаходжанне ў шлюбе лічылася абсалютнай перашкодай для новага шлюбу.

Пры наяўнасці дзвюх жонак шлюб з адной з іх скасоўвалі. Віленскі біскуп Войцех Табаровіч развёў Юшко Даўгіновіча з другой жонкай Любкай, хоць яна ўжо мела з ім сына, калі высветлілася, што раней ён быў жанаты. Законным быў прызнаны першы шлюб. Пасля смерці Юшко яго брат Ян выгнаў жанчыну. Любка ініцыявала справу супраць яго. Прад'яўленне дакумента віленскага біскупа Войцеха Табаровіча аб скасаванні другога шлюбу і пацвярджэнні першага

[40] [Rekaczewski E.] Relacye nuncyuszów apostolskich. T. 2. S. 90.

[41] Галубовіч В. Адзін са шляхоў фарміравання зямельнай уласнасці Льва Сапегі // Terra Alba. Т. 2. Homo venerus. С. 222–223.

[42] Осада Пскова глазами иностранцев. С. 283–284.

[43] Малиновский И. Учение о преступлении. С. 60; Andriulis V. Lietuvos Statutų. P. 50–51.

[44] Groicki B. Artykuły prawa majdeburskiego. S. 155.

стала прычынай для прыняцця рашэння на карысць Яна Даўгіновіча. Любка і яе сын не мелі права прэтэндаваць на маёнтак (1524)[45].

Леў Сапега, гарадзенскі земскі суддзя, абвінавачваўся ў бігаміі Крыштафам Гарабурдой. Яго старэйшы браў змовіў сястру Алену за Сапегу, калі першая жонка Ганна Копцеўна (? – пасля 1607) яшчэ жыла на той час. Крыштаф быў занепакоены лёсам сястры і не хацеў, каб яна жыла ў незаконным шлюбе (1605)[46]. Але рэальная сітуацыя была іншай. Ганна Копцеўна аўдавела пасля смерці Івана Валовіча ў 1582 г.[47] У дакументах яна фігуравала як жонка Льва Сапегі ў 1585 г. Але ў 1588 г. іх шлюб быў скасаваны кіеўскім мітрапалітам Анісіфарам Пятровічам Дзевачкам у Навагарадку[48]. Такім чынам, афіцыйна Сапега быў разведзены, і скарга супраць яго не мела падстаў.

Віленскія мяшчане Ян Гілевіч, яго жонка Анастасія Віткоўская і Ян Віткоўскі падалі скаргу супраць Пятра Тулькевіча, другога мужа сястры Марыны Віткоўскай. Другі шлюб адбыўся ў той час, калі першы муж Марцін Пажарка быў жывы і знаходзіўся ў Прусіі. Прычынай скаргі стала смерць Марыны, бо Тулькевіч зрабіў тастамент на сваю карысць, забраў сабе маёмасць жонкі, а сына ад першага шлюбу прадаў у маскоўскую няволю (1657)[49].

Выпадкі бігаміі былі звязаны з адсутнасцю інфармацыі пра мужа ці жонку падчас войнаў, у сувязі са зменай месца жыхарства. У Польшчы за гэта каралі смерцю ці выгнаннем[50]. Бігамія стварала праблему ў спадкаемстве і адмоўна ўплывала на статус дзяцей у шлюбе, які прызнаваўся незаконным. Таму і да сённяшняга дня ў заканадаўстве многіх краін адначасовае знаходжанне ў шлюбе з некалькімі асобамі забаронена.

*Пералюб.* Пералюб разумеўся як грэх і зламанне шлюбнай вернасці. У першую чаргу гэта было злачынства з пункту гледжання кананічнага права, бо здзяйсняўся замах на таямніцу шлюбу. Праваслаўе, уніяцтва, каталіцызм і пратэстантызм выключна ў негатыўным святле трактавалі пералюб, ён быў варты самага жорсткага пакарання. Д. Занкевіч прысвяціў асобны параграф у сваёй працы крытыцы шлюбнай здрады. Пры гэтым акцэнт рабіўся на паводзіны жанчыны, на тое, што яна павінна захоўваць чысціню і не дапускаць пералюбу[51]. Такім чынам адказнасць пераносілася менавіта на яе.

Пад уплывам рэлігіі нормы супраць пералюбу былі ўключаны ў заканадаўства. Акрамя таго, шлюбная здрада парушала спакой сям'і і грамадства, прыводзіла да канфліктаў. Таму прылічэнне пералюбу да граху стварала дадатковую перашкоду для канфліктных сітуацый.

У Статуце 1588 г. "пакаранне горлам" прызначалася за пералюб абаім – мужчыну і жанчыне[52]. Аб здрадзе маглі сведчыць староннія асобы, чэлядзь і слугі.

[45] Риб. Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. Петербург, 1903. С. 174–175.

[46] НГАБ, ф. 1737, воп. 1, спр. 8, арк. 193 адв.

[47] НГАБ, ф. 1755, воп.1, спр. 4, арк.1 – 1 адв.; спр. 8, арк. 369–375.

[48] НГАБ, ф. 1755, воп.1, спр. 11, арк. 336–339.

[49] Frick D. Wilnianie. S. 195–198; Frick D. Kith, Kin, and Neighbors. P. 237–239.

[50] Karpiński A. Kobieta w mieście polskim. S. 556; Kamler M. Złoczyńcy. S. 287–289, 401–402.

[51] Zankiewicz D. Wódz malutkich. S. 354–357.

[52] Малиновский И. Учение о преступлении. С. 60–61.

Пры выяўленні злачынства аб ім абвяшчалася суседзям, і вінаватыя выклікаліся ў гродскі суд. Калі пры выяўленні здрады муж забіў каханка, то вызваляўся ад адказнасці[53]. Аднак калі каханак забіваў мужа, то пазбаўляўся шляхецкага гонару і жыцця, а з яго маёнтка выплачвалася галоўшчына (Статут 1588 г. Раздз. 14, арт. 30). Традыцыйна разглядаўся выпадак жаночай здрады. Гэта было ўласціва для патрыярхальнага грамадства. Да таго ж варта ўзяць пад увагу, што ў складзе камісіі па Статуту былі толькі мужчыны. Патрыярхальнае стаўленне да пералюбу мела месца ў візантыйскім праве і было перанята намі праз Статут Яраслава.

Магдэбургскае права ўключала наступныя нормы. Згодна з Вайхбільдам, за пералюб мужчыну пагражала страта правоў на пасаг жонкі, а жанчыне – на вена. Тое ж пакаранне чакала жанчыну, калі яна "бяседавала" (г. зн. піла і бавіла час) і мылася ў лазні з чужымі людзьмі супраць волі мужа (арт. XXII). Саксонскае Люстра за пералюб вызначала смяротнае пакаранне (ч. II, арт. 13). Шлюбная здрада разумелася як злачынства супраць Бога і інстытута шлюбу. А здраднікаў можна пазнаць па іх адносінах паміж сабой: яны ўсміхаюцца, абдымаюцца, цалуюцца і інш. Вызваліць ад пакарання жанчыну можа шэраг абставін: муж сам здраджвае, не жыве з ёй, здрада адбылася пад прымусам[54].

Выкананне гэтых нормаў у судовым справаводстве выявіць дастаткова складана. Асобы з вышэйшага грамадства часам імкнуліся справы пра пералюб не даводзіць да суда. У гарадах выкананне нормаў права не ва ўсіх выпадках было аднолькавае.

Аднак папскі нунцый Галеаца Марэскоці ў апісанні Рэчы Паспалітай 1670 і 1671 гг. прывёў інфармацыю пра ВКЛ з працы Энея Сільвія Пікаламіні з XV ст. Згодна з ёй жанчыны мелі каханкаў з дазволу мужа, але наяўнасць каханкі ў мужа асуджалася. Разводы можна было атрымаць лёгка[55]. Тэкст падае разам інфармацыю з XV і XVII стст., таму некаторыя звесткі пазнейшага перыяду можна прыняць за сучасныя для нунцыя.

Тое, што пералюб сустракаўся ў розных саслоўях і заўсёды трэба было мець пільнасць, пацвярджаюць прымаўкі: "*Kto obłapia mężatki, bez oblicznej rany rzadki*", "*Jeśli się kto naprze z strony konia, wozu, sukniey, żony ku iakiey kolwiek potrzebie, nie puszczay z domu bez siebie, woz połamią, suknię zmażą, koń osadnią, żonę z łaską odeszła*", "*Z panem kart nie gray, w zawod nie puszczay, pieniędzy mu nie pożyczay, żony mu nie obłapiay*"[56].

У першую чаргу пералюб быў прычынай для разводу. Ён фігуруе ў шлюбаразводных працэсах шляхты Ядвігі Юр'еўны Насілоўскай і Грыгорыя Юр'евіча Осціка (1566), Юхно Яновіча і Багданы Станіслававічоўны (да 1541)[57].

Аднак не ўсе выпадкі здрады ў вышэйшым грамадстве ВКЛ заканчваліся разводам. Напрыклад, падобная сітуацыя мела месца сярод эліты

[53] Grajewski H. Kara śmierci w prawie polskim do połowy XIV wieku. Warszawa, 1956. S. 172.

[54] Groicki B. Porządek sądow. S. 205–208.

[55] Scriptores rerum Prussicarum. B. IV. Leipzig. 1870. S. 237–239; [Rekaczewski E.] Relacye nuncyuszów. T. 2. S. 367.

[56] Proverbiorum Polonicorum a Solomone Rysinio. P. D 2, Centuria 6:90; Kv, Centuria 17:100; P. D 3, Cv, Centuria 4:90.

[57] Пра спецыфіку разводу гл.: Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 449–475.

Венецыі[58]. Сярод перапюбнікаў былі заўважаны як мужчыны, так і жанчыны. Выпадкі перапюбу здараліся ў каралеўскіх і велікакняскіх сем'ях. Скандал быў у сям'і Уладзіслава Ягайлы і Соф'і Гальшанскай[59]. Плёткі аб шлюбнай здрадзе каралевы дайшлі да Вітаўта, і ён сказаў пра гэта брату (1427). Ян Длугаш абвінавачваў яго ў ініцыяванні плётак і дыскрэдытацыі каралевы. Казалі аб непрыстойных паводзінах Гальшанскай і яе сувязі са шляхтай пры двары. Глебу для падазрэнняў давала розніца ва ўзросце і цяжарнасць Соф'і. Пачалося следства. На некаторы перыяд каралева была адсунута ад караля. Яе збіраліся выправіць у ВКЛ. Ягайла патрапіў у складаную сітуацыю. Пры прызнанні здрады ставілася пад сумнеў законнасць нашчадкаў. Прыняць здраду азначала страціць рэпутацыю мужчыны і караля. Польская шляхта была супраць распальвання скандалу. У выніку Соф'я прынесла прысягу аб невінаватасці і справу закрылі[60]. Даволі складана меркаваць пра праўдзівасць плётак, тым больш з далечыні нашага часу. Генетычная экспертыза магла б праліць святло, але ў кожным выпадку ў дзецях была княская кроў Гальшанскіх. Тым не менш адбыўся падрыў рэпутацыі каралеўскай сям'і. Дарэчы, другая жонка Ягайлы Ганна Цылейская таксама абвінавачвалася ў перапюбу з рыцарамі Якубам з Кабылян і Мікалаем Хрантоўскім, але была прызнана невінаватасць каралевы (1408)[61].

Шлюб з 54-гадовай Ганнай Ягелонкай стаў умовай абрання каралём і вялікім князем Стэфана Баторыя. Практычна ад самага пачатку ён пазбаўляўся магчымасці мець законных дзяцей. Адносіны ў шлюбе не скл аліся. Баторый часта адсутнічаў і зрабіў сабе рэзідэнцыю ў Гародні. Калі верыць тагачасным плёткам, ён меў стасункі з гарадзенскай мяшчанкай. У іх нарадзіўся сын, якому далі прозвішча Князбоўскі. Ён служыў у канфедэрацыі ў роце Млоцкага, валодаў маёмасцю ў Гародні (1613)[62].

Кароль Уладзіслаў IV таксама меў схільнасць да гарадзенскіх дзяўчат. Яму вельмі спадабаліся прыгожыя дзеўкі нейкай Саламонавай. Спачатку ён кахаўся са старэйшай. Калі яна выйшла замуж за нейкага літвіна, то кароль даў яму староства за гэта. Потым манарх меў стасункі з другой дачкой. Яе муж таксама атрымаў староства[63].

Каралеўскія сем'і ствараліся не для кахання, а для палітыкі. Таму мець каханкаў было звычайнай справай у еўрапейскіх дварах. Напрыклад, Марыя Казіміра ў сваім лісце да мужа Яна III Сабескага пісала пра новае захапленне французскага караля паненкай ля Матэ (1662)[64].

---

[58] Ruggiero G. The Boundaries of Eros. P. 61–63.

[59] Пра сватаўство Ягайлы да Соф'і Гальшанскай напісана ў Хроніцы Быхаўца. ПСРЛ. Т. 32. С. 149.

[60] Długosz J. Roczniki. Ks. 11. Warszawa, 2009. S. 238–242; Stryjkowski M. Kronika.... Królewiec, 1582. S. 558; Bielski M. Kronika polska. Kraków, 1597. S. 328; Nikodem J. Witold wielki księże litewski (1354 lub 1355 – 27 października 1430). Poznań, 2013. S. 371–376.

[61] Długosz J. Roczniki. Ks. 10–11412. Warszawa, 2009. S. 22–23.

[62] Trepka W. N. Liber generations plebeanorum ("Liber chamorum"). Wroclaw; Warszawa; Kraków, 1995. s. 205.

[63] Ibid. S. 355.

[64] d'Arquien de la Grange M. K. Listy do Jana Sobieskiego. Warszawa, 1996. S. 179.

Шлюбныя здрады не абмінулі шляхецкія сем'і. Выбар шляхцянак падаў часам на мужчын з ніжэйшых сацыяльных прыступак. З'ява была вядома не толькі ў ВКЛ[65]. Маршалак ВКЛ Крыштаф Мікалай Дарагастайскі хацеў скасаваць шлюб з другой жонкай Зафеяй Радзівілаўнай. Па абавязку палітычнай і вайсковай службы ён часта адсутнічаў. Жонка скарысталася гэтым для сустрэч з яго слугой Станіславам Тымінскім у 1607 г. Спачатку гэтыя адносіны хаваліся, а потым сталі яўна дэманстравацца. Пад пагрозай пакарання за зводніцтва прачка Барбара Паўлава падрабязна расказала, як разгортваліся падзеі. К. Дарагастайскі ў першым парыве напісаў да Радзівілаў, што за гэтае злачынства трэба "горлам караць". Адначасова ён пачаў збіраць доказы здрады: паказанні слуг і шляхцічаў. Склалася небяспечная для Радзівілаў сітуацыя. Зафея, апраўдваючыся перад братамі, паведаміла, што К. Дарагастайскі стаў не здольным выконваць шлюбныя абавязкі, а яна хацела нарадзіць дзіця і таму здрадзіла мужу. Дарэчы, аб тым, што "купідон не раскрывае яму вароты перад старасцю", Дарагастайскі сам пісаў у лісце ў 1612 г. Браты прыклалі ўсе намаганні, каб справа не дайшла да разводу і шлюб захаваўся. Дарагастайскі не выбачыў здрады Тымінскаму. Адбыўся судовы працэс у Луцку ў 1607 г. Судзілі яго не за здраду, а за замах на шляхецкую маёмасць. Станіслаў згадзіўся з прысудам, бо на гэта была папярэдняя дамоўленасць з Дарагастайскім. Смяротнае пакаранне замянілі на высылку з Рэчы Паспалітай на 6 гадоў і штраф 10 000 злотых. Тымінскі не толькі не выехаў, а стаў служыць у каронным войску[66].

Падчашы ВКЛ Януш Радзівіл пагражаў утапіць каханка яго жонкі Зафеі Алелькавічаўны Слуцкай, якім, выявілася, быў яго слуга татарын Ян Асмульскі. Выкрылі здраду наступным чынам. Ян адпрасіўся ў Радзівіла паехаць да бацькі, а сам паехаў у Слуцк. Януш накіраваўся туды таксама. Жонка доўга не хацела яго пускаць, а калі ён увайшоў, то Асмульскага ўжо не было. Слуга быў вымушаны ўцячы ў Львоў. Але і там яго Радзівіл знайшоў. Яго асудзілі за крадзеж упрыгожанняў княгіні[67].

Гальшка Радзівілаўна скардзілася свайму бацьку Мікалаю Радзівілу Сіротку, што яе супольнае жыццё з мужам Габрыэлем Цянчынскім значна пагоршылася праз яго нявернасць (1613)[68]. Гальшка вельмі цяжка перажывала сямейныя праблемы і са сваёй бядою звярталася да сваякоў. У дадзеным выпадку толькі ад іх яна магла атрымаць падтрымку і дапамогу, каб паўплываць на мужа. У суд Радзівілы не звярнуліся.

Некаторыя асобы нават станавіліся гераінямі літаратурных твораў. Так, верш, прысвечаны жонцы троцкага ваяводы Багуслава Аляксандра Уніхоўскага Барбары Дуніноўне[69], апавядае, што яна паспявае завесці каханкаў, нягледзячы на кульгавасць. А стары і сляпы на адно вока муж не заўважае здрады:

[65] Ruggiero G. The Boundaries of Eros. P. 63.

[66] Sajkowski A. Opowieści. S. 225–230, 320–321; Seredyka J. Księżniczka i chudopachołek.

[67] Trepka W. N. Liber generations plebeanorum. s. 296–297; Sajkowski A. Od Sierotki do Rybańki. W kręgu Radziwiłłowskiego mecenaty. Poznań, 1965. S. 53–54; Kuchowicz Z. Miłość Staropolska. Lódź, 1982. S. 199–200; Bruckner A. Dzieje kultury polskiej. T. II. Polska u szczytu potęgi. Warszawa, 1991. S. 451.

[68] Sajkowski A. Staropolska Miłość. S. 54–64.

[69] Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. Województwo Trockie XIV–XVIII wiek / Pod red. A. Rachuby. Opr. H. Lulewicz, A. Rachuba, P. P. Romaniuk, A. Haratym. Przy współpr. A. Macuka i J. Aniszczanki. Warszawa, 2009. S. 230.

*Woiewodzina trocka (Unichowska)*
Niedolężne chcie złączył Bog do pary
Chromey zonie mąz slepy na oko stary
I choc paniu podobna nogami lecz cerą
Rowna z Dyany, y złamą Wenerą
Nagradza defekt tayny powierzchna uroda
Jeszcze nie iest kaleka kulawa gdy młoda
Chociasz nogę ma krotką ale w kroku spora
Dokąd z rana zamysli doydzie do wieczora
Rada się amornie y nie siedzi doma
Wszytką Litwię obiezy chciasz to iest chroma
A woiewoda trocki tak slepy na oczy
Ze y w Trokach lada kto zonę iemu troczy
Co za dziw bo iest chroma to się nie uchroni
Kazdy ią pewne złazi kto tylko dogoni[70].

Сярод мяшчанскага саслоўя пералюб таксама меў месца. Магілёўскі мешчанін Цімошка Бутака падаў скаргу на сваю нявестку Масюту Марцінаўну ў Магілёўскі магістрат (2 лютага 1580 г.). У яго доме спыніліся жаўнеры, а яна невядома з якой прычыны хацела ўцячы. Не давяраючы ёй, Цімошка пасадзіў нявестку на ланцуг. Масюта папрасіла паклікаць сястру Федзю. Апошняя, пабачыўшы гэту сітуацыю, узяла яе на парукі з умовай, што будзе трымаць яе ў сябе да прыезду мужа. Але Масюта ў выніку збегла. Таму другая скарга была ад Цімошкі на Федзю (3 лютага). На Масюту заявіў яе муж, шклоўскі мешчанін Іван Бутака (Бутаковіч). Пакуль ён быў у Быхаве, яна ўцякла з жаўнерамі і забрала рэчы (3 лютага). Пасля Цімошка знайшоў сведак, якія пацвердзілі парукі Федзі. Суд загадаў ёй знайсці сястру і вярнуць (4 сакавіка). Але са скаргі Яна Гульскага, таварыша роты Войцеха Хацімірскага, вынікае, што муж забраў Масюту з маёнтка Мар'і Курдзееўны (16 красавіка). Гульскі даў Масюце на захаванне 183 чырвоных залатых, а яна не вярнула грошы. Прычым Бутакам неаднаразова высылаліся паведамленні. Калі вайсковец быў у Магілёве, ён пабачыў жанчыну і забраў да сябе. Гатовы быў яе вярнуць таму, хто аддасць яму грошы, а ў магістрат прыехаў, каб знайсці Бутаку. Але праз пару дзён была заява Цімошкі на Федзю, якая не прывяла сястру (18 красавіка), заявы паўтарыліся яшчэ (7 і 11 мая)[71]. У кнізе выніковага прысуду не выяўлена. Таму цяжка меркаваць, чым скончылася справа.

Полацкі архіепіскап скасаваў шлюб магілёўскага мешчаніна Багдана Лук'янавіча і Уліты. Жонка на яго вачах, у яго доме, здраджвала з некалькімі казакамі і пасля з'ехала з імі ў Маскву. Пасля яе вяртання муж пайшоў у духоўны суд і атрымаў развод (1610), але жанчына не была пакарана за пералюб. Яна нават атрымала назад свой пасаг[72].

Чурыла Арцёмавіч абвінавачваў свайго бацьку Арцёма Павязкага ў пералюбе са сваёй жонкай і сцвярджаў, што застаў іх падчас стасункаў. Аднак дадатковых

[70] ANK, ASang. 246.

[71] АВАК. Т. 39. Вильна, 1915. С. 513, 537–538, 572, 575, 595, 600.

[72] ИЮМ. Вып. 8. Витебск, 1877. С. 294–299; Bardach J. Świecki charakter zwyczajowego prawa małżeńskiego. S. 118.

дадзеных ён даць не змог, а жонка адмовілася ад абвінавачвання. Гэта прымусіла Магілёўскі магістрат адправіць справу на даследаванне (1617)[73].

Берасцейскі радца Лукаш Памаранскі падаў у магістрат скаргу на жонку Альжбету Шчупакоўну з просьбай скасаваць шлюб. Ён шмат гадоў трываў яе п'янства і здрады, пра якія яму расказвалі людзі, пакуль не пабачыў гэта на ўласныя вочы. Нават былі сведкі пералюбу. Падчас памінак па жонцы Войцеха Галімскага Альжбета здрадзіла з чаляднікам Галімскага Янам Вярбіцкім. Адбылося гэта ў берасцейскім двары Зафеі Чаховічаўны, жонкі віленскага чашніка Даніэля Набароўскага. Каб пазбегнуць пакарання, мяшчанка збегла да прастытутак. Але справа мела працяг і была пададзена яшчэ луцкаму біскупу. У сваю чаргу ён накіраваў для правядзення следства двух пробашчаў – Каленскага і Вішніцкага. Гэта прымусіла Альжбету "прыпасці да ног" мужа і прасіць аб міласэрнасці, абяцаць выправіцца, а таксама скласці перад камісарамі ліст з абавязкамі, які быў унесены ў кнігі Берасцейскага магістрата. Мяшчанка прызнавала віну і слушнасць абвінавачванняў мужа, абяцала спавядацца і пакаяцца, хадзіць да споведзі на кожнае свята, насіць толькі чорную вопратку да канца жыцця, больш не піць і не здраджваць мужу, год не піць алкаголю, толькі ваду на абед і піва на вячэру, скасаваць усе скаргі на мужа, не мець дачынення да аптэкі мужа і яго рамяства. Яна пагадзілася, што пры парушэнні ўмоў супраць яе зноў будзе пачата справа аб шлюбнай здрадзе ў свецкім і духоўным судзе, у выніку чаго Альжбета будзе адлучана ад сваёй маёмасці і пакарана смерцю. Яна давярала мужу сваю бяспеку і выплату пазыкі ў 10 злотых (1640)[74].

Выпадак даволі цікавы з пункту гледжання практыкі права. Віна Альжбеты была відавочнай. Ёй пагражала смяротнае пакаранне. Калі справа дайшла да свецкага і духоўнага суда, то гэта прымусіла мяшчанку шукаць пагаднення з мужам. Менавіта ад яго залежаў вынік. Фіксацыя пунктаў абавязкаў давала магчымасць Памаранскаму ў будучым выкарыстаць дакумент супраць жонкі. У дадзеным выпадку мы маем прыклад, калі праз пагадненне смяротнае пакаранне было зменена на абавязкі перад мужам.

Берасцейскі мешчанін Павел Затэмяка падаў скаргу ў магістрат на цесця Яна Слесара і яго жонку, а таксам на непрыстойныя паводзіны жонкі Марыны (1644). Ён ажаніўся ў 1642 г., аднак нармальнага супольнага жыцця не склалася. Цесць з жонкай напіваліся і нападалі на дом зяця, збівалі яго, дачку падбухторвалі не жыць з ім. У 1643 г., калі лентвойтам быў Ян Кур'яновіч, які ў 1644 г. стаў бурмістрам, яны зрабілі так, каб шлюб не скасавалі. Калі Павел паехаў на заробкі ў Магілёў, то папрадавалі рэчы з дому, павыпівалі піва, забралі сярэбраны пояс маці. У сувязі з гэтымі падзеямі, а таксама з непрыстойным, амаральным ладам жыцця жонкі мешчанін перад чарговым выездам адмовіўся ад яе. Пры гэтым дазволіў жыць на яго палове дома, нават прадаць з умовай, што яму будзе палова грошай. Цешчы забаранялася з'яўляцца ў доме. А дзіцё, якое нарадзілася ў шлюбе, абяцаў карміць[75].

---

[73] ИЮМ. Вып. 8. Витебск, 1877. С. 344–345.

[74] НГАБ, ф. 1786, воп. 1, спр. 2, арк. 641–642, 667–670; АВАК. Т. 6. Вильна, 1872. С. 366–367.

[75] НГАБ, ф. 1786, воп. 1, спр. 3, арк. 325 адв. – 326 адв.

У судовай кнізе не атрымалася выявіць далейшую гісторыю скаргі. Але дадзеная заява была прычынай для скасавання шлюбу. П. Затэмяка быў абрабаваны сям'ёй жонкі і даведзены да галечы. Пры гэтым і іх супольнае жыццё не склалася. Аднак у скарзе ён не настойваў на расследаванні і смяротным пакаранні жонкі за пералюб, а толькі хацеў скасаваць шлюб.

Вынікі наступных скаргаў не атрымалася выявіць. Матыс Ёдэшка абвінавачваў жонку Ганну ў абразах, пагрозах яму і дзецям. Ён застаў жонку на гарачым учынку з чаляднікам нейкага паручніка. Калі Ганна пабачыла мужа, то сказала каханку забіць яго. Паручнік, пачуўшы яе крык, кінуўся на Матыса з шабляй. Калі б ён не ўцёк, то, напэўна, быў бы забіты (1658)[76]. Скаржнік больш хваляваўся за сваё жыццё і сваіх дзяцей, чым за здраду жонкі. Для яго было больш істотна, што ў выніку яе паводзін ствараецца небяспечная для жыцця і дабрабыту сітуацыя.

Падаць чарговую скаргу віленскага мешчаніна і купца Андрэя Вярбіцкага на жонку Еву Мілінянку прымусіў замах на яго жыццё. Забыўшыся на страх Божы, права і шлюбныя абавязкі, яна шкодзіла гаспадарцы, піла, зневажала мужа і здраджвала яму. Першы раз яна скалечыла Андрэю руку ў 1660 г. Была ініцыявана справа, але сябры і віленскі афіцыял настаялі на тым, каб ён прыняў жонку і скасаваў скаргу. Але сямейнае жыццё лепшым не стала. У 1663 г. Ева прыйшла дадому з "гарадскіх забаваў", сама з'ела абед, абразіла мужа, ударыла па шапцы, якая на зямлю ўпала. Калі Андрэй схіліўся яе падняць, то жонка схапілася за нож і кінулася на яго і параніла моцна галаву. Аб гэтым сведчылі лаўнікі. Нават пры людзях, на судзе, Ева пагражала мужу забойствам[77]. Прысуду па другім выпадку не выяўлена. Першай скаргі было дастаткова для разводу, бо быў замах на жыццё. Жанчына падлягала пакаранню смерцю за пералюб і замах. Аднак свецкія і духоўныя асобы настаялі на захаванні сям'і.

Як вынікае з дакументаў, крамнік Амброжый Меер быў не толькі пералюбнікам, але і злачынцам. Ганна Нейманоўна, жонка сталяра Яна Норвея, абвінавачвала яго ў намаўленні да сексу. З прычыны адмовы крамнік стаў рабіць шкоду яе сям'і: няслушна адправіў мужа ў вязніцу ў замку, а пасля і саму жанчыну, калі яна спрабавала даведацца пра лёс мужа. Яе выпусцілі, бо была небяспека цяжарнасці. Пасля крамнік падбухторыў замкавую пяхоту напасці на іх дом. Падчас нападу збілі мужа, абрабавалі дом, дзяцей павыганялі, немаўля выкінулі з калыскі. У скарзе змешчаны звесткі з біяграфіі Меера. Ён паходзіў з Любека, быў жанаты, здрадзіў жонцы з нейкай дзеўкай, якая ад яго зацяжарала. Каб пазбегнуць пакарання, уцёк у Вільню (1664)[78]. Крамнік прызвычаіўся атрымліваць ад жанчын згоду. Ганна была замужам і не хацела мець лішніх праблем ад мужчыны з сумнеўнай рэпутацыяй. У выніку помста Меера абрынулася на ўсю сям'ю. Тады быў ваенны час, такія злачынствы часта мелі месца. Выраку суда не выяўлена, таму цяжка меркаваць пра фінал справы. Але па сукупнасці здзейсненых правапарушэнняў магло дайсці да смяротнага пакарання.

[76] Frick D. Wilnianie. S. 113–114; Frick D. Kith, Kin, and Neighbors. P. 224–226.

[77] LVIA, f. 22, ap. 1, b. 1 (SA 5333), l. 337–338v.

[78] LVIA, f. 22, ap. 1, b. 1 (SA 5333), l. 420–421; Frick D. Wilnianie. S. 321–322.

Былі выпадкі пакарання смерцю за здраду. Першы раз у Магілёўскі магістрат Навум Радковіч ад імя дачкі Марыі падаў скаргу на яе мужа Ілью Анапрэевіча ў 1618 г. Ён абвінавачваў зяця ў шлюбнай няверласці. Аднак з прычыны адсутнасці доказаў яго вызвалілі ад адказнасці. Але праз год Ілью (1619) і яго каханку Адар'ю Казлеўну ўраднікі засталі на гарачым учынку. Абаіх прысудзілі да пакарання мячом на падставе магдэбургскага права[79].

Войтаўска-лаўніцкі суд Гародні асудзіў на смерць мяшчанку Раіну, дачку гарадзенскага ката Марціна Загурскага, за пералюб з жыдам Шымкам Хаімовічам (1668). Іх неаднаразова бачылі гараджане падчас сексуальных стасункаў у розных месцах, у тым ліку ва ўладаннях гарадзенскага касцёла Св. Мікалая. Раіна была замужам за хрысціянінам, а здраджвала з "няверным жыдам"[80]. Неаднаразовыя выпадкі пералюбу і стасункі з жыдам прывялі да смяротнага пакарання. Адмоўнае стаўленне да сексуальных адносінаў паміж жыдамі і хрысціянамі мела месца ў Венецыі. Там прадугледжвалася пакаранне грашовым спагнаннем і турэмным зняволеннем[81].

У 1688 г. Слуцкі замкавы суд разглядаў скаргу мяшчанкі Марфы Маркаўны Капыленіцоўны на былога мужа Фёдара Шуменку. У духоўным судзе спачатку ім далі сепарацыю (1686), а пасля замаху на яе жыццё – развод (1687). Фёдар абвінавачваўся ў п'янстве, чараванні, марэнні голадам жонкі, марнатраўстве яе маёмасці, пералюбе, замаху на жыццё. Такія сур'ёзныя абвінавачванні патрабавалі правядзення следства. Былі апытаны былыя сужэнцы і сведкі. Шуменка не прызнаваў сваю віну і сцвярджаў, што Марфа нагаворвае на яго. Выявілася, што мешчанін вёў распусны лад жыцця больш за 22 гады, хадзіў да прастытутак, замужніх жанчын, зрабіў дзіцё дачцэ Разбіцкага, спакусіў Домну Маляроўну, якую жонка ўзяла на працу. Апошняя адмаўляла факт стасункаў, але гэта пацвердзілі іншыя сведкі, у тым ліку яе маці. Выслухаўшы ўсіх, суд прыняў рашэнне пакараць смерцю Шуменку згодна з артыкуламі 29 і 30 раздзела 14 Статута ВКЛ 1588 г. Такое пакаранне было прызначана для таго, каб неадпаведныя стасункі не распаўсюджваліся ў шлюбных парах, а таксама каб Слуцк не спасцігла Божае пакаранне. Па справе была дазволена апеляцыя[82]. Нягледзячы на тое, што Шуменка здзейсніў розныя злачынствы, у тым ліку і замах на жонку, пакаралі яго менавіта за пералюб і распусту.

Справы пра пералюб мелі месца ў сялянскім асяроддзі. Калі б у выніку жарсці не згарэлі двары сялян, то наўрад ці выпадак разглядаўся на копным судзе. Падданыя Людвікі Караліны Радзівілаўны з сяла Цесава (Пагорская воласць Слуцкага павета) Іван, Дзмітрый, Фёдар і Даніла Прыгодзічы, Грый Проневіч, Васіль Рыбачэўскі, Грышка Проневіч абвінавачвалі Пелагею Лук'янаўну, жонку Фёдара Лінніка, у руйнаванні іх маёмасці і пералюбе (1687). Яны падалі наступную версію здарэння. Жанчына раззлавалася на мужа, што ён выганяў яе з дому за стасункі з яго родным братам Макарам. Каб яму адпомсціць, яна падпаліла

[79] НГАБ, ф. 1817, воп. 1, спр. 3, арк. 115 – 115 адв.; ИЮМ. Вып. 8. Витебск, 1877. С. 347–351.

[80] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 164 адв. – 165.

[81] Ruggiero G. The Boundaries of Eros. P. 86–87.

[82] НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 1239, арк. 387 – 390 адв.

хлеў, а ад яго полымя перакінулася на двары скаржнікаў. Сяляне патрабавалі для яе смяротнага пакарання і кампенсацыі страт з яе маёмасці. Іх словы пацвердзілі сведкі. Сваю версію Пелагея распавяла пад пагрозай лупцавання. Яна пайшла капаць буракі. Каб сагрэцца, распаліла вогнішча і не заўважыла, як ад яго загарэўся хлеў. Наконт стасункаў з Макарам яна настойвала, што гэта было згвалтаванне. Скарыстаўшыся адсутнасцю людзей, ён схіляў яе да сексу, а пасля ўзяў сілай. Сам Макар быў жанаты. Пра гэты выпадак сялянка паведаміла мужу і суседзям, аднак безвынікова. Мужа на судзе не было, але быў выкліканы яго брат. На судзе Макар, стаўшы на калені, казаў, што меў стасункі з Пелагеяй з яе дазволу. Улічыўшы ўсе паказанні, суд вынес рашэнне пакараць смерцю Пелагею і Макара. Прысуд павінны былі выканаць пасля прынясення прысягі скаржнікамі. Але ў прызначаны дзень сяляне адмовіліся ад настойвання на смяротным пакаранні для жанчыны, для іх дастаткова было яе выгнання са Слуцкага княства. Суддзі перадалі справу для канчатковага рашэння да адміністратараў Слуцкага княства[83].

У закрытым, лакальным асяроддзі пералюб выяўляецца вельмі хутка. Фёдар Ліннік атрымаў здраду з двух бакоў: ад жонкі і брата. Ён не стаў збіраць па факце капу і не шукаў пакарання смерцю для пералюбнікаў, а выгнаў жанчыну з хаты. Забарона на стасункі паміж сваякамі мела свой сэнс, бо такія дачыненні правакавалі сур'ёзныя канфлікты. Статут 1588 г. адназначна выказаўся за пакаранне смерцю абаіх удзельнікаў злачынства. Правапарушэнне выявілася ў выніку падпалу. У дакуменце пералюб асуджаецца як бессаромны і неадпаведны Божаму праву. Патрабаванне сялян жорсткага прысуду для Пелагеі заканамерна, калі ўлічыць, што яны страцілі свае двары 11 кастрычніка, напярэдадні зімы. За падпал выплачвалася кампенсацыя (Статут 1588 г. Раздз. 11, арт. 18). Аднак просьба аб пакаранні выгнаннем замяніла хуткую смерць на доўгую і пакутлівую. З улікам таго, што суд адбыўся 5 лістапада, Пелагею выпраўлялі ў халады без ежы і жытла. А прытулак злачынцам, як правіла, не давалі.

Пакаранне за пералюб было у тых выпадках, калі на гэтым настойвалі сужэнцы ці сваякі. Гэта правапарушэнне мела месца і ў гарадах Рэчы Паспалітай. Шлюбная здрада разумелася як злачынства супраць маралі і грамадскага спакою, таму за яго прызначалася сур'ёзнае пакаранне: лупцаванне, выгнанне, смерць[84]. У Італіі пералюб таксама лічыўся сур'ёзным правапарушэннем, за якое асуджалі на смерць, лупцаванне, турэмнае зняволенне[85]. Французскія нормы права дазвалялі абвінавачаную жанчыну пазбавіць пасагу і адправіць у кляштар на два гады, агаліўшы галаву. Выпусціць яе маглі толькі пасля прабачэння мужа. Зняволенне магло працягнуцца да канца жыцця. Судовая практыка ў Францыі рэдка выкарыстоўвала смяротнае пакаранне, часцей ужывалася лупцаванне, выгнанне, утрыманне ў манастыры[86].

---

[83] НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 1239, арк. 290 – 291 адв.

[84] Karpiński A. Przestępność we Lwowe w końcu XVI i w XVII wieku // Przegląd Historyczny. 1996. T. LXXXVII. Zesz. 4. S. 762, 766; Kaczor D. Przestępczość kryminalna. S. 129–143; Kamler M. Złoczyńcy. S. 277–284, 398–401; Krajewski R. Prawo i obowiązki seksualne małżonków. Studium prawne nad normą i patologią zachowań. Warszawa, 2009. S. 76, 87–90.

[85] Ruggiero G. The Boundaries of Eros. P. 45–69; Davidson N. Theology, Nature and the Law. P. 89.

[86] Malinowska M. Situacja kobiety. S. 55–61.

Рэлігійныя і прававыя нормы розных краін адназначна асуджалі сямейную здраду. Гэта было натуральнай з'явай у той час. У асноўным за пералюб каралі жанчын, мужчыны рэдка калі траплялі пад суд. Парушэнне спакою сям'і рэдка калі праходзіла без наступстваў. Ад пакрыўджанага боку залежала, выводзіць справу за рамкі сям'і ці разбіраць выпадак паміж сабой.

*Гомасексуальныя і лесбійскія сувязі*[87]. Стаўленне грамадства да аднаполых стасункаў у многім залежыць ад рэлігіі, традыцый, вызначанасці гендэрных роляў. Найлепшым асяроддзем для развіцця аднаполых стасункаў былі месцы канцэнтрацыі асобаў аднаго полу, такія як, напрыклад, войска і манастыры[88]. З'ява была больш уласціва гарадам[89], чым сельскай мясцовасці.

У некаторых культурах гомасексуалізм быў натуральнай з'явай. Напрыклад, гэта было характэрна для грэчаскай культуры. Часта было звязана з сістэмай выхавання юнакоў. Мужчынскае каханне знайшло адлюстраванне ў мастацтве, літаратуры, філасофіі, міфалогіі і іншых сферах. Нават была развіта мужчынская прастытуцыя[90]. Прычым у сексуальных дачыненнях актыўны партнёр захоўваў свой статус у грамадстве, а пасіўны станавіўся дэкласаваным элементам[91]. У Японіі акцэнт хоць і рабіўся на сяброўстве і духоўнай блізкасці мужчын, аднак у мастацтве сустракалася шмат гомаэратычных сюжэтаў і вобразаў[92]. Судовая практыка Венецыі толькі ў XV ст. пачынае адрозніваць пасіўных і актыўных удзельнікаў гомасексуальных кантактаў. Першыя атрымлівалі турэмнае зняволенне, а апошнія – смяротнае пакаранне[93].

На самым пачатку свайго існавання хрысціянства талерантна ставілася да геяў і лесбіянак. Але паступова стаўленне да іх набыло адмоўную афарбоўку. Спецыяльны трактат супраць аднаполых стасункаў сярод духавенства быў напісаны Пятром Дамяні (XI ст.). Ён прапаноўваў увесці жорсткія пакаранні супраць грэшнікаў[94]. Гомасексуальныя (у тым ліку і лесбійскія) сувязі набылі азначэнне ненатуральных сувязей, якія не ўласцівы прыродзе і не нясуць рэпрадукцыйнай функцыі. Важную ролю адыграў міф пра знішчэнне гарадоў Садомы і Гаморы (Быццё 19[95]) быццам бы за панаванне там гомасексуальных дачыненняў. Хаця

---

[87] Тэма аднаполых адносінаў стала шырока даследавацца за мяжой. Пра тэндэнцыі ў гістарыяграфіі гл.: Wyrobisz A. Tolerancja, nietolerancja i przesądy. S. 383–395.

[88] У праваслаўных манастырах гэта была сапраўдная праблема. Таму манастырскія статуты забаранялі ўсялякае праяўленне гомасексуальных стасункаў. Левина Е. Секс и общество в мире православных славян, 900–1700 // "А се грехи злые смертные..." С. 431–433; Кон И. С. Античная педерастия. Рэжым доступу: http://www.neuronet.ru/sexology/chapt1105.html.

[89] Queer Sites: Gay Urban Histories Since 1600 / Ed. D. Higgs. New York, 1999.

[90] Dover K. J. Greek Homosexuality. Updated and with a new Postscript. Cambridge; Massachusetts, 1978; Тэннехилл Р. Секс в истории. С. 141–150; Hupperts Ch. Homoseksualizm w Grecji i Rzymie // Geje i lesbijki: życie i kultura / Pod red. R. Aldricha. Kraków, 2009. S. 26–67; Friedman D. Pan niepokorny. S. 34–36.

[91] Левина Е. Секс и общество. С. 339–340.

[92] Кон И. С. Мужское тело. С. 86.

[93] Ruggiero G. The Boundaries of Eros. P. 121–124.

[94] Skwierczyński K. Walka z sodomią wśród kleru – "Liber Gomorrhianus" Piotra Damianiego // Przegląd Historyczny. 2007. № 98. S. 369–382.

[95] Вынікам знішчэння гарадоў стала кровазмяшэнне: дочкі Лота нарадзілі ад яго сыноў.

ў Бібліі адназначна пра гэта не гаворыцца. Натоўп мужчын прыйшоў да дому Лота і патрабаваў "пазнаць" двух яго гасцей мужчынскага полу. На што ён адказаў, што мае дзвюх дачок, якія не ведалі мужчын, і дазволіў з імі рабіць што заўгодна. Трактаванне гэтага ўрыўку як ілюстрацыі існавання гомасексуальных стасункаў было прынята ў пазнейшых рэлігійных працах. Але згодна з Першым пасланнем да Карыфіян (6:9) мужаложнікі разам з распуснікамі, пералюбнікамі і ананістамі не вартыя Царства Божага. Наяўнасць адмоўнай тэалагічнай трактоўкі сувязей паміж мужчынамі дала магчымасць праводзіць карныя працэсы ў сярэднявечных еўрапейскіх гарадах. Гомасексуалізм стаў дэманізавацца, яго называлі прычынай голаду, землятрусаў, пошасці і іншых няшчасцяў. У Венецыі і Фларэнцыі былі створаны спецыяльныя суды па пераследзе мужаложнікаў. Іх стасункі трактавалі як грэх супраць прыроды. З 1431 па 1502 г. магістрат вывучыў справы каля 10 000 мужчын. А ў Венецыі Францэска Фалька абвінавачваўся ў стварэнні школы для садамітаў (1553). Каралі ў італьянскіх гарадах кастрацыяй ці спаленнем. Пакаранні за гомасексуальныя дачыненні мелі месца і ў іншых еўрапейскіх гарадах[96].

У кантэксце еўрапейскай палемікі пра Садому і Гамору варта згадаць наш вопыт. У выданні "Бібліі" Францыска Скарыны глава 19 прыводзілася без каментароў[97], як і ў Астрожскай Бібліі[98]. Але ў Берасцейскай Бібліі 1563 г. побач змешчаны каментар: Лот зразумеў, што садаміты хочуць гасцей для незвычайнай распусты. У Нясвіжскай Бібліі ідзе спасылка на Першае пасланне апостала Паўла да Карыфіян[99]. Дадзены выпадак наўпрост адносілі да гомасексуалізму, а мужаложнікаў – да ліку грэшнікаў[100]. Практычна гэта давала магчымасць выкарыстоўваць Стары і Новы Запаветы ў судовых працэсах супраць гомасексуалістаў. Іншая літаратура рэлігійнага характару таксама адмоўна ставілася да аднаполых стасункаў. Напрыклад, мужаложнікаў адносіў да ліку грэшнікаў Сымон Будны[101]. Такой жа думкі прытрымлівалася ўніяцтва. У кнігах аднаполыя стасункі, у тым ліку паміж жанчынамі, называліся садаміяй[102]. Гэты грэх лічыўся горшым за пералюб[103].

---

[96] Stone L. The Family, Sex, and Marriage. P. 492; Ruggiero G. The Boundaries of Eros. P. 109–145; Davidson N. Theology, Nature and the Law. P. 87, 89, 90; Hughes O. D. Bodies, Disease, and Society. P. 113–114; Boswall J. Chrześcijaństwo, tolerancja społeczna i homoseksualność; Hergemöller B.-U. Średniowiecze // Geje i lesbijki: życie i kultura / Pod red. R. Aldricha. Kraków, 2009. S. 57–77; Tazbir J. Dewiacje obyczajowe // Studia nad kulturą staropolską. Prace wybrane / Red. S. Grzybowski. T. 4. Kraków, 2001. S. 253; Oczko P., Nastulczyk T. Homoseksualność staropolska. Kraków, 2012. S. 60–63.

[97] Біблія: Факс. Т. 1. С. 69–74.

[98] Біблія... Астрог, 1581. Арк. 7 адв. – 8.

[99] Biblia swięta. Brzest, 1563. S. 10; Biblia to iest księgi Starego y Nowego przymierza znowu z języka Hebrayskiego/Greckiego y Łacińskiego na Polski przełożone. Nieśwież, 1572. S. 9–11. З Бібліі 1563 г. і з Нясвіжскай Бібліі 1572 г. гэты і іншыя ўрыўкі, якія адносяцца да гомасексуальных стасункаў, надрукаваны ў: Oczko P., Nastulczyk T. Homoseksualność staropolska. S. 253–258.

[100] Апостол. Вильна, 1595. С. 135, 188; Nowy Thestament. Nieśwież, 1568. S. SIIIv.

[101] Катэхізіс: помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст. С. 112.

[102] Собрание припадков. С. 113; Zankiewicz D. Wódz malutkich. S. 337; Koronczewski A. Teologia moralna. S. 315.

[103] Szczurowski T. Missya bialska. Prawo kanoniczne. Kn. 1. S. 250.

Варта заўважыць, што адмоўнае акрэсленне аднаполых стасункаў у заходняй культуры адбывалася на фоне станаўлення інстытуту шлюбу. Яго прылічылі да Таямніцы, а стасункі паміж мужчынам і жанчынай сталі базавымі[104].

У перыяд Рэнесансу ў Еўропе было зроблена акрэсленне паняцця "садамія". Да яе сталі адносіць мастурбацыю, пазавагінальныя стасункі паміж мужчынам і жанчынай, заафілію, гомасексуалізм. У нас гэты тэрмін разумеўся такім самым чынам. Стаўленне да кантактаў паміж мужчынамі як да граху не змянілася. Гэта праяўлялася нават у мастацтве. Напрыклад, Сандра Бацічэлі ў ілюстрацыях да "Боскай камедыі" Дантэ змясціў садамітаў у пекле. Пераслед гомасексуалістаў не спыніўся ў перыяд Рэнесансу. Аднак з'ява працягвала існаваць. Месцамі сустрэч мужчын былі храмы, грамадскія прыбіральні, лазні, дамы. Да таго Рэнесанс зрабіў магчымым з'яўленне гомаэратычных твораў. Гэта праявілася ў карцінах, прысвечаных святым. Напрыклад, аголенае цела Св. Себасцяна на карціне Гвіда Рэні не пазбаўлена эратызму. З пяці карцін са Св. Себасцянам гэтага мастака вобраз, намаляваны ў 1639–1640 гг., стаў іконай геяў. Гэты святы неаднаразова прыцягваў увагу многіх мастакоў. На іншых выявах ён часта выглядае не як пакутнік, а як прывабны мужчына ці юнак[105].

Часам да праблемы гомасексуалізму звярталіся ў медыцынскіх трактатах. Так, у працы Псеўда-Арыстоцеля "Problemata" абмяркоўвалася задавальненне мужчын ад анальнага сексу[106].

Сучаснікі адзначалі распаўсюджанасць гомасексуалізму ў Францыі, Італіі, Турцыі[107]. Сярод прыхільнікаў мужчынскага кахання былі вядомыя асобы Італіі: Леанарда да Вінчы, Сандра Бацічэлі, Мікеланджэла і інш.[108]

Праз літаратуру ў нас маглі даведацца, што пакаёвыя ў Турцыі вельмі добра былі дасведчаны ў "навуцы Платона". Спасылка на філосафа прыведзена не выпадкова. Найбольш яскрава ідэі аднаполага кахання прадстаўлены ў яго працы "Пір"[109]. Прычына гомасексуальных стасункаў бачылася аўтару ў жорсткім абмежаванні кантактаў з жанчынамі. Туркі кахаліся "ў акне", у мячэці ці лазні. Жарсці да маладых хлопцаў ахоплівалі нават султанаў. Султан Мурат шалёна закахаўся ў армяніна Музу і праз гэта рабіў розныя вар'яцтвы. "Смуродлівае полымя" ахоплівала і турэцкіх жанчын. Старыя жанчыны прываблівалі маладых прыгожай вопраткай і каштоўнасцямі[110].

Заўважым, што распаўсюджанасць гомасексуальных стасункаў сярод мусульман і татараў адзначалі вандроўнікі яшчэ ў XIII ст.[111] Замежныя падарожнікі здзіў-

[104] Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 340–347.

[105] Puff H. Wczesnonowożytna Europa, 1400–1700. S. 77–89, 95–101; Кон И. С. Мужское тело. С. 229–243, 426–432.

[106] Same-Sex Desire. P. 115–134.

[107] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 319; Oczko P. Dlaczego nie chcę pisać o staropolskich samcołożnikach? Przyczynek do "archeologii" gay studies w Polsce // Teksty Drugie. 2008. № 5. S. 38.

[108] Davidson N. Theology, Nature and the Law. P. 87.

[109] Платон. Пір. Рэжым доступу: http://lib.ru/POEEAST/PLATO/pir.txt.

[110] Monarchia turecka. S. 40, 42–44.

[111] Собрание путешествий к татарам и другим восточным народам, в XIII, XIV, XV столетиях. СПб., 1845. С. 110, 111.

ляліся спакойнаму стаўленню да мужаложнікаў у Маскоўскім княстве[112]. Са слоў Адама Алеарыя вынікае, што гомасексуальныя дачыненні былі шырока вядомы[113]. На гэта таксама звярнуў увагу Самуэль Колінз. Распаўсюджанасць мужаложніцтва была звязана з рэзкім размежаваннем мужчын і жанчын у грамадстве. Пры гэтым да лесбійскіх стасункаў ставіліся больш спакойна[114]. Лічылася, што ў асяроддзі запарожскіх казакоў таксама сустракаліся гомасексуальныя дачыненні[115].

У літаратуры часта ўражанні ад той ці іншай краіны носяць суб'ектыўны характар. Праз яе немагчыма даць колькасную характарыстыку з'явы. Абвінавачванні ў нетрадыцыйных сексуальных дачыненнях маглі мець пад сабой не толькі факты, але і грунтавацца на этнічных і рэлігійных стэрэатыпах[116]. Але нягледзячы на суб'ектыўнасць, звяртанне ўвагі на гомасексуалізм азначала яго наяўнасць у грамадстве.

Статуты ВКЛ не мелі асобных артыкулаў супраць гомасексуалістаў. Аднак суддзі маглі звярнуцца да артыкула LXXI з Крымінальнага кодэкса Караліна, які прадугледжваў смяротнае пакаранне і спаленне за сувязі паміж мужчынамі[117]. Такое ж пакаранне выкарыстоўвалася ў кодэксе Барталамея Граіцкага. Гэты прысуд фігураваў у судовай практыцы Польшчы[118]. Але такіх выпадкаў было няшмат. Да гомасексуальных стасункаў ставіліся як да ненатуральных і брыдкіх кантактаў, справакаваных д'яблам. На гэта паўплывала стаўленне рэлігіі да гомасексуалізму як да граху[119].

У ВКЛ для азначэння стасункаў паміж мужчынамі выкарыстоўвалі тэрмін "мужаложнік"[120], "садаміт"; сучасныя тэрміны ("гомасексуаліст", "лесбіянка") былі запазычаны. Для шляхецкай культуры мелі важнае значэнне сям'я, дзеці, працяг роду. Гомасексуальныя адносіны не маглі гэтага даць. Таксама яны былі непрымальныя ў мяшчанскім і сялянскім асяроддзі. У XVI–XVII стст. гомасексуалізм мог існаваць толькі ў схаванай форме. Аднаполыя стасункі, як і іншыя распусныя паводзіны, адназначна асуджаліся ў літаратуры Рэчы Паспалітай[121].

На сённяшні дзень намі не выяўлены судовыя справы па аднаполых стасунках. Судовыя кнігі магістратаў і гродскіх судоў дайшлі да нас не цалкам. У сувязі з гэтым адсутнічае значная колькасць крыніц. Таму стаўленне да гэтай з'явы

---

[112] Кон И. С. Клубничка на березке. С. 24–25.

[113] Из записок иностранных путешественников XVI–XVII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 139.

[114] Левина Е. Секс и общество. С. 341–343.

[115] Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III // Wirtualna biblioteka literatury polskiej. S. 205–206; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 320.

[116] Tazbir J. Dewiacje. S. 257–261; Krawiec A. Seksualność. S. 236.

[117] Groicki B. Artykuły prawa majdeburskiego. S. 153.

[118] Oczko P., Nastulczyk T. Homoseksualność staropolska. S. 40–44.

[119] Kaczor D. Przestępczość kryminalna. S. 155–156; Kamler M. Złoczyńcy. S. 297–298; Oczko P. Dlaczego nie chcę pisać o staropolskich samcołożnikach? S. 36–37; Pietrzak J. "Cokolwiek serca i afektu Pańskiego mieć dla siebie upraszam". Dzieje romansu księcia Janusza Aleksandra Sanguszki z jego sekretarzem Kazimierzem Chylińskim // Klio. Czasopismo poświęcone dziejom Polski i powszechnym. 2013. T. 27 (4). S. 4, 6, 7.

[120] Апостол. Вильна, 1595. С. 135, 188.

[121] Kot S. Świadomość narodowa w Polsce wieku XV–XVII. Odczyt w Oddziale Krakowskim Polskiego Towarzystwa Historycznego. Lwów, 1938. S. 19; Tazbir J. Dewiacje. S. 252–274.

можна зразумець у асноўным праз літаратуру. Ян Длугаш даволі негатыўна ставіўся да іншаверцаў. Русіны з ВКЛ характарызаваліся не толькі здрадлівасцю, але і садомскімі стасункамі. Пратэстанцкі пастар Ян Жыгровіуш абвінавачваў каталіцкіх ксяндзоў не толькі ў распусце, але і ў гомасексуальных кантактах[122].

Вельмі рэдка захапленне мужчынскім целам сустракаецца ў літаратуры ВКЛ. У казанні на смерць сына віленскага кашталяна Мікалая Глябовіча, Яна, юнак характарызаваўся як цнатлівы, сарамлівы, пакорлівы і прыгожы. Апошняя рыса даволі незвычайная для характарыстыкі мужчыны. Прычым аўтар твора даволі шмат увагі аддае менавіта ёй. Ён прыводзіць прыклады прыгожых мужчын са Старога Запавету (Язэп, цар Вавілонскі Навухаданосар, Міхаіл, Давід) і адзначае, што ў іх прыгажосць і цнота былі побач. Па выглядзе аўтар параўноўвае Яна Глябовіча з Давідам: "*...Był młodzieniec na weyzrzenie piękny, y wzięty w oczach wszyskiego ludu, a naybardziey w oczach dworzan krolewskich dla ktorey grzecznosci iego, iako był krol Saul Dawida na obsługę swoię pokoiową od oyca wziął mowac mu: Niech Syn twoy Dawid stawa przed oblicznocię moią nałazł abowiem łask w oczach moich...*"[123].

Паводле слоў аўтара, Ян Глябовіч быў настолькі прыгожы, што яго выгляд выклікаў каханне. Гэта стала прычынай просьбы караля да Мікалая Глябовіча, каб яго сын стаў каралеўскім пакаёвым. У гэтым моцным акцэнце на прыгажосць юнака, якая пераважвае яго іншыя якасці, прасочваецца двухсэнсоўнасць і нават намёк на тое, што Ян карыстаўся сваёй прывабнасцю пры каралеўскім двары, прычым не толькі сярод жанчын. Гэта лірыка мела лёгкае гомаэратычные адценне і не ішла ў параўнанне з адкрытасцю часоў антычнасці. У літаратуры склалася меркаванне пра гомасексуальныя схільнасці Уладзіслава Вазы на падставе дзённіка Юрыя Асалінскага[124]. Існуе меркаванне, што з каралеўскіх асоб гомасексуальныя стасункі мелі Генрык Валезы, Якуб Людвік Сабескі, Міхаіл Карыбут Вішнявецкі[125].

У параўнанні з еўрапейскімі краінамі ў ВКЛ гомаэротыка як накірунак у мастацтве была маларазвітая. З візуальных крыніц варта згадаць сюжэт з тытульнай старонкі Берасцейскай Біблії 1563 г. У левым ніжнім куце намаляваны аголены мужчына, за якім шчыльна ззаду знаходзіцца д'ябал. Такім чынам выява адназначна адносіць гомасексуальныя дачыненні да грахоўнай д'ябальскай забавы. Пры гэтым у вобразе д'ябла паказаны актыўны партнёр, які спакушае пасіўнага. Тытульная старонка з'яўляецца копіяй гравюры Альбрэхта Альтдорфера, зробленай для другой кнігі Майсеевай[126]. Аўтарства копіі прыпісваюць нямецкаму

---

[122] Zygrowiusz J. Papopompe albo poslanie Papieza z odprawą ná missią lutrowę y zwingliuszowę. Senapaniowczy, 1611. S. 353; Tazbir J. Dewiacje. S. 254, 257.

[123] Wawrzynec P. Senator w Jasnie Wielmożnym Panu JMP Mikołai IV Hlebowiczu na Dabrownie Kasztelanie Wileńskim, Oniksztyńskim, Radoszkowskim starosce oraz dworanin pokoiowy JKM w Wielmożnym panie Janie Hlebowiczu na Dabrownie synu kasztelіana pomienionego. Wilna, 1633. S. 19–22.

[124] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 319; Oczko P., Nastulczyk T. Homoseksualność staropolska. S. 97–102.

[125] Tazbir J. Dewiacje. S. 258; Oczko P., Nastulczyk T. Homoseksualność staropolska. S. 82, 469; Pietrzak J. "Cokolwiek serca i afektu Pańskiego mieć dla siebie upraszam". S. 8–9.

[126] Галенчанка Г. Невядомыя і малавядомыя помнікі. С. 93.

мастаку Лукасу Кранаху малодшаму[127]. У Еўропе гомасексуалізм у той час выклікаў незадавальненне, таму наяўнасць такога сюжэта была зразумелай.

Да гомаэратычных польскімі даследчыкамі быў аднесены медзярыт Генрыха Рэдліха "Вечар плытагонаў на Нёмане", 1866 г. На ім адлюстравана, як бавяць час плытагоны: спяваюць, танцуюць, а два мужчыны цалуюцца ў вусны. Усе ў тыповым беларускім строі[128]. З першага позірку даволі рэдкі сюжэт, які паказвае гомасексуальныя стасункі ў ніжэйшым саслоўі. Сярод плытагонаў былі толькі мужчыны, выпраўляліся ў дарогу яны надоўга, таму не дзіўна, што было месца для аднаполых кантактаў. Аднак абодва мужчыны намаляваны з бутэлькай у руцэ. Гэта акалічнасць можа ўнесці сумнеў у гомаэратычны вобраз плытагонаў. Пад уздзеяннем алкаголю ўзнікала так званае братэрства, як яго праява – пацалункі і абдымкі. На падставе выгляду шчок і вуснаў можна казаць пра пацалунак, дзе адзін кранае другога толькі губамі. Гэта не глыбокі пацалунак з языком. Паказаная тэхніка на выяве можа быць выкарыстана для пацалунку без сексуальнага падтэксту. Звяртае на сябе ўвагу становішча рук. Мужчына, паказаны тварам да гледача, проста паклаў рукі на плечы другому. Яны не кранаюць цела другога, як гэта бывае ў парыве жарсці і замілавання. Вынікі такога "братэрства" пад уздзеяннем алкаголю могуць быць рознымі. Але адназначна аднесці гэты мужчынскі пацалунак да ілюстрацыі гомасексуальных стасункаў складана. Ён не дэманструе відавочна гомаэротыку, як на карцінах Барталамея Чэсі "Два фларэнційцы" (1600) ці Пітэра Брэйгеля Старэйшага "Кірмаш у Хобакене" (1559)[129].

У XVIII ст. гомасексуальныя дачыненні менш хаваліся. Можна дакладна казаць пра нетрадыцыйную арыентацыю мечніка ВКЛ Януша Аляксандра Сангушкі, які быў адным з самых заможных магнатаў і меў выбітную генеалогію. Пад прымусам бацькі Паўла Караля ён ажаніўся ў 1731 г. на прыгожай Канстанцыі, дачцэ полацкага ваяводы Станіслава Дэнгофа. Але муж быў абыякавы да яе, як і да ўсіх кабет. Ён шмат увагі аддаваў прыдворным мужчынам. Яго фаварыты атрымлівалі маёнткі і каштоўнасці. Сярод іх вылучыўся сакратар Казімір Хылінскі, які дзякуючы стасункам з Сангушкам зрабіў добрую кар'еру і палепшыў маёмасны стан свой і сваякоў. Бацька Януша Аляксандра быў супраць гомасексуальных схільнасцяў сына, безвынікова спрабаваў прымусіць яго жыць з жонкай. Ён зрабіў шмат намаганняў, каб выкінуць з двара сына сакратара, адправіў яго ў турму за фінансавыя махінацыі, а пасля ў выпраўленчы дом у Гданьску. У 1751 г. луцкі біскуп не змог дамагчыся разводу для гэтай пары. Пасля смерці мужа Канстанцыя выйшла замуж у 64 гады за маладога Юзафа Рагалінскага, які растраціў яе маёмасць[130]. Але, тым не менш, замежнікі,

[127] Kwielecka I. Biblia brzeska jej dzieje i znaczenie // Nauka. 2006. № 3. S. 113.

[128] Медзярыт быў зроблены на падставе малюнка Максімільяна Антонія Пятроўскага. Выява надрукавана, гл.: Oczko P., Nastulczyk T. Homoseksualność staropolska. S. 166.

[129] Oczko P., Nastulczyk T. Homoseksualność staropolska. S. 111, 131.

[130] Raczyński E. Obraz polaków i Polski w XVIII wieku. T. I. Poznań, 1840. S. 62–67; Czeppe M., Marcinek R. Sanguszkowa // PSB. T. 34/4. Zesz. 143. Warszawa; Wrocław; Kraków, 1993. S. 523; Marcinek R. Sanguszko Janusz // PSB. T. 34/4. Zesz.143. Warszawa; Wrocław; Kraków, 1993. S. 491; Oczko P. Dlaczego nie chcę pisać o staropolskich samcołożnikach? S. 36; Pietrzak J. "Cokolwiek serca i afektu Pańskiego mieć dla siebie upraszam". S. 11–32.

якія наведвалі Рэч Паспалітую ў XVIII ст., адзначалі адсутнасць шырокай абазнанасці жыхароў у гомасексуалізме[131].

Выпадкаў стасункаў паміж жанчынамі ў еўрапейскіх краінах сустракаецца менш, чым паміж мужчынамі[132], да гэтай з'явы грамадства ставілася значна спакайней. Сур'ёзнага пераследу лесбіянак не адбывалася. Навакольнае асяроддзе вельмі рэдка дазнавалася пра такія дачыненні, як у выпадку Альжбеты Петрасолінаўны з Хмельніка[133].

Да лесбійскіх стасункаў таксама адносілі кантакты з гермафрадытамі. Іх лічылі сярэднім пераходным полам[134]. Гермафрадыты і асаблівасці іх целаскладу абмяркоўваліся ў еўрапейскай медыцынскай літаратуры і звязваліся з лесбійскімі стасункамі[135].

У Псеўда-Арыстоцеля змешчана цікавая інфармацыя на гэты конт. Адзначалася, што гермафрадыты атрымліваюцца з прычыны спецыфічнага падзелу семя. Складанасць узнікае пры спробе аднесці такіх асоб да нейкага полу. Мужчынам ці жанчынай можна было назваць у залежнасці ад таго, якім органам карысталіся падчас інтымных стасункаў. Таксама на гэта абапіраліся пры вынясенні прысуду. Але хрышчэнне атрымліваў гермафрадыт як мужчына[136]. Ва ўніяцкім зборніку ў выпадках вянчання гермафрадыта было рэкамендавана звяртацца да епіскапа[137]. У пазнейшай літаратуры шлюбы гермафрадытаў прызнаваліся[138].

У творчай спадчыне Д. Набароўскага ёсць верш, прысвечаны гермафрадыту:

*Do jednego Hermafrodyty*
Nie wiem, hermafrodytą, przeczcie ludzie zowa,
Jakobyś i miężczyzną był, i białogłowa.
Ja z ciebie tych dwóch natur nie moga wyłatać.
A toli jednak powienien o tym zdanie moje:
Kiep – eś, pyje nosisz, o toż masz oboje[139].

Аднаполыя стасункі часта сустракаюцца ў грамадствах, якія маюць выразны гендэрны падзел, дзе існуюць жорсткія абмежаванні ў гетэрасексуальных дачыненнях. З'ява больш распаўсюджана сярод эліты, чым сярод простых людзей. У культуры ВКЛ не знайшло водгуку аднаполае каханне. У мужчынскіх і жаночых ідэалах было месца толькі традыцыйным вобразам, зарыентаваным на сям'ю. Адпаведна ў такой сітуацыі не было патрэбы ствараць адмысловых

[131] Tazbir J. Dewiacje. S. 271–272.

[132] Oczko P., Nastulczyk T. Homoseksualność staropolska. S. 67.

[133] Oczko P. Dlaczego nie chcę pisać o staropolskich samcołożnikach? S. 33.

[134] Gowing L. Lesbijki we wczesnonowożytnej Europe, 1500–1800 // Geje i lesbijki: życie i kultura / Pod red. R. Aldricha. Kraków, 2009. S. 126–143.

[135] Park K. The Rediscovering of the Clitoris: French Medicine and the Tribade // The Body in Parts. Fantasies of Corporeality in Early Modern Europe / Ed. D. Hillman, C. Mazzio. New York; London, 1997. P. 171–193.

[136] Problemata Aristotelis. Paganus, 1557. P. 128–130.

[137] Собрание припадков. С. 81 адв.

[138] Szczurowski T. Missya bialska. Prawo kanoniczne. Kn. 1. S. 206.

[139] Naborowski D. Poezje / Oprac. J. Dürr–Durski. Warszawa, 1961. S. 41.

судоў для пераследу гомасексуалістаў. У дадзеным выпадку мы не можам казаць пра паўнавартасную гісторыю аднаполых стасункаў у княстве. Гэта звязана як з тагачаснымі поглядамі грамадства, так і з фрагментарнасцю крыніц.

*Скаталожніцтва.* Заафілія як з'ява больш уласціва народам, якія займаюцца жывёлагадоўляй. Напрыклад, для манголаў гэта была натуральная рэч[140]. У першым пасланні Паўла да Цімафея людзі з гэтай схільнасцю аднесены да грэшнікаў[141], што моцна паўплывала на стаўленне да іх і давала магчымасць прыцягнення да суда. Заафілія ў Еўропе трактавалася як самы агідны сродак сексуальных стасункаў. У крыніцах яна завецца садаміяй. За гэта спальвалі і злачынцу, і жывёлу. У Венецыі рамесніка Сымона закляймілі і адцялі правую руку. Пакаранне было такім мяккім у сувязі з тым, што ён меў праблему са здароўем: эрэкцыя была, але без семявывяржэння, што было спраўджана дзвюма прастытуткамі (XV ст.). На вёсцы да стасункаў з жывёламі ставіліся больш спакойна, як да забавы хлопчыкаў[142]. Адам Алеарый адзначаў пра развітасць скаталожніцтва ў Маскоўскім княстве[143]. Наконт запарожскіх казакоў існавала меркаванне, што ў сувязі з адсутнасцю жанчын яны былі схільныя да забаў з коньмі і каровамі[144].

У асноўным у польскіх судах выпадкі заафіліі разглядаліся ў справах мужчын; пра жанчын, якія прывучалі сабак вылізваць саромныя месцы, згадвае літаратура[145]. Як правіла, скаталожнікаў асуджалі на спаленне[146]. Пры вынясенні прысуду кіраваліся артыкулам LXXI Крымінальнага кодэкса Караліна[147].

Гэта норма была выкарыстана пры пакаранні злачынцаў у Ковелі ў XVIII ст. Правапарушальнікі былі тыповыя для гэтага выпадку – жаўнер і пастух. Апошні, Якуб Літвіннік, паходзіў з ВКЛ з сяла Тулічава. Ён ужо прыцягваўся да суда ў дамініканскім манастыры, калі там служыў. Хутчэй за ўсё, за гэта і быў выгнаны. Свае сексуальныя эксперыменты пачаў з 7–8 гадоў. У яго багатым спісе былі свінні, авечка, сабака (вопыт няўдалы, пакусала), карова, кабыла. Літвіннік быў злоўлены жонкай гаспадара на гарачым учынку[148].

Статуты ВКЛ не ўтрымлівалі нормаў супраць заафіліі. З пункту гледжання рэлігіі сувязь з жывёламі лічылася грахоўнай. Напрыклад, пра гэта наўпрост пісаў Сымон Будны[149] і адзначалася ў праваслаўным кананічным праве[150]. Пры вынясенні прысудаў для свецкага суда рэлігійны аспект меў значэнне.

---

[140] Тэннехилл Р. Секс в истории. Іл. "Мангольская заафілія".

[141] Апостол. Вильна, 1595. С. 188.

[142] Matthews-Grico S. Ciało i seksualność. S. 193–195.

[143] Из записок иностранных путешественников XVI–XVII вв. // "А се грехи злые смертные..." С. 139.

[144] Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. S. 309.

[145] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 308–309.

[146] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 308–309; Kamler M. Złoczyńcy. S. 406.

[147] Groicki B. Artykuły prawa majdeburskiego. S. 153.

[148] Диса К. Прихована частина айсбергу: "гріх бестіальный" у Ковелі XVIII ст.: в контексті історії сексуальності // Повсякдення ранньомодерної України. Т. 1: Практики, казуси та девіації повсякдення / Відповідальний редактор В. Горобець. Київ, 2012. С. 245–252.

[149] Катэхізіс: помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст. С. 112.

[150] Сліж Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты. С. 294.

У судах ВКЛ справы па заафіліі сустракаюцца не так часта. Слуцкі замкавы суд заслухаў скаргу пана Міхаіла Нячкоўскага на свайго пастуха Аніську Мароза. Хлопец даўно праяўляў заафільныя схільнасці. Чэлядзь данесла Нячкоўскаму пра гэта, і пастух быў папярэджаны. У яго быў няўдалы вопыт з кабылай, якая яго ўдарыла, пасля чаго пастух перайшоў на кароў. Калі зарэзалі цяля для чэлядзі, то ён пры ўсіх сказаў, што ядуць яго сыночка. Да суда справа дайшла, калі яго злавілі ў хляве з каровай. Парабак патлумачыў свае дзеянні спакушэннем д'ябла. На судзе былі сведкі, якія пасля прысягнулі на сваіх словах. Мароз прызнаўся ў здзейсненым. Суд прысудзіў да спалення парабка і карову. Але спаленне замянілі на адсячэнне галавы (1687)[151].

У Слуцкі замкавы суд патрапіла яшчэ адна такая справа. Шляхціч Сымон Сульжыц абвінавачваў свайго пастуха Яўхіма Сыроватку з вёскі Забалаць Яроміцкай воласці ў граху з каровай. Гаспадар даўно заўважыў, што пастух часта замыкаўся ў хляве, аднак не думаў, што прычына палягае ў сувязі з жывёлай, пакуль не застаў яго падчас стасункаў. Перад судом пастух быў адпраўлены ў вязніцу. На судзе Сыроватка прызнаўся ў злачынстве. Прысуд быў такі ж, як у папярэднім выпадку. Спаленне замянілі на адсячэнне галавы. У рашэнні адзначалася, што пакаранне выкарыстоўваюць для павучання іншым, каб грэх не распаўсюджваўся. Згадвалася пра факт адсутнасці ў ВКЛ адпаведнага заканадаўчага артыкула, але рашэнне суда адпавядала Крымінальнаму кодэксу Караліна (1687)[152].

Гэтыя два выпадкі сведчаць, што схільнасць да жывёл мелі тыя, хто з імі працаваў, – пастухі. Дакументы даюць уяўленне пра стаўленне да заафіліі ў грамадстве. Яна трактавалася як брыдкі садомскі грэх, накіраваны супраць Божага права. Хрысціянства разумела скаталожніцтва як ненатуральныя, грахоўныя стасункі. Жорсткае пакаранне мела павучальны і прафілактычны характар. Справы былі ініцыяваны гаспадарамі. Аднак варта звярнуць увагу на тое, што скаталожнікі не былі прыведзены да суда адразу. Іх прыцягнулі да адказнасці, калі злачынства было здзейснена неаднаразова і мела сведак. Пакуль скаржнікі не былі канчаткова пераканаены ў грахоўнай сувязі, яны не звярталіся ў суд. Адзінкавы выпадак застаўся б без пакарання. Замена спалення, даволі жорсткай смерці, на адсячэнне галавы насіла акт міласэрнасці. У прысудзе адзначалася шкадаванне маладых хлопцаў, якія праз свой грэх павінны былі памерці. Мэтанакіраванага пераследу скаталожнікаў не было. З імі разбіраліся па выяўленых фактах.

Заафілія ў ВКЛ не насіла масавы характар і не разумелася як норма і элемент сялянскай культуры. Выяўленыя выпадкі сведчаць пра варыяцыі ў сексуальных паводзінах. Таксама гэта не азначае, што скаталожніцтва мела месца толькі ў Слуцкім рэгіёне. Абмежаванасць крыніц не дазваляе казаць пра рэгіянальныя асаблівасці заафіліі.

Такім чынам, на ўяўленне пра забароненыя і ненатуральныя сексуальныя стасункі паўплывала рэлігія. Гэты ўплыў непасрэдным чынам адбіўся на

[151] НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 1239, арк. 193 – 194 адв.

[152] Тамсама, арк. 211 – 212 адв.

заканадаўстве. Аднак Статуты ВКЛ утрымлівалі невялікую колькасць нормаў, якія рэгулявалі інтымную сферу жыцця. Таму выкарыстоўваліся артыкулы з іншых зводаў законаў. Пад суд траплялі забойцы немаўлят, пералюбнікі, кровазмяшальнікі, скаталожнікі. Асуджаліся ў грамадстве дашлюбныя стасункі, нявенчаны шлюб, пералюб, аднаполае каханне. Адпаведна гэта адмоўным чынам уплывала на рэпутацыю асобы. У горшым стане часта апыналіся жанчыны. Хоць грамадства ВКЛ не вызначылася адмысловым паляваннем на людзей з сексуальнымі адхіленнямі, але яно было традыцыйным і патрыярхальным. Таму відавочнае парушэнне маральных прынцыпаў не даравалася.

Варта адзначыць, што забароны хоць і мелі рэлігійны характар, аднак былі важныя з медыцынскага пункту гледжання. Так як не былі развіты кантрацэпцыя і лячэнне венерычных хвароб, то неўпарадкаваныя сексуальныя стасункі спрыялі распаўсюджванню захворванняў. Захоўванне манагамных адносінаў сапраўды спрыяла здароўю.

Наяўнасць розных тыпаў сексуальных паводзін не азначала, што грамадства ВКЛ было грахоўным і амаральным па сваёй сутнасці. Адхіленні ад прынятых нормаў, якія паўсюль свае, існуюць у кожным грамадстве. Але стан маральнасці ў многім вызначаецца тым, які працэнт насельніцтва ўдзельнічае ў неадпаведных стасунках. У выпадку ВКЛ немагчыма прывесці дакладныя лічбы, можна толькі ўявіць варыятыўнасць сексуальных дачыненняў. З пункту гледжання тагачасных традыцый нават гэта падлягала асуджэнню і пакаранню. Сённяшнія ацэнкі паводзін сталі мякчэйшымі. Аднак падыходзіць да гістарычных з'яў з сучаснымі маральнымі поглядамі нам падаецца немэтазгодным.

# **10.** Сексуальныя паслугі за грошы

*Кліент сыходзіць, а грошы застаюцца.*
(З аксіём дамоў распусты)

Прастытуцыя – з'ява сапраўды старажытная. Яна вызначаецца як палавы акт або ўцягванне ў сексуальныя стасункі за грошы. З пункту гледжання кліента – гэта аказанне сексуальных паслуг, дзе вынікам стасункаў з'яўляецца толькі секс без нараджэння дзяцей. З прастытуцыяй часам звязвалі неўпарадкаваныя шматлікія кантакты. У першую чаргу прастытуцыя – гэта камерцыйныя адносіны. Жанчына прапаноўвае цела, а мужчына купляе яго для карыстання на пэўны перыяд. Аднак свае паслугі ў індустрыі прапаноўваюць і мужчыны. Асноўная прывабнасць прафесіі ў тым, што ў параўнанні з іншымі можна зарабіць істотную суму грошай за кароткі перыяд. Сучасная прастытуцыя мае арганізаваную структуру, падзелены рынак, часта звязана з крыміналам[1].

Мужчыны з'яўляюцца стваральнікамі рынку камерцыйных сексуальных паслуг. Адбываецца гэта ў сувязі з шэрагам прычын: адсутнасць сталай партнёркі, жаданне разнастайнасці, экзатычныя ці паталагічныя жаданні, мужчынскія фізіялагічныя асаблівасці. Хоць попыт стварае мужчына, маральная віна перакладваецца менавіта на жанчыну, бо з пункту гледжання патрыярхальнага грамадства ў яе адсутнічаюць маральныя прынцыпы, за грошы яна гатова прадаваць сваё цела. Аднак прастытуцыя як камерцыйная з'ява падпарадкоўваецца элементарным прынцыпам бізнесу: ёсць попыт – ёсць прапанова. Таму існаваць яна будзе да таго часу, пакуль будзе запатрабавана. Гэтае правіла працуе незалежна ад эканамічнага ладу грамадства.

Аднак немагчыма падыходзіць да дадзенай тэмы выключна з сучаснымі катэгорыямі, бо існаванне прастытуцыі ў феадальным грамадстве мае свае асаблівасці. Пачынаючы ад таго, што сам тэрмін узнік у сучаснасці, і заканчваючы тым, што ў тагачасным грамадстве не было канкрэтна вызначанага паняцця для акрэслення з'явы. На прыкладзе сітуацыі з прастытуцыяй у Бургундыі бачна, што патрыярхальны погляд у перыяд барока сутыкаецца з падвоенай цяжкасцю.

[1] Edlund L., Korn E. A Theory of Prostitution // The Journal of Political Economy. 2002. Vol. 110. № 1. P. 181–214.

З аднаго боку, прастытуткі задавальняюць мужчынскія сексуальныя патрэбы, а з другога боку, яны з'яўляюцца пагрозай грамадскім ідэалам, падкантрольным жанчынам, прыстойным сем'ям і грамадскаму спакою. Адпаведна прастытуткі трактаваліся мужчынамі як маргінальны элемент, які знаходзіцца па-за мужчынскім кантролем. А кантроль над жаночым целам грунтаваўся на тым, што жаночая функцыя – нараджаць дзяцей, а гэта прастытуткай не выконвалася. Хоць у Бургундыі прастытуткі перыядычна выклікаліся ў магістрацкі суд, аднак, як неабходнае зло, моцнага пераследу яны не трывалі[2].

Дзяржава звычайна стаіць перад выбарам: або забараніць прастытуцыю, або легалізаваць. У першым выпадку ствараюцца заканадаўчыя нормы па пераследзе прастытутак і сутэнёраў, спецыяльныя службы кантролю. У другім выпадку дзяржава вылучае асобныя раёны для працы прастытутак і збірае падаткі з іх дзейнасці. У ВКЛ заканадаўства пайшло па шляху забароны. Ужываліся санкцыі супраць прастытутак і сутэнёраў. Аднак кліент, які ствараў попыт, не нёс адказнасці.

*Заканадаўства.* Са Статута 1566 г. уводзіліся пакаранні толькі для жанчын за распусны лад жыцця і нежаданне выходзіць замуж, калі ўзрост ужо дасягнуў 25 гадоў. Дзяўчына пазбаўлялася спадчыны і пасагу (Статут 1566 г. Раздз. 8, арт. 7; Статут 1588 г. Раздз. 8, арт. 7). У іншым артыкуле дадавалася, што за паводзінамі дзяўчыны павінны сачыць бацькі ці сваякі. Калі шляхцянка паводзіла сябе непрыстойна, то кроўныя мелі права ініцыяваць супраць яе справу. Шляхцянку маглі палічыць пералюбніцай і пакараць смерцю (Статут 1588 г. Раздз. 14, арт. 30)[3]. Такія санкцыі не ўжываліся ў дачыненні да мужчын. Пытанні маралі былі актуальнай праблемай для ВКЛ у XVI ст.[4], і ўвядзенне пэўных нормаў у заканадаўства стала неабходнасцю, пра якую пісалася ў палемічнай літаратуры. Аднак гэтыя нормы на практыцы датычылі распусніц і прастытутак.

Упершыню ў Статуце 1588 г. было ўведзена пакаранне зводнікам (як мужчынскага, так і жаночага полу) за намаўленне займацца прастытуцыяй замужніх і незамужніх жанчын. Адказнасць за выкананне артыкула ўскладалася на ваяводаў, старостаў і магістраты. За гэта злачынства каралі адразаннем носа, вушэй і вуснаў. За паўторнае правапарушэнне прызначалася смяротнае пакаранне (Статут 1588 г. Раздз. 14, арт. 31)[5]. Падобным чынам (адразаннем носа) караліся пералюбнікі, кровазмяшальнікі, людзі, якія мелі сексуальныя стасункі з духоўнымі асобамі па візантыйскім праве[6] і па магдэбургскім праве[7].

---

[2] Farr J. R. Authority and Sexuality in Early Modern Burgundy (1550–1730). Oxford; New York, 1995. P. 138–155.

[3] Czacki T. O litewskich i polskich prawach, o ich duchy, źródłach, związku, i o rzeczach zawartych w pierwszym Statucie dla Litwy, 1529 roku wydanym. T. 2. Kraków, 1861. S. 23–24; Малиновский И. А. Учение о преступлении. С. 57–58; Максимейко Н. Источники уголовных законов Литовского Статута. Киев, 1894. С. 166.

[4] Сліж Н. Мараль і норавы. С. 207–216.

[5] Малиновский И. Учение о преступлении. С. 58.

[6] "Книги законные" содержащие в себе в древнерусском переводе византийские законы земледельческие, уголовные, брачные и судебные / Издал А. Павлов. СПб., 1885. С. 68, 69, 72, 73, 75.

[7] Максимейко Н. Источники уголовных законов. С. 166–167, 172–173.

Для характарыстыкі "непрыстойных" жанчын у заканадаўстве выкарыстоўваўся тэрмін "*вшетечница", жанчына, якая "устане своемъ неучстиве се ховати мела*", што азначала *распусніца*. Так называлі жанчыну, якая прафесійна займалася прастытуцыяй, таксама і жанчыну, якая вяла распусны лад жыцця. Сітуацыя з тэрмінамі не ўнікальна. У сярэднявечнай Еўропе слова "*meretrix*" ("блудніца", "дзеўка") выкарыстоўвалася і для прастытутак, і для канкубін. Тагачасная ментальнасць не бачыла розніцы ў гэтых тыпах паводзін[8]. Паняцце "*вшетечность*" азначала *распуста*. Тэрміны сустракаюцца ў артыкулах пра абразу жанчыны (Статут 1588 г. Раздз. 3, арт. 28)[9], адмаўленне бацькі ад дачкі (прыводзіла да адхілення дзяўчыны ад спадчыны), забойства немаўляці, пералюб. Слова *прастытуцыя* не ўжывалася ў старабеларускай мове. У артыкуле пра зводніцтва ўжываецца паняцце "*спросность телесное*", таксама запазычанае з польскай мовы. З артыкула пра пералюб відавочна, што гэта мае дачыненне да распусты. Адсутнасць выразнага тэрміналагічнага апарату пасля прыводзіла да такой самай невыразнасці ў судовай практыцы. Са згаданых нормаў права вынікае, што жанчыны займаліся прастытуцыяй, распусна сябе паводзілі, намаўлялі іншых жанчын стаць прастытуткамі. Мужчына выступаў у ролі ці арганізатара гандлю жанчынамі, ці пералюбніка[10]. Традыцыйна найперш абвінавачвалася жанчына, а не кліент-мужчына, які ствараў попыт на сексуальныя паслугі.

Наступны артыкул быў звязаны з папярэднімі. Пакаранне смерцю прызначалася распуснай жанчыне, якая нарадзіла дзіцё, а пасля яго забіла з прычыны сораму ці страху пакарання. Разгляд такога злачынства праводзіўся ў гродскім судзе ці гарадскімі ўладамі (Статут 1588 г. Раздз. 11, арт. 60). Паводле магдэбургскага права за гэта злачынства жанчыну закапвалі жыўцом ці тапілі[11].

Магдэбургскае права негатыўна ставілася да прастытуцыі і распусты. Вайхбільд не дазваляў атрымліваць абарону ў касцёле распуснікам і пералюбнікам (арт. IX). Аднак заканадаўства пакідала права на маёмасць за жанчынай, якая сапсавала сваю рэпутацыю распуснымі паводзінамі (Саксонскае Люстра, ч. I, арт. 5; Вайхбільд, арт. XXII)[12]. Артыкулы адзначалі толькі распуснасць, не ўдакладняючы яе від: прастытуцыя ці неўпарадкаваныя сексуальныя стасункі.

Крымінальны кодэкс Караліна прадугледжваў шэраг артыкулаў, датычных прастытуцыі. За намаўленне займацца продажам свайго цела жонкі, дачкі ці знаёмай мужчыне пагражала смяротнае пакаранне (арт. LXXV). Зводнікам і тым, хто дапускаў у сваім доме прастытуцыю, адразалі вушы, лупцавалі каля слупа і выганялі з мясцовасці (арт. LXXVI)[13].

---

[8] Karras R. M. Seksualność w średniowiecznej Europie. S. 145.

[9] Артыкул пра абразу жанчыны паходзіць з візантыйскага права. Ён быў уключаны ў Статут Яраслава, але там выкарыстоўваўся тэрмін "блядь". Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. Москва, 1976. С. 105.

[10] Статут 1588 г. Раздз. 3, арт. 28; раздз. 8, арт. 7; раздз. 11, арт. 60; раздз. 14, арт. 30, 31. Малиновский И. Учение о преступлении. С. 57–60, 111.

[11] Максимейко Н. Источники уголовных законов. С. 167, 174.

[12] Гэтыя ж артыкулы прыводзіць Барталамей Граіцкі. Groicki B. Artykuły prawa majdeburskiego. S. 17.

[13] Ibid. S. 155.

Пад уплывам рэлігіі заканадаўства ВКЛ толькі ў Статуце 1588 г. уводзіць адмысловыя пакаранні супраць прастытуцыі. Да гэтага часу ўжываліся нормы з Саксонскага Люстра, Вайхбільда, Крымінальнага кодэкса Караліна. Накіраваны яны былі супраць жаночай прастытуцыі. Мужчынская прастытуцыя калі і мела месца, то знаходзілася па-за ўвагай закону. Варта адзначыць, што практыку права ў гэтай галіне прасачыць даволі складана. Крыніцы захавалі фрагментарныя звесткі, якія не дазваляюць у поўнай меры ацаніць ужыванне санкцый супраць гэтай катэгорыі насельніцтва.

*Карыстанне сексуальнымі паслугамі за мяжой.* Прастытуцыя, як і кожная прафесія, патрабуе навыкаў і кваліфікацыі, а таксама ўкладання грошай у падтрыманне прывабнага выгляду, навыкі прыцягваць і трымаць увагу мужчын. У XVI ст. элітныя куртызанкі Рыма вучыліся ў старэйшых жанчын, часам гэта былі іх маці. Яны вывучалі этыкет, літаратуру, пісьмо, танцы, спевы, ігру на музычным інструменце. Гэта былі самыя адукаваныя жанчыны на той час. Навыкі неабходны былі для камунікавання на адпаведным узроўні сярод эліты і для большых заробкаў. Акрамя таго, яны давалі магчымасць утрымаць каля сябе на доўгі перыяд сталых кліентаў, што давала трывалы даход. Ад куртызанак патрабавалася добрае валоданне мастацтвам сексу, каб кліент мог атрымаць максімальнае задавальненне ад кантакту. Патрабаваліся актыўны ўдзел у працэсе, разнастайнасць поз, анальны і аральны секс. Мужчына мог рэалізаваць з куртызанкай свае фантазіі, але яна пры гэтым адкрыта дэманстравала сваё задавальненне ад сексу[14]. Гэты бок жыцця быў вядомы польскім вандроўнікам і адзначаўся як непрыстойны[15].

Увогуле ў перыяд Рэнесансу італьянскія гарады талерантна ставіліся да прастытутак. Аднак іх дзейнасць рэгламентавалася магістратам. Былі створаны розныя прадпісанні адносна вопраткі, яе колеру і тканіны, месца пражывання і г. д.[16]

З твора "Страшны Герой" Франчэска Андрэіні можна было даведацца пра куртызанак. Хоць у мужчын яны выклікалі цікавасць, але ў іх размове такія жанчыны асуджаліся. У тэксце сустракаюцца наступныя выказванні: "*Kortezanna iest natury krokodylowey, ktory zamorzywszy nad trupem płacze*", "*Kortezanna gładka iest wabem młodości oraz starości*", "*Kortezanny podobny są fortunie, będąc statecznemi w swey niestateczności*", "*Kortezanna iest raiem ciała, czyscem kalety, a piekłem dusze*", "*Ile kortezan tyle zarazy*"[17]. Гэтыя фразы падкрэсліваюць неадназначнасць цялесных стасункаў з куртызанкамі, прыемнасць якіх можа прывесці да сумнага выніку. Але пры гэтым яны характарызуюць іх як драпежніц, здольных да маніпулявання мужчынамі, што дадаткова сведчыць пра іх прафесіяналізм у справе.

Рым не быў унікальны ў сваім падзеле прастытутак. У Кітаі ў той час яны таксама адрозніваліся ў залежнасці ад катэгорыі насельніцтва, якую абслугоўвалі. Існавалі прастытуткі і звычайныя неадукаваныя, і высокаадукаваныя, арганізаваныя ў цэхі. Прастытуткі дзейнічалі легальна і плацілі падаткі[18].

[14] Kurzel-Runtscheiner M. Córy Wenus. S. 85–90, 125–140.

[15] Wrześniak M. Włochy w relacjach polskich podróżników. S. 151.

[16] Davidson N. Theology, Nature and the Law. P. 91–92.

[17] Andreini F. Bohatyr Straszny. S. 63.

[18] Ван Гулик Р. Искусство секса в Древнем Китае. С. 224–242.

У перыяд XVI–XVII стст. было не так шмат грамадскіх месцаў, дзе прастытутка магла паказаць сябе і знайсці кліента. У Рыме куртызанкі часта наведвалі храмы, якія выконвалі не толькі рэлігійную, але і камунікатыўную функцыю. Сталых кліентаў прымалі ў сябе ў доме. Корчмы былі непасрэдным чынам звязаны з прастытуцыяй, бо сувязь паміж алкаголем і распустай была непарыўнай. Дамы распусты часта знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці з корчмамі. Да таго ж прастытуткі самі наведвалі іх для пошуку кліентаў. Былі выпадкі, калі пры корчмах былі прастытуткі і калі дамы распусты ўтрымлівалі корчмы. Жыццё публічных дамоў адлюстравалася ў творчасці нідэрландскага ананімнага мастака Брунсвіка Манаграміста. У горадзе быў адмысловы падзел прастытутак. На вышэйшым узроўні знаходзіліся жанчыны з дамоў распусты, а на ніжэйшым – вулічныя, у сельскай мясцовасці былі вядомы яшчэ прастытуткі, якія вандравалі. Найбольшая канцэнтрацыя дамоў распусты была ў гарадах. Чым большы быў горад, тым больш ствараў варыянтаў для спакусы. Індустрыя еўрапейскай прастытуцыі дасягнула такога ўзроўню, што сталі друкавацца шляхаводнікі з інфармацыяй пра жанчын. У Венецыі выйшла выданне ў 1566 г., у Амстэрдаме – у 1681 г. Апошні быў адным з галоўных еўрапейскіх гарадоў, дзе квітнела прастытуцыя. Начныя забавы сталі істотным элементам турыстычнай прывабнасці горада[19]. Рукапісны шляхаводнік з'явіўся для Варшавы ў 70-х гадах XVIII ст. і меў 23 адрасы. У вершаванай форме давалася характарыстыка жанчынам, якія аказвалі паслугі за грошы[20].

Для шляхты замежныя вандроўкі былі неабходным адукацыйным элементам. Але замежжа вабіла магчымасцю не толькі пашырыць свой кругагляд, але і адчуць асалоду эратычных прыгод. Гэта было характэрна не толькі для нашай эліты[21]. Адукацыйныя выезды не абыходзіліся без вывучэння замежных дамоў распусты. Канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл добра ведаў гэты бок жыцця ў Парыжы. Ён суправаджаў маладога Яна Замойскага па менш свецкіх раёнах Парыжа, дзе той атрымаў свой першы сексуальны досвед[22].

Аднак у падарожных нататках апісанне прастытутак сустракаем рэдка. Міхалон Літвін адзначаў, што для распусты татары трымаюць маладых дзяўчат, якія ўмеюць танцаваць, граць на арфах і кіфарах. Іх для забавы часта запрашалі на застоллі[23]. Мікалай Радзівіл Сіротка адзін з эпізодаў прысвяціў вольным жанчынам Каіра: "*Хадзіў я па месце, бо панядзелак быў, а ў дзень гэты і ў чацвер бывае рынак і нібы кірмаш. Шмат розных тавараў тут было, жывёлы рознае,*

[19] Le Putanisme d'Amsterdam: Livre contenant les tours et les ruses, dont se servent les Putains et les Maquereles. Amsterdam, 1681; Stone L. The Family, Sex, and Marriage. P. 616; Barzaghi A. Donne o cortigiane? La prostituzione a Venezia, documenti di costume dal XVI al XVIII secolo. Verona, 1980; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 283; Kurzel-Runtscheiner M. Córy Wenus. S. 168; Martin A. L. Alcohol, Sex, and Gender. P. 58–70; Matthews-Grico S. Ciało i seksualność. S. 181–189; van de Pol L. The Burgher and the Whore: Prostitution in Early Modern Amsterdam. Oxford, 2011.

[20] Rabowicz E. Oświeceniowe "przewodniki"; Sikorska-Kulesza J. Zło tolerowane: prostytucja w Królestwie Polskim w XIX wieku. Warszawa, 2004. S. 32–33.

[21] Mączak A. Peregrynacje. Wojaże. Turystyka. Warszawa, 2001. S. 193–202.

[22] d'Arquien de la Grange M. K. Listy do Jana Sobieskiego. S. 21.

[23] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 72.

*людзей таксама ўсіх народаў і моваў вялікае мноства. Нездарма ж пра тое места кажуць, што дзеля тлуму надта вялікага цяжка тут праз вуліцу перайсці, якую пешыя, конныя, жывёла, а асабліва ж распусніцы (прыгожа ўбраныя, з закрытым тварам, на мулах едучы) напаўняюць. Кажуць (бо мыта з іх, як і паўсюль, збіраюць), што іх тут да ста тысяч. Іншыя жанчыны, каторыя замужнія, з дома на вуліцу не выходзяць, нават у машэі. Нельга ім таксама праз вакно глядзець на вуліцу, хіба толькі праз драўляныя краты* (1583)"[24].

*Прастытуцыя ў Вялікім Княстве.* У прастытуцыю жанчына магла патрапіць рознымі шляхамі і з розных прычын: праз палон, прымус, нястачу[25], намаўленне, падман, любоў да сексу. Гэта мог быць як асноўны від дзейнасці, так і падпрацоўка. Так, палоннае насельніцтва не мела правоў і часта трапляла ў дамы распусты. Напрыклад, у перыяд Сярэднявечча ў Нямеччыне кантынгент прастытутак значна папаўняўся з ліку славянак і фінак, якіх здабывалі падчас вайсковых экспедыцый[26]. У ВКЛ палонныя былі ў асноўным з Маскоўскага княства.

Сустракаліся выпадкі схілення жанчын да прастытуцыі праз падман і абяцанне падарункаў. Кацярына Станіславаўна падала скаргу на віленскага злотніка Андрэя Вышынскага Быка і яго жонку Ганну Казлоўну. Яны ўгаварылі яе гаспадароў – віленскага краўца Валентыя Кваткоўскага і яго жонку Крысціну Габрыэлаўну – адправіць служэбніцу да іх хворай маці. Як толькі выйшлі з дому, сужэнцы ўзялі Кацярыну з двух бакоў за рукі. Ганна стала казаць, што ўжо атрымала ад людзей за яе грошы, прасіла паслухацца, бо шкоды ад гэтага не будзе. За згоду было паабяцана купіць дзяўчыне тое, што яна пажадае. Кацярына зразумела, што яе намаўляюць да прастытуцыі і вядуць да кліента. Яна змагла вырвацца і збегла ў касцёл Св. Яна, а адтуль да гаспадароў (1600)[27]. Апісаная сітуацыя даволі звычайная. Мужчына захацеў атрымаць дзяўчыну і вырашыў скарыстацца паслугамі пасярэднікаў. Верагодна, яны гэтай справай займаліся не першы раз і працавалі па схеме: падманам выманіць ахвяру, паабяцаць падарункі, а калі не згодзіцца, сілай адвесці да кліента. Практычна гэта было згвалтаванне. Кацярына была не замужам і, зразумела, такія прыгоды ёй былі не патрэбны.

Аднак за перыяд XVI–XVII стст. намі не было выяўлена попісаў дамоў распусты, у якіх была б інфармацыя пра паходжанне жанчын, шляхі прыходу ў прафесію, заробак. Большасць выяўленых звестак маюць фрагментарны характар і не даюць магчымасці сабраць статыстычныя дадзеныя і заканамернасці прыходу жанчын у прафесію. Таксама не падаецца магчымым высветліць, ці гэта была асноўная праца, ці сумяшчэнне з іншай. Напрыклад, сярод польскіх

[24] Кніга жыцій і хаджэнняў. С. 337.

[25] З пазнейшых дакументаў вынікае, што дзяўчаты наймаліся на службу да розных асоб, а пасля праз нястачу вымушаны былі займацца прастытуцыяй. Такі лёс склаўся ў Элеаноры Ляснеўскай з Вільні, якая ў дзяцінстве прыехала з цёткай у Варшаву. За свае паслугі брала 1-2 злотых (1788). AGAD, Archiwum Królestwa Polskiego, sygn. 311, k. 54v–55.

[26] Brudage J. A. Law, Sex, and Christian Society. P. 133.

[27] АВАК. Т. 20. Вильна, 1915. С. 162.

прастытутак былі вядомы выпадкі сумяшчэння гандлю целам са службай у гаспадароў, працай у шынку ці іншым заняткам[28].

Асноўным месцам дзейнасці прастытутак быў горад. Тут было больш насельніцтва, а значыць, больш кліентаў. У іх лік траплялі мясцовае насельніцтва, прыезджыя, купцы, шляхта і інш. У горадзе жыццё было больш інтэнсіўнае, значна адрознівалася ад спакойнага ладу жыцця ў сельскай мясцовасці і маёнтках. Не без падставы гарады лічыліся месцам распусты. У літаратурным творы "Побыт зямянскі і гарадскі" супрацьпастаўляецца жыццё горада і вёскі. Хоць у вёсцы больш працы, у горадзе больш сварак, скандалаў, магчымасці для распусты. Прычым большую вартасць у горадзе мелі распуснікі, чым прыстойныя людзі. За грахі Божую кару атрымалі Вавілон, Садома. Твор паказвае погляд на горад шляхціча, выхаванага ў сельскай мясцовасці. Законы горада падаюцца даволі дзікімі і незразумелымі. Але твор змяшчае цікавую замалёўку з жыцця горада, у якім добра адчуваюць сябе злачынцы і прастытуткі:

...Częstokroć ludzi cnotliwi
Ktory ni w czym nie są krzywi
Bywaią przesladowani
Y z miast iako źli wygnani.
A wszetecznic gospodarze,
Kartownicy, farynarze,
Piianice, kostyrowie
Y rozmaici frantowie;
Więc y same wsztecznice
Y niecnotliwe zwodnice
Co iawne złości działaią
W pokoiu w mieściech mieszkaią...[29]

Дамы распусты былі вядомы ў розных гарадах Рэчы Паспалітай. Крыніцы згадваюць Львоў, Гданьск, Варшаву, Кракаў, Познань, Люблін і інш.[30] Яны мясціліся ў звычайных дамах, маглі нават займаць там некалькі пакояў. У пакоях пражывала па некалькі прастытутак, якіх выдавалі па патрабаванні кліентаў. Сексуальныя кантакты адбываліся як у доме, так і за яго межамі. Сярод сутэнёраў сустракаюцца і мужчыны, і жанчыны.

Дамы распусты маглі стварацць нават у месцы пражывання святароў. Жонка рэзніка Якуба ў скляпеннях дома каноніка Яна Пякарскага (Вільня) трымала маладых дзяўчат, якім было каля 12 гадоў. Ноччу яна выдавала іх кліентам. Па пастанове капітулы было прынята рашэнне выселіць яе з дому (1574)[31]. Адказнасць за прастытуцыю і сутэнёрства была ўведзена толькі ў Статуце 1588 г., але

[28] Karpiński A. Kobieta w mieście polskim. S. 333–335.

[29] Domaniewski J. Byt ziemianski y mieyscki. [Lubcza], 1620. Кніга не мае нумарацыі старонак.

[30] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 284–285; Karpiński A. Kobieta w mieście polskim. S. 333–354; Karpiński A. Przestępność we Lwowe. S. 762; Kaczor D. Przestępczość kryminalna. S. 145–149.

[31] Pawlikowska W. Konkubiny w życiu prałatów i kanoników wilenskich w XVI–XVII wieku. Uwagi o recepcji uchwał Soboru Trydenskiego w Wielkim Księstwie Litewskim // Tridento visuotinio bažnyčios susirinkimo (1545–1563) įtaka Lietuvos kultūrai: susirikimo idėjų suvokimas ir sklaida Vidurio Europos rytuose: mokslo straipsnių ir studijų rinkinys. Vilnius, 2009. P. 230.

пакараць маглі паводле магдэбургскага права. Уражвае малады ўзрост дзяўчат. Цяжка ўявіць, што ў 12 гадоў гэтай прафесіяй займаліся добраахвотна. Найбольш верагодна, што яны паходзілі з бедных сем'яў. Дзяўчат маглі прывесці бацькі, або іх падбірала на вуліцы жонка рэзніка Якуба. Так, Геранім Хрысціян Холстэн у сваім вайсковым дзённіку згадваў, што ў публічныя дамы Польшчы падбіралі дзяцей з вуліцы, гадавалі іх да адпаведнага ўзросту, а пасля прывучалі да рамяства[32].

Інфармацыя пра таемныя дамы распусты часам паступала са скаргаў. Ганна Слівоўская абвінавачвала віленскага мешчаніна Васіля Копача ў трыманні ў доме распусных жанчын і карыстанні з гэтага пажытку (1620)[33]. У скарзе гарадзенскага лаўніка Яхіма Іваноўскага згадвалася, што Францішак Артушэвіч укрывае прастытутак (1690)[34]. Аднак ці займаўся далей магістрат гэтай справай, невядома, бо не заўсёды ў судовых кнігах утрымліваецца працэс з выракам.

Прастытуткі маглі знайсці сабе месца ў часовых будынках. Духавенства гарадзенскага Фарнага касцёла патрабавала ад магістрата знесці крамы на Рынку, якія былі пабудаваны для замежных купцоў яшчэ падчас прыезду Стэфана Батория. Пабудовы не толькі заходзілі на межы касцёла і могілак, стваралі небяспеку пажару, але таксама былі асяродкам непрыстойнасці – тут прадавалі гарэлку і пражывалі жанчыны (1596)[35]. Крамы займалі выгаднае месца. У цэнтры горада было шмат людзей, таму пасля ад'езду купцоў будынкі хутка занялі гандляры алкаголем і прастытуткі. Пра асобныя вуліцы, праўда, без назваў, дзе пражывалі прастытуткі ў Берасці, згадваецца ў скарзе радцы Лукаша Памаранскага ў 1640 г. Там хавалася яго жонка Альжбета Шчупакоўна ад пакарання за пералюб[36].

У некаторых гарадах прымаліся адмысловыя рашэнні супраць прастытутак. Слуцкі магістрат загадаў распусніц, якія канцэнтраваліся ў корчмах, адпраўляць на брудныя працы – чэрпаць твань з абарончых равоў, чысціць вуліцы і рабіць працы на замку (1666)[37]. Улады Гданьска актыўна змагаліся з прастытуцыяй, асабліва супраць перадачы ў арэнду дамоў для трымання там прастытутак[38]. Польскія магістраты каралі прастытутак і зводнікаў выгнаннем і лупцаваннем. Аднак жорсткага і мэтанакіраванага праследу не было[39].

Негатыўнае стаўленне да прастытутак тлумачыцца тым, што гэта былі людзі з групы рызыкі. Побач з прастытуцыяй ішлі крымінал, злоўжыванне алкаголем, венерычныя захворванні. Пры апісанні прастытутак Варшавы другой паловы XVIII ст. адзначалася пра наяўнасць у іх розных венерычных захворванняў[40].

---

[32] Holsten H. Ch. Przygody wojenne 1655–1666 / Tł. J. Leszczyński, oprac. T. Wasilewski. Warszawa, 1980. S. 86; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 286.

[33] Frick D. Wilnianie. S. 443.

[34] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 3, арк. 66.

[35] LMAVB, f. 6-207, l. 12, 14–15.

[36] АВАК. Т. 6. Вильна, 1872. С. 366–367.

[37] НГАБ, ф. 1814, воп. 1, спр. 14, арк. 22 адв.; Ткачоў М. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 31.

[38] Kaczor D. Przestępczość kryminalna. S. 145–149.

[39] Karpiński A. Kobieta w mieście polskim. S. 333–354; Karpiński A. Przestępność we Lwowe. S. 766; Kamler M. Złoczyńcy. S. 402–405.

[40] Rabowicz E. Oświeceniowe "przewodniki". S. 28.

Гэта сітуацыя не была ўнікальнай. Пры адсутнасці сродкаў кантрацэпцыі і адпаведнага лячэння хваробы палавым шляхам перадаваліся вельмі хутка.

Даволі складана выявіць аплату паслуг без каштарыса і бухгалтарскіх кніг, калі яны і вяліся. Зразумела, што аплачваўся палавы акт з жанчынай. Але немагчыма дакладна казаць, як улічваўся час пры аплаце. Таксама крыніцы не даюць інфармацыі пра існаванне асобных коштаў за анальны або аральны секс. Магчыма, што гэтыя паслугі ўваходзілі ў звычайныя абавязкі прастытуткі. Не выключаем, што пазавагінальны секс мог забараняцца, але калі верыць вершу Станіслава Косткі Патоцкага, то там дазваляліся ўсе варыянты кантактаў:

...Wszystko w bordelu, jak i w twoim niebie.
Rżnie się, chodęży, obłapie i jebie.
Ten w piczy kusia dzielnego pakuje,
Ten pcha go w dupę i jak młotem kuje...[41]

У шляхаводніку па варшаўскіх непрыстойных мясцінах добрыя рэкамендацыі атрымлівалі маладыя дзяўчаты з ладным навобмацак целам, якія даступныя за грошы, ведаюць розныя позы, дазваляюць пазавагінальны секс, добра лашчаць рукамі. Адмоўна была ахарактарызавана Мантова, якая жыла на Маршалкоўскай, бо мела хваробы і прымала маскоўцаў[42].

Прастытуцыю і распусту часам звязвалі з чараваннем, бо не можа шмат мужчын хадзіць да адной жанчыны без надзвычайнага ўздзеяння. Магілёўскія мяшчане абвінавачвалі Мар'ю Юдзіну ў чараванні брата Івана Іеўлевіча і сына Давыда Тарасовіча Міхалкі. Яны да яе вельмі часта хадзілі, і немагчыма было адгаварыць ад яе. Іван закінуў працу і ледзьве не кожную ноч наведваў жанчыну. Па просьбе ўрада Ходка Абрамовіч схадзіў да Мар'і і застаў там Івана (1588). Як далей пайшла справа, невядома. З дакумента вынікае, што Юдзіну можна кваліфікаваць як распусніцу, хаця яна магла займацца сексам і за ўзнагароду. Са скаргі берасцейскай зямянкі Ганны Ябланоўскай вынікае, што чары выкарыстоўвала для прыцягнення кліентаў прастытутка з Вільні Раіна Янушкоўская. Яна не кінула свой занятак нават пасля шлюбу з Мікалаем Цыцкам (1628)[43].

Прычыну папулярнасці жанчыны тагачаснае грамадства бачыла менавіта ў чарах. Яе сексуальную прывабнасць звязвалі з магіяй, а не з валоданнем разнастайнымі тэхнікамі. Не выключаем магчымасць выкарыстання сродкаў з эфектамі псіхалагічнага ўздзеяння. Але тут можа прысутнічаць і момант добрага ведання мужчынскай псіхалогіі, уменне маніпуляваць хцівасцю і задавальняць патрэбы мужчыны.

Прастытуцыя была непасрэдна звязана з войскам. Доўгі побыт без жанчыны патрабаваў задавальнення фізіялагічнай патрэбы. Напрыклад, у іспанскім войску дазвалялася прысутнасць ад 4 да 8 жанчын у разліку на 200 мужчын! Гэта лічы-

[41] Верш С. Патоцкага адносіцца да дамоў распусты XVIII ст. На яго варта звярнуць увагу як на прыклад стаўлення мужчыны да сексу і да сексуальных жаданняў. У ім падрабязна апісваюцца ўсе віды сексуальных кантактаў з прастытуткамі. Rabowicz E. Oświeceniowe "przewodniki". S. 24.

[42] Ibid. S. 31–39, 60–61, 65.

[43] НГАБ, ф. 1817, воп. 1, спр. 3, арк. 208 адв.; Судебные процессы над ведьмами в Литве. С. 162–164; Марзалюк І. Матрыманіяльнасць і секс. С. 132–133.

лася меншым злом у параўнанні з небяспекай для іншых жанчын. Час ад часу ў розных еўрапейскіх краінах беспаспяхова змагаліся з прастытуцыяй у войску. Кіраўніцтва польскага войска таксама прымала пастановы супраць прастытутак[44].

У ВКЛ вельмі негатыўна ставіліся да прысутнасці прастытутак пры жаўнерах. У 1557 г. у пастановах для войска Жыгімонта Аўгуста было забаронена вазіць з сабой "вясёлых паненак". Пушкарам нельга было трымаць пры сабе блудніц, а толькі жонак. Згодна з артыкуламі віцэ-рэгента Станіслава Цікоўскага, польскія вайскоўцы не мелі права на тэрыторыі ВКЛ займацца пералюбам, мець пры сабе прастытутак і нават жонак, браць на ўтрыманне жанчын з варожай тэрыторыі (1565). Стэфан Баторый дазваляў жаўнерам выпраўляцца ў паход з жонкамі, але жанчыны неадпаведных паводзінаў не павінны былі прысутнічаць у войску. Пры выяўленні такіх выпадкаў абодва караліся смерцю (1581). У гетманскіх ваенных артыкулах пакаранне прызначалася за кантакты з прастытуткамі, ім забаранялася знаходзіцца ў войску, дазвол мелі толькі жонкі, але яны павінны былі пацвердзіць свой шлюб. На ротмістраў ускладаліся абавязкі сачыць, каб не было прастытутак у войску (1609). Паводле артыкулаў для замежнага войска (1638–1648) Уладзіслава Вазы ў войску маглі знаходзіцца толькі жонкі, а не прастытуткі. Пастановы гетмана ВКЛ Крыштафа Радзівіла дапускалі знаходжанне жонак, а прастытутак каралі лупцаваннем. За хаванне жанчыны ў мужчынскай вопратцы пры выкрыцці ёй пагражала таксама лупцаванне, а вайскоўцу – смяротнае пакаранне. Жанчына вызвалялася ад пакарання, калі яна сама паведамляла пра сябе. "Каранне горлам" прызначалася вайскоўцу, які для сексуальных патрэбаў браў жанчыну са стану ворага (1635). Паводле артыкулаў гетмана ВКЛ Януша Радзівіла (1648) за ўтрыманне прастытуткі вайскоўцу таксама пагражала смерць. Паручнік і ротмістр страчвалі пасаду, калі не інфармавалі пра выпадкі гетмана[45]. У артыкулах рыцарскага кола ад 20 верасня 1661 г. адзначалася, што той, хто пры сабе трымае "свабодных і падазроных жанчын", павінен быць выдалены ад харугвы і пазбаўлены заслуг[46]. Як бачым, забарона прысутнічаць прастытуткам у войску перыядычна паўтаралася, што сведчыць пра аднолькавае стаўленне да праблемы на працягу гадоў. У гэтым бачылася пагроза для дысцыпліны і глеба для канфліктаў.

Вайсковыя артыкулы выконваліся. На загад гетмана была пакарана жанчына, якая кінула мужа і перайшла да таварыша з роты Бонара[47]. Другой жанчыне абрэзалі нос і вушы і выгналі з войска[48].

---

[44] Żojdź K. Przeciwko moralności, czy dyscyplinie? "Przestępstwa seksualne" popełniane przez żołnierzy koronnych i litewskich w XVII w. // Studia nad staropolską sztuką wojenną. T. III / Red. Z. Hundert, K. Żojdź, J. J. Sowa. Oświęcim, 2014. S. 98–100; Łopatecki K. Związki małżeńskie i pozamałżeńskie w armii koronnej i litewskiej w XVI i XVII stuleciu – prawo i stan faktyczny // Miscellanea Historico-Iuridica. 2014. T. 13. Z. 2. S. 48–71.

[45] Volumina legum. T. II. S. 478–479; Kutrzeba S. Polskie ustawy i artykuły wojskowe: od XV do XVIII wieku. Kraków, 1937. S. 71, 77, 124, 126, 156, 181, 185, 194, 201, 203, 218, 262, 270, 271; Łopatecki K. Związki małżeńskie i pozamałżeńskie. S. 61.

[46] Stefan Franciszek z Pruszcza Medeksza. S. 231–231.

[47] Севярын Бонар, рабштынскі, юрборскі, тарновецкі староста, муж Раіны Валовічаўны.

[48] Імя гетмана не называецца. Осада Пскова глазами иностранцев. С. 308, 314.

Аднак, нягледзячы на забароны, стасункі вайскоўцаў з прастытуткамі мелі месца. Некаторыя трымалі пры сабе прастытутак пад выглядам жонак, іншыя выязджалі ў дамы распусты. Ян Сабескі пісаў жонцы Марыі Казіміры, што ў панны Канкордыі ў Любліне цэлую гадзіну ў абозе правялі Міхаіл Казімір Радзівіл і Дзмітры Вішнявецкі. А каб пералічыць усіх, хто бавіў час у прастытутак, то не хапіла б паперы (1672)[49].

Г. Холстэн падаў апісанне аднаго публічнага дома ў Любліне ў 1663 г. Гэта была камяніца, дзе падавалася добрая ежа і пітво. Пры ёй жылі "ладныя дзеўкі, вартыя таго, каб з імі саграшыць"[50]. Як вынікае, у Любліне існавалі публічныя дамы для шляхты з добрым падборам кадраў і паслуг. Зразумела, мужчынам больш цікава было правесці час з прастытуткамі, чым у войску.

Непажаданы пабочны эфект такой прафесіі – нараджэнне дзяцей. Звычайным выпадкам у многіх краінах і гарадах былі здарэнні, калі пазбаўляліся ад нежаданых дзяцей ці плода[51]. Кобрынскі магістрат разглядаў справу мяшчанкі Марыны Давыдоўны, якая нарадзіла пазашлюбнае дзіцё (1715). Па яе словах, дзіцё нарадзілася мёртвым, і яна закапала яго пад плотам. Свінні знайшлі цела і з'елі. Каб не выглядаць распуснай, яна спачатку сцвярджала, што яе згвалтаваў Хведар Ягнуковіч, і нават прасіла знаёмых жанчын сведчыць пра гэта. Абвінавачванне ў згвалтаванні пераносіла віну на мужчыну. Аднак высветлілася, што аб злачынстве не было заявы, з Ягнуковічам жанчына была па добрай волі. Стасункі адбыліся, калі мешчанін ехаў на кірмаш. Ён быў жанаты, а пра здарэнне з дзіцём не ведаў. Так як у выніку стасункаў дайшло да нараджэння дзіцяці і да яго смерці, то прысуд быў наступны: Марыне – 300 удараў па голым целе каля ганебнага слупа, выгнанне з горада (штраф 10 коп літоўскіх грошаў таму, хто яе прытуліць), сястры Зафеі, якая не даглядзела выпадак і сама вядзе непрыстойны лад жыцця, – 50 удараў, Ягнуковічу – ляжаць крыжам перад царквой Св. Мікалая ў Кобрыне падчас усіх набажэнстваў на праваслаўныя Грамніцы, 2 фунты воску на царкву і выплаты ўраду[52]. Марына і яе сястра жылі ў адным доме, займаліся прастытуцыяй. Калі б суд даказаў наўмыснае забойства, то жанчыну прысудзілі б да смяротнага пакарання[53].

У дакументах часам фігуруе катэгорыя жанчын, якіх называюць распусніцамі. Не заўсёды падаецца магчымым вызначыць, ці гэта індывідуальная прастытутка, ці проста аматарка сексу. Віленскі мешчанін Юрый Грос абвінавачваў мяшчанку Дароту Зебяртоўскую ў распусным ладзе жыцця і неадпаведных паводзінах. Пасля смерці мужа Грыгорыя Тамковіда яна стала непрыстойна жыць.

[49] Żojdź K. Przeciwko moralności, czy dyscyplinie? S. 101.

[50] Holsten H. Ch. Przygody wojenne 1655–1666. S. 85–86; Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 286.

[51] Kaczor D. Przestępczość kryminalna. S. 108–129; Wiślicz T. Dzieciobójstwo jako narzędzie polityki reprodukcyjnej w Rzeczypospolitej XVII–XVIII wieku // W kręgu rodziny epok dawnych. Dzieciństwo / Red. B. Popiołek, A. Chłosta-Sikorska, M. Cadocha. Warszawa, 2014. S. 141–151.

[52] АВАК. Т. 6. Вильна, 1872. С. 531–532.

[53] Граіцкі В. асобна выбраў артыкулы па смяротным пакаранні з Імператарскага права. З іх VIII артыкул прадугледжваў смерць за забойства дзіцяці. Groicki B. Artykuły prawa majdeburskiego. S. 112–113.

Скаржнік беспаспяхова спрабаваў уздзейнічаць на яе праз апекуна і сваякоў. Дарота абражала сваіх суседзяў, цесця Гроса – Андрэя Хофмана. Аднойчы яна не толькі словамі і пагрозамі нанесла крыўду, але і дзеяннем – задрала сукню вышэй паса, агаліўшы цела. Гэта стала апошняй кропляй і справакавала скаргу (1675)[54]. У той час сваркі былі штодзённым элементам жыцця, аднак для таго каб на вуліцы дэманстраваць сваё цела для абразы, патрэбна была адсутнасць комплексаў і пэўных маральных абмежаванняў, індыферэнтнае стаўленне да грамадскай думкі. Такія паводзіны сведчаць на карысць таго, што Дарота і праўда вяла распусны лад жыцця. Так як жанчына на той час была ўдавой, то не выключаем, што займацца сексам яна магла для паляпшэння матэрыяльнага становішча.

Яшчэ адна катэгорыя, якая з цяжкасцю паддавалася ўпарадкаванню жыцця ў адпаведнасці з прынятымі маральнымі нормамі, – гэта жабракі. Яны маглі сабе дазволіць жыць без шлюбу, мець стасункі з кім захочацца, а таксама прадаваць сябе за мінімальную аплату – за ежу і пітво. У 1636 г. быў выдадзены прывілей Уладзіслава IV для стварэння аб'яднання віленскіх жабракоў на ўзор рамеснага цэху. Сярод іншага старшым уводзілася ў абавязак пільнаваць, каб не было распусных паводзін у корчмах і дамах, на вуліцах[55]. Магілёўскія жабракі арганізавалі свае брацтва яшчэ ў 1621 г., а іх мэтай была барацьба з падманам і канкурэнцыяй[56].

Даволі цяжка вызначыць, які быў стаж у прафесіі. Калі ён пачынаўся з 12 гадоў, то ў лепшым выпадку жанчына працавала да 25 гадоў. Яшчэ больш складана высветліць далейшы лёс прастытутак. Некаторыя з іх нараджалі дзяцей, жылі ў венчаным ці нявенчаным шлюбе.

Адна прастытутка (ці распусніца) з Полацка выйшла замуж за нейкага Невенглоўскага з Лукава (Люблінскае ваяводства). Пра гэта згадваецца ў сувязі з тым, што іх разам з пахолкам злавілі казакі пад замкам Няшчарды пры спробе перайсці на маскоўскі бок 4 ліпеня 1581 г. Невенглоўскі служыў розным панам – Жалкеўскаму, Бонару і іншым, а пахолак, нейкі серб, уцёк нядаўна ад слугі вугорскага гетмана Яна Барнамісы. Пры іх знайшлі вітальную прамову да маскоўцаў. Хоць Невенглоўскі і казаў, што яго прывёў да здрады чорт, яму пагражала быць пасаджаным на кол. Невенглоўскі прыняў каталіцызм і прасіў змяніць пакаранне на адсячэнне галавы. Пра далейшы лёс яго жонкі не згадваецца[57]. Візітацыя Фары Вітаўта 1674 г. адзначала, што гарадзенскі ўніяцкі святар Ян Шашко меў дзяцей з прастытуткай[58]. Гарадзенскі шляхціч Юзаф Сапоцька жыў у нявенчаным шлюбе з "нявольніцай і блудніцай", за што быў пазбаўлены спадчыны маці Канстанцыі Канстанцінаўны Рабееўны Гнайніцкай[59]. Яе рашэнне

[54] Frick D. Wilnianie. S. 40–41.

[55] Ibid. S. 93.

[56] ИЮМ. Вып. 8. Витебск, 1877. С. 367–369; Цітоў А. Магілёўскія цэхі ў XVI–XVIII стст. // Архіварыус. 2011. Вып. 9. С. 169–170.

[57] Piotrowski J. Dziennik wyprawy Stefana Batorego pod Psków (1581–1582). Kraków, 1894. S. 13–14.

[58] Камунтавічэне В. Гарадзенская каталіцкая парафія ў 15–17 ст. // Гістарычны альманах. 2012. Т. 18. С. 42.

[59] Інфармацыя паходзіць з тастамента маці Канстанцыі Канстанцінаўны Рабееўны Гнайніцкай (?–1675), жонкі гарадзенскага земскага падсудка Станіслава Сапоцькі (?–1663). НГАБ, ф. 1755, воп. 1, спр. 49, арк. 304 – 307 адв.

для таго часу было заканамерным, бо шлюб быў нявенчаным, з жанчынай непрыстойных паводзінаў.

Прастытуцыя была неад'емнай часткай жыцця многіх гарадоў Рэчы Паспалітай[60], а таксама была звязана з войскам. Яна мела жаночае аблічча. Жанчыны працавалі ў дамах распусты ці дзейнічалі індывідуальна. Калі ў Рыме назіраецца выразны падзел унутры прафесіі ў залежнасці ад кваліфікацыі, то ў ВКЛ яго выявіць складана. Нельга нават з упэўненасцю казаць пра наяўнасць элітных дамоў для шляхты. Але не выключаем, што ў прафесіі былі шляхцянкі. Больш інфармацыі пра гэта захавалася за XVIII ст. Шляхаводнік па Варшаве адзначае, што жонка лідскага харужага Юзафа Нарбута Ганна Гразманаўна прымала шамбелянаў і афіцэраў. Яна была яшчэ вядома сваёй перакладчыцкай дзейнасцю[61]. Увогуле для гэтага перыяду характэрна развіццё прыдворнай прастытуцыі.

Прастытуткі траплялі ў прафесію рознымі шляхамі і не заўсёды па ўласнай волі. Нават калі прастытутка абслугоўвала шляхту, то яна ўсё роўна знаходзілася на ніжэйшай сацыяльнай прыступцы, адносілася да маргінальнага слою насельніцтва. Яны не адпавядалі агульна прынятаму вобразу жанчыны – жонкі і маці. А з пункту гледжання хрысціянскай маралі яны парушалі ўсе нормы: жылі без венчанага шлюбу, мелі стасункі з рознымі мужчынамі, нават з жанатымі, практыкавалі розныя тэхнікі ў сексе, у тым ліку і грахоўныя, прымалі мужчын у розныя дні (у святы і пасты), прадавалі цела за грошы. Для іх не існавала маральнай праблемы ў тым, каб заняцца сексам з якім заўгодна мужчынам. Галоўнае, каб праца была аплачана. Па сутнасці, прастытуткі адносіліся да пералюбніц і распусніц. У грамадстве, дзе сфера сексу была табуіравана, такое стаўленне да іх было звычайнай з'явай.

Аднак нельга казаць, што ў ВКЛ прастытутак актыўна пераследавалі. Яны былі неабходнай часткай грамадства. Іх паслугамі карысталіся ўсе саслоўі, у тым ліку духавенства і шляхта. Таму ў поўнай ліквідацыі з'явы не было зацікаўленасці. Акрамя таго, у ВКЛ, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай, прастытуцыя не была ўрэгулявана да канца XVIII ст. Не было створана ніводнага дакумента, які б упарадкоўваў гэту сферу жыцця[62].

---

[60] Kamler M. Złoczyńcy. S. 157–183.

[61] Rabowicz E. Oświeceniowe "przewodniki". S. 8, 52, 91–92.

[62] Sikorska-Kulesza J. Zło tolerowane. S. 34.

# 11. Гвалт над целам і воляй

Тэма згвалтаванняў у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стст. даволі спецыфічная для даследавання і, як правіла, вывучаецца ў кантэксце гендэрных адносін, гісторыі сексу, крымінальных злачынстваў[1].

Стаўленне грамадства да сексуальных стасункаў з'яўляецца важным паказальнікам гендэрнай дыскрымінацыі, а таксама дадатковай крыніцай інфармацыі па гендэрных стэрэатыпах, ролях і статусе мужчыны і жанчыны ў грамадстве. У гэтым кантэксце сексуальны гвалт супраць жанчыны дэманструе, якімі ўспрымаюцца такія паводзіны мужчыны ў дадзеным грамадстве: нармальнымі або паталагічнымі. Адначасова гэта паказвае ступень агрэсіўнасці ў дачыненні да жанчын, а таксама наяўнасць ваяўнічасці ў гендэрных дачыненнях.

Феадальнае грамадства ад самага пачатку з'яўляецца патрыярхальным і іерархічным, дзе кожнаму / кожнай вызначана роля ў залежнасці ад полу і ўзросту. Адпаведна жанчына павінна падпарадкоўвацца мужчыну ў сям'і і, вядома, у сексе. Жаданні мужчыны былі першаснымі. Сексуальныя дачыненні ў шлюбе станавіліся абавязкам. Напрыклад, паводле праваслаўнага кананічнага права за пазбяганне сексуальных стасункаў з мужам жанчыне пагражала анафема. Жаданне мужа ці жонкі ўстрымацца ад ложка ўзгаднялася паміж сужэнцамі. А калі ўстрыманне прыводзіла да блуду мужа ці жонкі, то грэх клаўся на абаіх[2].

Згвалтаванне ў заканадаўстве многіх краін лічылася цяжкім злачынствам, за якое прадугледжвалася смяротнае пакаранне[3]. Яно трактавалася як гвалт волі жанчыны, які прыводзіў да парушэння спакою яе сям'і і грамадства, да знявагі звычаяў[4], замаху на сямейную маёмасць, напрыклад, як у Мазавецкім праве[5].

---

[1] Krawiec A. Seksualność. S. 161–202; Martin A. L. Alcohol, Sex, and Gender. P. 83–87; Вінниченко О. "Ґвалт поневольний": дві скарги про сексуальне насильство над селянками-підданками 1637 і 1648 років // Вісник Львівського університету. Серія історична. 2013. Випуск 48. С. 435–451 і інш.

[2] Молитовник или Требникъ из греческого языка на словенски переведенный и иследованый. Стратынь, 1606. С. 372 адв., 374 адв. – 375.

[3] Koranyi K. O niektórych postanowieniach karnych Statutu Litewskiego z r. 1529. Studium prawnoporównawcze // Księga pamiątkowa ku uczczeniu czterechsetnej rocznicy wydania pierwszego Statutu Litewskiego. Wilno, 1935. S. 149–154; Krawiec A. Seksualność. S. 151–152.

[4] Czacki T. O litewskich i polskich prawach. T. 2. S. 138–139.

[5] Krawiec A. Seksualność. S. 178–179.

Згвалтаванне як злачынства згадвалася ў сярэднявечных крыніцах польскага права. Неабходнай умовай сведчання пра гвалт быў крык аб дапамозе[6]. Падобны артыкул быў у Вісліцкім Статуце[7]. Ён утрымліваў інфармацыю пра абставіны гвалту (крык, знакі гвалту). Аднак у пералічаных крыніцах права не прадугледжвалася магчымасць шлюбу з гвалтаўніком, як у Вестгоцкай Праўдзе (654 г.), паводле якой дазвалялася ўзяць шлюб, калі бацькі не былі супраць[8]. Ідэю шлюбу з гвалтаўніком прапагандаваў з даўніх часоў касцёл. Рашэнне належала ахвяры[9].

З прыходам хрысціянства на нашы землі сексуальныя дачыненні перайшлі ў сферу кантролю царквы. Статут Яраслава лічыў злачынствам згвалтаванне, умыканне, групавое згвалтаванне. Старажытны звычай умыкання нявесты прыраўноўваўся да згвалтавання[10]. Пра яго існаванне ў старажытных плямёнах, якія насялялі тэрыторыю Беларусі, адзначаецца ў летапісе. Звычай быў уласцівы і іншым народам. Умыканне адбывалася каля вады ці падчас гульняў, са згоды ці без згоды дзяўчыны[11]. У Беларусі гэта традыцыя захавалася нават у XIX ст.[12]

Такое стаўленне царквы да згвалтавання прыйшло з візантыйскага права, артыкулы якога ўваходзілі ў склад кормчых. Па візантыйскім праве за гвалтоўныя дзеянні са зброяй асуджалі на смерць, а без зброі – на адсячэнне рук. За згвалтаванне і спакушэнне дзяўчыны ці чужой нявесты пагражала адсячэнне носа, а 1/3 маёмасці злачынцы пераходзіла дзяўчыне. Калі дзяўчына была непаўналетняя (да 14 гадоў), то ёй пераходзіла палова маёмасці[13]. Кананічнае права прызначала пакаранні за згвалтаванне замужняй жанчыны, дзеўкі, манашкі. Муж таксама лічыўся гвалтаўніком, калі здзяйсняў гвалт у дачыненні да жонкі[14].

З увядзеннем магдэбургскага права (першы горад Вільня, 1387 г.) сталі дзейнічаць Саксонскае Люстра і Вайхбільд. Заканадаўчыя акты гэтых збораў прадугледжвалі за згвалтаванне смяротны прысуд. Пра выпадак неабходна было паведаміць адразу, прадэманстраваць доказы злачынства. Дом, у якім была згвалтавана жанчына, знішчаўся. Касцёл не мог абараніць гвалтаўніка. Нават калі ў выніку здарэння адбыўся шлюб, дзеці лічыліся незаконнанароджанымі. Пры гэтым закон дазваляў больш лагоднае стаўленне да мужчыны, які сам прыйшоў у суд для доказу сваёй невінаватасці (Саксонскае Люстра, кн. 1, арт. 37; кн. 2,

[6] Артыкулы аб згвалтаванні ўтрымлівалі Эльбланская кніга, Мазавецкае права, Статут Казіміра Вялікага. Koranyi K. O niektórych postanowieniach karnych Statutu. S. 149–154; Grajewski H. Kara śmierci. S. 161–165; Krawiec A. Seksualność. S. 168–203.

[7] АЗР. Т. 1. 1361–1598. СПб., 1848. С. 11, 18; Максимейко Н. Источники уголовных законов. С. 116–117.

[8] Brudage J. A. Law, Sex, and Christian Society. P. 133.

[9] Koranyi K. O niektórych postanowieniach karnych Statutu. S. 151–152.

[10] Российское законодательство X–XX вв. Т. 1. Москва, 1984. С. 175; Гальковский Н. М. Борьба христианства с остатками язычества в Древней Руси. Т. 1. Харьков, 1916. С. 106.

[11] ПСРЛ. Т. 1. СПб., 1846. С. 6; Загоровский А. О разводе по русскому праву. Харьков, 1884. С. 3–12.

[12] Никольский Н. М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. Минск, 1956. С. 52–55.

[13] "Книги законные". С. 67, 74.

[14] Молитовник или Требникъ. Стратынь, 1606. С. 365 – 365 адв.; Номоканон сий естъ законоправилникъ. Львов, 1646. С. 26; Ехологіон албо молитвословъ или требникъ. Лвовъ, 1682. С. 22 адв. – 23.

арт. 13, 64; кн. 3, арт. 1; Вайхбільд, арт. IX, XXXVIII). У перакладным выданні Барталамея Граіцкага правільна згадваецца пра смяротнае пакаранне за згвалтаванне[15].

Статут ВКЛ 1529 г. увёў артыкул аб згвалтаванні. Гэтыя справы былі ў кампетэнцыі ваяводаў і старостаў[16]. Разглядаліся толькі тыя выпадкі, дзе жанчына аказвала супраціў. Знакам супраціву падчас гвалту быў крык. Калі на шум не прыбеглі людзі, то пацярпелая павінна была адразу, пасля таго, як яе адпусцілі, распавесці пра злачынства і паказаць знакі гвалту. Паводле заканадаўства злачынцы пагражала смяротнае пакаранне. Аднак згода дзяўчыны на шлюб выратоўвала яго ад смерці (Статут 1529 г. Раздз. 7, арт. 6)[17]. Такім чынам, у злачынцы быў выбар паміж шлюбам і смерцю, калі жанчына не была замужам. Статуты 1566 і 1588 гг. захавалі без зменаў норму Статута 1529 г. (Статут 1566 г. Раздз. 11, арт. 8; Статут 1588 г. Раздз. 11, арт. 12). Пакаранне за злачынства засталося ў кампетэнцыі ваяводаў і старостаў (Статут 1588 г. Раздз. 4, арт. 30).

У юрыдычнай тэрміналогіі старабеларускай мовы зафіксаваны два словы для вызначэння згвалтавання: "*усилство*" і "*кгвалтованье*". Першы тэрмін сустракаецца ў перакладзе Вісліцкага Статута. Ён выкарыстоўваўся для характарыстыкі злачынстваў, пры здзяйсненні якіх ужывалася сіла. У артыкулах пра абрабаванні ёсць блізкія тэрміны "*сильник*" (рабаўнік), "*сильно возмет*" (забярэ гвалтам). Здзяйсненне згвалтавання ў перакладзе было апісана як "*коли хто усилует девку, а либо жонку, кгвалтомъ*"[18], а ў Статуце – "*естли бы хто невесту або девку зкгвалтил*"[19]. Выкарыстанне сілы або гвалту падаецца як раўназначныя тэрміны. Яны паказваюць, што для дасягнення мэтаў злачынца ўжыў сілу, а само дзеянне мела гвалтоўны характар і было здзейснена супраць волі іншай асобы.

У судовых кнігах скаргі аб згвалтаванні сустракаюцца рэдка: па-першае, гэта трэба было даказаць, а па-другое, абвесціць пра гэта. Жанчына ў выніку атрымлівала падвойны стрэс. Яна цярпела гвалт, у якога маглі быць розныя наступствы: хваробы, цяжарнасць, псіхалагічныя і фізічныя траўмы. Аповед перад судом прымушаў перажыць здарэнне яшчэ раз. Акрамя таго, прагноз на далейшае жыццё пасля згвалтавання не быў аптымістычны.

Судовы працэс па справах згвалтавання складаўся з наступных элементаў: скарга, агляд пацярпелай, пасяджэнне, на якім разглядаліся доказы злачынства і выносіўся вырак. Выпадкі ў крыніцах не заўсёды даюць магчымасць прасачыць усе дэталі працэсу. Часта кнігі ўтрымліваюць толькі судовыя скаргі. Акрамя таго, магістрацкія, гродскія кнігі захаваліся ў вельмі абмежаванай колькасці.

---

[15] Jasker N. Juris provincialis. Fol. XXXVv–XXXVIv; Groicki B. Porządek sądów. S. 199; Krawiec A. Seksualność. S. 191–197; Вінниченко О. "Гвалт поневольний". С. 477.

[16] РИБ. Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. Петербург, 1903. С. 665; Лаппо И. И. Великое княжество Литовское. Т. 1. Юрьев, 1911. С. 291.

[17] Малиновский И. А. Учение о преступлении. С. 55–56; Валиконите И. М. I Литовский Статут – один из важнейших источников истории положения женщин в Великом Княжестве Литовском // Первый Литовский Статут 1529 г. Вильнюс, 1982. С. 45.

[18] АЗР. Т. 1. 1361–1598. СПб., 1846. С. 11, 14–15.

[19] Первый Литовский Статут (1529 г.). С. 197.

Гэта не дае выявіць тэндэнцыі ў злачынствах. Знойдзеныя факты паказваюць толькі варыятыўнасць правапарушэнняў.

Праблема доказу гвалту бачная ў наступнай справе. Парабак Цікан абвінаваціў у згвалтаванні сваёй дачкі Нядзелькі свіслацкага мешчаніна Юрыя Вінніка. Той, у сваю чаргу, абвінаваціў яе ў крадзяжы і ўцёках. Згвалтаванне адбылося ў бровары, а на дапамогу паклікаць не атрымалася, бо Віннік закрыў ёй рот шапкай. Дзяўчына распавяла пра выпадак жонцы войта і іншым жанчынам. Але з прычыны адсутнасці трох сведак і іншых доказаў мешчанін быў прызнаны невінаватым (1537). Пры вынясенні прысуду суддзі кіраваліся нормамі Статута 1529 г.[20] Па сутнасці, у гэтым выпадку словы Нядзелькі былі супраць словаў Вінніка. Не будучы ўпэўненымі ў здарэнні злачынства, суддзі апраўдалі мешчаніна.

Падданы Станіслава Карачуна абвінавачваўся ў згвалтаванні 19 і 23 лістапада 1590 г. трох жанчын: нявестак Хадыкі Камыша Мар'і і Настассі і жонкі Ходара Хомты. Справа спачатку разглядалася крычаўскім старостам Багданам Саламярэцкім. Пасля яна дайшла да Трыбуналу. Але падданы сцвярджаў, што не гвалтаваў. Прысудзілі выканаць прысягу, а па выкананні вызваліць ад адказнасці (1594)[21].

Згвалтаванне падданых было прычынай для звароту ў суд[22]. Але не заўсёды селянін мог атрымаць сатысфакцыю па скарзе. Падданы шляхціча Васіля Мялешкі Макарэц Юрэвіч быў вымушаны звярнуцца ў Гарадзенскі земскі суд у сувязі са згвалтаваннем яго непаўналетняй дачкі Даркі падданым Дзмітрыя Мікіціча – Іванчыкам. Ён скарыстаўся адсутнасцю людзей у полі, калі Дарка пасла жывёлу, і здзейсніў злачынства. Пра згвалтаванне дзяўчына не сказала бацьку, ён выявіў сам, калі пабачыў плямы крыві на вопратцы і прымусіў распавесці пра выпадак. Макарэц прыйшоў з дачкой да Мікіціча са скаргай на Іванчыка, але той яго збіў і выгнаў (1555)[23].

Менскі земскі суддзя Грыгорый Макаровіч ініцыяваў справу супраць падданых шляхціча Аляксандра Калецкага, якія згвалтавалі дзеўку-швачку з двара яго жонкі. На суд адказчыкі не з'явіліся, і справу было дазволена далей перадаць у Галоўны Трыбунал ВКЛ (1615)[24].

Шляхціч Слонімскага павета Якуб Велічковіч падаў скаргу на Аніску Прыбылчэню з сяла Новікі, падданага слонімскага шляхціча Мікалая Гумоўскага. Работніца Агапіца Валянцінаўна працавала ў полі, ва ўрочышчы. Аніска скарыстаўся адсутнасцю людзей, згвалтаваў яе і збіў. Яна падчас гвалту аказала супраціўленне і крычала. На крык прыбеглі людзі. Возны Васіль Гаўрылавіч

---

[20] Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковысского и оболенского державцы М. В. Клочко. 1533–1540 (Литовская метрика. Книга № 228. Книга судных дел № 9 / [публ. подг. В. А. Воронин, А. И. Груша, И. П. Старостина, А. Л. Хорошкевич; отв. ред. А. Л. Хорошкевич, Г. Я. Голенченко]). Москва, 2008. С. 96–97.

[21] НГАБ, КМФ-18, спр. 277, арк. 341 адв. – 342 адв.

[22] Згвалтаванні ў ніжэйшых саслоўях мелі месца на тэрыторыі Украіны. Гарасимчук М. Справи про зґвалтування й позбавлення цноти у судах Самбірської економії в XVII ст. // Соціум. Альманах соціальної історії. Київ, 2015. Вип. 11–12. С. 147–163.

[23] Судовая кніга рашэнне па скарзе не ўтрымлівае. АВАК. Т. 21. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1894. С. 65.

[24] НГАБ, ф. 1727, воп. 1, спр. 2, арк. 6 – 6 адв.

засведчыў сляды гвалту на целе Агапіцы (1605)[25]. Знаходжанне жанчыны адной у бязлюдным месцы часта правакавала злачынцаў не толькі ў ВКЛ[26].

Папярэдняя скарга не адзіная, па якой не выяўлена прысуду[27]. Слонімскі баярын Гаўрыла Аверкавіч абвінавациў баярына Васіла Ярмаловіча ў згвалтаванні жонкі і выклікаў вознага для яе агляду (1570)[28]. 18 ліпеня 1586 г. жонка каралеўскага ротмістра Марціна Карызны, Ганна Каспараўна Падгайская, падала скаргу на жамойцкага земяніна Каспара Марцінавіча Юшкевіча за згвалтаванне. Жанчына была ў гасцях у шляхты Упіцкага павета – Мікалая Вяковіча і яго жонкі Крысціны Баброўніцкаўны ў маёнтку Пакрое. Яна засталася ў іх начаваць. Юшкевіч, які таксама гасцяваў, ноччу ўварваўся ў пакой, выбіў дзверы, збіў жанчыну і згвалтаваў. На месца злачынства быў выкліканы возны, які пры аглядзе засведчыў раны і крывавую разарваную кашулю на жанчыне[29]. Вядомы яшчэ выпадак. Пётр Мікалаевіч Дарагастайскі падаў скаргу ад імя сваёй баярыні Марыны Сякіраўны. 21 студзеня 1590 г. яе дачка Ганна Шэцілаўна гасціла ў Смалявічах у сваячкі. Пад вечар Ян Няміра, урааднік віленскага ваяводы Мікалая Крыштафа Радзівіла ў Смалявічах, разам з памочнікамі напаў на дом, згвалтаваў дзяўчыну, звёз яе на двор ваяводы і там трымаў некалькі тыдняў. Падаць скаргу змаглі толькі 10 лютага[30].

Якія былі прысуды, цяжка вызначыць, бо знойдзены толькі скаргі. Шлюбам мог скончыцца толькі выпадак з Нямірам. Т. Чацкі, спасылаючыся на А. Ратундуса, адзначаў, што шлюбы з гвалтаўнікамі былі вельмі рэдкім выпадкам. Адзін меў месца ў перыяд панавання Жыгімонта Старога, калі мужчына згвалтаваў дзвюх жанчын, і яны выказалі жаданне выйсці за яго замуж. Але невядома, ці адбыўся з кім-небудзь шлюб[31]. Шлюб як выйсце з ганебнай сітуацыі выкарыстоўваўся ў еўрапейскай судовай практыцы. У Венецыі нобель Пелэгрына Вэнер за згвалтаванне маладой арыстакраткі быў асуджаны на выбар: да выплаты 1600 дукатаў ці да шлюбу. У выніку сем'і абралі шлюб (1468)[32].

У сваім дзённіку Альбрэхт Станіслаў Радзівіл згадвае пра судовы працэс над дэпутатам Трыбунала ВКЛ (21 чэрвеня 1636 г.), які згвалтаваў паненку. Аднак у крыніцы не напісана імя злачынцы і судовы вырак[33].

Магчыма, немясцовае паходжанне прывяло да смяротнага пакарання шляхціча Ашмянскага павета Аляксандра Юзафовіча. У 1613 г. Луцкі гродскі суд разгледзеў скаргу Воўдзі, падданай Жыдзічынскага манастыра з сяла Рокіні.

[25] НГАБ, ф. 1737, воп. 1, спр. 8, арк. 329а–330а.

[26] Вінниченко О. Зґвалтування, вбивство і пограбування, а також перелюб. Історія кримінального злочину, здійсненого під Львовом в 1645 р. // Соціум. Альманах соціальної історії. Київ, 2015. Вип. 11–12. С. 162–184.

[27] Пра праблему наяўнасці толькі скаргаў у судах Валыні таксама піша ўкраінская даследчыца Наталля Старчанка. Старченко Н. Справи про зґвалтування в шляхетському середовищі Волині (остання третина XVI – перша половина XVII ст.) // Соціум. Альманах соціальної історії. Київ, 2015. Вип. 11–12. С. 107.

[28] НГАБ, ф. 1781, воп. 1, спр. 1, арк. 302.

[29] АВАК. Т. 26. Акты Упитского гродского суда. Вильна, 1899. С. 325–326.

[30] АВАК. Т. 36. Акты Минского гродского суда. 1582–1590 гг. Вильна, 1912. С. 385.

[31] Аўтар не прыводзіць назву твора. Czacki T. O litewskich i polskich prawach. T. 2. S. 127–128.

[32] Matthews-Grico S. Ciało i seksualność. S. 177.

[33] Pamiętniki Albrychta Stanisława Radziwiłła. T. 1. Poznań, 1839. S. 318.

Шляхціч уварваўся ў будынак, застаў замужнюю жанчыну хворай на ложку, дзе і згвалтаваў. На судзе Юзафовіч не прызнаў сваю віну, аднак Воўдзя пацвердзіла здзяйсненне злачынства праз сведак. Для выканання смяротнага прысуду гвалтаўніка перадалі ў Луцкі магістрат[34].

У судовых дакументах сустракаюцца выпадкі нападаў групы злачынцаў з мэтай гвалту і рабавання. Падданы Рамейка Лаўрыновіч паскардзіўся на Бенядзікта Сцяцковіча (служэбніка крынскага старосты Грыгорыя Валовіча), Богуша Язохву, крынскага мешчаніна Шчэбета і іх памочнікаў, што ноччу пераняялі яго, сына Бэлю і нявесту, якая была дзеўкаю. З імі было дзевяць сватоў і сваха. Злачынцы пабілі вясельны "поезд", паранілі і згвалтавалі дзеўку і сваху, забралі ў іх рэчы. Рашэнне па справе адклалі да прыезду Івана Валовіча[35] (1540)[36].

Пры канфліктах паміж шляхтай часта ахвярамі станавіліся падданыя. У выніку нападу на маёнтак не толькі наносілі шкоду маёмасці, але і гвалтавалі жанчын. Аляксандр Андрэевіч Сангушка абвінавачваў у нападзе Івана Андрэевіча Палубінскага. Яго падданыя з маёнткаў Дзярэчын і Котчына наехалі на двор Броднае (1540). Мясцовыя жыхары былі збіты, некаторыя забіты, абрабаваны, а жанчыны згвалтаваны. Шкоды было налічана на 6100 коп літоўскіх грошаў[37].

У 1603 г. Навагарадскі гродскі суд разгледзеў справу шляхціча Пятра Васілеўскага. Разам з памочнікамі (сыны Дзмітрыя Чачота – Андрэй, Лявон, Ян і інш.) ён абвінавачваўся ў начным гвалтоўным наездзе на дом навагарадскага шляхціча Яраша Ляшчылоўскага, збіцці яго, родных і слуг, згвалтаванні жонкі Ганны Іванаўны Лазоўскай, рабаванні маёмасці. Згодна з артыкуламі 1, 2 і 12 (артыкул за згвалтаванне) раздзела 11 Статута Васілеўскі быў асуджаны на смерць. Пакаранне было выканана. Гэты працэс выклікаў пратэст навагарадскай шляхты. На сойміку 1605 г. быў напісаны ліст канцлеру ВКЛ Льву Сапегу аб незаконным вядзенні судовай справы. Сярод прэтэнзій адзначалася пра недазвол адказчыку прынесці прысягу і адмову ў падачы апеляцыі[38]. Па сутнасці, прысуд адпавядаў здзейсненаму злачынству. Пакараны быў толькі ініцыятар наезду. Напэўна, для шляхты прысуд і яго выкананне падалося жорсткім, бо часта за такія правапарушэнні прызначалі зняволенне, грашовае пакаранне.

За сукупнасць правапарушэнняў – гвалтоўны наезд на двор Ціжэўскі (Менскае ваяводства), згвалтаванне панны Кацярыны Бароўскай, крадзеж царкоўных рэчаў, пагрозы арандатару Стэфану Лазоўскаму, які трымаў двор у арэндзе ад Яна Копця, Юрый Садоўскі, яго жонка Гальшка Котлаўна, Даніэль і Станіслаў Садоўскія, Жыгімонт Сакалоўскі былі асуджаны да выгнання з ВКЛ. Ліст караля Уладзіслава IV Вазы даў ім адтэрміноўку ад выканання прысуду (1645)[39].

---

[34] Білоус Н. Насильство над жінками: сюжети з міщанського і селянського повсякдення Волині XVI – початку XVIII ст. // Соціум. Альманах соціальної історії. Київ, 2015. Вип. 11–12. С. 135–146.

[35] Іван Валовіч быў братам Грыгорыя, удзельнічаў у пасяджэннях замкавага суда, займаў пасаду скідзельскага ўрадніка.

[36] АВАК. Т. 17. Вильна, 1890. С. 228–229.

[37] Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie. T. 4: 1535–1547. Lwów, 1894. S. 115–123, 133–136.

[38] Дакументы былі актыкаваны ў кнігі Слонімскага гродскага суда (1605). НГАБ, ф. 1737, воп. 1, спр. 8, арк. 18 – 25 адв.

[39] НГАБ, ф. 1727, воп. 1, спр. 3, арк. 1132 – 1133 адв.

Судовая практыка ведае выпадак, калі артыкул аб згвалтаванні выкарыстоўваўся жанчынай, каб выйсці замуж. Друзіяна Няміраўна праз умацаванага Яна Абергарта абвінаваціла віленскага мешчаніна Андрэя Капусту ў згвалтаванні (1546). Пры вывучэнні справы высветлілася, што мешчанін спакусіў дзяўчыну, калі яна начавала ў яго доме, абяцаючы ажаніцца з ёй. Аднак пасля здарэння сваё абяцанне Капуста не спяшаўся выканаць, што прымусіла шляхцянку выкарыстаць стары метад для арганізацыі шлюбу – абвінаваціць у згвалтаванні. У выніку суд вызваліў мешчаніна ад адказнасці, але яны павянчаліся адразу перад суддзямі[40]. У дадзеным выпадку дашлюбныя сексуальныя стасункі справакавалі абвінавачванне ў злачынстве, вынікам чаго стаў шлюб. Друзіяна праз свайго ўмацаванага магла ведаць, што паводле заканадаўства наступствам такой скаргі можа быць прымусовы для Капусты шлюб.

Злачынствы аб згвалтаванні разглядаліся ў магістратах[41]. Прычым абвінавачванні без доказаў не прымаліся. Магілёўскі магістрат разглядаў скаргу Ескі Празаровіча і яго жонкі Огрыні на сляпога Усціна Анушковіча. Быццам бы ён згвалтаваў жанчыну ў каморы шынка, калі муж выправіў яе туды па піва. Пры разглядзе аказалася, што Усцін ужо быў праз яе зняволены бязвінна паводле рашэння гродскага суда. За фальшаванне справы скаржнікам загадалі выплаціць Усціну страты за суды. Пачуўшы прысуд, Еска стаў неадпаведна паводзіць сябе ў судзе, казаў, што не хоча далей жыць з Огрыняй. Яго адправілі ў вязніцу да таго часу, пакуль не возьмуць на парукі (1577)[42]. Па сутнасці, на судзе не было прыведзена ніякіх доказаў. Судовыя матэрыялы не ўтрымліваюць прычыну няслушнага абвінавачвання. Магчыма, каб схаваць свае грахі перад мужам, Огрыня паказала на Усціна як на гвалтаўніка.

Наступная скарга таксама паходзіць з Магілёўскага магістрата. У 1579 г. Адар'я Іваноўна абвінаваціла Івана Паўловіча ў згвалтаванні сваёй унучкі Марыі. Яна казала, што гвалту не бачыла, а толькі чула крыкі. Іншых доказаў у яе не было. Спасылаючыся на артыкул XXXVIII Вайхбільда, умацаваны ад боку адказчыка Іван Багдановіч аргументаваў, што выпадак адбыўся днём, а значыць, злачынцу можна было злавіць і прывесці да ўраду. На карысць невінаватасці Паўловіча сведчылі сведкі, яго прысяга і добраахвотны прыход у суд. Мешчанін быў апраўданы[43]. У гэтым выпадку пры вынясенні прысуду кіраваліся правам. Да таго ж добрае веданне заканадаўства ўмацаваным дало магчымасць Паўловічу быць апраўданым.

Справа аб згвалтаванні магла скончыцца пагадненнем і грашовым спагнаннем. Перад Магілёўскім магістратам удава Куліна Васкоўна атрымала 8 коп літоўскіх грошаў за згвалтаванне дачкі. Злачынства было здзейснена Яцкам Максімовічам. Калі мяшчанка хацела ініцыяваць судовую справу, то ён праз мяшчан

[40] Скарга разглядалася ў судзе віленскага ваяводы Яна Глябовіча. Lietuvos Metrika. Kn. 234 (1546–1548): 19-oji Teismų bylų knyga / Parengė I. Valikonitė, S. Viskantaitė-Saviščevienė, L. Steponavičienė. Vilnius, 2009. P. 71–72.

[41] Выпадкі згвалтаванняў у гарадах мелі месца на тэрыторыі Украіны. Білоус Н. Насильство над жінками. С. 135–146.

[42] ИЮМ. Вып. 30. Витебск, 1903. С. 10–12.

[43] АВАК. Т. 39. Вильна, 1915. С. 185–186.

Івана Івановіча і Марціна Еўхімавіча ўлагодзіў яе. Грошы не былі выплачаны адразу, таму ўдава падала скаргу ў магістрат (1588)[44].

Выпадак згвалтавання Кузьмой Васілевічам дзяўчыны Марухны Станіславаўны быў даказаны. Яна прыйшла да яго маці па дрожджы, а мешчанін, скарыстаўшыся адсутнасцю людзей у хаце, згвалтаваў. Полацкі магістрацкі суд прысудзіў злачынцу да смяротнага пакарання (1640)[45]. Такія ж прысуды выносіліся ў польскіх гарадах[46].

Справа з Мерацкага магістрата аб згвалтаванні дачкі былога бурмістра, на той час нябожчыка, Гальшкі Станіславаўны з'яўляецца ўнікальнай, бо дае разгледзець выпадак ад скаргі да судовага працэсу. Згвалтаванне адбылося 14 ліпеня 1610 г. пасля дзвюх гадзін дня. Скаргу падалі 15 ліпеня разам з жонкай войта Адама Сарбеўскага – Ганнай Якубаўнай Міцуцянкай. Абвінавачваўся лаўнік Каспер Фрызяровіч, муж сястры Гальшкі. Дзяўчына знаходзілася ў цёткі, калі туды прыйшла Зафея Більвічаўна, падчарка лаўніка, і пачала ўгаворваць яе зайсці да Фрызяровіча. Гальшка вымушана была паслухацца. Лаўнік сказаў ёй падаць есці, а калі аказалася, што нічога няма прыгатаванага, то прынесці гуркі са склепа. Як толькі яна зайшла туды, Зафея яе зачыніла. Фрызяровіч зайшоў у склеп, збіў і згвалтаваў дзяўчыну. Справа разглядалася 8 кастрычніка. На працэсе Фрызяровіч спрабаваў аспрэчыць папярэдні прысуд ад 16 ліпеня аб пакаранні на смерць за здзейсненае злачынства. Сярод аргументаў выказвалася, што скарга пададзена праз 3 дні, ён не злоўлены на гарачым учынку, сведкі далі паказанні не так, як трэба, а пры шлюбе сталяр Войцех Богута сведчыў, што ўзяў Станіславаўну ў жонкі паннай. Аднак супраць Фрызяровіча былі факты, што ён аказаў супраціўураднікам пры затрыманні, не з'яўляўся на суд, скарга дзяўчыны была пададзена адпаведна, Гальшка пры гвалце крычала і інш. А сведчанне Богуты перад судом аб узяцці Гальшкі ў жонкі як пачцівую паненку азначала, што выпадак не можа пашкодзіць яе рэпутацыі. На судзе мяшчанка яшчэ раз вымушана была сведчыць, што быў здзейснены гвалт. Суд пацвердзіў прысуд аб смяротным пакаранні і дазволіў апеляцыю. Але пасля апеляцыі Богута і яго жонка даравалі злачынцу і вызвалілі ад адказнасці (1611)[47].

Пры вынясенні рашэння ўраднікі кіраваліся працай Граіцкага. У гэтай справе ахвяры атрымалася даказаць згвалтаванне. З яе аповеду вынікае, што Фрызяровіч падрыхтаваў злачынства загадзя. Ён быў дастаткова добра дасведчаны ў праве і спрабаваў пазбегнуць адказнасці. Ахвярай стала сястра жонкі. Суддзі адзначылі гэты факт як ганебны, бо была сувязь паміж сваякамі. Бок ахвяры адразу настойваў на пакаранні злачынцы, і шлюб як выйсце з сітуацыі быў нерэальны. Гальшка ў хуткім часе пасля злачынства выйшла замуж, прычым здарэнне ніякім чынам не паўплывала адмоўна на яе рэпутацыю. Агучаных фактаў было дастаткова, каб асудзіць на смерць. Аднак у выніку прысуд не быў

[44] НГАБ, ф. 1817, воп. 1, спр. 3, арк. 208 адв.; Марзалюк І. Матрыманіяльнасць і секс. С. 135.

[45] АС. Т. 1. Вильна, 1867. С. 313–319.

[46] Kamler M. Złoczyńcy. S. 405.

[47] Скарга не апісвае здарэнне да канца. Дакумент пашкоджаны. Lietuvos magdeburginių miestų privilegijos ir akta. T. 7. P. 370–372, 374–380, 395–396.

рэалізаваны. Верагодна, што два бакі дамовіліся па прычыне сваяцтва. Такім чынам, выкананне рашэння суда залежала таксама ад ахвяры.

Мерацкі шавец Ян Грышовіч Папаўціс падаў у Мерацкі магістрат скаргу ад імя дваюраднай сястры Дароты Гірнаколаўны на пана Станіслава Дамброўскага. Ён згвалтаваў дзяўчыну, калі яна была ў яго на службе. Два сведкі пацвердзілі гэты факт. Але праблема палягала ў тым, што пра злачынства не паведамілі адразу. Справу накіравалі да мерацкага старосты (1621). Дамброўскі згадваецца яшчэ ў справе за 1627 г., значыць, смяротнае пакаранне за гвалт ён не атрымаў[48]. На рашэнне старосты паўплывала позняя падача скаргі ў суд, а таксама шляхецкае паходжанне гвалтаўніка.

У кнігах гарадзенскага войта Канстанціна Александровіча была зафіксавана скарга Алены Янаўны. Разам з дачкой ад першага шлюбу Даркай яна абвінавачвала мешчаніна Станіслава Смяроўскага з Баранавічаў у згвалтаванні. Дарка ў яго была чаляднiцай. Смяроўскі выправіў яе ў лес па грыбы да Чурылаўшчыны, там і адбылося злачынства, нягледзячы на супраціўленне Даркі (1668). Аднак пазней Смяроўскі фігураваў як сведка ў іншай справе[49]. Значыць, або згвалтаванне не было даказана, або пакаранне было не смяротнае. У кнігах гарадзенскага магістрата выяўлены толькі гэты выпадак, але не значыць, што не было іншых. Служэбніцы часта былі ахвярамі гвалту з боку гаспадароў ці служэбнікаў. Яны нават не заўсёды падавалі заявы ў суд[50].

У Фларэнцыі за згвалтаванне прысуджалі грашовае спагнанне ў залежнасці ад статусу жанчыны. Часцей за іншых ахвярамі гвалту былі жанчыны з нізкіх саслоўяў, удовы, замужнія, чый муж адсутнічаў. Гомасексуальнае згвалтаванне таксама адносілася да сур'ёзнага злачынства. За яго прысуджалі лупцаванне і штраф[51].

Вайскоўцы былі патэнцыйнай небяспекай для жанчын. Яны доўгі час не мелі сексу, былі агрэсіўныя, усё, што ім было неабходна, атрымлівалі з дапамогай зброі, а жанчын разглядалі як трафей. Асаблівую небяспеку ўяўлялі жаўнеры, якія доўга не атрымлівалі грошы, бо яны нападалі, рабавалі і гвалтавалі. Ахвярамі станавіліся як жанчыны ворага, так і жанчыны сваёй краіны. Спецыяльныя артыкулы для войска забаранялі гвалтаванне. Гвалт над жанчынамі і дзяўчатамі караўся паводле артыкулаў жамойцкага старосты Яна Хадкевіча (1564), а паводле гетманскіх артыкулаў (1609), Уладзіслава Вазы для замежнага войска (1638–1648), гетмана ВКЛ Крыштафа Радзівіла (1635), гетмана ВКЛ Януша Радзівіла (1648) злачынцы пагражала смерць[52]. Аднак крыніцы сведчаць, што перспектыва жорсткага пакарання не спыняла вайскоўцаў.

Перад Грунвальдскай бітвай войска ВКЛ і татарскае войска падчас рабавання польскай ваколіцы бралі гвалтам жанчын і дзяўчат[53]. Выпадкі гвалту фіксуюцца

[48] Ibid. P. 713–715, 857.

[49] НГАБ, ф. 1800, спр. 1, арк. 168; ф. 1761, спр. 2, арк. 420–421, 424–426.

[50] Kaczor D. Przestępczość kryminalna. S. 151; Kamler M. Złoczyńcy. S. 289–292.

[51] Brackett J. K. Criminal Justice and Crime in Late Renaissance Florence, 1537–1609. Cambridge, 2002. P. 110–112.

[52] Kutrzeba S. Polskie ustawy. S. 122, 201, 218, 239, 262.

[53] Długosz J. Roczniki. Ks. 10–11. Warszawa, 2009. S. 85.

ў перыяд Інфлянцкай вайны. Гаспадарскі баярын Мікалай Андрэевіч падаў скаргу на вайскоўца Яна Целка, які звёз з дому яго дачку Ганну і згвалтаваў (1565). Разам з віжам Мікалаем Венцлававічам знайшлі дзяўчыну. Гарадзенскія мяшчанкі яе агледзелі і засведчылі сляды згвалтавання. Справа ўскладнялася тым, што Ганна была непаўналетняя[54]. Падобная скарга патрапіла ў Луцкі гродскі суд на таварышаў роты Януша Мікалаевіча Збаражскага – Данілу Касцюшковіча, Кiселінскага і іншых (1567). Прыехаўшы ў Торчын, яны нарабілі шмат шкоды мясцоваму насельніцтву, у карчме "*полнячи грех содомъскии*"[55], звезлі дзвюх прыстойных жанчын з мястэчка[56].

У Баркулабаўскім летапісе занатаваны выпадкі згвалтавання казакамі. У 1601 г. у Віцебску яны "*шкоду содомию чинили горше злых неприятелей албо злых татар*", а ў 1603 г. жорстка збілі і згвалтавалі дзяўчынку шасці гадоў: "*... приносил один мещанин на руках своих девчину у шести летех змордованую, зкгвалчоную, ледвей живую, чого было горко, плачливе, страшно глядети. На тое вси люди плакали, богу сотворителю молилися, абы таковых своеволников вечне выгладити рачил*"[57]. Згвалтаванні мелі месца пры выправе войска ВКЛ пад Пскоў. Два італьянцы купілі дзвюх маскоўскіх дзевак у казакоў за ручніцу. А ноччу недалёка да гетманскага намёта іх згвалтавалі. Раніцай дзевак знайшлі ў іх намёце. Але верагодна, што італьянцам атрымалася пазбегнуць пакарання як іншаземцам (27 верасня 1581 г.)[58].

Падчас вайны 1654–1667 гг. войска ВКЛ гвалтавала масковак[59]. Аднак і маскоўскія войскі дзейнічалі даволі жорстка супраць жанчын ВКЛ[60]. Дакументы адзначаюць пра цяжкія выпрабаванні для насельніцтва. Аляксандр Жыткоўскі,ураднік польнага гетмана ВКЛ Вінцэнта Корвіна Гасеўскага, у сваёй скарзе падаў жахлівае апісанне руйнавання маёнтка Радванавічы (Берасцейскае ваяводства) палкоўнікам запарожскага войска Аляксандрам Русецкім і яго людзьмі. Падчас наезду маёнтак быў абрабаваны, падданыя збіты, а жанчыны і дзяўчаты згвалтаваны (1660). Быў праведзены агляд маёнтка, які паказаў зруйнаваны стан маёмасці і нанесеную шкоду насельніцтву[61]. На той час Берасцейскае ваяводства было вызвалена ад маскоўскіх войскаў. Полк Русецкага дзейнічаў на баку ВКЛ, на сваю вайсковую адзінку збіраў падаткі з Берасцейскага і Пінскага паветаў. Але гэта ператварылася ў рабаванне насельніцтва, аб чым сведчаць іншыя скаргі. У выніку гетман ВКЛ Павел Ян Сапега выдаў універсал аб ліквідацыі ваенных фарміраванняў палкоўніка А. Русецкага і забароне

[54] НГАБ, КМФ-18, спр. 261, арк. 155–156.

[55] Да "садомскага граху" ў крыніцах адносяць не гомасексуальныя дачыненні, а неадпаведныя сексуальныя паводзіны, гвалтоўныя дзеянні. Выраз паходзіць з рэлігійнай праваслаўнай літаратуры. Адзначым, што шырокае разуменне садаміі было не толькі ў нас, але, напрыклад, у Італіі. Davidson N. Theology, Nature and the Law. P. 76.

[56] Центральний державний історичний архів Україны м. Київ, ф. 25, оп. 1, спр. 9, арк. 71 адв.

[57] ПСРЛ. Т. 32. С. 187, 189.

[58] Piotrowski J. Dziennik wyprawy Stefana Batorego pod Psków (1581–1582). Kraków, 1894. S. 100.

[59] Żojdź K. Przeciwko moralności, czy dyscyplinie? S. 103–109.

[60] Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667. С. 53.

[61] НГАБ, ф. 1733, воп. 1, спр. 1, арк. 253 – 262 адв.

насельніцтву далучацца да іх з прычыны вялікіх людскіх страт. Наступны загад быў аб узяцці палкоўніка пад варту і пачатку следства[62].

Выпадкі гвалту здараліся падчас вайны і з боку суайчыннікаў, якія карысталіся беспакаранасцю з прычыны аслаблення ўлады. Гарадзенскі енерал Альбрэхт Дуброўскі засведчыў згвалтаванне служанкі менскага шляхціча Канстантыя Рора троцкім шляхцічам Кантрантыем Шылянскім. Апытанне праводзілася ў вёсках Прыставянцах і Палунцах. Акрамя таго, Шылянскі ў іншы час здзейсніў наезд на маёмасць Рора (1660)[63]. Вайна стварала ідэальныя ўмовы для дзеянняў гвалтаўнікоў, забойцаў і рабаўнікоў.

Істотную розніцу ў пакаранні падчас ваенных дзеянняў за згвалтаванне ў ВКЛ і Маскоўскім княстве паказвае ў сваім дзённіку Самуэль Маскевіч. Падзеі адбываліся падчас выправы на Маскоўскае княства. Нейкі слуга ўзяў гвалтам дачку баярына, калі той разам з сям'ёй вяртаўся з лазні. Дзяўчына вярнулася дадому толькі праз два тыдні. Судзілі слугу на агульным сходзе. Паводле Статута настойвалі на смяротным пакаранні. Бабоўскі прапанаваў судзіць паводле маскоўскіх законаў. Слугу збілі бізунамі, што задаволіла абодва бакі (1610)[64].

Да артыкула аб згвалтаванні меў дачыненне артыкул аб гвалтоўным шлюбаванні з жанчынай. За гэтае злачынства мужчыну каралі смерцю, 1/3 яго маёмасці пераходзіла пакрыўджанаму боку, а з 2/3 выплачваліся страты. Калі дзяўчына ўдзельнічала ў змове, то яна пазбаўлялася спадчыны і пасагу (Статут 1566 г. Раздз. 11, арт. 9)[65]. У Статуце 1588 г. гэты артыкул быў пашыраны. Мужчына не караўся смерцю, калі дзяўчына давала згоду на шлюб. Аднак пры ўзяцці дзяўчынай рэчаў з дому сваякі мелі права вяртаць маёмасць праз суд (Статут 1588 г. Раздз. 11, арт. 13)[66]. Гэтая норма была ўведзена ў сувязі з існаваннем даўняй традыцыі выкрадання нявесты, пра якую згадваецца яшчэ ў "Аповесці мінулых гадоў". Шлюб праз гвалт адбываўся без згоды бацькоў, што супярэчыла кананічнаму праву. Напрыклад, у праваслаўных прыходах Слуцкага і Капыльскага княстваў святарам забаранялася вянчаць шлюбы з дзяўчатамі, якія былі скрадзены ў бацькоў, пад пагрозай страціць царкву і прыход (1686)[67]. Водгаласы такога шлюбу захаваліся ў беларускіх народных абрадах яшчэ ў XIX ст.[68] А часам нават здараліся выпадкі вывазу дзяўчат[69]. Звычай крадзяжу нявесты таксама меў месца ў іншых краінах. Напрыклад, за гэта было смяротнае пакаранне ў Францыі і Польшчы, але пагроза смерці не спыняла мужчын[70].

Паводле класіфікацыі крымінальных спраў па соймавай пастанове 1611 г., шлюб праз гвалт быў аднесены да катэгорыі прыватнай крымінальнай справы.

[62] Тамсама, арк. 96 адв. – 97, 144 адв., 214, 269 – 269 адв., 439.

[63] VUB, f. 7, Trakų pilies teismo 1660–1661 metų aktų knyga, l. 222, 571–572v.

[64] Pamiętniki Samuela i Bogusława Kazimierza Maskiewiczów. S. 137–138.

[65] Лаппо И. И. Великое княжество Литовское. С. 521.

[66] Малиновский И. Учение о преступлении. С. 59.

[67] Минская старина. Вып. 4. С. 80–81.

[68] Богданович А. Пережитки древнего миросозерцания белорусов. С. 121.

[69] Никольский Н. М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. С. 52–54.

[70] Brudage J. A. Law, Sex, and Christian Society. P. 128; McNamara J. A.,Wemple S. The Power of Women. P. 85; Malinowska M. Situacja kobiety. S. 36–37.

У сувязі з гэтым загадвалася разглядаць гэтыя справы як іншыя крымінальныя, злачынцу саджаць у вязніцу, нават калі жанчына сведчыла на яго карысць[71].

Шлюб праз гвалт заставаўся актуальнай праблемай, што прымушала прымаць адпаведныя меры. У соймавую канстытуцыю 1607 г. быў унесены пункт аб гвалтоўным вывазе непаўналетніх асобаў жаночага полу ад бацькоў ці апекуноў. Такія злачынцы падлягалі зняволенню. Справы адносіліся да кампетэнцыі мясцовых судоў[72]. На сойме 1631 г. было адзначана пашырэнне практыкі шлюбаў праз гвалт. Была прынята пастанова пра павелічэнне грашовага спагнання за вываз жанчыны, з дадаткам, што ад пакарання рабаўнік не можа быць вызвалены, нават калі жанчына пад прысягай сведчыла, што была згодна выехаць, але яе сваякі гэтага не пацвярджалі. Такія справы разглядаліся ў Трыбунале[73]. Нунцый Ганарацы Вісконці ў лісце да кардынала дэ Торэса ад 22 сакавіка 1631 г. згадаў гэтую пастанову і адзначыў, што яна павінна зменшыць колькасць такіх выпадкаў[74].

Асобны прывілей для Вільні аб забароне шлюбу праз гвалт быў выдадзены Жыгімонтам Вазам у 1627 г. Прычынай стаў зварот да гаспадара мяшчан, бо папсаваліся звычаі і частымі сталі выпадкі шлюбу без вянчання і праз вываз паненак з горада без паведамлення бацькам пра шлюб. "Жаніх" і панна, якая пагадзілася выехаць з ім, пазбаўляліся маёмасці. Бацькі мелі права зрачыся яе. Калі памерлі бацькі, то спадчына такой дзяўчыны ішла апекунам, гаспадару і на рамонт віленскіх муроў. Аднак магістрат павінен быў сачыць, каб апекуны не злоўжывалі сваім правам і не трымалі дзяўчыну ў паненскім стане[75]. Дадзены дакумент – гэта рэдкі адмысловы выпадак прывілею адносна шлюбных спраў для горада. Ён больш датычыў шлюбу без згоды бацькоў, але яго можна было выкарыстаць і ў выпадку гвалтоўных дзеянняў мужчыны для заключэння шлюбу.

Шлюб праз гвалт меў непасрэднае дачыненне да згвалтавання, бо жанчына апынілася пад прымусам не толькі ў царкве, але і ў ложку. Гісторыя пакінула сведчанні, калі згвалтаванне з'яўлялася істотным аргументам для шлюбу. Упершыню такі выпадак у беларускай гісторыі занатаваны ў летапісах, калі князь Уладзімір забіў сям'ю Рагвалода, а яго дачку Рагнеду прымусова ўзяў у жонкі[76]. Але такі ўчынак быў уласцівы і іншым уладарам. Баляслаў І у выправе на Кіеў згвалтаваў дачку кіеўскага князя Прадславу. У такіх выпадках жанчына ўвасабляла сабой сваю краіну: улада над ёй азначала ўладу над краінай, якую перамаглі[77]. Гэта быў акт падпарадкавання і прыніжэння. Не па сваёй волі пайшла замуж Бірута за вялікага князя Кейстута, а праз згвалтаванне[78]. Даўмонт праз гвалт ажаніўся з жонкай брата Нарымонта, калі яна прыехала да яго выказаць спачуванні з нагоды смерці яго жонкі, а яе сястры. Прычым Нарымонт быў

[71] Volumina legum. T. II. S. 36, 326.

[72] Ibid. T. II. S. 444.

[73] Ibid. T. III. S. 326.

[74] [Rekaczewski E.]. Relacye nuncyuszów. T. 2. S. 180–183.

[75] Biblioteka Czartoryskich, rkps 2094, k. 264v–265.

[76] ПСРЛ. Т. 35. С. 39, 80; Чамярыцкі В. Летапісныя рэдакцыі падання пра Рагнеду // 480 год беларускага кнігадрукавання: матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў. Мінск, 1998. С. 163–169.

[77] Krawiec A. Seksualność. S. 161–167.

[78] ПСРЛ. Т. 35. С. 97, 181, 201; ПСРЛ. Т. 32. С. 138; Stryjkowski M. Kronika... Królewiec, 1582. S. 449.

жывы і не разведзены з жонкай. У выніку атрымліваецца цэлы шэраг парушэнняў: шлюб праз гвалт, бігамія, шлюб са сваячкай (жонка брата лічылася сваячкай). Паводзіны Даўмонта справакавалі канфлікт. Нарымонт сабраў войска, асадзіў горад Уцяны і вярнуў жонку[79].

У XVI ст. Ян Ласіцкі і Паўль Одэрборн пры апісанні шлюбнага абраду ў ВКЛ адзначалі, што пазбаўленне дзявоцкасці прымушала незгаворлівых бацькоў пагаджацца на шлюб[80]. Згвалтаванне дыскрэдытавала жанчыну і яе сям'ю, і шлюб з гвалтаўнікам быў выйсцем[81].

У судовай практыцы сустракаліся выпадкі абвінавачвання ў гвалтоўным узяцці ў шлюб. Ядвіга Гальшанская падала скаргу ў суд Паноў-Рады на Юрыя Осціка і абвінаваціла яго ў гвалтоўным выкраданні яе дачкі Ганны Літавораўны Храптовічаўны (1516). Насуперак волі Ганны маці хацела выдаць яе замуж за падкаморыя ВКЛ Андрэя Якубавіча Давойну і адмовіла будучаму гаспадарскаму маршалку Юрыю Осціку. Да шлюбу Ядвіга трымала дачку ў манастыры, адкуль Ганна з'ехала з Ю. Осцікам. У вечар ад'езду планавалася вяселле з А. Давойнам. На судзе Ю. Осцік сказаў, што жонка добраахвотна паехала з ім. Паказанні Ганны пацвердзілі яго словы і сведчылі пра прымус маці. Суд, выслухаўшы ўсе бакі, прыняў рашэнне: Ганна магла пайсці да мужа або да маці. Юрый Осцік прызнаваўся невінаватым[82].

Шляхцічу было выстаўлена сур'ёзнае абвінавачванне, за якое маглі прысудзіць да смяротнага пакарання. Такі прысуд мог быць прыняты на пачатку XVI ст., калі яшчэ не былі выпрацаваны заканадаўчыя нормы і ў судзе карысталіся звычаёвым правам. Цікава, што дзяўчына, якая выйшла замуж супраць волі маці, не толькі не была пакарана за свой учынак, а яшчэ мела права выбару. Пазней, з прыняццем Статутаў, за самавольны шлюб шляхцянку пазбаўлялі пасагу. На той час гэты ўчынак не дыскрэдытаваў дзяўчыну ў вачах асяроддзя. Аднак тут яшчэ трэба мець на ўвазе, што Я. Гальшанская мела вельмі скандальную рэпутацыю і часта была ў судах. Яна судзілася з другім зяцем Янам Аборскім, якому сама адвезла малодшую дачку Зафею, а потым абвінаваціла яго ў яе гвалтоўным выкраданні. Але прымас Ян Ланскі пацвердзіў законнасць шлюбу[83].

Невядома, чым скончыўся судовы працэс слонімскага баярына з вёскі Радзівілавічы Мацея Войцехавіча супраць Яцка Пятровіча. Апошні скраў у яго пасынка нявесту Ядвігу, дачку слонімскага баярына Юхны Міхайлавіча (1562).

---

[79] ПСРЛ. Т. 32. С. 32, 135.

[80] Ласіцкі Я. [Шлюбныя звычаі на Беларусі ў XVI стагоддзі] // Вяселле: Абрад / Уклад., уступ. арт. і камент. К. А. Цвіркі; Муз. дадат. З. Я. Мажэйка; Рэд. В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. 2-е выд. Мінск, 2004. С. 38–39; Oderborn P. De Russorum religione, ritibus nuptiarum, funerum, victu, vestitu, &c. et de Tartarorum religione ac moribus: vera et luculenta Narratio. Ad D. Davidem Chytraeum recens scripta. [Rostock], 1582. P. Bv-B2.

[81] Магчыма, што выпадак згвалтавання, зафіксаваны ў дакументах Львоўскага гродскага суда ў 1637 г., меў на мэце шлюб. Вінниченко О. "Ґвалт поневольний". С. 435–451.

[82] НГАБ, ф. 694, воп.1, спр. 287, арк. 118 – 119 адв.; РИБ. Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. Петербург, 1903. С. 944–948; Jankowski Cz. Powiat Oszmiański. Materiały do dziejów ziemi i ludzi. Cz. I. Peterburg, 1896. S. 280–281.

[83] Jankowski Cz. Powiat Oszmiański. S. 280–281.

Акрамя гэтага, былі спісаны ў асобны рэестр выдаткі на вяселле (піва, гарэлка і інш.), якія павінен быў кампенсаваць вінаваты бок. Бацька нявесты таксама падаў скаргу на Я. Пятровіча за выкраданне дачкі[84].

Вынік наступнай скаргі таксама невядомы. Мельхер Сноўскі абвінавaціў ротмістра Грыгорыя Войну ў гвалтоўных дзеяннях супраць дачкі Мацея Клочкі – Раіны. 21 чэрвеня 1573 г. ротмістр, скарыстаўшыся адсутнасцю гаспадароў, вывез яе у Падароск (Ваўкавыскі павет) і ажаніўся з ёй. Пасля смерці бацькі дзяўчына знаходзілася ў апецы Сноўскага. Яна была непаўналетняй на той час, таму адказнасць за яе нёс апякун[85].

Справа аб гвалтоўным вянчанні Кацярыны Ватальтовічаўны з палкоўнікам маскоўскіх войскаў Львом Сыціным разглядалася ў судзе метонскага біскупа, віленскага суфрагана, а таксама ў Віленскім гродскім судзе. Жанчына была гвалтоўна скрадзена палкоўнікам у Вільні. Пад пагрозай смерці яе прымусілі выйсці замуж. Кацярына пражыла з мужам 12 тыдняў. Былі беспаспяховыя спробы падаць на яго скаргі ваяводзе Мышэцкаму. Але апошні быў вядомы злачынствамі супраць мясцовага насельніцтва. Пасля вызвалення Вільні ад маскоўскіх войскаў Ян Лісоўскі, земянін Лідскага павета, які пазней стаў другім мужам Кацярыны, ініцыяваў справу супраць дзеянняў палкоўніка маскоўскіх войскаў Льва Сыціна (1665)[86].

Квіт пра атрыманне пасагу Янам Рымвідам Міцкевічам і яго жонкай Альжбетай Лявонаўнай ад маці Марыяны Тызенгаўзаўны і яе другога мужа Яна Левіна, капітана каралеўскага войска, утрымлівае апісанне абставінаў шлюбу праз гвалт (1689). У дакуменце Ян адзначыў, што паводзіў сябе як “непрыстойны зяць”. 12 мая 1688 г. ён вывез дзяўчыну гвалтоўным чынам з бацькоўскага маёнтка Серафімішкі (Упіцкі павет), за што быў абвешчаны банітам і асуджаны на смерць. Аднак нейкім чынам у яго атрымалася ўладзіць справу. Маці і айчым дзяўчыны скасавалі скаргі на яго і далі блаславенне на шлюб[87]. Гэты выпадак даволі рэдкая ілюстрацыя выканання нормы Статута адносна шлюбу праз гвалт. Справу ініцыявалі бацькі дзяўчыны, дамагліся асуджэння на смерць зяця. Выкананне прысуду было адменена дзякуючы згодзе на шлюб.

Як паказваюць факты, гвалтоўна маглі не толькі выдаць замуж дзяўчыну, але і ажаніць хлопца. У заканадаўстве пра такі выпадак не казалася. Шляхціч Мсціслаўскага ваяводства Ян Тэадор Станкевіч падаў скаргу ў Мсціслаўскі гродскі суд аб сваіх непрыемнасцях падчас вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй (1663). Ён быў захоплены маскоўскім войскам у сваім маёнтку Палуляхаўшчына (1655). У палоне яго прымусова ажанілі з дачкой папа Чыжа[88].

Гісторыя шлюбу Францішка Мялешкі (?–1715) і Гальшкі Колышкавай нетыповая. Пасля смерці старэйшага брата Міхаіла Мялешкі (? – пасля 1650), які не пакінуў нашчадкаў, Францішак застаўся старэйшым у сям’і, але ён быў

---

[84] НГАБ, ф. 1781, воп. 1, спр. 1, арк. 68 – 68 адв.

[85] Тамсама, арк. 457.

[86] Імя біскупа не згадваецца. АВАК. Т. 20. Вильна, 1915. С. 386–387.

[87] AGAD, Archiwum Tyzenhauzów, sygn. G-205.

[88] АВАК. Т. 34. Акты, относящиеся ко времени войны за Малороссию (1654–1667). Вильна, 1909. С. 300–301.

непаўналетнім. Сваякі з Валыні напісалі, каб Францішак прыехаў і застаўся ў іх да свайго паўналеццця. Па дарозе яго перахапіў Яраш Колышка, які служыў у яго бацькі і быў добра інфармаваны пра ўсе справы сям'і Мялешкаў, а таксама трымаў у заставе фальварак, куды і прывёз юнака. Там увечары яго падпаіў і ажаніў са сваёй дачкой Гальшкай. Усе правілы шляхецкага шлюбу былі парушаны. Не было змовінаў, шлюбнай дамовы, запісу вена і пасагу і інш. Ранкам Францішак даведаўся, што ён жанаты, і быў настолькі раз'юшаны, што ледзь не забіў Я. Колышку. Аднак той супакоіў яго, паабяцаўшы за дачкой пасаг 12 000 злотых. У сувязі з тым што зяць быў непаўналетнім і па заканадаўстве не мог самастойна валодаць маёмасцю, Дзявяткавічамі і іншымі ўладаннямі стаў кіраваць Я. Колышка. За перыяд яго кіравання ўладанні Мялешкаў былі спустошаны. Ён нарабіў шкоды на 100 000 злотых, а судовыя працэсы праз яго каштавалі 70 000 злотых. Яму было прызначана смяротнае пакаранне, а яго саўдзельнікам – баніцыя[89].

Выявіць шлюб праз гвалт ці шлюб пад прымусам можна толькі пры наяўнасці судовай скаргі, у іншым выпадку знайсці інфармацыю даволі складана. Такія шлюбы пры намаганні сваякоў жанчыны скасоўваліся[90]. Гэтыя з'явы прымусілі прымаць на сойме дадатковыя пастановы да артыкулаў Статута 1588 г. Шлюбы пад прымусам мелі месца не толькі на тэрыторыі ВКЛ[91]. Выпадкі сустракаліся на Валыні[92], у Бургундыі[93]. Удава па валынскім падваяводзе Адаму Букаемскаму, Зафея са Свідна, падала скаргу на Войцеха Даманькоўскага за тое, што напаў на яе на дарозе, завёз у свой маёнтак, згвалтаваў і прымусіў выйсці замуж (1598)[94].

Выкарыстанне гвалту для дасягнення сваіх мэтаў і рэалізацыі жадання было звычайнай з'явай. Збіццё і напад былі самымі распаўсюджанымі злачынствамі[95]. Грамадства мела павышаны стан агрэсіўнасці. У большасці выпадкаў мужчыны здзяйснялі злачынства з наступных прычын: доўгая адсутнасць сексу, карыстанне пэўнай сітуацыяй, праяўленне сілы і ўлады. Вельмі рэдка можна сустрэць паталагічных маньякаў-садыстаў, як былы афіцэр радзівілаўскай міліцыі Пётр Мышкоўскі. Падчас яго вандроўкі па краіне ў 1750 г. з чатырма падначаленымі паўсюль адбываўся гвалт над жанчынамі і садысцкае здзекаванне з іх[96].

---

[89] НГАБ у Гродне, ф. 1663, воп. 1, спр. 874; спр. 591, арк. 3–5; Сліж Н. Унутрысямейныя адносіны ў сям'і Мялешкаў са Слонімскага павета ВКЛ у другой палове XVII ст. // Павятовая шляхта ВКЛ: гісторыя, геральдыка, генеалогія, культура (XVI–XVIII ст.). Матэрыялы навуковай канферэнцыі, Горадня, 18 лютага 2005 г. Горадня, 2006. С. 76–86.

[90] Такія выпадкі здараліся нават сярод ніжэйшых саслоўяў. Bardach J. Świecki charakter zwyczajowego prawa małżeńskiego. S. 121.

[91] Майлз Р. Жаночая гісторыя свету. С. 101–102.

[92] Ворончук І. Подружні зради як наслідок практики укладання шлюбів в Україні в XVI–XVII ст. (на матеріалах ранньомодерної Волині) // Соціум. Альманах соціальної історії. 2006. Вип. 6. С. 165–167.

[93] Farr J. R. Authority and Sexuality. P. 99–110.

[94] Архив ЮЗР. Ч. 8. Т. 3. Киев, 1909. С. 476–478.

[95] Напрыклад, гэты від злачынстваў дамінаваў у Гародні. Сліж Н. Злачынства і злачынцы. С. 122–182.

[96] Kuchowicz Z. Człowiek polskiego baroku. S. 305.

Ахвярай гвалту магла стаць якая заўгодна жанчына незалежна ад статусу і ўзросту. Знаходжанне жанчыны адной ужо стварала небяспечную для яе сітуацыю. У якасці гвалтаўнікоў выступалі вайскоўцы, суседзі[97], сваякі, знаёмыя і незнаёмыя асобы. Мелі месца як гвалтоўныя спланаваныя напады, так і спантанныя злачынствы. Ініцыявалі справу сужэнцы ці сваякі пацярпелай. Заканадаўства адназначна выказвалася за смяротнае пакаранне для злачынцы. Аднак практыка паказвае, што давесці справу да пакарання не заўсёды атрымлівалася.

Шлюб праз гвалт таксама ствараў небяспеку для сям'і. Гэта была пагроза рэпутацыі, шлюбным стратэгіям, маёмасці. Такі шлюб парушаў як кананічнае права, так і заканадаўства. Лёс правапарушальніка залежаў ад сям'і. Ён мог быць пакараны, а мог стаць зяцем. Выпадкі гвалту супраць волі мужчыны былі выключэннем, а не правілам.

У грамадстве не было створана спрыяльнай сітуацыі для гвалтаўнікоў ні ў заканадаўстве, ні ў грамадскай думцы. Такія паводзіны адносіліся да дывіянтных, а не да нормы. Згвалтаванне як від злачынства даволі старажытнае, яго не выкаранілі нават сёння. Прычына яго палягае ў першую чаргу ў мужчыне, які не кантралюе сваю хцівасць і дамагаецца жанчыны ўсімі спосабамі. Патэнцыйна жанчына фізічна слабейшая за мужчыну і не можа даць адпаведны супраціў, і гэта ўлічвалася правапарушальнікамі. Варта адзначыць, што згвалтаванне не з'яўляецца ўласцівым толькі для ВКЛ злачынствам. Яно мела месца паўсюль.

Прасачыць тэндэнцыі ў згвалтаваннях і шлюбах праз гвалт вельмі складана з прычыны адсутнасці адпаведнай базы крыніц. Яе фрагментарнасць робіць недасягальнымі для даследавання псіхалогію злачынцы і ахвяры, далейшы лёс жанчыны, механізм рэалізацыі заканадаўства, тэрытарыяльныя асаблівасці выпадкаў і іншыя аспекты.

---

[97] Факты згвалтавання суседзямі і знаёмымі сустракаюцца ў іншых грамадствах. Ruggiero G. The Boundaries of Eros. P. 104.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Секс, як складаная сацыяльная, культурная і фізіялагічная з'ява, быў неад'емнай часткай старабеларускай культуры. Ён зрабіў уплыў на літаратуру, мастацтва, навуку, заканадаўства, судовую практыку, адносіны паміж мужчынам і жанчынай. Але гэтае ўздзеянне мела хутчэй схаваную форму, чым адкрытую.

Культура сексуальных стасункаў Вялікага Княства развівалася як у сваім унутраным свеце, так і ў кантакце з еўрапейскімі і суседнімі краінамі. Вопыт іншых культур быў цікавы для нашых жыхароў, часам ён запазычваўся, трапляў на старонкі кніг. Аднак абазнанасць у гэтай галіне была больш характэрна для адукаваных людзей. Сама краіна знаходзілася ва ўмеранай кліматычнай зоне з чатырма сезонамі, што выразна ўплывала на сексуальную актыўнасць літвінаў. Не апошнюю ролю тут адыгрывала фізіялогія, тэмперамент, рацыён харчавання, ужыванне алкаголю.

Нормы паводзінаў у сексе ўсталёўваліся рэлігіяй, а некаторыя з іх сталі нормамі права. Аднак яны не былі абсалютнымі і вызначальнымі. Тым больш што можна было прыйсці пакаяцца і зноў саграшыць. Пад уздзеяннем рэлігіі людзям секс уяўляўся грахом, а многія тэхнікі ў ім лічыліся шкоднымі натуры. З ім мірыліся як з неабходнасцю для працягу роду. Гэта думка ўступала ў супярэчнасць з фізіялогіяй і рабіла грэх прывабным. Аднак што было больш важна для асобы – жыць па рэлігійных прынцыпах ці задаволіць свае жаданні – залежала ад яе самой і ад таго, у якім асяроддзі яна існавала. Судовыя справы сведчаць, што людзі не заўсёды маглі стрымаць сваю жарсць нават пад пагрозай смяротнага пакарання.

Нягледзячы на тое што грамадства існавала пад рэлігійным кантролем, тэматыка інтымных адносінаў знайшла свой адбітак у літаратуры і мастацтве. Гэта быў адзін са сродкаў рэалізацыі жаданняў і пачуццяў. Але варта адзначыць, што ў гэтых накірунках вобразы ствараліся менавіта мужчынамі. Праявы жаночых жаданняў і патрэбаў амаль не знайшлі адлюстравання.

Стаўленне да інтымнай сферы жыцця мянялася ў краіне ў залежнасці ад эпохі, стану грамадства, эканамічных, сацыяльных, культурных тэндэнцый, тэндэнцый у гендэрных адносінах. У перыяд XVI–XVII стст. Вялікае Княства Літоўскае было феадальнай дзяржавай, а само грамадства мела яскравы патрыярхальны характар. Гэта непасрэдна ўплывала на адносіны паміж мужчынам і жанчынай. Патрыярхальны лад быў прызначаны для мужчыны і выразна падкрэсліваў яго дамінаванне над жанчынай. Гэта быў мужчынскі свет, дзе

